*Масей Сяднёў*

# ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ

*Масей Сяднёў*

# ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ

ВЕРШЫ

РАМАН

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1992

ББК 84Бел7
С99

Прадмова Барыса Сачанкі

Масей Седнев — один из самых известных и популярных белорусских писателей, волей судеб оказавшихся в эмиграции. Этой книгой, в которую вошли лучшие стихи из его книг «Погашенные звезды», «Очищение огнем», «А время больше, чем вечность» и его наиболее удачный роман «И этот день наступил». Масей Седнев открывается перед современным отечественным читателем как талантливый, оригинальный поэт и прозаик.

С $\frac{4702120202-037}{М 302(03)-92}$ БЗ 91—91

ISBN 5-340-01100-3

© Прадмова. Б. І. Сачанка, 1992
© М. І. Сяднёў, 1992

## «ХВАЛЮЮСЯ, СУМУЮ І ПІШУ...»

Масей Сяднёў — не новае імя ў нашай літаратуры, сёння гэта адзін з самых вядомых і папулярных пісьменнікаў беларускай эміграцыі. За афіцыйную дату яго нараджэння прынята лічыць 19 жніўня (1 верасня) 1915 г. На самай жа справе ён нарадзіўся на два гады раней — у 1913 г. у вёсцы Мокрае, якая цяпер знаходзіцца ў Касцюковіцкім раёне на Магілёўшчыне. «Мой бацька — селянін,— апавядаў потым М. Сяднёў,— і я — вясковы хлопец, сын бедняка, які нават напачатку вызваляўся ад падатку... Бацькі мае непісьменныя абодва, і абодва працавітыя. Мне здаецца, што я болей узяў усяго ад маці, у прыватнасці, пачуццёвую аснову. Маці для мяне як святая».

Вучыўся будучы пісьменнік у Макранскай пачатковай школе, потым у Саматэвіцкай сямігодцы, настаўнік якой І. Чэчка — выпускнік Нясвіжскай семінарыі — быў добра знаёмы з Якубам Коласам, чым вельмі ж ганарыўся і пра што неаднойчы расказваў на ўроках, тым самым абуджаючы цікавасць да літаратуры.

Пасля заканчэння Саматэвіцкай сямігодкі М. Сяднёў у 1930 г. паступіў у Мсціслаўскі педтэхнікум — там, як вядома, перад гэтым вучыліся Змітрок Астапенка, Аркадзь Куляшоў і Юлі Таўбін. Але вучоба ў педтэхнікуме ў М. Сяднёва не пайшла, бо яму там, як ён прызнаваўся, не спадабалася. «Тады ў педагогіцы панаваў так званы лабараторна-брыгадны метад, і я сядзеў у брыгадзе гэтай, як дурань: нехта за мяне адказваў, а мне ставілі адзнакі. Ды яшчэ голад настаў». І М. Сяднёў пакінуў вучобу, нават не скончыўшы першы семестр.

Куды было дзявацца, вельмі не думаў — вярнуўся дахаты, да бацькоў. Нейкі час працаваў у калгасе, потым уладкаваўся настаўнічаць у суседнюю вёску Кавычычы. У 1933 г., у надзеі знайсці сваё месца ў жыцці, ён выпраўляецца ў сталіцу Савецкай Беларусі горад Мінск, паступае там у Вышэйшы педагагічны інстытут. Аднак атрымаць дыплом настаўніка яму не ўдалося — у 1936 г., калі быў студэнтам апошняга чацвёртага курса, яго арыштоўваюць і без усякіх на тое падстаў высылаюць на Калыму.

Пяць гадоў правёў М. Сяднёў ні за што ні пра што ў сталінскіх лагерах — здабываў золата, працаваў на лесапавале, быў чорнарабочым. У канцы 1940 г. яго разам з іншымі былымі студэнтамі, якія спрабавалі свае сілы ў літаратуры і якія былі арыш-

таваны — Я. Ермаловічам, У. Клішэвічам, М. Суднікам, М. Гваздовым, П. Шыраковым — прывезлі ў Мінск на перагляд справы. Але зрабіць гэта не паспелі — пачалася Вялікая Айчынная вайна. Калі на сталіцу Савецкай Беларусі пасыпаліся нямецкія бомбы, усім арыштаваным і асуджаным было загадана пакінуць турму. М. Сяднёва разам з усімі пагналі калонай на Чэрвень. Там, у Чэрвені, ахова разбеглася і М. Сяднёў апынуўся на волі.

Вярнуўся ў родную вёску, працаваў на гаспадарцы. Калі Чырвоная Армія вызваляла Магілёўшчыну, баючыся, каб зноў не трапіць у сталінскія лагеры, М. Сяднёў выехаў у Беласток. Потым былі Берлін, Прага...

Пачалося бадзяжнае эміграцкае жыццё. М. Сяднёў працаваў настаўнікам у беларускай гімназіі ў Міхельсдорфе (Германія), на фабрыках і заводах у ЗША, на радыёстанцыі «Свабода», выкладаў рускую мову ў адным з амерыканскіх (штат Індыяна) універсітэтаў. Цяпер ён на пенсіі, жыве непадалёку ад Нью-Йорка ў невялічкім гарадку Глен-Коў.

Пісаць вершы М. Сяднёў пачаў яшчэ ў школе, у чацвёртым класе. Адзін з іх «Трактарная калона» надрукавала раённая газета «Сталінскі прызыў», калі вучыўся ў Мсціслаўскім педтэхнікуме. Потым яго вершы пачалі з'яўляцца на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў — «Чырвонай змены», «Звязды», «Савецкай Беларусі», «Літаратуры і мастацтва», «Беларускай работніцы і сялянкі», «Паляўнічага Беларусі», «Полымя рэвалюцыі». У ранніх вершах, напісаных не без уплыву фальклора, творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, ды і рускіх паэтаў А. Пушкіна, М. Лермантава, С. Ясеніна, апяваў хараство роднай прыроды, радасць і паўнату жыцця, нясмелае юначае каханне. Займацца творчасцю не пакінуў і ў турме, у сталінскіх лагерах. Там ён у неверагодна цяжкіх умовах стварыў цыкл вершаў «Патушаныя зоры», у якіх паспрабаваў перадаць усю жудасць перажытага ім самім і ўсімі яго сябрамі па няшчасці:

Я ў няволі. Маці, мая маці,
ну нашто дала ты мне жалейку?
Маёй песні болей не ўзвівацца —
згінуў, згінуў я ні за капейку.

У вершы «Хадзіў я ў пустыні і ціхім і сумным» ёсць і такія радкі:

Не хочацца жыць, а памерці — шчэ болей,
жывеш на зямлі і не знаеш зачым.
Чаму ж не хапае адвагі і волі
сябе задушыць у гушчары лясным?

У пазнейшых вершах паэт знаходзіць адказ на гэтае, ды і іншыя пытанні:

Толькі я лягу і вочы зажмуру,
толькі растану у ночнай цішы,
пад здрыгі таемныя муру
песня снуецца ў душы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

Дармо: хоць білі у цішы
і пхалі нанач у задуху —
не выбілі з яе душы
і песеннага духу.

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Ці йна была на Калыме,
ці ў камеры вільготнай, цеснай,
ці смерць была ў яе наўме —
яна была заўсёды песняй.

Менавіта яна, песня, ці інакш — паэзія, ратавала М. Сяднёва ў нялёгкіх выпрабаваннях, дапамагала яму прайсці праз усе кругі сталінскага пекла, выжыць, застацца самім сабою.

І вось «збамбілі ля турмы увесь квартал», і паэт «пайшоў у свет раскутым». Матывы адчаю, жуды саступаюць месца роздуму:

Ад часу, калі пугай яшчэ ляскаў
і ў полі рос,
глядзеў я з незямною ласкай
у глыбіню нябёс.

І там тануў мой зрок і сам я.
І я і статак — як плылі.
Здавалася — нябёсы ёсць таксама
і на зямлі.

Ды па зямлі было усё зямное
і не было нябёс.
Сцярог мяне, стаяў за мною
зямны мой лёс.

Ён так падбаў і ўсё так з'ісціў,
зямны мой лёс,
што ўжо пабачыць, як калісьці,
я не магу нябёс.

Напісаныя ў турме і на Калыме вершы, а таксама новыя, хоць і не часта, але друкаваліся ў акупацыйных выданнях — часопісе «Новы шлях», газетах «Раніца», «Новая дарога», «Беларускі работнік» і інш. У Беластоку М. Сяднёў падрыхтаваў да друку першы свой зборнік паэзіі, які назваў «Ад сына твайго, Беларусь». Але зборнік гэты, адрэдагаваны і набраны ў Кёнігсбергу, згарэў у пажары. Давялося М. Сяднёву чакаць яшчэ некалькі год, каб убачыць, патрымаць у руках сваю першую кнігу. Гэта было ў невялікім нямецкім гарадку Рэгенсбергу ў 1946 г. Называлася яна «У акіяне ночы». Праз год там жа, у тым самым Рэгенсбургу, дзе знайшоў часовае прыстанішча паэт, у яго выйшла другая кніга — «Спадзяванні». «Я ўключыў у гэтыя першыя свае кнігі вершы ваенных гадоў і новыя,— паведамляў М. Сяднёў.— Між іншым, некаторыя з напісаных і надрукаваных вершаў я не ўключыў у гэтыя зборнікі — меркаваў, што яны не вартыя таго». У 1947 г., праўда, ужо не ў Рэгенсбургу, а ў Міхельсдорфе і ў Ватэнштэце ў М. Сяднёва выйшлі яшчэ дзве кнігі — «На край святла» і «Цень Янкі Купалы». «Гэта быў адзін з самых плённых перыядаў у маім жыцці,— пісаў потым паэт.— Там, нягледзячы ні на што, я знаходзіўся ў нейкім рамантычна-ўзнёслым стане... Туга па страчаным перапаўняла мяне, гэта стварала своеасаблівы настрой. З'явіліся вершы заглыбленага зместу, з філасофскім падтэкстам, тое, што называецца медытацыяй. Я жыў паэзіяй, паэзія давала мне крылы, глушыла боль. Як, дарэчы, і ў сталінскіх турмах, на Калыме. Каб, здаецца, не вершы — не жыў бы». Менавіта тады ў адным з вершаў, прысвечаных сястры Дар'і, былі такія радкі:

Адно другога ўсё трагічней,
і страшна — гора без турбот
збываў я песняю лірычнай,
замест каб стаць на эшафот...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Што ж? Я не плачу й не каюся,
адно толькі даль імжыць...
Мне трэба казка якаясь,
каб мог я жыць.

І такой казкай стала для М. Сяднёва паэзія. Як толькі было цяжка на душы, ён браўся пісаць вершы, глушыў імі боль.

Наступныя кнігі паэта выходзілі ўжо са значнымі перапынкамі — і не ў Еўропе, а ў Амерыцы — «Ля ціхай брамы» (Нью-Йорк, 1956), «Патушаныя зоры» (Мюнхен — Нью-Йорк, 1975), «Ачышчэнне агнём» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1985), «А часу больш,

чым вечнасць» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1989). Пры ўсёй разнастайнасці тэм, якія закранаў і закранае паэт у сваёй творчасці, ёсць адна як бы галоўная, скразная, якая пераходзіць з твора ў твор, з кнігі ў кнігу — гэта Радзіма, той куточак зямлі, дзе нарадзіўся, упершыню ўбачыў свет, спазнаў першыя радасці і нягоды.

Засумаваў я па табе, Радзіма,
па недаступнай па тваёй красе.
Кудысьці адыходзіш ты ўсё міма
і забываешся, даруй мне, пакрысе.

Цябе я пакідаў, я думаў, ненадоўга —
праз месяц, праз другі вярнуся зноў.
Але цягнік далей, далей мяне ўсё тоўхаў:
як назнарок — назад не йшоў,—

прызнаецца паэт ў вершы «Жывы ўспамін». А ў вершы «Відзенне Бацькаўшчыны» зноў вяртаецца да гэтай тэмы, але па-іншаму:

Як толькі песняю сваёй зайдуся —
і Бацькаўшчына ў сэрца хлыне мне,
і лёгка робіцца ў начной задусе,
і быццам не наяве я, а ў сне.

Здалёк чалом ківае мне як быццам —
няўцешліваму сыну ў чужыне́.
Іду, як праз туман, хачу прабіцца,
ды сам не ведаю, гэта я, ці не.

Спыняюся, чакаю — ды няма прывету.
Спяшаюся — хоць ногі колюць хмызнякі...
Бо што мілей выгнанніку-паэту,
чым вобраз твой — далёкі і блізкі.

Бацькаўшчына, родная вёска саграваюць паэта, дзе б ён ні быў, акрыляюць, даюць тэмы для творчасці, будзяць успаміны.

Цяпер на бацькаўшчыне ўжо марозы
кладуць узор на ранішнім лядку.
Падпаленыя восеняй бярозы
усцяж гарадь на бальшаку.

Мне, босаму, не страшна, што я босы,—
скачу па маразянай траўцы шчэ валей.
Здаецца мне — як гляну на бярозы,
ад полымя мне іхняга цяплей.
У полі бацьку я ў падмозе,
гляджу жывёлу, бульбіны пяку.

І ўсё гляджу чамусьці, як бярозы
гарэць на нашым бальшаку.

Я восеняй жыву ў трывозе:
забудуся, ды зноў кране —
падпаленыя восеняй бярозы
гараць пякучай ранай у мяне.

(«Восень»)

Нямала твораў прысвяціў М. Сяднёў другой сусветнай вайне, тым падзеям, сведкам якіх ён быў сам на яго роднай зямлі — паэмы «Мая вайна», «Забраны Менск», «Цень Янкі Купалы», «Мікола Бугроў» і інш. Асабліва пранікнёна напісаны яго вершы пра маці, сясцёр, якіх пакінуў дома, у сваёй вёсцы, пайшоўшы бог ведае куды і чаго:

Сястра мая, даўно цябе не бачыў —
ад самага крывавага жніўя.
Балюча мне за ўсе мае няўдачы,
за ўсё грахі, што аплаціў не я.

Калі б не я, усё было б іначай.
я стаўся усяму віной:
жыццё сваё і ваша перайначыў,
і ўсё пайшло не тою стараной.

Вершы М. Сяднёва — гэта сапраўдная паэзія, яны вызначаюцца навізною мастацкіх сродкаў, нечаканай метафарычнасцю, лірызмам, свежасцю думкі, у некаторых з іх ён падымаецца да значных паэтычных абагульненняў.

Немалую цікавасць уяўляе і проза М. Сяднёва — яго раманы «Раман Корзюк» (Нью-Йорк — Мюнхен, 1985) і асабліва «І той дзень надышоў» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1987). Першы раман М. Сяднёву менш удаўся ўжо хоць бы па той прычыне, што ў самой яго задуме — «...я думаў напісаць чытэльную кніжку, даць у рукі беларускага чытача твор, які б зацікавіў яго як сваёй тэмай, сваёй матэрыяй, гэтак і сваімі сюжэтна-фабульнымі калізіямі, без асаблівых прэтэнзіяў на вялікую літаратуру» — быў пэўны пралік. Раман гэты пісаўся з вялікімі перапынкамі аж 27 гадоў. І хоць у рамане дзейнічаюць «канкрэтныя, не выдуманыя людзі з іхнімі сапраўднымі прозвішчамі», а месцам дзеяння выбраны Мінск, яго наваколле, а потым турма і тое, што ў ёй адбывалася ў часы масавых рэпрэсій і бяспраўя, гэта не ратуе. Мастацкія пралікі кампенсаваць аўтару не ўсюды ўдалося. У гэтых адносінах куды лепшы раман «І той дзень надышоў». Ён папоўніў не такую

ўжо і бедную беларускую літаратуру пра вайну, высвяціў яшчэ адну незабыўную яе старонку. Удаліся аўтару сцэны вясковага жыцця, апісанні прыроды, кахання; праўдзіва, пераканаўча створаны і вобразы маці, бацькі, некаторых суседзяў. Ды і сама вайна, перажытае аўтарам пададзена без прыкрас, так, як яно было ўсё на самай справе. Раман напісаны ад першай асобы, вельмі шчыра, лірычна і такою багатаю, свежаю мовай, як цяпер ужо рэдка пішуць многія нашы празаікі. «І той дзень надышоў» — удача М. Сяднёва, гэта бадай ці не самы лепшы раман, што створаны і выдадзены ў беларускім замежжы.

М. Сяднёў заўсёды праяўляў вялікую цікавасць да сваёй Радзімы, таго, як у нас жывуць людзі, што яны думаюць, да чаго імкнуцца. І, калі толькі стала гэта магчыма, наведаў Бацькаўшчыну. Ён пабываў у родным яму Касцюковіцкім раёне, у музеях, рэдакцыях газет і часопісаў, сустрэўся з пісьменнікамі і чытачамі ў Доме літаратара на вечары яго паэзіі. Свае ўражанні ад паездкі на Радзіму ён выклаў у нарысе «З Менску — у Мінск», які быў надрукаваны ў «Літаратуры і мастацтве». У лісце да аўтара гэтых радкоў ён пісаў: «Дахаты вярнуўся толькі 12 чэрвеня... Пакрысе ачуньваю ад доўгага падарожжа. Асэнсоўваю бачанае, чутае. Усё яно яшчэ толькі ўкладваецца, бо ж уражанне ад адведзінаў Бацькаўшчыны надзвычайнае, прыймо, прыхільнасць да мяне, чалавека сціплага,— зварушлівая, сустрэчы, гутаркі — незабыўныя, цеплыня — гаючая... Удзячны я і беларускаму грамадству, што прыйшло на вечар паслухаць мяне. Іхная неабыякавасць да мяне, спагада і мо захапленне ўзвышалі мяне, дадавалі прагі жыць».

У адным з апошніх вершаў «Надзея» М. Сяднёў шчыра, як і зазвычай, прызнаўся:

Захоплены, я кожны дзень
сябе радкамі выкладаю,
хачу уваскрасіць, што ў самаце
мяне трывожыла гадамі.

. . . . . . . . . . . . . . . . .

Хвалююся, сумую і пішу,
натхненне пераводжу ў форму.
А мо калісь чыюсь душу
кране мой верш нерукатворны.

Выхад у свет гэтай кнігі пісьменніка на яго любімай Радзіме — яскравае пацверджанне таго, што ён не памыліўся ў сваім чаканні, жаданні.

*Барыс Сачанка*

*Прысвячаецца дачцэ Ірэне*

# ВЕРШЫ

*То ўскрэсне, то запаліцца, то згасне,*
*то заімжыць...*
*Гляджу цяпер назад і бачу ясна —*
*не ўмеў я жыць.*

*Ад часу, калі пугай яшчэ ляскаў*
*і ў полі рос,*
*глядзеў я з незямною ласкай*
*у глыбіню нябёс.*

*І там тануў мой змрок і сам я.*
*І я і статак — як плылі.*
*Здавалася — нябёсы ёсць таксама*
*і на зямлі.*

*Ды на зямлі было усё зямное*
*і не было нябёс.*
*Сцярог мяне, стаяў за мною*
*зямны мой лёс.*

*Ён так падбаў і ўсё так з'есціў,*
*зямны мой лёс,*
*што ўжо пабачыць, як калісьці,*
*я не магу нябёс.*

# НА ДОСВІТКУ

## ПАСТУШКА

Ціхі захад у лагчынах
сонца тушыць.
Гоніць статак на спачынак
свой пастушка.

Жыта коласам багатым
даспявае.
Падганяе яна статак
і спявае.

Спеў ліецца і па полі,
і па рэчцы.
Кіне яна хуткі погляд,
усміхнецца.

Асядае пыл на плечы
і на косы.
У траву халодны вечар
роніць росы.

Яркнуць радасцяй нязнанай
яе вочы:
— Сенажаці, лес, паляны,
добрай ночы!

*1933*
*в. Мокрае*

## СОНЦУ

Колькі хочаш — стой над галавою
і зямлю — як можаш толькі — смаж!
Не папросім мы цябе з мальбою:
— Пашкадуй род чалавечы наш!

Думаеш — хаваемся ад спёкі мы,
думаеш — загубаю твой жар,—
толькі ходзім болей яснавокімі
ды на твары большы ў нас загар.

Знаем мы — стаяць над галавою
табе трэба кожны дзень затым,
каб знікаць за дальняю гарою
не па ўласнай волі залатым.

Колькі ж хочаш — стой над галавою,
прыйдзе накановаецы твой час —
згаснеш ты за дальняю гарою,
сілу перадаўшы ўсю для нас.

*1934*
*в. Мокрае*

## АДЗІНСТВА ХАРАСТВА

Свет разнастайны і багаты. Многа
у ім і з'яў, і фарбаў, і прымет.
Але ў блісканні сонца агнявога
адзінствам хараства чаруе свет.

Растуць зялёным морам травы,
пасля дажджоў такая цішыня!
І сонца вогненная слава
нясе ў руках паходню дня.

Як мудрасць звечная стагоддзяў,
яно нам асвятляе шлях.
Зажмурыш вочы на выгодзе —
і свет звініць тады ў вушах.

Зямля імчыць. І ныя цела.
З зямлёй плывеш у забыцці.
Мая душа яшчэ не мела
такога шчасця у жыцці.

Нібы радзіўся зноў ты. Яснасць,
і глыбіня нябёс, і пышны цвет.
Гатоў ад радасці рукамі ўспляснуць —
адзінствам хараства так вабіць свет.

*1935*

## ХВАЛА ВЯСНЕ, ДАЖДЖУ І ГРОМУ

Вясенні цёплы дзень. Палі,
у ціхім дрэмлючы спакоі,
глядзяцца ў неба: — Дождж, палій!
Сыдзі блакітнаю ракою!

Яшчэ ад самае зімы
з густой мы плесняй, ілам, глеем.
Нас асвяжы ты і абмый —
мы узрасцем, зазелянеем.

У гэты кволы, сонны дзень
усе паказваюць прыметы:
згінацца цяжка і гудзець
ад ураджаю будзе лета.

Гарачыня. І абнялі
зусім раптоўна неба хмары.
Яны панура наплылі —
маланка ўміг і гром ударыў.

І лінуў дождж, і зашумеў,
забулькаталі ручаіны.
Забілі кроплі ў голле дрэў,
запахла горкая рабіна.

Яснее поле ад уцех...
Сей, дождж, залочаныя стрэлы!

Густая рунь жытоў расце
і зелянее на свет цэлы.

І дзень такі глыбокі стаў —
санлівая зляцела стома.
Хвала зямлі, хвала жытам,
хвала вясне, дажджу і грому.

## ЖАДАННЕ

Я ляжаў на зямлі і хацеў, каб дажджы
на мяне светлым ліўнем лілі.
Вада неба, і цела і твар палашчы! —
Я не ўстану з зямлі.

Так прыемна мне. Пара, як дым,
ад мяне клубам валіцца ў траву.
Льецца дождж як з вядра. У раку маладым
з ручаямі сплыву.

Пасля сонца наступнага парай з ракі
паднімуся я ў неба... Пракоціцца гром —
і на поле, на рэкі, кусты, лазнякі
упаду я дажджом.

*1932*
*в. Мокрае*

## ВЯТРАК

Вятры ўскіпелі. Чатыры крылы
круціліся ў дзікім вяселлі.
Стары, нібы з векаў імглы,
здавалася, сэрца ён меліць.

Развейваўся пыл. І быў
гэта пыл не мукі той, што ў мерцы
пад кошам стаяла, а пыл
расцёртага каменем сэрца.

Вятры адкіпелі. І крылле яго
спынілася горка і горда.
А мне прыйшло ў памяць — ён стаў ад таго,
што каменем сэрца расцёрта.

*в. Мокрае*

## У ДАРОЗЕ

Падае снег апаўночы,
ліпне на голлі ялін.
Дрэмле маўклівая змрочнасць
ціхіх далін.

Падае снег. Пасцілае
ночцы пасцель на начлег.
Белае поле без краю —
снег і снег.

Поўніцца радасцяй сэрца,
шчасцем нязнаных уцех.
Што гэты снег!
Мне здаецца —
тае ад сэрца снег.

Сэрца маё весяліцца,
б'ецца гарачы ў ім смех.
Сэрцу майму толькі сніцца
белы апоўначы снег.

## ХУТЧЭЙ, ЗАРА!

Хутчэй, зара! Хутчэй, зара!
Нямая цемень — на згіноту!
Ты не прынесла мне дабра,
мая начная адзінота.

Узвійся, дзень! Вядзі хутчэй
мяне да радаснага дому!
Я не магу забыць вачэй,
такіх прынадных і знаёмых.

Прэч, адзінота ночы! Я
табе ў дар песень не прыношу —
душа заходзіцца мая
па незабыўнай і харошай.

Узвійся ж, дзень! Вядзі хутчэй
мяне да радаснага дому!
Я не магу забыць вачэй,
такіх прынадных і знаёмых.

## НЕ І ТАК

Я нясмела ў яе і засмучана
запытаў, ці кахаеш мяне?
Яна кінула ў вочы балючае,
ганарлівае: — Не!

Бедаваў, гараваў па ёй колькі я!
Завязалася кашка вясной на сасне —
запытаўся яшчэ ў яе. Колкае,
тое самае: — Не!

Стаў хадзіць танцаваць на зарэчча я —
час ляціць, завірухай імкне.
Зноў спытаўся ў яе. Прымірэнчае:
— Я не ведаю... не.

Стаў хадзіць да другое і ліпнуць я.
Весялюся, спяваю, лайдак.
Ці кахаеш, скажы? Са слязамі і ўсхліпамі
адказала мне: — Так!

## МАЁ ХУЛІГАНСТВА

Ларыёнаў сын?
Хлапец няшкодны —
пазайздросціць могуць
іншыя такому.
Ад маленства басаногага, лагодны,
ён вады не замуціў нікому.

Яго свет —
бацькоўская у хаце лава.
Свайго носа ўсюды ён не ткае.
Адным словам — добры хлопец.
Слава
пра мяне ў сяле ішла такая.

Так і рос.
Дзеля таго, што бацька
мой не быў ні знатным, ні багатым —
не гуляў я ў расфарбаваныя цацкі,
а ў палёх накручваў я хвасты цялятам.

Я на кожным дрэве крыжык нейкі высек.
Падпаясваўся вяроўкай туга.
Каб хаваліся ў блакітнай высі,
кідаў я каменьчыкі із пугі...

Тыя дні мінулі
хутка, нечакана.
Параслі ля рэчкі ніцаю лазою.
Там калісьці, сном закалыханы,
напаіў я вочы чыстаю расою.

Увабраўся ў сілу.
Але, зашчаслівы,
калі ноч за хатай змрок замесіць,
ад пачуццяў хмельнага наплыву
кідаў я каменьчыкі у месяц.

Вось тады, у змрок бялявай ночы,
да мяне прыйшла адна паненка
і сказала, глянуўшы мне ў вочы:
— Гэта ж хуліганства, даражэнькі...

Напаіла пахам рук сваіх васковых,
абдала валос прыбоем п'яным.
З тае ночы у глушы вясковай
стаў я непапраўным хуліганам.

І цяпер, каб быць ізноў шчаслівым,
толькі ноч за хатай змрок замесіць,
ад пачуццяў хмельнага наплыву
хочацца кідаць каменьчыкі у месяц.

## ЖЫЦЦЁ

Добра жыць на свеце бесклапотным
і не мець ніякіх нудных спраў,
выйсці ў поле, нахадзіцца, потым
заваліцца ў зелень цёплых траў.

Сонцу ледзь зажмураныя вочы
падстаўляць і чуць яго цяпло.
І тады і верыць нат не хочаш,
што з душы зямное адплыло.

Цешышся сабою і ўсім светам,
разамлеласць спешчаную п'еш.
Мімаволі робішся паэтам,
сам сабою наплывае верш.

...Светлае заносіць лёгкім дымам,
дум няўтомных зноў снуецца ніць.
Бесклапотным быць нам немагчыма,
немагчыма на зямлі не жыць.

## СНЕГАПАД

Развітаўся з табойназаўсёды як быццам я —
горда і смела.
У завулках завеямі злосна круціла зіма.
Да цябе я не йшоў, хоць і сэрца хацела,—
я чакаў, покуль ты не паклічаш сама.

Цэлы тыдзень у хату маю ветры лютыя білі.
Кожны дзень я ішоў да цябе і вяртаўся назад.
Але раптам спакой лёг на цэлыя мілі,
і уночы пачаўся лагодны, як пух, снегапад.

Раніцою было невымоўна ўсё бела.
Як размочаны цукар, сінявата-халодная гасла імгла.
Чысціні дакрануцца нага нічыя не пасмела,
толькі сцежка адна да парога твайго пралягла.

## ДОМІК Ў МЕНСКУ

Драўляны дом, блакітны дом!
Маіх найлепшых мар прытулак!
Ці так жа ўсё сваім вакном
глядзіш на вузенькі завулак?

Ці шчасцем ты сваім багат,
ці шашаль сцены твае губіць?
Ці так жа ўсё зялёны сад
тваю ідылію галубіць?

Скажы ты мне, скажы ты мне,
дзе зараз тая, што начамі
малілася сваёй вясне —
такая... з сінімі вачамі?

Ці ёй цяпер, як і тады,
ад нечага ўсё сумна, цяжка?
Як пражывае малады
свой век прыгожая манашка?

Што з ёй цяпер? Свой ціхі сум
яна ў вачох па мне ці носіць?
Гаротнасць цяжкіх яе дум
каго развеяць яна просіць?

Драўляны дом, пястуй свой сон,
гадуй у садзе свой спачынак!
Ты мар найлепшых пантэон,
адзіны дум маіх прыпынак.

## МАЛЕНСТВА

Што колісь жыло і што пела,
яшчэ раз ты, памяць, крані!
Прайшлі, як дажджы адзвінелі,
маленства глыбокія дні.

Прайшлі над маёй галавою,
як сонца ідзе па вясне.
І толькі іскрой залатою
вы ў снох мільгніцё без мяне.

О, дуб на сівым на кургане
і сосны адвечных палян!
Я помню, у вас закаханы,
ад радасці новай быў п'ян.

О, дзень мой, дагледжаны дзедам,
былое вярнуцца прымусь!
Усё, што узнаў я, што зведаў,
завецца цяпер Беларусь.

Я мог весяліцца і плакаць...
Ўзвіхрыся, мой горды скакун!
За рэчку, на сочную мякаць,
я зноў паганю мой табун.

У поле, у пушчы, увысь я
начным засвішчу салаўём.
Нявіннасць, нявіннасць, вярніся!
Вярніся, маленства маё!

*в. Мокрае*

## РАЗВІТАННЕ З ЛЕТАМ

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

Нішто да сонца так вясёла не імкне,
і глыбіня нябёс ужо не тая...
Там, на радзіме, ціха без мяне
апошнім цветам краскі адцвітаюць.

Не давялося мне ў палёх пажыць,
пачуць, як сок зямлі ўпіваюць травы.
Злавіць, замёршы сэрцам, ніць
яшчэ нязведанай праявы.

Не давялося мне... Ды што казаць,
мне шмат чаго ў жыцці не давялося.
І толькі сніцца мне азёраў гладзь
ды недаслуханы напеў калосся.

Яшчэ зямля ў зяленіве жыве
і сонцам жнівеньскім яшчэ сагрэта,
ды бачу я па смуглай сіняве —
канчаецца раптоўна лета.

## ПРАДЧУВАННЕ

Больш у полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях, цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

На зямлю і лісце не апала,
і палі жывуць так, як і ўчора.
Як раней, сягоння сонца ўстала,
як раней свяцілі — свецяць зоры.

Знаю я — і лета не загіне:
прывязуць яго сяляне ў гумны.
І не ляжа дзень у дамавіну —
ён згарыць у золаце, задумны.

Але ў полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях, цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

*в. Мокрае*

# ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ

## ЖАХ

Параніла сябе густая ноч
на ледзяных нажах.
Турма. Як бляск вар'яцкіх воч,
у вокнах б'ецца жах.

Нібы атручаны чумой,
маўчыць турэмны двор.
У гэтай вусцішы нямой
я ледзь ад страху не памёр.

Цялячы крык упаў на брук
і — лужына крыві.
І нейчы голас: — Пальцы рук
сціскай мацней, даві!

Заплакаў двор за гэты грэх,
крывёю — капяжы.
Яны, сцякаючы са стрэх,
застылі у нажы.

А думаў я, што гэта ноч
параніла сябе на ледзяных нажах —
турма. Як бляск вар'яцкіх воч,
у вокнах б'ецца жах.

*Менск, турма*

## УНОЧЫ

Толькі я лягу і вочы зажмуру,
толькі растану у ночнай цішы,
пад здрыгі таемныя муру,
песня снуецца ў душы.

Просіцца песня на волю —
ў неспазнаны шчэ свет.
Песня мая, ты не мучайся болей —
волі не мае твой ціхі паэт.

Не заляцець табе птушкай за краты,
колькі ні біся гарачым крылом:
у сутарэнні, галубка мая ты,
разам з табою памром.

*Менск, турма*

* * *

Жудка. Цемень мне сэрца гняце.
Аніяк не магу я заплюшчыць воч:
як у чорную яму, ў густой цемнаце,
імчацца трамваі ў ноч.

Мне здаецца, што з рэек пазбеглі яны
і, б'ючыся на трэскі, у пекла ляцяць.
Насядаюць адзін на адзін, як званы,
і ніякай іх сіле на гэтым шляху не суняць.

Дык хутчэй жа, хутчэй жа нясецеся вы!
Каб стрымоўвалі вас — не хачу! —
У нямое прадонне, на скрут галавы,
я са звонам такім жа лячу.

*Менск, турма*

* * *

Затуманілася даль,
не відаць лясоў амаль —
дождж. На сэрцы тлее жаль.

Дрэвы мокрыя ў садах
голле звесілі на дах,—
пад страху забіўся птах.

Многа дзірак у страсе —
мокне птушка пакрысе,
смутак сэрца моцна ссе.

А дождж б'е усё званчэй,
і адна аднэй хутчэй
слёзы капаюць з вачэй.

*Менск, турма*

* * *

З прагавітасцяй звярынай, дзікай
доўга я глядзеў на свет багаты.
Вачэй сініх гостраныя пікі
прабівалі замураваныя краты.

Ад жыццёвага схаваны тлуму,
здзіўлены палёў размаху,
у жыцці я першы раз падумаў,
што зямля — вялікая да страху.

Першабытная яе разлегласць,
як калісьці продкаў з дрэва, мяне звала.
Гэтай першабытнасці падлеглы,
я абняў бы ўсю зямную галу.

Я сышоў бы ў звечныя курганы
першыя знайсці сляды сабе падобных.
Іх жыццё, у справу закаханы,
вывучаў бы я па рэштках дапатопных.

І калі б даведаўся па іх жыцці адпетым,
што і іхнае, як наша, сэрца мёрла,
зненавідзеўшы усё на свеце гэтым,
я зьвяром драпежным сам палез бы ў горла.

*Менск, турма*

* * *

Хадзіў я ў пустыні, і ціхім, і сумным,
і злосна няволю сваю праклінаў.
Здавалася лішнім, зусім неразумным
ўсё, што на свеце любіў я і знаў.

І сам я сабе быў не рады, і мары
мае маладосці, і сноў маіх боль
былі мне цяпер — нібы зманлівасць чараў,
нібы весялосці начной алкаголь.

Цікавасць — сястра маіх год адзвінелых —
прапала, і міма халодных вачэй
праходзіць у фарбах усё анямелых,
знікае, як сон адзінокіх начэй.

Не хочацца жыць, а памерці — шчэ болей,
жывеш на зямлі і не знаеш зачым.
Чаму ж не хапае адвагі і волі
сябе задушыць у гушчары лясным?

*Калыма*

## ЗМАНЛІВАСЦЬ

Сядзела ты ў чорным за чорнаю кнігай
і моўчкі чытала, а я
сачыў за тваім кажным мігам
і ціха шаптаў: «Каралеўна мая...»

Ад чорнае кнігі прыгожых вачэй,
самотных, падняць не магла ты.
— Канчайце чытаць, каралеўна, хутчэй,
і пойдзем у сад наш, цудоўны, багаты.

— Чакай ты. Аб шчасці тваім і сваім,
аб нашым загубленым шчасці,

павінна узнаць я, каб нам, маладым,
ў жыцці не было больш напасцяў.

І пойдзем з табою тады мы у сад,
як гэтую кнігу я ўсю дачытаю.
Жыццё наша болей не пойдзе на спад,
вясна наша будзе ўсягды маладая.

І будзе у цвецені сад наш бялець,
раіцца ў ім будуць вясёлыя пчолы.
Мы ж будзем з табою ў абдымках гарэць
і піць асалоду жыцця, нібы пчолы.

Прачнуўся. Са мной каралеўны няма.
І толькі са мной каралеўна-няволя.
Ды стукае ў сцены марозам зіма,
гуляе па беламу, чыстаму полю.

*Калыма*

## ЖЫЦЦЁ

Чырвоны ліст жыцця апаў,
хістаецца, як цень, шкілет.
Прайшоў пачуццяў маіх пал,
знік вобразаў таемны свет.

Ім я валодаў, ён трымаў
мяне ў палоне чар сваіх.
Як шум дажджоў, як шэлест траў,
адхваляваў ён і заціх.

Парою толькі ў цяжкім сне,
як дум маркотных не зглушу,
ён бліскавіцай мільгане,
параніць змёрлую душу

і кане зноў у небыццё,
і шкода робіцца надзей.
Свайго — гаворыць мне жыццё —
не дасягаў ніхто з людзей.

*Калыма*

* * *

Хацеў бы ўзяць цяпер я посах,
пайсці далінамі, лясамі.
Хадзіць, забыўшы ўсё, па росах
хацеў бы я да смерці самай.

Я б там не быў, дзе вецер свішча,—
зайшоў бы ў ціхасць Белавежы.
Сядзеў бы там каля агнішча,
да горла б там было мне ежы.

І са звярынаю гайнёю
дзяліў бы ўсе мае прыгоды.
Я б захапляўся дзіўнаю ігрою
непаміраючай прыроды.

Знайшоў бы я заспакаенне,
ад хаосу аддзелены зямнога.
Другое б я пазнаў вучэнне —
вучэнне не хацець нічога.

*Менск, турма*

## ТАВАРЫШОМ

Таварышы далёкія мае!
Я п'ю штодня атруту зелля:
мне супакою не дае
цудоўны час мінулага вяселля.

Варушыцца ў вачох імкліва муць —
то вобразы знаёмыя мільгаюць.
Нябожчыкамі дні ўстаюць,
мяне настойліва, як цені, абступаюць.

Завуць мяне ў мінулае адплыць,
упіцца хмельнасцяй юнацтва.
Завуць спакусліва яшчэ пажыць
хвілінамі кахання і мастацтва.

Але дарма варушыцеся вы —
турмы я скуты кайданамі.

Цяжкім схіленнем галавы
я развітаюся навекі з вамі.

Таварышы, гуляйце без мяне,
няхай бяжыць ваш час вяселля.
Пра ўсё забыць каб хоць у сне,
я буду піць атруту зелля.

*Менск, турма*

## КРЫВІЧОМ

Нібы дзеці забітых ваўчых,
не спазнаўшыся добра з гняздом,
па дарогах мы ходзім чужых
і не знаем, дзе хата, наш дом.

Старадаўны разбураны быт,
дом раскідан, адвечны курган
ваш рыдлёўкай бязбожна разрыт
і развеян спакою туман.

Вашы косці іржа праз гады
у балотах забруджаных есць.
Вашай славы стаптаны сляды,
і спаганена вашая чэсць.

Ваша імя святое цяпер
вырываюць з крывёю ў жывых.
І смяецца ў вус крывяжэр
над ахвярамі ўчынкаў сваіх.

Заімшэлыя скрозь дзірваны,
б'юць крыніцы ключом вашы ледзь.
На руінах сівой старыны
здох апошні вялізны мядзведзь.

Паліняў, у задуме стаіць
край адвечнай, жывой пекнаты.
Аб вас гутарка ў свет не бяжыць,
закаціўся ваш век залаты.

Адзвінеўшы, ў імгле ён заціх.
Глум нясцерпны, і гвалт, і кірмаш.
У няволі сярод чужых
памірае патомак ваш.

*Калыма*

## ПРАВАДЫР НА ТРЫБУНЕ

Народ крычыць: ура! ура!
Задаваленне ў гомане народным:
вялікага правадыра
народ гукае бацькам родным.

Ён у вачох — нібы кумір
ад дворніка і да паэта.
На ўсё з трыбуны правадыр
глядзіць як валадар сусвету.

Глядзіць як збаўца ўсіх нягод
і думае, што пакарыў фартуну.
Таго ж не знае, што народ
скрышыў бы ўшчэнт яго й трыбуну.

*Менск, турма*

## ЗДРАЙЦАМ

Я вашу знаў ману, ліслівасць,
усім вам, здрайцам, знаў цану,
але дарыў вам дум імклівасць
і згадкі я пра даўніну.

Усе былі вы ў захапленні,
мяне ўзнімалі да нябёс.
То вы маўчалі ўсе, як цені,
то рагаталі вы да слёз.

А нада мною чорнай плямай
звісала здрада і паўзла:
нарыхтавалі вы мне яму,
паборнікі нікчэмнасці і зла.

Упаў... Чаго вы ўсе хацелі,
ніхто падумаць з вас не ўмеў —
вы ўсе ад злосці вар'яцелі,
што розум я і сэрца меў.

Чакайце ж вы, сляпыя совы,
не смейцеся, што я ў мурах.
Як перуном, адзіным словам
вас разнясу я ў пух і прах.

*Менск, турма*

* * *

Мусіць, больш не маючы нічога,
маці мне мая дала жалейку.
Ды пачуўся голас духу злога:
— Згінеш ты, Масей, ні за капейку.

Граць пачаў я думку сваю, мару,
гадаваць я песню-дабрадзейку,
ажно каркнула, нагнаўшы хмару:
— Згінеш ты, Масей, ні за капейку.

Захапіўся песняй я сваёю,
падкаваў я рыфмай чарадзейку.
Толькі ж грымнула над галавою:
— Згінеш ты, Масей, ні за капейку.

Я ў няволі. Маці мая, маці,
ну нашто дала ты мне жалейку?
Маёй песні болей не узвіцца —
згінуў, згінуў я ні за капейку.

*Новасібірск, лагер*

## МАІМ БАЦЬКОМ

Родныя, не плачце пры ўспаміне —
не загіне ваш бяздомны сын:
я прыйду з далёкае чужыны,
змучаны выгнаннем, на спачын.

Утаю я сэрца свайго раны,
абаб'ю з адзення пыл дарог.
Усхвалёваны душою, стану
на даўно пакінуты парог.

Долі падуладжаны жабрачай,
зведаўшы і сцюжу і самум,
з радасці і з гора я заплачу
і усіх вас, родных, абніму.

Я прыйду да ціхіх да сялібаў,
мне з маленства блізкіх, я прыйду,
я знайду хаціну нашу з ліпай,
толькі вас я, мусіць, не знайду.

Вось затым я часта-часта плачу
і схіляю долу галаву.
Долі падуладжаны жабрачай,
на зямлі жыву і не жыву.

*Менск, турма*

## ДА ПЕСНЯЎ

Нашто вас, песні, я складаю,
згасаючы ў нямой цішы?
Нікога сёння я не маю,
пагаварыць каб ад душы.

Я скуты ў цёмным сутарэнні,
я загараюся агнём,
ды думы ўсе і ўсе імкненні
тут робяцца дарэмным тлом.

Так кожны дзень бяссільна б'юся,
у галаве — страшэнны тлум...
Ніхто з радзімай Беларусі
не прачытае маіх дум.

*Менск, турма*

* * *

Перунамі біце, словы,
і душу маю ўзбунтуйце,
каб гарэла і спявала
яна, стомленасць забыўшы!
Каб глыбінь сваіх таемнасць
расказала і паслала
мне суладдзе новых песень,
у якіх бы неадлучна
жыла свежасць ад грымотаў,
па радкох, нібы па жылах,
кроў гарачая хадзіла.
Каб ад гэтых песень чулых
і любіць і ненавідзець
сэрцы людскія умелі.
Творчасці святыя мукі
зведаўшы, тады сказаў бы:
— Я багаты і шчаслівы,
мне нічога больш не трэба.
Узлятайце ж, мае думы,
перунамі біце, словы!

# НА МАРШРУТАХ

## ІНВАЛІД

На вуліцы снуе ў клопатах дня народ,
густым і плаўкім сонцам вуліца заліта.
На вуліцы шырокай — там, дзе пераход,—
закалыхалася няўпэўненая постаць інваліда.

Ён быў на ўсіх франтах задымленай вайны —
прайшоў і з славаю героя нараспашку.
Глядзеў не раз у твар самога сатаны,—
цяпер праз вуліцу прайсці яму занадта цяжка.

Спыніўся той, другі — яму глядзяць услед.
А ён як бы усё трапечацца на месцы.
І я гатоў быў хоць у свет
падняць яго і на сабе панесці.

Я за яго душой сваёю гас,
спагада у крыві агнём пякучым тлела.
З дакорам ён глядзеў на нас —
журботна і нясмела.

## ВЕРШ БЕЗ НАЗОВУ

Калі вы ўсе спіцё, а мне не спіцца,
калі ноч ціха дрэмле па вуглах,
я чую, як зямля варочаецца ў змроку,
як цёмную гульню распачынае свет.

Гарматы скрозь, узняўшы джэрлаў глоткі,
п'юць ненасытна спуджаны прастор.
І вее холадам ад іх маўклівых дулаў,
і смерць здае пазіцыі, што я заваяваў.

Пляцоўкі танкаў зрушацца і пойдуць,
а чорныя крыжы у небе будуць плаваць,
за мукі нашы, як благаславенне,
са скогатам на мірны дах спадуць.

На штых абпёршыся, стаяць дывізіі зацята —
вось зараз зробяць першы крок і пойдуць,
і дзікі гул, мільённы тупат
разбудзіць нас крывавым раннем.

Калі вы ўсе спіцё, а мне не спіцца,
калі ноч ціха дрэмле па вуглох,
я чую, як...
Журыўся б я і шкадаваў, калі б не ведаў,
што будуць жыць яшчэ па смерці нашай
і нашым хваляваннем, і пакутай
і нашай думкаю, і нашай песняй,
і здзейсняць тое, што мы не паспелі.

А мы ад хваль прыліву будзем дыхаць
на ўзмор'і лёгкай і празрыстай пенай.

## УСЦЕШАНЫЯ ГЕНІІ

Бамбілі ноч усю Берлін.
Ад дыму душна было ў скверы.
Мы згінулі б, напэўна, як адзін,
каб у збаўленне не было ў нас веры.

Багі нас бераглі, калі,
не дачакаўшыся адбою,
мы выпаўзалі з-пад зямлі,
каб не памерці пад зямлёю.

А там, праз вуліцу дамы
рассыпаліся грудай цэглы.
Якая праўда! Радваліся мы,
што там не мы палеглі.

...Ды раніцай зноў сонца і цяпло.
Лічылі мы, каго не стала.
І толькі геніі, схіляючы чало,
нам кланяліся з п'едэсталаў.

## З «ГІСТАРЫЧНЫХ ДАТАЎ»

Вецер сцягі над рэйхстагам чысціў.
Варта надзейная: спі, не...
Моцна стаяў рэйхстаг калісьці
на гітлераўскай спіне.

З неба, сінеючага патопу,
арлы яго — страх зямлі —
у кволае цемя Еўропы,
падаючы, дзяўблі.

Заакіянскі свет дзівіўся —
паволі ён плыў на караблёх.
І гітлераўскіх дывізій
цень хмуры на зямлю лёг.

І сіняе неба над намі
кавалкамі бомбаў ляцела.
Еўропа — старая дама —
упала бяскроўным целам.

. . . . . . . . . . . . . . . .

І вецер сцягі не чысціць,
і варце ўсё роўна: спі, не ...
Цяжка стаяў рэйхстаг калісьці
на нашай спіне.

## ЦЯЖКІ АДКАЗ

Гора вучыць таксама.
Задуменны пагляд:
— Мама,
чаму тата не едзе назад?

Цягнікі грукацелі
міма нас.

Я расла у пасцелі
доўгі час.

І магчыма, што тату
міма нашае хаты
правязла вайна,
ты ж казала — благая яна.

Сустракаць на паўстанак
я хаджу часта ў сне.
Ды там саля пустая
цішынёю пужае мяне.

Хтось вакенца адчыніць —
такі страшны, бляды:
— Ты чаго зноў, дзяўчынка,
завітала сюды?

— Сустракаць свайго бацьку —
ён не ехаў з вайны,
хоць у сне я ўжо чула багацька,
як аб ім б'юць на цэрквах званы.

Гавару я заўсёды, што высню,—
так не ўцяміла б век-вякоў.
Вы адтуль, магчыма, наўмысля
не пушчаеце цягнікоў?

— Не палохайся — не аблаю.
І слязы не пушчай ціхама.
Ты не ведаеш хіба, малая,
што адтуль цягнікоў няма.

Гора вучыць таксама.
Задуменны пагляд:
— Мама,
ці прыедзе наш тата назад?

Так ніколі, ні разу
не ўзнімала вачэй,
не прасіла адказу,
як збаўлення, хутчэй.

## СТРАХ

Не бойся — гэта нехта грукнуў,
а у душы тваёй падняўся страх
і выцягнуў няведамыя рукі,
каб ухапіцца за цябе, маленькая сястра.

Вось так мяне за шыю абнімі,
не прыслухоўвайся, што робіцца там, за сцяною.
Ты прырастаеш да мяне грудзьмі,
ды чуеш страх спіною.

А страх, малая,— гэта толькі страх
і у сапраўднасці нямашка страху.
Засні, маленькая, твой страх
...ад страху.

*1953*

## ВАЙНА ЦІШЫНІ

Пад нагамі рыпяць ступені.
Кола выкацілі у сад.
Дом, утраціўшы сілу шчаплення,
апушчаецца на фасад.

Паваротаючыся, абмінулі
гаманкія дарогі млын —
заімшэлы, сівы, аб мінулым
насцярожаны успамін.

Сустракалася ўсюды вайна са мною,
бачыў я і руіны руін.
Але тут — цішыня вайною
дзень і ноч наступала на млын.

## НА СПЫНКУ

Прайсці, мінуць і не заўважыць
і толькі сум у сэрцы зберагчы.
Хіба не просяць душы вашы
цяпер спачынку уначы?

На вуліцу другую крута
вунь павярнуў дрыготліва трамвай.
Дарэмна я крычаў: «Кандуктар!
Хоць на часінку затрымай!»

Застаўся я на перасядцы
і не сагрэюся ў плашчы.
І досвіткі ўжо не прысняцца
на гэтым беразе начы.

Пагасла мігаценне ў высі,
і хмары пачалі дажджыць...
Таму, хто ў сянняшнім спыніўся,
да заўтрашняга не дажыць...

## ЖАБРАКУ

Як сон няжданы наяву,
стаіш схіліўшыся ты каля брамы.
Падняўшы горда галаву,
праходзяць паўз цябе паны і дамы.

Анучы на табе — не паліто,
яны ўсе знатныя уборам.
Не даў табе нічога з іх ніхто —
спыніцца ля цябе ім сорам.

Як быццам тут не чалавек,
а камень нечакана вырас.
«От і дае ж прырода недарэк —
не чалавек, а чалавечы выраз».

Нічога дзіўнага! Яны б
прайшлі і бацьку свайго міма,
прайшлі б, як непатрэбны грыб
праходзяць, не спыніўшыся вачыма.

Прабач, жабрача, ім. Як ты,
з табой я стану каля брамы,
каб весялей было табе. «Браты»,—
падумаюць паны і дамы.

## ПРАГА

Мінуў чужых я колькі гарадоў —
дарожная на вуснах запяклася смага.
Не знала ты яшчэ маіх слядоў,
абраная наўмысна мною Прага.

Ад готыкі суровай стыгне кроў,
яна не песціць, а пужае
і ўночы забірае ціхасць сноў,—
ты ж, Прага, для мяне не так чужая.

Табе вядомы роду майго лёс,
ты і сама зіхціш у промнях яго славы.
Я крыўду да людзей чужых прывёз,
каб утапіць яе ў тваёй Валтаве.

Я ўспамінаю край свой — гора, жудзь,—
твае разглядваючы сцены.
Над ім хмурынкі лёгкія плывуць
у накіпе празрыста-белай пены.

І песню я табе сваю пяю,
і слаўлю я цябе, зямлі чужой сталіца,
што даўніну прыпомніла маю,
што майго краю неба ў зорках сніцца.

## ДАРОЖНЫЯ ЎРАЖАННІ

Я з дымнага горада выехаў сяння
пачуць, што вясною гаворыць зямля.
Забыўшы на стрэчы і сум развітання,
я польнай дарогай ішоў спакваля.

Я самы свабодны на свеце — чатыры
аднолькава вабяць мяне стараны.
Я самы багаты, гаворачы шчыра,—
кішэняў не маюць мае штаны.

Нідзе і нікому я больш не належу,
як выбіты ветрам гусіны пух.
Пузаты памешчык за дзесяць галежаў
патрапіць запрэгчы мяне у плуг.

Глядзеце — працуюць, нібы тыя коні,
счарнелыя, быццам зямля, парабкі.
Адчуў я калянасць іх моцных далоняў
кволым хрустам свае рукі.

Гавораць, у Чэхіі добра. Не знаю —
пазнаць не прыйшлося мне ўсіх уцех.
Ды толькі скажу я сабе і краю —
як добра, што я не чэх.

*Прага*

* * *

Вёрсты шлях мой далёкі пакрылі,
боль у сэрцы маім,
што гадамі насіў, не заціх.
Нібы птушка пярынкі з крылляў,
разгубляў я па свеце
самых родных і дарагіх.

Як ляцець мне у свет шырокі?
Белы цвет мае песні
не дажджом — капытамі прыбіт.
Абяссіленай і адзінокай,
яна падае з плачам
на чужы і халодны граніт.

Паляту, паляту на радзіму,
маёй песні вандроўнай
лёгкі пух абраню.
Мо яна пранясецца не міма,
а на сонечным полі
заварожыць праменняў гульню.

*Берлін*

## СНЕЖАНЬ

Каляндар лістае месяц снежань.
На маёй радзіме, пэўна, снег.
Вечароў не п'юць дзяўчаты свежасць,
хлопцы ў полі кінулі начлег.

Снег засыпаў вуліцы і поле —
не знайсці табе слядоў маіх.
У хвіліну цяжкую ніколі
не глядзець табе цяпер на іх.

Снежань выбеліў усё на свеце,
асляпляе боль пагляд вачэй.
Бела ўсё, і сонцам усё свеціць,
ды душа твая чарней начэй.

Каляндар, гартай лагодны снежань,
белую пасцель начам сцялі.
Разлівай успененую свежасць —
я забыт не ўсімі на зямлі.

## МАЙМУ НАЧНОМУ СЯБРУ

Месяц, мой сябра самотнасці, ці ж
ніколі ў жыцці ты, як людзі, не плакаў?
Круглаю мордай на ўсё ты глядзіш,
неба начнога вясёлы гуляка.

Праходзіш табе накапованы круг
дакладна, размерана — кропка ад кропкі.
На нашу зямлю — мітусліва-спалоханы рух —
глядзіш, як на месца людской салатопкі.

І я быў таксама калісьці, як ты,—
у полі, на вуліцы жыў я начамі.
Напіўшыся ўволю тваёй пекнаты,
на ўсходзе зару адмыкаў залатымі ключамі.

Прайшло тое хутка — свавольнасць і пал,—
разводзіць дарэмна па часе рукамі.
У золаце зорак сябе ты купаў,
а я піў вільготнасць крывёю апырсканых камер.

І сёння ты — хлопец маўклівай начы,
а я да цябе вось з адною мальбою:
туманам клубіцца ў лагох навучы,
да сонца не спаць мне з табою.

*1944*
*Берлін*

## НАД МОРАМ

— Што з табой і што ты робіш, Валя?
Ці жывеш ты дзе на свеце белым?
Пырснула у вочы пенай хваля,
адплыла назад у шуме смелым.

— Ці жыве у сэрцы тваім сіла,
што злучала нас, як вера ў Бога? —
Хлюпнула у бераг і ступні абмыла,
толькі не сказала мне нічога.

Сум няўтольны маю я па той дзяўчыне,
што за морам дзесьці, у пацёмках шэрых.
Я зраблюся, мора, як само ты, сінім,
толькі выкінь, мора, на другі свой бераг.

## З НЕДАСЛАНЫХ ЛІСТОЎ

### I

Тут не такая, Ліда, старана —
жыццё маё ідзе зусім няўдала.
Таму вось толькі ты адна
паэзіяй маёй завaладала.

Самотнасцяй туманю галаву
і сэрца цешу стрэчаю зімовай.
А мне гавораць — так жыву,
што не знаёмы я з тутэйшай мовай.

Яно, напэўна, так. Але
заўсёды людзі могуць памыліцца.
Не кожны можа у імгле
свяціць агністаю зарніцай.

Мне люба гаварыць з табою. Зноў
я вечароў разбіў глухую змову.
Як насалоду дзіўных сноў,
ты разумееш маю мову.

Цікавых, знаю, будзе шмат,
каб прачытаць ім слова ў слова,
Зрабіўшы здзіўлены пагляд,
скажы ім толькі: ад Сяднёва.

II

Няма куды пайсці — чужая змова.
Прыемна думаць мне, што ёсць на свеце ты.
Каб перажыць усё яшчэ нанова,
Гартаю зноў я недасланыя лісты.

Жывуць яны маім нутром і свецяць
блакітным небам леташняй вясны.
Іх не для славы я друкую у газеце —
на пошукі цябе няхай ідуць яны.

Нясуць табе цяпло майго дыхання,
сагрэтага наплывам пачуцця.
Тут, на зямлі, без ласкі і кахання,
скажу — няма сапраўднага жыцця.

Мне за сябе не сорамна. Ніколі
чужому звычаю я не складаў хвалы.
Нібы праз сон, у першараднай ролі
твой вобраз мне смяецца із імглы.

...Па рэчцы плавае гусак з гусыняй,
знайшоўшы дружбу мірную ў трысці.
Усё тамілася у нейкай мляўкай сіні —
нікуды больш нам не хацелася ісці.

Мне гэтае прыйшло само, да слова,
прыйшло таму, што ёсць на свеце ты.
Каб перажыць усё яшчэ нанова,
пішу сягоння гэтыя лісты.

III

Хацеў я напісаць табе даўно,
але ўсё неяк часу не хапала.
Жыву сярод чужых. Пішу адно,
але і з пісаніны толку мала.

Усё не так укладваецца ў верш
і крытык лае, кажа, што пагана.
Самім сабой, як хочаш, не жывеш,
старая не залечваецца рана.

Атрутай дзён яна гнаіцца зноў,
зноў па-ранейшаму і сумна і балесне.
Жыве наплывам чорных сноў
мая няспраўджаная песня.

З пацёмак вечароў, гарачых і густых,
шукаю я да прахалоды выйсця.
Ды не дайсці мне да крыніцаў тых,
з якіх мы, прагныя, пілі калісьці.

Засмягласць не праходзіць губ,
і вольна не злятае слова.
Пісаць сягоння больш я не магу.—
З пашанай да цябе.
Бывай здарова.

## РАЗВІТАННЕ

Ну нашто, ну нашто сваё сэрца я мучаю?
Я па ўсім цяпер бачу, што ты — не мая.
Грае восень у полі нам песню разлучынаў —
гэта знаеш і ты, гэта знаю і я.

Самым тонкім, празрыстым, нібы павалокаю,
зацягнуліся лужыны ўночы лядком.
Тваё сэрца цяпер — таямніца глыбокая,
але я без сумлеву яе назаву халадком.

Не глядзеўшы мне ў вочы, нібы вінаватая,
ты маю абыякава, хутка пускаеш руку.
І зусім несвядома, ўсягды зухаватая,
чаравічкам ты водзіш сваім па пяску.

Недарэчы гаворыш ты мне, што ўжо выпілі
сок зямлі вераснёвых начэй халады,
а зіма — ледзяное дыханне — бязлітасным кіпенем
хутка спыніць у рэках цячэнне вады.

Дык нашто, дык нашто сваё сэрца я мучаю?
Я па ўсім цяпер бачу, што ты не мая.
Але ў тое, што песню разлучынаў
грае восень для нас — не хацеў бы услухвацца я.

## ДАРОГІ

Ператоптана, зведана ўсё як быццам,
і прывычна ўсё, як паверхня стала.
Ды ніяк, хоць ты што, не прабіцца
мне на тую дарогу, што сюды завяла.

Не сустрэў на шляху я сваім нікога,
мо таму, што я сам сустрэцца не мог,—
маючы ў свеце многа дарогаў,
я заблытаўся ў сетцы дарог.

І дарогі маёй канцы абое,
нібы ворагі душацца — смерць не міне:
адзін п'е з нашых рэк-вадапою,
а другі смагай мучыць мяне.

...Лёля, ты, як нашае сіняе лета,
у сэрцы маім туманы пасеш.
Трымценне, цяплом сагрэтае,
забытая памяць, ты зноў устаеш.

Што было і што ёсць — ніяк не адрозню,
захацелася шчасця ізноў у жыцці.
Танцуе мая маладосць на дарогах,
не хоча ніяк адысці.

* * *

Я думаў, што гарэць, нібы на ветры, мне даволі —
ляжыць гадоў маіх на вуснах горкі прысмак.
Я думаў, што, як вогнішча пакінутае ў полі,
душу маю пакрыў халодны попел-прысак.

Я думаў, досвед мой мяне навучыў і сцішыў —
сваёй усхваляванасцяй не назаляць нікому.
Так караблі у прыстані, сыходзячы з узвышшаў,
знаходзяць цішыню і радасную ўтому.

Дык не ж! Ізноў згарае дзень мой кажны.
Ніхто, напэўна, з блізкіх не зацеміў
на твары маім холад і няўважнасць,
на гастрыні пяра — душы смяротнае трымценне.

Шляхоў зямных ізноў перамагаю змору,
рука сама сабе прысуд пакутны піша.
Так караблі із прыстані ізноў ідуць у мора —
іх вабіць смерць у бездані, а не спакой і ціша.

## РАМАН

...І раптам перада мною
ідзе яна,— што са мной? —
такою зямною
на гэтай зямлі зямной.

Забыўся я, хто я, і дзе я.
І бачыў цябе я калі?
Як быццам гэта падзея
сталася не на зямлі.

У гэтакім вось настроі
услед — ад вугла й да вугла —
іду за табою — стройнай —
куды б ты ні павяла.

## КЛЯШТАР

Да кляштара замкнута брама:
«Забараняецца ўваход».
Яна ж дазволу і не брала —
размаляваны рот.

З пярэдняй кішані дастала
ёй паслухмяныя ключы.
Паходкай царсцвеннаю, аднастайнай
за брамай знікла уначы.

Глядзеў услед яшчэ ёй доўга —
дрыжэла ў галаве імгла.
Шкада — не быў я тым бульдогам,
з якім ты ў браму увайшла.

*1948*
*Зальцгаў*

## СТРЫМАНАСЦЬ

За горадам усюды быў я з Вамі,
прыпынкаў нашых знаю я мясціны:
і дол, усланы кветак дыванамі,
і скалаў старадаўнія руіны.

Нідзе мы не стаялі болей за хвіліны —
цягнула нас нязведаная сіла.
Вы ўсё былі цнатліваю дзяўчынай,
таемнасцяй вачэй мяне манілі.

Так цэлы дзень прайшоў. А мы
расстраціць не маглі саромлівага палу.
З далін дыхнула холадам зімы —
пайшлі дахаты мы маўкліва і памалу.

*1.4.1945*
*Прага*

## НА ПЛЯЖЫ

На ўсю энергію свяціла сонца. Дзень,
расплаўлены, жывою лавай ліўся
і занімаў прастор, шырокі на ўвесь свет,
каб людзі радаснымі на зямлі былі ўсе.

І пляж кішэў людзьмі. Як дохлыя, яны
ляжалі у пяску гарачых хвалях,
салодкай стомаю знывалі ціха
і — голыя — нічога не хавалі.

Пілі, разлёгшыся, усёй істотай сонца
і непрыкметна для сябе усё жаўцелі.
А потым у ваду яны няслі,
спяшаючыся, бронзавыя целы.

І здаравелі. Род жаночы
хваліўся грацыяй перад вачыма.
Мы разумелі іх, і нам
усё было магчыма.

Жылі і радаваліся ўсе жыццю.
Дзівоснай казкаю плылі за хвіляй хвілі.
Развітвалася сонца. Спаць ішло.
А людзі яму скласць хвалу забылі.

## З ВЯЧЭРНІХ БЛУКАННЯЎ

Кватэры адамкнуўся корак —
і павяла удаль дарога.
І тысячамі зор з мальбою і дакорам
глядзелі вочы Бога.

Ахутвалі таемнасцяю змрокі,
душа, не знаючы чаго, ўсяго хацела.
Такі сабе прыемны й лёгкі,
ідзеш адзін на свеце цэлым.

Чакаеш нейкай стрэчы незвычайнай
і верыш ў кажную на небе зорку.
Дармо што, плюснуўшы вачамі,
яна ўжо падае за ўзгоркам.

## АСЛЕПЛЕНАСЦЬ

Баялася ты ўвечары ісці адна.
Не знаю як — пайшоў і я з табою.
забылася а д з і н, а д н а,
і толькі засталося блізкае: а б о е.

Над галавою неба зорнае ішло.
Успыхнуўшы, пагасла й неба.
Глядзелі нібы ў цёмнае мы шкло,
і болей не было зямлі і неба.

І свет не быў ужо для нас,
а самі мы былі асобным светам,
што ткаўся зваблiва для нас,
як перад першым шчэ паэтам.

А беспрасветная аслепленасць плыла,
несупярэчлівыя ліплі рукі...
Навошта ж прахалодаю імгла
гарачыя нам цалавала рукі?

## СУМ

Хліпнуў агонь — лягла.
Застаўся адзін я ў свеце.
Месяц вырваўся з-за вугла —
надзьмуты, свеціць.

Да паўнаты напіўся,
ціхі, як кароўе вока,—
жоўтая пыса,
прабіраецца бокам.

Выгнаны мы ў чужыну,—
ён прыйшоў па небе за мною.
Як кот, выгінае спіну
з ласкай зямною.

Горка сябе над зямлёю паднёс:
«Галодныя, як сыр намажце!..»
У сіняе мора нябёс
плыве, як на мачце.

## СУСТРЭЧА

Ты насустрач — болем. І распаўся
дзень на міліярды сонцаў у вачох.
Свет застыў у нейкай мёртвай паўзе —
раўнавагі я знайсці не мог.

Гэтая сустрэча на прадмесці! —
Бляск вітрын, і ты, і зманлівасць уяў.
Апынуўся зноў на тым я месцы,
на якім, здаецца, я стаяў.

У вачох сваіх мяне ты топіш.
Заклікалі нас вячэрнія званы.
Загубіліся мы у натоўпе
ля царкоўнай мураванае сцяны.

Нашых збаўцаў і святых з паўценяў
выстаўлялі нішы на паказ.
Госпадзі, даруй маё хаценне —
незаслужаных, пастаў і нас!

* * *

Едзеш ты. Ці ж магчыма? —
Дождж, імгла і вятры.
Вочы некуды міма —
абатры.

Засталася часіна —
памаўчым...
Вочы сінія —
дым.

## ВЯСНА

З начы зямля была йшчэ мокрай —
дажджы шумелі уначы,
тады, калі нас цемра з вокнаў
манілася падсцерагчы.

Святло згасілі мы й на залі,
парваўшы стрыманасці ніць,
каб многазначна не сказалі,
што нехта позна йшчэ не спіць.

...З вакна глядзелі мы абое
уніз, і сад у вокны лез.
З пампушак белых, як з набояў,
страляў у нас пахучы бэз.

*1948*
*Заўльгаў*

## ЯК МАЛІТВА

Прайшла і не заўважыла як быццам.
Праходзь, я не злуюся — Бог з табой.
Калі б я мог, я мог бы заступіцца
прад Небам за цябе з найбольшаю мальбой.

З мальбою ціхаю, пяшчотнаю, дзіцячай,
што шэпчуць мае вусны уначы.
Яны, дрыготкія, няўдачаў
не ўмеюць стрымана перамагчы.

Не знаеш ты, якая асалода
мне думаць пра цябе у часе саматы.
Шапчу малітвы я, і шкода:
іх чуе Бог, але не чуеш ты.

А што, калі б Ён мог іх здзейсніць...
І ноч усю, праз сон, праз ціш,
У глыбіні душы шчымлівай песняй,
як звон затонуты, ты ўсё звініш.

* * *

Будзь мне ты ўсім. Мае дарогі
канчаюцца — ля ног тваіх ляглі.
Зрабіць усё ты можаш, толькі
усё зрабі ты для мяне.

Я прысвячу табе жыцця майго астатак —
нікога я не меў, каму б даверыў лёс я свой.
Шукаю ўсё і не знаходжу — пэўна,
няма на свеце больш сваяцтва душ.

Няўжо я памыліўся, калі цябе за лепшую абраў?
Чаму ж маўчыш? — Я прад табою,
па-за табой не будзе ўжо мяне.

Скацілася сляза з вачэй тваіх журботных.
Ты думаеш. Скажы мне, што?

## МАЛЕНЬКАЯ ПРОСЬБА

Магчыма, хутка я памру,
і ты забудзеш пра мяне.
І сон пра шчасную пару,
магчыма, хутка праміне.

Скажы, калі мы йшчэ жывём,
што ты часінку хоць адну
нахілішся сваім чалом —
я нават мёртвым уздыхну.

Мая душа на свеце тым
даступіцца к дабру.
Тады аб нашым аб зямным
навек у песнях я замру.

## ВЕЧАР

Іду і, як радасць, нясу сваё гора,
дотыкам ног скарынку снягоў ламлю.
Нібы са штыхоў, сцякае святло із зораў,
іголкамі холаду коліць зямлю.

Застыўшы на ўзлёце, песня замоўкла.
На ўсё я сказаць мог і «так» і «не».
І шчасце чужое із цёплых вокнаў
на вуліцах цёмных агнямі лавіла мяне.

Я белыя плямы агнёў спалохана пераступаю
і ночы сябе аддаю на давер.
Мне сніцца краіна у снох залатая,
што вокнамі свеціцца ўвечар цяпер.

Іду я, як радасць, нясу сваё гора,
дотыкам ног скарынку снягоў ламлю.
Нібы са штыхоў, сцякае святло із зораў,
іголкамі холаду коліць зямлю.

* * *

Даўно агні патухлі ў вокнах.
Ўсёй мітусні наперакор
спакойна месяц мёртвым вокам
глядзіць на наш спакойны двор.

Тады мае прыходзяць думы,
як нанач з мора караблі
прыходзяць, стомленыя тлумам,
і сняць пра цішыню зямлі.

Я дзень пражыў, і я спакойны,
і хочацца сказаць мне зноў:
мой лёс і будучыя войны
маіх не патрывожаць сноў.

Як будучыня, нейкая дзяўчына
стаяла, гордая сабой, ў вакне.
Глядзела сумнымі крыху вачыма
і ўсміхалася... магчыма, і не мне.

Даўно паснулі ўсе, як камні,
а мне не спіцца. Што ж,
мне сніцца, як яна рукамі
з вакна лавіла дождж.

## РАДАСЦЬ

Я сёння поўны радасцяй. Баюся,
што, нарастаючы, яна ў цішы,
пральецца смуткам нечаканым
за край душы.

Было ж не раз — надыдзе і захопіць,
на лёгкіх крыллях несучы,
а потым згасне таямніча,
як свечка уначы.

Яе кароткае дыханне,
як мілы, але рэдкі госць.
І нам здаецца — радасць
на свеце ёсць.

## СОН

Невядома — хто знае — што падружыцца з намі —
першы раз на чужыне ноч цвіла мая снамі.

Ішоў я па загонах, і маленькім, і босым,
і ў празрыстых вачох нёс ліпнёвыя росы.

Пастухі забаўлялі кароў на жалейцы,—
малако тады ў вымя, кажуць, цёплае льецца.

Пастухі весялілі зялёныя далі,
ды цяпер, як калісьці, мяне не віталі.

Не пачуў пра сябе я ні гуку, ні зыку —
яны, пэўна, забылі земляка і музыку.

Маё сэрца зайшлося ад раптоўнага болю,—
я пайшоў да сялібаў па знаёмаму полю.

Мая родная хата мяне доўга чакала,
а прыйшоў — тое месца зусім пуставала.

Так прайшоўся я ў сне па зямлі Беларусі —
гэта значыць, напэўна, я туды не вярнуся.

## АДЗІНОЦТВА

На вуліцы — хоць ты збірай іголкі:
павіс між небам і зямлёю месяц.
У горадзе чужым шукаў цябе і гойкаў,
хоць ведаў, што пляцы нічога не абвесцяць.

Яны сваё да позняе начы таптал і,
і я для іх — дзівак незразумелы:
шукаў узімку веснавых праталін,
адступам для мяне быў... мост згарэлы.

Спяшаліся дахаты ўсе па двое
і, сумнага, мяне збівалі з тратуару.
І я, паніклы галавою,
ішоў... із месяцам у пару.

## РАЗБІТАЕ ЛЁТНІШЧА

Калісьці смерць яны з сабой насілі
і раздавалі нам, людзям зямлі,
а сёння задрамалі у бяссіллі
паветраныя караблі.

Ім нецікава на зямлі, ім трэба
нясці на ўсе канцы жыццё і смерць...
І кажная часціна сніць пра неба,
і кажная часціна хоча узляцець.

Зламанае крыло апошнім ўзмахам
перамагло сябе і ўпала ў сны.
Над лётнішчам падбітым птахам
яшчэ вітае дух вайны.

І думаецца мне — калісьці раніцою
прачнуся я і ўжо не будзе іх:
у неба ўзнімуцца яны сям'ёю,
забраўшы цяжкараненых сваіх.

Ды непрабудным сном яны ўжо дрэмлюць,
паветраныя караблі,—
глыбока ўрэзаліся ў зямлю,
каб не падняцца болей ад зямлі.

## ДАЛЁКАЕ

Цяпер тое ўсё далёка,
як звон за хатай калосся.
Пісаліся вершы лёгка,
калі мне цяжка жылося.

Жывецца цяпер не лепей,
а можа, яшчэ і горай —
вясёлым зіхценнем у небе
не свяцяцца зоры.

Для песні радок здабываю
няўпэўнена, рэдка, скупа.
Аблаюць яшчэ — бывае —
яе паасобку ці ў купе.

І болю, і гневу, і смутку
агонь тлее ў слове, як прыску.
Застаўся ад песень тых хутка
на вуснах гаркавы прысмак.

Усё ўжо цяпер вядома,—
калісьці такі ахвочы,
цяпер не выходжу з дому,
толькі калі — уночы.

Зноў паглядзець на зоры,
далёкія тыя...
Толькі ж яны не гавораць,
свецяцца — не залатыя.

*1959*

## ВІДЗЕННЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Як толькі песняю сваёй зайдуся —
і Бацькаўшчына ў сэрца хлыне мне,
і лёгка робіцца ў начной задусе,
і быццам не наяве, а ў сне.

Здалёк чаломківае мне як быццам —
няўцешліваму сыну ў чужыне.
Іду, як праз туман, хачу прабіцца,
ды сам не ведаю, ці гэта я, ці не.

Спыняюся, чакаю — ды няма прывету.
Спяшаюся — хоць ногі коляць хмызнякі.
Бо што мілей выгнанніку-паэту,
чым вобраз твой — далёкі і блізкі?

*1959*

* * *

Цяпер я ў неба болей закаханы
і бег хмурынак разумею болей, чым калі.
Гляджу у неба я — і зажываюць раны,
што атрымаў я на пакутлівай зямлі.

Гляджу — і турбавацца больш не трэба.
злагоджвае усё у сэрцы сінява.
Ды вось бяда: пачнеш глядзець у неба —
закружыцца адразу галава.

*1959—1960*

## БОЛЬ

Памалюся за вас. За мяне
ці ж вы можаце памаліцца?..
А з-за дрэў, нібы сполах, зірне
белакаменная званіца.

І схаваецца зноў. А боль —
быццам я на крыжы распяты.
Памаліцца за іх дазволь —
бачыш, як глядзяць вачаняты?

Яны моляць, і сінь вачэй
іхных смокча высокае неба.
Ты пашлі ім спакой начэй —
можа, болей, чым нават хлеба.

Заслужылі ў цябе яны
міласэрную ласку.
Дык зрабі, я малю, іх сны,
іх жыццё, як міраж і як казку.

*1959*

* * *

Тут жылі мы і болей не будзем тут жыць —
мала месца для нас, а йшчэ меней — спагады.
Вараннё за вакном не спыняе кружыць —
то падымецца ўгору, то ідзе зноў да спаду.

Б'е крыламі трывогу, разварушвае жаль,
што у сэрцы і так, не сціхаючы, шчыміць.
Той кавалачак неба, за вакном што ляжаў,
палыхнуў развітальна цяпер прад вачыма,

І здавалася мне — найдрабнейшая рэч
лезла ў рукі: «Глядзі не забудзь нічога».
Апусціўся ў руках мой паходны меч —
як да вечнасці, так — да парога.

Не набралася б, можа, зашмат і дабра,
каб не гэта бясконца дарога.
Колькі мог я панесці — усё забраў,
пакідаючы толькі сябе самога.

## ВОСЕНЬ

Навеяла ў садзе лістоў
восень — жоўтая веялка.
А за садам над рэчкаю стог
нібы апусціў павекі.

Сляпымі ўглядаецца вачмі
у страчанае лета.

І мне хацелася сказаць: — Ачнісь!
Забудзь пра гэта!

Завялі краскі й трава,
і поле восенню зжата.
Нядоўга час трываў,
навальніцамі багаты.

Радасць прайшла ля весніц
з кошыкамі суніц...
З чорнага галля на ўзлессі —
зябкае ціўканне сініц.

Засумавалі, азглелі сады.
Пад нагамі шапоча лісце.
Быццам усё тут назаўсягды
Пакінута кімсьці.

*1965*

## СУЦЭЛЬНАСЦЬ

Недаспаў я колькі ўжо начэй —
хоць бы сцішыцца мне на часінку:
дзве душы ў маёй душы аднэй
між сабой змагаюцца бесперапынку.

У змаганні дзве душы мае
не прыходзілі яшчэ да згоды.
Ні адна з тых душ не выйграе,
толькі прайграю я сам заўсёды.

Часам нават за сталом адным
мы сядзім ужо аднэй сям'ёю.
Толькі ж напаследак, як з чужым,
разыходжуся я сам з сабою.

То люблю я неба сіняву,
то я лаюся бесперапынку...
Гэтак вось сябе я і зжыву —
сам перад сабой на паядынку.

*1959*

## ЗАЛАТОЕ ШУГАННЕ

Мне спаць уночы не даюць
цяжкія самалёты:
страшэнна рэжуць муць
начную сваім лётам.

Куды і што нясуць яны?
І дзе яны яшчэ кружылі?
Я чую дрож сцяны,
як дрож у собскіх жылах.

А як бы я хацеў цішы,
калі не ўдзень, дык хоць бы ўночы —
даўно ужо ў маёй душы
не сніўся сон прарочы.

Лятуць ніжэй і ў вышыні.
Агні патушаць і засвецяць.
Лятуць... Лятуць...
І цішыні
няма на цэлым свеце.

І ў сполаху імкнуць далоў,
як самагубцы, з неба зоры —
шуганне залатых галоў
пад рэха гулкае матораў.

*1959*

## УНАЧЫ

Уночы чуюся пэўней,
нейк сцішней пад аховай ночы —
душа ўспрымае свет паўней,
і да жыцця я больш ахвочы.

Вунь хмары з праблiскам святла
над безданню імчацца строма.
І я тулюся да вугла,
баюся аглушыцца громам.

Ды ціш і ноч. Спакой залёг.
На ўсіх пляцох і вуліцах нікога.
І, здэцца, на зямлі мы двох:
я сам і Валадарства Бога.

*1968*

## БАЛАДА

Чакаю. Прыйдзі. Вярніся.
Не йдзеш ты. Не чуеш. Няма.
У вокнах нідзе не блісне.
Сцюдзёна. Марозна. Зіма.

І месяц, і хмары на небе.
Паснулі дамы, як капцы.
Ды ўсё-ткі чамусьці мне лепей
на гэтым бязлюдным пляцы.

Вунь кінуўся цень з балкону.
Пабегла фіранка ў вакне.
І буду я думаць да скону,
што ты адчыняла мне.

Я цэлую ноч тут прабуду
з таполямі на пляцы,
паверыўшы ў тое цуда,
што сталася на пляцы.

*1968*

## ЛЕТУЦЕННАСЦЬ

Вечар і ціхі і моўкны —
з вэлюму і ядвабу.
На вуліцу свецяць вокны
і цеплынёю вабяць.

Толькі з панеляў не ўбачыш —
хоць станавіся на дыбкі —
жарсці маўкліва-гарачай
ані салодкіх абдымкаў.

Выдумаў гэта я, можа...
Можа, за тэю фіранкай
нехта, гаворачы: «Божа!»,
не дажыве да ранку.

Але ў імгле вечаровай —
зябка-настылай яме —
кажны я раз зачарован
ціхімі вокнаў агнямі.

*1968*

## НА ЗАХОДЗЕ СОНЦА

Як быццам з неба яны злезлі —
святыя пасланцы:
для продажу, за агароджаю зялезнай,
паселі помнікі, як мудрацы,

чакаючы, калі і хто іх купіць:
— Не бойцеся, глядзіце, выбірайце!
Даволі швэндацца вам купай,
здрайцы!

— Спалохаліся, га? Пабеглі, як чужыя,
ад нашай гутаркі хаўтурнай.

Помнікі, услед выцягваючы шыі,
гугнявілі:
— Йшчэ вернецеся, дурні!

— Мы злосці й болю вам не чынім —
пасланыя мы з высі...
Ага, застаўся вось адзін хлапчына —
хадзі бліжэй і не трусіся!

Я скамянеў ад д'яблаў гэтых нізкіх,
і лысіна ў расе ўся.
І помнік, скочыўшы, халодны, слізкі,
на плечы мае ўссеўся.

— Нясі! — дыхнуў каменным целам
і ашчаперыў рукі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

А сонца на заходзе крывянела
ад катавання й мукі.

*1948*
*Заўльгаў*

* * *

Прыглядаюся, каб не разбіцца,
вобмацкам хаджу я, спакваля:
некуды уніз, не па арбіце,
падае з-пад ног маіх зямля.

Страшна і не можна пагадзіцца —
на заходзе, як настане цішыня,
у крывавай вогненнай мядніцы
плавіць Бог увесь здабытак дня.

На зямлі не людзі — чалавекі —
тупаем і б'емся век-вяком:
тонкім, нібы шкло, навекі
неба нас накрыла каўпаком.

Грэшныя ў непаслухмянстве душы,
не хацелі б мы зямлёю тлець:
падаем, рукамі узмахнуўшы,
каб усё-ткі ў неба узляцець.

## СМЕРЦЬ МАЛІТВАЎ

Дзень прарэзаўся праз вокны,
а у хаце — як нікога.
Варушыўся змрок — сплывала
ціхая таемнасць Бога.

Не паспеў я у таемным,
варушлівым разабрацца:
дзень, ад сажы чорны й дымны.
забіраў мяне на працу.

І ў душы, святлом спужанай,
церпяліва і без бітвы,
як манашкі, паміралі
недаснёныя малітвы.

## БЕЛЫЯ НОЧЫ

Ноч, пахная смалой сасоннаю,
і зорка крыллем лопае на залатым шпілі.
Паставіў месяц варту сонную
стаўпом да самае зямлі.

На небасхіле горы цьмяныя паснулі,
як коннікі без галавы.
Сады у акіяне ночы патанулі,
як бела-воблачныя астравы.

На дне ракі, гліяста-глінкім,
таптаўся вечар, не замінаючы нікому.
Гнуў месяц кволыя галінкі
зялёна-белым комам.

І ў садзе дымам абсыпаўся —
глуханямы нябёс напаснік.

Асцерагайцеся нападу
вы ноччу белай на паўчвэрці —
пабелкай гляне дом з-за саду,
як выраз выскаленай смерці.

## АНЁЛ

Упершыню пабачыў гэта быццам:
над вуліцай — вось зваліцца на дол —
высока на слупе у золаце зіхціцца,
злятаючы да нас, Анёл.

У постаці маўклівай і балеснай
Збавіцель наш і Спас,
Ён з вышыні той паднябеснай
крыламі атуляе нас.

Працягвае да нас анёльскія Ён рукі,
і нам здаецца на зямлі —
Ён выстаўляе свае рукі,
каб мы Яго адтуль знялі.

І Ён сумуе сумам чалавечым,
і, здэцца, не збаяўся б Ён ані
плашмя ударыцца, абы не вечна
зіхцець у золкай вышыні.

*1968*

## МАНАХ

«Не стала ў кляштары манаха —
гавораць, вінавата дама»,—
перадавалася з іроніяй і страхам,
як грэшная і боязная тэлеграма.

Ішоў, і млела пад каленьмі...
На павароце ў сэрца ўдарыла трывога
і тупіком, і смерцяй, і збаўленнем —
распяцце бронзавае Бога.

На мур глядзелі яго вочы —
вакно пабачыў і сцяну ўсё тую.
Апоўначы манах пастукаў тройчы
у браму ціхую й святую.

*1948*
*Заўльгаў*

## НІ КАНЦА І НІ ПАЧАТКУ

Ні канца і ні пачатку,
толькі ўсё ж — канец:
палажыла пячатку
смерць — цярновы вянец.

І ўжо водблескі сцюжаць
далёкіх зор...
А пад вокнамі ружы —
як далёкі дакор.

Знекуль ледзьве даходзіць
спеў, як звон касы.
На адлегласці стагоддзя —
дзяцей галасы.

Заклапочаныя, чакаюць,
шалясценне ў лісці.
Цішыня такая,
быццам мае нехта прыйсці.

Толькі хто гэта з соллю
стол абрусам накрыў?
Пад высокаю столлю —
тайна крыл.

Вось і сталася тайна,
найвялікшая з таямніц,—
гэтак проста і незвычайна
як зіхценне уночы зарніц.

І высокая урачыстасць,
як маўклівасць, села на трон,
завалодала усім чыста
непадкупным нутром.

І, як выклік, пальчатку
Ураніла каля сянец...
Ні канца і ні пачатку,
толькі ўсё ж канец.

*1959*

# ЯК СПАЖЫТАК ШТОДЗЁННЫ

* * *

Баюся тых дарог,
што я прайшоў аднойчы:
яны з напрамкаў трох —
ад сцюж, ад зор, ад ночы.

Пад'юджвалі ісці
паіць вадой гнаявай.
Я ж не прыпомню, ці
было хоць што наяве.

І славячы камлі
хваін і пух гусіны,
ішоў я па зямлі,
небе у небе сінім.

І цвіў на градах мак,
і піў ваду я з лосем,
аж покуль цела ўсмак
муроў не напілося.

Таго ўсяго няма —
лёс нахлусіў пагану...
Кудысь у глухамань
качу зямлю нагамі.

## СТОМЛЕНАСЦЬ

Стаміўся жыць я на высокай ноце.
Было ж калісьці ўсё звычайна, проста:
піў яйкі чаек на балоце,
лупіў нажом бяросту.

У полі, за чародамі авечак,
рос, нібы збожжа й травы,
і патураў натуры чалавечай
без асаблівага на тое права.

Цяпер калішніх слоў звычайных
шукаю, як слядоў зацёртых.
Ды не збудзіць іх — як маўчання
на могільніку мёртвых.

## ВЫРАШЭННЕ МУКІ

Тут сонца, а за даляглядам
ідуць дажджы і п'юць зямлю.
Праменяцца блакітным спадам,
а я — і кроплі не ўмалю.

Шляхі... Шляхі... Пакунак мулкі...
Ты плачаш, га? У твар — цяплом.
І хуткім вырашэннем мукі
быў спушчаны у зямлю гром.

## ВЫГНАНЕЦ

— Адкуль жа будзеш?
— З Украіны...
— А я сама з Беларусі...
— І маці й бацька мой загінуў...
— Загінулі й мае усі.

Сустрэліся й пайшлі маліцца...
За пазухаю хатнія лісты.
А я маўчаў усё — як быццам
сястрой маёй была не ты.

Пайшоў сабе далей з нічым я,
і ў вадзе — ледзь-ледзь мільгне —
вялі паўз берага лагчыны
мой вобраз, незнаёмы мне.

*1948*
*Заўльгаў*

## МАЛІТВА

На коміне фабрычным сонца дагарае,
а мне дахаты йсці ці хутка?
Пад карканне варон — крыклівай зграі —
шапчу малітвы я ціхутка.

Каб шчасце у кутку маім вялося,
як птушка ценькая пад ветлым дахам,
каб хлеб і соль былі, а ўвосень
вятры не білі аканіцамі з размаху.

Каб сцерпіць абыякавасць чужыны,
суродзічаў пыхлівых холад думны,
патрыятычную іх сліну,
парадны тупат тлумны.

Каб пры канцы шляхоў маіх далёкіх,
што не ўскладаюцца ні ў вёрсты і ні ў мілі,
не помнячы грахоў і крыўдаў лёгкіх,
прыхільныя багі мяне благаславілі.

* * *

Вось і ноч. Як даўней — нікога.
Толькі чую ўжо — край зямлі.
Каб не бачыць шчасця зямнога,
адплылі назад караблі.

Перавозілі й будуць везці —
акіян глухі і нямы.
Стаў я кропкаю зноў на тым месцы,
што Зямлёю назвалі мы.

За спіною маёю горад,
здэцца, рыецца у зямлю.
Як спажытак штодзённы, гора
я за пазухаю тулю.

Пад'язджаюць. Бяруць. Адвозяць.
Толькі я, у цяплынь, у цішу,
Захінаюся, як на марозе,
прастудзіць баючыся душу.

Апусцела паволі прыстань —
што сказаць і куды пайсці?
Толькі неба маланкі хрысцяць
як сто тысяч год у жыцці.

## АКІЯН

Аб табе я меў думку не тую,
калі сніў пра цябе здаля.
Дзень і ноч ты ад злосці лютуеш,
праклінаеш сябе, што ты не зямля.

І ўсё пляжыць цябе адчай зняверы,
зелянееш ад роспачы ты.
Хвалі дыбяцца і, як пантэры,
з пенай кідаюцца на барты.

Пасланца зямлі — карабель не раструшчыш
і на дне прыспаць не змагчы.
Паднімаешся к небу — зялёны грузчык,—
аднаму табе страшна сярод начы.

Ты жывеш, як і мы, падманам:
так прывабна усё, што не ўзяць рукой.
Бунтавацца не хочаш ты акіянам,
мы ж не хочам кружыцца — зямлёй.

## НЕБЯСПЕКА

Вось так зірнеш на ваш натоўп —
тлум, шорганне, панель і спека.
Якіх нікчэмных душ патоп!
Якая жудасная небяспека!

Баюся, што нямая сінява
больш не зірне з-за камяніц-палацаў...
І вочы узнімаю я,
каб ні на кім не затрымацца.

Каб, уваходзячы у ціхасць сноў,
не дакранацца вашых душ і пальцаў,
каб у натхнёным адзіноцтве зноў
вас абмінаць і не спыняцца.

## РАСЧАРАВАННЕ

Наверсе тупацелі й бегалі злачынна —
маглі падлогу так працерці.
Як шафа у кутку з начыннем,
маўчаў я, цішыню пазнаючы у сэрцы.

І ў мой пакой дзвярэй не адчынялі
і не будзілі ў часе раннім.
Не задаволены сваймі чынамі,
я цешыўся сваім расчараваннем.

І толькі злёгку здрыгваўся у крэсле,—
вы так рэагаваць, вядома што, не звыклі.
У памяці маёй усё закрэсліў
прабег шалёны матацыклю.

І вуліцы ізноў, аглухшы, апусцелі,
і толькі за сцяной хтось плёхаўся у ванне.
Як добра, што яшчэ ў пасцелі
ёсць слодыч жудкая неіснавання!

## СМУТАК

Нядзеля, а свята
няма у душы.
А смутку багата,
як ілу ў кашы.

Зярно пэратрэцца —
і будзе мука.
А смутак у сэрцы —
як спеў жаўрука:

калышацца, смокча
і жалем звініць.
Душу, як драбочак,
ён хоча разбіць

на тысячу звонкіх
тужлівых званкоў,
і сыпкіх і ломкіх,
як іскры з падкоў.

Каб радасці болей
і ўцехі не меў,
ад смутку і болю
журыўся, нямеў...

Як быццам араты,
ўсё сыпліць із рук...
І падае раптам
з нябёсаў жаўрук...

...Ды зноўку засмокча,
жальбой зазвініць.
Душу, як драбочак,
зноў цягне, як ніць.

Угору і ўгору,
вышэй і вышэй...
Гавора й гавора —
цішэй і цішэй.

*1961*

## ЗДРАДА

Пражытыя мае не вінаваты дні —
з іх кожны адышоў, пакорны лёсу,
як той ваяк, якому ў мітусні
апошняй бітвы выйграць не ўдалося.

Вунь і цяпер тых дзён застылая чарга,
нібы на подступах, стаіць за мною
і, абяссіленая, як мага
завець мяне стаць перадам, а не спіною.

Ды днём пражытым страшна паказаць абліччa —
няма на ім ні мужнасці і ні адвагі.
І гэта здрадаю яны палічаць,
на помсту ўзняўшы рыцарскія шпагі.

## У ПУШЧЫ

Плюскоча уночы дождж ахвочы,
а ты ад слаты астыг.
Падскочаць на ўзбоччы, лапочуць,
лятуць, як пласты, лісты.

А пушча у гушчы ўсё нешта трушчыць —
памры на кары без пары.
— Расплюшчым пад плюшчам цябе,
невідушчы,—
памры без пары,— крычаць ведзьмары.

## ВОКАМГНЕННЕ

Любіць віцца бліскавіца,
іскраў з крэсіва накрэсіць.
Навальніцай асляпіцца,
як завесяць хмары месяц,
і упіцца, чарам быццам,
у час воўчы хто не схоча? —
Ля капліцы абпаліцца
і у ночы ўтапіць вочы.

## КАВАЛКІ ХОЛАДУ

Маланкай неба Бог хвастаў,
караў зямлю суровым прыгаворам.
Каб зноў у іншым вобразе паўстаць,
з вышыняў падалі ў прадонне горы.

Свет белы, як туманам, дождж замгліў,
апошні дзень, нібы тапелец, кануў.
Па ўсёй паверхні пераможанай зямлі
пайшлі разгневаныя акіяны.

Бог кропляю блакітнай сцёк,
свайго прысуду не адменьваў —
у цесных долах за жыццё
разыгрываўся бой каменняў.

Не йшлі яны ў бязвыхадны рукаў,
як людзі йдуць з паднятымі рукамі,
а кажны камень выхаду шукаў,
праходзячы праз іншы камень.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Спаўзлі ў даліну, згаслыя, яны
у нерухомым стройным стылі —
як быццам тут не камяні —
кавалкі холаду застылі.

## ВЯСНА

Тут ні палёў табе і ні лясоў, ні гаю,
тут перспектыва іншая і тон:
прастор — наколькі толькі вока дасягае —
замураваны у зялеза і бетон.

І тут і там, здаецца, без патрэбы
натоўпы небаскробаў — прывідаў жывых —
стаяць, высока ўрэзаўшыся ў неба,
як помнікі майстром, што збудавалі іх.

І ўсюды там, дзе чалавеку незаезна —
вышэй птушыных чорных зграй —
масты ўзняліся радугай зялезнай,
гігантамі сягнуўшы з краю і на край...

Бетон. Пясок... Ды што я? Пахне, мусіць,
на дошкі зрэзаная на двары сасна...
Сакавіковы дзень, і дзіву я даюся —
вылазіць із бетону й каменю вясна.

*1960*

## НА ВОЗЕРЫ МІЧЫГАН

Як добра на Мічыгане!
Бяздоннае неба, сонца, вада.
Харчы і гатэль — усё беззаганна,
каб толькі не сумная грамада.

Людзі ляжаць пад ветрам павеўным —
такая малеча, драбяза!
У Бога за іх, напэўна,
з жалю блішчыць сляза.

Захоплены кажны драбніцаю самай,
у шчасці маленькім кажны прыціх.
І робіцца страшна, што ты таксама
належыш да іх.

А хвалі шумяць і лёгкаю пенай
хлёпаюць ласкаю каля ног.
І толькі адзін я з песняй натхненнай
нешта далёкае ў сэрцы бярог.

Вось-вось нехта прыйдзе. Гэткі цікавы,
што ўсцешыцца раптам уся грамада.
І ўспыхнуць па-новаму ў промнях славы
бяздоннае неба, сонца, вада.

# РОЗДУМ

## БЕЛАРУСЬ

Нясмелы, думаю часцей употай,
мой дух заўсёды думкаю аднэй прыбіт:
ці, неразумная, не знаеш яшчэ, хто ты,
ці ты няспраўджаны яшчэ вякамі міт.

Я знаю — знойдуцца, што абгаворацць,
а можа, й праклянуць, ды ўсё дарма —
табе аднэй пажалюся я горам:
мне сумна, што ты ёсць, смяртэльна — што няма.

Другія славу сабе хутка лепяць,
а твой папар не ўзнятым шчэ ляжыць.
Было б не нараджацца табе лепей,
чым, нарадзіўшыся, не жыць.

Спяць акіяна твайго воды,
як сон, варочаецца імгла.
Нашто ж, скажы, між Захадам і Ўсходам
вачыма сінімі ты прарасла?

## ЗЯЛЁНАЯ ВЕЛІЧ

Гнеўнай славаю мы не паўсталі,
не для нас былі вякі —
залеглі мы нямымі пластамі
невядома на час які.

Туманом набіраліся далі,
гралі музыку камары,
ды зялёную веліч гайдалі
сосны гонкія угары.

Ліплі ў нашыя грудзі пікі
і лічылі смяротны час.
Толькі наш герой вялікі
не паклікаў на бітву нас.

На капцох не было нашай стражы,
нас тапталі, глумілі, клялі...
Я хачу, каб у нас былі нашы
імператары і каралі.

## ЛЯ ЦІХАЙ БРАМЫ

Я —
брамаў не люблю...
. . . . . . . . . . . . . . . .
У брамаў стынь, сутонь.
Пад брамамі — калек рыззё, нудзьга
ды ныдзь.
*Наталля Арсеннева*

Нам асуджаць усіх і ўсё не нова.
Прыемна долю гушкаць сібарыткай.
Не знаем мы, якога слова
сягоння хочацца душы пад світкай.

Пад гул літаўраў, бубнаў, лютняў
вядзём мы Бацькаўшчыну ўвесну, ўвосень.
А душ сваіх, як сытых трутняў,
на людзі паказаць мы баімося.

...А можа б, лепей не казаць: не варта —
няўпрыкмець, як пузыр дражджаны,
страшная нараджаецца пагарда
у нас, саміх вякамі пагарджаных.

Сяброў я страціў усіх чыста,
былых прыхільнікаў, прынамсі.
Бо не хаджу я на ўрачыстасць
у саматканай апранасе.

Аб Беларусь мы языкі счасалі,
бяссільныя, мы любім дужых,—
душа заходзіцца часамі
па грэшных і маленькіх душах.

Як цяжка жыць журбою чалавечай!
Шкада ўсяго нам — не душы забранай...
За ўсіх здаровых, за калек і ўвечных
я памалюся зноў ля ціхай брамы.

*1955*

## ЯК ПАМЯЦЬ НА ВУСНАХ

Калі-нікалі запішу
радкамі сваю душу
агрызкам алоўку
і зноўку я змоўкну.

За хатаю дрэвы мокнуць
і быццам просяцца ў вокны.

А я,— як на вуснах замок,—
узгрэтаю песняй замоўк.

Гляджу — і мой шэпат вусны
застаўся як памяць на вуснах,
лірычны, усхваляваны,
сягонняшнім днём датаваны.

*1959*

## МАЙМУ ВЕРШУ

...Ды ты ўсё яшчэ жывеш,
хоць ліхалецце, хоць пагроза.
А я паспеў, пакутны верш,
цябе ўжо прамяняць на прозу.

Радкі мае, я клікаў вас,
і, паслухмяныя, ішлі вы.
І доўга мой лірычны сказ
яшчэ не стыгнуў, варушлівы.

Зарэў, адсвечваўся душой
маёй, то сумнай, то узнёслай,
вячэрняй таямнічаю цішой,
чаканай, млоснай.

Цвіценнем белых ліп
і голасам пяшчотным маці.
Аж покуль на цэменце не ахрып
у строгім каземаце.

Аж покуль косткамі сваймі
у падзямеллі ты не хруснуў...
Адмалку, ад гадоў сямі,
са мной не кідаў ты хаўрусу.

Па Калыме і па вайне
і я і ты ішлі балесне.
І толькі па маёй віне
не ўсё ўпісалі мы у песню.

Але і так жыццём дыхнуць
на холад часу мае словы.
Бо холад той і лёд раскуць
яны заўжды былі гатовы.

Што б ні было, ты ўсё жывеш,
тугі, нацэлены і порсткі.
Імкні ж, імкні ж, мой сябра верш,
хоць пакрысе, хоць па напёрстку.

Не супыняйся на дарозе,
хоць і крывавіцца ўсё рана.
На неразмераную прозу
мяняць цябе яшчэ зарана.

*8.9.1962*

* * *

І з словам у душу не ўлезці,
не адгукнуцца ў ёй акордам:
радкоў тугія лейцы
нікога не вядуць за морду.

— Мы верым звеку ў Бога.
— Мы знаем — дождж ідзе із неба.
А больш не ведаем нічога,
і ведаць болей нам не трэба.

Але насцігну вас, нарэшце,
рабоў заспаных і закутых.
У душы вашы буду лезці
і з словам мёду і атруты.

## ГЕРАІНЯ

Я мала сплю цяпер і мала ем —
дарэшты ссушыць злыбеда такая:
герояў шчэ няскончаных паэм,
падобных да сябе, у свет я выпускаю.

Няма назойлівей за іх людзей:
— Я без крыві, а я хадзіць не ўмею.
Калі нас напладзіў — пацей!
Дай нам жыццё! — І я пацею,

жыўлю іх і гадую, як дзяцей:
— Бярэце вы мяне ўсяго і ежце!
Смакчыце мозаг із маіх касцей!
Расціце, нібы хлеб у дзежцы!

Варушацца, як чэрці ля мяне,
пакуль я укладаю план паэмы...
Аж тут, як сонца па вясне,
падсела нейкая: — Хадзем мы!

Кідай іх, брыдкіх і сухіх! —
і усміхнулася такім цудоўным вочкам!
Я на спакуслівую глянуў і прыціх,
пайшоў услед за ёю моўчкі.

## ЭЛЕГІЙНАЕ

Прылёг на сонцы я у сасняку,
падклаўшы пад шчаку руку.
За колькі год прыслухаўся да цішыні,

ды ў сэрцы не пачуў нічога я, ані,—
як бы хто налажыў пячатку,—
ні ўзруху радаснага ў глыбіні,
ні верша новага імгненнага пачатку.
Не закранула мова цішыні
у сэрцы радаснай струны.
Вятруга раптам наляцеў здаля,
і утрапёная зямля
дыхнула холадам, нібы з труны.
Закалаціліся сасонкі угары,
нібы спрасонку на зары.
Тугой завыў увесь сасняк,
і я не мог сябе ніяк
угаварыць, што то не скон,
што гэта толькі плача ён —
звычайна, як здавён.

## ПРОСТЫМІ СЛОВАМІ

Хочацца верш пачаць
самымі простымі словамі —
кашуляй з майго пляча,
шышкамі яловымі.

Бульбай і жытам густым,
закаханымі яе вачыма,
тленам, хатаю і ўсім тым,
без чаго жыць ніяк немагчыма.

Адарваўся калі ад грыў,
ад хвашчу, асакі на балоце,
я самога сябе марыў
на высокай ноце.

Да прыгожага рваўся, абы
не курэлі вершы лучынай.
Нават тыя словы забыў,
якіх маці вучыла.

А таго не ведаў ніяк,
што натхненнае слова проста
нараджаецца няўзнак
і свярбіць, як кароста.

На сцяжынцы зямной,
як маленства, нанова,
падружыся са мной
шчэ нікім не ўжытае слова.

## ЗАЙЗДРАСЦЬ

Я да славы чужое зусім не зайздросны,
але славы зрачыся не хацеў бы ні мала.
Я хацеў бы хоць так уваскроснуць,
як Максім Багдановіч, Колас, Купала.

Да багацця зямнога я не зайздросны,
хоць хацеў бы займець сваю хату,
каб над ёю шумелі сосны,
гналі спёку ценем кашлатым.

Да чужой маладосці я не зайздросны,
хоць хацеў маладзейшым бы стацца,
каб усё ж і ў наступныя вёсны
захапляцца зграбнай пастацяй.

Незвычайны міне мяне хтосьці,
страпянуся адразу я, млосны,—
Да жывога ўсяго й прыгажосці
я страшэнна зайздросны.

*1962*

# НА СПЫНКУ

## НЕ ЯВАЙ, А ВЕЧНЫМ СНОМ

Канчаецца ўжо маршрут,
а мне шчэ далёка дадому...
На станцыі колькі мінут
паравоз выдыхае стому

і зноў у дарогу, далей
да невядомага спынку...
Хіснуліся ззаду канцы алей,
і мы ўжо адкінуліся на спінку.

Чужога вялікага места рух
застаўся прыгожай уявай.
Ад грукату колаў ужо аглух,
а памяць аб ім шчэ яскравей:

жаночая стройнасць, вітрыны, дамы
і на падваконніках краскі,
развітванні, стрэчы... І толькі мы —
без стрэчы ў дарозе траскай.

І здрыгваешся суздром —
калісьці, на нейкім спынку,
не явай, а вечным сном
адкінемся мы на спінку.

## АДЧУВАННЕ НАЧЫ

Голле б'е зразмаху
                    па сцяне.
Дробны дождж па даху
                    сыпане.
Уначы ў пацёмку страшна мне.
Вецер злы на ганку
                    бахае дзвярмі.
Капае у банку
                    дождж слязьмі.
Мокра — што ты толькі ні вазьмі.
Ціснуцца баракі, шэрыя ў імгле.
Людзі-небаракі
                    спяць. А на стале —
міг — і маю свечку дождж залье.

* * *

Я кажны дзень паміраю
і ўсё жыву.
Веру у прышласць маю
і ў сіняву.

І спадзяюся: возьмуць
ангелы мяне ў рай...
— Трасіся на возе
і не памірай,

трэба шчэ доўга ехаць,
дый цяжка папасць у рай,—
гавораць мне ангелы нехаця,—
лепей не памірай!

## АДЗІНОТА

(З Рыльке)

Адзінота святая мая, беражы
свае скарбы усе, міражы
прамінулых часоў, такіх слаўных!
О, святая мая адзінота, ты
залатыя дзверы свае саматы
замыкай ад усіх цікаўных.

## З ГЕЙНЭ

У садзе прыгожым ранкам
гарнуліся да мяне наздзіў,
шапталі і гаварылі кветкі,
але я маўклівым быў.

Спачувалі і гаварылі кветкі
слязінкамі сінімі з-пад павек:
«Не злуйся на нас, сястрычак,
ты смутны, няўцешлівы чалавек».

## З ГЕЙНЭ

Яны мяне мучылі і злавалі
і сэрца спапялілі зусім
адныя сваёй нянавісцяй,
другія — каханнем сваім.

Яны і мой хлеб атруцілі,
атруту у кубак лілі, як дым,
адныя сваёй нянавісцяй,
другія — каханнем сваім.

Ды тая, якая найболей,
кваліла і дапякала усім,
нянавісцяй не гарэла,
як і каханнем сваім.

## ПАТРЫЁТЫ

Я не любіў ніколі патрыётаў,
бязгрэшных, новых фарысеяў.
Як зерне после абмалоту,
іх душы я на сіце дзён прасеяў.

Куслівая і здрадлівая заедзь,
каўчэг уратаваны ноеў,
яны сягонняшняе славяць,
да ўчорашняга павярнуўшыся спіною.

Я вызнаў іх, геройскіх і адданых,--
ад іх ушчункаў бегаў, апантаны.
І Бацькаўшчына на этапах дальніх
звaніла і ў мае кайданы.

Ды ўсё тады было мне нова,
хоць і стаяў, як на гарачым прыску.
Маім тады адзіным словам
было: і ныне й прысна.

Даруйце — не збярог для вас я
інакшых дум і слова.
Калі свяча мая пагасла,
я запалю яе нанова.

## «СЯБРОМ»

Так, так. Вядома мне, дальбог,
і вашае дабро, і вашае сяброўства.
Ваш гнеў і кліч да перамог
не йдзе далей пустога красамоўства.

Вы добрыя, як добра ўсё.
І кажны з вас сябе ўзвялічыў.
Вы важна ходзіце, як парасё
з паднятым і надзьмутым лычам.

Смяюся я за гэта з вас —
такою дрэняй шмат мяне душылі.
Як прыйдзе добры для вас час,
вы аддасцё мяне з вяроўкаю на шыі.

Тады ў другіх, каб жыць было зручней,
вы купіце спакой, і купіце вы згоду.
Не аднаго прадаўшы, як раней,,
зноў чэсна будзеце служыць народу.

## ТРЫБУНАМ

Дзе вы, трыбуны і натхнёныя прарокі?
чаму асекся голас ваш?
Часамі ўночы сню вас ненарокам,
жду прыйсця вашага, і вас нямаш.

Дні глуха падаюць гнілою грушай,
і раскай воды завалакло.
А хто сягоння нас агнём святым узрушыць,
а хто сягоння станіць на чало?

Як хто хацеў — так кажны з нас і тупаў
і заўтрашняга не разумеў ніяк.
на ўсіх дарогах нашага адступу
як помста ўпаў апошні наш ваяк.

А час у беззваротнасць кануў,
і толькі гойдаюцца кругі.
Крывёй сцякаюць у чаканні
апушчаныя сцягі.

Дзе ж вы, трыбуны і натхнёныя праpокі?
Чаму асекся голас ваш?
Вы толькі сніліся мне ненарокам —
нямаш.

* * *

Занадта ўсё да сэрца я прымаў —
нішто не зменіцца ні заўтра і ніколі.
Дарэмна ў свеце маіх зманлівых уяў.
я неба маляваў у змрочны колер.

Нашто таіцца — крышку дапяклі
мана сяброў і кплівы смех няздараў.
Без ветразяў мае стаялі караблі —
уздыхі іхныя яны вятром раздалі.

Сягоння ў сонечную цішыню
блакітным мігаценнем дзень спавіты...
А можа, гэта толькі ўсё яшчэ я сню
і вогкая вясна яшчэ не прарасла з-пад плітаў?

## ПАЛІТЫЧНАЯ ЭЛЕГІЯ

Нашто пайшоў за вамі я дарогаю цярністай
з узлётам дум і захапленнем юнака?
Як я цягнуўся ўвесь да вас душою прамяністай,
так у галоднага да хлеба цягнецца рука.

Я забываў на ўсё. Прайшлі гады няўдала.
У вёсцы без мяне вадой шумела гаць.
У полі пастуховая жалейка сумавала.
Я забываў пра ўсё, чаго ніколі нельга забываць.

Крывавых катаў час узвысіў над народам —
у сутарэнні жар душы мае не гас.
З краіны той, дзе ўсё пакрыта лёдам,
прынёс я жар душы — прынёс для вас.

А вы? А вы? Я праклінаю вас бясконца!
Стаю адзін, схіліўшы сумнае чало.
Вы толькі грэліся на тых праменнях сонца,
што вам насустрач вогненна ішло.

## НЕПАСЛУХМЯНЫЯ РАДКІ

О не, о не,— напэўна, не таму я
вас не люблю, камраты, «радакі»...
Вось і цяпер ніяк я не ўтаймую
непаслухмяныя мае радкі.

Яны бунтуюцца аддаўна,
хоць іх мірыў, гадзіў.
І як бы ні было: іх не аддаў я
на смех, на здзіў.

Спакойна дыхаюць яны і раўнаважна —
я забываю вас, камраты, «радакі»...
Чаму ж усё-ткі верш мой кажны
ўзрываюць непакорныя радкі?

* * *

Я з вамі быў і мог, як вы,
з усіх любіць сябе самога.
Схіленнем важным галавы
не выказаць паважнага нічога.

Я з вамі быў. Ды з вамі йшоўшы, пакрысе
цяжкой рабілася мая дарога:

такога, як і сам, як вы усе,
маленькага, нікчэмнага я нёс у сэрцы бога.

І я пайшоў ад вас. І незямнога
пазнаў святла я ззянне за гарамі,
адчуў я іншага у сэрцы сваім Бога...
Прабачце мне, што быў я з вамі.

## БУДУЧЫНЯ

*Эмігрантам*

Якая ты — не знаю я. Стаміўся,
чакаючы цябе... Не муч...
У неразгаданае б'юцца крылы-мыслі —
спыняе лёт іх вогкая, цяжкая муць.

Пладзіцца пакідаюць гусі вырай,
лятуць назад — у сіні свет...
— Скажы, паэт — прарок даўнейшы, шчыры,
што будзе?
— Гм-м...— Адказу не дае паэт.

— Што будзе — лепей ведаеце самі.
Змяшаеце мяне з гразёю напалам,
калі скажу, што дзесьці за гарамі, за марамі
без надпісу паставяць крыжык вам.

* * *

Адкуль жа будзе брацца і ў мяне
да вас любоў, спагада і замілаванне:
таксама, як і вы, я дыхаю адным —
сваім маленькім «я», зласлівым і зайздросным?

Адкуль жа будзе брацца і ў мяне
не толькі ў заўтрае, а ў сянняшняе вера —
у сянняшняе, як і вы, не веру я,
а заўтрашняе?.. Хто пра заўтрашняе скажа?

Адкуль жа будзе брацца і ў мяне
той гарт, якога вы не маеце і самі?

Ці, можа, думаеце вы:
з паэта — ўсё, а з вас — нічога?

Вас песняю бадзёрай пацяшай
і вас падтрымлівай на духу.
А сам? Ну, што належыцца табе,
калі на смутак — і на той не маеш права?

Як блізкія, як родныя і як свае
ці мы калі хоць раз пагаварылі?
Перад чужымі і перад сваймі
ці мы адны аднога ўшанавалі?

Адкуль жа будзе брацца і ў мяне
той дух, адвага і геройства...
Не, не — зняверыліся мы
ад доўгай і бясплоднай веры.

## ЖЫВЫ ЎСПАМІН

Засумаваў я па табе, радзіма,
па недаступнай па тваёй красе.
Кудысьці адыходзіш ты ўсё міма
і забываешся, даруй мне, пакрысе.

Цябе я пакідаў, я думаў, ненадоўга —
праз месяц, праз другі вярнуся зноў.
Але цягнік далей мяне ўсё тоўхаў:
як назнарок — назад не йшоў.

Я чуў — варочалася глуха
зацятаю вайной зямля.
У мітуслівa-неспакойным руху,
што мне рабіць — падчас не ведаў я.

Агнём твае мігалі вейкі
у суцемках за рысаю зямной.
Ты, хрысцячы мяне агнём, навекі
развітвалася сполахам са мной.

І сумаваў, і плакаў я, і верыў,
і гневаўся — іду без бітвы так.

Дармо, што я не быў жаўнерам,
я сэрцам вычуваў гарачыню атак...

Я пакідаў цябе да хуткага спаткання
і не збіраўся у дарогу назусім...
Цяпер шкадую, што на развітанне
«Бывайце» не сказаў усім...

*1960*

## З НОВЫМ ГОДАМ

Шлях — ад роднага парога.
Развітанне — дзве рукі.
Невядомая дарога,—
З Новым годам, землякі!

Перад намі толькі неба —
сіняе на ўсе бакі.
Болей нам, відаць, не трэба,—
з Новым годам, землякі!

Караблі сцягі палошчаць —
той такі, а той такі.
Слава Богу, сядзімо шчэ,—
з Новым годам, землякі!

Тупацелі нават крышку —
збіліся ў хадзе цвікі.
Вып'ем з гора па кілішку
з Новым годам, землякі!

Пра братоў, сясцёр распяцце
і пра лёс наш, пра які...
не, не буду ўспамінаць я,—
з Новым годам, землякі!

Не без Бога чалавекі —
пад зямлёю мерцвякі.
Так вітаюцца спрадвеку,—
з Новым годам, землякі!

*1949*
*Міхельсдорф*

## «МАСА»

Я рэдка падаючы падымаўся.
Пыталіся не раз: «А ты йдзе?»
Не дай ты Божа паказацца масе —
знявечыць, плюне і адыдзе.

Яшчэ бадай я на каленях поўзаў —
нахлыне гурт смаркатых і наклепе...
А месяц у трагічнай позе
стаяў на бестурботным небе.

Закінулі і з мінай поснай
гатовую да паядынку шпагу.
У вечнасць кануў чалавек апошні,
і вымерла на ўсёй зямлі адвага.

І ты разгневанай рукою
за меч памсліва не хапайся —
сыдзі блакітнаю ракою,
як цёплы дождж улетку на папасе.

## НОВЫ ГОД

Які ты ў чорта Новы год!
Будзь сапраўды ты Новым!
Вядзі у новы нас паход —
мы схілім прад табой галовы.

Ты ўсё стары, хоць одаў шмат
табе складаюць трубадуры.
А мы чакаем на загад,
як ветразі чакаюць буры.

А многа дрэмле ужо з нас,
зняверыліся ўжо і ссохлі:
музею б толькі напаказ —
крывыя, згорбленыя сохі.

Я зразумеў закон зямлі,
і тост я падымаю вышай:
не будзеш Новым ты, калі
мы самі Новы не напішам.

# СЛОВА

* * *

Мяне чакае небыццё,
забыт я буду светам.
Ідзі ж па-іншаму, жыццё,
я мог бы быць паэтам.

Блакітнай яркасцяй і све-
жасцяй, як пасля грому,
мой верш хвалюецца, жыве
назло сабе самому.

Жыве адзін сваім жыццём,
нікому не вядомым.
З маім здружыўшыся нутром,
начуе толькі дома.

На час, маўклівы і глухі,
ён знае, дзе танцуюць чэрці.
Сышліся ўсе яго шляхі
у пункце гібелі і смерці.

Але ў час буры і слаты,
калі імгла гусцее ночы,
падоўгу, з жартам, як браты,
глядзім адзін другому ў вочы.

І не палохае нас час —
на ўсё кладзем свае прыметы.
І цікавей яшчэ для нас.
што невядомыя мы свету.

*Менск, турма*

## НАРАДЖЭННЕ ПЕСНІ

Пасля дажджоў аднэй вясны
была цудоўная пагода.
Глыбокія тварыла сны
аб сваім будучым прырода.

Зямля і цеплыня начэй
з вільготнасцяй адзіным сталі.
І непрыкметна для вачэй
у садзе ружы падрасталі.

Цвіла вясна навокал нас.
Тады, у момант расцвітання,
маёй пакутнай песні час
паклаў пачатак існавання.

І песня ўзнала ўсё, што ёсць...
Ёй, калі росы ў травах стылі,
спяваючы пра маладосць,
дзяўчаты голас падарылі.

Я сэрца й розум ёй аддаў,
сябе ўсяго і без звароту,
каб з ёй над светам я вітаў,
гарэў адвагаю узлётаў

і ёю жыў. Няхай
мне з ёй не будзе развітання!
Агнём нястомным палыхай,
маё гарачае дыханне!

## СІНІЯ ВОЧЫ

Як цяжка да аматараў сягоння не належаць
і не запэцкаць ног чужою тванню.
О, як бы я хацеў рассунуць межы
майго зямнога існавання!

Праз вашу тоўшчу цёмную прабрацца,
як прабіраецца праз хмары бліскавіца,
і ў тысячы градацый
яшчэ й яшчэ раз нарадзіцца.

І вось з вачыма сінімі у ранні росным
раскрыўся васілёк на перавале...
А людзі йшлі і пазіралі скоса:
адны маліліся, а іншыя — плявалі.

## ВЁСЦЫ

Прыйшоўшы ў горад ад зямлі,
Не змог ніяк я ў ім ужыцца.
Як сына, вёска, прытулі
пад стрэхі саламяныя чужынца!

Даволі я стаптаў дарог...
Не, болей я цябе не кіну!
Няхай адзін дзядоўнік і мурог,
няхай адна прагорклая мякіна!

Ці ж я на ёй такой не ўзрос?
Пад шум дажджоў, глухі і немы,
затое жоўты мне авёс
прашапацеў свае паэмы.

Тугу, мой сціплы верш, адкінь!
Заўсёды сніся, маладое!
Каб верш злячыць, я строф радкі
паіў вячэрнім сырадоем.

І ў свет яму шлях не разрыт,—
глядзяцца ў вочы яму зоркі,
і адбіваюць строгі рытм
з дзяўчат найлепшыя танцоркі.

Я, адарваны ад зямлі,
нідзе ніяк не змог ужыцца.
Як сына, вёска, прытулі
пад стрэхі саламяныя чужынца!

*Беласток*

* * *

Звычайны я. Я славы не прыдбаў —
я толькі кропля ў акіяне.
Мяне сярод клапотаў і забаў
ніхто з патомкаў не памяне.

Я ціха дзень за днём жыву,
самотны я і нецікавы.
Іду адзін, схіліўшы галаву,
і міма воплескаў, і міма славы.

І скажа не адзін: — Яшчэ адна,
глядзеце, выпаўзла аблуда,
і голас падае, адроддзе дна,
і кпіць над нашым самасудам.

Дарэмна вы сказалі гэта —
з вас кожны сёння злосцяй дыша.
Хоць ціхі я, ды ўзлёт паэта
за вас, высокіх, многа вышай.

І мне б магло нясціся «брава»,
і мне б маглі зайграць музыкі.
Ды што мне гэтакая слава! —
Я сам сабе адзін вялікі.

## Я НЕ ПАЭТ

Я не паэт, калі душы маёй малітваў
не шэпча ў грозныя часы народ.
Я не паэт, калі расчуленыя рытмы
не плавяць абыякавасці лёд.

Я не паэт — не ўзнёсся я над часам,
наш век не задрамаў ў радкох маіх паэм.

Я не сказаў, адкінуўшы прыкрасы.
куды на хвалях мора мы плывем.

Я не паэт. Мяне нашчадак неахайны
разрэжа нажам папалам
і гляне: «Пеў ён аб каханні,
і не пакінуў ён нічога нам».

А я, дзівак, убіў сабе у галаў,
што знаны я, што я паэт.
Таго ж не знаў, што ціхі я і кволы,
капціў закопчаны другімі свет.

## СЛЕДАМ ЗА ПЕСНЯЙ

Каму ўсе радасці жыцця,
лірычных песень згукі,—
не для пацехі й забыцця —
мне песня дадзена для мукі.

Турэмшчыкі аднойчы на зары
забачылі яе: ад мукі —
стаіць, пакорлівая, на двары,
і ззаду звязаныя рукі.

Хацела стуль яна ўцячы —
і рвалася з-за крат акордам.
Але на допыце ўначы —
лірычную — пабілі морду.

Дапытваліся цэлы год,
гнілым кармілі шчаўем.
Ганяла, і балеў жывот,
але, каб выйсці — не пушчалі.

На суд павезлі — чысты змор,—
на лаўцы седзячы, яна самлела:
за здраду Бацькаўшчыне пракурор
патрабаваў расстрэлу.

Пакутвала яна, калі
без мяккага пад бокам
галодную пад лаўкаю вязлі
ад Мінска да Уладзівастока.

А там зноў шчасце — як каму.
І хоцькі ці няхоцькі,
яна плыла на Калыму
Японскім і Ахоцкім.

Страшэнна за дарогу падвяло,
і без харчоў і сілы
яна — хоць лезь ты у сіло —
на шахце тачкі поўныя вазіла.

Дармо: хоць білі у цішы
і пхалі нанач у задуху —
не выбілі з яе душы
і песеннага духу.

Ці йна была на Калыме,
ці ў камеры вільготнай, цеснай,
ці смерць была ў яе наўме —
яна была заўсёды песняй.

*1960*

## «ЖЫЖА»

Па вечарох, рвучыся з каленяў маці,
маленькім, я цягнуўся да «жыжы».
А «жыжа» — гэта была лучына,
што гарэла у нашай хаце.

— Сядзі спакойна,— гаварыла маці,—
і не рвіся, а то «жыжа» куся.

Я ж не слухаўся маці
і рукамі цапаў «жыжу» —
найпрыгажэйшую рэч у нашай хаце.

І напраўду, прыгожая «жыжа» кусала балюча,
і з тых пор зваць пачаў я «жыжу» кусяй.

Злез з каленяў я матчыных. Свет,
што заззяў за нашаю хатай,
пацягнуў мяне, як тая «жыжа»,
і пайшоў я у свет, недасяжны, далёкі.

Ён усімі сваімі фарбамі і колерамі
граў у сэрцы маім — і словы мае,
як маленне, ішлі насустрач свету.

І яшчэ я пазнаў у тым свеце нешта,
што рабіла яго яшчэ больш прыгожым,
гэтым «нешта» былі самі людзі —
найцікавейшыя рэчы у свеце.

Як да самай прывабнай «жыжы»,
пацягнуўся я да людзей — стварэнняў
міласэрных, і ціхіх, і боскіх.
І пра іх я пяяў у вершах лірычных
і — юнак — палымнеў самым чыстым да іх
каханнем.

Толькі як я шкадую, што ўжо маці болей
не было у дарозе са мною,
і яна, калі йшоў я да гэтай «жыжы»,
як раней, не сказала мне — куся!

## СЯСТРЫ

*Дар'і*

### I

Часамі і плачу і каюся,
а даль дажджамі імжыць...
Мне трэба казка якаясь,
каб мог я жыць.

Сэрца смыліць успамінамі.
І як мінулы успомніш час,
бомбамі, кулямі, мінамі
той узрываецца час.

І быццам з-за пераправы,
жывыя, нібы ртуць,
сумныя і яскравыя,
вочы твае цвітуць.

Мінулае, звон затонуты,
каб голас твой не заціх,

я ўсё шчэ масты пантонныя
кладу на рэках тваіх.

Нібы пад кулямі, ўпотай,
пад стрэламі залатымі дажджу,
і радасны і самотны,
па тых мастох у сне я хаджу.

Што ж? Я не плачу й не каюся,
адно толькі даль імжыць...
Мне трэба казка якаясь,
каб мог я жыць.

II

Сястра мая, даўно цябе не бачыў —
ад самага крывавага жніўя.
Балюча мне за ўсе мае няўдачы,
за ўсе мае грахі, што аплаціў не я.

Калі б не я, усё было б іначай,
я стаўся усяму віной:
жыццё сваё і ваша перайначыў,
і ўсё пайшло не тою стараной.

Яшчэ баі ішлі далёка,
а ўжо ў перадсмяротны час
страшней вайны аднекуль збоку
наш лёс насоўваўся на нас.

Адно другога ўсё трагічней,
і страшна — гора без турбот
збываў я песняю лірычнай,
замест каб стаць на эшафот.

* * *

Усё ізноў як і было —
дні вымераны цягнікамі.
Гляджу ў задымленае шкло,
на падваконніку апёршыся рукамі.

Няма ні хаты, ні турбот,
і выдаткованы актывы.
Ды ўсё ж прыемна ехаць напярод
наконта разагрэтага лакаматыву.

Усё ізноў як і было.
Не ведаю, куды і еду.
Утупіўся ў вагона шкло,
каб не глядзець на непрыемнага суседа.

Усё ізноў як і было —
дні вымераны цягнікамі.
Вакно і сажаю, і дымам занясло,
нічога не відно й не выцерці рукамі.

## БАЛАДА ПРА ТРОХ НАВАГРАДСКІХ ЖАЎНЕРАЎ

На захад яны не пайшлі —
на захад ісці не хацелі:
занадта прывабна гарэлі шпілі
на наваградскім касцеле.

Занадта любілі сваю старану,
хоць выказаць гэта й не ўмелі.
На трох толькі мелі вінтоўку адну,
дзявочыя хустачкі і шынелі.

Камраты далёка — палкі,
разбітыя, іх адступілі...
І толькі схіліліся васількі
пры жытніх дарогах ад пылу.

Камрацкіх сясцёр і бацькоў
адплатаю спалены хаты.
І песняй апошняй на векі вякоў
быў звон для іх служкі-лапаты.

Нічога з сабою не беручы,
апроч цярплівасці й веры,
у пушчы-лясы адступілі ўначы
тры наваградскіх жаўнеры.

З тых пор яны сталі легендай зямлі:
у кажнай былі яны бітве,
іх танкі і кулі прабіць не маглі,
дармо што іх шапкі прабіты.

Ім доля адвагу дала для душы,
сталёвыя латы — для цела.
Ні ўтомы не зналі яны, ні цішы,—
стамлёнасць ад іх адляцела.

І сумна зрабілася вельмі ім тром
ад бітваў, адвагі, геройства.
Ад нечага мучыўся кажны нутром,
паранены болем войстрым.

Напужаны вораг ад іх
кідаўся без бойкі наўцёкі.
Ад страху ён доўга не ціх —
на конях падковамі цокаў.

Хоць болей цяпер у паход
нат кулі не бралі з сабою,
усюды ім — быццам на звод —
дарогу ўступалі без бою.

І стала жыццё, нібы пекла, для трох
без рызыкі, славы і бітвы.
Маркоціўся кажны і сох
і толькі шаптаў малітву.

І доўга вось гэтак яны
блукалі па ўсёй Беларусі.
Блукалі, як хмары, як сны,
як быццам блукаць хто іх змусіў.

А потым замёр аб іх нават і слых,
і толькі прахожы мог лёгка адрозніць
адзін ля другога дубкоў маладых
пры наваградскай дарозе.

У горад радзімы вяла іх шаша,
ды ззаду спынілі іх нетры...
Гаворыць лістамі цяпер іх душа,
усцяж паслухмяная ветру.

*1953*

## ГАЛУБІНАЕ СЭРЦА

На дошчачцы вузенечкай —
не зваліцца ўніз абы —
пад страхою рана-рана
чысцілі свае забы

шызенькія — дзюбка ў дзюбку —
галубочак і галубка.
І міжсобку гаманілі,
што зрабіць ім трэба сяння.

— Крылле намачу я, абрасяню,
а злятаю на прасянне.
Можа, як зярнятак назбіраю —
цяжка жыць і нам у бедным краю,—

Так, усеўшыся на лубцы,
галубок сказаў сваёй галубцы.

— Трэ ляцець — пустая лубка,—
уздыхнула бедная галубка.

Бо ж ляжаць на сэрцы маткі
шчэ маленькія галубняткі:
вочкі — кропелькі блакітныя,
дзюбкі — просячыя роцікі.

— Дык ляці ж, прыдбай што-кольвек,
даражэнькі мой саколік.—
І на развітанне
па-птушынаму галубка
галубочка дзюбнула у дзюбку:
— Ранняя дарога — добрая пара,
хай табе ні пуху, ні пяра!

Галубочак пырх — і патануў у небе.
А галубка засталася з дзеткамі малымі.

Доўга ці нядоўга блукаў галубок,
колькі раз зірнуў ён у той бок,
дзе яго чакалі, галубка,—
невядома тое нам было —
памяць тую пылам замяло.

Там чакаюць яго ў хатцы —
галубку пара вяртацца.
Слава ж Богу, цэлы, жывы,
ён нясе для іх спажывы —
усяго, што толькі трэба.

Галубочак зноў вітаў у небе.
Прылянцеў — не трэ спажывы:
перабіты ўсе, няжывы.
Перакуленая лубка —
з галавой ад'едзенай галубка,
вечным сном галубяняткі
пазаснулі каля маткі.
Хтосьці злы, драпежны, дзікі
выпіў кроў і ўсе вантробы
палажыў на лыкі
для жалобы.

Высока ў небе лётаў галубок
тры дні. Маркотны, ціхі, без яды,
як сірата.
Хаваўся ён за сінявой
і падаў галавой,
біў прах зямлі,
чапляўся за шпілі
і зноў у неба ўзлятаў,
і доўга-доўга там вітаў:
здавалася, ён пакідаў зямлю —
прасянне, рэчку і раллю.

Тым часам людзі над ракой,
у неба ткаючы рукой,
паказвалі адзін другому галубка,
што ўзнімаўся ўсё вышэй — і так высокі —
за сіня-белыя аблокі.
Ледзь-ледзь відаць — і менш і менш,—
пакуль зрабіўся кропкай
у глыбіні нябёсаў —
сонечнай і топкай.
Яшчэ часінка, міг — замёрлі ўсе:
на дол, цвярды, як ток,
з нябёсаў, крылле склаўшы,
ўніз галавою падаў галубок.

Чым сэрца раз жыло,
успомніў ці аднойчы...
Ляжыць у пыле галубок,
заплюшчыўшы сівыя вочы.

Крылле — як патрапаныя рукавы,
і толькі дзюбка — цвярдзей мінералу.
Паволі, гарачае ад крыві,
галубінае сэрца ўмірала.

Сяння на аўсянні,
заўтра на прасянні
скок! скок! —
прамільгнуў у памяці галубок.

Было шкода людзям галубка,
малога дзіцяці быццам,
і міжвольна сама рука
цягнулася перахрысціцца.

*1953*

# АЧЫШЧЭННЕ АГНЁМ

## ЖАЛЕЙКА

Я зноў заснуўшую было жалейку
Бяру і пробую ў ёй галасоў:
Ці хопіць светлых, звонкіх думак-слоў.
Ці гладка пойдзе песня-дабрадзейка?

*Янка Купала*

Спрабую зноў крануць маю жалейку
пасля бясплодных столькіх год...
У час выгнанніцкі яна была мне лекам
і вызначала думак маіх ход.

Я з ёю йшоў сібірскімі шляхамі,
туліў за пазухай ад сцюж на Калыме.
Дзяліўся з ёю згадкамі і снамі —
і з ёю было цёпла мне.

І нат калі да скону было мала,
калі здавалася, што не сцярплю пакут,
што не загінуў я, ты думы высылала
у родны мой, бацькоўскі кут.

Прайшлі гады... Не знаю, як ішлі вы.
Ды толькі доўга, у чужой мне старане,
не дакранаўся струн тваіх чуллівых —
і ты пакінула мяне.

...Баюся зноў крануць сваю жалейку,
як быццам перад ёй у нечым вінават.
У сполаху й трывозе нейкай
настройваю душу я на ранейшы лад.

*Красавік, 1983*
*Баварыя*

* * *

Не дасягнуць, не ўзяць, не разгадаць:
што мела быць — хіба ўжо адбылося.
Як толькі ў вершах сум свой спавядаць —
нічога болей мне не засталося.

Жыву высокаю журбой,
тугой па тым, што не збылося.
Як толькі быць незадаволеным сабой —
нічога болей мне не засталося.

Адмецены віхурай часу, я
з эпохай нашаю не зросся.
Як толькі жыць сваім маленькім «я» —
нічога болей мне не засталося.

Без радасці, кахання жыць
сумней, чым адцвітанне ўвосень.
Як толькі век свой завяршыць —
нічога болей мне не засталося.

*Красавік, 1984*
*Глен-Коў*

## НАДЗЕЯ

Захоплены, я кожны дзень
сябе радкамі выкладаю,
хачу уваскрасіць, што ў самаце
мяне трывожыла гадамі.

Сяджу, гібею, каб радком
натхненне пераліць у форму.

Калісьці, можа, радаком
ён цеплынёй душу агорне.

І, можа, ўведаюць яны,
чым жыў паэта іх нязнаны,
пра ўзнёсласць дум, пра сны,
пра ўсе яго заганы.

Ды толькі ён хацеў ва ўсім
быць колькі можна дасканалым.
Няпоспех у жыцці сваім
прымаў з вялікім жалем.

Хвалююся, сумую і пішу,
натхненне пераводжу ў форму.
А мо калісь чыюсь душу
кране мой верш нерукатворын.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен-Коў*

## ЛЯМПАДКА

Гарыць лямпадка тут і дзень і ноч,
і кожны раз я пасля працы
завітваю сюды, апроч
калі сюды я не магу дабрацца.

Такая ціхасць тут і лагада
у гэтай чуйнай і малой каплічцы!
Хачу тут вечнасці паклон аддаць
і суму на часінку хоць пазбыцца.

Успомніць тых, якіх ужо няма,
пра самых блізкіх, пра сябе самога.
Слязіну пусціш ціхама
без крыўды на нікога.

Глядзіш, лямпадка свеціць як —
дрыготка, таямніча,
бы нейкі хоча выдаць табе знак,
шапоча табе нешта, кліча.

І ты стаіш, і свеціцца яна,
як краска жоўтая у ліпні.
Баішся толькі, што яна —
адзін мамент — і можа хліпнуць.

*Чэрвень, 1983*
*Глен-Коў*

## ГРЭШНАЯ ДУША

Быццё як скончу сваё я —
ад думкі я такой згараю,—
я ведаю, душа мая
не трапіць, грэшная, у царства раю.

Вялікі грэх ёсць у мяне,
і я жыву ў штодзённай скрусе.
Я спавядацца прад людзьмі — о не! —
за гэты грэх баюся.

Ці можа зняць яго рука чыя?
Ці адкуплю яго цаной якою?
Не хочу ў ім прызнацца я
нат прад самім сабою.

Празрыста-лёгкая ад саматы
блукаць пачне душа мая ў сусвеце.
Я ведаю, што не захочаш Ты
яе, бяздомную, прывеціць.

Ды, грэшная, наколькі сіл стае,
яна ўсё будзе у Тваёй арбіце.
І вечна у харомы светлыя Твае,
як матылёк яна ўсё будзе біцца.

*Люты, 1984*
*Глен-Коў*

## ДЗЁННАЕ

Як часта дзённае сцірае
святое у тваёй душы!
І заціхаюць згукі раю,
што слухаў ты ў цішы.

Хтось, нібы той чарвяк капусны,
абдаў цябе слюной-слатой —
і слова ўзнёслае на вуснах
замрэ, атручанае гаркатой.

Адчуеш зноў ты гвалту подых,
агорне цябе каламуць.
І ты ссутулішся і пойдзеш,
і ангелы ў душы замруць.

Ты абарваны на паўслове,
ды колькі б гвалту ты ні знёс,
усё ты слыхам сваім ловіш
заглушаную музыку нябёс.

*Верасень, 1984*
*Глен-Коў*

## СЯСТРА

І сталася. І адышла ты.
Нябёсы узялі цябе ад нас
у светла-праведную хату,
і для цябе свет гэты згас.

Пакінула ты ў ім пакуты,
і ў іншым свеце будзе ўжо лягчэй
спачыць свабоднаю, раскутай
пад светлым позіркам Яго вачэй.

Забудзеш мо аб сваім горы,
аб днёх, што шчасцем не цвілі.
Засвецяць табе сонца, зоры,
што не свяцілі на зямлі.

Ды ты зямное не забудзеш,
і светлінёю сваіх воч
усё, турботная, ты будзеш
глядзець адтуль і дзень і ноч.

Ці ўсё тут, што ты пакідала
не горай, чым яно было.
І вечна будзе йсці з аддаляў
твае журбы і дабрыні святло.

*Лістапад, 1983*
*Глен-Коў*

## АКІЯН І НЕБА

Вялікай караю, непаслухмяны,
у моманце якімсьці уразлівым,
калісьці небам быў ён пакараны
і на зямлі пакінуты ў сваім разліве.

Ваду ганяе акіян сваю і пеніць —
уздыхі чуем мы яго глухія.
У непадатлівасці, адшчапенец,
зрабіўся ён асобнаю стыхіяй.

Людской нагой не затаптаны,—
такая у яго патрэба,—
раз'юшаны і апантаны,
ён помстай пырскае у неба.

Як ні ўзнімаецца ён плёсам
і як ні прагне бунтавацца,
сваёю хваляй да нябёсаў
усё ж не можа ён узняцца.

І неба ад пачатку, ад вякоў,
з усёю пераможнасцяй сваёю,
ахутаўшы яго з усіх бакоў,
схіляецца над ім блакітнай вышынёю.

*Студзень, 1984*
*Глен-Коў*

## МОРА Ў ПАХОДЗЕ

Спакойна-лёгкае перад тым
(з гладдзю сіняю вод),
узнятае ветрам крутым,
сабралася мора ў паход.

Як на рэдут які,
хвалі, у шуме сваім,
зладжаныя, як палкі,
коцяцца строем адным.

І ўжо іх ніяк не суняць,
руху іхнага да жыцця.
Яны радуюцца, шумяць,
што ўзняліся із небыцця.

Спяшаюцца колькі моцы стае,
падганяючы сёстраў сваіх.
Духу ім паддае
мора высокі уздых.

Плешчуць, пырскаюць, змагары,
і не ведаюць шчэ пра тую жудзь,
што, як дзьмуць перастануць вятры,
яны, сцішаныя, памруць.

*Люты, 1984*
*Глен-Коў*

## ТАЯМНІЦА

Клён за вакном стаіць па леце,
яшчэ зялёна-жоўты і вячыст.
Ніяк я не магу прыкмеціць
той міг як адрываецца з галінкі ліст.

У цішыні здрыгнуўся, ветлы,
і ўжо у руху бачыш ты яго.
Як быццам хтосьці непрыкметна
пярстамі дакрануўся да яго.

Не ўбачыў я, як ліст адрынуў,
як страпянуўся у цішы.
Загадкавы той міг адрыву
як сполах варухнуўся у душы.

Як нейкі дух дыхнуў і сціхнуў.
І здрыгваўся я ўсёй душой,
што гэты дух мне непасцігны
у таямнічасці сваёй.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен-Коў*

## ПАЭТ

Паэту трэба йшчэ й уменне —
яно крыніца для яго другая.
Я не чакаю Божага натхнення —
у працы я сябе перамагаю.

Варушыцца няяснае ўяўленне,
і цесна мне, нібы ў якой задусе.
Прыходзіць да мяне натхненне,
калі — свабодны — я за стол саджуся.

Упэўнены, сабе я пачынаю верыць,
заходзяцца гарачай хваляй грудзі.
Радкі паспешліва кладуцца на паперу,
ды я не ведаю яшчэ, ці з іх што будзе.

Аж покуль думкаю імгненнай, яснай
цябе тваё тварэнне не азорыць.
І ты ў хвіліне гэтай шчаснай
сягаеш, радасны, да зораў.

Цяпер ты сам сабе і ўсё далёка,
увесь ты — чуйнасць і імкненне.
І скончыў ты, і табе лёгка,
і верыш ты у Божае натхненне.

*Студзень, 1984*
*Глен-Коў*

## АТАМ

Над чалавецтва сіратлівай хатай
навіс наморшчана-пануры атам.

Стаіць у свету уваччу ён,
свет нюхам яго сваім чуе.

Замёр, стаіўшыся. Баіцца
у вогнішчы ягоным спапяліцца.

Скавала сіла атама нямая.
Свет рукі ў неба узнімае.

Ды што, якая ў тым патрэба,
калі глядзіцца атам з неба.

Наморшчаны, маўклівы, хмуры,
гатовы выбухнуць віхурай.

Над светам грэшным, вінаватым
запанаваў няўмольны атам.

*Жнівень, 1983*
*Глен-Коў*

## АКІЯН

Заткнуў мне вушы акіян
сваім няспынным гулам.
Ад спёкі тут я акрыяў
і скончыў дзень прагулам.

Не выдумаў я ні радка
і ўсё хадзіў па пляжы.
А ты чагосьці наракаў
і ўсё у бераг пляжыў.

Пясок прыбоем мокры цёр
і хлюпаў пенай пад нагамі.
Нябёсаў найблакітнейшы шацёр
дзень распасцёр над намі.

Ляжалі ў розных позах мы
і не саромеліся дужа.
З канца ў канец, нібы дрыўмі,
людзьмі быў пляж загружан.

Увесь ты дзень у самаце
каціў навалу за навалай.
Раз'юшаны, нібы хацеў
нас змыць магутнай хваляй.

*Жнівень, 1983*
*Глен-Коў*

## 70

Мне 70. Хацеў бы я,
каб гэта быў не я.
Не я, а іншы хтосьці,
а я ўсяго — пабочным госцем.
Няхай усе прамовы і ўсе тосты
прымаў бы на сябе той «хтосьці».
Я толькі прывітаў бы Ягамосцю,
як і належыцца запрошанаму госцю.
З усмешкаю — дыпламатычны ход —
падцягваў бы яму і я «Сто год».

*Глен-Коў*

## ЗАСМУЧАНЫЯ ГОРЫ

Нібы ў нейкім адвечным горы —
праз усе вякі і гады —
у глыбокіх маршчынах горы
засмуціліся назаўсёды.

Над чалом іх, задумным, голым,
клубяць, варацца хмары.
Мне ж здаецца, як я, невясёлы,
яны ўсё пра штосьці мараць.

І як быццам усё нязгодны,
што яны ў паднябеснай высі

праз усе вякі і годы
без нікога адны засталіся.

Як маланак агні агнявыя
сінім бляскам чало іх адорaць,
у здзіўленні яны, нямыя,
як, прачнуўшыся, загаворaць.

І заціхнуць зноў пад цяжарам,
намаршчыняцца ў задуменні.
Па адхонах іх толькі хмары
прабягаюць, як цені.

*Красавік, 1983*
*Баварыя*

## ВОСЕНЬ

Цяпер на бацькаўшчыне ўжо марозы
кладуць узор на ранішнім лядку.
Падпаленыя восеняй бярозы,
усцяж гараць на бальшаку.

Мне, босаму, не страшна, што я босы —
скачу па маразянай траўцы шчэ валей.
Здаецца мне — як гляну на бярозы,
ад полымя мне іхнага цяплей.

У полі бацьку я ў падмозе,
гляджу жывёлу, бульбіны пяку.
І ўсё гляджу чамусьці, як бярозы
гараць на нашым бальшаку.

Я восеняй жыву ў трывозе,
забудуся, ды зноў кране:
падпаленыя восеняй бярозы
гараць пякучай ранай у мяне.

*Верасень, 1983*
*Глен-Коў*

## АГОНЬ

*Зоі Юр'евай*

Праз усе малыя годы,
пакуль не выпадзе снег,
хлапчукамі, у кожную пагоду,
мы вадзілі коні на начлег.

Апранутыя у армякі суконныя,
на ўвесь час мы аддаваліся дню.
Не было такога, каб увосень на полі з коньмі
мы былі без агню.

Агонь у нас, прастарэк,
не зводзіўся ніколі:
без агню ты не чалавек,
без агню ты не конюх.

Для канюховага шчасця,
канюхам, нам змалку,
каб агонь раскласці,
давалі запалкі.

Ляпей, чымся ў якую калатню,
мы мелі звычку —
як у прыгожую гульню,
гуляць у сярнічкі.

Нібы тую пстрычку,
на сваю галаву,
запускалі сярнічку
у сухую траву:

мы глядзелі, як долам сухім,
як бы за нечым наўздагон,
паглынаючы ўсё на шляху сваім,
бег агонь,

пахопіста, віхрыста,
клубком, з падскокам,
шыпеў агніста,
каціўся бокам.

Поўніліся мы відовішчам тым,
дзівіліся Богу агню, што яго ўсчаў.
Агонь для нас быў нечым святым —
душы нашыя прычашчаў.

Распальвалі яго мы ўначы,
каб цемра не лезла на нас.
І не палохалі нас сычы,
пакуль агонь не гас.

Лежачы на мурожнай пасцелі,
нібы на цуд які,
задуменна глядзелі
на пакрытыя попелам вугалькі.

І зноў падкідалі
смалякі-карчы,
каб цемра не наступала,
каб нам было весялей уначы.

Дзівіліся мы, як канала
на агні суччо з хмызнякоў.
Агнём мы адганялі
ад коней ваўкоў.

Баяліся яны, калі
іх агартала сутонь,
і задаволеныя былі,
калі бачылі агонь.

А найгорай малым: ім капцы —
аддаюць яны яшчэ дань матчынаму
малаку.

Яны, сасунцы,
нічога зрабіць не могуць ваўку.

Учуўшы ваўкоў гайню,
у трывожны час
яны прыходзілі да агню
і клаліся каля нас.

...Шугае ўсю ноч агонь,
каб агонь не знік,
водсветы кідае на аблонь
агонь — вартаўнік.

Світае. Гарацъ смалякі,
і каб дахаты ехаць цяплей было,
мы забралі у армякі
ад вогнішча нашага цяпло.

Запарошваюцца сляды —
можа, згасне агонь, перастане бліскаць?
От жа не! — калі вернемся зноў сюды,
агонь будзе — у прыску.

*Люты, 1984*
*Глен-Коў*

## ЖАНОЧАЯ ПРОСЬБА

Ты паглядзі, які прыгожы свет!
І паглядзі ты на пргожых нас!
Чаму ў вачох тваіх агонь пагас,
прыціхлы наш паэт?

Заўсёды стрыманым ты быў, але,
спакушаны, ішоў за намі ты.
Ты маладзеў ад нашай пекнаты,
і не было задумы на чале.

Мы жыць не можам без тваіх
узвышаных, натхнёных слоў.
Пяяў ты нас. Цяпер заціх.

Пакінутых, нас паглынае муць.
Настрой ты ліру сваю зноў
і вечна з намі будзь.

*Снежань, 1983*
*Глен-Коў*

## ПАТРЭБА ПАДМАНУ

Баюся, што цябе я разлюблю,
і мне прыгожага падману больш не застанецца,
і радасцяй заціхне біцца сэрца,
і буду, як раней, я ў крыўдзе на зямлю,

што Небам адпусканыя мне дні —
шчаслівыя — ў мяне яна заўсёды забірала.
Узнёслых дзён кахання было мала,
і жыў нядоўга я у царстве святліні.

Баюся, што разбуру вобраз твой,
як чар яго ў мяне аслабне.
І жыць тады я не змагу табой,

а чым я буду жыць, скажы ты мне, тады?
Я толькі, заварожаны табой, прывабнай,
магу ўратаваць сябе ад саматы.

*Снежань, 1983*
*Глен-Коў*

## ЛЕДА

Няўцям, само сабой, без згоды
старым, прывычным следам
бог Зеўс царовай жонкай Ледай,
у лебедзя ўвайшоўшы, авалодаў.

Купалася яна адна-адзінай,
і ён, угледзеўшы, плыў звабна, ўмела.
Яна ж пужалася і млела,
калі крылом ён датыкаўся лебядзіным.

Схіляў лагодна шыю перад ёю
і атуляў усю яе, нібыта снамі.
Рабілася яна слабою

і не было ўжо сіл для супраціву.
Абвіўшы шыю лебедзя рукамі,
забылася яна ў няпамяці чуллівай.

*Снежань, 1983*
*Глен-Коў*

## СВЯТЛО І ЗМРОК

На сонца заглядзеўся я —
мне сонца асляпіла вочы.

*Максім Багдановіч*

Святло мяне навекі паланіла,
што йшло ад сонца, і за ім ў дагонцы,
зачаравана ягонаю агністай сілай,
я ўсё жыццё ішоў насустрач сонцу.

Змрок вочы мае коліць, раніць,
я цемры змалку йшчэ баяўся.
І калі сонца узнімалася уранні,
святлом істота напаўнялася мая ўся.

Ішоў насустрач дню, што мне прыносіў
цяпло, і радваўся, захоплены, душою,
яму ўсё падстаўляючы зажмураныя вочы.

Ды наступіла непрыкметна знекуль восень,
і калі некалі насустрач дню ішоў я —
іду цяпер, ссутулены, насустрач ночы.

*Красавік, 1984*
*Глен-Коў*

# УЯЎЛЕННЕ

Усё палымней і яскравей —
ніяк не згасіць іх, ані,—
зіхцяць у маёй уяве
далёкага места агні.

## УЯЎЛЕННЕ

Хвіліны ідуць за хвілінай.
Начная варушыцца муць.
Мне лепшых хвілін успаміны
ніяк не даюць заснуць.

Усё палымней і яскравей —
ніяк не згасіць іх, ані,—
зіхцяць у маёй уяве
далёкага места агні.

У залі, асветленай зырка —
(усё — як пад белую косць),
натхнёна іграюць музыкі —
захопленасць, смех, весялосць.

Там пары ў салодкай стоме,
нібы ў ап'яненні якім,
то йдуць, то стаяць нерухома,
то кружаць паркетам слізкім.

Знываюць у жарсці-хаценні,
ўпіваюць духмянасці плын.
І толькі я ў задуменні
сядзеў маўкліва адзін...

Усё палымней і яскравей —
ніяк не згасіць іх, ані,—
зіхцяць у маёй уяве
далёкага места агні.

*Травень, 1983*
*Глен-Коў*

## ВЕНЕЦЫЯ

*Валерыі Філіп*

Галубоў галубіная сварка.
Колькі іх, галубіных чубоў!
На плошчы Святога Марка
карміла ты з рук галубоў.

Шызыя, яны аблятал,
шызую, цябе вакол.
Узнімаліся і злятал
на калені твае і на дол.

Не, не есці яны прасілі —
хоць ёсць звычай у іх такі,—
ім хацелася з усёй сілы
твае толькі дакнуцца рукі.

Яны лётаюць верхам і нізам,
колькі моцы у іх стае...
Як той голуб, хацеў бы, шызы,
я злятаць на калені твае.

І з прыручанасцяю хатняй,
нібы голуб які,
па-галубінаму, далікатна
браць зярняты з твае рукі.

*Верасень, 1983*
*Глен-Коў*

## МОЯ LORELEI

> Ich weiss nicht, was sol es bedeuten,
> das ih so trauzig bin.
>
> *Heinrich Heine* [1]

Ёсць месца такое ў лесе,
з ім можа зраўняцца рай.
Там, на Палессі,
жыве мая Лёрэляй.

Як тая казуля
між сініх азёр,
у зрэбнай кашулі —
палескі узор.

Як нас разлучыла ліха —
таму ужо колькі год,
над Прыпяцяй плаўнаю, ціхай
гарыць задуменна заход.

Гадаючы ўсё аб нечым,
на бераг, дзе бору край,
самотная, кожны вечар
прыходзіць мая Лёрэляй.

Сама не свая такая,
як бы на якую бяду,
яна мяне ўсё гукае —
а мо да яе я прыйду.

Стаіць у прасторы сінім
і моліцца ўсім святым,
ды голас яе бяссільны
вяртаецца рэхам пустым.

Рака пачынае хліпаць,
хвалямі біцца ў край.
Баюся, што кінецца ў Прыпяць
мая Лёрэляй.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен-Коў*

---

[1] Я не ведаю, што б гэта значыла, што я такі смутны.

*Генрых Гейнэ*

* * *

Ты падабаешся ўсё мне,
ды болей да цябе я не імкнуся:
ў душы маёй, як на струне,
ты адзвінела назаўсёды, мусіць.

Штось згасла ў вобразе тваім,
што так мяне і чараваў і вабіў.
Каб я не думаў пра цябе, не сніў —
хвіліны не было такое, мабыць.

Цяпер не той душы мае парыў,
ён не ўзбуджае пламню асалоды.
А мо цябе я сам стварыў,
і ты была такой, як ёсць, заўсёды?

Не, не — цябе я ўсё люблю,
кагосьці мне любіць — патрэба.
Люблю цяпер цябе, як зямлю,—
калісьці я любіў цябе, як неба.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен-Коў*

## ТЫ

Ты ў сне прыходзіш да мяне,
ды толькі несапраўдная якаясь.
Зірнуўшы строга на мяне,
ты некуды няўцям знікаеш.

Я чулы да твае хады,
і хоць у гэта цяжка даць мне веры,
здалося сёння, што ты сапраўды
пастукалася ў мае дзверы.

Пахопіста наніз я збег,
каб адчыніць табе мае затворы,
ды не было ужо цябе —
і толькі на парог зляталі зоры.

Глядзеў яшчэ я доўга у вакно
на рух загадкавы сусвету
і думаў: можа, ты калі
прамчышся прада мной каметай.

*Ліпень, 1983*
*Глен-Коў*

## РАМАНС

Вы дзесьці ёсць, і мне маркотна,
што тут, далёкіх вас, няма.
Тых летніх дзён, такіх спякотных,
сустрэчаў тых цяпер няма.

Калышацца між намі мора,
і рук ахвочых поціску нямаш.
Зацягнутая сінявой прастора
хавае смутны вобраз ваш.

І толькі штось гавораць вочы,
то радасныя, то з журбой.
Як быццам нешта мне прарочаць,
спакусай цягнуць за сабой.

Няма вас тут. Пастацяй зграбнай
чаруеце — адна любосць.
Хоць вас няма, ды мне прывабна,
што ўсё-такі вы дзесьці ёсць.

*Лістапад, 1983*
*Глен-Коў*

## НА ПАЛЯВАННІ

На ўзлессі лісце жоўтае ільсніцца.
Там зважліва, каб не параніцца,
ляжыць, скруціўшыся, лісіца
на выгрыве халоднай раніцай.

Ляжыць і паляўнічых не баіцца,
як на далоні — вось яна!

Сапраўдная лісіца
позняй восеняй.

Я падыходжу з стрэльбай блізка
і ўжо гатовы цэліцца —
ляжыць, спакойная, з прыгожым пыскам,
з хвастом — нібы гарачая мяцеліца.

Падумаў я: «Ну, вось жа годзе —
аддасца стрэлам там, за гумнамі,—
глядзіцца на мяне, нібы з стагоддзяў,
і вывучае, вумная.

Відаць, дазналася, як быў я блізка,
што я не ўмею цэліцца:
ляжыць, спакойная з прыгожым пыскам,
з хвастом — нібы мяцеліца.

*Кастрычнік, 1983*
*Глен-Коў*

## ПРАРОЦТВА СІВІЛАЎ

Я не ведаю, якая сіла
у маіх сівілаў.
Але толькі мае сівілы
мяне ссівілі.
Трапіў я да іх, як у нерат,—
яны ўсё прадказалі наперад:
і калі я, і як нараджуся,
у якім кутку Беларусі,
і ў якім нат адзенні,
і што будзе пасля нараджэння.

І калі я прыйшоў на свет гэты,
яны поруч сядзелі, старыя кабеты.
І, спагадныя, на картах расклалі
мой жыццёвы шлях да найменшай дэталі.
І ў пялёнках яшчэ,
сваёю спіною,
вычуваў я, што будзе са мною.

5 Зак. 984

Клалі лёс мой сівілы на шалі,
зелле нейкае мяшалі.

Усё чыста збылося, што яны прадказалі.

Ах, мае вы сівілы,
вы мяне ссівілі:
з нейкай сілаю незямною
прадказалі, што будзе са мною.

Слоў хвалы для вас у мяне не стае,
больш люблю вас, багіняў чымся.
Прадраклі вы ўсе беды мае,
толькі як не сказалі ад іх ўберагчыся.

*Снежань, 1983*
*Глен-Коў*

## ЧУЖЫНА

Усё роўна — іду я ці еду —
не застанецца тут майго следу:
буду змыты чужою хваляй,
нада мною што запанавала.

Я аглушаны чужою гаворкай,
незразумелаю, агорклай.
Як непатрэбную якую,
зразумець ужо не спрабую.
І што б дзе хто ні галёкаў,
застаецца яна далёкай.
Бы з сабою у змове,
думаю толькі ў сваёй роднай мове.
У душы маёй не слабее,
цэлы свет стварыў з яе я.
І сяджу я ў гэтым свеце,
як на іншай планеце.
Між людскога прыбою
застаюся самім сабою.
У самоце такой пякельнай
існую, нібы паралельна:
свет ідзе дарогай сваёю,
я таксама — сваёю.

Свет праносіцца міма
прад маімі вачыма.
У шматфарбным такім —
сузіральнік я толькі ў ім.

*Люты, 1984*
*Глен-Коў*

## «DEAD END»

Жыву я ў багатым пасёлку,
наладжана ўсё тут як след.
Пайсці я хачу па зёлкі,
ды бачу я ўсюды «Dead end».

«Dead end» — гэта значыць дарога
канчаецца, ходу няма.
Зірнуўшы на знак гэты строгі,
іду я назад ціхама.

Ды мне не сядзіцца ў хаце —
дарогаю іншай іду пад абед.
Ды зноў — як якое закляцце —
трывожнае бачу «Dead end».

Хаджу я вось так у сумлеве,
не дапамог і сусед.
Направа іду ці налева —
усюды мігціцца «Dead end».

*Чэрвень, 1983*
*Глен-Коў*

## АДКАЗ НА ЗАПРАШЭННЕ

Прыслалі ў хату звесткі нам
з усімі дадзенымі аб пагосце —
відаць, як новым жыхарам —
дзе мы злажыць маглі б таксама свае косці.

І помнікі у розную цану
нам прапануюцца пры гэтым.

Якую хочаш выбірай труну —
у кожнай будзеш ты дагледжаным, прыгрэтым.

Што будуць адпяванне і званы,
што можна пры жыцці замовіць дамавіну,
што будуць нават Там яны
служыць табе у кожную часіну.

І шлюць мне найпадданейшы прывет.
Падумаць, сапраўды спакуслівыя ўмовы.
Ды ўсё ж, разважыўшы як след,
прыняць я іх не быў гатовы.

Сабраў маршчыны на сваім ілбе
і напісаў такое я тым асам:
«Трымайце гэта ўсё вы пры сабе —
Я не збіраюся ўміраць тымчасам».

*Ліпень, 1983*
*Глен-Коў*

## БЯГУН

Па вуліцы бяжыць старэнькі чалавечак,
ён практыкуецца у бязе.
Ён думае, што гэтым сябе лечыць,
і ўсё бяжыць — аж колькі яму ўлезе.

Пагляд яго няпэўны і трывожны,
яму займае дыхавіцу.
Ён агаліў сябе наколькі толькі можна,
хоць там ужо няма чым пахваліцца.

Матляецца і кулачкі сціскае,
ад поту выцірае лобік.
І апаноўвае журба якаясь
увесь ягоны воблік.

Пот залівае яму вочы,
ды, не зважаючы на пот і працу,
бяжыць натужана, як быццам хоча
у маладосць прарвацца.

Ды ёсць у свеце рубяжы,
адлівы ёсць, і ёсць прылівы.
З якой ты моцай ні бяжы,
няма туды прарыву.

*Травень, 1983*
*Глен-Коў*

## РАЗЛУЧАНЫЯ АКІЯНАМ

Званю... Няма... Забыла...
Праз акіян дарэмна я напружваў слых.
Запырскаў ён срабрыстым пылам
на беразе расстання нас, дваіх.

І пагасіў у сэрцы прысак,
што ў нас яшчэ з табою тлеў.
А я ўсё веру ў тваё прыйсце
і выганяю з сэрца свой сумлеў.

Званю і думаю, што, пэўна,
мыляюся твой нумар набіраць.
Спрабую зноў і зноў, няпэўны,
ды голасу твайго мне не чуваць.

Загойданы, нібы калыскай,
знікае аб табе ўсялякі слых.
Знаць, назаўсёды акіян запырскаў
на беразе расстання нас, дваіх.

*Май, 1984*
*Глен-Коў*

## КРОСНЫ

*Памяці маці маёй прысвячаю*

...Не спачыне і не пpыляжа:
перад Вялікаднем, у час посны,
за зіму напраўшы пражы,
маці ткала кросны.

З апаўночы да раніцы, пакуль не праясніцца —
каб было на сарочку і на світку,
усю Піліпаўку за прасніцай
выцягвалася на нітку.

Яшчэ былі мы ў пасцелі,
сну нам было йшчэ не годзе,
а яна ўжо за кудзеляй —
нітку выводзіць.

Трэба ж паспець да раніцы —
днём будзе праца іншая.
З бацькам яна радзіцца,
заўсёды увішная.

Як бы чмель які ўсё адно
ці струна якая,
чулі мы у сне, як верацяно
у руках яе спявае.

Раніцою глядзелі, як яна,
схіліўшыся набок,
пражу з верацяна
зматвала на клубок.

Матляўся на столі сцень
ад матчынай рукі.
Досвіткам кожны дзень
раслі клубкі.

Як дар найбольшы які,
дбайна клала іх у куток.
Былі там клубкі
на аснову і ўток.

І з тых вось клубкоў —
бегатні было нямала —
у парожняй пуні на калкох
кросны маці снавала.

Ды такімі яшчэ іх не кінеш,
трэба потам яшчэ абліваццa:
каб былі яны мяккімі,
пранікамі пярылі на лаўцы.

Потым яна праз два ніты
прапушчала канцы асновы,
каб увесь гэты фонд залаты
для навою быў гатовы.

Клопату не абярэшся —
асцярожна, памалу,
кросны, нарэшце,
на навой навівала.

Болю як бы не чутно,
як бы ўскрослай,
радая ткаць палатно,
садзілася за кросны.

Нітка стане якая тугой
і парвецца — яе вяжы.
То аднэй, то другой нагой
наступала на панажы.

Слізкі, смоўж, маўляў,
з пражаю на ўток,
направа і налева слізгаў
у разяўленым зеве чаўнок.

Хадзілі рукі яе
то ў адзін, то ў другі бок.
Цэлы дзень — колькі сілы стае —
ганяе яна чаўнок.

Адпусціць навой, разаўе,
і было нам відно:
бы з-пад курыцы — з-пад яе
выходзіла палатно.

Зморанасці на твары цень —
сядзіць жа, сагнутая ў крук.
Наткаўшы за цэлы дзень,
не чула ад набілак рук.

Ночы такой не міне,
каб, як і наяву,
палатно і ў сне
не йшло праз галаву.

Заставалася яшчэ адно:
пакуль чалавек жыве,
суровае палатно
выбеліць на мураве.

Баліць ці не баліць,
вясёлай ці ў журбе,
палотны бяліць
насіла на сабе.

Нібыта ў якой журбе —
ці доўга йшчэ будзеш жыць —
спяшалася сабе
кашулю на смерць пашыць

з працы і рупнасці сваёй,
з чаго жыве чалавек,
з таго палатна і з пражы той,
што прала яна свой цэлы век.

*Сакавік, 1984*
*Глен-Коў*

# А ЧАСУ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЕЧНАСЦЬ

## ЗАМАЛА ЧАСУ

Быў малады і думаў, што ў мяне
наперадзе ёсць часу больш, чым вечнасць,
што час не скончыцца, не праміне —
бяздумна жыў я і бяспечна.

Маёю школаю былі загон, папас,
і розум мой не біўся над загадкаю сляпою.
Я верыў — прыйдзе мой жаданы час
і станецца, што мае быць, самім сабою.

Не ведаю, ці сталася яно, ці не,
а толькі я пайшоў дарогаю сваёю,
а толькі йсці нялёгка было мне
дарогаю сваёю тою.

Усё адкладваў я на потым, на пазней
і не спяшаўся здзейсніцца радкамі.
Яны губляліся, адвольныя, у сне
ды зноў прасіліся ў мяне начамі.

Іх запісаць не давялося мне
у той, што жыў я, паняверцы.
Я думаў — гора праміне
і зберагу я іх у маім сэрцы.

Ды час прайшоў — я не заўважыў як...
Відно цяпер мне без прыкрасаў:
таго, што я хацеў, я не зраблю ніяк —
страшэнна мала засталося ў мяне часу.

*1988*

* * *

З вітком гадоў ступаю ўсё цяжэй,
як бы ўзбіраюся я на гару.
З вітком гадоў раблюся ўсё цішэй,
не палымнею сэрцам, не гару.

Іду, ўзбіраюся і за спіной
увесь набытак свой нясу.
Нічога не пакінуў за сабой —
усё узяў: няўдачы, роспач, сум.

Нясу ў душы сваёй адбітак з'яў
і следу не пакінуў на сяўбе.
Адважны, змораны, з сабой яшчэ я ўзяў
найбольшы і цяжкі цяжар — сябе.

І найсвяцейшае, што я нашу,
што выбраў я з усіх праяў,
жывіла, наталяла што душу —
я неразлучнае са мною слова ўзяў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ну вось я й на гары. Ляжыць
увесь мізэрны мой набытак, што я нёс.
І думаю: ці варта гэтым было жыць?
І стала мне шкада сябе да слёз.

*1988*

## СЭРЦА

*Жывеш нядоўга, чалавек,*
*перажыві ж умомант век.*

*Максім Багдановіч*

Я вінаваты прад табою, сэрца,
што, неразумны, я цябе не шкадаваў,
няшчадна выдаткоўваў і змушаў
работаць на мяне бесперастанку.
Заўсёды паслухмяным ты было —
ішло на кожнае маё хаценне
і не пыталася, ці ўсё я ўрахаваў
і ўзважыў розумам халодным,
і ці хаценне вартае выдаткаў.
У згодзе ты было са мной заўсёды.
У засляпленні жудасным маім
я дабрынёй надужываў тваёю,
і хутка надвярэдзіў я цябе.
Яшчэ малым за статкам нашым
у полі лётаў я стралою.
З хлапцамі вёскі нашай беднай
гуляў, гарэзны, я наперагонкі.
Каб выйграў я, ты наддавала мне
як найшпарчэйшага ўсё ходу.
У жарсці жаркай я й не чуў,
як ты збівалася із свайго рытму.
Я згадваю яшчэ, як на гумне
у некалькі цапоў мы малацілі —
дзіцячае, ты хутка знемагала
ад доўгай і паспешлівай калатні,
ды ажывала зноў, абы не спасаваць,
абы з дарослымі быць нараўні.
Мне не забыць: з такіх, як я,
хтось птушаня з гнязда цягнуў
і з дрэва вобземлю скідаў яго,
і тут жа, кволае, яно ўмірала.
Ды не адно: ад болю й смутку
з ім заадно і маё сэрца памірала.
А як падрос, з усіх маіх пакутаў
зазнала маё неразважлівае сэрца
кахання найбалесныя пакуты.
Было ўсё тут: роспач, захапленне, мукі
і радасць нез'яснёная, што мне
шчаслівыя часіны даравала.

Ды зноў: знянацку ўжаліла цябе
неміласэрная гадзюка-здрада.
Выдаткі ўсё гэта былі
нязмерныя для майго сэрца.
Але не ўсё, не ўсё яшчэ... Чакай,
наперадзе чакае нас з табой
удар бязлітасны, смяртэльны.
Няждана, ціхай сапаю, халодна
яны прыйшлі, па сходках крадучыся,
заснулага, мяне з пасцелі узнялі
і павялі начнымі вуліцамі, каты,
каб спратаць у глыбокім сутарэнні.
Змарнелае, ты кожнае начы
жахалася ад бразгацення
замкоў турэмных у дзвярах,
дрыжэла, замірала — мо й цябе
паклічуць, возьмуць, павядуць.
Закутае, ад страху халадзела ты,
і толькі лекамі адзінымі табе былі
мае няўцешлівыя слёзы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Выдаткі ўсё гэта былі
нязмерныя для майго сэрца.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Цяпер спачынь. Цябе я вызваляю
ад непамернае мае нагрузкі.
Служыла мне ты неадступна
на ўсіх маіх, такіх цяжкіх,
жыццёвых пуцявінах.
Спачынь і мне даруй, што я цябе
не надта шкадаваў, кяляіў, нягодны.
Я ведаю, хацела для мяне ты
найбольшых поспехаў і ўдачаў.
І калі я чаго не дасягнуў —
віна мая, а не твая,
маё спакутанае сэрца.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Спачынь. Спачынь. Спачыну й я.
Сыду. І толькі шкода мне,

што застанешся ты без усялякае
маёй узнагароды, і ў скрусе па табе
я даўжнікам тваім навекі застануся.
Даруй... Даруй.

*1988*

* * *

У адзіноце блукаў я,
у свет невядомы брыў.
Доўга цябе шукаў я,
марыў і сніў.

І ў той мары жывой, неаслабнай —
ці то яваю, ці то маной —
такою жадана-прывабнай
паўстала ты прада мной.

У думках люляў цябе, песціў,
сябе не кваліў турботай зямной.
Ты стала маёй песняй,
ратункам і доляй маёй.

Без цябе, я знаю, не жыць мне,
для мяне ты — як прыгожы зман,
як васільковая блакітнасць у жыце
і як незагойнасць ран.

І калі мне ўжо ўсё адасніцца,
не падняцца з папёмкаў начы,
будзеш вогнікам свяціцца
для мяне ты ў той начы.

*1988*

* * *

На чужых на загонах
з ёй сустрэўся сягоння:

погляд Мадонны ўсё роўна
задуменна-чароўны.

Стаіць прада мною
на зямлі — незямною.

У апратцы сіня-нябеснай,
быццам прыйшла з маёй песні,

што складаў пра яе, закаханы,
на жыццё і на смерць ёй адданы.

Рады я. Гаварыць ахвочы,
а яна — долу вочы.

Не зварухнуцца вейкі,
быццам застыла навекі.

Ужо й час наступае вячэрні,
а я ўсё ў засмучэнні

на маю гляджу Мадонну,
такі сумны, бяздомны.

*1988*

* * *

Болей пісаць пра мора
нехаць бярэ і змора.

Іншае ў сэрцы пешчу,
а яно ўсё плешча і плешча.

Смутку не магу я збыцца,
а яно насміхаецца быццам.

І нешта сказаць хоча мне шчэ,
ды ўсё плешча і плешча.

Можа, пра Мадонну тую,
мройную маю, святую,

што сустрэў я на загонах калісьці,
як ападала лісце.

Толькі ж тое ўсё між скалаў,
мора, ты запаласкала.

Пра што сню і што пешчу,
мне пра тое не плешчаш.

*1988*

## ГОРА

Забылася мора пра гора —
спакойная сіняя гладзь.
А я не магу свайго гора
і смутку свайго суняць.

Спакоем, лагодаю, цішай
дыхае мора ў цішы.
А я не магу суцішыць
болю ў маёй душы.

Забылася мора пра штормы,
што білі ў яго карму.
Разлог яго ўдалеч прасторны —
краю няма яму.

Забылася мора пра гора,
адпачывае, спіць.

А я ўсё пытаюся ў мора,
як з горам маім мне быць.

*1988*

## У ПАРКУ

У гэтым восеньскім парку
болей не буду.
Сказалі мне Паркі:
«Болей ніякага цуду».

Ды памыліліся, мусіць,—
праз увесь час імклівы

у парку я застануся
ценем маўклівым.

Душа мая трапеча
у кожным ветру павеве.
Захаваюць мяне навечна
у парку дрэвы.

У час добры й балесны
за адно быў я з імі.
Як складаць свае песні,
я радзіўся з імі.

*1988*

## ДРЭВЫ Ў ПАРКУ

Адсвяціла сонца сваё,
і нікога ў парку не засталося.
Згасла праменняў вастрыё,
напусціла сутункаў восень.

Людзі пайшлі ўсе проч,
і, авеяныя журбою,
засталіся дрэвы на ноч
самі з сабою.

Не адны вы такія ў жыцці —
не дзялюся ні з кім і я снамі.
Мне няма куды ісці —
застануся я з вамі.

*1988*

## ВОСЕНЬ

Дрэвы — дружныя брацця —
без асцярогі
асыпаюць сваё багацце
сабе пад ногі.

Урону — вер ці не вер —
не шкадуюць яны нямала:
ім, аголеным, цяпер
лягчэй стала.

Асыпаюцца дрэвы ў цішы
да пары свае весняй.
Кожны раз лёгка мне на душы,
калі я асыпаюся песняй.

*1988*

## ХВАЛІ НА МОРЫ

Хвалі свае не спыняюць хады —
плывуць, ды не знаюць куды.
У розныя б'юць берагі —
то ў адзін, то ў другі,
не маючы нічога наўме —
адкуль вецер падзьме.
Ідуць то туды, то сюды —
вечны рух вады.

*1988*

## СІЗІФАВА ПРАЦА

У гэты бераг мора б'е дзень і ноч, работа яго
не спыняецца ні на хваліну.
Але бяда ў тым, што на гэтым беразе
ніхто ніколі не бывае.
Ён пусты, бязлюдны, дзікі.
Нікога няма, хто мог бы паслухаць адвечны
пошуг мора.
Ды яно не зважае на гэта, робіць сваё,
нястомна, аддана, як самы рупны на свеце працаўнік.
І як шкада!
Няўжо яно працуе толькі для сябе самога?
Няўжо яно б'е ў бераг, абы толькі біць?
Бязмэтна?
Не думаючы пра карысць?
О, якая гэта жудасць!

*1988*

## ЗАЖМУРЫЛАСЯ ВОСЕНЬ...

Зажурылася восень па мне, што не йду ў поле
да яе ў адведкі. Не распальваю агонь і не
пяку бульбу.
Не бегаю босым па сцюдзёных лужынах.
Не йду ў лес паслухаць цішыню.
Пытаецца восень, чаму яна не чуе, як іржуць мае коні.
Чаму, як яны скрэбліся, не пакінулі свае поўсці на
дрэвах?
Чаму не бягуць гулкім долам яны,
распусціўшы грывы?
Часта я плачу па табе дажджом-слязьмі,
выю ветрам,
схіляюся да цябе засохлаю былінкай,
журуся смуткам-туманом дзень і ноч па табе, што ўмеў
падслухаць мяне сэрцам і пад маёю пушчаю забыцца.
Адгукніся, небарака!
Дзе ты?

*1988*

## СУСТРЭЧА Ў ПАРКУ

У парку незнаёмы мне малады чалавек
распачаў са мною гутарку.
Быў я ўважлівым да яго, і ён, прыкмеціўшы гэта,
без ніякай перадышкі, пачаў тлумачыць мне
Біблію, адрэкамендаваўшыся місіянерам.
Ён усведамляў мяне, як можна пазнаць
жывога Бога.
Але я слухаў яго толькі адным вухам,
бадай зусім не слухаў:
я быў увесь у сузіранні хараства,
што адкрывалася перад маімі вачыма —
райскім супакоем восеньскага парку,
задуменнасцяй дрэваў у ім,
таямнічасцяй усяго існага.
І ўсё чакаў, калі малады чалавек
адыдзецца ад мяне.

*1988*

* * *

З начы ў парку яшчэ быў мароз, і ў ім не было
людзей.
Ды апаўдні парк ужо нагрэўся ад густога
восеньскага сонца.
Было цёпла і ўтульна, аднак лаўкі ў парку
яшчэ пуставалі.
Толькі ў адным кутку, на выграве, асунуўшыся,
сядзелі двое старых, і невядома было,
ці яны задрамалі, ці ўжо адышлі.

*1988*

## ПАВУЦІНКІ

Сонца ўзнялося на ўсю сваю восеньскую вышыню,
і, спакойнае, затапіла сваім святлом
усю неабмежную прастору.
Дрэмяць у сцішнасці сады,
пунсавеюць, наліваюцца ў іх антонаўкі.
А ў полі, з паднябесся, лятуць на зямлю,
як запаволеныя стрэлы,
бялюткія павуцінкі.
Людзі кажуць, што гэта бабіна лета.
Не — гэта нам пасланне з невядомага свету.

*1988*

* * *

Безліч разоў качка дае нырца,
каб дастаць сабе з дна спажыву.
Але гэта ёй не заўсёды ўдаецца.

Безліч разоў я заглядваю ў сваю душу,
каб адшукаць у ёй сапраўднае слова.
Але гэта рэдка калі мне ўдаецца.

*1988*

## ВЫСЛОЎІ

Дрэвы губляюць увосень лісты, а я — словы.

Раней я вучыўся гаварыць, цяпер вучуся маўчаць.

У лазні колькі ні парся, ні мыйся, а душы не адмыеш,
калі яна брудная.

Сонца прыгажэйшае, калі заходзіць,
краса — калі адцвітае.

Павольнага, мяне пакінула ў парку жонка.
Я ціха хаджу, і яна злуецца. Ёй трэба
як найболей аббегчы, як найболей пабачыць.
Яна не ведае, што, павольны, я бачу болей,
чымся яна, хуткая.

Ад ружовага колеру дрэваў у садзе
заружавелася мая душа.

У часе няма часу, ёсць толькі — бясконцасць.

Пісьменнік К. абяцаў мне прыслаць сваю кніжку,
але не прыслаў. Чалавек спраўджаецца,
калі ён верны самому сабе.

*1988*

* * *

Я цэлае сваё жыццё аддаў слову.
Дзеля яго пакутваў за кратамі.
На алтар слова склаў ахвяры.
І як жа балюча ўсведамляць,
што яно цяпер непатрэбнае.
Яго зракліся браты-беларусы.
О ты, маё неспазнанае слова,
навошта я мучыўся табою?

*1988*

* * *

Восень — гэта калі рэжуць авечак.
На мяса і на кажухі. Авечкі ўжо ад'еліся,
адгуляліся — тлустыя.
Асабліва ідуць у ход бараны:
ад іх не чакаюць прыплоду.

*1988*

## СКАРГА БЯСКРЫЛЫХ, ЦІ ЯК КРЫЛАТЫЯ ДАПАМАГЛІ БЯСКРЫЛЫМ

(Казка для дзяцей)

Было гэта на птушыным балі —
на яго бяскрылыя прыкалдыбалі.

Валюхаючыся — як умелі —
між крылатых, нешчаслівыя, паселі.

І птушынаю скорагаворкай
сталі скардзіцца на лёс свой горкі:

«Нам жыццё зрабілася нямілым,
нам, нягеглым і пастылым.

Шчыплем на балоце толькі лотаць.
Гора наша — мы не ўмеем лётаць.

Плаваем між купін і чароту —
мы пазбаўленыя лёту.

Наша пер'е глей і гразь пакрылі —
анямелі нашы крылы.

Сёстры нашыя і брацця,
памажэце нам узняцца!

Шчыплем на балоце толькі лотаць.
Гора наша — мы не ўмеем лётаць».

Цэлаю сям'ёю ўзнятыя,
над бяскрылымі ўскружыліся крылатыя:

«Гэй, суродзічы нашы балесныя,
ці ж не вабяць вас далі нябесныя?

Узніміце свае дзюбы, паглядзіце,
як мы патанаем у блакіце».

І як васількі ў жыце,
патанулі ў блакіце.

Кружачыся, як той жораў,
даляцелі аж да зораў

і, вярнуўшыся адтуль, дазорцы,
прышпілілі кожнаму бяскрыламу па зорцы.

Цэлаю сям'ёй, заўзятыя,
над бяскрылымі кружылі ўсё крылатыя.

Усміхаліся бяскрылым, называлі іх мілымі —
і бяскрылыя... замахалі крыламі.

Узрадаваліся бяскрылыя бясконца,
заглядзеліся ў неба блакітнае ваконца.

Над паплавамі, над хатамі
шуганулі ў неба бяскрылыя з крылатымі.

*1986*

# І ТОЙ ДЗЕНЬ НАДЫШОЎ

## РАМАН

# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

**Мала карысці ад слоў, веры каторым няма.**
*Мікола Гусоўскі*

Дзеля чаго яна назвала мяне Юзікам і пры якіх абставінах, я скажу пазней, калі яна ўжо будзе дaraслай. Цяпер жа яна яшчэ малая, ёй не болей як адзінаццаць год, і, думаю, што яна не ведае яшчэ, як мяне завуць наогул. Дый у яе няма ніякай патрэбы ведаць, як мяне завуць. Зрэшты, яна са мной дасюль яшчэ ні разу й не гаварыла — сароміецца. Пры сустрэчы апушчае вочы долу — глядзіць толькі на мае жоўтыя гарадскія бацінкі, у якіх я ўсё яшчэ хаджу, не скідаю, хоць з Менску я прыехаў да сваіх бацькоў болей як тыдзень таму назад і мог бы ўжо прывыкнуць зноў хадзіць босым, як і ўсе тут ходзяць. Яна таксама босая. Ёй, відаць, падабаецца, што я апрануты па-гарадскому і, значыцца, не такі, як усе. Ёй таксама падабаецца, што я — студэнт, дадам — адзіны на ўсю вёску. Я ўжо на той ступені, што нават магу не хадзіць на працу ў калгас, не пеклавацца, як усе, магу хадзіць панічом, прастойваць немаведама чаго цэлымі гадзінамі на нашым мосце праз рэчку Свінку, што прабягае паміж ейнаю і маёю вёскамі, раздзяляе іх. На гэтым мосце, бывала, сыходзілася ў святочныя дні моладзь з абедзвюх вёсак — Мокрага Першага і Мокрага Другога. Цяпер, як настаў калгас, моладзь збіраецца тут рэдка — трэба і ў святы працаваць.

Вось і сёння я на мосце толькі сам: рабочая ж пара, пагодны дзень і ўсе — на полі. Гляджу, як унізе, перад самым мостам, там, дзе глыбей, боўтаецца дзятва — адна малеча. Дае нырца, выплывае наверх, пырскаецца, і як у гэтых пырсках ламаецца на аскепкі сонца. Дарослыя ж будуць купацца-мыцца ўвечары, калі сцямнее і можна будзе лез-

ці ў ваду голым, без трусікаў — такіх рэчаў тут ні ў кога няма.

Яна таксама — бачу па ёй — хацела б плёхацца разам з малымі, каб толькі ў тым купеле былі адны дзяўчынкі і не было хлопчыкаў. Яна стаіць там, унізе, на беразе, і прыглядаецца — дзіўна! — якраз да хлопчыкаў, асабліва калі яны, голыя і загарэлыя, вылазяць на бераг. Час ад часу — я гэта бачу — яна кіне на мяне неўпрыкмець свой сарамлівы погляд. Але я сябе не выдаю, што прыкмячаю гэта. Яна там, унізе, на поплаве, не адна — з ёю гусі, цэлы статак. У руках трымае доўгую хварасціну — кіруе ёю гусей. На галаве ў яе гарыць чырвоны банцік, коскі звісаюць да пояса. Зірк — як у Божай Мацеры: выразліва ясны, кідкі і як бы задуменна-засмучаны. Гэта калі яна глядзіць прама на цябе. Зіркне ж збочліва — як апаліць. Яна ўся пайшла ў матку — у маткі ж таксама лахматыя, з роскідам, бровы, чорныя, як воранава крыло. З-пад іх зораць на цябе прадонныя вочы, гулліва-мітуслівыя. Завуць ейную маці Хімай. У Мокрым яна адна такая. Гавораць, што свой пачатак Хіма ўзяла ад маладога цыгана-ганчара, што ездзіў па ваколічных вёсках з гаршкамі і, бывала, спыняўся нанач у ейных, Хіміных, бацькоў. Дачцэ ж, хоць яна й пайшла ў матку, дадаліся яшчэ й бацькавы рысы — выйшла прывабная харашуня, што й стаіць вось цяпер перада мною ўнізе з статкам гусей і хварасцінай у руках.

Мой знаёмы, настаўнік Вяркееў, з якім я сябрую, неяк сказаў мне, што ў ягоным трэцім класе сярод дзяўчынак — яна самая прыгожая, хоць і не самая паспяховая і што з ёю трэба займацца дадаткова. (Бацькі вучняў казалі мне, што Вяркееў спаміж настаўнікаў найбольш адукаваны чалавек, хоць дасюль у гэтым я не мог пераканацца.)

Вяркееў угледзеў мяне на мосце. (Ён чакаў майго прыезду, пытаўся ў бацькі, калі я буду.) Імчыць з горкі ад школы. Вітаецца:

— Што й ты пасвіш гусі з маёй Дусяй?

Гэта мяне абышло — якая яна яго? Што толькі вучыцца ў яго? А зрэшты, якая яна мая? Таксама ж не мая. Але ўсё-такі я не ўзлюбіў, што Вяркееў — мот — назваў яе *сваёй*, ды яшчэ наўзверх Дусяй. Дасюль яна была для мяне толькі «яна», без якога-колечы імя, як сымбаль, а цяпер яна была названая Дусяй, і гэтая канкрэтнасць як бы развянчала яе. Але гэта глупства. Вунь яна ўзняла хварасціну — пагнала далей паўз рэчку сваю гаману і штосьці заспявала, мне падумалася — на развітанне са

мною. Як бы там ні было, я ўпэўнены, што яна спявае не для сябе, а для некага, і той «нехта» — цешу я сябе — гэта я, хоць і лаўлю сябе на тым, што ўсё гэта — хімера, хачу верыць, што я ўсё-ткі здольны ацэньваць рэчы рэальна, бачыць іх у сапраўдным святле. Ды зноў жа я хачу, каб рэчы выглядалі прыгажэй, як яны ёсць на самай справе. Мне падабаецца падманваць сябе.

Гусі не надта слухаюцца яе — хутка, як качкі, уцякаюць у рэчку, гагочуць, як ашалелыя, б'юць паветра крыллем. Яна канчае спяваць, пачынае — гэта відаць па ейнай паставе — гаманіць з імі. Наіўная, угаворвае іх, непаслухмяных.

Гэта ўжо каторы дзень, як я прыкіпеў да гэтага моста — падоўгу стаю на ім, быццам любуюся харaством вясковага наваколля: жытам, што тут жа, побач, направа ад нашай школы; нашаю рэчкаю; ветраком (налева ад мяне), што апусціў крылле, задумны ў сваёй нерухомасці; а яшчэ далей — трыма стройнымі вязамі на даляглядзе. (Усё роўна, як я ні маскуюся, можна заўважыць, што я стаю тут не так сабе. Але няўжо можа нехта падумаць, што я любуюся *ёю*? Баюся, што магу праслыць дзіваком.)

Вяркееў мне перашкаджае — усё не адыходзіцца. Балбоча і балбоча. Яму, кажа, некуды дзецца — заняткаў у школе ўжо няма, на лета нікуды не паехаў, прападае ў Мокрым. Асабліва не па сабе яму ўвечары. Да дзяўчат пад хату дзеда Мельніка, куды яны збіраюцца пасля працы і дапазна валтузяцца з хлопцамі, Вяркееў не ходзіць — кажа, «грубая матэрыя», хоць, як я пазней пераканаўся, ліпне да гэтай «грубай матэрыі». Ён, кажа, любіць толькі дзявочыя галасы. Любіць, як яны спяваюць, як іхныя песні ў вечаровай ядранасці пакрываюць прастору на некалькі кіламетраў наўкруг, як, пачуўшы іх, у якой-небудзь суседняй вёсцы адгукаюцца ім сваёю песняй. Дрэнна толькі, кажа, што перашкаджаюць дзяўчатам хлопцы — шчыплюць іх, і тыя тады верашчаць да знямогі. Але іх, дурніцаў, сцішаюць хлопцы, каб яны не перашкаджалі спаць дзеду Мельніку.

Далёка сваіх гусей яна не пагнала — вяртаецца ўжо назад да моста. Яна тут круціць іх цэлы дзень. Пабачыўшы, што я стаю тут не адзін, а з Вяркеевым, ейным настаўнікам, закрычала на гусей. Чаму ўсё-ткі ён назваў яе «сваёю Дусяй»? Я хацеў ужо загаварыць з ёю, але вось прыбег ён.

— Загляньма ў сельсавет, *зачараваны*! — і бадай не пацёг мяне, узяўшы пад руку.

Да сельсавета ад моста не болей як трыста — чатырыста метраў. Побач сельсавета — сельпо. У будынку сельсавета месціцца і нашая пошта. Там жа сядзіць і фінагент, мой далёкі сваяк. Сельсавет і сельпо, з невялікай паміж імі добра падмеценай пляцоўкай, і становяць наш «Цэнтр». Побач гэтага «Цэнтра» стаіць і ейная хата. Гэтаю хатай і канчаецца вясковая вуліца. Сюды, у «Цэнтр», прыходзяць сяляне з ваколічных вёсак — пачуць навасцяў, купіць штонебудзь або й проста «на людзей паглядзець і сябе паказаць».

Насустрач — бачу — ідзе ейная маці. Можна сказаць — бяжыць. Босая. Рыхтык цыганка. Або не — грачанка. Я вызваляюся з-пад апекі Вяркеева і гатовы ўжо быў прывітацца з ёю, Дусінай маці, як яна апярэдзіла мой намер і сама — яшчэ здалёк — прывіталася першай, выразна скіроўваючы сваё вітанне да мяне. Вяркеева яна як бы й не прыкмячае.

— Чула, што прыехаў, а не бачылася яшчэ,— і падае мне руку.— Заўсёды ж, як прыедзеш, бяжыш, коцішся з горкі сюды. Ці нешта ўжо забыўся на нас?

«Бяжыш, коцішся з горкі»— гэта ў яе азначае месца, дзе стаіць нашая хата і адкуль я «бягу, качуся». На правым, вышэйшым, беразе рэчкі нашая хата й сапраўды выглядае як на горцы — узнятай, паднесенай, асабліва калі глядзець на яе знізу, з моста. Я, калі трэба было ў сельпо, у сельсавет або яшчэ куды, сапраўды не йшоў, а бег праз мост — якога не мінеш — і Хіма, маці Дусі, магла бачыць мяне, бягучага, у вакно з свае хаты.

— Я ж усім і кажу,— недарэчы гаворыць яна, штò гэта за Масееў сын — не ходзіць, а бяжыць і пры сустрэчы, ласкавы, кожнаму скажа «добры дзень!»— і старому і малому.

Гэта яна ўжо гаворыць як бы Вяркееву, а мне чамусьці сорамна, што яна гаворыць гэта, пагатоў пры Вяркееве.

— Не бачыў мае Дусі? — зноў звяртаецца да мяне. (Напэўна, назірала, глядзела з вакна свае хаты, як я тырчэў на мосце, і думае, мусіць жа, бачыў ейную — хацеў падумаць *маю* — Дусю.) — Ды не дзе дзенецца — знайду. Накарміць жа трэба. Худзенькая яна ў мяне. Бялюткая, дармо што чарнушка — на адным малацэ жывець.

Развітаўшыся, яна паімчалася шукаць Дусю, а мы па-

спяшаліся ў сельсавет. Вяркееў кажа — прыехаў з раёна нейкі ўпаўнаважаны.

Вяркееў адчапіўся ад мяне: нырнуў у сельпо, там — я ўпэўнены — ён раздушыць разам з каапэратарам паўлітэрка, балазе цяпер у крамцы ні душы, значыць, цэлая раскоша для п'янчужак і іншых прыхлябацеляў, уключна з самім старшынёй сельсавета. Бывае нават, што яны зачыняюцца, каб ніхто не перашкаджаў ім «разгавецца», як яны ахрысцілі выпіўку на хаду.

Я застаўся адзін пасярод вуліцы, не ведаючы, куды мне пайсці. Сельсавет і розныя ўпаўнаважаныя мяне не надта цікавяць. Я аглядаюся назад, ці не гоніць дахаты гусей Дуся. Яна не мінула б гэтай дарогі, дзе я стаю цяпер,— гэта якраз дарога да яе хаты. Да Вяркеева — не ведаю чаму — у мяне варухнулася непрыязь, а то й варожасць, і мне трэба было неяк збавіцца ад такога пачуцця. Я хацеў заглушыць гэтае пачуццё стрэчаю з ёю. Я ж і стаяў на мосце, узвышаў сябе ёю, каб утаймаваць у сваёй душы разлад, які я адчуў, прыехаўшы з Менску, разлад, што паўстаў у мяне ці то ад чытання розных — у тым ліку забароненых — кніг, ці таму, што мне ў вёсцы няма чаго рабіць. Я ўжо адарваўся ад яе. Я не гарадскі і не вясковы. Я не магу глядзець на сваіх бацькоў і на сястру, як яны ўбіваюцца ў калгасе на агульных работах. Праўда, як я прыехаў з вучобы да хаты, бацьку ўжо не пасылаюць кожны дзень з касою, даюць лягчэйшую працу — відаць, лічацца са мною.

Бацька з маці ўвечары валочаць на сабе барану, абрабляюць за хатаю свае соткі. Мяне не чапаюць. Я магу не рабіць, я ўжо госць, я нібы ўжо чужы, і мне ад такога адчування не па сабе. Мяне шкадуюць, але вонкава гэтага не выяўляюць

Чытанне — я й на канікулах заўсёды чытаю — чытанне перарабіла мяне, наставіла на нейкі іншы, больш ідэальны свет, на больш прыгожае ў свеце, я знаходжуся ў пошуках гэтага летуценнага свету. Адсюль з'явілася патрэба ў ёй.

Вось і яна сама — мусіць, маці паклікала яе на абед, і яна гоніць гусей дахаты. Яны, паслухмяныя цяпер, ідуць стройнаю чародкаю самі — іх не трэба падганяць. Яна йдзе за імі ўслед. На адлегласці бачу яе — засяроджаную, спакойную, стройную, з коскамі і банцікам, у лёгкай сукенцы. Бачу яе, невясковую, нібы закінутую сюды аднекуль з больш прывабнага свету.

Яна заўважыла, што я стаю на ейнай дарозе. Узрушанасці не паказвае — ідзе лёгкай, роўнай паходкай. Гусі, дайшоўшы да мяне, загагаталі, абмінулі, нібы якую перашкоду, што трапілася на іхнай дарозе. А яна сама проста ідзе на мяне — збочыць не можа. Дайшла. Ужо ля мяне. Побач. Думаў, затрымаецца, нешта скажа. Не. Лёгка ўсміхнуўшыся, пайшла. Я гукнуў яе, і яна ўжо зводдалі памахала мне рукой.

Невядома адкуль узнікла на дарозе і ейная маці з травою ў фартуху — наскубла дзесьці, мусіць, для свае каровы.

— Нясу во сваёй Красульцы. З поля прыходзіць галодная. Рыкае. Глядзіць мне ў вочы, ці не дам чаго. Сваёй Дусьцы б'ю масельца, каб расла здаровенькая і прыгожанькая. Можа, калі табе нявеста будзе. (Засмяялася.) Ці ў цябе мо гарадская завялася? Пайду. І стары ж мой жджэ мяне там. Ага, наш Ягорка прыязджае. Табе таварыш будзе — вучыліся ж у школе разам. Заходзь да нас.

З канцылярыі сельсавета выйшаў фінагент Даўгаль. Каб маці не сказала, я не ведаў бы, што ў нас ёсць такая радня. Здароўкаецца.

— Ведаеш, я каратка. На хаду. Табой цікавіцца ўпаўнаважаны. Цябе пакліча старшыня ў канцылярыю — будзь асцярожны.

І схаваўся за дзвярыма сельпо — мусіць, пайшоў «разгаўляцца». Іх, сяброў па выпіўцы, цэлая шайка — старшыня, сакратар сельсавета, фінагент, Вяркееў і сам кааператар. Кааператара, кажуць, будуць судзіць за расстрату.

Папярэджанне фінагента як бы й не тычылася мяне. Праўда, я ўдаваў, што гэта мяне не тычылася. На самай справе паведамленне агента апякло маё нутро, выклікала трывогу. Толькі ўсё гэта я адганяў ад сябе. Я хацеў жыць бесклапотна. Хацеў жыць тым узвышаным пачуццём, што акрыляла мяне, той радасцяй быцця, што штурхала мяне на нейкі ўчынак, але, не знайшоўшы выхаду, згарала ва мне самім, пакідаючы ў душы салодкі смутак лёгкага расчаравання.

Я позна пачаў складвацца як асоба. Маленства без якіх-небудзь асаблівых выгодаў, праца з самых ранніх год, адсутнасць належнага школьнага выхавання не вельмі спрыялі майму развіццю ў пачатную пару. Але ў нашай сям'і ўсё прадвызначаў лёс — ён кіраваў намі, і мы сляпа падпарадкоўваліся яму. Падсведамае вычуццё наканаванасці лёсу спарадзіла ў нас скрайнюю чуллівасць.

Лёс прадвызначыў і маю дарогу: хоць і спознена, я

ўсё-ткі адарваўся ад сахі і пайшоў, скажам так — у навуку.

Але я быў народжаны не для навукі як нечага рацыянальнага — нада мною запанаваў эмацыянальны пачатак, чуллівы пачатак. З яго і пачалося афармленне, складванне мае душы, ейны рост. Якраз цяпер я і знаходжуся ў працэсе станаўлення свае асобы, перад усім ейнага эстэтычнага пачатку. Для яго, гэтага эстэтычнага пачатку, я й шукаю *«яе»*. *«Яна»* можа быць кім хочаце. Ну хоць бы і Дусяй.

Выйшаў на ганак старшыня сельсавета і кіўком галавы паклікаў да сябе. Калі я ўвайшоў у ягоны пакой, старшыня, ні пра што ў мяне не запытаўшыся, здаў мяне адразу ўпаўнаважанаму з раёна. Той папрасіў мяне прайсціся з ім, паказаць яму канцылярыю нашага калгаса — ён хацеў бы бачыць там старшыню.

— Гэта ж, здаецца, і вам па дарозе.

«Па дарозе» ці не па дарозе, а я змушаны быў ісці з ім назад праз мост, на другі бок рэчкі. Канцылярыя нашага калгаса знаходзілася на самым процілеглым канцы вёскі, і мне давялося прайсці з упаўнаважаным усю яе — з канца ў канец.

Ён не сказаў мне, хто ён такі, а я не пытаўся — гэта ўсё для мяне было няважна. Мінулі мост. Паказалася на ўзгорку нашая хата, і калі мы дайшлі да яе, ён запытаўся, дзе я жыву, у якой хаце. Я паказаў яму.

— Чуў, вы — на апошнім курсе універсітэта. Канчаеце, значыцца. Вельмі добра. Будзеце выкладаць? Рускую ці беларускую літаратуру? Я дазнаўся (ён усміхнуўся), што вы на літфаку і, пэўна ж, будзеце выкладаць літаратуру — тую ці тую.

І без ніякай паўзы, без перадышкі, запытаўся, каго я найбольш люблю з беларускіх паэтаў і пісьменнікаў — Пушчу, Гаруна, Дубоўку, Чорнага, Кляшторнага?

Я быў вельмі здзіўлены, што ўпаўнаважанаму вядомыя гэтыя прозвішчы. Гэта мяне насцярожыла. Я вычуў, што ўпаўнаважаны пытаецца пра гэтых людзей не так сабе — хоча праверыць маю ідэалогію. І я пачаў ганіць і Пушчу, і Гаруна, і Дубоўку, і Чорнага, і усіх чыста, пра каго ўпаўнаважаны пытаўся, а хваліць Андрэя Александровіча, пралетарскага паэта-камуніста. Упаўнаважаны прыкмеціў — гэта было няцяжка — што я самастрахуюся.

— Добра. Добра. Вельмі добра. І мы не будзем пра гэ-

та. Ясна ўсё.— І, перайшоўшы на другое, спытаўся:— У якіх вы дачыненнях з Вяркеевым?

Я адказаў — у самых найлепшых.

— Ну і правільна. З ім можна дружыць. Бо з кім болей вы можаце тут дружыць?

Дайшлі да канцылярыі калгаса, і ўпаўнаважаны развітаўся са мною, жадаючы мне поспехаў, а я падумаў — гэта ж ён збірае дадзеныя пра мяне — навошта ж бы спатрэбіўся яму наш старшыня калгаса.

Ідучы назад, я мінуў сваю хату, пайшоў на мост і, перайшоўшы яго, зноў апынуўся ў «Цэнтры», г. зн. ля сельпо і сельсавета.

З сельпо якраз выходзіў фінагент, па ўсім відаць, добра «разгавеўшыся».

— Я з табою не гавару. Я іду толькі паўз цябе — ты стаіш на дарозе — і не размаўляю з табою: старшыня вунь глядзіць у вакно. Скажу толькі — уцякай! З'едзь адсюль! Ніхто цябе не будзе шукаць. Я з табою не гаварыў.

Як ішоў, гэтак і пайшоў, не затрымліваючыся. Зачыніў за сабою дзверы ў канцылярыю сельсавета.

Неспакойны, я не ведаю, куды мне пайсці. У душы — несамавіта: эстэтыка мая церпіць крах. Сутыкнулася з рэальнасцяй. *«Яна»* з гусямі і банцікам-аганьком затушавалася наплывам іншага пачуцця.

У дадатак дадзяе самотнасць, сонная пустэча вуліцы: на ёй каб хто матнуўся — мёртва. Зірнеш — толькі дзе-небудзь, седзячы пасярод вуліцы, якое малое сыпліць у сваёй несвядомасці сабе пясок на галаву. Аж жудка.

Пайду да свайго колішняга таварыша па школе, да Вусціна. Яго калоціць, не адпушчае цяцюха, і ён, напэўна, будзе ў хаце. Так і ёсць — не толькі ён, але й ягоная маці, і сястра-падлетак, што, як толькі ўвайшоў я, схавалася за шырмай. Вусцінава маці кінулася прыбіраць на стале, запрашаючы мяне садзіцца, радая майму прыходу. Яна толькі што прыйшла з поля падаіць карову — дачка яшчэ не ўмее. Пастух прыганяе кароў на цэлае абеддзе — спёка. І выганяе толькі, калі спёка спадае.

Вусцін зайздросціць мне, што я вучуся, шкадуе, што пасля чатырох класаў не пайшоў далей у навуку. У калгасе працаваць не любіць, лаецца з брыгадзірам, сваім таварышам. Ягоная маці прыслухоўваецца да нашай гутаркі і, незадаволеная сынам, не магла ўстрымацца, каб не выказаць мне гэтага свайго незадавалення:

— Ляжыць во дзень у дзень, а прыйдзе вечар — бя-

жыць да сучкі. Прыходзіць да хаты, калі добрыя людзі ідуць на працу. Можа б, ты, Масеевіч, ушчуў яго як?

Вусцін не злаваўся на маці, усмешліва пазіраў на мяне. Тое, што гаварыла яму маці, успрымаў як належнае і, відавочна, думаў, што ў маіх вачох ён не прайграе, а наадварот — выйграе.

Па сваім прыездзе ў гутарках з вясковымі хлопцамі — маімі аднагодкамі, я заўважыў, што амаль усе яны хваляцца сваімі перамогамі на жаночым фронце. Я ніяк не каментаваў іхных дасягненняў, хоць і слухаў іх уважліва. Ад іх веяла на мяне нечым нячыстым, брыдкім і непрыемным, такое іхнае адкрытае прызнанне выклікала ў мяне нясмак, асабліва калі яны падлічалі на пальцах, колькі дзевак яны пазбавілі цнатлівасці. Я ім не верыў, ведаў, што яны хваляцца, але разам з тым, недзе ў самым цёмным закутку душы, зайздросціў ім. Яны лічылі мяне не дастаткова адважным, баязлівым, далікатным інтэлігентам, які не апанаваў метадам, што вядзе да авалодання, і — дзіўная рэч — прапаноўвалі мне свае паслугі ў гэтым, на іх думку, зусім лёгкім мастацтве.

— Калі хочаш, я завяду цябе сёння ўвечары да аднэй — ламацца доўга не будзе,— ціха, каб не чула маці, угаворваў мяне Вусцін.

У маім Мокрым — дый не толькі ў Мокрым — трываў яшчэ стары звычай «хадзіць да дзевак спаць». На цэлае лета — душна ж, дый бацькі на перашкодзе — дзеўка выходзіць спаць на двор: у клець, пад павець, або й проста на калёсы, калі яны пад страхою. Застаюцца спаць у хаце толькі тыя, хто не спадзяецца на поспех: надта непрыгожыя і няўдалыя.

Гэты выхад з хаты разлічаны на тое, каб прынадзіць пажаданага хлапца і, калі ўсё пойдзе на лад,— выйсці за яго замуж. Дзеўка не пусціць да сябе нанач нікога, хто ёй не падабаецца, колькі б ён ні прасіўся, і не паддасца хлопцу — зялезны закон — калі вычуе, што з ім не будзе будучыні. Канешне, бывае, калі дзеўка памыляецца — аддасца хлопцу, а замуж той не бярэ, і тады рэпутацыю чэснай дзеўкі яна траціць назаўсёды.

Мяне, як свайго, ды яшчэ студэнта, думаецца, пусціла б да сябе любая з нашых дзевак, але я баюся іх: адпусціцца каторая, каб забрытаць цябе, і тады канец усім тваім планам, у тым ліку і вучобе, будзеш працаваць, каб магчы выплачваць аліменты. Але маглі цябе, такога свайго і не прыняць, не пусціць у клець: я ім не пара, а нашы дзеўкі —

народ цвярозы, яны шукаюць роўных сабе, і магло стацца, што, стоячы пад дзвярыма, ты доўга прасіўся б, каб табе адчынілі. Ды, зрэшты, што я гавару — я такі ж самы, як і яны: просты, адкрыты, дурны, такі ж самы працаўнік — на полі, на лузе, на таку, на гумне, у хаце — усюды, дзе спатрэбіцца мазолістая рука. Я толькі адарваўся ад іх і, адарваны, на жаль, станаўлюся чужым для іх.

У кожным разе я падзякаваў Вусціну за ягоную гатовасць дапамагчы мне і збіраўся ўжо выйсці, як ягоная сястрычка — такога прыблізна ўзросту, як Дуся,— паказалася з-за шырмы і, танцуючы, выпаліла:

— А я чула, што вы гаварылі.

І пабегла зноў за шырму.

Вусціна гэта нямала не здзівіла, і калі я ўжо ўзяўся за клямку, каб выйсці, ён нагадаў пра сваю гатовасць прыслужыцца мне. Непрыемна ўсім гэтым уражаны, я рады быў апынуцца на свабодзе, у раздоллі ўсё яшчэ нязгаслага дня. Я не пайшоў дахаты назад на мост, а павярнуў да да добра знаёмага закутка-астраўка, што некалі ўтварыла наша Свінка, абмінуўшы яго з абодвух бакоў, быццам пакідаючы нам гэты астравок для схованак ці для адзінотнага роздуму і адпачынку. На гэтым астраўку, акружаным вербалозам, густа раслі краскі, гулі над імі пчолы. Іхны гуд не парушаў той цішыні, якая панавала тут, наадварот, як бы штосьці дадаваў да яе, ствараў радасна-патаёмную музыку існавання. Тут адчувалася прысутнасць духу, што непрыкметна творыць усё. Каб трапіць на гэты астравок, трэба было перайсці невялікі, але досыць хуткі струмень, і мне спатрэбілася скінуць свае бацінкі. Узяўшы іх у рукі, я пераскочыў струменьчык і бачу — *ейныя* гусі тут, шчыплюць траву. А дзе ж яна сама? Аж бачу — сядзіць на палянцы сярод красак, уе вяночак, прымервае сабе на галаве. Мяне яшчэ не бачыць. Такое ўражанне, быццам, засяроджаная, яна не ведае, дзе яна. Яна толькі сама з сабой, у нейкім сваім асобным свеце, і ці варта перапыняць яе ў гэтым ейным існаванні. Цікава, што яна думае? Нешта ж яна думае. Як вяночак з красак, снуецца ж адначасна і вяночак ейных мар, толькі ёй адной вядомых. Гусі для яе не існуюць. Яна, мусіць, забыла пра іх. Але яны ведаюць сваю пастушку — даюць ёй магчымасць пабыць з сабой, у шкоду не йдуць. Вяночак гатовы. Устаючы, надзела яго на галаву. Папраўляе. Забрала адзаду свае коскі і пералажыла іх на грудзі. Гэта надало ёй выгляд больш дарослай. Яна, канешне, не раз наглядала, як дарослыя дзяўчаты, стоячы

перад люстэркам, заплятали свае косы, перакінуўшы іх наперад. Кароценькая, як сетачка, ейная суkенка, што не даходзіла ёй да каленяў, усё ж сведчыла пра ейную дзіцячую бесклапотнасць і неспакушанасць. А вось яна пабачыла мяне і — дзіўна — ніколькі не збянтэжылася. У нейкі няўлоўны момант твар яе засвяціўся радаснай усмешкай. Гледзячы на мяне, яна заставалася стаяць. Я падышоў да яе. Яна хутка зняла з галавы вяночак. Вачэй не засланяла рукою, як гэта яна рабіла раней пры сустрэчы са мной.

— Навошта ты зняла вяночак з галавы? Ты такая прыгожая ў ім.

— А без вяночка я не прыгожая? — спыталася.

— Канешне, ты прыгожая і без вяночка.

— Дык я не буду й надзяваць яго. Я звіла яго для цябе. Я ведала, што ты прыйдзеш сюды.

— Як ты магла ведаць пра гэта?

— Ты ж ходзіш сюды чытаць. Ляжыш у траве. Я заўсёды бачу цябе тут. І я думала, што ты й сёння будзеш тут.

— А я цябе ніколі не бачыў тут.

— Бо я, схаваўшыся, глядзела на цябе. Таму ты й не бачыў мяне. Я ведаю, чаму ты й на мосце стаіш.

— Ну скажы — чаму?

— Каб глядзець на мяне.

— Чаму ты думаеш, што я гляжу на цябе?

— Бо ты кажаш, што я прыгожая.

Я быў здзіўлены ейнай смеласцяй, а яшчэ больш — ейнай кемлівасцяй. Яна глядзела на мяне не збочліва, адкрыта, у ейных вачох гулялі здрадліва-звабныя іскрынкі малой шэльмы. Мяне ўражала непрыхаванае імкненне паказацца дарослай. У ёй прачыналася смутнае ўяўленне нечага нязведанага.

Я стаяў з вяночкам у руках, не ведаючы, што з ім рабіць. Яна заўважыла маю нерашучасць, умомант замкнулася, як бы спалохаўшыся сябе самой. Падняла з долу хварасціну, сказала:

— Гусі разышліся. Пайду шукаць і паганю двору.

— А вяночак?

— Калі не хочаш узяць з сабой, пусці на ваду — няхай плывець. Я пушчаю вяночкі часта. Гляджу, дзе яны прыпыняцца.

Адышоўшыся, азірнулася. Памахала мне рукой.

...Чапляюся-чапляюся і ні за што не магу зачапіцца. Ні ў горадзе, ні тут. І там нядобра, і тут нядобра. Нова-

спечаны інтэлігент! Рамантык! Якому трэба *«яна»*! Расчараваны Вертэр! Сумуе ў глушы вясковай! Шукае прыгодаў! Нейкіх незвычайных сустрэчаў! Эстэт! Паглядзець збоку — адно смяхоцце! І канешне ж, смяюцца: «Масееў сын запанеў ці з глузду з'ехаў — з дзецьмі забаўляецца».

Я баюся гэтага прысуду. Плюну на сваю рамантыку! Пайду разам з усімі касіць! Пайду ў гурт! У калгас! Я пакажу сябе ранейшага — селяніна, які ўмее ўсё: і касіць, і малаціць, і сеяць, і веяць. Ды што там — «пакажу»? Бацька вон як пяклуецца, дык стань побач і «пакажы»! Зарабі працадзень які — з яго ж жывуць цяпер усе! Пабыў гасцём, і досыць!

У хаце я не застаў нікога. Маці прыходзіла з працы і пайшла зноў. Справілася з усім: падаіла карову і справадзіла яе пастуху, згатавала нешта сабе, з'ела, панесла абед бацьку і сястры на поле. Яны з нецярпеннем чакаюць матчынага прыходу з абедам — з гаршчэчкамі ў махрачы. У гаршчэчках на першае — суп, на другое — грэцкая каша. У маці звісае торба, цісне плячо. У торбе — лыжкі, акрайчык хлеба, свежыя агуркі з свайго агарода. Поле тое за тры вярсты, і, каб не пазніцца, маці спяшаецца, абліваецца потам. Бацьку ж не церпіцца, ён выглядае яе на дарозе, чакае, калі яна пакажацца, злуецца, калі яе ўсё не відаць.

Для мяне ж маці пакінула на стале смачнейшае — яешню і бульбяныя аладкі — дранікі, якія, яна ведае, я люблю асабліва. Мяне ўбівае матчына дабрыня. Чым я заслужыў такое?

У хаце незвычайна ціха ад таго, што ў ёй усё прыбрана і нікога няма. Толькі звоняць у шыбы мухі, б'юцца ў шкло. Ад таго, што ў хаце нікога няма і цішыня, я лепш усведамляю сябе, бачу сябе. Хачу нешта зрабіць для маці, каб ёй, калі яна прыйдзе ўвечары з працы, лягчэй было хадзіцца па гаспадарцы. Але нічога не магу прыдумаць. Узяўся за кніжку. Але й кніжку адкінуў. Пацягнула да сшытка, куды я часам запісваю, што мне набяжыць. Вось і набегла:

Ціхі захад у лагчынах
сонца тушыць.
Гоніць статак на спачынак
свой пастушка.

Жыта коласам багатым
даспявае.
Падганяе яна статак
і спявае.

Спеў ліецца і па палі
і па рэчцы.
Кіне яна быстры погляд,
усміхнецца.

Асядае пыл на плечы
і на косы.
У траву халодны вечар
роніць росы.

Яркнуць радасцяй нязнанай
яе вочы.
— Сенажаці, лес, паляны,
добрай ночы!

Няўжо гэта пра яе? Дзіўна!

Сонца ўжо — бачу ў вакно — барабаніць залацістым дажджом у дах школы, заліло сваім бляскам усю сцяну, промнямі, быццам якім вастрыём, праколвае сасновы бор, заходзіць — хутка вечар. Пайду ў агарод, нарэжу бацвіння парсюку, пасяку, будзе чым карміць, як прыбяжыць маці з поля. Накалю дроў, знайду смалякоў — маці лягчэй будзе распаліць у печы сырыя дровы. Трэба ж будзе нешта гатаваць на вячэру.

Бацька ўвайшоў на двор з касою на плячы — брыгадзір усё-ткі і сёння паслаў на касавіцу, не даў, як абяцаў, лягчэйшай працы. Пагавару з ім зноў, а то й з самім старшынёй — бацька выбіўся з сілаў, ды й з страўнікам нешта ў яго не ў парадку.

Маці з сястрой жалі — прыйшлі з сярпамі. Бацька з двара ўвайшоў у хату, зірнуў на мяне, але нічога не сказаў, лёг адпачыць. Маці з сястрой узяліся за сваю жаночую працу. А мне —сорамна, ніякавата. Пайду заўтра на працу — касіць.

Маці высыпала на стол — зварылася ўжо — з чыгунка бульбу. Пасыпала ўкропам. Ядзім з кіслым малаком — смачна. Гэта і ўсё — нанач наядацца нельга.

Не паспелі вылезці з-за стала, як прыбег Вяркееў — ведаю, будзе запрашаць мяне некуды пайсці з ім на вечар.

— Лявонавіч (гэта ён да майго бацькі), намахаліся ж за дзень касою, дык па аднэй не зашкодзіць, косці памякчэюць,— і дастаў з кішэні паўлітра.

— Можа б, яно і не зашкодзіла, Сямёнавіч, ды нечым закусіць — цыбулька толькі.

Маці засаромелася: як бацька мог сказаць такое пры настаўніку?

— Ды, можа ж, знойдзецца што й да цыбулькі,— сказала яна.

Паспешна пачала прыбіраць на стол, запрашаючы Вяркеева садзіцца. Маці ведала — бацька хоча выпіць. Гэта ж рэдкі для яго дар. Калі такое зноў надарыцца? Купляць самому — купіла няма. Гарэлка стала дарагою ў кааператыве. Бацька па гарэлцы не сумаваў — не піў. Толькі калі да якога свята гнаў яе, і ўжо тады, у кампаніі, любіў выпіць і заспяваць якую-небудзь, абавязкова сумную, песню. Маўклівы, рабіўся гаваркім і вясёлым. З бяды, нягледзячы на свой страўнік, бацька мог, што называецца, і запіць. Тады ён бунтаваўся, быў нязгодным, аж пакуль, ап'янелы, не расслабляўся слязьмі.

Вяркееў разліў свой паўлітэрак на нас траіх (маці ніколі нават на губы не брала гарэлкі). Выпілі. Я рады, што бацька загаманіў — мяне мучыла ягоная маўкліня. Але Вяркееў ірваўся ўжо з хаты, увесь час сігналізаваў мне сваімі вірлівымі вачыма.

— Ну, ваша дзела маладое. Ідзеце, гуляйце!

Невядома было, ці гэта тычылася толькі Вяркеева, ці й мяне. Мы выйшлі. Маці толькі й паспела сказаць:

— Надта ж не пазніся.

Пра сваю гутарку з упаўнаважаным я не сказаў Вяркееву, хоць, дапушчаю, ён ведае пра яе. Я нічога не гаварыў пра гэтую гутарку і ў хаце.

— Ну, куды свіснем?— пытаецца ў мяне Вяркееў.

Я, канешне, і не думаў заходзіць да Вусціна, каб ён завёў мяне да той, што «доўга не ламаецца», і адказаў Вяркееву:

— Куды хочаш свішчы, я нікуды не пайду. Глядзі, якая прыгожая ноч! А месяц! Такога болей ніколі не будзе! Пойдзем да ветрака, адтуль, з вышыні, ты пабачыш, якое прыгожае ў месячным святле макранскае наваколле! Ты жывеш тут ужо колькі гадоў, а тутэйшага хараства і не прыкмячаеш. Гэта ж проста зачараваны край, а ты не можаш спазнаць яго. Хочаш пакінуць гэты край.

Вяркееў, як бы раззлаваўшыся:

— Табе ўсё высокая матэрыя, а мяне вабіць нізкая матэрыя. Пройдзем на вёску, я адскочу на хвілінку, а ты пачакаеш.

— Што такое ў цябе?

— Ведаеш, калі на тое ўжо пайшло,— прызнаюся табе — бяда. Папаўся. Але, можа, як яшчэ й абыдзецца.

І Вяркееў расказаў мне пра *сваю* Акуліну, маладую і,

як ён сказаў,— «дзябёлую» дзеўку, прыбіральшчыцу ў школе. Напачатку Акуліна прыходзіла прыбіраць — мыць падлогу — разам з сваёю маці, потым пачала ўпраўляцца сама. Прыходзіла Акуліна мыць падлогі ў суботы, калі не было заняткаў. Вяркееў ніколі не звяртаў на яе нейкай асаблівай увагі — непрыгожая, «грубая матэрыя». Мые ну й мые — нехта ж мусіць мыць. Ды аднойчы выйшаў Вяркееў з свае кватэры — невялікага пакойчыка — на калідор. Здзівіўся: у ягоны клас адчыненыя дзверы. Стаў у пройме адчыненых дзвярэй і пабачыў... упершыню пабачыў — Акуліна, нагнуўшыся, шаруе анучай падлогу. Павернутая да яго задам, шпарка ходзіць — туды і сюды. Кароткая сукенка на ёй, задраўшыся, лезе на спіну, агаляе ейныя пругкія ікры. Яна не прыкмячае настаўніка — робіць сваё, а ў Вяркеева памутнелі вочы — такой спакусы ён яшчэ не бачыў. Заманіў Акуліну ў свой пакойчык, і сталася тое, чаго не магло не стацца.

Школа цяпер пустуе — лета, няма заняткаў, і Акуліне нязручна заходзіць у школу без дзела, а Вяркеева яна хоча мець. Выйшла з хаты спаць на двор, у імшанік, куды цяпер і хоча на хвілінку «адскочыць» Вяркееў. Ён хацеў бы і збавіцца ад яе, але не можа — цягне, ды й яна горнецца да яго ўсёй душой, жаркая, ліпкая. Пастанаўляе не йсці да яе, а наступіць вечар — не можа ўстрымацца, бяжыць да яе. Пагатоў, што яна быццам ужо зацяжарала, і яму ўжо не адчапіцца ад яе — ухлёпаўся. А мо яна толькі пужае яго? Можа, яно як і пройдзе. «Я хутка спраўлюся»,— гаворыць Вяркееў. А мне не па сабе: чаму я мушу яго чакаць, пакуль ён «справіцца»? Міжволі мяне ахоплівае ўяўленне таго, што чакае Вяркеева ў Акуліны.

Мы ўжо на Акуліііным панадворку. Месяц свеціць, як назнарок, зырка. Ніякага ценю — нас могуць пабачыць з вокнаў бацькі Акуліны. Як праз міннае поле, праскочылі панадворак. Апынуліся ў садзе. Вяркееў ціхенька стукае ў сцяну, за якою спіць Акуліна. Чуткая, яна саскоквае (чуваць было) з свайго ложка — чакала, не спала. Адсоўвае завал у дзвярох, і Вяркееў ныраe ў тыя дзверы, як у якую яміну. Я толькі цяпер усведаміў, у якіх дурнях я апынуўся. Хаваюся ў цені разложыстай грушы. Ды сад, увесь заліты месячным святлом,— здрадлівы, выкрывае мяне. Мне трэба было пакінуць Вяркеева, не чакаць яго, пакуль ён «скончыць». Але мне ўявілася ў гэты момант Акуліна — у кароткай начной сарочцы, і я стаю, не йду, чакаю Вяркеева.

Вось Вяркееў ужо «справіўся», выходзіць ад Акуліны.

— Выбачай. Здаецца, я не забавіўся надта. Каб яна мяне хутчэй адпусціла, я сказаў, што ты жджэш мяне.

Мяне, як апякло,— нашто ён сказаў, што я тут. Асыстую, ці што?

Пачуліся дзявочыя галасы — зацягнулі песню, такую сумную і павольную, што здавалася, некага недзе хаваюць.

— Сядзяць яшчэ, дуры. Не йдуць спаць,— азваўся Вяркееў.— Зайшоў бы й ты да якой, а то глытаеш слінкі.

Мяне гэта раззлавала, але я змоўчаў. А чаму «раззлавала»?— запытацца б. Слінкі я ткі глытаю. У яго ўсё проста, а ў мяне — складана.

Падышлі да дзяўчат. Яны, як і заўсёды, на сваім месцы, пад хатаю дзеда Мельніка. Мельнік іх не гоніць. З нашым прыходам дзяўчаты сціхлі — сумеліся.

— Дзеўкі, во яшчэ два жаніхі прыйшлі. Не зявайце. Запрашайце ў клець. Добрыя хлопцы.

Гэта жартуе Вусцін. Ён сядзіць паміж дзяўчат, шчыпліць іх, лезе з рукамі куды не трэба. Абараняючыся, яны калоцяць яго кулакамі, невядома — напраўду ці ўяўна.

— А можа, яны ўжо былі ў клеці і другі раз, можа, не захочуць,— адказала Вусціну нейкая, відаць, самая баявітая.

— Калі б былі ў клеці, рана так бы не выйшлі.

—Зашмат ты ведаеш, мой ты Вусцінчык,—кпіла з Вусціна *баявітая* і, абнімаючы яго, прыгаворвала:

— Дай я цябе, міленькі, пацалую.

— Вытры перш свае лыпы... тады,— падняўся Вусцін і падышоў да мяне. Я насцярожыўся — што ён скажа? Вусцін узяў мяне за плячо, адвёў убок і ціха, каб не пачулі, прамармытаў:

— Пойдзем. Завяду. Да Агапкі. Яна хоча цябе.— А потым: — Чаму ты не зайшоў да мяне?

— Вусцін, пакінь мяне, прашу,— адказаў я ў злосці, і мяне пачулі дзяўчаты.

— Не хоча!— як адсек Вусцін.

Дзяўчаты выбухнулі смехам.

Абсмяяныя, мы не ведалі, як адысціся ад іх. Ды гонар загаварыў у нас, і мы пайшлі.

— Узыдзем да ветрака?— запытаўся я.

— Не. Пайду спаць. Правядзі мяне да моста, і я пайду. А ты йдзі да ветрака.

Я рады, што ён пайшоў. Але мне сумна аднаму. Мне не хапае некага. Некага, хто мог бы быць *разам* са мною. Вяр-

кееў не быў са мною. Ён быў з *сабою,* далёкі мне. Я быў з ім, але мая душа адварочвалася ад яго, баранілася. Вяркееў кажа, што я нерэальны, а я не люблю яго, *рэальнага.*

Вяркееў пайшоў, а я застаўся адзін на мосце. Ад месячнага святла мяне бароніць, хавае ў свой цень схіленая над мостам разлогая вярба. Месяц заліў, напоўніў сваім святлом усю паднебную прастору. Куды ні зірнеш — усюды святло. Я люблю такую ноч. Ад месячнага святла вочы не жмурацца, як ад сонца. Зрок вастрэйшы, больш праніклівы. Месячнае святло хмеліць, п'яніць, узнімае сілу, і табе хочацца загаварыць з цэлым сусветам.

З моста я ўзняўся на свой узгорысты, дзе школа, бераг. Адсюль, з узгорка, пабачыў агеньчык у *ейным* акенцы. Гэтак позна? Агеньчык выдаўся мне гэткім цёплым, мяккім. І мне захацелася пайсці на гэты агеньчык. Спусціўся зноў на мост. Перайшоў яго. І я пад *ейным* вакном. Гляджу — сядзіць за сталом. Твар асветлены лямпай. Засяроджаная. Вейкі апушчаныя — чытае. Вось яна прыўзняла галаву — кідкі пагляд. На ёй — узорыстая начная кашулька, адкрытая на грудзёх. Што яна чытае? Вось яна вылазіць з-за стала, звабная, стройная. Тушыць, дзьмухнуўшы ў пузырок, лямпу. І я больш не бачу яе. Застаўся ў вачох толькі ейны вобраз.

Назаўтра, прачнуўшыся (гэта была нядзеля), даведаўся, што мае адбыцца нейкі важны сход калгаснікаў і што дзеля гэтага перапыняюцца ў калгасе ўсе працы, нягледзячы на тое, што пагода стаіць добрая і можна б было шмат чаго надрабіць у полі. Мая пастанова пайсці сёння касіць не здзейсніцца.

У хату ўваходзіць старшыня калгаса — чаго гэта ён? — ветліва вітаецца, загаворвае з бацькам:

— Я, Лявонавіч, гэта да сына твайго.

І ўжо да мяне:

— Масеевіч, сёння ты нам патрэбен. Пушчаем на подпіс «Ліст беларускага народа таварышу Сталіну». Ліст напісалі беларускія паэты, дык каму яго чытаць і тлумачыць, як не табе. Ты ж сам, можна сказаць, пісьменнік і добра ведаеш іхныя рыфмы. Гэта табе будзе як грамадская нагрузка. А як жа, ты ж студэнт, дзяржава цябе вучыць, дык мусіш ёй адплачваць. Не ўсё ж табе лынды біць.

Старшыня ўручыў мне «Ліст», сказаў падрыхтавацца да выступлення на дванаццатую гадзіну. Сход будзе на вуліцы, ля нашай хаты. Вынесуць для прэзідыума стол, а людзі рассядуцца дзе як хто, не вялікае панства.

«Ліст» я ўжо чытаў у перыядычным друку. Напісаны ён беларускімі паэтамі калектыўна, на чале з Янкам Купалам. Першымі напісалі вершаваны ліст Сталіну грузіны, і ад іх пачалі браць прыклад іншыя рэспублікі, адна перад адной навыперадкі, спяшаючыся засведчыць сваю адданасць праваддыру, усхваляючы яго на ўсе лады, выказваючы яму падзяку за ўсе дасягненні, якіх не было б без яго. Усё забавязанае ягонаму генію. У «Лісце» было намалёвана самае бязбеднае жыццё ў Беларусі. Асабістыя подпісы беларусаў павінны пацвердзіць гэта.

І вось я за сталом у прэзідыуме. Побач мяне старшыня, Вяркееў, брыгадзіры, рахункавод, кладаўшчык. Наўкола размясціліся калгаснікі — мужчыны і жанчыны, хто дзе: на прынесеных лаўках, услончыках, на жэрдзях пад плотам, а найбольш — на зямлі, падмеценай і цвёрдай, як ток. Дзяўчаты купкамі стаялі наўзбоч. Перад сталом, унізе, паселі малыя.

Для слова адкрыць сход падняўся старшыня. Гоман прыціх: што ён скажа? Чаго гэта так сагналі ўсіх?

Старшыня — ён быў ужо выпіўшы — пачаў:

— Ну, чаго вы развесілі вушы? Манны ад мяне чакаеце, ці што? Бачу, сабраліся сюды дружна, не так як на працу, вашу... Ну ды ладна. Наш паважаны студэнт, пісьменнік, наша, можна сказаць, кроў, Мікола Масеевіч, прачытае вам зараз ліст нашаму дарагому Сталіну. Слухайце і не смейцеся, такую вашу... Падпішаце ўсе як адзін гэты ліст — умее хто ці не ўмее стаўляць каракулі. Круціць хвастамі, прашу, не круціць. Вашы подпісы пойдуць у сельсавет, у раён, а там і далей, аж да саменькага Сталіна.

Я пачаў чытаць. Прызнаюся, што не так, як трэба было б. Я чытаў занадта хутка, гнаў — як бы перада мною сядзелі самі паэты, якія яго напісалі. Чытаў з запалам, натхнёна, спадзеючыся, што такім спосабам я дасягну найбольшага эфекту. Ды не тут тое было. Напачатку, можа, якую хвіліну-дзве, мяне слухалі ўважліва, а потым, калі стаміліся ад майго малачэння, перасталі слухаць, пачалі гаманіць, кідаць рэплікі, якіх я не разумеў, смяяцца. Каб гэта быў нехта іншы, напрыклад, прадстаўнік з раёна ці хто з сельсавета, яны цярпліва слухалі б, а я быў свой, мяне не баяліся, мяне можна й не слухаць.

Старшыня, расчырванелы, заклікаў да парадку, але гэта яму мала ўдавалася (ён таксама быў свой). Чытанне маё перарывалася. Вяркееў падказваў мне, каб я чытаў павальней, не спяшаўся, больш тлумачыў. Ды ўжо сход

выйшаў з-пад кантролю, і яго цяжка было наструнiць. Дзяўчаты прыскалі ад смеху, нешта паказвалі мне на пальцах, а я яшчэ болей бянтэжыўся: я ўпершыню выступаў на такім людным сходзе. Асабліва я быў збіты з тропу, калі дайшоў да таго месца ў «Лісце», дзе апісвалася заможнае жыццё калгаснікаў. Узняўся яшчэ большы гоман, смех, пайшоў у ход досціп, і я не ведаў, як мне быць. Ды мае аднавяскоўцы, відаць, шкадуючы мяне, трохі ўгаманіліся, далі мне магчымасць чытаць далей. Але зноў жа не маглі стрымацца, калі я дайшоў да радка «і дзяўчаты ходзяць у шаўку». Выбухнуў смех. Дзяўчаты, што стаялі збоч, былі не толькі не ў «шаўку», а босыя. «Глядзеце, як надзеў іх Сталін,— прост вуліцу мятуць шоўкам». «Чытай, чытай, Масеевіч, далей — што там яшчэ?» Яны пачалі ўважліва слухаць мяне, але я, збянтэжаны, пачаў збівацца, чытаць невыразна, рабіць памылкі, быццам бачыў гэты тэкст упершыню. Неяк дачытаў. Сеў, засаромлены. Вяркееў кінуўся ратаваць справу, звярнуўся да калгаснікаў з словам пра значэнне «Ліста», сказаў, што кампанія па зборы подпісаў праводзіцца па ўсёй Беларусі і што працоўныя рэспублікі з энтузіязмам ухваляюць ліст, кладуць свае подпісы пад ім. Гаварыў, што «Ліст таварышу Сталіну» натхняе працоўных на далейшыя здзяйсненні. Падпісацца ўсіх настойліва заклікаў і старшыня калгаса. Але шмат хто не хацеў падыходзіць да стала падпісвацца.

— Як нашы подпісы пойдуць у сельсавет, у раён і далей, дык я не падпішуся, хоць вы тут трэсніце. Я не ведаю, што там зробяць з маім подпісам. Як на яго паглядзяць.

Гэта сказала Хадоська, удава, што не прапусціць ніводнага сходу і не пасаромеецца сказаць, што ёй узбрыдзе на вум. Любіць «шарахнуць», як пра яе гавораць.

— Нічога з табой не станецца, як падпішышся. Як не падпішышся, во тады...— даймаў яе старшыня.

Старшынёва папярэджанне было ўспрынята сходам як пагроза, і ўсе падпісаліся пад «Лістом Сталіну».

Я страшэнна быў незадаволены сабой. Называецца, «выступіў». Пайшоў у хату — маці гукала есці.

Толькі селі за стол, як прыйшла Агапка, нашая вясковая дзяўчына. Яна скончыла сямігодку і нібыта хоча параіцца са мною, куды ёй паступіць далей. Але ейны прыход быў успрыняты інакш — яе цікавіць не вучоба, а нешта іншае. Гэта ўжо не першы раз, што яна прыходзіць да нас у хату, робіць мне нязручнасць, запрашае мяне куды-небудзь пайсці з ёю — то ў калгасную канцылярыю рабіць на-

сценную газету, то на танцы, то проста пагуляць, прайсціся з ёю па вуліцы. Але я не магу прыняць ніводнай ейнай прапановы: не хачу з ёю звязвацца. Аднойчы было й пагадзіўся, выйшаў з ёю на вуліцу, дык яна адразу мяне пад руку, шчыльна туліцца, а мне ад сораму хоць праз зямлю праваліся — я ніколі ні з кім не хадзіў пад ручку, ды яшчэ па вуліцы, каб усе глядзелі на цябе. Гэта толькі яна можа вытрымаць, не гнуцца пад позіркам усёй вуліцы. І я заракся — нікуды не хадзіць з ёю. Але й не хацеў яе крыўдзіць. Я ж студэнт і мушу абыходзіцца з ёю культурна, не паказваць сябе дзікуном. Яна бязмала таксама студэнтка, калега мне. Па-свойму мне нават шкада яе. Вось і цяпер — сядзіць на лаўцы, спрабуе загаварыць, але ні бацька, ні маці, ні сястра ў гаворку з ёй не ўступаюць. Маўчу і я. Ветлівасць вымагала б запрасіць яе за стол, але гэтая традыцыя была парушаная ў дачыненні да яе: бацькі не лічылі яе роўнай мне і паставіліся да яе досыць непрыхільна. Ёй няёмка, яна не ведае, як ёй быць, круціцца, ёрзае на лаўцы. Я сяджу, як на вуглёх, раблю перад бацькам выгляд, што не цікаўлюся ёю. Мне здаецца, што маці добра ведае, чаго яна прыйшла, і гэта яшчэ больш бянтэжыць мяне. Мне сорамна, што дзяўчына сама завітала да мяне ў хату гэтак адкрыта. Трывае нязносная напружанасць і маўчанка, толькі чуваць, як бацька сярдзіта сёрбае, паскорана сіляючы з міскі капусту. Нарэшце мы скончылі есці. Я вылажу з-за стала, яна злазіць з лаўкі, жэстамі і рухамі выводзіць мяне з хаты. За дзвярыма ўлавіла маю руку і, разагрэтая, зіхатлівая, у нецярпенні мала не цягне мяне праз варотцы ў наш сад, дзе яшчэ з мінулага лета стаяў будан: бацька начаваў там, калі даспявалі яблыкі, каб ніхто не абтрос іх. Агапчыны бацькі — нашыя суседзі, іхны і наш двор перагароджаны толькі невысокім плотам, і, канешне ж, Агапка ведае пра існаванне ў нашым садзе гэтага будана. Ашчаперыла мяне аберуч за шыю і сунецца задам, цягне да будана. Пры самым уваходзе ў яго падае наўзнік. Самлелая, ціха ляжыць, як у непрытомнасці. Я маруджу... Рыпнулі варотцы — маці. Я ўскочыў. Маці ўжо выходзіла праз заднія дзверцы ў поле, як бы нічога не пабачыўшы. Агапка, узняўшыся, аплявушыла мяне з усяго маху. Пайшла прэч не азірнуўшыся.

Куды мне дзецца цяпер? Я прапаў. Як мне паказацца на вочы бацьком? Што яны падумаюць? Шануюць, шкадуюць, вераць у маю чысціню.

Гэта ўжо не першы выпадак са мной. Было ўжо і раней... Сямігодка, у якой я вучыўся, была за дванаццаць кіламетраў ад нас, і я прыходзіў дахаты толькі на выхадныя. У панядзелак рана, з хатулём за плячыма, вяртаўся назад у сваю школу. Калі было разводдзе, бацька, надзеўшы боты з высокімі халявамі, прыносіў мне харч сам — маці баялася, каб я, замачыўшы ногі, не прастудзіўся. Амаль кожны раз — туды і назад — са мною разам хадзіла ў тую ж самую школу адна дзяўчына з Мокрага Другога, старэйшая за мяне на пару гадоў. Заходзіла да нас у хату, калі была гатовая ў дарогу раней, як я, чакала, пакуль мяне збярэ маці, і мы, ужо гатовыя, выходзілі з хаты, накіроўваючыся ў нашу далёкую школу. Або я заходзіў да яе, чакаў, пакуль яна збярэцца. І так узапар колькі год. Я лічыў яе прыгожай, паважаў, і мне як бы не хапала яе, калі я не бачыўся з ёю. Па дарозе ў школу мы ўвесь час няспынна гаварылі, у нас заўсёды было пра што гаварыць. Мы ішлі і праз лес, і праз поле, праз сенажаці, пераходзілі рэчку — прыгожа было, лёгка, асабліва вясною. Не чулі сваіх хатулёў за плячыма. Аднойчы, калі мы вярталіся з школы дамоў (была якраз вясна), яна (яе звалі Наташай), з кветкамі ў руках, што яна назбірала па дарозе, з нейкай асаблівай пяшчотай развітвалася са мной перад нашай хатай, і мая маці бачыла ў вакно гэтае нашае развітанне. Невядома, што маці здалося. Толькі, калі я ўвайшоў у хату, маці адразу папрасіла мяне за стол, дала есці. Я бяруся за лыжку і ем. Маці то падыдзе да стала, пакладзе нешта, адыдзе, то зноў вернецца. Я гэтага не заўважаю — гэта для мяне звычайна. Ды чую — маці нешта сказала: я не ведаю дакладна, што яна сказала, але мяне тое пачутае раптоўна апякло, абдало ўсяго гарачынёю, градам пырснулі слёзы. Кінуў лыжку, выскачыў з-за стала: маці ўпікнула мяне Наташай. І я перастаў разам з ёю хадзіць у школу.

Я цяпер разумею, як аберагала мяне маці, баючыся, што, недасведчанага і неспакушанага, мяне можна лёгка спакусіць. Вось тое самае і з Агапкай. Дурнота, і ўсё.

Расчулены, бягу куды вочы глядзяць. Забягаю на могільнік, што недалёка ад нашае хаты. Там высокія, гонкія сосны. Такіх соснаў нідзе няма. Таемны шум-гоман. Услухайся ў яго. Гэта табе яны шэпчуць, гамоняць. Пытаюцца, ці ты з імі заадно, ці ты чуеш іх. І я сапраўды чую іх, ад іхнай гамонкі мне лягчэй. Я прыракаю ім, спагадным, што я чысты, і ад мяне чыстага, яны прымаюць споведзь. Я спавядаюся перад імі і яшчэ... перад маці. Я ўпэўнены,

маці ведае, які я — спакуслівы, але не спакушаны... Нехта ўсё-ткі зваліў тут сасну. Падаючы, яна памалаціла драўляныя крыжы. Угары, дзе яна даставала сваёю галавой неба, цяпер прагаліна: адышла адна з сясцёр і болей не вернецца. Можа, таму гэтак тужліва шумяць сосны.

Шыбую да моста — можа, *яна* там. Не, няма. Няма ні яе, ні гусей, ні хлапчукоў. Яны купаліся, калі пякло сонца, цяпер жа яно нізкае, і купанне скончылася. Можа, яна на астраўку з гусямі? Але нашто яна мне. Не, мне яна патрэбная. З яе я зрабіў казку. Ад гэтай казкі харашэе мая душа, яснее, расце, удасканальваецца. Але што гэта я пляту? Гэта ж зусім не тое, што я хачу сказаць. Гэта ж літаратура, а літаратурай не выкажаш душы, усё будзе толькі прыблізным, а значыцца, несапраўдным. Будзе літаратура. У мяне няма адзіных, сапраўдных слоў. Усё гэта толькі цьмяны адбітак іх. Я не люблю сябе за сваю няздольнасць адтварыць найменшы рух свае душы і, можа, таму, што не магу гэты рух улавіць і ўсведаміць. Ты хочаш быць абсалютна праўдзівым, хочаш сказаць пра сябе ўсю, поўную праўду, а не можаш — усё-ткі нешта хаваеш. Баішся гэтай поўнай праўды. Думаеш, калі скажаш, тады ўжо не будзе цябе, гэта будзе ўжо нехта іншы, не той, кім ты сябе выстаўляў, цябе разлюбяць і пакінуць, ты проста перастанеш быць чалавекам. Няўжо чалавеку трэба маскавацца, каб быць чалавекам? Думаю, што так. Я, напрыклад, адкрыты чалавек, нават больш, чымся трэба, і таму часта станаўлюся лёгкай здабычай іншых. У кожным разе ўсё, што я цяпер пішу,— гэта толькі напаўпраўда. Поўная тады, калі я выварочваю сябе, крытыкую, адмаўляю сябе, не баючыся паказаць самае адмоўнае ў сабе.

Я ў нашым «Цэнтры». Тут сёння пуста. Праўда, сельпо адчынена — ідзе рэвізія. Ці, дакладней, каапператар рыхтуецца да рэвізіі, махлюе, хоча, калі прыедуць рэвізоры, выкруціцца, паказаць, што ў яго ўсё чыста-гладка. Тут жа і фінагент — дапамагае. Гэты ўбачыў мяне. Выходзіць.

— Шкадую цябе, таму і гавару. Чуў, што ты не ўправіўся з «Лістом Сталіну». Кажуць, каб не Вяркееў, быў бы поўны правал. Сход быў бы сарваны, і ніякіх подпісаў пад «Лістом» не было б. Гавораць, ты чытаў «Ліст», а сход смяяўся. Нейкі ты нехлямяжы... І чаго ты тырчыш тут. Не змываешся. Не разумею.

Адбрыў і пайшоў назад, у лаўку. Адкуль ён даведаўся пра той сход? Вяркееў цюкнуў?

Сонца зніжаецца павольна, але прыкметна. Калі паста-

іш з хвіліну ціха, бачыш, што яно асядае. Вятрак на ўзгорку ўвесь у золаце. Гарыць. Як падсвечаны. Ціха стаяць задумнай сцяною на левым баку рэчкі жыты. Вечарэе...

Да Вусціна не пайду. А куды? Дахаты? Не. Праходжу паўз Дусіну хату. Забачыўшы мяне, стукае ў шыбіну ейная маці і рукою паказвае, каб я зайшоў. Заходжу — прыехаў Ягор. Два гады не бачыў яго, з таго часу, як ён паехаў у Віцебск у ФЗУ. Вітаемся. Але хто гэта яшчэ з ім? Ягор, радасны, вясёлы, знаёміць мяне. Яна называе сябе Эмай. Значыць, нетутэйшая — гарадская. У нас такіх імёнаў няма і не можа быць. Хачу дзеля ветлівасці сказаць нешта Эме, але не магу — не выходзіць. Я не чакаў тут ніякай Эмы.

— Праходзь, праходзь, даражэнькі,— гаворыць мне Дусіна маці.— Я ж табе казала, што прыедзе наш Ягорка, дык, бачыш, і прыехаў. І не адзін, бачыш, а і з нявестай— свадзьбу будзем спраўляць. Яны ж зразу і ад'яжджаюць. Прыехалі паказацца нам, старым, а там і наўцёкі. Во як, мой ты даражэнькі. Хацелі толькі запісацца ў сельсавеце, а я не — свадзьба! Была б царква, дык і ў царкву... Ды што ета я загаварылася? Праходзьце, чаго ета мы ў парозе стаім? Каб жа я знала, літру купіла б. Цяпер ужо лаўка закрыта. Ты недзе, стары, прыхаваў... ёсць у цябе недзе бутылка якая? Гналі ж нядаўна. Не выпіў жа ўсю.

Эма загаворвае з бацькам Ягоркі, прыглядаецца да Дусі. Ягор дастае з свайго куфэрка нейкія рэчы — падарункі для маці і бацькі. Я стаю і гляджу. Дуся чакае, што дасць брацік ёй.

— Табе дасць нешта Эма.

Эма выцягвае з свайго багажу (яны яшчэ не распакаваліся) прыгожую блузку:

— Надзень-ка, ці падыдзе.

— Скінь жа перш кашульку,— сказала Дусі ейная маці.

Дуся не слухаецца.

— Ну, пасля прымераець. Сароміцца Масеевіча. Грудкі вунь пайшлі ўжо,— сказала Хіма.

Узяла з рук Эмы блузку, павесіла ў шафе. Захадзілася па хаце, пачала, спяшаючыся, рыхтаваць — і тое, і другое, і трэцяе, накрываць на стол, садзіць гасцей, у тым ліку і мяне. Ейны «стары» дастаў з падполля дзве бутэлькі сівухі, свайго вырабу самагонку. Запалілі вісячую над сталом лямпу. Святло ўпала на белы, чысцюсенькі абрус, настала свята. Хіма ўжо ўсіх усадзіла за стол, толькі я стаю — мне трэба дахаты, мяне там чакаюць. Гадаюць, дзе я? Што са мною? Не вячэраюць — чакаюць мяне. А мяне тут са-

дзяць. Дусіна маці ўгаворвае мяне, я аднекваюся. Я мусіў бы быць ужо дома. Стаю, не саджуся за стол. Няўгледна Дуся (дзіўна, я называю яе ўжо Дусяй, і мне стала гэта падабацца) паспела ўжо надзець блузку, што ёй падаравала Эма, і цяпер, седзячы за сталом, уся зіхціцца, прычэсаная, зыркая, радасная. Хіма ўсё-ткі ўгаварыла сесці мяне за стол і якраз усадзіла мяне побач Дусі. Насупраць мяне, праз стол, сядзіць Эма, Дусін бацька з Ягоркам сядзяць на покуці. Дусіна маці пачала падаваць на стол. Сама не садзілася яшчэ. Сказала, яна прымосціцца дзе-небудзь, як управіцца,—«кыла сваёй дарагой нявестачкі». Гаспадар наліў у шклянкі гарэлкі — усім, апрача Дусі. Ёй маці прынесла малака з белым хлебам, што, відаць, прывёз Ягорка з Віцебска. Выпілі за прыезджых, за гасцей. У лік гасцей Дусін бацька залічыў і мяне. Пілі ўжо па другой, заядаючы. Я саромеўся, што са мною гэтак блізка сядзіць Дуся, не мог з ёю гаварыць. Распачаў гаворку праз стол з Эмай. Ад гарэлкі язык мой развязаўся. Эма была радая, што я зачапіў яе,— разгаварылася са мною, як бы з даўнім знаёмым. Выклала ўсё: і дзе яна нарадзілася, і хто ейныя бацькі, і дзе яна вучылася, і што яна робіць, і як яна пазнаёмілася з «сваім Ягорушкай». Дусіна маці прысела да яе і ўважліва слухала, вывучала «нявестачку». Гаспадар гаварыў найбольш з сынам, не забываючы частаваць гасцей сваім першаком, самай моцнай гарэлкай, што ідзе з апарата на самым пачатку. Пазнейшая гарэлка — гэта адгон. Ён слабейшы. Пяршак гарыць, як спірт, адгон — не. Хіма зацягнула на вокнах «гардыны» з мяшка. Стала больш утульна. Хоць гэтая ўтульнасць пачулася хутчэй ад першака. Стол ужо загаманіў — гудліва, працяжна, галасна. Асабліва была звонкай Эма, яна заглушала ўсіх, не слухала, што гавораць іншыя, звярталася толькі да мяне, выцягваючы сваю доўгую белую шыю і кладучыся на стол сваімі адвіслымі грудзьмі. Глядзела на мяне як бы спадыспаду — знізу угору, на мае грудзі, а не ў вочы мне. Хіма пазірала на яе з нейкім здзіўленнем — думаю, Эма рабіла на яе хутчэй адмоўнае ўражанне. Я гавару з Эмай, але чую каля сябе Дусю, што, прытаіўшыся, слухала маю з Эмай гаворку і быццам шукала зручнага моманту перапыніць яе. Эма, пабачыўшы, што я станаўлюся няўважлівым да яе, павярнула сваю гаварыльню да свякрухі, і было відаць, як Хіма ўжо здаволілася ёю, сваёю, можна ўжо сказаць, нявесткай: глядзела на яе ўсмешліва-ласкава, датыкалася да ейнага пляча рукой, нахілялася да яе, калі гаварыла ёй

нешта на вуха. Ягор захоплена, выглядала, увайшоў з бацькам у нейкую дзелавую гутарку і не звяртаў увагі на іншых. Мяне для яго як бы не было. Я ўзяўся за сваю шклянку, пацягнуў яшчэ раз. Адчуў цеплыню. Гарэлка пайшла па жылах. У вушох зашумела. І мне было гэтак добра — ад шуму-дажджу ўнутры, ад таго, што выпіў, і ад таго, што побач Дуся. Яна сядзела каля мяне, як пад крылом, і, сцішаная маўчала, быццам слухаючы мяне. Ейны бацька (пара ж яго ўжо назваць) Піліп, што дасюль, можна сказаць, не звяртаў на мяне ніякай увагі і, здавалася, быў не надта задаволены маёй прысутнасцяй, прывітаў мяне, быццам толькі цяпер угледзеўшы мяне за сталом:

— Што там чуваць у тваім Мінску? Там жа ўсе навасці, у нас жа тут нічога не пачуеш,— на вайну не заносіцца?

Я сказаў, што не, не заносіцца.

— Ну дык во й вып'ем за тое, што не заносіцца. Пабяруць вас, калі што. І цябе, майго Ягорку і ўсіх.

Піліп ужо быў п'яны. Праз нейкую паўзу загаварыў зноў:

— А ты, чуў, нешта пішаш у газеты, Масеевіч? Але што ты можаш напісаць, малакасос? Ты ж не ведаеш жыцця. А выдумаць — што ты можаш выдумаць? Нічога. А калі й выдумаеш, дык гэта будзе няпраўда. Вы ўсе цяпер пішаце няпраўду. Хочаш, я табе раскажу адну праўду. Нідзе — ні ў кніжках, ні ў газетах гэтага не знойдзеш.

І ўжо хацеў быў пачаць...

— Татачка!— закрычала Дуся.— Зноў пра ката будзеш?— Спалохалася, з мальбою ў вачох, зірнула на маці.

— Ды кінь ты, стары дурань, ката свайго. Людзі абсмяялі цябе і нас з табою — дражняць катом тваім.

— Ды я хачу Масеевічу расказаць, ён гэта ў газеце прапіша і нас з табою, дура ты гэткая... Вот жа, Масеевіч, наш кот, можна казаць...

— Тата! Любенькі! Не трэба. Не будзем слухаць!— зноў занепакоілася Дуся і сваёю даланёй накрыла бацьку рот.— Не дам табе гаварыць, татачка!

Эма была запярэчыла: «Не мяшайце ж чалавеку — няхай раскажа». Але Ягор махнуў ёй рукой: «Не трэба! Сядзі там!»

Ягор найболей цярпеў ад бацькавага ката. Кожны дзень, бывала, калі ён прыходзіў у школу (у Мокрым яшчэ), вучні пыталіся ў яго нібы сур'ёзна:

— Ну, колькі ваш кот налавіў сёння ўночы рыбы пад

мостам? Усю прынёс дахаты ці з'еў, і табе нічога не засталося?

На школьнай дошцы ў класе рысавалі ката, мост, рэчку. Кот апушчае свой хвост у ваду, і на яго бярэцца рыба. Пад рысункам надпісвалі: «Кот-рыбалоў». А побач рысавалі Ягорку з торбай праз плячо, гатовага класці злоўленую катом рыбу.

Даймалі ў школе гэтым катом-рыбаловам і Дусю. А пайшло ўсё ад таго, што Дусін бацька — Піліп — выпіўшы ў кампаніі, заўсёды пачынаў сваю байку пра ката-рыбалова, які не толькі сам карміўся рыбаю, а й забяспечваў ёю сям'ю свайго гаспадара. Кот выходзіць уначы на рэчку і там вудзіць — замест вудзільна — сваім хвастом. Есць сам і дахаты прыносіць. Мяўкае пад дзвярыма (з рыбаю), каб адчынілі яму.

Піліп апавядаў пра свайго ката гэтак красамоўна, цікава, што яму можна было нават паверыць. Гэтым сваім мастацтвам Піліп, Дусін бацька, праслыў на цэлую ваколіцу. Да Піліпа ставіліся паблажліва і пры кожнай нагодзе прасілі яго расказаць пра свайго незвычайнага ката. Піліпавы слухачы пераміргваліся, сам жа ён гэтага не заўважаў і з усёй пераканаўчасцяй, захоплены сваім апавяданнем, выхваляў мастацтва свайго вучонага ката.

Вось і цяпер Дуся і Ягор баяліся, што ён зноў, як і заўсёды, пачне пра свайго ката.

— Як вы ўжо гэтак закрычэлі, дык я, халеры, паддамся вам. Віп'ю во. А ты чаго гэта прыліпла да чалавека? — строга зірнуў Піліп на сваю дачку.— Дыхнуць свабодна не дасі.

Дуся страпянулася, як пракінуўшыся ад сну.

— Ну, чаго ты накінуўся на дзіцё?— заступілася Хіма за дачку.

— Дзіцё...— прамармытаў Піліп.

Я хачу пайсці, ды чамусьці не магу адважыцца вылезці з-за стала. Сяджу. Каб я не быў выпіўшы, я ўжо пайшоў бы — у мяне не хапіла б адвагі сядзець гэтак доўга за чужым сталом... пагатоў побач Дусі. Разабрацца б, што мне Дусіна сям'я? Што мне Дуся сама? Што мне Ягор? Чаго я прыйшоў сюды? Мяне паманілі, і я — гатоў?

Вылажу з-за стала. За мной вышмыгнула і Дуся. Развітваюся — спачатку з гаспадыняй, потым з Эмай. Дуся думае, што я падам руку і ёй,— чакае. Зірк вачэй — цёплы, ласкавы, прыхільны. Ягор з бацькам застаюцца яшчэ

на покуці. Няхай сядзяць. Падыходжу да парога, каб ужо выйсці. Ягор з-за стала ўзняў руку:

— Пачакай — правяду.

— І я з табою,— смела сказала Дуся.

Узяла брата за руку, вядзе да парога, туліцца да яго. Далучылася да нас і Эма. Мы выйшлі. Мы ідзём на мост — яны праводзяць мяне. Ідзём і не гаворым. Каб што-небудзь сказаць, Дуся пытаецца ў мяне:

— А ты пушчаў мой вяночак на ваду? Ён плывець?

— Плывець,— не думаючы, адказаў я.

Ягор і Эма не разумелі, пра што гаворка. Далі мне «добрай ночы». «Добрай ночы» сказала і Дуся. Якая яна ўсё-такі добрая дзяўчынка! — падумалася.

У вокнах маёй хаты святла ўжо няма — ляглі спаць. Не дачакаліся мяне. Як мне ўвайсці ў хату, каб не пачулі? Маці чуткая. Скрыпну — прачнецца. А мо яна й не спіць? Чакае, каб, калі я прыйду, сказаць, дзе я магу знайсці сабе нешта з'есці. Яна ў нас такая, хліплівая. Душа ў яе хліпціць па кожнаму, можа, найболей — па мне.

Чую — нейкія галасы, рогат на вуліцы. Недзе каля калгаснай канцылярыі. Успомніў — сёння ж наш старшыня дазволіў моладзі танцаваць у канцылярыі. Гэта адзінае прыгоднае для гэтага месца. Хлопцы папрасілі ў старшыні яшчэ на сходзе, калі падпісвалі «Ліст Сталіну». Я чуў, як адзін з іх угаворваў яго: «Падпісалі ж «Ліст», значыцца, зарабілі, дык пусці ў сваю багадзельню патупаць». Дзяўчаты пляскалі старшыні ў ладкі, што дазволіў. Дык вось гэта яны там і «тупаюць». Пайду, можа, там і сястра, з ёю лацвей потым будзе зайсці ў хату. Заходжу. Дзяўчаты заўзята пяраць аб драўляную падлогу сваімі босымі, бацькоўскімі падэшвамі: танцуюць. Былі на сходзе босыя і тут на танцах — босыя. Высока пад столлю пыхціць лямпа, уздрыгвае ад тупацення. Грае гармонік. Б'юць у бубен. Да мяне падбягаюць хлопцы. Адзін з іх просіць мяне разлучыць з ім адну, самую прыгожую, пару, што цяпер кружыцца ў танцы: колькі да гэтай пары ні падыходзілі хлопцы, каб разбіць яе і танцаваць, але харашуняў ніяк не расшчапіць, кружацца, сашчэпленыя, самі з сабой, ведай — пагарджаюць табою, ім давай нейкіх асаблівых хлопцаў.

Калі зачынаюць граць танец, у круг, на пляцоўку, звычайна, выходзяць танцаваць першымі дзяўчаты, і ўжо толькі тады іх разлучаюць хлопцы. Іх рэдка запрашаюць, калі яны, яшчэ не выйшаўшы ў круг, стаяць недзе на

ўзбоччы. Гэта было б занадта інтэлігентна, па-гарадскому.

Я адмовіўся ад прапановы разлучыць ганаровую пару. Угледзеў у кутку сваю сястру з... Агапкай. Сястру запрашае старшынёва дачка, і яны выходзяць танцаваць. Той жа самы хлопец просіць мяне разбіць іх. Дзеля сястры я пагадзіўся. Танцую з старшынёваю. Агапка скоса і злосна зыркае на мяне, калі я з сваёю партнёршаю іду па крузе паўз яе.

Сястра радая, што я тут. Тая ўвага да мяне як да студэнта перападае і ёй. Брат і сястра на танцах — гэта добра: брат можа заступіцца за сястру, калі б які п'янчуга прыставаў да яе або дзеля яе паміж хлопцамі паўстаў бы які-небудзь канфлікт.

Нам яшчэ тут гуляць і гуляць, ды я прашу сястру пайсці дамоў — заўтра ж панядзелак, дый позна ўжо. Мы выходзім. Сястра пытаецца, дзе я прападаў, сам жа стараюся даведацца ў яе, што і як у хаце, ці маці не злуецца, што я не прыйшоў на вячэру.

З сястрой я ўваходжу ў хату смялей. Сястра ні ў чым не вінаватая. Яна запрацавала сабе танцы. Упоцьмах яна намацала нешта з ежы на стале, просіць і мяне ўзяць што.

Я доўга не мог заснуць. Мяне турбавала Агапчына дзела. Як я заўтра пакажуся маці на вочы? Канешне, маці мне нічога не скажа, але як выстаяць самому перад ёй? Калісьці маці магла папракнуць мяне Наташай, тады для маці я быў яшчэ малы, і яна лічыла сваім абавязкам аберагаць мяне ад спакусы. Цяпер не тое — я дарослы, сказаць ёй што-небудзь мне не так ужо лёгка, маці разумее гэта, ды ўсё-ткі яна і цяпер, не спадзеючыся на мой розум, баіцца, каб я не збіўся з дарогі, заставаўся чыстым, як і дасюль, да тэй пары, калі стану жыццёва дасведчаны і буду магчы абраць сабе спадарожніцу паводле развагі, а не толькі паводле інстынкту. І толькі тады, па законе, магу сабе дазволіць адпусціцца. Боязь бацькоў, асабліва маці, дзіўным спосабам перадалася і мне — я й сам баяўся ўліпнуць дзе-небудзь, бярогся, не йшоў на збліжэнне да такой ступені, калі мог бы ўжо пераступіць мяжу дазволенага. Канешне, было тут і іншае — ідэалізацыя жанчыны як катэгорыі чыста эстэтычнай. Змалку бачыў у ёй толькі нябеснае, не цялеснае, толькі прыгожае, да чаго нельга дакрануцца, псаваць. І ўжо будучы дарослым, хоць і даведаўся аб жанчыне болей,— не хацеў разбураць, развенчваць створанага мною раней вобраза. Між іншым, Дуся падтрымлівала ў мяне такі вобраз. Бацька нават

турбаваўся маім такім стаўленнем да жаночага роду. Уночы я неяк падслухаў (не цяпер, раней, калі я спаў у адным з імі пакоі) шэпт бацькі з маткай: «Што ты робіш з яго баязліўца, ён жа будзе тады ўсяго баяцца».— «Гэта не я, ён сам такі».— «Ну дык і дрэнна». Я доўга думаў над тым, што казалі бацькі, хацеў зразумець сэнс пачутых словаў, асабліва бацькава «ну дык і дрэнна». Цяпер я разумею — мяне навучыла Агапка.

Мне прысніўся Вяркееў — вобраз ягоны быў няясны, я ледзьве пазнаваў яго. Выразным быў толькі ягоны голас, званчэйшы, чымся ў сапраўднасці. Вяркееў быццам перадаваў мне сваю Акуліну, сплаўляў, а сам хацеў з'ехаць ад яе. Я не пагаджаўся («Нашто яна мне такая!»), і ён крычаў на мяне з усёй сілы. Доўга вярзлося мне ўсякае, пакуль не заснуў. А прачнуўшыся раніцою, першае, што я пачуў,— бацька клепіць касу на двары. Бацька здзівіўся, што я так рана прачнуўся. Бо ж яшчэ маці была не падняўшыся.

— Чаго ты гэтак успёрся?

— Хачу з табой пайсці касіць.

Бацька, седзячы за кляпаннем, зірнуў на мяне:

— Калі табе так захацелася — пойдзем. А можа б, пагуляў яшчэ?

Я вычуў — бацька рады, што я йду з ім, і толькі для прычэлля гаворыць, каб я пагуляў яшчэ.

Ці гаварыла яму маці пра ўчарашняе? Хіба што не: вочы яго не паказалі гэтага.

Касіць мы пайшлі без снедання. Снеданне нам прынясе сястра пазней. Цяпер яшчэ рана снедаць. Касцы не чакаюць на снеданне ў хаце. Трэба спяшацца, пакуль раса. Сонца прыпячэ — трава не будзе рэзацца. Замудохаешся.

Вось мы й на лузе, на заліўным. Стаіць яшчэ туман — не ўзняўся. Ідзём — расяная трава хвошча па нашых штанінах — у Супырыцу, на ўчастак, дзе бацька касіў у суботу. Яму яшчэ брыгадзір не замяраў скошанага, не падлічыў сотак, казаў, зробіць гэта ў панядзелак. Бацька кажа — можа, выкасіў цэлы гектар. На лузе яшчэ нікога — мы першыя. Не спыніў яшчэ свайго занятку і драч — дзярэ на ўсю сваю моц.

Бацька адмыслова праверыў маю касу, як яна насаджана, ці ў крузе яна, ці вонках яго, ці правільна сядзіць «пупок», не нізка і не завысока, прыгледзеўся да «банькі», як у ёй сядзяць клінкі,— агледзеўшы ўсё, бацька

пайшоў наперадзе, я за ім. Лажыўся пракос за пракосам. Пры заходзе бацька радзіў мне не забіраць шырока, як ён,— можна падарвацца. Але я хацеў, каб мой пракос быў не вузейшым за бацькаў — я хацеў быць у касьбе нароўні з ім. Касілі з ахвотай, без пярэдыху. Пакуль найшло болей касцоў (не ўсе калгаснікі ўстаюць цяпер рана), мы ўжо з бацькам зваліла цэлую плаху. Пракосы, як валы, разлегліся роўнымі радамі на вялікай — як вокам кінуць — прасторы, збрытай цяпер, зваяванай.

Сястра прынесла нам снеданне, калі сонца было ўжо высока ўзняўшыся. Калі мы з'елі, сястра паспяшалася назад, дахаты, каб паспець на сваю працу. Мы ж з бацькам зноў узяліся за сваё, шчыравалі да самага паўдня, калі ўжо неміласэрна пачало пячы сонца і трава стала цвёрдай. Косы прытупіліся, на іхным палатне прыстыла зялёная смага — цяжка соўкаць касой. Трэба кляпаць. Вастрыць. Патрэбны адпачынак.

Мы леглі ў цяньку пад вярбой. Стомлены, я хутка заснуў. Не чуў нават, як бацька кляпаў, адбіваў косы. Калі я прачнуўся, косы былі ўжо наведзеныя і ўторкнутыя цаўём у зямлю. Бацька закурыў і ўпершыню, як пачалі касіць, кінуў на мяне вачыма — бачу, хоча са мною загаварыць. «Пра што? Няўжо маці сказала яму? Не, бацька мой не такі — ён лічыць мяне дарослым і пра такое глупства не будзе гаварыць, не будзе сароміць мяне. Мы — мужчыны. Пра што ж тады?»

— Я не ведаў, куды ты пайшоў учора пасля сходу. Шукаў цябе — ты быў мне патрэбны. Кыла сельпо цябе не было. Пайшоў быў назад дахаты, аж нагнаў мяне Даўгаль, фінагент. П'яны. Дый кажа: пылнамочный з табой гаварыў. Дык што ён табе казаў? Нешта дрэннае? Чаму, казаў мне Даўгаль, табе трэба ўцякаць? Ці ты што зрабіў?

Я ўсё расказаў бацьку. Сказаў, што я нічога не зрабіў. Сказаў, што, ідучы да калгаснай канцылярыі (упаўнаважаны там хацеў старшыню пабачыць), прайшоўся з ім па ўсёй нашай вуліцы (бачыў, як у некаторых хатах кідаліся ў вокны паглядзець, з кім гэта я йду). Сказаў і пра тое, што ўпаўнаважаны пытаўся, дзе я жыву і што я паказаў яму нашу хату.

Бацька ўстрывожыўся, кінуў наводмаш недакураную папяроску.

— Сын мой, дык гэта ж ты на заметцы. Бачыш, ён кінуў ужо сваё вока і на нашу хату. А для чаго? Можа, ты нешта сказаў — тут ці там, у Мінску? Ці напісаў што

дрэннае? Не можа ж быць, што б так, з бухты-барахты. Кінуў бы ты сваю пісаніну — згубіць яна цябе. Нашто табе пэцкацца?

У бацькі ад перажывання перасмыкнуліся, скрывіліся вусны. Я ведаю, што ў яго цяпер на душы. Ён бачыць, што ўсё ягонае прапала: нада мною навісла бяда, ягоныя спадзяванні — пабачыць мяне нарэшце на нейкай службе праваліліся. Бацька ўжо бачыў мяне сярод тых, хто вылез ужо наверх. Жыў ужо гэтым. Уяўляў, як людзі будуць хваліць мяне, зайздросціць, як яму ад гэтага будзе прыемна. Маімі поспехамі бацька спадзяваўся некаму — невядома каму — адпомсціць: ага, не толькі вы там, на вярху, цяпер мы й самі там. І вось цяпер гэтай надзеі ўжо няма. «Яны там, на вярхох, нешта задумалі супраць мяне».

— Можа б, ты паехаў да цёткі ў Хабараўск? Можа б, уцалеў і за што-небудзь учапіўся б там?

Каб як заспакоіць бацьку, я сказаў:

— Бацька, не кідайся гэтак у паніку. Я не думаю, каб нешта са мною сталася. Трэба ж мне дакончыць навуку. Вучыўся-вучыўся і цяпер кідаць, уцякаць?

— Глядзі, каб цябе яны не дакончылі.

Прынесла сястра абед — касцом павага, яны ўстаюць на світанні, апаўдні ім трэба адпачыць, паляжаць, а то й прыснуць у цяньку, каб, падсілкаваўшыся, зноў пайсці штурмам на бясконцую зялёную роўнядзь і да вечара, ужо пры халадку, збрыць яшчэ якога паўгектара.

І мы ладна-такі прасунуліся — дакасілі да самай дальняй звіліны ракі. Там абцерлі вехцем травы свае косы — на сёння досыць. Прыйшоў і брыгадзір замяраць. Цікава, колькі мы скасілі? Я заглядваю ў паперчыну, на якой робіць падлічэнні брыгадзір. Бацька стаіць наводдалі. Ён спакойны: пры мне брыгадзір не ашукае, не скруціць. Не адніміць ад цябе якую сотку і не прыпіша яе каму-небудзь іншаму, хто яму больш даспадобы. Бацька заўсёды няпэўны: правільна яму падлічыў брыгадзір ці не.

Ужо шарэе. Ідзём дахаты. На дарогу да нас з усіх бакоў узыходзяць касцы — грамадой рушым дахаты, у вёску, да якой не менш як тры кіламетры. Каса ў мяне на плячы муляе, робіцца цяжкой. Рук не чую, ногі — як не свае. Бацька ледзьве валачэцца. Я гатовы ўзяць на сваё плячо і ягоную касу, але ведаю — не аддасць. Калісьці, як я толькі пачынаў касіць, яшчэ вучыўся, бацька заўсёды, як вярталіся дахаты, нёс і маю касу — бачыў, наколькі я стомлены. Цяпер я дужэйшы за бацьку і хацеў бы пад-

несці бацькаву касу. Ды ён не хоча паказацца перад людзьмі слабым.

Агапчын бацька ідзе побач нас, здаравейшы за майго бацьку. Мой бацька з ім не гаворыць, ідзе моўчкі.

— Ну што, каса — гэта табе не кніжка,— зачапляе мяне Агапчын бацька.— Хоць што я гавару, ты ў нас малайцом — аднолькава здольны і да кніжкі, і да касы.

— І ты думаеш, гэта ўсё, на што ён здольны? — пачаў пад'язджаць пад яго Рыжы Карпа, вядомы ў вёсцы сваімі жартамі, вострым слоўкам і нахабствам.

— Гэтага я ўжо не ведаю,— нібы абараняецца Агапчын бацька.

— Вось тое яно і ёсць, што не ведаеш.

— Ну а што ты ведаеш, разумнік такі? — знайшоўся што сказаць Агапчын бацька.

Рыжы Карпа не чакаў такога адпору ад ціхманага чалавека, якім быў Агапчын бацька. Асекся і змоўк, а я сваім парадкам абрадаваўся, што Карпавы жарты не атрымалі далейшага развіцця.

Мы ўжо з бацькам у хаце. Вячэра гатова — маці прыйшла з поля сёння раней і паспела ўжо нешта згатаваць. Я з маці яшчэ не сустракаўся вачыма. Яна запрашае нас за стол. Бацька запальвае лямпу, а я баюся святла — зараз зірне на мяне маці. Якімі вачыма? Але маці спакойна стаўляе на стол міскі. Вочы апушчаныя — на мяне не глядзіць, і ўжо гэтым самым было ўсё сказана. Я прыціх. Не гаварыў. Пеpажываў і еў як не сваім ротам. Маці бачыла гэта, і ёй стала шкада мяне. Запыталася, ці я хацеў бы яшчэ што з'есці. Я нічога не мог сказаць — яшчэ больш бянтэжыўся. Гэта было для мяне найбольшым пакараннем — пакаранне дабрынёй.

Прыбег, як на зло, Вяркееў. Запрашаць куды-небудзь пайсці з ім. Але я нікуды сёння не пайду, скажу — стомлены. Я так і сказаў яму. Ён — відаць было — злёгку пакрыўдзіўся, але стрымаўся, не паказаў гэтага. Я быў упэўнены, што ён пойдзе да Акуліны. Балазе ўжо коўтнуў — дыхаў спіртам. П'яным ён заўсёды ідзе да яе.

Доўга не затрымліваючыся, Вяркееў выйшаў. Бацька зірнуў на мяне — хіба не ўхваляў, што я абышоўся так з настаўнікам.

— Правёў бы. Можа, што сказаў бы табе. Нюхаецца ж з старшынёй, і ад яго ён мог што дазнацца аб табе.

— Іншым разам запытаюся,— адказаў я бацьку.

Маці сказала, што яна ўжо паслала мне пасцель —

канешне, яна ўхваляе маю пастанову нікуды не йсці сягоння. Напрацаваўся ж, трэба адпачыць. А заўтра ж зноў на працу.

Я лёг, і ў цішыні, якая запанавала ў хаце, чуў кожны шорах, плынь самой цішыні, чуў нават дыханне каровы ў хляве за сцяною. Ад гэтай цішыні я не мог заснуць. Стомленасць, аднак, няўпрыкмець адышла, адчуў у сабе лёгкасць, зараіліся думы, і гэта ўсё падняло мяне з пасцелі. Я выйшаў з сянец і, не баючыся сустрэцца з кім-небудзь, пайшоў на мост, проста так, каб на ўсе грудзі ўдыхнуць водар ночы, упіцца зорнасцяй неба, адчуць шырыню, размах прасторы, цёплы ўздых зямлі, нагрэтай за дзень. Я адчуў у сабе прыток сілы, вырастаў, гатовы на нейкі незвычайны ўчынак.

Няхай яркнуць зоры, няхай вечар —
прыпынюся, стану на рагу.
прычакаю радаснай сустрэчы,
цёплую усмешку зберагу.

Як сяброў сваіх, вясёлы вечар
сабірае хлопцаў на лагу,
і сузор'і радасную стрэчу
ў залатых суценях берагуць.

Цэлы дзень ты ў полі жыта жала,
я касіў траву з густой расой.
Майго смутку гостранае джала
адкляпанай рэзаў я касой.

А цяпер от вечар. Ты са мною.
Мо сумуеш? Хочаш — запяю:
«Б'е ключом крыніца пад гарою» —
песеньку ўлюбёную тваю.

Няхай яркнуць зоры, няхай вечар —
прыпынюся, стану на рагу.
Прычакаю радаснай сустрэчы.
цёплую усмешку зберагу.

Глупства гэты верш. Яе са мной няма. Яна толькі ў маім уяўленні. Учора на гэтым мосце на развітанне са мной яна падала мне руку, і — я чуў — яна выразна затрымала сваю руку ў маёй. Яна хацела быць толькі са мной? Але з ёй былі брат і Эма. Хоць — можа, усё гэта я выдумляю. Хутчэй за ўсё, што так. Гэта мая выдумка. Але што ж, выдумка — гэта таксама праўда. Яна цяпер спіць. Усе спяць. Толькі я не сплю. Але і мне пара спаць. Дый робіцца зябка, ноч — зорна-халодная. Я сыходжу з моста.

Зышоўшы, глянуў уніз, пад мост,— ці не ловіць Піліпаў кот рыбу?

Дусін бацька любіць апавядаць пра нешта незвычайнае, як хоць бы пра гэтага самага ката, любіць выдумляць пра нешта малападобнае на рэальнасць, хоча здзівіць свайго слухача гэтай незвычайнасцяй, для яго няважна — верыць яму хто ці не, яму падабаецца само мастацтва прыгожай хлусні, хоць тое, пра што ён апавядае, ён аніяк не лічыць хлуснёй. На яго глядзяць найменей як на дзівака, каб не сказаць — як на чалавека, у якога не хапае ў галаве аднэй клёпкі. Нельга сказаць, аднак, каб яго не паважалі. Наадварот, калі яго няма ў грамадзе, без яго сумна. Прыходзіць ён, яму адводзяць самае пачэснае месца. Але ёсць людзі, што лічаць яго разумным чалавекам, які бачыць усіх і ўсё наскрозь, толькі прыкідваецца дзіваком, каб можна было смяяцца ў душы над намі. Ён ніколі не злуецца і не лаецца, і дзеля гэтага яго падганяюць пад *святога*. Усе ягоныя асаблівасці і якасці пераносяць чамусьці і на ягоных дзяцей, нават на жонку. От нейкая асаблівая сям'я, з адхіленнем ад нармальнага. Што робіць ягоную сям'ю ў вачох іншых усё ж цікавай, па свойму адметнай і, урэшце, добрай — гэта прыгажосць, якой гэтая сям'я надзелена. Дуся была зайздросным водпрыскам гэтай прыгажосці. Але, кажуць, прыгажосць, звычайна, надзелена і такой якасцяй, як глупота. Прыгажосць і глупота добра суіснуюць міжсобку.

Позна ўжо. Іду дахаты. Неба адшугала зорамі, і на зямлю пала суцемень. Падыходжу да хаты, бачу — пералазіць праз плот, пад самым маім носам,— з Агапчынага двара Вусцін.

— Ты што тут робіш? (Мяне гэта нямала здзівіла.)

— Нічога. Хацеў да Агапкі — не пушчае ў клець. Добра ты ёй мазгі закруціў.

— Так табе й трэба. Не хадзі ў маю зону.

— Нічога. Зайду яшчэ куды.

На гэтым мы развіталіся, і я пайшоў спаць.

Сон мой быў моцны, і я не мог прачнуцца раніцою — маці ўзбудзіла мяне, калі сонца было ўжо досыць высока. Брыгадзір не загадваў нам сёння касіць. Маці мне сказала — бацьку ён паслаў крыць страху, трэба рыхтаваць пуню пад сена, а мне наказаў ісці з дзявочай брыгадай сушыць сена, вяршыць копы. Вяршыць капу, завяршыць яе можа толькі мужчына — у яго ёсць для гэтага адпаведны спрыт і дастаткова сілы ў руках, каб закінуць віламі ці

граблямі сена на самую макушку капы, надзець на яе шапку, завастрыць, закругліць верх гэтак, каб — на выпадак дажджу — ён абцякаў па бакох і не пранікаў у сярэдзіну, інакш — згніе. Капа мусіць быць як яечка. Па тым, як чалавек капніць сена, стаўляе копы, вяршыць іх, судзяць аб ягонай здатнасці, вызначаюць ягоную вартасць. З гэтым мастацтвам я спраўляюся добра — не ўпершыню, і не баюся спляміцца. Я цалкам задаволены сваім сённяшнім прызначэннем. Маці падала снеданне. Са мною абыходзіцца, як звычайна — далікатна-ўважліва, але мне здаецца не так свабодна, як раней: нешта ўсё-такі ў ёй засталося ад маёй «аферы», і таго «нешта» яна не можа перамагчы.

Я спяшаюся выйсці на вуліцу. Мяне, вяршыцеля коп, чакала ўжо дзявочая брыгада. Я ў іх нібы за брыгадзіра. Пабачыўшы мяне, невядома чаго — смяюцца, жартуюць. Яны — хто ў чым: у лёгенькіх, рознага колеру, сукенках, у безрукаўках, у прыгожа павязаных, таксама рознага колеру, хустках, з граблямі на плячох.

Рушылі ў Супырыцу, дзе мы ўчора з бацькам касілі. У дарозе ўжо наганяе нас, таксама падкідаць, сушыць сена, Агапка. Я не надта рады бачыць яе тут — таго глядзі, на людзях асароміць.

Вось мы ўжо і ў Супырыцы. Ходзім уперад і назад доўгай шарэнгаю — падкідваем, разбіваем валы сена; сонца спякотнае, дзень гарачы, але правеўны; граблі ходзяць у руках лёгка, прывычна, ідзём у адзін бок, потым у другі; пры завяртанні змяняецца і палажэнне рук на грабільнішчы: налягае на яго то правая, то левая рука, і так бясконца, пакуль не раскідаем, не разаб'ём усіх пракосаў, што залеглі зялёнымі валамі-хвалямі на вялікай — як вокам кінуць — прасторы; цяпер жа няма ўжо палосак-шнуроў — калгас, бязмежнае поле, шырыня, і дзеля гэтага здаецца — працы ніколі не будзе канца, колькі ні рабі — усяго не зробіш, і, урэшце, табой апаноўвае якаясь нехаць, дармо што ўзяліся напачатку шчыра, з энтузіязмам; пазней энтузіязм гэты спадае; невядома, адкуль у тваёй падсвядомасці паяўляецца сумлеў адносна калектыўнай працы. Хораша, прыгожа глядзець, як мы арудуем граблямі, спрытна, з усмешкай і жартамі, але ўсё-ткі нам выдаецца наша праца як бы не цалкам сур'ёзнай, мы як бы не працуем, а забаўляемся, як бы на чужой, а не на сваёй палосцы. Гэта толькі так здаецца, што ў гурце праца спорная, на самай справе яна стратная. Але мы працуем заўзята. Дайшлі ўжо да калгаснай граніцы — скончыліся

пракосы-валуны. Заходзім зноў, адкуль пачалі,— павартаць сена на другі бок; яно сохне хутка, неўзабаве можна будзе зграбаць у копы.

Сонца ўжо на паўдні. Сена болей варочаць не будзем, няхай паляжыць, падсохнець, а мы тым часам папалуднуем, хто чым, хто што ўзяў з сабою. Седзімо гуртам. Каля мяне блізка ніхто не садзіцца — не ведаю, паважаюць ці саромяцца. Мне, аднаму мужчыну сярод іх, ніякавата, і мае паводзіны ненатуральныя. З імі мусіў бы быць нехта баявейшы. Знайшлася адна, што зачапіла мяне:

— Узяў бы ты каторую ды, адкаціўшыся трохі далей...

— Ну дык вазьмі і адкаціся, калі ўжо табе так засвярбела,— ткнула ёй іншая.

— А табе не свярбіць?

— Засвярбіць — знайду каго. Не бойся.

Счапіліся самыя старэйшыя ў брыгадзе, пачалі адна адну выкрываць.

— Ты ўжо мела аднаго бугая. Хадзіў-хадзіў дый кінуў, дык захацелася яшчэ.

— Хадзіў, ды не нахадзіў, а ты ўжо паспела скінуць і цяпер во зноў пуза падцягваеш, хаваешся.

Дзяўчаты прыціхлі. Ім цікава паслухаць пра грахі сваіх старэйшых кампанак. Праўда, некаторыя з іх затыкалі вушы — удавалі, што ім брыдка слухаць скаромніну, ці мо й сапраўды іх чыстае, неспакушанае сэрца абаранялася ад нячыстасці.

Да мяне падыходзіць Агапка. Садзіцца.

— Во адна ўжо падсела. А што ж? Смялейшая хутчэй даб'ецца.

Агапка, не звяртаючы ўвагі на рэпліку, пытаецца, ці яшчэ мне баліць. «Ведаеш, не можаш — не раздражняй. Але я не пра ета. Як думаеш — прымуць мяне ў Мінскі педтэхнікум? Я не хацела б быць настаўніцай, але ў мяне малыя шансы паступіць яшчэ куды: не вытрымаю ўступных экзаменаў. А ў педтэхнікумах недабор, дык могуць узяць і мяне. Былі б з табою ў адным горадзе. А ў калгасе не хачу заставацца. Дык парадзь што-небудзь».

Я не спадзяваўся пабачыць Агапку такой разважлівай. Пагадзіўся з ёю, што ёй лягчэй будзе паступіць у педтэхнікум. Трэба хутчэй падаваць заяву.

Сонца здорава звярнула ўжо з паўдня. Трэба зграбаць сена, стаўляць копы.

— От як бы адкуль насунулася цямнуха ды пасыпала

дожджыкам — узняліся б угору граблі дый дахаты, і ўсё б было з копамі.

Як цуда якое — на захадзе сапраўды паказаліся першыя абрысы цёмнай хмары, што ўвачавідкі павялічваліся і, як пагроза, паволі сунулася з-за лесу на нас. Мы спахваціліся, кінуліся зграбаць, дружна, паспешліва. Мяне закідваюць ахапкамі сена, падносяць да месца, якое я абіраю для капы. Капа вырастае ўвомірг, я ледзьве паспяваю вяршыць, крычу, каб не рабілі вельмі малых копаў — прагнююць датла; змятаем, агаляем прастор за прасторам, а хмара — шырокая на паўнеба — усё бліжэй і бліжэй, чуцен ужо ейны дых; сціхла ўсё навокал, прырода стаілася ў чаканні нечага неўнікнёнага, пакорліва аддаючыся таму, што мае вось-вось наступіць. І яно наступіла — залапатаў буйнымі кроплямі дождж, а мы ўсё яшчэ бяжым з ахапкамі сена, каб закончыць незакончаныя копы. Дождж ужо спаласаваў нашыя спіны, і мы, мокрыя, хаваемся ў копы. Тулімся адзін да аднаго. Да нас у капу бяжыць і Агапка, ды ў нас няма ўжо месца, і яна, крутнуўшыся, шмыгнула недзе ў іншую капу.

Дождж усё не сціхаў, спорны, цёплы, грыбны. Ды хмара, вытрэсеная ўжо, адыходзіць ад нас, кропячы наша нязгрэбенае сена. Шабаш. Вылазім з копаў, радыя дажджу, што перапыніў нашую працу. Аж нечакана выбліснула, як абмытае, сонца, нізкае і нейкае калматае. Але мы ўжо рушылі дахаты — што нам цяпер сонца: сёння яно ўжо не высушыць нашага сена.

Бацька ўжо быў у хаце — дождж прагнаў з страхі і яго. Маці пайшла падглядаць у агародзе маладую бульбу на вячэру. Сястры яшчэ няма — яна чысціць з жанчынамі гумны, дождж ім не перашкаджае. А вось бачу, ідзе і яна, радасная, з пісьмом у руках,— відаць, атрымала ад свайго Мішкі, што працуе ў МТС і ўсё не прыязджае дамоў, толькі сыпіць пісьмамі. Пэўна, нехта ўручыў ёй пісьмо, калі яна йшла дахаты, і вось цяпер яна спяшаецца прачытаць яго, сеўшы ў кутку на свой ложак.

Сонца яшчэ не зайшло, хліпае, разгарэўшыся, за пагоркам, гатовае схавацца за край зямлі.

У вакне бачу — ідзе да нас Ягор з сваёю Эмай і Дусяй. Угледзеўшы іх, сястра спяшаецца прыбраць на стале, змахнуць ручніком на лаўках. Я здагадваюся — Ягор будзе запрашаць на вяселле. Ягоная ж маці гаварыла, дый сам ён, што вяселле мае адбыцца гэтай нядзелі. Хіма не хоча, каб ейны сын ад'ехаў у свой Віцебск, не паказаў-

шыся на людзях з сваёй суджанай, такой прыгожай і мілай. Часу да нядзелі застаецца мала, і Хіма з сваім Пілілам рыхтуюцца да ўрачыстасці, можна сказаць, дзень і ноч. Запрашаюць гасцей — сваякоў і несваякоў, знаёмых і незнаёмых, хочуць, каб вяселле было громкае, шумнае, на ўсю ваколіцу.

Ягор ужо на парозе. Убраны. Асабліва Эма. Дуся таксама — у лёгкай, блакітнага колеру, сукецы, зіхатлівая, з заплеценымі коскамі. Прыйшла, каб пабачыць мяне? Проста ў хату, у якой яна яшчэ ніколі не была? Сэрца маё азвалася сполахам, радасцяй і нейкім спадзяваннем. Учора на мосце, як развітваліся, яна падала мне сваю руку, і я пачуў, як па маёй прабег ток, ад чаго ў мяне закружылася галава і перарвалася на імгненне свядомасць. Я не магу цяпер спакойна затрымаць на ёй свайго погляду: яна глядзіць на мяне, як іконка, Ягор знаёміць бацьку і сястру з сваёй нявестай. Мая сястра — Дар'я — запрашае гасцей садзіцца, яны дзякуюць, гавораць, што яны ненадоўга. Тым часам прыходзіць з агарода і маці. Ягор пачынае запрашаць, саромеючыся, з нейкай няпэўненасцяй у голасе. Просіць нас усіх ушанаваць сваёй прысутнасцяй ягонае «ачалавечанне». Бацька й маці падзякавалі за запросіны, але прыйсці не абяцалі: ім, старым, тырчэць на вяселлі не да твару. Людзі будуць смяяцца. Сястра палічыла такі адказ не надта ветлівым і, каб Ягор з Эмай не пакрыўдзіліся, усяляк старалася згладзіць адмову бацькоў, распачала гутарку з Эмай, пыталася, як ім жывецца ў Віцебску, нарэшце, запрасіла гасцей прысесці на хвілінку за стол і, калі тыя прыселі, спахвацілася, што гасцей няма чым частаваць. Вячэра яшчэ не гатова, а таго, што належылася б у такім выпадку — пітва — у хаце, сястра ведала, няма. На дапамогу ёй прыйшла маці — прынесла некалі прыхаванага ёю паўлітра самагонкі. Бацька запаліў над сталом лямпу, як выглядала,— задаволены такому выхаду з палажэння. Бацька чокнуўся з Ягорам, пажадаўшы яму шчаслівага сужэнства. Сястра і Эма толькі дакрануліся да сваіх шклянак. Маці пачала нешта падаваць на стол, але за гутаркай госці стравай надта не цікавіліся — гутарылі ўтрох: Эма, сястра і Дуся. Яны, здавалася, склалі нейкую інтымную змоўніцкую фракцыю. Дуся моўчкі, напружана слухала сваіх старэйшых субяседніц, выглядала — спасцігала, вучылася ў іх.

Бацька, перакусіўшы, адкінуўся на ложак адпачыць, маці ходалася ля печы, а я з Ягорам вяду без асаблівай

ахвоты бяседу, засяроджаны найболей на Дусі, балазе яна цяпер паглынутая размовай Эмы з Дар'яй і хіба не прыкмячае майго спасціжэння яе. Але, слухаючы іх, яна была настаўлена і на мяне: павернутая да мяне адной стараной, напружаная, яна ўкрадкам пазірала і на мяне. Здавалася, яна не вытрымае такога напружання і загаворыць са мною. Так яно і сталася: кінуўшы свой пагляд на палічку з кніжкамі, што была прымацаваная побач яе на сцяне, яна папрасіла ў мяне дазволу паглядзець тыя кніжкі. Сярод кніг яна натрапіла і на маю, тоненькую — «Прычасце». Зірнула на мяне, і ейны твар засвяціўся радасна-ўсхваляванай усмешкай. Запыталася:

— Што ета «прычасце»?

Пачынаю тлумачыць сваё «прычасце», але яна не спасцігае таго, што я гавару, затлумленая адчуваннем маёй фізічнай да яе блізкасці. Палажыла маю кніжыцу на стол. Гартае. Спрабуе ў ёй чытаць:

Заўсёды ты перада мною,
перад табой заўсёды я.
Занята сэрца ўсё табою,
красуня гордая мая.

Але сказаць табе не смею
я гэтай праўды з прастаты.
Чаго стаю, чаго нямею
перад табой — не знаеш ты.

— А я знаю — чаго. Ты любіш яе. А хто яна, красуня?

— Яна — ніхто. Яе няма. Гэта я выдумаў яе.

— Няпраўда. Яна ёсць. Ты саромішся яе? А дзе яна жывець — тут?

— Не, яе тут няма...

Дуся папрасіла мяне прачытаць нейкі іншы свой верш.

— Во гэты,— паказала ў кнізе.

Сеўшы за стол, я пачаў чытаць. Нахіліўшыся над маім «Прычасцем», з боку ля мяне, яна вадзіла вачыма па радкох услед за мною:

Цябе я ўспомніў і душою
здрыгнуўся ў радасці нямой:
ускрэсла ты перада мною
ва ўсёй прыгожасці сваёй.

Цябе я сэрцам адчуваю,
ты ў ім — адвечнаю вясной.
Табой тамлюся і спяваю
сягоння я табе адной.

Я сэрцам вырас у каханні,
пазнаў я шчасце і жыццё.
Мае глухія уздыханні,
як сон, мінулі ў небыццё.

І рад, што ў шчасці я зныВаю,
што сэрца мне хвалюе жар.
І як магу, так бласлаўляю
пасланы мне кахання дар.

— Я люблю ета. Ты дзіўны...

Аблакаціўшыся, яна трымае сваю шчаку гэтак блізка да маёй, што я чую, як няўцям дакранаюцца да яе шчакі мае ўскудлачаныя валасы. Гэтае прыгожае адчуванне перашкаджае мне чытаць, і я закрываю сваё «Прычасце». Яна, пасмялелая, прызнаецца мне, што адзін мой вершык «Элькіна радасць», змешчаны ў чытанцы для другое клясы, яны вучылі ў школе, і яна ведае яго на памяць. Яна сумелася, што я нічога не сказаў ёй у адказ, узяла Эму за руку з выглядам, быццам, пакрыўджаная, яна хоча ўжо пайсці дахаты. Тут узняўся і Ягор, войкаючы, што яны заседзеліся ў нас. Я выйшаў разам з імі — правесці іх. Іду побач Дусі, яна ўсё яшчэ трымаецца за руку ў Эмы. Неспадзявана яна сваю другую руку дае мне, і гэтак мы дайшлі да самага моста. Развіталіся.

Сястра сустрэла мяне насмешлівым паглядам, што выказваў адначасна дабрыню і зразуменне майго дзівацтва. Павячэралі. Я лёг спаць. Ды што я кажу — «спаць»? Я не сплю. Я думаю. Я люблю думаць лежачы. Люблю думаць уначы. Удзень я не магу думаць. Каб неяк запісалася ўсё тое, пра што я думаю ўначы, выйшла б самая цікавая, самая багатая, а галоўнае — самая праўдзівая кніга, з усіх напісаных дасюль. Уначы ты прызнаешся ўва ўсім, нічога не хаваеш, нават сваіх самых патаемных думак, якімі б яны ні былі: самымі прыгожымі ці самымі злачыннымі. Уначы ты нікога не баішся, пад аховай ночы ты абсалютна сам з сабою. Цябе ніхто не можа падслухаць, апрача Бога, і ты баішся толькі Яго аднаго, баішся перад Ім схлусіць. Удзень ты мог бы яшчэ сказаць, што Бога няма, уначы — пабаяўся б. Уначы ты гранічна чэсны ў сваім думанні. Уначы думаецца глыбей, думка твая ў нейкую мільённую долю секунды, можа, як водбліск маланкі, асвяціць цёмнае прадонне, якое знаходзіцца ўжо па-за межамі тваёй свядомасці, сігануць у другое вымярэнне. Гэтак, я думаю, пазнаецца Бог. Прачнуўшыся раніцою, Бога ўжо можа не

быць. Дзень закрэслівае твае начныя думы, змушае цябе прыстасоўвацца, інакш кажучы — хлусіць.

Я не магу не думаць, лёгшы ў пасцель, пра Дусю, пра Акуліну, пра Вяркеева, пра самога сябе, і толькі ў апошнюю чаргу я думаю пра бацькоў. Я іх шкадую болей за ўсё на свеце, але іх засланяе — гэта як грэх — маё асабістае. Ягор з Эмай выпадаюць з маёй памяці. Выпадзе таксама ўпаўнаважаны. Я ляжу ў ложку, але я не ўсведамляю, што я ляжу ў ложку, я — то ў Менску, з вершамі ў нейкай рэдакцыі, то тут, дома — кашу, вяршу копы, смяюся з дзяўчатамі, стаю на мосце, гавару з Дусяй, то на нейкім азораным узвышшы і з яго, з узвышша, нейкім цудам, нецялесны, узнімаюся ў іншыя сферы, слухаю музыку і, задаволены, вяртаюся, ужо такім, як я ёсць, зноў да сябе самога.

Ды ўсё-ткі я не сказаў самага галоўнага, пра што я думаў. Я не сказаў, чаго я хацеў гэтай начы. Я не сказаў услых. Думаць можна пра сябе што хочаш, пакуль твая думка не выказана ў слове. Але калі ты пераводзіш сваю думку ў слова, хочаш апрануць яе ў слова, надаць ёй выраз, ты ўжо ўкладваеш у яго, у слова, не тое, пра што ты на самай справе думаў, ты ўжо хлусіш, ты баішся сказаць праўду. Чалавек можа быць чалавекам толькі тады, калі ён не баіцца сказаць гэтай праўды. Сабе я не баяўся сказаць, чаго я хачу, не баяўся хацець, чаго я хацеў, але ці я магу сказаць вам, чаго я хацеў. Не, я не магу сказаць вам, чаго я хацеў. Вось у чым загвоздка. Вось у чым чалавечая трагедыя.

Я ведаю, калі я прачнуся раніцою, я буду думаць інакш, я буду іншым чалавекам, не тым, якім я быў уначы. Спраўджваецца чалавек толькі ўначы.

Вяркееў да нас не заходзіць. Бацька пытаецца ў мяне — чаму? У бацькі з галавы не выходзіць гутарка са мною ўпаўнаважанага. Бацька турбуецца, і ён хацеў бы пагаварыць з Вяркеевым — можа, той што-небудзь праясніў бы. Вяркееў жа блізкі да начальства, да самога старшыні сельсавета, і ведае ад яго ўсе сакрэты.

Наколькі я магу меркаваць, пра небяспеку, якая, на думку бацькі, навісла нада мною, ён яшчэ не гаварыў з маці, ведаючы ейную заходлівую душу і клопат аба мне. Калі б ён ужо сказаў маці, яна не ўцярпела б і запыталася б у мяне. Ад думкі, што са мною можа здарыцца нешта

страшнае, маці не магла б нармальна жыць. Не спала б. Плакала б уцішку. У сваім уяўленні бачыла б мяне ў самых найгоршых абставінах, праца ёй не йшла б на дум і ўсё валілася б з рук. Бацька, шкадуючы яе, трымаў справу ў сакрэце, хоць у самога душа была неспакойная. Я ўжо мог заўважыць змену ў ім: ён спахмурнеў, негаваркі нагогул, стаў яшчэ больш маўклівым, схуднеў, работы, як звычайна, не пільнаваўся і мяне не заахвочваў, казаў — няма патрэбы ў мяне хадзіць з касою кожны дзень, а я, наадварот, знаходзіў у працы, у грамадзе, суцяшэнне, быў рады, што праца паглынае мяне.

Толькі ўвечары, пасля працы, выходжу з хаты і ў сваіх адзінотных блуканнях аддаюся звабнасці начы, ахутаны ёю, як якім вэлюмам — ён ласкавы і лёгкі. Іду на мост паглядзець, як там, у віры, падаючы, топяцца зоры, не дасягнуўшы ягонай глыбіні, даходжу да ветрака на ўзгорку, адтуль спушчаюся зноў у нізіну, да рэчкі, удыхаю, асабліва востры тут, водыр ночы, духмянасць росных лугоў. Лёгкаму і задаволенаму, мне не хапае толькі нейкага здзяйснення, вялікага й надзвычайнага.

Вяртаюся дахаты. А мо зайсці да Агапкі? Яна, напэўна, спіць у клеці. Хіба не пра яе я думаў уначы? Хіба не яе хацеў я? Вусціна яна не пусціла. Пусціць мяне? Падыходжу, крадучыся, да клеці. Знадворку дзверы не ўзятыя на замок, значыць — яна ў клеці. Стукаюся. Аж чую — нехта бразнуў дзвярыма. Кашлянуў. Гэта Агапчын бацька. Пакідаю іхны двор. Бачу — у нашай хаце святло. Чаму — гэтак позна? Я думаў ужо легчы ў сенцах, дзе мая пасцель, аж чую — у хаце бацька з Вяркеевым. Не вытрымаў. Распытвае сам у яго пра мяне. Ах, бацька, бацька, нашто ты зачапляеш яго? Ці ж ён скажа табе праўду?

Вяркееў, як я ўвайшоў у хату, хутка вылез з-за стала, прывітаўся са мною за руку, сказаў, што, уласна, ён заходзіў да мяне і, не застаўшы, «разгаварыўся во з Лявонавічам».

— Правядзеш мяне?

Мы выйшлі.

— Шкада мне твайго бацькі. Гэта ты яго гэтак напужаў? Ён бачыць цябе ўжо ў няшчасці. Страшэнна перажывае. Чаго ён так? Табой цікавіўся ўпаўнаважаны, ну дык і што з гэтага? Мала ён кім цікавіцца? Я, на жаль, не бачыўся з ім. Дазнаўся пра ягоную гутарку з табой ад старшыні, але не надаў гэтаму ніякага значэння. Пацікаў-

люся. Запытаюся. І ты сам не вешай носа. Лепш во зойдзем куды.

Я не выказаў ніякага свайго дачынення да сказанага Вяркеевым, сказаў яму толькі, што надта стомлены, хачу спаць. Давёў яго да школы. Развітаўся. Але бачу па ім, што на сваю кватэру ён не пойдзе.

Рэшту гэтага тыдня я касіў з брыгадаю, зарабляў бацьку працадні. Увечары нікуды не хаджу. Увечары чытаю ў ложку, што ў сенцах, «Милый друг» Мапасана, «Красное и черное» Стэндаля. Гэтыя кнігі распальваюць маё ваабражэнне, узбуджаюць мяне, і я ніяк не магу заснуць. А раніцою маці ніяк не можа мяне дабудзіцца.

Надыходзіла нядзеля — дзень Ягоравага вяселля. Не ведаю, чаму я чакаю гэтага дня з нецярпеннем, хоць і не рыхтуюся да яго: касцюм, кашуля, гальштук у мяне ёсць, і што яшчэ болей? Спраўляе клопат вяселле сястры — мы ж з ёю ідзём на яго: не хапае то таго, то другога, няма дзе і няма за што купіць патрэбнае для такой урачыстасці.

Вяселле пачнецца ў нядзелю апаўдні. Гасцей будзе шмат. У Піліпавай хаце ўсе й не змесцяцца. Добра, калі паслужыць пагода. Можна будзе й на вуліцы паставіць сталы.

Піліпава хата стаіць над рэчкаю, насупраць нашай. Наша на адным баку рэчкі, Піліпава — на другім. Як тая, так і другая — на ўзгорках, і адлегласць паміж імі невялікая. Калі не йсці праз мост, а наўпрасткі, праз рэчку, дык тую адлегласць можна пакрыць за мінуту — сігануў, і ты ўжо на тым баку. Як я хадзіў з Ягорам у нашу пачатковую школу, дык, ідучы да яго, каб разам ісці з ім, я ніколі не йшоў праз мост, толькі праз рэчку. Рэчка была на месцы пераходу вузенькай і плыткай, і я лёгка перабягаў яе па бервяне, што было пакладзена праз яе. Зімою ж рэчка замярзала, дык было яшчэ лацвей. З нашага вакна, што на рэчку, можна бачыць два вакны ў Піліпавай хаце. Я заўсёды люблю глядзець на іх, калі заходзіць сонца. Тады вокны гараць, ахопленыя полымем.

Рэчка паміж нашымі хатамі густа парасла вербалозам, і дзеці, заседзеўшыся за зіму ў хаце, гуляюць тут вясною ў хованкі. Тут ёсць вельмі ўтульныя, зарослыя травой мясціны. На іх можна паляжаць, загарэць на сонцы.

З вакна бачу, як да Піліпа ідуць госці. Па-святочнаму ўбраныя — маладыя і старэйшыя. Нешта нясуць з са-

бою. Валяць, як на кірмаш. Але я знарок не спяшаюся, хоць мяне й цягне туды. Ды й сястра яшчэ не гатовая, усё прыстройвае — і ўсё не можа — перад люстэркам прычоску.

Адазваўся гармонік у Піліпавай хаце, вясёлае рэха пакацілася па рэчцы — значыць, прыйшлі скамарохі. Ударылі ў бубен — маё сэрца скалынулася ў салодкай трывозе.

Нарэшце мы выбраліся з сястрой. Ідзём праз мост, сястра баіцца запыліць бацінкі, ступае асцярожна. Яна малая, прыгожая, стройная, з кветкамі ў руках. Ідзе, як бы ў царкву, сціплая, прыўзнята-засяроджаная. Мне чамусьці шкода яе. Шкада, што яна такая прыгожая і добрая. Я хацеў бы, каб гэта было ейнае вяселле. Але мая сястра не хоча выходзіць за абы-каго. Сваталіся ўжо — не захацела, не пайшла. І ў першы раз, і ў другі.

Перад Піліпавай хатай чыста падмецена вуліца — тут, думаю, будуць танцаваць. Вынесены стол з двума крэсламі побач. Дзень — як таго хацелася: сонечны. Сонца ўжо на самай сваёй вышыні.

Уваходзім у хату. Хіма адразу перахапіла нас, вядзе да стала на покуці. Сястра, паставіўшы кветкі на стол і прывітаўшыся з Эмай і Ягорам, адыходзіць на дзявочую старану. Я саджуся за стол, як хацела Хіма,— побач Ягора. З другога боку, побач мяне будзе сядзець — яго яшчэ няма — старшыня сельсавета. Гэта мне не вельмі падабаецца. Не відаць яшчэ і Вяркеева. Але ён казаў — будзе. За сталом таксама фінагент і кааператар, Ягорава радня — старыя і маладыя, мужчыны і жанчыны, незнаёмая мне маладая пара — усяго ўціснулася тут чалавек пятнаццаць. Да стала прыстаўленыя, апрача крэслаў, услончыкі, розныя скрынкі. Шмат чаго з гэтага было прынесена гасцямі. Паўз сцены стаялі яшчэ сталы. Пасярэдзіне ж хаты стаяў даўжэзны стол, густа заселены і застаўлены бутэлькамі. З правага боку ад стала, што на покуці, сядзелі скамарохі з гармоняй, скрыпкай і бубнам.

Піліп хадзіў ад стала да стала, прывітваў гасцей, глядзеў, каму чаго не хапае, дапамагаў жонцы. Той не было супыну — падавала на стол ежу, талеркі, нажы, відэльцы, прымала гасцей, што ўсё яшчэ напаўнялі і так ужо перапоўненую хату. Госці яшчэ ўстрымліваліся есці і піць, гаманілі, жартавалі, смяяліся, чакалі, пакуль нехта павядзе рэй, падасць каманду, але каманды той усё не было, гаспадары былі паглынутыя сваім жаданнем дагадзіць гас-

цям нагэтулькі, што забыліся знайсці распарадчыка, які мог бы весці вяселле, калі і не па старому звычаю, дык хоць надаваў бы яму нейкі лад і зладжанасць. Госці аглядваліся, ці не ўзнімецца хто на покуці — пара ж пачынаць. Маладыя пачуваліся няёмка, на іх была звернутая ўся ўвага. Нарэшце вярнуўся да свайго стала на покуці Піліп, узяў напоўненую шклянку і, узняўшы яе, акінуў вачыма гасцей. Тыя, угледзеўшы яго, сціхлі. Піліп пачаў:

— Ета, я хачу сказаць, дарагія госцічкі, што мы, ета, рады, што вы не пагрэбвалі намі і прыйшлі. Не абяссудзьце, калі што не так. Дык, ета, пажылаем нашым маладым,— Хіма падыдзі й ты! — нашым дзецям сыгласнай і шчаслівай суместнай жысці. Прашу, ета, ўсіх дружна выпіць за ета.

Хіма, стоячы побач мужа, дадала, хрысцячыся на іконы ў покуці:

— Памажы ім, Божанька...

Яна нешта яшчэ шаптала, як малітву. Госці весела і дружна, з пажаданнямі шчасця маладым, хто ўзняўшыся, хто седзячы, радыя, што нарэшце быў дадзены ход справе, выпілі за маладых, крыкнулі: «Горка!» Ды Эма неяк упарцілася, не надта ахвотна цалавалася з Ягорам, калі той першым падстаўляў вусны.

— Што ета яна? — не пасаромеўся нехта выгукнуць.— Гарманіст, давай, братка!

Скамарохі адказалі дружнай, заліхвацкай музыкай. Пачаліся частыя тосты. Не разабраць, хто што гаворыць. Тлумна. Весела.

На парозе паказаўся старшыня сельсавета з Вяркеевым. Хіма, падляцеўшы да іх, павяла ўвайшоўшых да стала на покуці. Старшыня, ідучы, вітаўся з усімі, матляючы галавой направа і налева. Вяркееў ішоў следам за ім. Старшыня ўсеўся ля мяне, не прывітаўшыся са мною. Я не надта рады быў ягонаму суседству. Вяркееву не было месца, але бабы, ап’янеўшыя ўжо, уціснулі яго між сабой.

Старшыні ўлілі ў шклянку, і ён — ні з бухты-барахты,— узняўшыся, нацэліўся гаварыць прамову. Госці прыціхлі — будзе ж гаварыць старшыня. І старшыня пачаў:

— Спірва пыспасібкаю, ета, Піліпу і Хіме, што й мяне ні прамінулі. Быльшая чэсць для мяне быць тут. Стыршыню ні любяць, но пріглашаюць (на хаце зарагаталі). Ета я знаю. Но Піліп чылавек наш, хырошый чалавек, пыддзержываець савецкую ўласць на ўсіх яе крутых пы-

варотах. Піліп первый пашоў у калгас, аддаў увесь свой скот. Ні шэпчыцца па завуголлю. Піліп савецкій, хрісціянскій чылавек. Піліп сямейсцвенный чылавек. Я ўжо ні гавару пра Хіму. Таварішчы, Хіма залатэй чылавек — яны выгыдавалі дзяцей. Дык вып'ем, ета, за харошых бацькоў — Піліпа і Хіму.

Старшыня, асушыўшы, стукнуў дном парожняй шклянкі аб стол — паставіў.

— Таварішчы, цяперь, ета, хачу прыздравіць нашых маладых. Харошая пара. Красівая пара! Можна сказаць, смычка дзяреўні з горадам (смех). Смычка крісцьянства з прылітаріятам! Маладзец, Ягор! Ні павёў сваю к папу. Прывёў к нам, у сільсавет, зарыгістравацца. Так ета і нада! Па-савецкаму. А што ж там! Ат чыстага серца, ета, прыздраўляю вас, Ягор і Эма, жылаю вам харошэй, шчаслівый, мірный жысці (што б ні біліся!). Любіце адзін аднаго, дзяцей ныжывайце і нас ні забывайце. Вып'ем, ета, пакуль яны не пайшлі ў клець, за маладажонаў!

Узняўшы налітую ўжо для яго шклянку, старшыня дыхам асушыў яе і, высока ўзнятай, ударыў ёю аб падлогу,— эфект быў поўны. Старшыня сеў і, заядаючы, звярнуўся да мяне:

— Ну, а ты чаго сядзіш куццёй — ні бэ, ні мэ? Тост быў, а ты й ні піў? Не, так, таварішч пісацель, ні пойдзіць! Якей жа ты пісаціль, калі ні п'еш? Пісацілі п'юць. На тое ж яны й пісацілі.

Наліў сабе і, не пытаючыся, падліў мне. Падагрэты, пад ягонай прынукай, я выпіў да дна поўную шклянку «Пшанічнай». (Гэтую гарэлку прынёс — некалькі бутэлек — каапhouseholder.) Чую, як заклала вушы, цёплы струмень пайшоў па жылах, аж да самых пят. Да мяне даходзіць — як на вялікай адлегласці — прыглушаны гуд на хаце і ўдар бубна. Мне лёгка, радасна, я ўжо не саромлюся, я ўжо не «куцця», я ўжо нічога не баюся. Я — п'яны. Я хачу гаварыць, але не з старшынёй, у маім п'яным мазгу нядрэмны кантралёр падказвае мне не гаварыць з ім, высцерагацца яго. Балазе ён ушчаў гаворку з Ягоравай цёткай, што сядзела насупраць яго. Эма падсоўвае мне талерку, каб я закусваў, але гэтага я добра не ўспрымаю, дакрануся толькі да ежы і забываю — не ем. Я хачу гаварыць, гаварыць, гаварыць. Мне смешна й добра. Бубен не сціхае — б'е. Пэўна, я ўсё-ткі п'яны. Хачу вылезці з-за стала — мне дрэнна. Эма падае мне руку — памагае вылезці. Гаворыць, якая ў мяне цёплая, далікатная рука, у

Ягора — шурпатая. Ягор — ФЗУ. Хоча са мной танцаваць, а я ледзьве стаю на нагах. Нехта гаворыць: «Набраўся ўжо», «Зялёны яшчэ». А што мне тое, пра што яны гавораць. Няхай гавораць! Пайшлі яны к чорту!

Ягор бярэ мяне ў ахапак, чую ягоныя «шурпатыя рукі». Хоча вынесці мяне ў сенцы, на прахалоду. Скулу! Не панясеш! Адштурхнуў яго. Набегла Хіма: «Штой-та вы, даражэнькія?» Дае мне выпіць расолу. Я не бяру. Нашто мне расол. Я ўжо не п'яны. Іду к сталу на сваё месца. Наліваю сабе гарэлкі.

— Во цяпер ты пісаціль,— узнімае сваю шклянку старшыня сельсавета. Хоча са мною чокнуцца, а я ўжо выпіў. Не хачу чокацца з ім. Эма дражніць Ягора: корміць мяне. І цяпер я слухаю яе — ем. Але — не! Я не хачу дражніць Ягора! Мне не патрэбная ягоная Эма! Мне добра самому. Я хачу паказаць, што я не «зялёны», што я не «набраўся» — магу выпіць яшчэ болей. Наліваю сабе. П'ю. Слухаю Эму — ем. У мяне вялікі апетыт. П'ю і закусваю. Гарэлка мяне не бярэ. Магу танцаваць. Запрашаю Эму, але яе перахоплівае Ягор. Стаю ў нерашучасці. Да мяне падбягае з круга, пакінуўшы сваю сяброўку, адна маладзіца, валачэ мяне, п'яная, танцаваць. І я пайшоў. Я танцую не толькі з ёю — жартуючы, мяне адбіраюць ад яе, галоднай, іншыя — у крузе амаль што адны жанчыны. Мужчыны сядзяць за сталом — п'юць, гамоняць, спяваюць. Бабы, як ачмурэлыя, трэпяцца шмоццем у танцы, ціснуцца, цалуюцца, абнімаюць адна адную. Адкуль у іх такая сіла? Скончыцца танец — цягнуць мяне за стол, даюць мне піць, п'юць самі, падносяць мне закуску на кончыку нажа. Цягнуць зноў у танец. І мне добра з імі. І сораму няма ў мяне. Танцую. Абнімаюся. А што ж там? Я — п'яны. Аж бачу — ля загнета стаіць з сваімі таварышкамі Дуся. Глядзіць! Яна ўсё бачыла! Калі яна прыйшла? Адкуль? Як я не ўгледзеў яе? Спрабую ўсміхнуцца ёй, хачу загаварыць, але мая няўрымслівая маладзіца, абхапіўшы мяне дзвюма рукамі на поясе і адкінуўшы назад сваю галаву, кружыць мяне несціхана, не адпушчае. Я збянтэжаны. Не ведаю, што рабіць... Калі мы кружымся, праходзім па крузе паўз Дусю, яна адварочваецца, загаворвае з сваімі таварышкамі. Косы ў яе льсняцца, бровы ўзнятыя, пагляд кідкі, строгі. У новым святочным адзенні яна невымоўна прыгожая. Скончыўся танец, я вырываюся з рук мае маладзіцы, падыходжу да Дусі, а яна з сваімі таварышкамі — за парог, на вуліцу! Там поўна

моладзі — хлопцаў і дзяўчат. Танцуюць. Скамарохі сядзяць на лаўцы ў хаце паміж адчыненымі вокнамі, і іхная музыка чутная як у хаце, гэтак і на вуліцы. Я хачу таксама ісці на вуліцу — мне душна. Але мая маладзіца ўчапілася за мяне не на жарт.

— Ты не хочаш мяне?

Цягне да стала. Цалуе. Бачу — вылазяць з-за стала старшыня і Вяркееў. Ідуць да выхаду паўз мяне. Мяне не зачапляюць. Чорт з імі — няхай ідуць! Саджуся з маёй маладзіцай за ейны стол. Маё месца на покуці даўно страчана. Там сядзяць яшчэ фінагент і кааператар. Яны не танцуюць — п'юць. Да іх прысеў і сам гаспадар. Хіма ж усё глядзіць за гасцямі, ходзіць ля сталоў, выяўна мной незадаволеная — на мяне не глядзіць, як бы не прыкмячае. Ёй, відаць, не падабаецца, што я сяджу з малодкай, танцую з ёй, дазваляю, каб мяне цалавалі. Мусіць, яшчэ й таму, што не сяджу з Ягорам, не знаходжу з ім, колішнім таварышам, гаворкі.

У хаце духата. Цяснота. Хатай апанавалі жанчыны. Ап'янелыя, яны ўдарыліся ў танцы, але з мужчын мала хто з імі танцуе, і бальшыня з іх, абняўшыся, танцуюць самі з сабой. Нас такіх, як я, толькі некалькі. Бабы замучылі і скамарохаў — ім грай і грай бесперастанку.

І скамарохі выйшлі з хаты граць на вуліцу. Сонца ўжо нізка — не пячэ. На вуліцы правеўней, больш прастору. Але жанчыны на вуліцу не йдуць — ім у хаце ўтульней, зацішней, да таго ж у цясноце мала хто бачыць, што яны вытвараюць. Апроч таго, яны саромеюцца дзяўчат — усё ж яны бабы, а не дзеўкі і на вуліцы ў іх меней шанцаў падчапіць хлапца.

Ад сваёй маладзіцы я ўсё-ткі адкараскаўся — пайшоў танцаваць з дзяўчатамі на вуліцу. Перад тым як выйсці, выпіў для храбрасці: ідзеш жа на вуліцу, на святло дзённае, там ты на воку ў людзей. Не тое што ў хаце, сярод п'яных, у клуме і ў паўзмроку. Вось каб ні на што не зважаць і выпіў.

На вуліцы, пад самай хатай, поўна народу. Пераважна моладзь. На вяселле яна прыходзіць незапрошанай. Вяселле маладых, значыць, і яны тут. У іх таксама некалі будзе вяселле.

Дзяўчаты стаяць на адным, хлопцы на другім баку. Так ужо заведзена. Скамарохі — за сталом. Сярод дзяўчат бачу сястру і Дусю з таварышкамі. Сястра, угледзеўшы, падыходзіць да мяне:

— Ці ета ты здурэў — ты ж п'яный! Асаромішся!
— Нічога, сястрыца, я ў парадку.

Стаю. Разглядаюся. Пачаўся танец. Граюць падыспань. Я не пайду запрашаць. Падыспань не танцую. Яшчэ многа дзяўчат незапрошаных — стаяць у чаканні кавалераў. Я не люблю гэтага слова — кавалер. Я не кавалер і не ўмею быць кавалерам. Пайшлі яны к чорту, усе кавалеры! Мы — хлопцы.

Эма выйшла з хаты і, адшукаўшы вачыма Дусю, запрашае яе танцаваць. Тая, бачу, не пагаджаецца. Але Эма цягне яе за абедзве рукі ў круг, прыпяваючы:

Ай, падыспанец —
Харошанькі танец.

Дуся, нясмелая, выходзіць. Напачатку ў яе не ладзіцца. Ды хутка яна пачынае патрапляць, і я, гледзячы на яе, зайздрошчу ейнаму ўменню, ейным зграбным рухам. Эму, падышоўшы, змяніў Ягор, але танцаваў з сястрычкай няўдала — не ўмеў. Я ўжо, прыгледзеўшыся, мог бы хіба ляпей за яго. Іду падмяніць Ягора. Той уступае мне сястрычку, а яна — наўцёкі ад мяне...

Вяселле віруе, не спыняецца. Наадварот — у прадчуванні свайго канца набывае яшчэ большую сілу. Пачалі танцаваць і тыя, што не танцавалі, саромеліся. Цяпер, калі ўжо пашарэла, пачаў узнімацца ў нізіне, над рэчкай, туман, папоўз на вуліцу і ахутаў неўзаметку Ліліпаву хату. Належла ў круг гэтулькі, што не разбярэш, хто з кім танцуе. Нясмелыя, у сутунках яны сталі смелыя, акрыленыя, яны аказаліся найлепшымі танцорамі. У іх абудзілася незвычайная здольнасць у заляцанні. Гэта настала іхная пара. Дзе падзелася іхная сціпласць?

Музыкантаў пояць, кормяць, цалуюць, каб яны гралі задзірасцей і не думалі канчаць. Ходзіць ходырам хата — там тамсама не сціхае бабскае вяселле. Зрэшты, у іх там свая, бабская капэля. Яны, здурэўшы, граюць самі сабе — на качулках, на талерках, на сваіх вуснах, на ўсім, што пападзе ім пад рукі. Нехта з мужчын — трэба ж, каб быў і бубен! — пярыць лыжкай у заслонку.

Нутро маё, спаленае гарэлкай, просіць піць — сапраўды, я перабраў: глытаю і не наглытаюся вады — цёплая, і ніяк не магу спатоліць свае смагі. Смага. Смага. Смага. Я не ведаю, чым яе патушыць. Я сёння надзвычайны. Я ніколі яшчэ не быў такім. Я п'яны, і не толькі ад гарэлкі. Мне падабаецца, што я п'яны. Мне гэтак хораша, быццам

я толькі цяпер нарадзіўся. Я радуюся, што да мяне прыйшоў поспех. Мне здаецца, што я ўсё магу, што мне ўсё даступна. Ад усведамлення гэтага я здаюся самому сабе куды важнейшым, чымся я ёсць на самай справе.

Але хто гэта бярэ мяне ззаду за плечы, дыхае на мяне, абдае валасамі, абнімае, шэпча, туліцца? Маладзіца? Я хапаюся за яе, іду за ёю. За ёю. Некуды ўніз. Да рэчкі. Далей і далей. Займае дух. Яна то йдзе, то прысядае. Яе забірае нясцерп. У жарсці прыліпае да мяне. Не можа йсці, гатовая паваліцца, як ачмурэлая. А трава — дываном. І мы ў траве...

З вуліцы дайшоў да слыху бубен. І, узняўшыся, спяшаюся назад, да грамады, а мне наперарэз постаць у белым — Дуся! Яшчэ не ачомаўся, як яна, скочыўшы, павісла мне на шыі. Як малую, у страху і радасці прытуляю яе. Яна калоціцца, як ад холаду. Хачу спусціць яе з рук, а яна яшчэ больш прыклейваецца.

— Нясі мяне. Мне добра ў цябе. Я хачу, каб ты нёс мяне і нёс. Мне добра, калі ты мяне нясеш.

І я нёс яе, як падарунак, як найбольшы здабытак. І мне было як ніколі добра, і ў мяне адпала засмучэнне, і душа мая ачышчалася ад граху.

Перад ейнаю хатаю яна злезла з маіх рук.

На вуліцы, за хатаю, яшчэ білі ў бубен, але зморана і глуха — як у бочку.

Мы ўвайшлі ў хату. Гасцей ужо не было. Толькі свае.

— Дзе ета вы так былі? От добранька, што прыйшлі,— ласкава сустрэла нас Дусіна маці.— Пасядзім. Пагаворым спакойна. А ўбіраць ужо будзем заўтра.— Прыглядаючыся да Дусі: — Чаго ета ты такая смутная? Масеевіч, прысядзь за стол. Можа, яшчэ захочаш выпіць ці з'есці. І ты таксама, Дуся.

За сталом сядзелі Пілін і Ягор з Эмаю. Яны заўтра ад'язджаюць. Спяшаюцца на працу. На станцыю іх адвязе Піліп. Я пагадзіўся сесці за стол дзеля ветлівасці. Гавару з Ягорам, распытваю яго пра ягоныя планы, калі ён зноў будзе ў Мокрым, можа, напісаў бы калі, а ў самога ў мяне на душы зусім іншае — я чую побач Дусю, маўклівую, задуменную. Мне здаецца, што яна не слухае, што я гавару — думае пра сваё. Гэта мучыць мяне, хоць ведаю, што зачапіць яна мяне цяпер не можа.

Мне лепей бы пайсці цяпер ад іх. Я хачу цяпер быць сам з сабою. Выказваю яшчэ раз мае найлепшыя пажаданні Ягору і Эме. Гавару Ягору, што мне было прыемна

сустрэцца з ім пасля стольких год, пазнаёміцца з ягонай абранніцай. Дзякую гаспадаром за гасцінаасць. Збіраюся выходзіць, толькі не ведаю, як развітацца з Дусяй. Стаю ля парога. Маруджу. Яна застаецца сядзець за сталом.

— Дуся, ты не пачцівая. Хоць бы развіталася з Масеевічам.

— Мамачка, я ўжо развіталася.

Падышла да мяне і — з выглядам быццам гэта загадала ёй маці — падала мне руку. Я ўзяў яе ў абедзве свае, глянуўшы ёй у вочы. Яна злёгку ўсміхнулася, не забіраючы ад мяне свае рукі. Запыталася:

— Табе спадабалася наша вяселле? Табе было добра ў нас?

— Вельмі добра.

Адпусціў ейную руку. Пакланіўшыся ўсім, сказаў:

— Добрай ночы. Шчыра дзякую.

— Заходзь, Масеевіч, да нас. Не чужайся. От шкада — тваіх радзіцеляў не было ў нас,— сказала на развітанне Хіма.

Я не пайшоў на мост. Ад Піліпавай хаты спусціўся ўніз, на рэчку. Перайшоў яе па бервяне. Іду праз хмызняк па мурожнай траве. «Няўжо Дуся бачыла тут мяне з ёю?»

У хату не заходжу. Лёг на свой ложак у сенцах. Сястра, канешне, ужо ў хаце. Прыйшла раней мяне.

Цяжка перадаць усё тое, што я перадумаў, лежачы ў пасцелі. Ніколі яшчэ так не думаў пра жыццё, пра сябе. Я ўсё яшчэ быў недарослым. Сёння я ўжо дарослы, стаўся такім толькі некалькі гадзін таму назад. І гэтая мая дарослаясць як бы падказвае мне: я мушу задумацца над сабой. Я быў у сваіх бацькоў пад іхнай аховай, і мне не трэба было думаць. Цяпер хата адыходзіць ад мяне, бацькоўская апека канчаецца. Яны ў страху, што іхнай апекі цяпер недастаткова, каб уберагчы мяне, што нада мною стаў мой уласны лёс, што я ўжо падуладны свайму лёсу і ўсё залежыць цяпер ад таго, наколькі я спраўлюся з ім, калі спраўлюся наогул. Я ўжо за парогам бацькоўскай хаты. І мне як ніколі робіцца шкада сваіх бацькоў. Больш таго — у мяне страх за іх. Я баюся, што іх напаткае тая ж фатальнасць, што й мяне. Мяне мучыць нейкая віна перад бацькамі, віна, што ўзнімаецца ў мяне да ступені граху. А які грэх? Мая віна і грэх — гэта іхная памылка адносна мяне — памылка, якую я замацоўваў у іхным уяўленні пра мяне. Я падтрымліваў у іхных вачох сябе

такім, якога яны хацелі бачыць. Цяпер я ўспрымаю гэта як грэх.

Я часта думаю над пытаннем дабрыні. Ці добры я? Адказ у мяне атрымліваецца хутчэй адмоўны. Але мяне ўспрымаюць як добрага. Напраўду ж, я не ведаю, ці гэта так. У кожным разе, я ўсюды і перад усімі стараюся паказацца добрым. І гэта, думаю, губіць мяне. Я ніколі адкрыта і гнеўна не паўстаў супраць каго-небудзь ці супраць чаго-небудзь. Я не паказваю свайго характару. У мяне яго няма. Я хачу паказацца добрым перад *усімі*. Але ж тады мяне няма. Я ўвесь у адчуваннях, і яны, адчуванні, змушаюць мяне быць добрым з *усімі*. Я не люблю вострых людзей, матэматычна паслядоўных, яны — цяжкія для мяне. Але ці гэта азначае, што я — добры? Мой брат, напрыклад, у вачох бацькоў «нядобры» — у яго ёсць характар. Нязломны. Ён заўсёды адзін і той жа. Ён нязменны. Я прыстасоўваюся. А ён — не. Ён усюды і заўсёды *ён*. Не таму, што ён хоча гэтак. Не, ён такі сам па сабе. Ён ёсць. Мяне ж няма. У маім «я» мільёны «я», і таму ў мяне няма «я». Няма мяне. Майго брата менш любяць, як мяне. Ён «нядобры». А які ён добры на самай справе! Толькі ніхто гэтага не ведае. Я цаню яго вышэй сябе. Але ён залічае мяне да «ўгоднікаў» і, магчыма, не любіць мяне. Ён не ведае, што я высока цаню яго. Ён ведае толькі, што я ўгоднік, карыстаюся ў сям'і прывілеямі. Ён таго не ведае, што я саромлюся свайго ўгодніцтва. Брат вывеў «угоднік» з «угождать». Мне дагаджаюць. Мяне выдзяляюць, мяне больш любяць, мне даюць усё лепшае, нават пад час абеду мне даюць, напрыклад, не якое-небудзь, а *любовае* мяса, не тлустае. Бацькі ведаюць, што ад «жырнага» мяса мяне можа вырваць. Я гіджуся. Я, бачыце, малімоннік, мне давай толькі смачнае, *любовае*. Я ўгоднік.

Раптоўная, як маланка, думка пра ўпаўнаважанага перарвала гэтыя мае дзіўныя разважанні. *Упаўнаважаны* закрэсліў у маёй памяці ўсё, што адклалася ў ёй за пражыты дзень. Я адчуў, што я стаю на ростані і што мне трэба ўсведаміць, хто я, што я?.. Упаўнаважаны паўстаў у маіх вачох гэтак зырка, што я мог разгледзець у ім самую найдрабнейшую рысу. Найперш ён сам — нізкі, камлюкаваты, прысадзісты, цяжкі. Гэтае ўражанне ўзмацняецца яшчэ ягонымі новымі падкоўкамі на абцасах. Галянішчы, халявы ягоных ботаў даходзяць да самых каленяў, і яны там закасаныя. Галіфэ, скуранка і ленінская кепка

на брытай галаве завяршаюць ягоны вобраз, надаюць яму такую суцэльнасць, якая не выклікае сумлеву адносна ягонай злітнасці. Лоб — пляскаты, вочы — у вузенькіх шчылінах. Глядзіць праз іх — як смяецца. Ты не бачыш неба ў іх — яны замутненыя і схаваныя, і таму ты не можаш меркаваць аб зрухах ягонай душы. Што асабліва ўражае пры гэтым — ягоны ласкавы голас, што выклікае цябе на шчырасць з ім.

Вобраз упаўнаважанага як бы спусціў заслону на сцэне свайго дня, дзе я граў, і перавёў мяне ў другі план — у план начы. Вобраз гэты патушыў мой зыркі, шматфарбны дзень.

Я ўжо заснуў, я сплю, а мая душа ўсё жыве — жыве яшчэ яскравымі ўяўленнямі, то радаснымі, то хмурымі, то трывожна-неспакойнымі.

Мне ўжо не хочацца працаваць у калгасе. Але і сядзець у бацькоў і не працаваць я таксама не хачу. Мне трэба пакідаць Мокрае. Выбірацца. Куды? На Дальні Усход, як радзіў фінагент? Вяркееў гаворыць тое самае. Бацькі нічога мне не падказваюць. Яны не ведаюць самі, што ляпей — уцякаць мне ці ехаць у Менск канчаць вучобу. А чаму ўцякаць? Мы ж — не кулакі. Падатку вунь колькі год бацька не плаціў — вызваляўся як бядняк. У школу заўсёды сельсавет даваў мне даведку, што я — бядняцкага паходжання. Як бедняку сельсавет танна прадаў бацьку хату кулака. Мы толькі коратка, перад самым калгасам, былі ўжо больш заможнымі, але ж пад кулака ніяк не падыходзілі. Дый цяпер жа бацька — калгаснік. З кулакамі расправіліся, бацьку не зачапілі. Дык чаго мае баяцца ягоны сын? Я ж і не контррэвалюцыянер. Ды ўсё ж бацька, урахаваўшы ўсё, быў за тое, каб я з'ехаў, не варочаўся ў Менск. Шукаць мяне ніхто не будзе. Уцяклі ж з Мокрага кулакі, і ніхто іх не шукае. Нават не так далёка — у леспрамгасе зашыліся і сядзяць — ніхто іх не выдае. Не папаліся пад гарачую руку, дык і жывуць сабе. А хто чакаў свайго лёсу, дык і дачакаўся — схапілі. Гнояць турму ці мруць у тайзе.

Сягоння дождж, і калгас сядзіць у хаце. Недзе працуюць толькі на гумнах, на ферме або нешта робяць для сябе, радыя дажджу — на поле брыгадзір не пагоніць. Бацька таксама ў хаце — робіць новыя калёсы, маці шые, а сястра пабегла да свае таварышкі, радая выхадному.

Я надумаўся пайсці да Вяркеева — недзе дзецца. Хацеў было пісаць, але не пішацца — выходзіць не тое. Як

ні стараюся настроіць сябе на *патрэбны* лад — лезе самота, яна пераходзіць у адчай і канчаецца бунтам, а хто такое возьме ў мяне? Я гэтым летам думаў напісаць цыкл вершаў і здаць яго ў «Полымя рэвалюцыі». Ды як ты здасі яго? Самому нават боязна чытаць тое, што выйшла, а не то што каму паказаць. Вяркееву я не прызнаюся, што я нешта напісаў. Чытаў толькі Вусціну — некаму ж хочацца прачытаць, і Вусцін не падвядзе. Праўда, ён хваліцца маімі вершамі, асабліва калі бачыць іх надрукаванымі. Тое, што я чытаў яму, не надта даходзіла да яго. Затое спадабаўся яму мой верш пра наступ на мяне «зялёнай злосці». У вёсцы я адчуваю сябе ў зялёным палоне, акружаны бязлітасным зяленівам, што напірае на мяне з усіх бакоў, займае прастор, ад яго не схаваешся, ад яго няма ратунку, яно, гэтае зяленіва, цягнецца, хоча схапіць цябе. І я хачу ўцячы ад гэтага наступу, ад гэтай «зялёнай злосці». Куды? У горад. У сталіцу. Там ёсць вышэйшыя ўлады, і яны мусяць спыніць гэты «разбой нямы», там высокія дамы спыняць наступ «зялёнай злосці». Вусцін адразу запомніў канцовую зваротку гэтага верша і ўсюды дэкламаваў яе:

Там улады вышэйшыя ёсць —
спыняць гэты разбой нямы.
Там зялёную злосць
затрымаюць высокія дамы.

У Вяркеева была якраз Акуліна, і я памкнуўся быў пакінуць іх адных, але Вяркееў затрымаў мяне, і я — застаўся. Акуліна ж — жывот у яе быў ужо надуты — паспяшалася выйсці. Вяркееў прапанаваў мне паехаць разам з ім у Касцюковічы на настаўніцкую канферэнцыю. «Пазнаёмішся з людзьмі. Прадстаўлю цябе начальству. Атрымаеш куды-небудзь у школу прызначэнне. Папрацуеш з год які, адпачнеш, абабішся трохі, а там і ў твой Менск. Думаю, усё-ткі ўцякаць табе нікуды не трэба. Куды табе гэтак спяшацца? Ці мо напісаў што і спяшаешся здаць у друк?»

Я нават абрадаваўся прапанове Вяркеева паехаць на настаўніцкую канферэнцыю і даў яму сваю згоду.

— Ну вось і добра. Старшыня дае каня і цялегу на зялезным ходу,— засмяяўся Вяркееў.— Выязджаем рана. Дамовіліся! Заходзь па мяне.

Да Касцюковічаў трыццаць пяць вёрст, і я падняўся досыць-такі рана. Зайшоў да Вяркеева — ён быў ужо сабраны.

«Цялега на зялезным ходу» чакала нас (учора Вяркееў нічога не сказаў) на Піліпавым двары, гатовая да ад'езду. Значыць, Піліп павязе нас у Касцюковічы. Ён ужо чакаў нас. Забачыўшы, прывітаўся:

— Добра, што не заспаліся. Валаводзіць не будзем. Будзем запрагацца.

Пад павеццю стаяў у хамуце стаеннік варaной масці. Дагледжаны, гладкі, аж блішчыць, відаць, што стаіць на аўсе. На ім ездзіць толькі начальства, уласна старшыня сельсавета.

Цялега, ужо падмазаная, стаяла напагатове. На ёй сядзенне на два чалавекі. Ззаду ў піхціры — свежаскошаная трава.

— Усё ўжо на мазі,— Піліп выцер рукі вехцем травы і кінуў яго наводмаш.— Сядайце, госцейкі. Заедзем па «хазяіна».

«Сабака ўсё-ткі Вяркееў. Не сказаў, што з намі едзе старшыня сельсавета — хазяін. Мог бы, саскочыў бы з «цялегі на зялезным ходу» і нікуды б не паехаў».

Калі, выехаўшы на вуліцу, я зірнуў у бок Піліпавай хаты — у расчыненае вакно, высунуўшыся да палавіны, глядзела Дуся. Усмешлівая, махала нам загарэлай па самы плячук рукой.

— Татка, вяртайцеся ж хутчэй,— крычала.

Невядома было, ці гэтая просьба была адрасавана толькі «татку», ці й нам. Напэўна, і нам. Я ніколі не чуў, каб Дуся звярталася да свайго бацькі на «вы».

Раніца пасля ўчарашняга дажджу выдарылася росная, чыстая, з туманам над рэчкай. З агарода моцна тхне ўкропам, кмінам, агуркамі, бульбоўнікам. Хаты сцішна, адзінока стаяць у сваёй дрымоце, як бы пакінутыя людзьмі. Пастух яшчэ не выганяў кароў. Як гэта хораша ўставаць рана, першым!

Спыніліся перад новай хатай старшыні, лепшай у цэлай вёсцы, з вялікімі, светлымі вокнамі. Старшыня прывітаўся, здавалася,— толькі з Піліпам. Мая прысутнасць яго нікольні не здзівіла, значыцца, ён ужо ведаў, што і я буду. Бачу, яму недзе сесці, сядзенне занятае намі. Яшчэ старшыня не ўзняўся на падножак, як я, аслабаніўшы для яго месца на сядзенні, сеў ніжэй, на мяшок з аўсом.

Рушылі нарэшце ў дарогу. Конь, адгадаваны, выгуляны, панёс нас, не чакаючы Піліпавай прынукі. Ён бег, быццам рады быў, што вырваўся з стайні. Піліп нат стрымліваў яго, каб не браў адразу гэтак прытка.

Цялегу нашу няшчадна кідае на бакі, і старшыня з Вяркеевым, каб не зваліцца з сядзення, хапаюцца за ляскі. Мне ж хоць бы што — я сяджу не так высока, мне мякка на аўсе. Маўчу, унураны, а яны (Вяркееў і старшыня былі для мяне сапраўды «яны») гавораць і гавораць, перастаюць толькі, калі іх моцна кідае на бакі. Заплюшчыўшы вочы, бачу Дусю ў вакне, усю залітую ранішнім сонцам. Яно ўжо ўзышло і трымае Піліпаву хату, як у фокусе.

Праязджаем Жаркі, вёску, дзе я некалі трымаў экзамен за тры класы пачатковай школы. Калі гэта было? Здаецца, даўно-даўно! А якая гэта была радасць — вытрымаць першы ў тваім жыцці экзамен! Быў такі ж сонечны дзень, як і сёння. Разам з сваімі настаўнікамі прыйшлі здаваць экзамен вучні з суседніх пачатковых школаў. Няшмат іх было, хлопчыкаў і дзяўчатак, убраных па-святочнаму. Нашая настаўніца, Міхневіч, рыхтавала нас як толькі магла — з усёй стараннасцяй. У Жарках на экзаменах з усіх настаўнікаў яна — самая маладая і самая прыгажэйшая. Нам здаецца, што яе й найбольш паважаюць — здароўкаюцца з ёю, усміхаюцца ёй, прахаджваюцца з ёй пад ручку.

Пачынаюцца экзамены. Нас пасадзілі ў вялікім класе групкамі, паводле школаў. Самая найменшая групка — наша. Адзін з настаўнікаў, з вусамі і з вісючым на грудзёх гадзіннікам, дыктуе нам паволі, выразна. Дыктоўка — гэта што я люблю. Я не раблю па-беларуску памылак і дзеля гэтага не баюся дыктоўкі. Я баюся арыфметыкі. Асабліва задач. А выберуць жа для экзаменаў не самую лёгкую. Але нас выратуе наша настаўніца. Калі будзе цяжкая задачка, яна не ўцерпіць — падкіне нам яе развязку. І яна, баючыся, што мы не ўправімся, гэтак і зрабіла — падкінула развязанне, хоць задачка была не такая ўжо складаная, і мы рашылі яе самі.

Пасля экзаменаў нам адразу ж выпісалі на гатовых бланках пасведчанне аб заканчэнні трох класаў. З якой радасцяй я паказваў сваім бацькам сваё пасведчанне па-беларуску!

На паўдарозе да Касцюковічаў нас сустрэла Машавое сваёй абезгалоўненай царквой. Якая яна цяпер брыдкая без купалаў і крыжоў! Тут я ўпершыню прычашчаўся, упершыню быў у царкве. Прывозіла сюды мяне мая бабка. Мне тады было — не помню колькі — можа, якіх пяць-шэсць год. Здалёк, калі мы яшчэ пад'язджалі да

Машавога, кінулася нам на ўзгорку белая царква з запаленымі ўверсе ранішнім сонцам крыжамі. Заварожаны імі, я не заўважыў, калі мы ўехалі ў сяло. Званы сваім звонам запоўнілі ўсю прастору і ўзбудзілі ў мяне нешта нез'яснёна радаснае і адначасна ўзнёсла-трывожнае — а як гэта я буду прычашчацца? Што гэта такое? Бабка мне тлумачыла ў хаце, але тады я, на жаль, яе не слухаў. Прыезджыя людзі патокам уваходзілі ў царкву, і бабця, узяўшы за руку, вяла мяне ў гэты паток, і я з ёю разам, з усімі ўзнімаўся па сходках усё вышэй і вышэй, аж пакуль не дайшлі да ўвахода ў царкву — шырокіх, расчыненых дзвярэй. Ужо за імі я апынуўся ў нейкім нязнаным мне царстве: усё наўкола блішчыць золатам, з расквечаных вокнаў струменіцца лагоднае святло, блакітна-шызая зварушлівасць, пахная дымнасць кадзільніцы, святар у нябеснай рызе і побач яго — хлопчыкі. Недзе ззаду спеў — гэта, прашаптала мне бабця, спяваюць анёлы, я азірнуўся, каб пабачыць іх, а на мяне — з самай вышыні, з купала — глядзіць Багародзіца, строгая і ласкавая, і я, заварожаны, стаю ў заміранні, не ведаю, дзе я і што са мною робіцца.

Цялега ўз'ехала на брук, задрыжэла, і я ачнуўся ад сваёй мройнасці. Але на мяне ўсё яшчэ не пераставалі глядзець у самае сэрца вочы Багародзіцы, падобныя — крый ты Божа — на Дусіны.

Гэта мы ўжо ў Касцюковічах. Старшыня пайшоў у райвыканком, а я з Вяркеевым на канферэнцыю ў Народны дом.

Увайшоўшы — з парога — нам кінуўся ў вочы прэзідыум на сцэне ў такім вялікім складзе, быццам гэта быў прэзідыум партыйнага з'езда ў Крамлі, з той толькі розніцай, што ў ім сядзелі і жанчыны, прычым у пераважнай бальшыні. Што мяне асабліва ўразіла — гэта наяўнасць у прэзідыуме ўпаўнаважанага. З трыбуны гаварыў сакратар райкома партыі.

Зала была перапоўненая, і мы знайшлі сабе месца толькі ў першым радзе ад прэзідыума, перад самай трыбунай.

Сакратар райкома партыі гаварыў па-руску, што неяк не вязалася з аўдыторыяй, напоўненай беларускімі настаўнікамі, пераважна сялянскага паходжання, з якіх бальшыня не прывыкла, а па сутнасці й не ўмела добра гаварыць па-руску. Сакратар заклікаў настаўнікаў выхоўваць сваіх навучэнцаў у камуністычным духу, пры-

шчапляць ім камуністычную мараль, гаварыў аб тэй ролі, якую адыгрывае настаўнік у фарміраванні новага савецкага чалавека. У сваім празмерна доўгім дакладзе спыніўся ён і на міжнародным палажэнні, асабліва кляйміў фашысцкую Нямеччыну пад правадырствам Гітлера. Напаследак выясняў — хоць і не зусім выразна — пытанне небяспекі буржуазнага нацыяналізму. Слухалі яго напружана-ўважліва, але складвалася ўражанне, што змест прамовы аўдыторыяй не ўспрымаўся, аддавалася толькі належнае партыйнаму сакратару.

Пасля кароткай паўзы, па дакладзе сакратара, канферэнцыя прыступіла да абмеркавання пытанняў, што стаялі на парадку дня. Пачаўся разгляд пытанняў аб рэформе беларускага правапісу, толькі што зацверджанага ўрадавым дэкрэтам.

Дакладчык па гэтаму пытанню, як выявілася, не надта кампетэнтная асоба ў лінгвістыцы, усхваляў на ўсе лады новы беларускі правапіс, новую рэформу, у выніку якой, на ягоную думку, беларуская мова атрымала сваё прыроднае гучанне, вызвалілася ад неўласцівых ёй формаў як у фанетыцы, гэтак у марфалогіі і сінтаксісе, ачысцілася ад варварызмаў, пераважна польскага паходжання, наблізілася да роднаснай ёй мовы — рускай. Дакладчык абгрунтоўваў непрыгоднасць школьнай граматыкі Язэпа Лёсіка, гаварыў аб ейнай метадалагічнай заганнасці, ейнай нацыяналістычнай скіраванасці, арыентацыі Лёсіка на польскую мову за кошт аддалення ад рускай. Калі ж пасыпаліся канкрэтныя пытанні з боку настаўнікаў, дакладчык у большасці быў не ў стане на іх адказваць.

Старэйшы ўжо настаўнік з гладкай, аж да глянцу, загарэлай лысінай, пытаўся ў дакладчыка, як быць цяпер з назоўнікамі мужчынскага і жаночага роду ў родным склоне адзіночнага і множнага ліку, як пісаць «аўса» ці «аўсу», «народа» ці «народу», «хат» ці «хатаў», «дзяўчат» ці «дзяўчатаў».

У зале ўзняўся рогат. Нехта праявіў сябе на ўвесь голас:

— Бач, чаго захацеў — давай яму «дзяўчатаў».

Іншыя пыталіся, чаму цяпер у месным склоне множнага ліку для назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду заменены ранейшы канчатак «ох-ёх» на «ах-ях»? У народнай жа мове, у фальклоры, бытуе прыгожая форма ох-ёх»:

А ў палёх-палёх
ды быльнёг палёг.

Былі пытанні, чаму выкідваецца мяккі знак паміж зычнымі «нн», чаму цяпер «большэвік», а не «бальшавік», як было дасюль.

Няяснасць выклікаў новы правапіс і ў пытаннях, што тычыліся слоў замежнага паходжання. Узнятых пытанняў было такое мноства, што дакладчык не ведаў, як яму выкручвацца. Нарэшце яго збілі з панталыку, і ён пакінуў трыбуну. На залі ж настаўнікі спрачаліся між сабой, нешта даводзілі адзін аднаму, аж пакуль старшыня канферэнцыі не пачаў званіць, заклікаючы да парадку. Аднак старэйшы настаўнік з бліскучай лысінай усё не сціхаў, кідаў рэплікі:

— Мусім мы цяпер нашых вучняў перавучваць? Якая ета работа? Сёння я гаварыў адно, а заўтра другое?

Старшыня пазваніў яшчэ мацней, абвесціў:

— Наступнае пытанне — пытанне падручнікаў. Слова для дакладу мае таварыш Трахімчык.

Трахімчык, рослы, тонкі, аднавокі (другое ў яго было пад чорным, выпуклым пятачком),— падышоў да трыбуны, касавурліва зірнуў перш у бок прэзідыума, потым паверх галоваў на залу. Расклаў свае паперы, пачаў:

— Уласна, я зачаплю тут праблему падручнікаў не наогул, а праблему падручнікаў беларускіх, дый то толькі праблему падручнікаў па беларускай мове і літаратуры. Скажу адразу — тут у нас правал. Далікатная справа. Падручнікі ёсць, але мы не можам імі карыстацца — яны знятыя з ужытку, забароненыя. Узяць хоць бы для прыкладу хрэстаматыю, якой мы дасюль карысталіся. У ёй змешчаныя творы, аўтары якіх цяпер арыштаваныя і абвінавачваюцца ў буржуазным нацыяналізме. Значыцца, гэтым падручнікам мы не можам карыстацца. Трэба ствараць новы. А гэта доўгая песня, прытым справа ўскладняецца яшчэ й тым, каго ўключаць у новую хрэстаматыю, хто з беларускіх пісьменнікаў надзейна стабільны, каб яго можна было браць без рызыкі, што ён заўтра не акажацца ворагам? Янка Купала і Якуб Колас цяпер ужо, здаецца, стабільныя. Стабільнымі дасюль былі Андрэй Александровіч, Чарот, Галавач. Але, глядзеце, трэба і іх выкідваць. Практычна вось і выходзіць, што мы пазбаўленыя падручнікаў па беларускай літаратуры. А як дысцыпліна беларуская літаратура праграмай вымагаецца. Гэта ж, побач мовы, адна з найгалаўнейшых дысцыплінаў. Яе трэба выкладаць. А як? Я не ведаю. Я пакідаю гэтае пытанне пад вашую развагу. З свайго боку я ўсё-ткі хацеў бы прапа-

наваць такую ідэю: скласці, так бы сказаць, рабочую групу з найбольш кампетэнтных выкладчыкаў беларускай літаратуры і даручыць ёй больш дэтальна вывучыць праблему беларускіх падручнікаў па літаратуры. Свае рэкамендацыі група магла б падаць у адпаведныя вышэйшыя інстанцыі.

Голас: Рэкамендацыі такой групы не мелі б ніякай вагі. Бо хто надзеліць яе патрэбнымі пайнамоцтвамі? Вы? Гэта заданне не нейкай нашай рабочай групы, а заданне самога Наркамата асветы БССР.

Другі голас: ... і НКВД.

Зала павярнулася: хто гэта сказаў?

— У такім разе я здымаю сваю прапанову,— паспяшаўся заявіць Трахімчык.— Але ясна адно — падручнікаў няма. І выглядае, што гэтую праблему выкладчыкі беларускай літаратуры змушаныя вырашаць самі.

Голас упаўнаважанага: Выбачайце, не самі! Прашу слова.

Трахімчык хутка закругліўся і, не паказваючы выгляду, што пакрыўджаны, хуценька адышоўся ад трыбуны і сеў на сваё месца ў прэзідыуме.

Упаўнаважаны крэгляй выкаціўся з-за стала да трыбуны і неспадзявана загаварыў на чыстай беларускай мове:

— Таварышы, мы не можам пусціць на самацёк справу беларускіх падручнікаў. Мы не можам ствараць падручнікаў «самі». Справа дапаможнікаў па беларускай літаратуры не такая простая. Літаратура — дысцыпліна ідэалагічная, магутны сродак у выхаванні маладога пакалення, і нам неабыякава, на якіх узорах прыгожага пісьменства мы будзем узгадоўваць школьніка. Невыразныя ў ідэалагічным сэнсе творы мы не бярэм на ўзбраенне. Варожыя ідэалагічна нам творы мы катэгарычна адкідаем. На жаль, у хрэстаматыю па беларускай літаратуры трапілі творы ідэалагічна заганныя, а то й проста ідэалагічна шкодныя, контррэвалюцыйныя. Аўтары гэтых твораў — носьбіты непрымальнай намі ідэалогіі, зразумела, ім не месца не толькі ў хрэстаматыі, але і ў нашым савецкім грамадстве.

Тут нехта кіўнуў у бок НКВД:

— А што ж вы думаеце, НКВД — гэта так сабе, для фасону? На тое ж яно і НКВД, каб дбаць пра бяспеку нашага грамадства. На ягоным абавязку — калі паўстане такая неабходнасць — ізаляваць шкодны элемент ад рэшты гра-

мадства. Ізаляваць часова, на пэўны час або й назаўсёды, у залежнасці ад сацыяльных паводзінаў гэтага элемента. Што тычыцца беларускіх пісьменнікаў, дык не захаваю — у дачыненні да іх паўстала неабходнасць прыняць захады ў кірунку ачышчэння іхных шэрагаў ад варожага, контррэвалюцыйнага ахвосця. Вось чым тлумачацца, дарагія сябры, прабелы ў хрэстаматыі і ў іншых дапаможніках, пра якія вы тут гаворыце. Але я магу запэўніць вас — падручнікі будуць. Над складаннем іх нашыя навукоўцы ўжо працуюць, і вы хутка падручнікі атрымаеце. Ад вас патрабуецца толькі цярпенне і зразуменне справы. Да выхаду новых, перагледжаных падручнікаў у нас ёсць у наяўнасці дастатковая колькасць матэрыялу па беларускай літаратуры і такім парадкам у вас ёсць поўная магчымасць праводзіць нармальныя заняткі ў гэтай галіне. Як мне здаецца, вы занадта драматызуеце сітуацыю. Сярод вас, бачу, пануе нейкае незадаваленне нашай палітыкай у галіне беларускай мовы і літаратуры. Вам, бачу, незразумела, чым выклікана гэтая палітыка. Скажу адкрыта — яна выкліканая небяспекай нацыяналізму ў Беларусі. Беларускія нацыяналісты пад выглядам беларусізацыі ажыццяўлялі палітыку аддзялення, сепарацыі ад Саюза, ішлі курсам поўнай незалежнасці Беларусі. Праследуючы такую мэту, беларускія нацыяналісты асаблівы націск клалі на мову і літаратуру. Узніклі школьныя граматыкі розных лёсікаў, хрэстаматыі-чытанкі розных чаржынскіх, падручнікі па гісторыі, літаратуры розных гарэцкіх і г. д. Падключаліся ж сюды, канешне, і беларускія паэты і пісьменнікі. Вось якраз цяпер мы іх і адключаем. Прашу зразумець гэта.

Упаўнаважаны з выглядам задаволенасці сваім выступленнем сеў на сваё месца. Старшыня прэзідыума нешта перагаварыў з ім і, узняўшыся над сталом, абвесціў перапынак на абед.

Але мне было не да абеду. Настрой мой папсаваўся. Чаго я прыехаў на гэтую канферэнцыю? Мне было б лягчэй, каб я не чуў усяго таго, што на ёй гаварылася. Упаўнаважаны наганяў страх. У ролі «культурнага» шэфа ўстановы, у якой ён служыць, ён паказаўся мне агідным і небяспечным.

— Ну, чаго спахмурнеў? Давай прадстаўлю цябе нашаму райана,— падганяў мяне Вяркееў.— Пайшлі!

Райана, сярэдніх гадоў чалавек, прывітаўся са мною вельмі ветліва, прыязна, як з сваім даўнім і добрым знаё-

мым, увесь твар яго свяціўся дабрынёй і гатовасцяй аказаць мне любую паслугу.

Дамовіліся разам пайсці на абед. Сталовая была ўжо перапоўнена наведвальнікамі, пераважна настаўнікамі з канферэнцыі. Селі за стол. Адна з афіцыянтак, заўважыўшы за нашым сталом райана, хутка падскочыла да нас,— відаць, райана тут сталы госць. Афіцыянтка, прыгожая, з надраенымі валасамі бландзінка, у добра скроеным па ёй убранні, запыталася, што б мы хацелі заказаць.

Вяркееў, пераглянуўшыся з райана, папрасіў па сто грам на кожнага. Хутка прабегшы вачыма меню, замовіў для нас траіх усё, што там было.

Мы ўжо выпілі па сто, а закусваць яшчэ не было чым. Гарэлка ўзяла мяне адразу, і я баяўся, што зраблю на райана дрэннае ўражанне. Хоць нашто ён мне? Я ў яго не буду працаваць. Чую, як праз сон,— Вяркееў хваліць мяне на ўсе лады. Даходзіць да мяне, што ў нашым раёне шмат вакантных месцаў, у тым ліку — у саміх Касцюковічах. Райана нагвалт патрэбны настаўнікі. Райана, перапыніўшы гутарку з Вяркеевым, пачаў знаёміцца са мною, звяртацца да мяне з рознымі пытаннямі.

Перарваў нашую гутарку ўпаўнаважаны. Вынырнуўшы адкульсці з настаўніцкага тлуму, ён парукаўся з кожным з нас — у тым ліку і са мной — і сеў за нашым сталом паміж райана і мною.

— Таварыш райна, ты сёння не выступаў. Ці яшчэ выступіш? — не то сур'ёзна, не то жартам спытаўся ўпаўнаважаны.

— Пабачу.

— Хацеў бы я пабачыць.

— Вот ты перашкаджаеш. Бяру во маладога чалавека. Да зарэзу патрэбны людзі. Пазнаёмся!

— Я ўжо меў гонар пазнаёміцца. Бярэш, кажаш? Таварыш жа (упаўнаважаны зірнуў на мяне), здаецца, збіраецца канчаць навуку, а не настаўнічаць.

— Гэта ж не твая справа, а таварыша.

— Чаму ты так думаеш, што не мая? — А можа, й мая. Дарэчы, як ты, райана, ацэньваеш выступленне Трахімчыка?

Райана нешта хацеў адказаць, але якраз у гэты момант з'явілася афіцыянтка з падносам і хутка пачала згружаць на стол усё, што прадугледжана меню, уключна з дэсертам — кампотам у кубачках. Вяркееў тут жа папрасіў афіцыянтку прытарабаніць *меню* і для таварыша (нашага

ўпаўнаважанага). «На аднэйназе», загадаў ён ёй,— і — графінчык са стаканчыкамі.

Сапраўды, усё гэта хутка было ўжо на стале, і Вяркееў скамандаваў — «як належыцца, прыкласціся». Не хацеў «прыкладвацца» толькі я, і райана адразу ж з дакорам:

— Ну дык гэта што ж, браток, я, можна сказаць, узяў ужо цябе на работу, а ты не хочаш да нас прыхінуцца.— Шмат не можаш — разумею, але яшчэ па аднэй мусіш.

— Я паддаўся, і мы выпілі «па аднэй». Пачалі есці. Упаўнаважаны атрымаў сваё «меню» таксама. Еў спяшаючыся і скончыў раней за ўсіх.

— Дык ты, райана, не адказаў яшчэ на маё пытанне.

— А я ўжо й забыўся, на якое.

— Ды пра выступленне Трахімчыка. Нешта ён не ў той бок глядзіць.

— А ты куды хочаш, каб ён глядзеў?

— Я без жартаў, райна,— ты мусіў бы зарэагаваць. Трахімчык, па сутнасці, гне контррэвалюцыю. Ты не бачыш гэтага? Як ты мог дапусціць такога чалавека да трыбуны?

— Ён найбольш кампетэнтны ў літаратуры. Ты, канешне,— самы кампетэнтны, і ты пабіў яго. Чаго ты хочаш яшчэ ад яго? Ён нічога дрэннага не меў на ўвазе. Зрэшты, я выступлю па абедзе і ўсё выраўную. Не турбуйся!

Райана перайшоў да мяне:

— Я даю вам (ён пачаў звяртацца да мяне на «вы») месца ў саміх Касцюковічах, у дзесяцігодцы,— выкладаць беларускую мову і літаратуру. Згода?

Я не ведаю, што яму адказаць. Упаўнаважаны насцярожыўся — слухае.

— Найлепшая ў раёне дзесяцігодка. Настаўніцкі калектыў ідэальны. Папрацуеце год, пабачыце: спадабаецца — застанецеся, не — паедзеце ў свой Мінск.

— Райана, не Мінск, а Менск. Беларускія нацыяналісты, «нацдэмы», не любяць «Мінску».

— Дык ён жа не нацдэм!

І ўжо да мяне:

— Ну дык і як? Заўтра і аформлю. Выпішу прызначэнне.

— Райана, не спяшайся гэтак! — уставіў сваё ўпаўнаважаны.

У душы я кляну сябе, што не магу разгаварыцца з райана, не магу даць яму канкрэтнага адказу. Мяне прыгня-

тае прысутнасць упаўнаважанага. Я хацеў бы прыняць прапанову райана, такую спакуслівую. Прапанова райана ўзвышае мяне, я вырастаю ў сваіх собскіх вачох, я ўяўляю нават, як быў бы задаволены мой бацька маёй пасадай выкладчыка ў раённай дзесяцігодцы, як зайздросцілі б мне ў Мокрым. Але я не люблю Касцюковічаў. Я не ведаю іх. Мне яны чужыя. Мне трэба ехаць у Менск — гэта мая наканаванасць. Я не магу не ехаць туды. Я мушу спраўдзіць сябе, не важна як — мне важна дайсці да свайго канца, спраўдзіцца. І таму я не магу нічога сказаць райана. Ён глядзіць на мяне сваімі добрымі вачыма і, магчыма,— дапушчаю — разумее, чаму я маўчу. А калі не разумее? Тады я трачу сябе ў ягоных вачох. Ён можа падумаць — хутчэй за ўсё — што я проста несур'ёзны чалавек, не варты ягонай увагі. Не паверыць і Вяркееву: «Перахваліў, я нічога не бачу ў ім».

Вяркееў, бачу, незадаволены мной: дзе падзелася мая вынаходлівасць, спантаннасць, мой досціп, нарэшце, мая культура, эрудыцыя?

І Вяркееў ратуе сітуацыю:

— Райана, мы заўтра зойдзем да цябе ў канцылярыю. Добра?

— Чакаю. Чакаю. Абавязкова.

Вяркееў заплаціў за ўсіх нас, і мы вылезлі з-за стала, ладна захмялеўшыя. Упаўнаважаны, развітваючыся, сказаў райана, што ён прыйдзе на ягонае выступленне. Падаў руку Вяркееву, у мой бок толькі кіўнуў галавой, кідка зірнуўшы мне пад ногі.

Вяркееву я сказаў, што на канферэнцыі не буду, пайду пахаджу па мястэчку, нанач прыйду ў наш нумар.

Па мястэчку я не хадзіў, адразу пайшоў у нумар. Пакінуў — каб мяне не шукалі — пісульку, што я пайшоў дамоў. Я не хачу заставацца тут нанач. Нецікава. Самотна. Да таго ж — я ведаю — Вяркееў прывядзе якую-небудзь з настаўніцаў, і што я мушу тады рабіць? Не хачу ісці і да райана. Працаваць у Касцюковічах азначае — быць на вачох упаўнаважанага. Мая пуцявіна ўжо вызначана, і трэба ісці па ёй.

Да цёмнага я буду ўжо ў Мокрым. Хацеў быў зайсці да Піліпа ў Дом калгасніка, сказаць і яму, што я іду, але перадумаў — не пайшоў да яго. У мяне ўзнялася сіла — бегчы ў Мокрае. Хутчэй у Мокрае! Я не раз хадзіў з Мокрага ў Касцюковічы — туды і назад у той жа самы дзень.

Разам семдзесят вёрстаў. Яшчэ, купіўшы што, нясеш нешта і за спіною.

Выйшаўшы з мястэчка, я зняў свае бацінкі і — басанож — пусціўся ў дарогу. Праз вёскі не йду — мінаю іх. Нашто, каб мяне бачыў нехта на вуліцы босым? І, толькі мінуўшы вёску, зноў узыходзіў на дарогу. Качуся — калі дарога йдзе на спад, іду павальней — калі яна ўзнімаецца. Не надта разглядаюся — у мяне мала часу. Сустракаю зрэдку калгасныя абозы — вязуць на станцыю здаваць дзяржаве нарыхтоўкі: сена, маладую бульбу, дровы. На багністых мясцох бачу загрузлыя вазы, паламаныя восі, дугі, скінутыя каткі. Найбольш уражаюць укачаныя ў багну коні — яны такія мізэрныя, і, гледзячы на іх, заходзіцца ад жалю сэрца. У паветры вісіць лаянка — у печань, у Бога, у Сталіна. Добрай вупражы няма, усё пяньковае, і яно хутка зношваецца, рвецца. Як гэта мне ўсё знаёма! Колькі разоў я загразаў вось гэтак, як яны. Я загрузаю і цяпер, толькі ў нечым іншым.

Мінаю маё Машавое. Сонца ўжо садзіцца. Ягоныя праменні — ужо рэдкія, але агністыя — дастаюць, як штыхамі, на ўзгорку царкву і, адбітыя ёю, паламаныя, гаснуць. Хоць крыжоў на царкве і няма, але ў маім уяўленні яны ўсё гараць, як і тады, калі я глядзеў на іх, едучы з бабцяй на споведзь. Здаецца, варта толькі мне зноў глянуць на купалы, як яны, зіхатлівыя, пырснуць на мяне сваім золатам.

Набліжаюся да маіх Жаркоў — там-сям у хатах ужо хліпаюць агні — слабыя, нясмелыя, мігцяць употайку, затуленыя ў кутках.

Да Мокрага засталося тры вярсты. Не ведаю, чаму пры набліжэнні хвалююся і яшчэ больш спяшаюся. Пад наплывам пачуцця трачу здольнасць думаць.

Уваходжу ў Мокрае. Не, я не пайду вуліцай. Пайду агародамі паўз рэчку. Нашто мне з кім сустракацца? Паўз рэчку ціха стаяць, стаіўшыся ў вечаровай цішыні, хмызнякі. Нагрэтая за дзень трава дыхае нечым п'янкім, духмяным, востра пахным. Вось я ўжо й дайшоў, куды йшоў. Бачу — у іхным заднім акенцы агеньчык. Узыходжу на іхны агарод, з агарода — у сенцы. Бяруся за клямку — адчыняю дзверы ў хату: яны сядзяць за сталом. Вячэраюць. Кінуўшы лыжку на стол, Хіма бяжыць да парога, мне насустрач:

— Што такое? Прыехалі ўжо? А мой стары?

— Застаўся... Я толькі адзін.

— Прыехаў на чым?

— Прыбег...

— Прыбег?

— Напраўду.

— Занудзіўся, ці што? Ах, які ж ты бяглівы! Хадзі, даражэнькі, за стол. Павячэраем разам. Згаладаўся ж за дарогу, нябось.

Садзіць мяне за стол. Дае лыжку. І мы трох сіляем з аднэй міскі кулеш, гарачы і густы, запраўлены скваркамі.

Пры святле ў Дусі зораць вочы, свецяцца нейкім асаблівым бляскам. Глядзіць на мяне — гаворыць са мною вачыма. Я сіляю кулеш няўпэўнена і нязграбна. Яна ўсміхаецца, калі з мае лыжкі капае на стол кулеш. Гаворыць:

— Ты не ўмееш есці нашага куляшу.

Забраўшы з грудзей косы, закідвае іх за плечы, злёгку дакранаецца левай рукой локана, што звісае ў яе над вухам. Яна неспакойная. Уражаная маім прыходам.

— Цябе там нечым угнявілі, што так прыбег,— пытаецца Хіма.— Гэта ж не так сабе прычгаў? Мой стары нічога табе не казаў? Калі прыедзе? — Вылезла з-за стала: — Ад куляшу па целяшу. Ды куляшом я вас не накармлю. Дастану яшчэ чаго.

Выйшла ў сенцы. У нейкім сполаху Дуся зірнула на мяне, відаць, таму што мы засталіся з ёю адны. Але вярнулася з сянец Хіма з паліваным гаршком у руках. Паставіла на стол. Пачала калупаць з яго на іспадак заліты маслам сыр.

Дуся бярэ рукамі з іспадка драбочкі сыру, дае мне, кладзе сабе ў рот, смеючыся. Мне падабаецца, як гэта яна робіць. Яна пачувае сябе ўжо больш свабодна, натуральна. Я любуюся ейнымі загарэлымі зграбнымі рукамі, адкрытай, прыгожай шыяй. Лёгкую, тонкую балахонку на ейных грудзёх ледзь прыкметна пораць два кукішы ейнай сарамлівасці. Я не гляджу на іх — грэх.

Ззаду нас, у вакне, спалыхнула трывожным святлом зарніца. Хіма, перахрысціўшыся, пачала зачыняць вокны — будзе навальніца. Нездарма ж так парыла.

— Масеевіч, заставайся ў нас нанач. Нам боязна адным. Падышла да вакна. Адчыніла. Зірнула на ўсе бакі: — Сунецца цёмная туча — агонь у чэраве. Ці не на бяду якую, крый ты Божа! Застанься. Начуй у нас!

— Але я мушу йсці. Мне трэба збірацца.

— Ты не хочаш у нас заставацца? — спыталася Дуся. Я не пайшла б — баюся грому. Хочаш дамоў?

— Так, дамоў. І — не дамоў.

— Ды што ета ты гаворыш, Масеевіч? Бог з табой, а куды ж? — устрывожылася Хіма.

— Мне трэба збірацца, збірацца... у дарогу.

— Не мані. У якую дарогу? Гэта табе надаела ў нас, і цябе цягне туды назад, у горад,— не верыць мне Хіма.— От не дуры галавы, чалавеча. Хочаш Дусю напужаць? Куды ты пойдзеш проці ночы? Заставайся, кажу!

Дуся глядзіць на мяне — што я скажу? Я вылажу з-за стала. Вылазіць за мною і Дуся.

У вокнах зноў, як у сударгах, закалацілася зарніца. Хіма ледзьве паспела перахрысціцца. Яна выкруціла ў лямпе кнот, і лямпа згасла. «Нельга, каб гарэла святло ў гразу».

Я стаю ўжо ля парога, гатовы выйсці. Вокны ўсё часцей асляпляюцца бліскавіцай, і ў прамежках гэтага асляплення я ўлаўліваю постаць Дусі ў белай балахонцы. Пад дзвярыма азваўся кот — просіцца ў хату.

— І ён чуе небяспеку. Уцякае. Бяжыць да людзей. Баіцца застацца на двары,— ціха, амаль шэптам, гаворыць Хіма.

За хатай, над рэчкай, ударыў гром, і рэха пакацілася па ўсім наваколлі. Яшчэ і яшчэ. Раз за разам. Загуркатаў. Яшчэ лупянуў.

— Пэўна, вярбу над мостам цяў,— прашаптала Хіма.

Зашумеў дождж, і сціхнуў гром. Ды нечакана лупянуў зноў у самы вугал, і сіняя кацёлка пакацілася па двары.

Дуся кінулася за полаг на свой ложак.

— Крый ты Божа, а я й забылася юшку зачыніць — яшчэ ўляціць у комін. Не стой і ты ля парога. Ідзі супакой Дусю — насмерць перапужалася.

Я адхінуў полаг — Дуся ляжала, накрыўшыся з галавой.

— Баішся грому?

— Каб у хаце быў бацька, я не баялася б. Як гром, я тулюся да яго і хоць дрыжу ўся, але ў ягоных руках супакойваюся.

Яна скінула з сябе дзяругу і гатовая была ўзняцца, як гакнуў, здаецца, у самую хату — гром. Учэпістая, прыклеілася да мяне. Калоціцца. І толькі калі я дакрануўся яе шчакі сваёю, яна супакоілася, сціхла.

— Ты цяпер як у бацькі.

Маўчыць.

— Не баішся?

Пацалавала.

Дождж абкладваў сваім шамаценнем хату, лагодны і сцішны, закладваў вушы, суцяшаў. Гром ужо не парушаў гэтай сцішнасці. Толькі дзесьці далёка — ужо за Вараноўкай — зрэдку чуваць было ягонае вуркатанне.

— Ты ўжо цяпер не пойдзеш ад нас? Застанешся ў нас? Мая маці не пусціць цябе.

— А ты пусціш?

— Я таксама не пушчу цябе. Змокнеш.

— А калі дождж перастане, магу я пайсці?

— Дождж будзе йсці. Хіба табе дрэнна ў нас?

Але дождж усё-ткі ўшчук, і я пайшоў. Адарваўся. Я баяўся пераступіць тую крайнюю мяжу, да якой я так наблізіўся. Дуся — нясведамае дзеўчанё, але ўжо абуджанае і гатовае на нешта ёй дасюль няведамае, прынадна неадчэпнае. Я мушу пайсці ад яе як найхутчэй, каб не выклікаць у яе, абуджанай, яшчэ болей згубнай для яе жарсці. Я не хачу, каб на гэтым усё і скончылася.

Заўтра я скажу бацьком, што еду. Я сваё тут адбыў. Сягоння серада, і да суботы яшчэ будзе ў маці час сабраць мяне ў дарогу. Надышоў час мне выбірацца, і нікуды больш, як толькі ў Менск. Я не магу не вярнуцца туды. Усё маё там. Я ведаю — бацькі ўжо не будуць болей пярэчыць — яны здаліся, зміріліся з тым, што няўхільна.

Я ляжу ў сенцах у пасцелі і ў думках развітваюся з усімі і ўсім, таксама і з Дусяй. Калі я ўжо заснуў, мярэшчыўся Пілiп з сваім канём, грукацела «цялега на зялезным хаду» з Вяркеевым на ёй.

Раніцою я і аб'явіў за сталом пры снеданні аб сваім жаданні адправіцца на станцыю ў суботу. Хоць гэта й не было вялікай неспадзеўкай для бацькоў, пастанова мая паехаць у гэтую суботу прыбіла іх. Маці вылезла з-за стала і пачала бразгацець начыннем у загнетку — гэта яна ад усхваляванасці і жалю і каб не паказаць сваіх вачэй, поўных слязьмі. Засмучаная сястра сказала, што яна папросіць у брыгадзіра каня і адвязе мяне на станцыю. Бацька моўчкі збіраўся на працу, усё на тую ж — касіць. Маці таксама мусіла ісці на працу. Я заставаўся ў хаце адзін, і мяне мучыла нейкая віна, неўсвядомленая і дзеля гэтага яшчэ больш датклівая. Адсюль, можа, і тая мітусяніна, што завалодала маёй душой і адбірае ў мяне здольнасць ясна бачыць рэчы. Выходжу з хаты, іду да Вяркеева — можа, ужо вярнуўся з Касцюковічаў. Гляджу — на Вяркеевай школьнай дзялянцы, зарослай пустазеллем, по-

ле Акуліна. Седзячы. Ад жывата-бэбаха не можа згінацца. Пытаюся, ці ёсць ён. Незадаволена адказвае, што яшчэ спіць, але што я магу зайсці.

Заходжу.

— Ну дык чаго гэта ты збег? — замест каб адказаць на маё прывітанне пытаецца ў мяне Вяркееў, злазячы з ложка.— Ты мне напсаваў. Перад нашым райана я размаляваў цябе ў самыя прывабныя фарбы. Той думаў, што ты й сапраўды тое, што трэба яму, а ты г... скажу я табе. Райана чакаў нас, гатовы быў выпісаць табе прызначэнне ў дзесяцігодку, а ты й носу свайго паскуднага не паказаў. Не годна гэтак, браток. Я страціў на табе шмат. Якая цябе дрыстачка пагнала? Я й дзеўку ўжо для цябе знайшоў — на канферэнцыі іх хапала — а ты, пся крэў, збег.

— Слухай, я прыйшоў развітацца з табою. Я еду.

— Твая справа,— памаўчаўшы, адказаў Вяркееў.

Пачаў надзявацца, зірнуў у вакно і, пабачыўшы Акуліну, паскардзіўся:

— Ніяк не развяжуся з ёй. Хацеў, каб скінула, дык дзе там. Спаймала. Ну, але я не пра гэта. Кажаш — едзеш. Адгаворваць не буду. Каці! Я спраўлю табе й праводзіны. А як жа? Ёсць паўлітра. Бачыш — і цэлая кашолка правіянту — прыпёрла мая ненаглядная (Вяркееў паказаў на кошык, што стаяў на стале, накрыты ручніком). Дзень, бачыш, які цудоўны! Пойдзем на сасновыя шышкі, на чабор, у саснячок. Спяку яешню ў твой гонар, вып'ем і забудзем пра нашых Акулін.

На невялікай воддалі ад школы стаяў, уласна, не саснячок, а прыгожы бор з стагоднімі гонкімі соснамі, і мы пайшлі туды. Я нават быў рады пайсці туды. Ці пабуду яшчэ калі ў ім? Гэта — месца маіх адзінотных блуканняў. Прыгадаліся некалі складзеныя ў гэтым бары радкі:

Са спакоем адвечных палян,
добры дзень, мой зялёны бор.
Я прыйшоў на твой мяккі дыван,
на густы і пахучы чабор.

Захавай ты ад спёкі мяне,
дай напіцца з крыніцы вады.
Мая стома тады праміне,
харашэй стане сэрцу тады.

Вяркееў у поспеху сабраў у грудок сухія з шышкамі сасновыя галінкі і не паспеў ткнуць у іх сярнічку, як яны дзьмухнулі полымем, узняўшы ўгору агністыя трэскі. Грудок хутка прагарэў да дна, і на ягоных спапяленых

вуглёх Вяркееў паставіў патэльню з разбітымі на ёй жаўткамі-вочкамі. Нарэзаў з бохана скібак, расклаў іх на распасцёртым белым настольніку, дастаў з кашолкі соль, агуркі, відэльцы і паставіў дзве шклянкі. У іх ён разліў свайго паўлітра.

— А тым часам і цалкавуха ўжо гатова — спяклася. Ну дык, браце, за тваё! — Узняў шклянку і дзынкнуў аб маю.— Праводжу цябе ў тваю дарогу, якой бы яна ні была. Трымайся! Гартуйся ў бядзе! Весяліся ў шчасці! Я табе не вораг. Наадварот! Дык дзёрнем, браток!

Гарэлка ўзяла сваё. Вяркееў яшчэ не снедаў і ўзяўся за «цалкавуху» не на жарт: жэр як у прорву. Мне не хацелася напачатку паганіць душу гарэлкай, але калі яна разлілася гарачай хваляй па ўсім целе, мне стала добра, і тая трывога, што была запанавала мною, змянілася цяпер утульнасцяй, лагодным спакоем і прыемнай цеплынёй. Есці я не хацеў, закусіў толькі маласольным агурком з хлебам. Вяркееў адзін апустошыў Акуліціну кашолку.

Палянка, на якой мы размясціліся і якую абступалі выносістыя сосны, выглядала цяпер, пазалочаная раніншнім сонцам, як нейкі алтар з соснамі-свечкамі.

— Маліся! Ты ж эстэт! — адкінуўшыся на мох, не то сур'ёзна, не то здзекліва звярнуўся да мяне Вяркееў.— Такога мо болей не ўбачыш.

У мяне варухнулася да яго непрыязь. Я блізу ненавідзеў яго, гледзячы, як ён, лежачы, травінкай калупаў у сваіх зрыжэлых зубах. Ды хутка мая нянавісць да Вяркеева перайшла ў расчуленасць, у жаласць да сябе самога. Я ледзьве стрымліваў сябе ад нервовага струсу. Аціхласць наступіла толькі тады, калі ў душы выступілі слёзы. Я не хаваўся ад Вяркеева, хацеў чамусьці, каб ён бачыў маю неўтаймаванасць, але той, не доўга думаючы, пачаў мяне сячы:

— Развесіў нюні. Хочаш, каб цябе нехта пагладзіў па галоўцы. Не, браце, спагады няма на зямлі, і на яе не спадзявайся. Бяры жыццё ў рукі сам, як быка за рогі, калі можаш. Але, бачу, ты не можаш. Прырода такіх плаксаў, як ты, не любіць. Прыроду трэба браць. Тады яна будзе твая. А ты ад яе нічога не бярэш, не ўзяў і едзеш во, засмяглы і сухавейны. Ды я не хачу цябе кваліць. Я раджу табе быць цвярозым, тады будзе і табе і іншым лепей. Тыя іншыя будуць бачыць у табе чалавека, а не слімазару. Ты нейкі затуманены, невыразны. І гора табе, невыразнаму і затуманенаму.

Іншым разам я мог бы абурыцца на Вяркеева, але цяпер, слухаючы яго, я прызнаваў, што ён гаворыць праўду, і ад гэтага мне станавілася яшчэ цяжэй, душэўная мітусяніна не давала мне спакою.

— Паглядзі, чым ты жывеш? Нічым! Вершамі? Але гэта пустое. Яшчэ каб пісаў па-руску. Бачу, як у тое сіло, і ў Мінск ты едзеш дзеля тых сваіх вершаў. Дзеля нечага эфемернага ты ахвяруеш сабою. Скажу табе праўду — мне шкада тваіх бацькоў. Ты мог бы ашчасліваць іх, а не ўбіваць. Яны ўклалі сябе ў цябе, спадзеючыся на цябе. А таго хіба яны не ведаюць, што для іх ты — толькі няшчасце. Яны мо й шкадуюць цябе дзеля таго, што ты — нягеглы. Выбачай, што я выварачваю цябе, як тыя штаны, навыварат. Выварачваю, каб ты бачыў, які ты. Я табе ні сват і ні брат, і не мая справа цябе вучыць. От здурэў, дык і гавару. Я ад цябе нічога не хаваю. І ты не крыўдуй.

Скажу больш — на развітанне з табою: я на тваім месцы не варочаўся б у Мінск. Упаўнаважаны нічога такога мне не сказаў — я для яго не таварыш. І цябе я не хачу настрашыць. Але я крутнуў бы куды-небудзь набок, а не паехаў бы ў тваю пастку — Мінск. Твой бацька (я люблю твайго старога) прасіў мяне пагаварыць з табою, дык я вось і гавару. Але цябе, як відаць, не пераробіш. Слімазара і застаецца слімазарай. Як ты не аддзёр Агапкі, што налазіла на цябе, дык які ты ў прыродзе чалавек. Ты недзе вонках гэтай прыроды. Я знарок гавару груба, аголена, каб ты ўясніў, што трэба трымацца законаў прыроды, а не парушаць іх, што жыццё — суровая рэч, але ў гэтай суровасці яно прывабнае. Але толькі тады, калі ты сам суровы настолькі, каб падпарадкаваць яго сабе. Жыццё прывабнае, калі ты бярэш яго. Ты не бярэш! І мо калі-небудзь жыццё перакуе цябе, хоць мне штосьці ў гэта не верыцца. Такіх, як ты, не перакуеш — адразу, без супраціву паддасіся молату, як слюнька. І не будзе чаго гартаваць. З перакоўкі атрымаецца дрэнь. Загартаванай сталі не атрымаецца. Ведаеш закон супраціўлення металаў?

— Можа б, ты спыніўся нарэшце? Табе — каб перакаваць! Учыніць гвалт! Я не хачу твайго гвалту! Пакінь мяне такім, якім я ёсць! Пакінь мяне наогул! Не вучы!

— Глядзі ты — паказаў сябе! Не думаў! Нейкі рэзістанс у цябе ўсё-ткі ёсць. А я думаў — ты абсалютна безнадзейны. Маладзец!

Я не мог больш цярпець насмешак Вяркеева і, падзякаваўшы за праводзіны, пачаў развітвацца з ім. Развітаў-

шыся, ён пайшоў ад мяне рашуча, ні разу не азірнуўшыся.

Дахаты я не пайшоў, павярнуў да нашага Махавога балота, зарослага багуном. Я хацеў яшчэ пабыць у лесе, адумацца, сцішыцца, прыслухацца да сябе. З аднаго боку Махавога рос беразняк, яго называлі ў нас чарналессем. Тут усе бярозы глушкі. Калі патрэш іхны ліст аб ліст, белай мукі не пакажацца, венікі з гэтых бяроз нядобрыя.

На другім баку балота, на выхадзе да поля, раслі ўжо прыгожыя, белыя бярозы, кучаравыя, з гнуткім веццем і мяккімі лісточкамі. З іх я вязаў некалі венікі, злучаў іх у пары, чапляў на шыю каню і з імі ехаў дахаты. А то — як ганяў вясною цялят — лупіў з бярозаў кару — пад ёю смачны, сакаўны мязок. Я скабліў яго і з захлёбам глытаў. Мязок, бывала, я закопваў і ў зямлю, каб ён не псаваўся, быў свежым на даўжэйшы час, да самага лета, калі бярозы мязгі ўжо не даюць.

Усё гэта мне цяпер здавалася такім далёкім, бязмежна мілым, будзіла ў мяне згадкі з майго маленства, такога нялёгкага, але такога шчымліва-радаснага.

З усім гэтым я цяпер развітваўся, прыглядаўся да ўсяго, як бы імкнучыся замацаваць гэта ўсё ў памяці, забраць усё з сабою.

Больш у полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях, цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

На зямлю і лісце не апала,
і палі жывуць так, як учора.
Як раней, сягоння сонца ўстала,
як раней свяцілі, свецяць зоры.

Знаю я, і лета не загіне:
прывязуць яго сяляне ў гумны.
І не ляжа дзень у дамавіну —
ён згарыць у золаце, задумны.

Але ў полі я не заначую,
кіну я зялёную бярлогу:
у аддалях, цёмнай пушчы чую
сэрцам я асеннюю трывогу.

Ад'езд быў самым пакутлівым. Бацька й маці маўчалі — збіралі мяне ў дарогу. Зборы тыя былі самыя нескладаныя. Увесь мой скарб змяшчаўся ў маім невялічкім, старым і мала прыгодным чамаданчыку. Усё маё было на мне — той аблезлы ад сонца касцюм, у якім я прыехаў, і знакамітыя жоўтыя бацінкі, што звярталі на сябе ўвагу

сваім гарадскім паходжаннем. Маці ўсё нечага шукала, раздумвала, ці не забыла што пакласці мне. Спяшаючыся, стаўляла яду на стол, а мне, гледзячы, як яна ходаецца, есці не хацелася, і сеў я за стол толькі, каб супакоіць яе. Сястра перавязала вяроўчынай мой чамадан і паставіла яго ля парога, на выхад. Бацька быў на двары, рыхтаваў калёсы, падмазваў колы, чысціў шчоткай каня — брыгадзір, відаць, каб дагадзіць мне, прызначыў нам усё ж вызнога.

Увайшоўшы ў хату, бацька коратка кінуў:

— Конь запрэжаны...

Надышоў час развітвацца, але мы не ведалі як — маўчалі, і толькі калі бацька ўзяўся за чамадан, каб яго вынесці, маці, мітуслівая, кінулася да мяне, хацела абняць, але замест каб зрабіць гэта, сумеўшыся, пачала настаўляць мяне на дарогу:

— Ты ж прыязджай... пішы... не забывай нас... глядзі за сабою. Калі што трэба табе, мы прышлём.

— Маці, не марудзь. Конь стаіць.

У сенцах бацька абняў мяне. Апрача ягонага «глядзі ж», ён, унутрана ўзрушаны, больш нічога не мог сказаць.

Выйшлі з сянец на двор. Бацька палажыў плашмя чамадан на калёсы. Накрыў яго свежаскошанай травой. Сястра накінула яшчэ наўзверх саматканую ў узорах пасцілку — гэта як сядзенне для мяне. Мне трэба ўжо садзіцца на калёсы, але я маруджу. Выязны скоса пазірае на нас — хто тут сядзе і ў чые рукі трапяць лейцы. Ды час быў рушыць, і сястра заняла месца ў перадку — яна павязе мяне на станцыю. За варотамі я скочыў на калёсы і, калі азірнуўся,— пабачыў маці з хусткаю ля вачэй, а побач яе, ніжэйшага за яе, згорбленага бацьку. Яны ўсё стаялі, пакуль мы не павярнулі да коўратаў, да выезду з вёскі. Я перажываў — засмылела сэрца, што не абняў, не прытуліў на развітанне маці, не дакрануўся, не пагладзіў яе ссівелых валасоў.

Ля коўратаў — бачу — цэлы натоўп, пярэсты, ажыўлены, пераважна жанчыны, дзяўчаты, дзеці. Гэтыя апошнія, як птушкі, абселі зачыненыя коўраты, нікога не пушчаюць. Іншыя стаяць па абодвух баках вуліцы, нечага чакаюць. Сястра здагадалася (а мо й ведала), што гэта — *провады.*

— Цябе прыйшлі праважаць,— сказала, і ў ейным голасе я пачуў засмучэнне.

Як толькі пад'ехалі да коўратаў, дзеці саскочылі з іх і, як саранча, абляпілі калёсы. Дзяўчаты, *свае*, з якімі я разам працаваў, у тым ліку і Агапка, загарадзілі нашаму выязному дарогу, спынілі яго:

— Ходу няма. Коўраты зачыненыя. Хочам выкупу. Так не выедзеш.

Смяюцца.

На самай справе ніякага выкупу не просяць, а даруюць мне на дарогу новенькі ручнік, з прыгожа вышытымі на ім заблаццю словамі: «Не забывай нас».

У гэтым усё: і павага, і спагада, і шчырасць, і замілаванне, і нешта невымоўна макранскае — бяда.

Сястра і я, мы злезлі з калёсаў. Са мною пачалі прашчацца, жадаць мне шчаслівай дарогі. Некаторыя з жанок, развітваючыся, слязіліся. Дзеці, абступіўшы, трэслі мяне, як свайго, за рукі, прасілі мяне прыязджаць да іх у школу настаўнікам, іншыя ж — скласці пра іх які-небудзь вершык.

Смела падышла Агапка. Абняла. Пацалавала.

— Не забудзь жа, што прасіла. І пішы!

Нахапіўся аднекуль — тут як тут — брыгадзір, з бутэлькай і дзвюма чаркамі ў руцэ. Наліў сабе. Паднёс мне:

— Па аднэй, браток! На дарогу! За дружбу! За свойскасць! І на памяць. Трымайся!

Парожняй чаркай пакружыў над сваёй галавой і, смеючыся, ужо да дзяўчат:

— А вам у рот і не папала, трэба было шырэй разяўляць!

Дзеці ўжо адчынілі коўраты — даюць нам дарогу. Выязны рвануўся, але сястра, нацягнуўшы лейцы, супыніла яго. Я скочыў на калёсы. Лейцы адпушчаныя, і выязны, застаяўшыся, пайшоў поўным ходам. Ззаду засталіся рукі, хусткі, што няспынна нам махалі ўслед.

Спушчаемся на мост. Унізе, на поплаве, Дуся з гусямі. Глядзіць на нас. Я не ведаю, ці падыдзе яна. Прашу сястру супыніцца. Збягаю з адхону наніз. Дуся разумее, ведае, што я ад'язджаю. Хоча ўсміхнуцца. Я падаю ёй руку, гавару, што мне не хочацца ад'язджаць, а яна:

— Але ты казаў, што табе трэба. Ты ж прыедзеш назад?

# ЧАСТКА ДРУГАЯ

Ішоў дзень за днём, месяц за месяцам, а пісьма ад сына няма — як у ваду кануў. Кожны дзень, прыйшоўшы з працы, Масей Лявонавіч правяраў падваконнік у сенцах, ці не паклаў туды, як звычайна, паштар пісьмо, але падваконнік пуставаў, і, засмучаны, Масей Лявонавіч уваходзіў у хату як не свой. Пытаўся яшчэ ў Маланні, сваёй жонкі, можа, яна ўзяла, прыйшоўшы з працы раней. А то, здаралася, Масей Лявонавіч перапыняў на вуліцы паштара, пытаўся, можа, як завалялася сынава пісьмо ў ягонай, як кавальскі мех, губатай скураной сумцы. Паштар ласкава ўсміхаўся, спачуваў старому, суцяшаў, што не сёння, дык заўтра, а пісьмо прыйдзе, трэба толькі ўмець чакаць.

Ішлі дні, тыдні, месяцы, паштар мінаў хату Масея Лявонавіча, пісьмаў на падваконніку ў сенцах не клаў. У Масея Лявонавіча запала падазрэнне: пісьмы затрымліваюцца ў сельсавеце і яму не перадаюцца.

— Ведаю я гэтую банду,— жаліўся ён сваёй Маланні. Малання яму нічога не адказвала — што ёй тая «банда»? Сэрца яе чула, яшчэ калі яна выпраўляла сына ў дарогу, што з ім нешта станецца. І от яно, відаць, сталася.

Масей Лявонавіч стаяў у нядзелю каля сельпо, цікаваў на фінагента, свайго сваяка,— ці не ведае той што-небудзь пра сына. Калі Масей Лявонавіч улучыў момант і запытаўся ў яго, фінагент адказаў:

— Што пытаешся? Я казаў яму... Няма чаго цяпер пытацца...

Сказаў і падаўся ў сельпо.

Пытаўся Масей Лявонавіч і ў Вяркеева, думаў, можа, яму сын напісаў — дружылі ж. Вяркееў як бы й паспачу-

ваў Масею Лявонавічу, але ўжо сам запыт, як відаць было, Вяркееву не спадабаўся.

Негаваркі наогул Масей Лявонавіч зрабіўся яшчэ больш маўклівым. Толькі часцей пачаў брацца за свой кісет — дастане з яго табаку, скруціць папяроску, выкрасіць крэсівам агонь, прыкурыць, зацягнецца. Свой кісет ён заўсёды трымае за поясам, нават і тады, калі працуе. На перапынках, калі брыгада, лежачы на пракосах, адпачывае, Масей Лявонавіч, згорблены, сядзіць дзе-небудзь наводдалі, часцей пад дрэвам, апіраючыся на яго сваёю зморанай спіною. У мужчынскіх жартах удзелу не бярэ. Мужчыны дзівяцца, ад чаго Масей Лявонавіч гэтак пераменіўся. Пад'ялдыкваюць, пытаюцца, можа, Маланння разлюбіла. Масей Лявонавіч маўчаў — кепікі да яго не даходзілі. А то, пакінуўшы жарты і пад'ялдыкванне, пыталіся — ужо сур'ёзна — што піша з Мінска сын. Масей Лявонавіч не прызнаваўся, што пісьмаў ад сына няма, адказваў гэтак, быццам ён і атрымлівае:

— Што піша? Жыў, здароў. І ўсё.

Не было такой ночы, каб не сніў сына. Сын стукаецца ў дзверы, каб адчынілі яму, пусцілі ў хату. Масей Лявонавіч падбягае да дзвярэй, хоча адчыніць, ды не можа адсунуць зялезны завал — цяжкі. Б'е кулакамі. Кліча на дапамогу Маланню. Але дзверы не паддаюцца. Сын жа плача па той бок дзвярэй, гаворыць: «Вы не хочаце мяне пусціць. Вы не любіце мяне. Дык я й пайду ад вас». І яны чуюць ягоныя крокі, як ён адыходзіць. Просяць вярнуцца. Але крокаў больш не чуваць, і яны, балесныя, бездапаможныя, не ведаюць, што рабіць, пачынаюць сварыцца, упікаць адно аднаго за няўдачу.

Ішлі дні, ішлі месяцы, і ў нейкі дзень паштар паклаў на падваконнік пісьмо. Масей Лявонавіч, заўважыўшы, баяўся браць яго ў рукі, нібы яно магло абпячы. Нёс у хату асцярожна, баяўся пакамечыць. Палажыў на стол. Не адкрываў. Прачытаць яго ён усё роўна не можа — з такой мудрасцю ён не спазнаўся. Трэба чакаць, пакуль прыйдзе дачка — адзіны, што заўстаўся ў хаце, грамацей. Масей Лявонавіч усё-ткі не ўцерпеў — адкрыў і быў надта здзіўлены: у канверце быў усяго маленькі лісток, спісаны толькі з аднаго боку. Паклаў назад у канверт — да прыходу дачкі.

Дачка з маці прыйшлі з поля пазней як звычайна,— дажыналі сваю, адмераную брыгадзірам, дзялянку.

Дачка, глянуўшы на канверт, дастала з яго лісток і

ледзь паспеўшы схапіць вачыма некалькі радкоў, кінула лісток на стол — пісьмо было ад Агапкі з Менска. З лістка дачка прачытала наступнае:

«Добры дзень, дзядзька Масей Лявонавіч!

Не хацела б вас засмуціць, ды дзела не важнае — сын ваш у турме. Не знаю, за што. Хадзіла ў інтэрнат, дзе ён жыў,— нічога не дазналася. Не кажуць. Пішу вам, думаючы, што вы не знаеце яшчэ пра ета. Ні гаруйце, можа, яго яшчэ выпусцяць. Нічога ж ён такога ні здзелаў. Калі што больш разузнаю напішу вам. Сама я вучуся ў цехнікуме. Ні лёгка. Ды самі знаеце, лёгкага хлеба німа. Перадаю вам і вашай жонцы паклоны і самыя лучшыя прыветы.

Агапка».

...Свет — як праваліўся. Рэчы набылі іншы выгляд. Важнае зрабілася няважным. Масей Лявонавіч не плакаў — душа зайшлася жалем, болем, сціснулася ў камячок. А пра Маланню няма чаго й гаварыць — сланяецца з кутка ў куток, а чаго — не ведае. Як палувумная! Ноч не спала, а раніцай паплялася на могільнік — паспавядацца, пажаліцца, расказаць пра сваё гора маці, паплакаць на ейнай магілцы. Ніхто так не зразумее, як маці. Для Маланні яна ўсё яшчэ жывая. У яе яна шукае збаўлення і ратунку.

Дачка, Дар'я, моўчкі, не еўшы, пайшла капаць бульбу — наказаў брыгадзір.

Сам жа Масей Лявонавіч заставаўся ў хаце, на працу не йшоў. «А чаму не пайшоў? — падумаюць. Захварэў? Нешта надумаўся рабіць сваё? На калгас яму напляваць? А мо ў якой адлучцы? Таго глядзі — прыйдуць у хату праверыць, што робіш? Дзе дзеўся? Дазволу застацца ў хаце ў брыгадзіра не пытаўся ж? Не, не выдавай свайго гора. Ідзі з касою, як хадзіў».

Пад павеццю, на бэльцы, вісяць косы — свая і сынава. Масей Лявонавіч знімае сваю. Сынава застаецца вісець. Сын ужо не пойдзе з ім. Не стане з ім у пары. І тут Масей Лявонавіч не вытрымаў — хлынулі слёзы.

Масей Лявонавіч не мог дакасіць да вечара — знямог. Усё не хацеў паказаць свае слабасці, хацеў як-небудзь дацягнуць да канца дня. Abліваўся потам, ногі падкошваліся, рукі як трэба не хадзілі, касцы ззаду насядалі, шваргалі косамі ля самых пят, і Масей Лявонавіч выйшаў з строю — здаўся. Прыйшоў дахаты. Лёг. У сваіх думах ён не існаваў. Яны завалодалі ім, тлуміліся самі па сабе, плылі адвольна, быццам ён не быў іхнаю прычынаю, а

ўсяго толькі нейкім пабочным інструментам, як і яны, ён сплываў разам з імі ў нейкі нябыт. Але з таго нябыту думы вярталіся зноў, і не было канца гэтаму кругавароту. Так і ляжаў Масей Лявонавіч у паўзабыцці, пакуль не заснуў, не адышоў у поўнае забыццё.

З могілак Маланння пайшла на поле і поруч з дачкою заняла сабе баразну. Дачка адносіла кошыкі ў гурт — і свае, і матчыны. І макавага зерня не было яшчэ ў роце ў Маланні: як толькі нагнецца — цямнее ў вачох, няма сілы на гэтую работу, і яна баялася, каб не заваліцца і самой у баразну.

Увечары, як маглі, гатавалі вячэру — трэба ж жыць. Даядалі ўжо бульбу, як прыбег Вяркееў. Яшчэ з парога загрымеў:

— А мне й не сказалі. Два Мокрых чутка абляцела — Масеевага сына арыштавалі. Масееў сын у турме. Масеевага сына няма.

Чакаў, што скажа яму Лявонавіч. А Лявонавіч маўчаў — ні пацвярджаў, ні адмаўляў. Маўчалі таксама Маланння і Дар'я. І Вяркееву зрабілася не па сабе. Яго прысутнасць была лішняй. Збіты з панталыку, Вяркееў памуліў да парога. На ягонае «дабранач» ён не пачуў адказу.

Не было праходу ні Масею Лявонавічу, ні Маланні, ні Дар'і — пыталіся, што здарылася, а яны, зацятыя, не прызнаваліся, удавалі, што нічога не сталася. Ды пагалоска, што Масеевага сына засадзілі, не сціхала: «Не можа быць», «За што?», «Шкада хлопца, калі праўда», «Што ета на свеце дзеецца — нявінных людзей саджаюць», «Крый ты Божа...»

Чым болей Масей Лявонавіч хаваўся, не казаў праўды, тым больш пачалі вяскоўцы верыць, што з ягоным сынам здарылася нешта сапраўды нядобрае. Нават вокны ў хаце Масея Лявонавіча сведчылі пра тое — на іх лёг цень пахмурнасці і журботнасці. Праходзіш вуліцай — бачыш, што хата не тая — сшупуленая, зморшчаная, апусцілася на адзін зруб ніжэй.

А бывала, што Масей Лявонавіч не верыў пісьму Агапкі. «Можа, гэта злы жарт. Падвох». І ў яго ўзнікалі розныя здагадкі і меркаванні адносна сына, ён нават дапускаў, што нічога кепскага з сынам не здарылася. «От, можа, чым заняты пільным. Можа, й загуляўся. Спахопіцца — дасць знаць пра сябе».

Але Масей Лявонавіч ведаў, што гэтым ён толькі сябе падманвае, што на самай справе яго напаткала няшчасце,

самае вялікае гора, якое толькі можа напаткаць чалавека.

Ішлі дні, тыдні, месяцы, а ад сына ўсё не было ніякіх весцяў, і Масей Лявонавіч вырашыў паехаць у Мінск, даведацца асабіста пра лёс свайго сына. Малання сабрала яго ў дарогу. Брыгадзір не даў каня, і Масей Лявонавіч пайшоў на станцыю пяшком. Адгакаў трыццаць вёрст. Купіў білет. Сеў на поезд. Паехаў.

А тут на падваконнік паклаў паштар пісьмо. Пісьмо ад сына. Дар'я чытала яго і плакала. Чытала і плакала. Маці слухала, але быццам не ўспрымала чутага, ці не разумела, і каб не слёзы, што самі цяклі з яе вачэй, можна было б падумаць, што яна нежывая і што тое, што было ў пісьме, яе не тычыцца. «Не можа быць, каб сын так пісаў». Настолькі гэта неверагодна, незвычайна. Строй, гучанне пісьма не тое. Не тыя словы.

«Дарагія мае маці, бацька, сястра!

Ведаю, здагадваюся — даўно чакаеце ад мяне пісьма. Не было такога, каб я гэтак доўга маўчаў. Шкадуючы вас, не хацеў вам пісаць. Не падумайце, што са мною сталася нешта безнадзейна дрэннае. Я здаровы, жывы, і нічога мне не бракуе. Я не галодны, сыты, адзеты. Бялізны, што ты мне, маці, надавала перад ад'ездам, хопіць надоўга. Добра й тое, што ты ўгаварыла мяне ўзяць з сабою цёплае паліто. Яно мне дужа ў нагодзе. Табе, сястрыца, дзякую за ручнікі, вышытыя табою. На іх пеўнікі сапраўды, як жывыя, проста гатовыя заспяваць. Цешыць гэта мяне вельмі. Мне здаецца, што я ў хаце, бачу, як яны бегаюць па двары. Бацька, ведаю, слухае і не верыць у тое, што я пішу. Думае, што я пацяшаю вас. Можа, яно і так. Я ткі вас трохі пацяшаю. Не хачу вас пужаць знянацку. Тут — я так думаю — выйшла непаразуменне. Мяне ўзялі і трымаюць у спраўдоме, па-старому — турма. Але вы не палохайцеся, не тужыце па мне. Я буду выпушчаны з спраўдома. Закончу сваё навучанне і вярнуся да вас. Невінаваты ж я. Ты, бацька, не сярдуй, што я не паслухаўся цябе. Шануй сваё здароўе. Я табе буду ў падмозе. Пойдзем яшчэ разам з табою касіць. Не аддавай нікому мае касы — спатрэбіцца.

Ну што яшчэ вам напісаць? Пэўна, здзівяцца нашыя, як даведаюцца, што я ў спраўдоме-турме. Казаць, дзе я, няма патрэбы, але ж усё роўна даведаюцца. Гэтага не схаваеш. Не крыўдуйце на мяне. Прычыніць бяды я вам не хацеў, і вы надта не бядуйце. Усё неяк уладзіцца. Я вам буду пісаць, але, можа, не так часта, і ў выпадку доўгай нячут-

насці не турбуйцеся — гэта не будзе азначаць, што мне дрэнна або што мяне няма ўжо на свеце. Я прыйду да вас, і мы ўсе пабачымся. Толькі не трэба сумаваць па мне. Асабліва ты, маці, не будзь мне такой гаротнай. Ад усведамлення, што ты не будзеш такой, мне будзе куды лягчэй.

Заставайцеся здаровы. Да пабачання. Абнімаю вас крэпка. Цалую. Ваш Мікола».

Масей Лявонавіч вярнуўся з Мінска з нічым — пра сына ён нічога не даведаўся. Ён не мог справіцца ў горадзе з цяжкасцямі: не мог знайсці месца пераначаваць, затрымацца, не ведаў, з чаго пачаць пошукі сына, да каго звярнуцца. Ён кінуўся з хаты ў дарогу, добра не падумаўшы, як след не падрыхтаваўшыся — кінуўся ў дарогу з болю і роспачы. Масею Лявонавічу паказалі ў Мінску турму, але там ён нічога не даведаўся, з ім нават не хацелі гаварыць. Нейкая з жанчынаў, што стаялі з перадачамі ля варот, парадзіла яму звярнуцца ў НКВД, але ён нават добра не ведаў, што гэта такое. Усё ж ягоны язык дапытаўся, дзе было тое НКВД. Зноў жа і там яго не дапусцілі да «начальніка», якога ён патрабаваў. Калі ён сказаў, што хацеў бы дазнацца пра свайго сына, ці ён у іх, ён пачуў, што ў іх не толькі сыны, а й дочкі. «Калі ваш сын у нас, вас павядомяць. Паязджайце дахаты, бацька».

Масей Лявонавіч хацеў яшчэ зайсці ў інтэрнат, дзе жыў сын — можа б, там што сказалі — але ў яго не было адраса. Не ведаў, куды падацца яшчэ. Грошы канчаліся, і ён не мог больш заставацца ў горадзе. Павярнуў дахаты. «Каб я быў граматным, дабіўся б. Зарэзала мяне мая слепата».

Пісьмо сына, якое яму чытала дачка некалькі разоў, пераканала яго канчальна, што ўсё скончана і што трэба смела глядзець праўдзе ў вочы. Масей Лявонавіч ужо не таіўся, гаварыў, што сына ткі пасадзілі, надаваў гэтаму факту нейкае асаблівае значэнне, даваў зразумець, што абы-каго не саджаюць. «Мой жа сын не ўкраў і не ўбіў. Дык за што яго тады пасадзілі? Падумайце! Разважце! Я газетаў не чытаю, але ж мы чулі ўсе — пасадзілі вунька якіх людзей. Усіх, хто ў пачоце ў Леніна быў, хто стаяў за людзей. Да аднаго — усе вялікія галовы. Не, дурняў не садзяць».

Масея Лявонавіча падтрымліваў такі ход думак, яму як бы станавілася лягчэй ад усведамлення, што «абы-каго не садзяць», што ягоны сын належыць да такіх людзей, што «стаялі за людзей».

У Масея Лявонавіча з'явіўся нават гонар за сына, з'явілася зразуменне ягонай годнасці. «Піша ж. У газетах яго імя стаіць. Не піша ж ён супраць людзей, а за людзей. Дык, можа, за ета яго й пасадзілі?»

Боль за сына, аднак, ад такога ўсведамлення не сціхаў, рабіўся яшчэ больш пякучым — марнуецца ж ні пра што ні за што чалавек.

Старшыня калгаса, брыгадзіры, здавалася яму, глядзелі на яго цяпер іншымі вачыма — ён як бы вырас у іхных вачох, набыў большую вагу. Аднак вонкава ставіліся да яго нязменна, па-ранейшаму — пасылалі на агульныя, не самыя лёгкія работы. Як быў, так і застаўся ён для іх — касцом.

Масею Лявонавічу і Маланні, а таксама й дачцэ людзі выказвалі сваё спачуванне — адныя шчыра, спагадна, іншыя — каб захаваць толькі звычай: спагадаць чалавеку ў няшчасці. Адно было відавочна — арышт Масеевага сына быў для ўсіх неспадзеўкай, успрымаўся як няшчасце для чалавека, пагатоў такога маладога. Але людская спагада яшчэ больш вярэдзіла душу, выклікала яшчэ большы жаль. Спачуванне даводзіла Маланню да слёз, дарма што яна глытала іх, каб не паказацца перад людзьмі такой слабай.

Што сына цяпер няма ў хаце — гэта не ўпершыню. Гэта было й раней. Але цяпер ягоная адсутнасць адчувалася асабліва. Пра адсутнасць сына ў хаце сведчыла ўсё: стол, дзе ён не сядзіць, пасцель, дзе ўжо ён не спіць, кніжкі на паліцы, да якіх ён не дакранаецца, забыты гальштук на цвічку, фатаграфіі ягоных сяброў, што вачыма са сцяны шукаюць яго, нават само паветра ў хаце здаецца больш разрэджаным.

Дасюль, калі не было сына, ён усё роўна як быў. Ён прыязджаў на канікулы — на Каляды, а потым на цэлае лета. Ягоная прысутнасць ніколі не канчалася. У хаце быў ягоны дух. Цяпер такога адчування няма. Прысутнасць яго скончылася. Без яго апусцела не толькі хата, а й панадворак: ён не коле там дроў, не пілуе з бацькам на сталюзе дошкі. Нідзе не чуваць ягонага голасу.

А то ў нядзелю глядзіць Масей Лявонавіч у вакно: насупраць, праз дарогу, ля вясковага клуба тоўпіцца моладзь — хлопцы і дзяўчаты, сынавы равеснікі. І сярод гэтага гурту няма сына. Яны жартуюць, смяюцца, танцуюць, весела праводзяць сваю маладосць. Ах, лепш бы гэтага не бачыць— чыстая пакута!

Не раз змяніліся поры года, наступіла вясна — каторая гэта ўжо? — а сына няма. Не прыехаў і гэтай вясною на канікулы. Нават не прыслаў пісьма. Праўда, гаварыў жа, што часта пісаць не зможа, што калі не будзе доўга ад яго пісем, дык гэта яшчэ не будзе азначаць, што з ім кепска. Але ж, напэўна, кепска, што дасюль ні слоўка няма. Казаў, што выпусцяць, разбяруцца. Вось і разабраліся — ні слуху ні духу.

Апусцеў мост над рэчкаю Свінкай. На ім не відаць Масеевага сына. Унізе, пад самым мостам, дзе глыбей, боўтаецца, як і раней, дзятва — дае нырца, выплывае наверх, пырскаецца. Загарэлая, вылазіць на бераг, каб пагрэцца на сонцы. Але ўнізе, там на поплаве, не пасуцца ўжо гусі і не відаць іхнай пастушкі. Хіма гаворыць, што Дуся ўжо завялікая, каб хадзіць з хварасцінаю за гусямі. Дуся ўжо блізка нявесты, гаворыць Хіма. На яе ўжо хлопцы заглядваюцца. Ёй трэба вучыцца вышываць, а не гусей пасвіць. Чатырнаццаты годзік мінае. Ладная ўжо дзеўка і саромеецца з гусямі быць.

Хіма наводзіла спраўкі пра Масеевіча. Нічога не чутно пра яго.

— Ах, як шкада хлапца! Не коціць ужо з горкі, не вітаецца. Няма. У хату ўжо не забяжыць. Хліпцеў ён па нашай Дусьцы. Дый і яна... не можа забыць яго. Вунь усё нешта піша. Не паказвае, хаваецца. Ды ад мяне не схаваеш — усё бачу. З свайго хавала дастае фатаграфію — углядаецца. А то нешта чытае ў кніжачцы. Шэпча. Ты, стары, усяго гэтага не бачыш. А я бачу. Не смейся, у іх была ўжо любоў. Млеў ён па ёй, і яна. Нясмелая, малая, а ўжо чула яго, ліпла. Ды ён чэсны хлопец. Я давярала яму Дуську. Падрасце, думала,— нявеста будзе для Масеевіча. Яна ж у нас удалася — прыгожанькая. Уся ў мяне. Не лыпай — чаго ты? З іх была б добрая пара. Ён браў бы навукай, а яна — хараством сваім.

— Балбочаш ты й сама не ведаеш што. Пустое мелеш. Вярзеш вярзёнку. Такая ты з ёю красавіца! Невядома яшчэ, што было б з гэтай красы. Ужо было й да грэху недалёка — бачыў, прыкмячаў. Добра, што ён совесны хлопец. У іншага яна ўжо спяклася б. Ліпла ж. А ты хоць бы што. Яшчэ й патурала. Канешне, шкада хлопца. Да душы быў ён мне. Ды вось насцігла яго няшчасце — гавораць, ужо засудзілі і некуды далёка выслалі.

— Крый ты Божа! А я ўсё думала — вернецца скора. Ці ж яго ёсць за што судзіць. Вот свет настаў!

— Не ойкай. І з дачкой памалу. Не пры ўнявесты.

— Трэба ж думаць і пра ета. Не за гарамі яно. Душа мая чула... я пра Масеевіча. Я табе й не расказала, як ён адыходзіў ад нас... паследні раз... як ты быў у Касцюковічах. Гаворыць, яму пара ў дарогу збірацца, а я не ведаю, пра якую дарогу ён гаворыць. Спяшаўся, а ўсё не мог выйсці. Прывязаны быў ён да нас, да нашай Дуські. Прычгаў жа з Касцюковічаў... Кінуў цябе. Бягом прыбег. Сваю хату мінуў. У нашу прыляцеў. Мы вячэрылі якраз. Я ўсадзіла і яго. Яны сядзяць абодвы... ну ведаеш — душа радуецца. Люба паглядзець, згодныя такія. Адно адным не налюбуюцца. Вось жа сядзяць, а тут — як гокне! Як ударыць! Яшчэ і яшчэ! Вокны ў сіняй схватцы закалаціліся. Вогненная кацёлка па двары пакацілася. Зашыпела... Сціх як бы ўжо й гром. Ды зноў як гокне — у саменькі вугал. Дуся за шырму хавацца. З галавой накрылася. Гукае мяне. Я не пайшла. Масеевіч пайшоў. А тут зноў... і яна яму на рукі... так, як, бывала, к табе. Уся збялелая... Толькі ў яго на грудзёх сціхла... Нам адным страшна было, і я Масеевіча не пушчала з хаты — куды ж у такую гразу... А ён і сам, бачу, гатовы застацца ў нас... Шкада мне яго... Не хацеў ён ісці... Дождж сціх і ён, не хочучы, пайшоў... І от яго цяпер няма... Збіраўся ў дарогу... і, вот табе, якая дарога. Ты слухаеш мяне?

— Слухаю... Слухаю, дуруша ты еткая.

— Ты не можаш разабраць, што яна тут напісала? Учора ж цэлы вечар дапазна сядзела. Каму ж як не яму?

Падала Піліпу сшытак.

— Адвяжыся! Трэба табе знаць?

Як ні прасіла, Піліп не стаў чытаць.

— Ты й хацеў бы, ды не можаш. Галава ў цябе пустая. Усё вылецела з яе. Буквы ўжо і тыя забыў.

Увайшла ў хату Дуся.

— Мы ета пра цябе і Масеевіча.

— А што пра мяне?

— Ды нічога. Так сабе. От шкадавалі хлапца. Да нас ужо не забяжыць. Ты пісала яму што?

— Нічога я не пісала. Куды ж яму я напішу?

— Ну нешта ж ты ўчора пісала? Не хавайся... Прачытай, што напісала! Мы з бацькам хацелі во самі прачытаць, ды не ўмеем. У цябе ж ад нас сакрэтаў няма. На, прачытай нам.

— Вот, мама, якая ты! Я ж табе не маленькая, а ўгаворваеш мяне як маленькую. Нічога я тут не напісала.

Гэта я толькі перапісала ў свой сшытак адзін вершык, што я люблю. У маім сшытку шмат іх. А ты думала, што пісьмо? Цяпер я буду ад цябе хавацца, мама... Давай, прачытаю...

Заўсёды ты перада мною,
перад табой заўсёды я.
Занята сэрца ўсё табою,
красуня гордая мая.

Але сказаць ніяк не ўмею
я гэтай праўды з прастаты.
Чаго стаю, чаго нямею
перад табой — не знаеш ты.

І толькі, можа, хваляванне
дае табе аб гэтым знаць.
Няхай, няхай! Я рад — прызнанне
душы не можа расказаць.

Таксама як вясной галіны
сказаць не могуць, ад чаго
да сонца цягнуцца няспынна,
усё глядзяцца на яго.

Я рад, што ты ўсягды са мною,
што прад табой заўсёды я,
што чую я цябе душою,
красуня ціхая мая.

— Вось якое маё пісьмо.

— Ты, паганка, чытаеш не тое. Ета з кніжкі. Ты прачытай, што ты напісала сама.

— Таго не магу, матулечка...

— Саромішся. Ужо знаеш стыд? Ну, глядзі мне! На вуліцу не йдзі ўжо — позна!

Пад хатаю дзеда Мельніка адгукнуліся дзяўчаты песняй. Яна паплыла вечаровым наўколлем. Узбуджанае, яно панесла песню далёка-далёка, пакуль яна не скончылася недзе разлівістым рэхам.

— Матулечка, чуеш, як прыгожа? Пусці! І я хачу заспяваць разам з імі. Ты пачуеш, які ў мяне голас. Ты ніколі не чула, як я спяваю. Я спявала дасюль толькі сабе. Пусці хоць на каротка.

— Не, дзеўка, лажыся спаць. Заўтра пойдзем на праполку. Трэба рана ўставаць. Будзем лён палоць.

Хіма патушыла лямпу. Пачалі класціся. Пілiп лёг у сенцах — там халадней. Хіма з дачкой леглі на шырокім ложку, затуленым ад хаты шырмай. Хіма хутка захрапла,

а Дуся, стоеная, ляжала ціха, не магла заснуць. Яна хацела б пайсці на вуліцу, да дзяўчат — нейкая сіла цягне яе да іх. Гэтым сілам няма выхаду, ёй душна, яна варочаецца, скідае з сябе пакрывала, высоўвае свае ногі на волю — таўчэ імі адкінутую з-пад галавы падушку. А то зноў, агаленая, сцішыцца, і перад ёйным зрокам праходзяць уяўныя малюнкі, настолькі звабныя і пажаданыя, што яны здаюцца ёй рэальнымі. З раскінутымі рукамі яна чакае іхнага набліжэння. Яна ўжо не ведае, у сне яна ці наяве. Нехта нясе яе на руках, туліць, цалуе, дакранаецца да яе, чуллівай, але, нясмелы, далей нічога не робіць, нясе і нясе, аж пакуль не апусціў яе на траву ў вербалозе за іхнаю хатай ля рэчкі, яна замірае ад жарсці, хоча яго, ды баіцца — адпіхнула ад сябе.

— Дзетка маё, што ты так мяне абхваціла. Сон мо бачыла які страшны? — пытаецца, пракінуўшыся, Хіма.

Дуся адкацілася ад маці, тут жа забыўшыся глыбокім сном...

Зацвіў у полі лён, аж вочы адбірае, калі глядзіш на яго — такі сінюткі. Пераліваецца. Грае ўсімі колерамі неба, адбівае ўсе адценні зямнога і нябеснага бытавання, глядзіць на цябе, прамаўляе, і душа твая даверліва раскрываецца насустрач яму, зацвіцеламу.

Дуся не прыкмячае, што побач яе полюць жанкі, дзяўчаты, ейная маці, цэлае звяно. Яна толькі адна і з ёю сінявокі лён. Яна ў ім, як у нейкім незямным царстве, лёгкі і празрысты вятрыска ахоплівае яе з усіх бакоў, і яна, чуллівая, радуецца ягонаму казытліваму дотыку, даступная і адкрытая яму. У гэтым блакітным царстве ейны слых ловіць самыя найменшыя згукі, ёй здаецца, што нехта шэпча ёй, а што, яна добра й не ведае, толькі нешта спакуслівае і пажаданае ёй. Той «нехта» некуды нясе яе, якраз гэтак, як у ейным начным сне, цалуе яе. Ды сціхае вятрыска, ніхто ёй больш не шэпча, і, свабодная, яна аддаецца сабе самой, любуецца зацвіцелым полем, і радасць існавання напаўняе ўсю ейную істоту. Яна ў звяне. Яна вярнулася аднекуль, як з паднябесся, і ўжо бачыць сваю маці і ўсіх, хто з ёю. Яна ўжо поліць. Натамілася. Хочацца адпачыць. Звяно йдзе на ўзлескак, пад шырачэзны дуб. Ён схавае ад спёкі. Папалуднаваўшы, яны прылягуць на нейкі час, над імі будзе стаяць ледзь чутны пошум дуба, але не ўсе з іх заснуць. Нехта з іх будзе слухаць, як скрозь сон, ягоны затоены спеў, ціхі шэпт, яшчэ не разгаданы нікім.

Ад Масеевіча прыйшло пісьмо. Ішло яно доўга — гэта было відаць паводле шматлікіх пячатак на ім. На пошце ў сельсавеце яно праляжала некалькі дзён, аддаваць яго адрасату надта не спяшаліся.

Што ў тым пісьме? Прайшло столькі часу — нічога не было, а тут от раптам — сэрца можа разарвацца.

«Дарагія мае мацi, бацька, сястра!

Не пужайцеся. Нічога дрэннага ў маім пісьме няма. Чытайце маё пісьмо, як бы я пісаў яго з адпачынку ці з якога падарожжа. А што я доўга да вас не пісаў, дык я ж гаварыў вам пра гэта. Дый не было пра што пісаць. Цяпер усё ўжо ясней, і я пішу, каб вы ведалі, што са мною нічога больш не сталася, апрача таго, што ўжо сталася і пра што вы ўжо ведаеце. От жа накляпалі на мяне. Паклёпам паверылі. Я пішу куды трэба, каб зняпраўдзіць паклёпы. Вы ні на адну секунду не падумайце, што я ў чым-небудзь вінаваты. За мной няма ніякай віны. А от абвінавацілі. Прыпісалі, Бог ведае што. Я спадзяюся, што вышэйшыя органы разбяруцца, і я буду асвабоджаны. І вы там — чуеце, што я вам гавару? — надта не бядуйце па мне. Ты, сястра, чытай маё пісьмо бадзёра, не вычытвай у ім больш таго, што ў ім ёсць. Я цяпер у Новасібірску. Адсюль павязуць далей — праз усе сібірскія гарады. От ужо нагляджуся! Ці мог бы я калі-небудзь пабачыць гэта ўсё? Будзем праязджаць Хабараўск і недзе там станцыю Верына — там жа мая цётка, якой я ніколі не бачыў. От каб яна ведала! Далей — Уладывасток. А там — Японскае і Ахоцкае моры. Я рады, што нас вязуць на працу. Працы я не баюся. Ты, бацька, мяне прывучыў. Гэта лепш, чымся сядзець у Мінску — у турме. З Мінску нас везлі цэлай кампаніяй. Былі цікавыя людзі, з імі я рады быў пазнаёміцца. Яны надта не сумуюць, трымаюцца бадзёра. У іхнім гурце і мне было весялей. У думках я жыву заўсёды з вамі. Я ўсё бачу: як вы ўстаяцё, снедаеце, што гаворыце, куды ідзеце на працу, калі вяртаецеся дахаты. Усё-ўсенькае стаіць у мяне ўваччу. Вокны нашай хаты ну проста глядзяць на мяне. Ведаю нават тую часінку, калі вы гаворыце пра мяне. Вось і цяпер я бачу вас пры маім пісьме. Ты, сястра, развесяляй бацькоў, каб яны не нудзіліся. Скажы ім, што мяне й чорт не возьме. Вытрымаю. Прыйду. Вярнуся. Толькі, каб вы там былі жывы-здаровы. Толькі каб вам там было добра — от што мне баліць. Пісаць вы мне цяпер не зможаце — мы ў дарозе, і пакуль нас не прывязуць на месца, дзе мы будзем працаваць, пройдзе шмат

часу. Адтуль я ўжо й падам вам свой адрас. Тады вы й напішаце мне. А пакуль толькі маё пісьмо.

Гэта — усё роўна як бы мы ўсе разам пагаварылі: вы мне расказалі пра сябе, а я пра сябе. Я вас добра чуў. Вы расказалі не толькі пра сябе, а й пра ўсе навасці, пра ўсё тое, што цяпер у вас адбываецца. Цікава было б дазнацца больш. Мае дарагія мама, бацька, сястра, канчаю на гэтым сваё пісьмо. Абнімаю вас крэпка і цалую. Люблю вас. Думаю пра вас. Да хуткага пабачання. Застаюся з вамі. Ваш Мікола».

Чутка, што Лявонавіч атрымаў ад сына пісьмо, не засталася сакрэтам для вяскоўцаў: «Лявонавічу прыйшло ад сына пісьмо», «Што сын піша, Лявонавіч не гаворыць — тоіць», «Ды што там таіць? Відна й так — заказамацілі!».

Але чуткі — як чуткі: пранесліся й сціхлі. Што там каму чужая болька? Свайго ўсяго хапае... Слоў няма — шкада хлапца, але Лявонавічу, можа, так і трэба — скнара, жлоб.

Ішлі дні, тыдні, месяцы,— ды што там «месяцы»? — прамінуў не адзін ужо год, і хваля забыцця праглынула людскую памяць пра Лявонавічавага сына. Яе засмактала штодзённая турбота пра сваё. Чужая журба — не журба.

Ды не пакідала тая журба Лявонавічаву хату. Ягоная хата й так была як наводшыбе, а цяпер як бы аддзялілася яшчэ болей, адасобілася, замкнулася ў сабе самой, у сваім горы і засмучэнні. Ейныя жыхары выглядалі цяпер як адкінутыя, выселеныя, сталі быццам чужымі. На хату Лявонавіча глядзелі цяпер як на адарваную часціну ад цэлага. Калі Лявонавіч прыходзіў на агульны сход калгаснікаў, пачуццё адчужанасці яшчэ больш узмацнялася: яму здавалася, што ён лішні, што ён не свой, што ягонаму гору не спачуваюць, а радуюцца ў душы. Аднойчы, будучы на сходзе, Лявонавіч захацеў прылюдна папрасіць старшыню, каб ён вызваліў яго ад касы, не можа ж ён дзень у дзень хадзіць з касой, у той час як маладзейшыя і дужэйшыя за яго цэлымі днямі лынды б'юць і ім яшчэ налічаюць за адзін дзень лындаў паўтара, а то й два працадні. Старшыня не ўзлюбіў гэтага і ў злосці пекануў Лявонавічу:

— Масей, не забывайся, дзе твой сын!

Большага болю старшыня не мог прычыніць Лявонавічу. Лявонавіч пакінуў калгасны сход, паніклы, з слязьмі на вачох. Ён зарокся не хадзіць на сходы.

Сум, журба, жаль, усведамленне сынавых пакутаў, страх за ягонае жыццё неўпрыкмець апусташалі душу Лявонавіча, з'ядалі яе. Лявонавіч не мог перажыць, не мог пагадзіцца з думкай, што сына няма, і тым больш не мог зміръщца — што нічога не чуваць пра яго. Лявонавіча пужала невядомасць. Бясконцае чаканне нейкіх — хутчэй за ўсё нядобрых — навінаў, страх перад імі трымалі Лявонавіча ў заўсёдным неспакоі і напружанні. Часта яму здавалася, што сын недзе тут, некуды пайшоў і хутка вернецца. Ён адклепаў яму касу, і яны йдуць разам касіць у Супырыцу. Па дарозе сын расказвае яму, што ён нідзе й не быў, што ён свабодны і йдзе во разам з ім — няма чаго смуціцца і плакаць. Рады Лявонавіч просіць Маланню згатаваць ім, як прыйдуць з працы, сытную вячэру. А то ў нядзелю сядзяць яны за сталом, абедаюць, сын курыць сам — не хаваецца ўжо, дарослы,— і частуе яго, бацьку, папяросамі з прыгожай каробкі,— ён прывёз з Мінска цэлую тузіну такіх каробак. Кураць вось так, гавораць. Ён дзівіцца, што сын гэтак шмат ведае пра ўсё — што значыць вучоны чалавек! Бацьку вялікі гонар. Распіваюць з ім паўлітра, і маці не пярэчыць, яшчэ й падкладвае закуску. Ды хутка Лявонавіч ловіць сябе, што ўсё гэта толькі ўява, што ў сапраўднасці сына няма, і пустка ў душы яшчэ даймае больш. Яшчэ з большай сілай апаноўваюць ім несціханыя, неадступныя, у змрок ахутаныя думы.

Ні з кім асабліва Лявонавіч у гутарку не ўступае — робіць сваё, толькі калі ў брыгадзе пачуеш ад яго якое слова, дый то як кароткі адказ на якое-небудзь запытанне. Буркне і сціхне. Думае нешта сваё. З гэтым усе звыкліся, і ніхто надта не набіваўся яму ў суразмоўнікі. Гэтак і заставаўся ён сам па сабе, а людзі самі па сабе.

Адылі яму ой як хацелася з кім-небудзь загаварыць, ды не было з кім. З Маланняй ён дзяліўся толькі сваімі снамі пра сына, але гэта яго не задавальняла, яму трэба быў нехта чужы, перад кім ён мог бы адкрыцца, выкласці ўсё, што накіпела ў ягонай душы. Ды такога чужога не было ў яго, і невыказны жаль тлеў у нутры, не знаходзіў выхаду.

Асабліва цяжкой была для Лявонавіча нядзеля, калі ён не працаваў і калі ў клубе — што праз дарогу — моладзь спраўляла свае гулі: танцавала, спявала, весялілася. Гэта балела Лявонавічу. Ён глядзіць у вакно, бачыць, як моладзь спяшаецца, пачуўшы гармонік,— хто з кім ва-

ляць валам. Смяюцца, рагочуць. А калі гарачыня, дык выходзяць з клуба і танцуюць, можна сказаць, пад самым вакном Лявонавічавай хаты. Глядзіць на ўсё гэта Лявонавіч і ніяк не можа сцішыць болю ў сэрцы: «Усе тут. Усе тут, толькі няма яго аднаго. Гуляюць вось і што ім да каго?» Лявонавіч не можа заснуць, пакуль не сцішыцца ўсё на вуліцы, пакуль не разыдуцца хто куды. Дый пасля, калі настане цішыня, Лявонавіч усё роўна не можа заснуць — лезуць думы адна за аднэй. Думае пра Вяркеева. Можа, загляне. Быў жа ўжо колькі разоў. І ўсё ўначы. Саромеецца, баіцца заходзіць днём. Пабачаць — скажуць: спачувае. Ды ён — малайчына. Пагаворыць. Супакоіць. І лягчэй на сэрцы. Не цураецца. Няхай бы ж забег во й цяпер. Пэўна, недзе гуляе. Што яму, маладому?

І Вяркееў прыкаціў — п'янюсенькі. «Хоча ўзнаць што пра сына ці так — пагаварыць? От — як вымаліў яго».

Селі за стол упоцемках.

— Я, Лявонавіч, толькі на хвілінку. Бег і вось забег. Як дзялы? Надта не мардуйце сябе. Будзе перамена, і ўсё пераменіцца. І пабачыце — Мікола хутка вернецца.

— Адкуль ета вы знаеце?

— Скажу вам вось што. Давяраючы вам. Гітлер усёткі нападзе на нас. Мала што ён з намі дагавор заключыў. Усё, што мы атрымалі па дагавору з ім, забярэць назад. І каб жа толькі гэта! Як ашалелы прэцца й прэцца. Скруціў вон Францыю, і ў Еўропе ніхто ўжо не ўстаіць проці яго. Завернецца, кажу, і папрэцца на нас. І тады што? Наўрад, каб мы яго стрымалі — праломіць нашу абарону і пойдзе наскрозь, аж да Уралу. Прабойная сіла ў яго вялікая. Дык разляцяцца і тыя лагеры. І пойдуць, пабрыдуць з іх ува ўсе канцы нявольнікі. Гэтак прыйдзе дахаты і Мікола. Кажу вам!

Лявонавіч слухаў настаўніка, вучонага чалавека, насцярожана і з пэўнай доляй недаверу: «Як гэта ён так раптам загаварыў пра вайну, пра Гітлера. Усё як бы ціха, а ён пра вайну... Ніхто нічога не гаварыць, а ў яго на языку — вайна. Ці, можа, сп'яну?» Ды тым не менш слухаў уважліва, стараўся нічога не прапусціць, усё ўцяміць. «Пэўна ж, мы, сляпыя людзі, нічога не ведаем — што і да чаго. А гэта во чалавек разбіраецца, бачыць наперад. Прадказвае».

Лявонавіч слухаў і адчуваў, як у ягоную душу ўлі-

ваецца нешта новае, дасюль нечуванае нешта радаснае, хоць і трывожнае. Вяркееў узбудзіў у ягонай душы надзею, ашаламіў яго незвычайнымі навасцямі. Лявонавіч адчуваў, быццам у яго пад нагамі вырасла нейкае апірышча.

— Ці пра ета, пра вайну, пішуць газеты, ці вы гэта ад сябе?

— Газеты выхваляюць поспехі Гітлера ў заваяванні Еўропы, але маўчаць, што ён можа заваяваць і нас. Газеты пра гэта пакуль што маўчаць. Але ёсць людзі ў Крамлі, што бачаць такую апаснасць. Нездарма ж наша ваенная тэхніка дзень і ноч грукочыць праз станцыі і паўстанкі. Вязуць. Куды, вы думаеце? На Захад. Для спаткання з Гітлерам. Нашым снаражэннем завалены ўжо ўвесь наш Заходні фронт. Адкуль я ведаю, запытаецеся? Не сумнявайцеся! Мы ведаем. Мы ведаем, што Гітлер вылупляе свае вочы на нашыя прасторы, дык мы і хочам стварыць надзейны заслон супраць яго. Гэта адно. Іншае — каб, як вытварыцца адпаведная сітуацыя, ударыць Гітлеру ў спіну. Ён там, на Захадзе, будзе курпечыць розныя Бельгіі, Галандыі, Даніі, а мы — тут як тут. Раз-два, і ўся Нямеччына наша. Не падумайце, Сталін таксама ў шапку не спіць. Вусамі сваімі добра стрыжэ.

Лявонавіч не можа ўседзець на месцы спакойна — усё гэта так незвычайна для яго. Усё гэта такое пажаднае, але й такое ненадзейнае. Захапленне яго вялікае, але й апаска не меншая: як пачнецца тое, дык чым яно скончыцца.

— Вы думаеце, што й мы тут, на месцы, не рыхтуемся да гэтых падзеяў? Не, Лявонавіч, рыхтуемся, дый яшчэ як! Мы лічымся — трэба ж разлічваць на самае горшае,— што Гітлер можа праскочыць, заняць некаторыя нашы тэрыторыі, у тым ліку і наш раён. Дык што, вы думаеце, мы будзем сядзець склаўшы рукі? Не, у нас на такі выпадак будзе ўжо ўсё гатова. У нас ёсць ужо бронь: старшыня сельсавета застаецца ў тыле, наш камсамольскі важак...

— А вы?

— І я. Да нас далучацца і некаторыя раённыя кіраўнікі, на чале з сакратаром партыйнай арганізацыі. Між іншага, пакідаецца ў тыле і наш з вамі ўпаўнаважаны для арганізацыі партызанкі, на выпадак, калі, кажу, вораг дапне і сюды. Вось такія, Лявонавіч, планы. Я з вамі гавару сакрэтна, давяраючы вам. Хоць вы і пакрыўджаны савецкай уладай чалавек, але вы не вораг савецкай улады.

Я думаю, Сталін распусціць турмы — патрэбны людзі. Выйдзе і Мікола, ваш сын, а мой таварыш. Дзеля яго, у імя яго я й гавару пра ўсё гэта з вамі. Мы з ім не заўсёды ладзілі, але я паважаю яго як здольнага, карыснага нам чалавека. Пабачыце, Лявонавіч, мы яшчэ будзем з ім партызаніць... Мне шкада цёткі Маланні — гэтак яна ўбіваецца! А Дар'я? Гэта ж золата, а не дзеўка! Прывязаўся я да вашай сям'і, як ні да кога. Вы сапраўдныя людзі. Вы мне — як бацькі. Вы думаеце, я прырос тут, знайшоў душэўных людзей? Не, каб не вы, мне некуды было б дзецца. Я, можа, дзеля гэтага і ў бяду папаў — пусціў на свет Божы незаконнае дзіця.

Жальба, скарга Вяркеева падкупіла Лявонавіча, ён стаў болей верыць у тое, што яму гаварыў паважаны ім настаўнік.

— Думаеце, Сямёнавіч, Сталін пабярэць і тых, што ў турме сядзяць? Возьміць ён іх у армію?

— Усе яму спатрэбяцца... А як жа? Але, Лявонавіч, я ж не Бог, усяго ведаць не магу. Можа, яно ўсё пойдзе па-другому.

— Я, Сямёнавіч, баюся, што як пачнецца вайна, зняволеным будзе горш. Іх можа Сталін і пастраляць.

— Нашто яму іх страляць. Вайна пастраляе, як яна пачнецца. А я ўпэўнены ў тым. Але ж пайду ўжо — глядзіце, ужо віднеецца.

Лявонавіч зірнуў у вакно — супакоеная за ноч дарога ўжо шарэла, плот насупраць выступаў з імглы сваімі абрысамі.

— Дык, Лявонавіч, іду. Хай наша гутарка застанецца паміж намі. Можа, я вам і зашмат нагаварыў... Ад Міколы ж нічога не чуваць, а?

— Я ж бы не таіўся ад вас.

Вяркееў пайшоў, пакінуўшы ў душы Лявонавіча надзею, спадзяваннне, сумляванне, трывогу.

На прызбе дзеда Мельніка сядзяць дзяўчаты — вечар ядраны, халаднаваты, і яны туляцца адна да аднэй. Хлопцы ўкліньваюцца паміж імі, садзяцца на калені, залазяць за пазуху, просяць пагрэць там свае рукі. Дзяўчаты брыкаюцца, адпіхваюцца, верашчаць. Але хлопцы, асабліва найбольш нахабныя, лезуць зноў, дамагаюцца свайго. Але лезуць не да ўсіх. Ёсць дзяўчаты, якіх яны баяцца: тыя добра даюць ім кулакамі пад рэбры.

— Няхай сядзяць, недатрогі. Каму яны патрэбныя? У нас ёсць вон маладзейшыя.

І чапляюцца да тых «маладзейшых» — новай змены, якой папоўнілася дзявочая грамада пад хатаю дзеда Мельніка. Сярод гэтай новай змены і Дуся. Яна прыходзіць сюды спяваць. Маці просіць яе не пазніцца, прыходзіць дахаты, калі яны яшчэ не лажацца. І калі Дусі доўга няма, па яе прыходзіць маці. Забірае яе, і яны разам ідуць дахаты. Хлопцы суправаджаюць іх жартамі, смехам і скаромнымі словамі:

— Усё роўна не ўцалее.

Сёння вечар звонкі, і дзяўчатам трэба ўсё-ткі заспяваць. Сціхаюць і хлопцы. Часамі і яны слухаюць, хоць і нядоўга. Дзяўчаты радзяцца, з якой песні пачаць. Пагаджаюцца на той, якая будзе далей чуваць. Спрабуюць свае галасы. Нейкая з іх — вядучая — бярэ ноту — завысока, кажуць. Просяць — ніжэй. І вось, ужо зладжаныя, натхнёныя, яны аддаюцца песні, аддаюцца ўсёю душою, выспеўваюць усё тое ў ёй, што наспела і просіцца на волю. Песня ўзнялася высока, паплыла, пакацілася, яна то замірае, то зноў узносіцца, бясконцая, запаўняе прастору, і ў ёй, у гэтай прасторы, здаецца, ужо нічога няма, апрача самой песні. Дуся мае надзвычайны слых і голас. Ейны голас пазнаюць нават на адлегласці, у бліжніх вёсках, дзе таксама збіраюцца па вечарох хлопцы і дзяўчаты. Адклікаюцца сваімі песнямі або прыслухоўваюцца, як спяваюць іхныя суседзі.

— Чуеце? Гэта ж Хіміна Дуся гэтак бярэ.

Калі Дуся не прыходзіць на спеўку, яе выклікаюць ейныя сяброўкі. Сярод дзяўчат на прызбе дзеда Мельніка ёсць выдатныя спявачкі, харысткі, як іх называюць хлопцы. Да харыстак належыць і Дуся. Зрэшты, яе надта і не трэба ўпрошваць — сама рвецца на пагулянкі. Ейная маці добра ведае, што дачку цікавяць не толькі песні. Дзеўка яна ўжо «бальшая», і Хіма неспакойная за яе. Выгадавала. Выпеставала. Дзеўка завідная. Не налюбавацца. І ростам выйшла, і стройнасцяй, і з твару ніхто не зраўняецца — шляхетныя рысы, бровы ўзнятыя, вочы — іскрыстыя, зірне — не ў аднаго сэрца ёкне. А было ж — іх за людзей не лічылі: бедныя, хата голая, ні кала ні двара. Толькі нядаўна Пiлiп прыбудаваў сенцы. Гультаяваты, басні толькі расказвае. Пачоту ў людзей не мае — дзівак нейкі. А во глядзі — якую дзеўку праізвёў! Сын — як сын.

А гэта ўзяла ўсім. Піліп нават аўтарытэт набыў: такую дачку мае.

Пацішэла на прызбе ў дзеда Мельніка — дзяўчаты пачалі разыходзіцца. Позна ўжо. Заўтра трэба рана ўставаць на працу.

З рэчкі на вуліцу напоўз туман, нічога не відно — схаваліся хаты. Дуся йдзе дамоў. Яе ніхто не праваджае. Хлопцы пагналіся за іншымі. Яна ні з кім не захацела ісці разам. Аж нехта ззаду цапнуў яе за плячо.

— Дуся, гэта я! Мікола.

Дуся пазнала Міколу Бугрова. Ён не прыходзіць на прызбу да дзеда Мельніка, адасабляецца — камсамольскае званне не дазваляе яму змешвацца з гуртам. Але за Дусяй ён страляе. Даганяў яе па дарозе дахаты ўжо не раз. Угаворваў, каб яна з хаты перабралася спаць у клець. Дуся баіцца яго. Дый маці, яна ведала, не пусціць яе ў клець — будуць прыходзіць хлопцы. І Дуся не выходзіла, як ні схіляў яе да гэтага Мікола Бугроў. Не сказаць, каб яна не цікавілася ім — хлоцец ён ладны, хоць і вялікі хвалько. Яго так і празвалі дзеўкі — Хвалько. І Дуся, уласна, была цяпер не супраць, перад тым як пайсці ў хату, пастаяць з ім якую часінку. Спыніліся. Мікола адразу паказаў свой хлапцоўскі спрыт: пацягнуў Дусю далей ад хаты, у закутак на двары. У няспыннай жарсці цалаваў яе, абнімаў. Калаціўся ўвесь, як ў ліхаманцы. Дуся ўпіралася, не йшла ад хаты. Мікола пачаў тады прыпіраць яе да сцяны і, прыпёршы, шчыльна прыпаў да яе, цалуючы і хапаючыся аднэй рукой за ейную суценку знізу. Дуся не ўпусціла яго, і ён, звяўшы, у знямозе, абвіс у яе на грудзёх. З агідай Дуся адштурхнула яго і ўцякла ў сенцы. Хіма, відавочна, пачуўшы, як яны валтузіліся, пачала гукаць у вакно:

— Дуся! Зараз жа ў хату!

Ужо ў хаце маці запыталася ў дачкі:

— Хто гэта быў?

Дуся ёй нічога не адказала і моўчкі лягла спаць. Заўтра ж ейны дзень: будзе выпуск. Атрымае пасведчанне аб заканчэнні сямігадовай школы. «Але я не пайду. Я завялікая для сямігодкі — дылда».

Але на выпускны вечар Дуся ўсё-ткі пайшла. Маці адзела яе як найпрыгажэй. І сапраўды, Дуся выглядала хутчэй як нявеста, а не як вучаніца. Ды сорам у яе мінуў, яна загарэлася ахвотай пайсці на вечар. Там будуць ейныя настаўнікі, сяброўкі, бацькі, хлопцы, усе, хто захоча прый-

сці. Будуць танцы. Гэта ейны дзень! Перад адыходам, паглядзелася ў люстэрка: у вачох — таемнасць, глыбіня, задуменнасць, бровы — узнятыя, міргліва-насцярожаныя, твар — радасна-ўсмешлівы, белы каўнерык блузкі зграбна абняў шыю, чорныя, з праборам на галаве, валасы спадаюць за спіной дзвюма туга сплеценымі касамі. Агледзеўшы сябе, засталася задаволенай. Пакінула хату.

Пасведчанні аб заканчэнні Макранскай сямігадовай школы былі раздадзеныя выпускнікам удзень. Цяпер жа, ўвечары,— заканчэнне з танцамі. Дуся ўвайшла ў самае большае іхнае класнае памяшканне, добра асветленае, ператворанае ў залу. Сталы, расстаўленыя ў выглядзе літары «П», былі ўжо занятыя. На самым ганаровым месцы сядзелі ў поўным складзе настаўнікі, у тым ліку сам дырэктар школы. Дуся, невядома чаму, збянтэжылася, угледзеўшы іх. Саромелася. Ёй здавалася, што толькі на яе і глядзяць яны. На яе, такую ўбраную, і, можа, не адпаведна дадзеным абставінам. Яна ўлавіла погляд Вяркеева і ў ім — здавалася ёй — асуджэнне яе. У разгубленасці яна не ведала, куды ёй прыстаць. Усхваляваная, яна не прыкмячала сваіх сяброўак. Села — невядома ёй самой чаму — якраз навідавоку ў настаўнікаў, на месцы, што заставалася незанятым — ніхто хіба не хацеў сядзець гэтак блізка каля настаўнікаў. Вучні-выпускнікі і таксама з ніжэйшых, шостых і пятых класаў, стаялі ціха на ўзбоччы ў чаканні распарадку. За сталамі ж сядзелі пераважна бацькі і іншыя госці. Пазваніў дырэктар. Пачаў гаварыць. Ягоная прамова была скіраваная болей да бацькоў, чымся да вучняў-выпускнікоў. Ён як бы даваў справаздачу перад бацькамі, як бы апраўдваўся перад імі за тыя недахопы ў школе, якія ў ёй мелі месца. І напачатку здавалася дзіўным, што ён гаворыць пра гэта. Але ў другой палавіне сваёй прамовы ён выпукліў настолькі дасягненні сваёй школы, што недахопы перасталі быць недахопамі, з'явіліся як бы тымі стымуламі, якія й прывялі школу да ейных сённяшніх, цалкам дадатных вынікаў. Прамаўлялі і настаўнікі, але, як выглядала, толькі таму, што трэба было. Больш красамоўным аказаўся Вяркееў. Ён, можна сказаць, апраўдаў сябе ў вачох бацькоў, якія крыва глядзелі на яго як выхаваўцу, у сувязі з яго недастойнымі настаўніка паводзінамі. Мелася на ўвазе Акуліна. Канешне, ён плаціў Акуліне аліменты, і тая не мела да яго больш ніякіх прэтэнзіяў. Усё было як бы ў парадку, але ўчынак Вяркеева не ўсімі лічыўся маральным. Бальшыня

была на баку Акуліны, простай, але сумленнай дзеўкі. «Чаго лез, калі не падабалася». Шкадавалі ейнага хлопчыка, «чыстага Вяркеева».

Цяпер, гледзячы на Вяркеева, статнага і прыгожага, здатнага на слова і жарт, бацькі-слухачы як бы даравалі яму ягоныя грахі.

Дусіных бацькоў на вечары не было — ім загадала дачка не прыходзіць. Яна будзе саромецца пры іх, чуцца несвабоднай.

Пачалі граць. Пачаліся танцы. А Дусю ніхто не запрашае. Адвярнуліся і сяброўкі. «Няхай не ганарыцца сваёй красатой. Няхай пасядзіць». Хлопцы-выпускнікі ўжо занятыя. Яны знайшлі сваіх і з імі не разлучаюцца. Хлопцаў-няшкольнікаў нешта не відаць. Такія танцы ім не падабаюцца. Дуся ў адзіноце. Яна гэткага не чакала. Яна не разумее, што здарылася. Чаму ёй такая помста? Азіраецца па бакох. Не ведае, што рабіць. За сталамі азіраюцца на яе. «Што такое? Чаму яе не бяруць?»

Канчаецца танец. Пачынаецца другі — Дуся як сядзела, так і сядзіць. Ніхто яе не бярэць. Не запрашае. Сама яна ўжо цяпер не адважваецца запрасіць каго-небудзь з сваіх сяброўак. Сядзіць. Але ўжо болей не можа сядзець. Гатова заплакаць. Гэтак рыхтавалася! Гэтак хацела быць тут! Гэтак была ўпэўненая ў сваім поспеху! А цяпер... «Чаму я прыйшла сюды? Што мне тут трэба? Я сюды не належу. Я тут чужая. Я тут завялікая». Гатова ўзняцца й кінуцца за дзверы.

Вяркееў назірае за ёй. Вяркееў разумее яе. Бачыць яе пакуты. «Пайсці? Нічога непрыстойнага?» Вылазіць з-за стала. Ідзе, «Куды ён ідзе?» — глядзяць на яго. Вяркееў накіроўваецца да Дусі. Яна тут. Да яе недалёка. Ідзе, ні на кога не азіраючыся. Падыходзіць да яе. Запрашае. Дуся спешна ўстае і, уратаваная, ідзе з настаўнікам у круг. Шчаслівая, закружылася ў танцы. Азмрочаны было, цяпер ейны твар засвяціўся ўсімі ейнымі прывабнымі рысамі. Вяркееў, будучы някепскім танцорам, вёў яе ў танцы смела, зусім не беручы на ўвагу, што яна яго вучаніца, а ён ёй настаўнік. Зрэшты, яна ўжо цяпер не ягоная вучаніца, і ён не ейны настаўнік. Яна можа быць з ім свабоднай. Вяркееў, выглядала, і расцэньваў яе гэтак, танцаваў з ёй як з поўнасцяй дарослай, не саромячыся шчыльна прытуляць яе да сябе, асабліва калі апыняўся з ёю ў менш асветленым месцы танцавальнай пляцоўкі. «Во гэта якраз

тое, што яму патрэбна. Не тое што Акуліна»,— ацэньвалі жанкі за сталамі.

Танец скончыўся, і Вяркееў пасадзіў сваю былую вучаніцу на ейнае месца. Пачаўся наступны танец. Зноў Дусю ніхто не бярэ. Цяпер, можа б, хто з хлопцаў-выпускнікоў і падышоў да яе, запрасіў бы да танца, але яе ўжо лічылі занятай, і не абы-кім, а самім настаўнікам. Гэтак і заставалася яна сядзець. І тут Вяркееў не палічыў нейкай нетактоўнасцяй — запрасіў Дусю зноў. Танцаваў з ёй з імпэтам. Яна адказвала тым жа. І ад іх, абаіх, стваралася ўражанне як ад якой-небудзь закаханай пары. Вяркееў ужо не прапускаў з ёй ніводнага танца, аж пакуль дырэктар не паклікаў яго да сябе. Распачаў з ім нейкую гутарку. Не адпушчаў яго, уважаючы, відавочна, паводзіны Вяркеева недастаткова прыстойнымі.

І Дуся, не хочучы больш заставацца на вечары, паспяшалася дахаты. На мосце яе пераняў Мікола Бугроў.

— Я цябе чакаў тут. Ведаў, што ў цябе іншай дарогі няма. Вось і спаймаў.

Гэта ён гаварыў нібы жартам, але Дуся баялася яго — пачне прыставаць, як і ўчора. Ды Мікола быў сёння лагаднейшы, не спрабаваў абнімаць яе, хацеў толькі ўзяць пад руку, і калі Дуся не давалася, успрыняў гэта спакойна, ішоў побач мірна і зважна.

— Можа, пройдземся паўз рэчку. Ты ведаеш, як там утульна ісці між траў і вербалозу, а якія пахі! Галава кружыцца ад арамату!

Дуся ўспрыняла паэзію Міколы падазрона.

— Я нікуды не пайду. Я іду дахаты.

У яе цяпер такі настрой — нікога не бачыць, ні з кім не знацца. Думала, як збавіцца ад яго. Неспадзяванае спатканне з Міколам было для яе прыкрым, але яна не хацела даць яму адчуць гэта. Сваю цвёрдую адмову ягонай прапановы прагуляцца злагодзіла нязручнасцяй ісці між траў і кустоўя ў такім убранні, якое ў яе цяпер. Міколу такое тлумачэнне задаволіла, тым больш што Дуся ўжо дазволіла яму трымацца аднэй рукой за ейную талію. Ля свае хаты яна не пабаіцца адкінуць яе.

І вось яны ўжо каля Дусінай хаты. Дуся хоча развітацца з ім, але Мікола не адпушчае яе, трымае за руку, не дае ёй вырвацца.

— Я закрычу, калі ты не адпусціш!

— Закрычыш?

І Мікола адным рашучым узмахам рукі распаласаваў на грудзёх у Дусі ейную блузку. Павольна, не спяшаючыся пайшоў ад яе ў кірунку хаты дзеда Мельніка.

Дуся ў слязах ціхенька, каб не пачулі бацькі, увайшла ў хату. Раздзелася. Падзёртую блузку схавала, каб заўтра не пабачыла маці. Пра выпадак з Міколам яна не скажа.

Па нейкім часе Мікола ад некага пачуў, што Дуся перайшла спаць у клець. І ён захацеў пераканацца ў гэтым. Увечары чакаў, пакуль разыдуцца з прызбы дзеда Мельніка. Там жа і Дуся — чуцён ейны голас. Ён толькі падпільнуе, куды яна пойдзе — у хату ці ў клець. На спатканне з ёй пасля ўчарашняга ён не разлічваў. Учарашняга яна яму не даруе. Ён хацеў бы замазаць сваю віну, папрасіць у яе прабачэння, але як дАступіцца да яе: «Я не ўлічыў, што яна дзеўка іншага тыпу, не такая, як усе. Больш далікатная. А я лез нахрапам. Гэта не той да яе падыход. Нашых дзевак комкай як хочаш, але не яе. А можа, яна і саўсім не хоча знацца са мною? Яна, можна сказаць, ужо студэнтка, а я хто? Лапаць. Скончыў тры класы, і ўсё. Тады ў нас і было толькі што тры класы. Сямігодкі не было. Ды каб і была, куды мне, пераростку, было пхнуцца? Сядзець разам з малечай у адным класе? Вось і пайшоў у камуну, на лёгкі хлеб. Выбіўся ў актывісты. Паслалі на курсы. З курсаў вярнуўся камсамольцам. Заняўся культурна-асветнай работай. Але які я культурнік? Адчыніў хату-чытальню ў Мокрым. Прывёз з раёна кніжак, журналаў. Пачалі ісці да нас газеты. Хацеў заманіць моладзь. Дык дзе там? На прызбу да дзека Мельніка йдуць, у хату-чытальню — не! Кінулася мне неяк у вочы яна. Страшэнна спадабалася дзеўчанё! Напачатку саромеўся загаварыць з ёю, такой яшчэ маладзенькай, а сэрцам быў ужо ўліпшы. Праз які год ці болей гляджу — яна ўжо невядома калі — у дзеўкі выйшла. Я й прыўдарыў. Сораму ўжо не меў — пачаў пільнаваць яе, а яно не тут-то было. Я й пачаў тады сілаю браць. Вось і папсаваў гэтым ўсё».

Мікола стаіўся за вуглом Дусінай хаты, чакае, калі яна будзе йсці. Ад дзеда Мельніка ўжо разыходзяцца — вуліца ажывілася смехам і гаворкай. Павінна ісці і яна. А можа ж, будзе йсці не адна, а з якім хлопцам? Дык добра ведаць. Я мушу з ёй так ці інакш скончыць. Думка, што яе нехта можа праважаць, паласнула па сэрцы. Рэўнасць і ад таго яшчэ большая любасць да яе. Яе ўсё яшчэ няма. Яна

мусіла б ужо быць. А можа, яе хто павёў у другі бок? Вусцін жа прымазваецца да яе. Рагатаў на прызбе. Ці мо яшчэ хто? Яна ж цяпер ужо студэнтка, і кавалеры, роўныя ёй, знойдуцца. Ён чуе ейны голас. Яна з некім гаворыць. Хто гэта? Не пазнаць. Развітваюцца — адлягло.

І вось яна йдзе.

Мікола як сам не свой. Не, ён яе цяпер не зачэпіць. Ведае наперад, што з гэтага будзе. Ён хоча толькі ўбачыць, куды яна пойдзе — у хату ці ў клець. І вось ён бачыць — Дуся падыходзіць да дзвярэй у клець, што тут жа, насупраць сянец. Адчыняе. Уваходзіць. Мікола чуе, як заклаўся засоў: зачынілася. «Пачакаю — няхай уляжацца. Яна будзе пытацца — хто? Я свайго голасу не падам. Пазнае — не адчыніць. Але як я хачу быць там, у яе! Адурманіла мяне, дурнога».

Крадучыся, падышоў да дзвярэй. Замёр. Ціха стукнуў. Прыслухаўся. Маўчыць. Яшчэ раз — нешта рыпнула. Але ніякага адказу. Прастукаў дробненька яшчэ. У стуку — просьба, хаценне. Чуе — злазіць з ложка. Тупае. Падыходзіць да дзвярэй. Пытаецца: «Хто гэта?» Адгукніся — не адчыніць. Стукнуў яшчэ, ужо больш настойліва. Не можа ж быць, каб яна не адчыніла. Яна ж не ведае, хто. Усё ж яна спадзяецца на некага. Нашто ж бы яна пераходзіла ў клець? Пераходзяць жа, каб некага ўсё-ткі пушчаць.

Мікола мармыча, каб не пазнала, шэпча, просіцца.

Адкладае засоў. Адчыняе. А яму гэта й трэба было — ён ужо ў клеці. Яна некуды адскочыла. Цямнота — не відаць, дзе яна. Ушчыркнуў запалку — седзячы на ложку, паспешна накідвае на сябе суконку. Кідаецца да дзвярэй — хоча выскачыць. А ён за яе. Нясе на ложак. А яна ў плач. Малоціць яго нагамі. «Не бойся. Я цябе не зачаплю. Прабач мне ўчарашнюю дзікасць». А ў самога іншае наўме: «Можа, як прылашчу, і ляжам мірна». Ад яе йдзе п'янкая пахнасць, некранутая свежасць. Ён чуе дрыготкасць ейнага цела. У яго нястрымная да яе цяга. От бы зваліў і прысмактаўся. А яна ўсё не сціхае, калоціцца, як птушка ў сіле. Просіць: «Пусці!» І яму шкада яе. Да яго пачала варочацца цвярозасць. Выпусціў яе з сваіх рук, і яна памкнулася зноў да дзвярэй. Ён сілай усадзіў яе побач сябе на ложку, трымаючы яе за плечы. Перастала ўсхліпваць, супакоілася. Падумаў — пайшло на лад. Хацеў сказаць ёй нешта самае прыгожае, ды не сумеў — муцілася ў галаве ад хацення авалодаць ёю. Маўчаў. Між-

волі туліўся да яе, а яна наадварот — тапоршчыцца, супраціўляецца ўсёй істотай. І ён зразумеў, што ўсё — надарэмна. Узняўся — хацеў пайсці. А яна: «Мікола, не гневайся на мяне, што я такая. Прабач».

У гэтых словах Мікола адчуў такую дабрыню, такую ласку, такое спачуванне да яго, што ягонае сэрца зайшлося ад шчымлівага болю і адначасна ад нейкай вялікай любасці да яе. Гэта было для яго ўзнагародай за ўсе ягоныя мукі. Мікола праняўся яшчэ большай шчырасцяй да яе: «Якая яна залатая!» І ад таго, што яна такая добрая, любая для яго, Міколу забірае рэўнасць: каму яна дастанецца, такая добрая, пяшчотная?

Мікола ўсё-ткі знайшоў сілу ў сабе пакінуць яе. У заходлівасці сэрца, у раздвоенасці душы выйшаў з клеці. Пайшоў у свой пасёлак за Мокрым, празваны Камунай.

Дуся зачынілася зноў і лягла, але заснуць ужо не магла. «Хто яму сказаў, што я ў клеці? Я нікому не гаварыла. Мне хацелася выйсці з хаты, як і ўсе выходзяць. Выйсці — у гэтым ёсць нешта цікавае, нейкая тайна, нешта невядомае. Што сустрэне цябе? Гэта ж першы крок у тваім выхадзе, нясмелы крок, але і адважны. Выйсці з хаты — гэта як выйсці ў жыццё. Выйсці насустрач жыццю. Кінуць яму выклік. Усё роўна як сказаць яму: «Я іду. Я гатова. Я аддаюся табе. Я твая. Але ці гатова я? І як бы нехта ўнутры мяне: «Гатова!» Але я баюся гэтага голасу, такога падманнага і здрадлівага. Я ўжо была гатова. І як гэта ўсё абярнулася! Так, ён адчуваў, што я была гатова і хацеў узяць мяне як гатовую. Без усякай асцярогі. Няўжо гэта так *бяруць*? Няўжо гэта так сустракаюць твой *выхад*? Тваю *гатовасць*? У гэтым таямніца выхаду? Няма нечага больш звабнага? Гэтак усё проста? Толькі *гэта*, і ўсё? Мікола хацеў толькі *гэтага*? І я адштурхнула яго. Можа, гэта была памылка з майго боку? Не буду я каяцца? Прыйдзе ён зноў?

Свет звабнасці пачаў даўно мяне трывожыць. Я пачала разумець гэта толькі цяпер. *Тады ж*, у маю гусіную пару, мне было проста добра, прыемна, і ўсё. *Тады* мне было прыемна, што *ён* глядзіць на мяне, гаворыць са мною. І мне сумна было, калі я не бачыла *яго*. Калі *ён* не стаяў на мосце або калі я не бачыла *яго*, як чытаў, лежачы ў траве ля рэчкі. А найболей, калі ён сядзеў у нас са мною за сталом, гэтак блізка, што ад той блізіні мне было млосна, сэрца знывала ў салодкай стоме. Дзіўна, пры ім я заў-

сёды хацела быць у лёгкай сукенцы і абавязкова, каб мае рукі былі голыя. А калі чыталі, схіліўшыся над кніжкай, я хацела, каб мой локан дакранаўся да яго твару. Мне было прыемна ўсякае ягонае датыкненне, такое далікатнае, лёгкае, узварушлівае. Сапраўды, я баялася грому. Баюся і цяпер. Але *тады*... тады я хацела, каб ён мяне *суцяшаў, каб ён падышоў да мяне.* І *ён* падышоў. А я накрылася. Я хацела, каб ён *раскрыў* мяне і *ўбачыў* мяне, якая я прыгожая. Я хацела нават, каб ён лёг каля мяне, мне было б тады спішна і прыемна, і я не чула б тады грому. Ён не лёг каля мяне, і я ўскочыла тады яму на рукі. Як гэта было добра! І я хацела, каб ён заставаўся ў нас, жыў у нашай хаце. Помню-помню маю гусіную пару, незвычайную. А брацікава вяселле... Я ўсё бачыла тады. Як *ён* пайшоў з *ёю*. Я пабегла за імі. І знайшла іх... у кустох. Чаго яны хаваліся? І што яны рабілі? Яна, тая другая, была *гатовая*? І ён *браў* яе? Гэтак як хацеў узяць мяне Мікола? Я магла тады забіць тую жанчыну. Яна адбірала ў мяне *яго*. Але дзе яна дзелася? Я не бачыла яе. Куды яна знікла? Ад нейкай уявы таго, што яны там *рабілі*, па ўсім маім целе прабегла дрож, скаланула мяне ўсю, *тое*, невядомае, таямнічае, што *было* ў іх там, завалодала мною нагэтулькі, што калі ён ужо ўцякаў ад *яе*, я, ідучы яму напярэймы, скочыла яму на грудзі, каб ён схаваў мяне ў сабе, так, як *тую* жанчыну, каб я была з ім, як адно, каб мяне ён нёс некуды.

Не пушчала мяне маці ў клецъ. Прасіла. Маліла. Але я выйшла. Я хацела чамусьці выйсці ў суботу. Пад нядзелю. Я хацела, каб гэта было як свята. А свята не наступіла. Можа, яшчэ яно будзе?..»

Змора, уяўленні перамаглі Дусю, і на світанні яна заснула глыбокім сном.

У калгаснай канцылярыі, што насупраць Лявонавічавай хаты — граюць. Нядзеля, і старшыня дазволіў моладзі танцы, тым болей што пагода дрэнная і сена зграбаць не пашлеш яе. Танцы ў канцылярыі — адзіным прыгодным для гэтага будынку — пачаліся яшчэ папаўдні і зацягнуліся аж да вечара. Дуся думала, пайсці ёй на танцы ці не і, урэшце, вырашыла пайсці. Па-святочнаму адзелася і рушыла. Калі яна ўвайшла ў канцылярыю, на сярэдзіне залы пабачыла Лявонавіча, абступленага з усіх бакоў моладдзю. Гармонік не йграў, у бубен не білі. Стаяла за-

тоеная цішыня. Лявонавіч — відаць па ўсім, падвыпіўшы — трымаў у руках газету. Моладзь ужо ведала — не раз яна бачыла яго тут з газетай — што Лявонавіч мае нешта сказаць, як заўсёды,— нешта надта смешнае ці — калі пра сына — надта журботнае, жаласлівае. Лявонавіч просіць моладзь не крыўдзіцца на яго, няпрошанага госця, што ён сваім прыходам перапыніў усю іхную «музыку». Гаворыць, што ён доўга не будзе тут. От, учуўшы музыку, не ўцерпеў і прыйшоў аддаць чэсць. Адразу ж і пойдзе. Скажа толькі якое слова. Не будзе ім замінаць. Стаіць, ссівелы і засмучаны. Нясмелы, хвалюецца, быццам не ведае, з чаго пачаць ці саромеецца той увагі, якую ён тут напаткаў. Паднёс блізка да вачэй газету — дагары, загалоўкам уніз:

— Тут во ў мяне свежая газета. Палучыў з Мінску. Краска яшчэ не высахла. Калі дазволіце, дык прачытаю вам пра тое, што ў свеце праісходзіць і як нам у тым свеце вядзецца. Дык вы гатовы?

— Гатовы! Гатовы! Чытай, Лявонавіч!

— Дык, ва-первых,— міжнароднае палажэнне. Нападзець Гітлер на Сталіна ці не? Нападзець! Стаіць чорным па беламу. Вялікімі буквамі. Хто ўмее, той можа прачытаць сам. Я ж чытаю для тых, хто не ўмее чытаць. Ага, нападзець. Але стаіць вапрос, хто каго пабядзіць. Гітлер Сталіна ці Сталін Гітлера? У газеце стаіць, што пабядзіць Сталін. Пра другую вазможнасць тут маўчаць. Ну вот. Я прыйшоў да вас сюды не сам. Мяне прыслалі Касцюковічы — раён. Загадалі правесці з вамі бяседу. Сам палітрук загадаў. Ён сказаў: «Лявонавіч, ты добра знаеш там сваіх людзей, разам з хлопцамі і дзеўкамі, ведаеш усё пра іх, нават, чым яны дышуць (а я, яй-богу, не ведаю, чым вы дышаце). Сратва гэта (ён так і назваў вас) таўчэцца ж у цябе пад носам (гэта ён так таму, што я вас у вакно бачу, як вы тут перад клубам гуляеце і ўсё такое), дык, кажа, каму ж, як не табе, наставіць яе, сратву гэту, на пуць ісцінный. (Гэтага ў газеце няма. Гэта ён мне так гаварыў.) Паглядзім, што піша газета далей.

— Лявонавіч, досыць пра вайну. Вычытай нам, што піша газета пра твайго сына.

Лявонавіч змоўк. Стаяў і нічога не гаварыў. Толькі глытаў сліну. Худы яго кадык спазматычна рухаўся, выпіраў скуру. Вочы блішчэлі — у іх тумаініліся слёзы. Ды Лявонавіч перамог сябе, адказаў таму, хто прасіў яго вычытаць пра сына:

— Пра ета ўжо на другім баку газеты. Там усё сказана. І пра майго сына.

Лявонавіч пачаў шукаць тое месца ў газеце, дзе, ён казаў, напісана пра яго сына. Разгарнуў газету на ўсю шырыню, закрыўшы такім спосабам свой твар. Слабым голасам пачаў «вычытваць» пра свайго сына:

— Прайшло ўжо пяць год, як яго забралі. Ета цяпер ён дужа далёка. На самай Калыме. Ета яшчэ далей, як Амур. Ета за Амурам. У газеце во стаіць, што ён гукае нас адтуль, але яго голас не даходзіць сюды — далёка. Просіць, каб яго выручылі. Але голас яго разбіваецца аб скалы. Вяртаецца да яго назад водгуллем. У тым водгуллі ён чуе не свой, а нейчы іншы голас: «У-у-у-у. Гу-гу-гу-гі. Жы-жы-жы. У-у-а-а-а. Памрэш тут. Ніхто цябе не пачуе. Ніхто не будзе ведаць, дзе ты падзеўся. У-у-у. У-у-у-а-а». Сын мярцвее ад гэтага голасу. Ён чуе яго і ўначы. Не можа заснуць: «У-у-у-у-а-я-я-я». Раніцою тое самае: «У-у-у-у-а-я-я-я-жых». Сын бяжыць на гару — можа, адтуль яго пачуюць. Просіць ратунку. Гукае. Ды водгулля няма — голас яго паглынае прастора. Ды сваёю душою я чую той голас сына. Мне няма дзе дзецца. Выбягаю з хаты ўначы. Крычу: «Ратуйце!» Ды ніхто не ратуе. Ніхто нас не чуе. Толькі зоры ў небе пераміргваюцца. А голас яго ўсё носіцца па паверхні зямлі. Не сціхае. Я чую яго ўсюды: у хаце, на двары. Што ні вазьму ў рукі, чую яго голас, журботны, адчайны. Лыжку паднясу — і тая крычыць. Во й цяпер, мае дзеткі, прыбег да вас пажаліцца перад вамі, каб вы ўчулі гэты голас-роспач. Ён звернуты і да вас, мае любыя. Паспагадайце яму...

Газета ўпала на падлогу. Лявонавіч ціска накрыў сваімі далонямі вочы і стаяў нерухома ў змярцвенні — плакаў.

Дуся хацела падысці да Лявонавіча, паспагадаць яму, сказаць нейкае слова ўцехі, але не адважылася, чамусьці не магла гэтага зрабіць.

Нехта з хлопцаў падняў з падлогі газету:

— Вазьмі, Лявонавіч. Калі-небудзь нам прачытаеш пра сына яшчэ.

— Даруйце, мае любыя. Грайце. Гуляйце. Ета ваша время.

Хлопцы давялі Лявонавіча да парога ягонае хаты. Развіталіся.

Дуся не танцавала. Пайшла дахаты не праз мост, наўпросткі — праз рэчку: баялася, каб яе не перастрэў дзе Мікола Бугроў.

Піліп бачыць у вакно — у сельсавеце гарыць лямпа. Ужо за поўнач, а ўсё гарыць. Нешта вырашаюць. Нешта важнае. Гэтак заўсёды: кулачылі — лямпа гарэла, у калгас гналі — лямпа гарэла, у турму каго — лямпа гарэла. У сельсавеце лямпа гарыць заўсёды на бяду. Піліп не можа заснуць. Злазіў з печы ўжо колькі разоў, прахаджваўся па хаце. Зноў лажыўся. Агонь у сельсавеце не дае яму спакою — трывожыць. Не на дабро ж. Прыехаў упаўнаважаны не так сабе. У яго яны ўсе на вачох: хто прыязджае, хто ад'язджае, хто заходзіць, хто выходзіць — усіх бачыць. Бачыў, як яшчэ звечара збіраліся — апрача свайго начальства, былі і прыезджыя. Усё нейкія шышкі. Нешта ж такое ёсць — нездарма ўсхадзіліся.

— Хіма, ты спіш?

— Дзе там за табою заснеш! А што?

— Ды нічога.— Глядзіць у вакно: — Хутчэй — машына пад'ехала!

— Да нас?

— Дура, хто да нас пад'едзе — да сельсавету пад'ехала! Глядзі — вылазяць.

Хіма кінулася да вакна: у сельсавет увайшло чатыры чалавекі, двое — з вінтоўкамі: ражном тырчаць.

— Ну, нешта ж будзе.

— Каб што кепскае не пачалося,— устрывожылася Хіма.

На Вусцінавым двары забрахаў сабака — чуе прыезджых.

Піліп і Хіма прыліплі да шыбы — углядаюцца.

— Гэнымі днямі яны, як не тыя — і старшыня, і сакратар, і фінагент. Нечага хаваюцца. Відаць, нешта ведаюць, але маўчаць. Сельпо на замку. Вяркееў шнуруе туды і сюды. Бугроў — і той, развесіўшы свае лупы, не адыходзіцца ад старшыні — слухае, нешта на вус наматвае.

— Ну што ты ета так пра чалавека гаворыш. Зяцем яшчэ тваім можа быць.

— Каб ты згарэла з сваімі зяцямі. Табе толькі зяці наўме. Глядзі, каб усе твае зяці не загрымелі. Бачыш, нездарма заварушыліся.

З сельсавета выйшлі два чалавекі. Ідуць да Піліпавай хаты. Хіма адскочыла ад вакна і дзверы — на кручок.

— Адкладзі. Сам старшыня і нехта яшчэ з ім.

Увайшоўшы, старшыня просіць прабачэння, што разбудзіў.

— Ды мы й так не спалі,— лагодна адказаў Піліп.

— Пілiп! Вось што! Пакладзі дзе-небудзь во таварыша з раёну. Няхай паспіць у цябе гадзіну-другую. Яму рана ў дарогу. Усім у дарогу.

— Што ён сказаў — «усім у дарогу»? — ціха запыталася Хіма.

— Чаму ты не спыталася ў яго? Адкуль я ведаю?

А раненька ў сельсавеце былі ўжо ўсе старшыні калгасаў. З імі прыбылі іхныя рахункаводы. Настаўнікі ўсіх школаў. Увесь сельскі актыў. «Таварыш з раёну» сапраўды падняўся рана і, не развітваючыся, пакінуў Пілiпаву хату.

Пілiп выйшаў з хаты паслухаць, што чуваць. Чаму гэтак сышліся і з'еxaліся сюды людзі? Імі была занята ўжо ўся пляцоўка — «Цэнтр». Сюды пачалі збірацца з суседніх хатаў — мужчыны і нават жанчыны. Сонныя, яны нечым напалоханыя. Як бы ім хто нешта ў вушы ўвёў. На сход іх не загоніш, а тут — як па камандзе. Сюды, на гэтую пляцоўку «Цэнтр», прыйшоў з сваёю пугаю і трубой пастух. Стаўшы ў гэтым канцы вуліцы, ён, звычайна, пачынае трубіць, абуджаючы такім спосабам гаспадыняў, каб яны выганялі яму з двароў свой статак. Цяпер жа, угледзеўшы столькі народу, ён не распачынаў свае ігры — здзіўлена пазіраў на грамаду.

На сельсавецкі ганак узышоў сакратар раённай партарганізацыі:

— Таварышы! Неспадзявана, вераломна напала на нашу краіну гітлераўская Германія. Фашысцкія самалёты скінулі бомбы на нашыя гарады, у тым ліку на сталіцу Савецкай Беларусі — Мінск. Гітлераўскія полчышчы перайшлі нашу граніцу, уварваліся на тэрыторыю Савецкага Саюза. Нашая гераічная Чырвоная Армія наносіць сакрушальныя ўдары па ворагу. Ды, нягледзячы на гэта, ворагу ўдалося ўжо захапіць некаторыя нашыя населеныя пункты. Магутны бронетанкавы кулак Гітлера нацэлены ў самае сэрца нашай радзімы — Маскву. Таварыш Сталін заклікаў па радыё не паддавацца паніцы. Ён пераняў камандаванне ўсімі збройнымі сіламі Савецкага Саюза на сябе. У сваёй прамове, звернутай да ўсяго савецкага народа, Сталін накрэсліў баявую праграму: ні за якую цану не ўступаць ворагу аніводнай пядзі нашай зямлі, а калі б тую пядзю давялося пакінуць — пакінуць яе спаленай, мёртвай, пустой. Макавага зерня не мусіць папасці ў ненасытную глотку Гітлера. Строгі наказ Сталіна —

таптаць, паліць збожжа, уганяць жывёлу, капаць супрацьтанкавыя канавы-валы. Загад Сталіна — усё на абарону! Усё на выратаванне Радзімы. Усё на зламанне гітлераўскага карка. Таварыш Сталін выказаў цвёрдую ўпэўненасць — перамога будзе за намі! Але для гэтага патрэбна, каб ніводная душа не засталася ўбаку, каб кожны ўзяў на сябе як найбольшы цяжар, калі трэба — ахвяраваў сабою ў імя перамогі над акупантам. Вораг знішчае на сваім шляху ўсё жывое — паліць, забівае, вешае, гвалціць.

Цяжкая доля выпала нам, дарагія браты і сёстры, найбольшае ў гісторыі выпрабаванне. Пакуль у нас ёсць яшчэ час, бярэмся за работу. Мы знаходзімся ў стане вайны і мусіць таму быць закон вайны — нічога не шкадаваць для перамогі. Няма такой цаны, якую б мы не заплацілі ў імя Радзімы. Вораг пасягнуў на нашае святое святых — на самое наша жыццё. Быць нам або не быць. Гэтак, дарагія мае, стаіць пытанне. Нашым баявым лозунгам мусіць быць: «Смерць акупантам! За Радзіму! За Сталіна!»

Пілін, стоячы ў натоўпе, спадзяваўся пачуць пра ўсё, што хочаш, толькі не пра вайну. Вайна для яго была нечым немагчымым. Стаяў. І не верыў. Чуткі хадзілі пра вайну, але што яна будзе, не верылі. І вось табе вайна. Напалі. Здзіўлена і з страхам слухалі прамоўцу. Пад канец прамовы прываліла столькі народу, што ўжо яго не мог змясціць «Цэнтр». Дзіўна — калі і хто іх сюды паклікаў? Гэтак рана. Адкуль яны дачуліся?

Сакратара партарганізацыі змяніў на ганку прадстаўнік з ваенкамата.

— Я, таварышы, па сваёй часці. Нам навязана вайна, і, каб бараніцца, нам патрэбна зброя і людзі. Патрэбны сродкі вайны. Гэтым сродкам у першую чаргу з'яўляюцца людзі. Мы мусім мець людзей, здольных карыстацца зброяй. У нас ёсць добра абвучаная і ўзброеная армія. Але ў умовах вайны, якой бы вялікай ні была наша армія, яе недастаткова. Таму паўстае патрэба агульнай, пагалоўнай мабілізацыі насельніцтва. Гэта ваенны закон. Ён няўхільны, абавязковы і татальны. Гэтым загадваю правесці ў Макранскім сельсавеце агульную абавязковую пагалоўную мабілізацыю, як яна ўжо праводзіцца па ўсім Савецкім Саюзе. Правільна сказаў таварыш сакратар партарганізацыі — ніякай панікі! Але і ніякага адвалыньвання! Перамога за намі, але яна будзе дарагой і крывавай. Хаваць гэта было б недарэчна. Плачу, роспачы, слязам няма месца. Мы сабраліся тут, каб як найлепей і як найхутчэй

правесці пагалоўную мабілізацыю ўсяго мужчынскага насельніцтва адпаведных гадоў. Фронт чакае салдат.

Напалоханыя, знямелыя, жанчыны стаялі моўчкі, няздольныя яшчэ поўнасцяй уясніць пачутае: настолькі яно было для іх неспадзяваным.

— Я сказаў — фронту патрэбны людзі, салдаты. Але людзей патрабуе і тыл. Вось жа салдатамі тылу, яго працаўнікамі і абаронцамі, будзе жаночае насельніцтва. Перад намі, таварышы, татальная мабілізацыя. На кіраўніцтва вашага сельсавета, на партыйцаў і ўвесь актыў ускладваецца заданне — у трохдзённы тэрмін закончыць адпраўку мужчынскага насельніцтва на станцыю ў Касцюковічы. Фронт крычыць, фронт чакае людзей. Наскольки паспяхова і ў тэрмін вы справіцеся з гэтым заданнем, настолькі будзе забяспечанае нашае процівастаянне ворагу. Усякае ўхіленне караецца паводле ваенных законаў. На падмогу вам — людзі ўжо ў дарозе з раёна. Спадзяюся, ўсё ясна. Я скончыў.

Старшыня сельсавета паклікаў да сябе ў канцылярыю старшыняў калгасаў, іхных рахункаводаў, брыгадзіраў, настаўнікаў, актыў. За зачыненымі дзвярыма, з удзелам прадстаўнікоў раёна, пачалася нарада, распрацоўка канкрэтных мерапрыемстваў па ажыццяўленню суцэльнай мабілізацыі.

Мокрае Першае і Мокрае Другое, як бы перасталі існаваць — з іх забралі галоўную сілу — мужчын. Засталіся жанчыны, дзеці і нямоглыя старыя. Хаты стаяць як абрабаваныя. Іх пакінулі людзі, гартам якіх яны трымаліся. З кожнай з іх як бы вылецела душа — птушка, што карміла птушанят. Дамы-гнёзды засталіся пакінутымі і асірацелымі, стаяць няўпэўненыя ў павароце тых, хто іх пакінуў. Мабілізацыя, быццам якая чума, прайшлася па вёсках, апустошыла, знявечыла іх, пакінуўшы толькі тых, хто ёй непатрэбен — у слёзах, у роспачы, у чаканні Божай міласці. З нядзелі пад панядзелак, калі з абедзвюх Мокрых мусілі навабранцы ад'ехаць, у хатах-гнёздах не спалі або калі й спалі, дык вельмі мала і трывожна: гэта была апошняя ноч, ноч развітання, ноч болесці, ноч спачуцця, ноч любасці і страху перад будучыняй. Вуліцы замёрлі, хаты стаіліся, пад іхнымі стрэхамі варушылася неразгаданае ў сваёй існасці жыццё, найбольш у гэтую ноч глыбокае ў сваім выяўленні. У гэтую ноч вусны шэптам сказалі тое,

чаго яны яшчэ ніколі не гаварылі. Неба высока стаяла ў гэтую ноч, у ім гаварылі-радзіліся зоры, лілі з вышыні спагаду людзям пад стрэхамі. Мігцелі, быццам варажылі пра лёс, што напаткаў гэтых людзей.

Сельсавет ператварыўся ў своеасаблівы штаб — адсюль выходзілі загады і распараджэнні. У гэтым штабе ўлада фактычна належала ўжо не старшыні сельсавета, а ваенным, што сядзелі ў гэтым штабе. Функцыі старшыні зводзіліся ўсяго да выканання загадаў ваенных: накіравання ў раённы цэнтр прыгодных павозак з коньмі, калгаснага статка — кароў, авечак, свіней, эвакуацыя маслазавода, адпраўка на станцыю насеннага фонду. Але для ўсяго гэтага ў старшыні не хапала ўжо людзей — паслугоўвацца трэба было толькі старымі, калекамі і жанчынамі. Да таго ж не было ўжо цягла — лепшыя, прыгодныя для працы коні і валы былі забраны. Калгасы засталіся абяззброенымі, разгромленымі, паралізаванымі. На старшыняў калгасаў старшыня сельсавета насядаў як толькі мог, за невыкананне ягоных распараджэнняў пагражаў ваеннымі законамі, хоць добра не ведаў і сам, якая палітыка вышэйшых уладаў адносна гаспадарчай дзейнасці калгасаў: абрабляць зямлю, сеяць ці таптаць, паліць ужо пасеенае і вырашчанае. Адносна загаду Сталіна — пакідаць ворагу спаленую зямлю, старшыні калгасаў вагаюцца: а што ж будуць есці тыя, што засталіся ў калгасе — жанчыны, дзеці і ўсе нямоглыя старыя? Што ім паміраць з голаду? Праўда, былі і такія старшыні калгасаў, што выконвалі загад Сталіна: таптаці, палілі жыта, што пайшло ўжо было ў колас. Жанчыны-салдаткі ўсяляк змагаліся з такімі старшынямі — проста выходзілі з дзецьмі на поле: тапчы і нас, палі, калі ты такі бязлітасны і крыважэрны.

Да штаба належалі, апрача старшыні сельсавета, упаўнаважанага, людзей з ваенкаматаў, таксама некалькі актывістаў, сярод іх Вяркееў і Мікола Бугроў. Гэта ўсё так званая бронь, незмабілізаваная, пакінутая на мясцох для наладжвання гаспадарчай, хоць і вельмі абмежаванай, дзейнасці калгасаў, а галоўнае — для мацавання грамадзянскай абароны супраць ворага. У дадатак — бронь як бы ўвасабляла сабой савецкую ўладу, што застанецца тут у падполлі нат і тады, калі ворагу ўдасца заняць гэтую тэрыторыю. На выпадак акупацыі ў раёне Макранскага сельсавета мяркуецца стварыць ядро першай партызанскай групы, якое складзецца з раённага начальства, у тым ліку першага сакратара райкома партыі. Для падполля ўмовы

ў Макранскім сельсавеце як найлепшыя — непраходныя балоцістыя лясы, аддаленасць мясцовасці ад шляхоў зносін: чыгункі, шасейных дарог, дарог наогул. Немец не здолее ўстанавіць тут свайго кантролю. Штаб ужо мае і такую-сякую зброю. Старшыню сельсавета можна было бачыць на вуліцы з вінтоўкай. Зброя як бы падмацоўвала ягоны аўтарытэт, сведчыла, што ён неабыякі чалавек, а носьбіт улады, якая не папусціцца нічым. Жаночае апалчэнне, як цяпер называлі жанчын, глядзела на старшыню з вінтоўкай са здзіўленнем і пагардай. Але старшыня — улада, і нічога не папішаш. Штаб дае яму загады, і ён іх выконвае: гоніць гэтае апалчэнне на акопы, часам далёка, за некалькі кіламетраў, аж на раку Бесядзь, там капаюць даўгую — на цэлыя кіламетры — глыбокую канаву, у якой застрануць фашысцкія танкі. На рэчцы Бесядзь ваенныя стратэгі мяркуюць затрымаць немцаў і даць ім бой, калі яны надыдуць сюды. На гэты стратэгічна важны пункт сагналі жанчын і хлопчыкаў-падлеткаў з розных вёсак сумежных сельсаветаў. Камандуюць гэтай аперацыяй ваенныя. Жанчыны іх называюць лейтэнантамі. Адзін з такіх лейтэнантаў стаіць на кватэры ў Піліпа. Гэта, як потым выявілася, той самы малады чалавек, якога прывёў быў Піліпу старшыня сельсавета і які, праспаўшы колькі гадзін у сенцах, невядома куды знік. Цяпер жа ён атабарыўся ў Піліпа як належыцца. Спіць позна, мыецца, голіцца, снедае не спяшаючыся, падцягвае сваю партупею, гаворачы Хіме «спасіба, мамаша», і выходзіць. Едзе, разам з палітруком, на Бесядзь. Што яму вайна? Яму добра на акопах, у жаночым тыле. Ён бронь. Прозвішча ягонае — Смірноў. Імя — Сашок. Гэтак яго называе палітрук. Піліп чамусьці не ўмее правільна вымавіць ягонае імя, і замест «Сашок», у яго выходзіць «Шашок». Прыехаў Смірноў Сашок у Касцюковічы з Каломны толькі нядаўна. Раён і прыслаў яго ў Мокрае як ваеннага спецыяліста. Ён таксама належыць да макранскага штаба, «стаўкі», як жартліва называе гэты штаб Вусаты Якаў, старэйшы чалавек, інвалід першай сусветнай вайны.

З Дусяй Шашок не ўваходзіць у гутарку, як бы не прыкмячае яе. Толькі калі пад час снедання яна падасць штонебудзь на стол, гаворыць ёй: «Спасіба, барышня». Аднак, паснедаўшы, вылазячы з-за стала, заўсёды гаворыць «спасіба», не ёй, а ейнай маці. Гэта ён робіць знарок, каб не рабіць выгляду, што ён цікавіцца дачкой. Але ў сваёй душы Шашок пастанавіў «застрэліць барышню». Яна яму

вельмі падабаецца, такая спакуслівая козка. Калі раніцою Дуся йдзе з клеці праз сенцы ў хату, Шашок, лежачы на ложку, сваёй выцягнутай рукою хапае яе за сукенку, цягне да сябе. Дуся, аднак, вырываецца, хаваецца ад яго ў хаце. Лейтэнант пасля гэтага не можа ўжо заснуць: «Ничего, никуда не денешься». Пачынае збірацца — мыцца, брыцца. Чакае, калі яго запросіць «мамаша» на снеданне.

З абедзвюх Мокрых на акопы жанчын забірае ваенны грузавік. Вязе на Бесядзь. Гэта пераважна дзяўчаты — дарослыя і яшчэ недарослыя. Жанчыны старэйшыя, што маюць малых дзяцей, застаюцца, для іх ёсць іншая работа. Увечары машына прывозіць «апалчэнне» назад, дахаты. Але бывае, калі ваенная машына едзе куды-небудзь па іншай патрэбе, і тады «апалчэнне» застаецца начаваць на акопах. Што тут тады дзеецца! Спаць няма дзе, толькі на зямлі, на траве, пад кустом. Накрыцца няма чым — камары залазяць куды не трэба. Пад галаву можаш палажыць толькі сваю рыдлёўку. Які ж тут можа быць сон? Ну, і лічаць дзяўчаты на небе зоры. Не спяць. Дурэюць. Шчакочуць адна другую. Ім што, дураслівым? Палезлі б да лейтэнантаў у іхныя шатры-будкі, але ці ж лёгка на гэта адважыцца? Можа, некаторыя спрытнейшыя і маглі б. Ды ім, лейтэнантам, не трэба столькі, колькі нас тут усіх. У іх выбар вялікі. У нас тут усякай твары па пары. Любая, якую хочаш, масць ёсць. Самых маладзейшых і прыгажэйшых могуць мець. І маюць. Губа ў іх не дура. Унь як Пііпаву аблюбавалі! Кожны да сябе ў шалаш запрашае. Ды дзеўка не дура — бароніцца.

— Бароніцца? Дужа ты знаеш.

— Што знаю, тое й кажу.

— Нічога ты не знаеш. Сама бачыла!

— Што ты бачыла?

— А тое, што, заголеную, у кустох качалі. Сярод белага дня.

— Хто яе там качаў?

— Ды той жа Шашок, што ў іх прымасціўся.

— Ці не гаворыш ты лішняе, дзеўка? Мо зайздросціш?

— Цьфу! Захацелася б — ляжала б у будцы таксама. Ёсць тут адзін. Лупіць на мяне вочы. Ды я ведаю — сарвець і паедзе. Нашто мне такое? Я не Дуся.

— Не брашы на Дусю. Яна дзеўка чыстая.

— Кажу табе — сама бачыла. Ляжыць, адкінуўшыся. Але няхай! У нас адкідацца можна. Гэта яшчэ нічога не

значыць. Такей дзерявеньскій звычай — палапае, і ўсё. Далей дзеўка не пусціць. Заціснецца гэтак, што не ўсуніць. А гэты... Ну, каб ты бачыла! Усунуў! І соўкае.

— Дальбог, ты гэта маніш. Сама сабе ўявіла. Сама гэтага хочаш. Ведаю я цябе. Вусціна няма, дык цяпер няма каму соўкаць. А пра Дусю... Не веру. Пашто ёй так прылюдна... каб хто бачыў... На тое ж у яе ёсць клець... Зручней.

— А што ты думаеш, ён не соўкае яе і ў клеці? Соўкае — дзеўка салодкая. Ета яе цяпер самая пара. Прывыкшы, дык ёй і на акопах хочацца. На чыстым воздусе. А струмант у яго, відаць, добры. Трымціць у знямозе... Думаюць, іх не бача ніхто. Ад мяне не схавацца — усё роўна падгледжу. Гляджу ета, дальбог, і самой хочацца... Каб яны пагарэлі.

— Вот жа я й гавару, што ты ўяўляеш сабе. Таго глядзі, пачнеш хлопчыкаў спакушаць. Вучыць. Распусніца ты.

— Ну, на гэта я ўжо не пайду. Ляпей я... Ды што казаць, бабам прыйшоў канец! Як вайна — бабам заўсёды бяда. А бабам жа патрэбна бабскае. Як мірна было ўсё, дык і мы былі мірныя, не кідаліся на шыю. А цяпер як няма, дык хочацца яшчэ болей, дармо што бяда, гора. У бядзе й горы гэта як лек і спасенне. Глядзі, як усхадзілася бабскае кодла на акопах — проста грэх. Як на бяду якую. Нямоглым і тым праходу не даюць — лезуць і да іх. Лейтэнантаў жа ўсім не хопіць. А лейтэнанты гэтыя... от докі! Ты думаеш, машына сапраўды некуды паехала. Гавораць так, каб мы тут засталіся нанач, не ехалі дахаты. Ім уначы лацвей. Ды й нашае кодла не супраць застацца на акопах. Хоча выставіць і свой акопчык.

— Жартуеш... Не так усё проста. Думаеш, толькі мы, бабы, такія нешчаслівыя. Вунь Мікола Бугроў... Колькі тут нас, а знайсці нікога не можа. Сланяецца, як непрыкаяны.

— А ведаеш — чаму? Перажывае за Дуську! Бачыць, што ягонае не бярэ. Не можа ж ён не бачыць — напэўна, бачыць — як загаляюць ягоную Дуську. Ён жа па ёй млее. Але баіцца лейтэнанта. Нічога не можа зрабіць. Па ўсім відаць, яна яго не хоча. Чула ж мо — у клець не пушчае. Раздурылі дзеўку — і таму падабаецца, і таму падабаецца. А ўсё красата яе і слабасць. Ля яе ж ходзіць і палітрук. Усё чытае ёй газеты, пра палітыку рассусольвае. Дусьцы

няма калі й за лапату ўзяцца. А ты думаеш — чаго ён хоча? Таксама загаліць. Палітыка ёй не трэба.

— Пакінь ты! Дальбог, ты ненармальная. Паслухаць, што ты гаворыш, дык інакш пра цябе не скажаш. А пра Пиліпаву Дуську... галаву дам на адрэз — ты ёй зайздросціш і таму валіш на яе. Яна яшчэ нечапаная, чыстая дзеўка.

— Такая, як ты.

— Ты мяне не чапай. А то палучыш. Не раўняйся са мною.

Вайна віруе ўжо другі тыдзень, а Мокрае пра яе мала што ведае — радыё няма, газеты ўжо не прыходзяць. Толькі раёнка — «Сталінскі прызыў», дый тая на адным толькі лістку. Што з яе даведаешся? Кажуць, немцы забралі ўжо Мінск, Воршу, Магілёў, Чавусы і стаяць пад Клімавічамі. Дык адтуль жа да Касцюковічаў — як рукою падаць. Таго глядзі — праз ноч і ў Мокрым заявяцца. Але дакладна ніхто нічога не ведае. Па-ранейшаму ганяюць на акопы — лейтэнанты не даюць адпачыць жанчынам. Збожжа тым часам не топчуць і не паляць. Статак, як быў, гэтак і застаецца ў калгаснай аборы. Старшыня сельсавета раз'язджае па калгасах, патрабуючы ад іх выканання планаў. Палітрук заклікае не верыць чуткам — іх сведама сее вораг. Чырвоная Армія стойка стаіць на сваіх пазіцыях, стрымліваючы націск гітлераўскай арміі. Але гэтым запэўненням людзі ўжо не вераць — паводзіны самога штаба выдаюць яго трывогу і нервовасць. Бронь кожную ноч збіраецца ў сельсавеце. Нарада за нарадай. Кідаецца ў вочы заклапочанасць штаба. Канешне, штаб ведае пра сапраўднае палажэнне на фронце, толькі не хоча пра гэтае палажэнне гаварыць — утойвае. Робіць уражанне, што няма падставаў для панікі. Але заспакоіць людзей штабу не ўдаецца. Мокрае, адно і другое, жывуць прытоеным жыццём. Прыціхла і чакае нечага неўнікнёнага. Людзі не выказваюць свайго такога ці іншага стаўлення да падзеяў. Найболей маўчаць. Што яны думаюць, цяжка меркаваць. Чакаюць, і ўсё. Каго, чаго чакаюць — няясна. Уначы можна пачуць, як недзе ў некага бразнула клямка, рыпнулі дзверы. Нехта з некім шэпчацца. Вёска ўначы ўжо, як раней, не спіць — у ёй варушыцца прыціхлае, затоенае жыццё. Раніцой з вуснаў у вусны перадаецца начная інфармацыя: да Хадоскі ці да Сцепаніды нехта

заходзіў уначы. Бачылі — нешта нёс. Пёкла Канцавая некага з лесу хавае пад сваёю спадніцай. Вусаты Якаў сам устанавіў недзе сваё радыё і слухае. Ведае ўсё навылёт, але нікому нічога не кажа. Вёска кішыць усякімі навінамі, здагадкамі, дапушчэннямі. Адзін аднога падглядаюць, цікуюць. Уначы прайдзі Мокрае з канца ў канец — нікога не ўбачыш, але нейчыя вочы ўсё роўна цябе ўбачаць, цябе дагледзяць. Мокрае ўвайшло ў сваё нутро, затоена дыша. Пакуль нешта не вызначыцца канчальна, яно маўчыць, яно яшчэ не ведае, куды што. Прыціхла вуліца, на прызбе дзеда Мельніка дзяўчаты не збіраюцца — хлопцаў няма, ды й не да гуляў.

Аж раптам вяртаецца ў Мокрае з Мінска Агапка. Ішла адтуль дванаццаць дзён з хатулём за плячыма. Ногі збіла. Насілу дабралася. Яна й пусціла пагалоску, што за ёю ішлі немцы па пятах і што не сёння, дык заўтра яны будуць і ў Мокрым. Сказала таксама, што нашы здаюцца немцу, яна сама бачыла, як яны гналі нашых салдатаў. Агапку выклікалі ў сельсавет, у штаб. Дапытвалі і сказалі, каб прыкусіла свой язык. І сапраўды, цяпер ад яе і слова не пачуеш. Кажуць, яе завербавалі ў партызанскую групу.

Піліп ненарокам убачыў у вакно — да сельсавета пад'ехалі дзве машыны — легкавая і паўтонка. З легкавой вылезлі два чалавекі. Ім насустрач выйшлі з сельсавета ўпаўнаважаны і палітрук. Прывіталіся і адразу ж зніклі за дзвярыма.

«Ну, нешта ж ім прыспічыла. Закалола ў... Дасюль іх тут ніхто і ў вочы не бачыў. А глядзі, прымчаліся... Уцякаюць, ці што? Гэта ж, канешне, касцюковіцкія тузы... Зямля ўжо гарыць у іх пад нагамі, ці што? Там ужо ім месца няма, што прыкацілі сюды, у глуш? Вот настала для іх часіна!.. Значыць, усё-ткі немец прэ?»

Разважанні Піліпа перабіла Хіма:

— Глядзі ты, і Шашок наш сабраўся — на ложку ў сенцах скатка яго ў паход гатова. На акопы не паехаў, і тут яго не відаць. Ты не бачыў яго?

— Круціцца недзе тут. Відаць, да Вяркеева пайшоў у школу. Бачыў — праз мост ішоў туды. З ім і твой лупаты зяць — Бугроў.

— Не дапякай мяне зяцьмі. Цяпер не да зяцёў. Мы сядзім тут. Нічога не бачым і не чуем, а свет загарэўся. І дзе

то цяпер наш Ягорка? Забралі ж і яго. Я так думаю. Хоць бы Эма прыйшла сюды да нас. У нас зацішней.

— Дабяруцца й сюды. Не думай. Бачыш, начальства Касцюковічы пакінула. Цяпер ужо ў нас тут раён. Але выпараць і адсюль.

— Ды нягож, як прыйдзе час, яны й нас пакінуць. Я баюся, каб чаго не ўчынілі, пакідаючы. Я баюся таксама за Дуську. Каб не зманілі і яе. Гэты Шашок. Дзеўка — яна дура. Стукне ў голаў, і прапала. Можа б, і ты ёй што сказаў? Нешта яна сабе ў галаву забрала.

— Гавары ты ўжо цяпер з ёй.

— Табе не шкода свайго роднага дзіцяці?

Надвечар прывезлі з акопаў жанчын. Дуся, угледзеўшы ў сенцах на ложку скатку Шашка, увайшла ў хату засмучаная. Маці адразу заўважыла гэта:

— Скажы, мо што здарылася?

— Ды нічога, мама.

— Хадзі на двор. Хачу ў цябе нешта запытацца. Каб бацька не чуў.

— Мама, ну што такое? Гавары тут!

— Ды выйдзем на мінутку.

Яны выйшлі.

— Скажы, дзіцятка... Пара ўжо, а ў цябе няма. Мыла бялізну — тваё ўсё чыстае...

— Мамачка, будзе яшчэ. Не квялі мяне!

Дуся, угневаная, не пайшла ў хату, а на вуліцу. Маці падумала: відаць, да якоесьці свае сяброўкі.

Дусі доўга не было. Ужо й сцямнела, а яе не было. Прыйшла, калі было ўжо досыць позна. Маці паставіла ёй на стол вячэру.

— З'еж хоць цяпер. Цэлы ж дзень галодная была. На акопы з сабой нічога не брала... Мо што чуваць у цябе новае? Ты ж увесь час сярод людзей.

— Ды нічога, мама. Агапка, ты ж ведаеш, прыйшла з Мінску. Я з ёй гаварыла. Яна шмат чаго расказала мне. Пра ўсё чыста. Пра ўсё чыста. Сказала таксама...

На парозе з'явіўся Шашок. Дуся палажыла лыжку на стол. Як бы спужалася.

— Мамаша, благодарю за все. Я ухожу... Надо.

Падаў Хіме, потым Піліпу руку.

— А с барышней я уже простился.— Глянуў на Дусю.— До свидания. Всего хорошего.

Выйшаў.

Дуся толькі чула ягоныя крокі за хатай.

Раніцою, калі вёска яшчэ спала, Піліп, выйшаўшы з хаты, заўважыў пакінутыя адчыненымі дзверы ў сельсавеце. Гэта выдалася яму падазроным. Праём у дзвярох чарнеўся глыбокай пасцяй. Піліп напачатку не адважваўся падысці бліжэй і паглядзець, у чым справа. Аднак цікаўнасць перамагла, і Піліп узышоў на ганак сельсавета, з якога яшчэ нядаўна прамаўляла касцюковіцкае начальства. З асцярогай пераступіў парог, і ягоным вачам паказалася несамавітая карціна: параскіданыя ўсюды на падлозе розныя рэчы, адчыненыя ў сталох шуфляды, перад дзверцамі ў грубцы і ў самой грубцы — ворах спаленай, абвугленай паперы, голыя, без фіранак вокны, залітыя атрамантам сталы — выгляд поўнай пустэльні. «З'ехалі. Няма. Як карова языком злізала. Была ўласць, і няма ўласці. Вось яно як»,— падумаў Піліп і хутка выйшаў з канцылярыі, каб, крый ты Божа, не падумаў хто, што і ён тут як-небудзь замешаны. Вярнуўся дахаты. Сказаў Хіме, што ўжо ўласць збегла. І след прастыў.

— К таму яно йшло. Я ткі чула ўначы — машыны гулі. Думала, што б гэта такое? Хацела ўжо цябе разбудзіць, ды хутка ўсё сціхла. Значыць, далі ходу. Ну але Бог з імі. Я рада, што Дусі дур не ўлез у галаву — не зманілі і яе. Але трэба яшчэ паглядзець, ці яна ў клеці. Ды што гэта я? Грэх так аб дзіцяці падумаць. Яна ж у нас не такая.

— Такая ці не такая, а радавацца няма чаго.

— Пра што ты гаворыш?

— Ды ні пра што. Сама ведаеш...

Чутка, што «ўласці» ўжо няма, не замарудзіла даляцець да слыху жыхароў Мокрага Першага і Мокрага Другога. Адкуль ні вазьміся — набеглі ў сельсавет найперш хлапчукі, перакулілі ўсё дагары нагамі ў пошуках нечага патрэбнага ім. А пазней, як ужо добра ўднелася, пачалі з'яўляцца і дарослыя, пераважна цяплюхі, старыя і нямоглыя мужчыны-абборкі. Гэтыя апошнія зазлянулі і ў сельпо. Дзверы былі на замку, ды іх узламалі — сельпо аказалася такім жа пустым, як і канцылярыя сельсавета: што было, усё сплыло. Ды нягледзячы на гэта розгалас пайшоў, што «добрыя людзечкі цягнуць з капіраціву дабро, а мы седзімо тут склаўшы рукі». Гэтага было дастаткова, каб пачацца цэламу штурму на сельпо: рынуліся ўсе туды ў надзеі ўварваць што-небудзь і сабе. Але, апрача прапаганднай літаратуры, якая ішла ў якасці абавязковай нагрузкі да больш каштоўных рэчаў, у сельпо ўжо нічога вартаснага не было. Зрэшты, у ім ніколі не было поўна:

гарэлка, хлеб, соль, запалкі, іншыя дробныя рэчы і ўсё. Калі ж у сельпо і прывозілася нешта вартаснае, дэфіцытнае, яно адразу ж трапляла ў рукі памазаннікаў Божых. Звычайнаму чалавеку і ў вочы яго не паказвалі.

Піліп глядзеў у вакно, як людзі тоўпіліся каля сельпо — уваходзілі і выходзілі з яго, нешта ўхапіўшы там, ці так, з пустымі рукамі. Глядзеў, але сам не меў намеру пайсці ў тое сельпо: а што як уласці вернуцца? Тады што? Знойдуць усіх, хто рабаваў, крэмсаў, ламаў. Мо нават і ў гэтую хвіліну ўласць тая выглядае з кустоў, назірае, хто чаго варты. Далёка ж яна яшчэ не ад'ехалася.

Асабліва валам валілі жанчыны, пачуўшы, што ў «капераціве» ёсць соль. Але яе ўжо расхапалі тыя, хто ўварваўся ў той «капераціў» першым, і жанкі, расчараваныя, выходзілі з сельпо з нічым. Яны наракалі на свой жаночы лёс: «Хто смялейшы, той і мае, хто вёў рэй з начальствам, той усё й захапіў, а беднай салдатцы — кукіш. Пра ейных малых дзетак ніхто не спагадае, не ўгледзіць, што яны ж засталіся без бацькі. Як на вайну — дык нашых першых. Іншыя ж вон у бронь улезлі і, пэўна ж, сядзяць у кустох».

Не ўцалела ад хцівага вока і школа — што можна было пацягнуць — пацягнулі. Асабліва пацярпеў фіз- і хімкабінеты — да найменшай бляшачкі падчысцілі. Шкло зваконных рамаў і тое павынімалі. За адну ноч школа была цалкам разгромленая. Хто і што — невядома. Шыта-крыта. Вось табе й пабралі мужчынаў! Гэта ж мужчынская работа! Не бабская.

Вяскоўцаў здзіўляла тое, што начальства пакінула іх гэтак патаемна і падспудна. Угаворвала не паддавацца паніцы, заставацца кожнаму на сваіх мясцох, рабіць, як і рабілі дасюль, не парушаць дысцыпліны, і вось табе — змылася першым, няўгледна ад людскога вока. Дзе падзеўся той штаб і тая бронь? Рыхтаваліся ж яны, думалі ж яны, як гэта ім лацвей знікнуць! От і зніклі. Пачуў кот смаленае.

Але ў вяскоўцаў было адчуванне нечага новага, хоць і няяснага. Упершыню яны засталіся без улады. Упершыню адчулі сябе свабоднымі, хоць гэтая свабода і пужала іх: як гэта быць ім самім? Была нават радасць, што ўлада адступіла, скончылася, пакінула іх. Яны яе не шкадуюць, па ёй не плачуць — дадзела яна ім. Хопіць! Але што наступіць пасля яе, якая ўлада прыйдзе на змену старой? Які будзе парадак? Пэўна ж парадак трэба змяніць, але хто яго зменіць і як? Нашы ж людзі пайшлі. Пайшлі на

вайну. Але за каго яны ваююць? Вярнуліся б хутчэй дахаты жывымі і ўстанаўлялі б нейкі свой парадак. Бо калі пачне ўстанаўляць парадак чужынец, дык ці добры будзе той парадак для нас? Прыйдзе немец — напэўна ж прыйдзе, чаго б уцякалі нашыя? — дык як ён будзе абыходзіцца з намі? Боязна. Наша ўся сіла пайшла немаведама чаго і куды, а прыйдзе чужая. Што яна будзе рабіць з намі, пакінутымі і безабароннымі?

Як бы назнарок, сярод белага дня, нічога не баючыся, павольным крокам, упэўнена ідзе па вуліцы — з канца ў канец — старшыня сельсавета з вінтоўкай за плячыма. Ідзе гэтак, каб яго бачылі ўсе, каб ведалі, што савецкая ўлада не адступіла, што — бачыце — яна ступае ў яго асобе цвёрда і непахісна, хай нехта паспрабуе нават падумаць, што яе няма. Не, яна, улада, тут, яна не знікла, яна непераможная і непрамінальная. Старшыня сельсавета ішоў вуліцай, не пазіраючы на вокны хатаў, якія ён мінаў, але ягоныя вочы, здаецца, бачылі ўсё і ўсіх, хто і як сябе паводзіў у час ягонай кароткай адсутнасці. І людзі, гледзячы ў вакно, баяліся яго, ягонай хады. Ім здавалася, што ён ведае іхныя думы, іх настрой, ведае, хто ўжо здрадзіў яму, палічыў, што ўжо яго няма, што ён болей не вернецца. А ён, глядзі, тут. Хай дрыжыць той, хто ўжо спісаў яго і ўсклаў надзею на некага іншага. Не, не будзе іншага.

Уначы да Дусі ў клець прыйшоў Мікола Бугроў. Дуся ўпусціла яго, пасля таго як ён сказаў, што хоча толькі пагаварыць з ёй. Але перад тым як адчыніць яму, Дуся надзелася, ведаючы яго нораў. Бугроў, увайшоўшы, папрасіў:

— Давай сядзем. Дзе твой ложак — не бачу.

Намацаў у цемры ложак. Сеў.

— Хадзі й ты, сядай, кажу. Не бойся. Чапаць не буду.

Дуся не садзілася, гатовая выскачыць у выпадку, калі б Мікола ўздумаў змусіць яе лажыцца з ім.

— Хадзі, кажу! Мяне дык ты баішся, а як хто там падлезе да цябе... Ды я не хачу пра ета гаварыць. Я хачу пагаварыць з табою пра другое... Ну хадзі ж сюды, да мяне. Не бойся. Я прыйшоў не за етым.

У голасе Міколы Дуся вычула нотку засмучанасці, шчырую просьбу пагаварыць з ёю, аднак, ведаючы ягоную

натуру, не верыла яму і ўсё заставалася стаяць каля дзвярэй.

— Тое, Дуся, ужо прайшло, калі я лез да цябе. Ты даруй мне тое. Тое ўсё было не сур'ёзнае. Цяпер час надышоў сур'ёзны, і я хачу пагаварыць з табою сур'ёзна. Ты ўжо не малая... Ты слухаеш мяне? Хадзі, пагаворым палюдску. Вырашым, як табе быць. Што будзеш рабіць? Заставацца ў хаце сядзець ці... У хаце не ўседзіш. Прыйдуць... Упрашваць не будуць... пацягнуць. Ім ты спатрэбішся. На такіх, як ты, яны падкія. Дык каб уцалець... Адзіны ратунак пайсці з намі. Пайсці з людзьмі заадно. Як пайшлі і йдуць мільёны такіх, як ты, каб не спляміць сябе, свой род, сваю матку, свайго бацьку, свайго брата. Падумай, Дуся. Ты нам патрэбная. Хадзі да нас. У лес. Нас ужо многа. У нас ёсць ужо вялікія сілы. У нас ёсць база. Наша армія пакінула нам усё патрэбнае. А прыйдзе вораг... а ён ужо стаіць за колькі кіламетраў адсюль... мы будзем яго біць з тылу. Масква забяспечыць нас усім чыста. Перакіне людзей, зброю. Вораг не ўстаіць. Перамога будзе за намі. Пабачыш. Дык не будзеш жа ты стаяць убаку. Як ты будзеш глядзець людзям у вочы, калі нашы людзі вернуцца? З перамогай. Яны спытаюцца, ці ты штонебудзь зрабіла для перамогі, унясла сваю долю ці не? Хочаш, я пагавару з тваімі бацькамі. Яны, я ведаю, адпусцяць цябе, калі ты захочаш сама. Мы цябе пашлём у Маскву, у школу медсясцёр. Адтуль ты выйдзеш медсястрой перавязваць партызанам раны. Падумай толькі, якую службу ты саслужыш гэтым! Што ты тут будзеш гібець? Прыедзем за табой на машыне, пакуль не позна, і забярэм цябе. Гэта, Дуся, не толькі мая просьба — усяго нашага штаба, усіх нашых людзей просьба. Людзей, якія цябе ведаюць, паважаюць і любяць. Штаб шле табе прывітанні. Сашок Смірноў таксама і перш за ўсё. Дамовіліся, Дуся? Дай мне сваю руку. Дзе ты? Чаму ты маўчыш? Ты згодная са мною? Скажы сваё слова!

Дуся маўчыць. Дусі як няма. Яна затаіла сваё дыханне. Яна нічым не выказвае свае прысутнасці, і невядома было, ці ўспрымае яна тое, што Мікола ёй гаворыць.

— Чаму ты зацялася? Цяжка табе адказаць? Не ведаеш, што сказаць? Але ты мусіш адказаць. Цяпер! З намі ты ці не з намі? Вырашай, Дуся, пакуль не позна! Пакуль я яшчэ не пакінуў цябе. У мяне няма часу. Чуеш, Дуся?

Бугроў падняўся з ложка і накіраваўся да дзвярэй. Дуся адчыніла дзверы, і Бугроў падумаў, што яна хоча ўця-

чы ад яго, але Дуся не ўцякала, стаяла і моўчкі глядзела на Бугрова ў паўзмроку.

— Дык пакуль я не пераступіў гэты парог, адказвай, што ў цябе на душы?

Падышоў да яе бліжэй, хацеў абняць — адмахнулася рукамі.— Не хочаш мяне — ладна! Я свабодны ад цябе. Я табе вось што яшчэ скажу. Ты закончыла школу. Ты не чуеш свайго абавязку перад ёй, перад тымі, хто цябе вучыў, вывеў на дарогу? Дык на якую дарогу ты хочаш стаць, яшчэ раз пытаюся я ў цябе?

— Я хачу пайсці ў хату.

— Гэткі твой адказ? Пабачым!

Бугроў сігануў за парог з рашучасцяй, якой Дуся яшчэ не бачыла ў ім.

Цэлы дзень яна праседзела ў хаце, нікуды не выходзячы. Яна нічога не сказала маці пра Бугрова, пра ўсё тое, што ён ёй гаварыў. Яна была сама з сабой. Гэта быў дзень ейнага роздуму. Яна менш за ўсё думала над тым, што гаварыў, да чаго заклікаў яе Мікола Бугроў. На душы ў яе было не гэта, нешта іншае, мала ёю ўсвядомленае, але тым не менш датклівае. У няяснасці душы яна бралася то за адно, то за другое. Гартала кніжкі, разглядала ў іх пакладзеныя некалі ёю розныя кветачкі, лісцікі, цяпер засохлыя, фотакарткі, што пужалі яе сваім кідкім паглядам вачэй, такіх знаёмых і напаўзабытых. Сярод гэтых фотакартак яна знайшла і фотакарткі з братавага вяселля. На яе глядзяць Эма, брат, маці, яна сама і яшчэ... яна не стала болей разглядаць іх. Узяла свой сшытак з вершыкамі. З тымі, што яна калісьці любіла, завучвала на памяць. Але ўсё гэта было ўжо ў мінулым і, здавалася ёй, не мае цяпер непасрэднага да яе дачынення. Ды ўсё-ткі яно зачапляла ў ейнай душы струну, згукі якой адзываліся ў ёй няўлоўнай радасцяй і адначасна смуткам, што яшчэ больш рабіла яе няўпэўненай і страчанай.

Маці не магла не прыкмеціць ейнага такога стану, але не зачапляла яе, не перашкаджала ёй з ейнымі перажываннямі, хоць і карцела ёй даведацца ў дачкі аб прычыне ейнага несамавітага настрою і ўзрушэння. Хіма пра ўсё магла падумаць, але не хацела дапусціць аднаго — Дусінай страты дзявочасці, такой магчымай. Гэтага яна найбольш баялася, балазе, што ў Дусі ўсё яшчэ не прыходзяць госці, на бялізне ўсё яшчэ не паказваецца ейнае месячнае. «Мо дзеля гэтага й перажывае»,— думала Хіма, але зноў жа не хацела гэтым назаляць ёй, пакуль не ўля-

жацца ў яе ўсё душэўнае. Дуся ўсё пераглядае свае школьныя прыналежнасці, парадкуе, нешта выкідвае ў кошык, быццам збіраецца ў дарогу. «Няхай сабе пераглядае, можа, гэты занятак суцішыць яе»,— думае Хіма. Дуся ўзнялася дастаць з палічкі бутэлечку клею і, устаючы, глянула ў вакно:

— Мамачка, ратуй мяне! Па мяне прыехалі! Схавай мяне! І кінулася ў падполле для бульбы.

Хіма, перапужаная, зірнула ў вакно: з кузава паўтонкі вылазілі Сашок і Мікола Бугроў.

З броні ў абедзвюх Мокрых засталася толькі Агапка, калі на самай справе яна залічалася да гэтай броні. Ні Вяркеева, ні Міколы Бугрова, ні старшыні сельсавета не было ўжо відаць. Калі яны й паяўляліся ў вёсцы, дык толькі ўночы і ў людзей, блізкіх ім і адданых. Прыкмячалі таксама макранцы, што да Хадоскі Канцавой заглядвае ўпаўнаважаны і што з касцюковіцкага начальства толькі ён яшчэ не сышоў. Іншыя ж падаліся пад Папову Гару, трымаюць курс на Гомель. Гэтак гавораць, гэткія чуткі. Чутак гэтых столькі, што невядома, якой з іх верыць. Людзі жывуць цяпер чуткамі. З броні засталася, праўда, яшчэ Дуся, хоць ніхто не верыў, што тая бронь калі-небудзь цікавілася ёю. «Якая з яе бронь? Шашок націснуў, і «бронь» здалася,— смяяліся бабы.— А вот жа не паехала з ім у лес. Прыязджаў па яе. Схавалася і не паехала. Паказала яму сваю «бронь».

Лявонавіч усе гэтыя дні збіраўся пагаварыць з Агапкай, ды ўсё не выходзіла. Нарэшце Дар'я запрасіла яе дахаты. Лявонавіч хацеў паслухаць яе самую пра ўсё, што яна бачыла, што чула. Можа ж, што і пра сына скажа. Вучылася ж з ім у адным горадзе.

Агапка ахвотна прыняла запрашэнне, яна нават сама хацела зазірнуць у хату, дзе яна была не раз і куды яна заўсёды ішла ў надзеі здзяйснення сваіх жаданняў.

Лявонавіч і Малання сустрэлі яе з усёй павагай і ветлівасцяй, хоць і вычувалі сваю перад ёю няёмкасць за няўвагу ў мінулым.

Агапка цяпер аформілася канчальна, спаважнела, набыла прыстойны выгляд маладой адукаванай асобы. Чорныя, да бляску, валасы. Спакойныя, разумныя вочы. Павольныя, мяккія рухі. Акругласць формаў. У гарадскім убранні.

Пяць год прайшло з таго часу, як яна была тут. Лявонавіч і Малання былі нямала здзіўлены яе такім пераўтварэннем і не ведалі, як з ёю абыходзіцца. Агапка ж сваім захваннем, спакойным і тактоўным, суцешыла іх, і яны пачалі чуцца свабодна і нявымушана. Малання пачала частаваць госцю, стаўляць на стол усё лепшае, што толькі ў яе было. Агапка ўпрошвала не турбавацца, гаварыла, што яна не галодная і што яна вельмі ўдзячная за такую ўвагу. Лявонавіч нат дастаў аднекуль паўлітра «Рускай горкай». Казаў: «Як аб'явілі мабілізацыю, дык у сельпо навезлі столькі гарэлкі, што хоць ты затапіся ў ёй. Хапалі ўсе, дык во і мне дасталося. Можа, можаце трохі выпіць, дык выпіце на здароўе». Лявонавіч пачаў называць Агапку на «вы», але госця папрасіла называць яе, як і раней, Агапкай. «Лявонавіч, я была Агапкай і хачу застацца Агапкай. Тым болей для вас, Лявонавіч. Мы ж свае людзі».

Лявонавіч быў рады ўстаноўленаму паміж імі зразуменню і гатовы ўжо быў пачаць свае роспыты, але Агапка, добра ведаючы, што яму баліць, доўга не чакаючы, пачала сама:

— Мае даражэнькія! Я ўсё разумею. Мне блізка ваша бяда, заклапочанасць, гора. Я перажывала і перажываю вашу бяду, як сваю асабістую. Не захаваю — мы ж дарослыя людзі і няма чаго нам хавацца — я любіла Міколу, вашага сына. Ён дораг мне і цяпер, хоць я ўжо (прывітайце мяне!) цяпер замужняя жанчына. Такое маё шчасце, даражэнькія,— выйшла замуж за месяц перад вайной. Муж цяпер змабілізаваны, як і ўсе, і я засталася адна — ні ўдава, ні замужняя. І вось вярнулася ў сваё Мокрае. Аж з самага Мінску. Калі ён быў ужо ўвесь у агні. Ішла дванаццаць дзён з сваім набыткам за плячыма. Набыткаў было няшмат. Мы толькі што пачалі з мужам уладкоўвацца... Я й забыла вам сказаць, я ж настаўніца. Працавала пасля заканчэння педтэхнікума ў пачатковай школе, там жа, у Мінску, на ўскраіне горада. Люблю дзяцей. Хацела мець і сваіх. І вось папаўся мне чалавек. Выйшла за яго. І вось яго ўжо няма. Я засталася адна. Куды ж мне? Вот і прыйшла, што называецца, дамоў. Ні замужняя, ні ўдава. А які тут цяпер дом? Ды я вярнулася, Лявонавіч, назад. На пяць гадоў назад, калі Мікола і я выйшлі адсюль шукаць сябе, свайго шчасця. Я ўжо гаварыла, я любіла Міколу. Не ведаю, ці ён любіў мяне. Здаецца, не. Ён *любіў усіх і нікога, усё і нічога.* Ён любіў, Лявонавіч, сваё

дзела. Дарэшты быў адданы слову, вершапісанню, літаратуры. Хацеў быць паэтам. Не тое што стаўляў сабе за мэту стаць паэтам. Не. Ён нават саромеўся слова «паэт». Чуўся ніякавата, калі яго нехта называў паэтам. Ён быў заюшаны ў гэтым слове, хачу сказаць, у беларускім слове. Яно яго й давяло. Часта яму было сумна, і ён прыходзіў да мяне, «у Мокрае», як ён казаў. Дзякую яму і за гэта. Нудзіўся ён па вас. Хацеў пабачыцца з вамі перад... Ён прадчуваў, што яго возьмуць. Не раз развітваўся са мной. Казаў, мо ўжо цябе, макранскую, не пабачу. Развітваўся — дзівак — з сонцам, калі яно заходзіла. Любіў захад сонца. Кажу, вычуваў свой *заход*. Турбаваўся, што ў пральні яго бялізна не гатова. От, гаварыў, не будзе чаго ўзяць з сабою *туды*... Вы ведаеце куды. Усё не выплачвала яму ганарару, грошы, нейкая газета, у якой ён нешта друкаваў сваё. Ён ужо не рыхтаваўся, як звычайна, да заняткаў — пісаў і пісаў. Праз ноч навылёт. Я пра гэта ведаю, ён чытаў мне ўсё гэта. У яго нікога не было, і ён бег да мяне, «у Мокрае». Мы, можа б, з ім і сышліся напаследак, каб... Хоць не. Ён увесь быў у нябёсах. А я зямная. Выдумваў нешта незвычайнае, у ягонай уяве былі нейкія нетутэйшыя вобразы, пазазямныя, нябескія. Ствараючы ў сваёй уяве прыгожае, жыў гэтым. Жыў фактычна нерэальным. Падманваў сябе... Я ведаю — ён пісаў вам часта пісьмы. Але ў тых пісьмах ён не пісаў праўды. Шкадаваў вас. От які ён быў чалавек.

— Так. Так. Гаворыш праўду — не пісаў усяго пра сябе. Ды мы чулі, што за кожным ягоным словам стаіць. От бяда!

Лявонавіч змахнуў з вачэй слязу.

— Расказвайце. Расказвайце ўсё чысценька, што ведаеце.

— Не ўсё я ведаю, на жаль. Ну, дык вось наступіў той дзень, якога ён чакаў, якога ён баяўся, але да якога няўхільна ішоў. Гэты дзень яму быў наканаваны. Ён дакладна ведаў, калі той дзень настане. Да сябе ён пайшоў увечары ад мяне, сказаўшы, што ён ужо болей са мной не пабачыцца. І так сталася. Тае начы яго арыштавалі. Не аднаго яго. Я ўжо вам пра гэта пісала. Арыштавалі іх адразу, дванаццаць чалавек. І некалькі прафесараў. У адну ноч. Мы, студэнты педтэхнікума, дачуліся пра гэтыя арышты раніцою. У той жа дзень, увечары, я пайшла ў інтэрнат, дзе жыў Мікола, але ніхто нічога мне не сказаў. Баяліся гаварыць. Толькі тэхнічка, жанчына, што ў іх

прыбірала, шапнула мне: «Міленькая, і яшчэ будуць браць. На гэтым не канец». І бралі. У нашым тэхнікуме ўзялі. Нам незразумела было — за што? Потым я ўжо даведалася — прыватна і з газет — што чысцяць «буржуазных нацыяналістаў». Што гэта такое, мне было няўцям, аж пакуль на палітзанятках нам не растлумачылі, што гэта людзі, якія хочуць аддзялення Беларусі, каб яна была асобнай дзяржавай. Лявонавіч, ну мяркуйце, ці мог Мікола нат падумаць пра гэта. А нацыяналістамі іх называлі таму, што яны як быццам на першае месца стаўлялі сваю нацыю, свой народ. Ну дык Мікола, выходзіць, таксама нацыяналіст — ён любіць свой народ.

Забыла я сказаць вам яшчэ адно. Гэта, можа, й вырашыла канчальна лёс Міколы. Хадзіла паміж Міколавых аднакурснікаў байка, а можа, гэта было й праўда — Мікола мог выпаліць такое — быццам, ішоўшы ў інстытуце па калідоры, ён заўважыў на дошцы абвестак вялікага памеру, надта размаляванае апавешчанне. У ім паведамлялася, што на палітзанятках чацвертага (ягонага) курса будзе даклад пра сталінскую канстытуцыю. Прачытаўшы гэта (каля дошкі стаялі іншыя студэнты), Мікола не то што сказаў, а выкрыкнуў:

Канстытуцыю далі,
адчынілі дзверы.
У астрог нас павялі
і таўкуць без меры.

Напужаныя гэтым выкрыкам, студэнты палічылі патрэбным як найхутчэй змыцца. Мікола стаяў у разгубленасці, не разумеючы, што здарылася. Міколу й прышылі, што ён, Мікола, гэтак во адгукнуўся пра сталінскую канстытуцыю. На самай жа справе Мікола сказаў гэта ненарокам, не думаючы, механічна. Атрымалася яно вось як: Мікола мусіў выступіць з сваім рэфератам на семінары па Коласу. Седзячы ў бібліятэцы, Мікола й пісаў свой рэферат, падмацоўваючы свае выказванні цытатамі з Коласа. Падаў і гэту, ходкую ўва ўсіх крытыкаў цытату з коласаўскага верша пра царскую канстытуцыю. Па сканчэнні работы над рэфератам Мікола быў нагэтулькі стомлены і затлумлены, што, выйшаўшы з бібліятэкі і прачытаўшы на дошцы абвестку пра канстытуцыю, у яго міжвольна, па асацыяцыі ўспыхнулі коласаўскія радкі. Гэта была механічная, ненаўмысная аддача стомленага мозга. Але Міколу прыпісалі ў НКВД, што ён сказаў гэта наўмысна, што гэта злосная контррэвалюцыйная выхадка.

Неасцярожны быў. Не бярогся. Такі ён у нас, неразумны,— падагульніў Лявонавіч.

— Так, праўда — неразумны. Але ў яго быў свой розум. На ўсё. Інакш у яго не магло быць. І гэтак Мікола знік. Прайшлі годы, і я, паглынутая сваім, не то што забыла Міколу, а проста не чула пра яго. Я ж з таго часу ў Мокрым не была і не ведала, што вы мелі ад Міколы пісьмы. Але пра самае важнае я вам яшчэ й не сказала. Проста неверагодныя рэчы. І я думаю, што Мікола на самай справе дзе-небудзь у дарозе дахаты.

На настаўніцкай канферэнцыі ў Мінску я пазнаёмілася з аднэй настаўніцай з Смілавічаў. Ейнае прозвішча — Валя Камоцкая. Яна вучылася разам з Міколам на літаратурным аддзяленні. Будучы студэнткай, была ўжо замужам за студэнтам з свайго ж курса. Ведала добра Міколу, паколькі ейны муж-студэнт таксама нешта пісаў і, бывала, запрашаў да сябе Міколу паслухаць напісанае. І вось арыштавалі — я думаю, тады ж, як і Міколу — і ейнага мужа-студэнта, разам з цэлаю групай студэнтаў. І ўсіх іх асудзілі. Яны прайшлі па аднаму супольнаму дзелу. Усім ім далі па дзесяць год. Але слухайце, што далей. Валя Камоцкая пачала хадайнічаць за свайго мужа і дамаглася ў Маскве адмены прысуду Вярхоўнага суда БССР. Ну й прывезлі ўсю групу назад у Мінск на новае следства. Камоцкая перадала свайму мужу й перадачу. Значыць, мае даражэнькія, Мікола быў у Мінску. Гэта абсалютна верагодна. А пачалася вайна, дык іх жа некуды вывелі з турмы. І напэўна. Я сама бачыла, як уцякала з Мінска і йшла вобак шашы Мінск — Чэрвень вялічэзную калону зняволеных пад канвоем. Я бачыла гэтую калону, калі яна ўжо ўваходзіла ў самы Чэрвень. На ўскраіне горада я спынілася каля студні напіцца вады — такая спякота тады была — і назірала за гэтай калонай. Мне падумалася, што сярод зняволеных можа быць і Мікола і я магу яго ўгледзець. І мне сапраўды ў нейкім моманце здалося, што я пабачыла Міколу, але калону гналі хутка, і твар Міколы — можа, гэта быў і не ён — прамільгнуў, знік. Вот якая, даражэнькія, гісторыя. Я пра гэта хацела расказаць вам, як толькі прыйшла, але за мяне ўзяліся нашыя, хочуць, каб я засталася ў тылу ў немцаў, калі яны прыйдуць сюды, і вяла работу. Пра ета я яшчэ падумаю. Але што Мікола можа прыйсці, кажу,— на гэта ёсць надзея. І вы, Лявонавіч, і вы, цётка Малання, усцешыцеся, пабачыўшы на сваім парозе Міколу.

У Мокрым не відно ўжо старшыні сельсавета. Не пахаджае з вінтоўкай за плячыма. Некуды знік. Знікла і ўся бронь. Няма ўлады. Сельсавет і школа — адзіныя ў Мокрым савецкія ўстановы — глядзяць разбітымі вокнамі, папераджальна і трывожна. Калгасы засталіся без старшыняў, іхнымі гаспадарамі сталі самі людзі: забіраюць сабе з фермаў кароў, свіней, авечак. Цягнуць, што пападзецца — плугі, хамуты, калёсы. Можа, усё гэта спатрэбіцца — даходзяць жа чуткі, што немцы калгасы распускаюць, зямлю аддаюць сялянам. Дык чым яе будзем абрабляць? Вось толькі бяда — засталося мала коней. Як іх падзеліш? Страху ўжо няма, што вернецца ўласць. Немцы бяруць за горадам горад. Мільёны нашых салдатаў ужо ў руках немцаў — здаліся. Іх, кажуць, адпускаюць дахаты, дык мо й сапраўды пачнуць варочацца да сваіх сем'яў. Даў бы Бог. Гавораць, вайна абмінула нашы балоты, пайшла бокам наперад, і мы ўжо ў тыле, пад немцам. Невядома яшчэ, што робіцца ў Касцюковічах, але пагаворваюць, што там ужо ўласць нямецкая. Бургамістр будзе нейкі ўпраўляць. Сельсаветаў не будзе. Будуць воласці. Як раней. У валасцях таксама будуць бургамістры. Прышлюць і нам якога-небудзь. Толькі калі яны да нас дабяруцца сюды? Трэба ж, каб быў нейкі парадак. З уласцю жыць нялёгка, але кепска і без яе. Хто дужэйшы і смялейшы, той і бярэ. А слабому? Слабому трэба зашчыта.

— Дык што — немец цябе зашчыціць? Ты ўжо чакаеш яго? Пабойся, Хадоска! Мужа адправіла на вайну, а сама немца чакаеш? Ён табе дасць такую зашчыту...

— Але чаго ты ўз'елася? Я не баюся цябе — чакаю. А ты што — чакаеш, калі твой з кустоў прыйдзе? Не, трасца! Досыць вам панаваць! Я адправіла свайго на вайну, а ты куды адправіла? У лес? Твой бронь, а мой аблонь. Мой і нашы ўсе кроў праліваюць. Можа, ужо каго няма й у жывых, а твой, нябось, цэленькі. Яшчэ па начах табе й пад спадніцу залазіць. Не, я хачу, каб і мой прыйшоў да мяне, вярнуўся з фронту жывым. За якога лысага чорта ён будзе ваяваць? За цябе? У мяне вунь куча дзяцей засталася. Ім патрэбны бацька! А ты мяне немцам упікаеш. Вот і хачу немца! Няхай ён навядзець парадак.

— Чаго ета вы раскудахталіся, мае даражэнькія? Ці не падзялілі чаго? Сцішыцеся! Прасіце Бога, каб памілаваў нас. Прасіце помачы ў Яго. Ніадкуль яе не чакайце,— Хіма хоча злагодзіць спрэчку паміж жанчынамі, але гэта

ёй не ўдаецца. Хадоска гэтак распякла сакратарову, што тая пачала лезці да яе з кулакамі.

— Ну ці гэта вы пашалелі — адна на адну наступаць? Мужчыны б'юцца, а тут, глядзі, бабы пачынаюць. Хадоска! І ты, сакратарова, разыдзіцеся, кажу! Людзі засмяюць! — Хіма стала паміж імі, распасцёршы рукі.

І тут, як якое насланнё, прарэзалі вуліцу тры матацыклісты ў касках. Памчаліся на мост, крута павярнуўшыся каля сельпо.

— Ну вось і твой немец! Дачакалася? Свісні ім!

Сказала і пайшла. А Хадоська яшчэ глядзела на мост, ці не пакажацца адкуль болей немцаў.

Росказень Агапкі пра Міколу ўзбудзіў у Лявонавіча і Маланні надзею на вызваленне сына, на зварот яго дахаты. Але шмат чаго ў ейным росказні выдавалася ім малапраўдападобным. Яны думалі, што Агапка проста хацела суцешыць іх і дзеля гэтага выдумала для іх, як для дзяцей, байку, што Міколу прывезлі з Калымы ў Мінск і што ён ужо можа быць у дарозе дахаты. Праўда, ад Міколы яны ўжо не атрымлівалі лістоў болей як паўгода, і за гэты час усё магло быць. Маглі прывезці яго ў Мінск, маглі зноў узяцца за іх дзела, калі такі загад з Масквы. Ды ўсё ж росказень Агапкі дужа сумленны, дужа замыславаты, каб у яго можна было лёгка паверыць. І ўсё ж Лявонавіч і Малання хацелі верыць. Верылі. Пачалі жыць гэтай верай. Агапка шмат чаго адкрыла ім пра сына, чаго яны не ведалі. Цяпер ён стаўся для іх больш зразумелым, а ад таго сталіся больш зразумелымі і ягоныя пакуты.

У надзеі, што іхны сын можа і прыйсці, Малання пачала нават рыхтавацца да сустрэчы яго: шыць яму з саматканага палатна сподняе — штаны, кашулю і іншае. З гэтага ж у яго нічога не засталося — знасіў усё бацька. Пачала дбаць і пра верхнюю адзежыну: прыйдзе, дык не будзе чаго надзець. Ператрэсла пасцель, абнавіла, памыла. На ягоным ложку ў сенцах ніхто не спаў: як пакінуў яго Мікола, гэтак і заставаўся ён стаяць пустым. Малання пачала клапаціцца і пра скароміну: як прыйдзе, дык чым жа яго карміць? Не хлебам жа з бульбай! На гэтым не паправіцца. Трэба якая й скварка. Але ў Лявонавіча й Маланні не вяліся свінні — дохлі. Што ні рабілі — праводзілі дэзінфекцыю, клікалі ветэрынара, чысцілі, мылі хлявы, увесь двор — нічога не дапамагала. Корміш-кор-

міш свінню, парсюка якога, пажывець якіх тры-чатыры месяцы, і няма — чэзне. А то ўжо калі й апаросіцца свіння, дык пасля трох-чатырох тыдняў дохнуць і парасяты. Ніяк не развядзець Лявонавіч свіней! У суседа — аднаго і другога — няма ніякага зводу, ёсць свінні і кормныя і надворныя, і ёсць сала і да сала, а ў яго няма. У яго ідуць свінні на звод. Вось і цяпер — апарасіла шасцёх. Ім толькі па два тыдні, а ўжо захварэлі. Дык ці калоць іх, каб усёткі спажыць, ці пачакаць — мо выздаравеюць? А як не — што тады рабіць? Калоць ужо будзе позна — заразных есці ўжо не будзеш. Маланн радзіць — калоць, пакуль не здохлі. Будзе чым пачаставаць, як прыйдзе. (Лявонавіч і Маланн чамусьці не называлі сына на імя — баяліся. Абыходзіліся трэцім, неазначальным імем: «як прыйдзе».)

Лявонавіч верыць у свае сны. Яны ў яго прарочыя. Што сасніць уночы — чакай таго ўдзень: спаўняецца. Маланн нават баіцца ягоных сноў. Прачнуўшыся раніцой, скажа, напрыклад, што прападзе карова, конь, свіння ці авечка, ведай — гэтак і будзе. І таму Маланн баіцца раніцою выходзіць з хаты на двор — баіцца там убачыць Лявонавічава прароцтва. Або — сасніць, што не сёння, дык заўтра прыйдзе ад сына пісьмо, глядзіш — паштар і прыносіць яго. Няма тэй ночы, каб ён не сасніў чаго і каб тое не адбылося. Лявонавіч, здавалася, і лажыўся спаць не для таго, каб адпачыць, выспацца, а каб сасніць, даведацца, што будзе. Калі што дрэннае сніў, хадзіў, прачнуўшыся, маркотны, пануры, чакаў таго моманту, калі саснёнае адбудзецца. Хацеў тое дрэннае прадухіліць, хоць ведаў — гэтага зрабіць нельга: няўхільнае застаецца няўхільным. Калі ж сон прадказваў яму нешта радаснае, ён баяўся яго чым-небудзь спужаць, пашкодзіць таму, што мае наступіць. Досыць толькі, прачнуўшыся, сказаць якое-небудзь паганае слова, як сон твой не спраўдзіцца, уцячэ ад цябе, нядобрага. Для прарочага сну чалавек мусіць быць накшталт святога. Толькі такі чалавек можа пабачыць,— а пабачыць можна толькі ў сне,— цудоўнае ўдалечыні святло, якое — калі ты здольны спазнаць яго — і прадказвае, вяшчае табе.

Лявонавіч майстраваў сабе на двары калёсы. Свідраваў у «падушчы» дзюрку для шворна і неяк свярдлом парэзаў сабе палец. Пайшла кроў. Не ўпершыню такое, але Лявонавіч на гэты раз угледзеў у гэтым нейкі знак. Спакойна глядзеў, як ішла кроў і нічога не рабіў, каб спыніць ейны плын. Яму гэты плын здаваўся нечым асаблівым.

Нарэшце ўвайшоў у хату, пасыпаў попелам на рану, забінтаваў, і кроў супынілася. Рука не балела, і ён вярнуўся да працы. Угледзеў на «падушцы» некалькі кропелек свае крыві. Яны, гэтыя кропелькі, нагэтулькі зыркія ў сваёй выразнасці, што яны быццам крычалі яму: «Мы твае. Не бойся. Гэта табе на радасць. Табе ўжо не баліць». Але Лявонавічу ўсё здавалася, што гэтыя кропелькі пралітыя не ім, а некім іншым, і пралітыя для таго, каб ён, Лявонавіч, спазнаў, кім яны пралітыя.

Падганяў пад «падушкі» восі, а ўсё думаў пра гэтыя кропелькі. Ужо састругаў іх з «падушкі» гэблікам, ад іх не засталося і следу, а кропелькі ўсё стаялі ў вачох.

Калі лёг спаць, дык і ў сне гарэлі яны. Згаслі толькі, як пачаўся дзень. Такі надзвычайны. Сонца высокае. Пад сонцам гойдаецца нейкае вялікае мора, спакойнае і такое блакітнае. Ледзь-ледзь зыбаецца. Далягляд далёкі-далёкі. З-пад далягляду, з-за нейкай невідочнай рысы выплывае човен, і ў ім нехта маленькі-маленькі, не распазнаць. Стоячы на беразе мора, Лявонавіч углядаецца, не спушчае яго з вачэй. Човен плыве і плыве проста на яго. Усё бліжэй і бліжэй, але Лявонавіч, дзеля марской сінявы, усё не можа разгледзець, хто ў чоўне. Той, хто ў ім, заслонены блакітнай дымкай, падобнай на нейкае мроіва. Човен ужо на сярэдзіне мора. Плыве і плыве. Ды раптам ззаду нахлынула магутная хваля, ударыла ў човен, і човен знік, прапаў з вачэй. За хваляй набягае іншая хваля. Хвалі б'юць у бераг, пырскаюць. Лявонавіч нічога не можа разглядзець у моры. І вось уздыбленая, цэлай сцяною, рушыцца хваля, і ў той хвалі Лявонавіч бачыць човен. Хваля-сцяна нясе човен проста на яго, на самы бераг. Але перад самым берагам, гатовы ўжо ўткнуцца ў яго, човен пачынае тануць, хвалі паглынаюць яго і ў нейкай невядомай датуль рашучасці. Спалоханы Лявонавіч, нагнуўшыся, хапаецца за човен, цягне — але замест чоўна ён выцягнуў за валасы... сына.

Прачнуўшыся пад раніцу, Лявонавіч лёгенька крануў Маланню:

— Спіш? Ведаеш, бачыў сон — прыйдзе Мікола. Але будзь спакойнай. Не хвалюйся. Не трэба чакаць. От рабі ўсё так, як і рабіла, як бы й нічога не сталася. І яно станецца.

# ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

Я падышоў да свае вёскі, калі ўжо зайшло сонца, але калі было яшчэ досыць відна, і, каб мяне ніхто не ўбачыў, я вырашыў схавацца ў жыце, пасядзець у ім, пакуль не сцямнее. Я хачу ўвайсці ў хату незаўважаным. Не хачу, каб людзі адразу даведаліся, што я прыйшоў, вярнуўся. Як я ні запавольваў свае хады, а ўсё роўна прыйшоў на нашыя палеткі зарана. Ад самага Чэрвеня, дзе нас кінуў канвой, я іду, хаваючыся, каб мяне не затрымалі, каб дайсці. І вось, калі дайшоў, пачаў набліжацца да нашых ваколіцаў — не мог замарудзіць сваіх крокаў, дачакацца пацёмкаў: усё знаёмае, роднае хлынула ў маю душу, сціснула маё сэрца болем, жалем і трывогай. Я цяпер ужо дома, я ўжо тут, я зараз пераступлю свой парог! Сяджу ў жыце, гэтак блізка ад свае хаты! Узняўшыся, я мог бы пабачыць яе з гэтага жыта. Я ўжо і ўздымаўся колькі разоў, каб зірнуць на яе. Сяджу, чакаю, пакуль болей сціснецца, пацямнее. Чую нейчую гамонку. Гэта, пэўна, ідуць з працы вяскоўцы гэтак блізка паўз мяне — я нават чую, як яны ступаюць, чвякаюць па жарсцвянай дарозе, то тут жа, побач мяне. Яны адыходзяць, і я ўзнімаюся — не магу болей чакаць! Выходжу з жыта, аглядаюся. Направа — наш могільнік, з тымі ж высачэзнымі соснамі. Я толькі вокам кінуў на іх — перада мною, як на прыцэле, была ўжо нашая хата, крайняя, злёгку ахутаная вячэрнімі сутункамі. Гэтая кропка была для мяне цяпер змяшчэнне ўсяго чыста на свеце. Як гэта я зайду ў хату, як гэта я пакажуся! У душы маёй варухнулася віна: гэта ж усё я, гэта ж усё праз мяне! Пайшоў хутчэй. Не аглядаюся. Ступіў на свой агарод — а побач, у суседнім агародзе,

узнялася ў пярэстым убранні жанчына з лапатай у руках. Углядаецца ў мяне. Няхай углядаецца! Я ўжо на сваім двары. Свой і не свой. Баюся ўзяцца за клямку дзвярэй, пераступіць тую мяжу, да якой я дайшоў. Стаю і не адважваюся адчыніць дзвярэй — як гэта так, адразу! Збіраюся з духам. А дзверы адчыняюцца самі — маці! Спужалася. Войкнула. Зайшлася ціхім плачам. Я ў хаце. Бацька сціскае мяне ў сваіх абдымках. Сястра цалуе і таксама не можа ўстрымацца ад плачу. Бацька ў спеху зацемніў вокны. Запаліў лямпу. Маці, зірнуўшы, у чым я, зноў залілася слязьмі: ногі ў мяне абкручаныя анучамі, ватнікі ў дзюрках свецяцца маім голым целам, спарахнелая ад поту кашуля ледзьве трымаецца на плячох, на голай шыі нешта накшталт шаліка, на галаве — кепка-безказырка. Мяне садзяць за стол, я ледзьве пераступаю — ногі сцішаныя, не хочуцьісці. Я збіў іх, ідучы шашою. Мне даюць есці і піць, ды ад усхваляванасці я не магу за гэта ўзяцца — плачу сам ад радасці і гора. Нехта забразгацеў у сенцах, і бацька схаваў мяне пад палом. Увайшлі дзве жанчыны, гавораць:

— Не маглі ўстрымацца, каб не зайсці: разнеслася чутка — сын прыйшоў. От, думаем, вялікая радасць сёння ў вас у хаце — дачакаліся сына. Нагараваўся ж досыць. Дык дзе ж гэта ён? Ці адпачывае?

— Ды што гэта вы? — гаворыць маці. Здалося гэта вам, ці што?

— Дык бачыла ж Хадора, ваша суседка, як ён ішоў. Бачыла яго ўжо на вашым агародзе! Што гэта вы, добрыя людзечкі, і прызнацца не хочаце? Ці ж ён крадзены які ў вас. Дзякаваць жа Богу, што прыйшоў. Чаго ж хавацца?

Я чую гэтую гаворку. Бацька маўчыць. Маці слаба і няўпэўнена пераконвае жанчын, што мяне, на жаль, яшчэ няма, я чую, як яна мучаецца, гаворачы гэта, жанчыны бачаць па ёй, па ейнай няўпэўненасці, што яна гаворыць няпраўду.

— Ну, але даруйце нам, што патурбавалі. Зайшлі не ў пару. Наскочылі, можна сказаць. Не далі вам і апомніцца, дый чалавеку адпачыць з дарогі не даём. Лявонавіч, як дазволіце, мы заўтра заглянем. З паўлітрам прыйдзем прывітаць вас. Мы ж рады за вас,— сказала адна з іх на адыходзе.

Бацька выясніў мне, што лепей тым часам мне не паказвацца, паколькі няпэўна яшчэ, ці напраўду адышла

«ўласць», што прыязджаюць яшчэ ўначы на грузавіку нашыя, у тым ліку старшыня сельсавета. Што яны робяць тут, невядома. Але, даведаўшыся, могуць забраць мяне. Могуць мяне яшчэ й «расходаваць» — веры ім няма. Я мушу сядзець ціха, пакуль яны не знікнуць канчальна. Бацька дадаў, што наша, макранская, тэрыторыя тым часам яшчэ савецкая. Немцы паказаліся на матацыклах, і след іх прастыў, болей не паказваюцца.

Я стомлены, і мяне пачалі рыхтаваць на адпачынак. Я папрасіў маці паслаць мне на падлозе. Мне хацелася распластацца, выцягнуцца, свабодна раскінуць нагамі, распасцерці рукі. Я спаў неспакойна, малаціў нагамі, не ведаў, куды іх дзець, крычаў, плакаў, нешта трызніў.

Пад вечар няўгледна ўехалі ў вёску немцы — нейкая тылавая часць, слаба ўзброеная. Адкуль яны ўзяліся, ніхто не мог бы сказаць. Выставілі ў абодвух канцох вёскі патрулі і пачалі яе латошыць. Вяртлявы, малога росту немец, бегаў па хатах, голасна выкрыкваючы, колькі ў кожнай з іх можа размесціцца салдатаў. Немцы збіраліся заначаваць у Мокрым.

Я сядзеў на лаўцы ля вакна, калі ў нашу хату ўбеглі два немцы. Адзін з іх ужо нёс у аднэй руцэ гарлач малака, які ён паспеў ухапіць недзе ў сенцах. Зірнуўшы на мяне, ён з нейкім сполахам у голасе:

— Партызан!

Невядома было, ці ён ужо прыняў мяне за партызана, ці толькі пытаўся. З вялікай цяжкасцяй я сказаў яму панямецку, што я не партызан. Але ён не адступаўся ад мяне, пытаўся, чаму я не ў арміі і ці ёсць у мяне зброя. Адчапіўся ад мяне толькі тады, калі я сказаў, што прыйшоў з турмы і ў армію не трапіў. Задаволеныя маім адказам і пабачыўшы, што я трохі разумею іхную мову, яны пацягнулі мяне на вуліцу як перакладчыка.

На вуліцы, апрача немцаў, амаль нікога не было — пахаваліся. Немцы пачалі выганяць з хатаў дзяўчат і жанчын, каб яны дапамагалі ім рыхтаваць вячэру — капалі на агародах бульбу, чысцілі, мылі. У канцы вёскі, за коўратамі, расклалі вогнішча, выкацілі сваю кухню, парастаўлялі ўсё патрэбнае. Цукеркамі і шакаладам заманьвалі дзяўчат, але тыя гуртам уцякалі ад іх. Ды немцы лавілі іх, змушалі працаваць. Спаймалі і маю сястру, але адпусцілі, калі я сказаў, што гэта мая сястра. Ушанавалі

гонар перакладчыка! Але з'явіўся й іншы перакладчык — Вусаты Якаў, ён, можна сказаць, разумеў па-нямецку лепей, чымся я — навучыўся гаварыць у палоне. Я быў яму ў падмозе. Пасмялелі і дзяўчаты з жанкамі, што мы гаворым з немцамі па-іхнаму. Стоячы наводдалі ад вогнішча, разглядвалі, якія яны, немцы. Зроду ж не бачылі іх. Ды стала цямнець, і вяскоўцы пачалі разыходзіцца па сваіх хатах. Але ў гэтыя хаты пачалі залазіць на ноч і немцы — па пяць, а то й па дзесяць. У нашай хаце іх лягло на падлозе дзесяць чалавек. Самі ж мы, можна сказаць, не спалі ўсю ноч — неяк было не па сабе, што ў хаце столькі чужых людзей. Салдаты, як пападалі на падлогу, гэтак адразу й заснулі. Уначы можна было пачуць іх стогн і незразумелае трызненне.

Раніцою, мажа, а якой шостай гадзіне, раздалася на вуліцы каманда «аўфштэйн» і нашыя салдаты ўвомірг паўскоквалі, выбягаючы з хаты. На падлозе валяліся забытыя ці пакінутыя імі розныя дробныя рэчы, пераважна плошкі, якімі яны асвятляліся ўвечары. За якую паўгадзіну вёска ачысцілася ад іх. За ўсю вайну першы і апошні раз яна бачыла немца. Аддаленая ад раёна, ад галоўных дарог, закінутая ў лясох, глухая, яна хутка сталася здабычай партызан. Усталеная было тут валасць з дзесяткам паліцэйскіх не змагла нават на патрабаванне раёна адправіць яму статак кароў — яго перанялі ў лесе партызаны, перабілі паліцэйскіх і вярнулі жывёлу ейным уласнікам. Валасць, былы сельсавет, была разгромлена, бургамістр, мясцовы чалавек, у мінулым актывіст, падаўся ў партызаны, але тыя расстралялі яго, як здрадніка. Мокрае засталося без ніякай улады, калі не лічыць улады партызанскай, самай страшэннай улады: над ёю не было кантролю, яна была самачыннай.

У Мокрым былі людзі, якія чакалі немцаў і былі расчараваныя, што яны пайшлі, не змогшы ўстанавіць свае ўлады. Гэтыя людзі цяпер баяліся партызан, баяліся іхнай «начной улады». Партызаны дзейнічалі толькі ўначы — прыходзілі, забіралі, стралялі. Удзень яны яшчэ баяліся паказвацца. Іхная ўлада — начная, незаконная, а людзям патрэбна нейкая ўлада законная, дзённая. Нехта ж мусіць кіраваць. Вунь яны не ведаюць, што рабіць з калгасам. Да макранцаў даходзяць чуткі, што калгасы ў суседзяў развальваюцца, дзеляць зямлю, наразаюць на сям'ю, на кожную душу, ці яна, тая душа, ёсць у сям'і, ці яе няма ў дадзены момант. Чулі, немцы хочуць, каб калгасы заста-

валіся, ім лацвей тады браць з іх усё, што яны захочуць. Нам жа калгасы збрыдлі, мы хочам рабіць на сябе. Дык людзі й не слухаюцца немцаў — робяць сваё. Немец сядзіць у цэнтры, сюды ён баіцца і носа паказаць. А партызан баіцца немца — хаваецца ў лесе. Яму што? Захоча есці — прыйдзе і возьме. Не дасі — адбярэць. Вось тут і жыві. А трэба ж жыць. Карміць неяк сябе і дзяцей. А з чаго можна жыць? З зямлі. Дык нам давай зямлю. Абробім!

І вяскоўцы выбралі мяне ў зямельную камісію, дзяліць зямлю. Я не хацеў, адмаўляўся. Але бацька ўгаварыў мяне ўзяць на сябе такую функцыю.

З стрыечным братам, Андрэем, кульгавым і непрыгодным для арміі чалавекам, мы і ўзяліся дзяліць зямлю — на палоскі. Як і было да калгаса. Зямля ў нас няроўная, паводле якасці,— дзе пяскі, дзе балотцы, дзе ўрадлівая, дзе неўрадлівая,— і дзеля гэтага мы хацелі падзяліць яе, наколькі толькі можна, справядліва: наразалі кожнаму па палосцы на пясках і кожнаму па палосцы на лепшых землях. Каб без крыўды. Не паспявалі мы выдзеліць па палосцы на адным якім-небудзь участку, як, глядзіш,— іх ужо ўзлупілі жанкі, узаралі і чакаюць нас, калі мы падрыхтуем ім наступныя дзялянкі. За які-небудзь тыдзень перавярнулі-ўзаралі цэлае поле! Дзіву дацца — на пакінутых арміяй паганенькіх канёх, узятых з калгаснай канюшні і цяпер адкормленых. працаўніцы вёскі — жанчыны без мужчынскай сілы ўпраўляліся з працай хутчэй, чымся пры калгасе, калі даставала ўсяго — і людзей, і цягла. Адкуль узяліся плугі, бароны, хамуты, калёсы, сеялякі, веялякі.

Але як мы ні стараліся пры дзяльбе зямлі размеркаваць яе як найбольш справядліва, нараканням не было канца: Хадора не атрымала нарэзу там, дзе мы нарэзалі Акуліне, Акуліна не атрымала дзялянкі там, дзе атрымала Хадора, тая ці іншая сям'я атрымала два надзелы на добрай зямлі, у той час, як якой-небудзь іншай сям'і выдзелілі два надзелы на пясках і г. д. і г. д. Мала таго, нас пачалі абвінавачваць, што сабе мы наразаем усюды добрай зямлі.

І я выйшаў з зямельнай камісіі. Я не магу слухаць гэтых нараканняў. Узяўся за школьную справу — надумаўся аднавіць у нашай школе заняткі, адчыніць нанова няпоўную сярэднюю школу — НСШ, як гэта было і да вайны, да нядаўняга. Мая ідэя знайшла падтрымку ў вяс-

коўцаў: а як жа, дзяцей трэба вучыць, як бы там ні было. І гэтак я стаўся дырэктарам свае, Макранскай школы. Шукаю выкладчыкаў. Некаторыя з настаўнікаў, што працавалі ў школе і нікуды не паехалі, прынялі маю прапанову. Не хапала выкладчыка-матэматыка, але й той знайшоўся ў асобе аднаго белабілетніка. Так-сяк заладзілі разбітыя ў школе вокны, памылі падлогі, пачысцілі, падмалявалі, вырашылі, якімі падручнікамі будзем карыстацца, вызначылі дзень адкрыцця школы. Заняткі мусілі распачацца ўва ўсіх класах адначасна. Усе настаўнікі былі ў зборы. Вучні чакалі ў класах сваіх настаўнікаў. Быў дадзены званок, і мы рушылі з настаўніцкай у свае класы. Я пайшоў у свой — сёмы клас. Я ўзяўся выкладаць беларускую мову і літаратуру. На палавіне майго ўрока да мяне прыбягае хлопчык і, спалоханы, шэпча мне на вуха: «У школе партызаны. Мая настаўніца мяне паслала».

І выбег. Мае вучні насцярожыліся, зразумелі, што нешта нядобрае. Я спакойна, наколькі мог, сказаў ім, што пакіну іх на хвілінку, і хутка выйшаў праз заднія дзверы на двор, адтуль пакаціўся хмызнякамі ўніз, на рэчку, у вербалоз. Услед за мной было выпушчана некалькі куль. Маё хавала было ненадзейнае, і я адбегся па рэчцы на які кіламетр, далей ад школы. Узняўся на вышэйшы бераг рэчкі, зайшоў у знаёмы мне сасняк, у тыл школы, і адтуль пачаў назіраць за ёй. З школы групкамі выходзілі вучні, пакідалі яе. Выйшлі з яе і тры, узброеныя вінтоўкамі, чалавекі. Селі на падводу і паехалі на мост. Я ўжо магу вярнуцца ў школу. Я хачу пабачыць сваіх выкладчыкаў. Я не магу не пабачыцца з імі. Іду, пасмялелы і важны. Заходжу ў школу, у настаўніцкую. Там сядзяць мае выкладчыкі і спрачаюцца. Не пайшлі яшчэ. Яны, як выглядае, не спадзяваліся мяне бачыць. Коратка расказалі мне пра партызанскі візіт. Пад пагрозай расстрэлу ім загадалі распусціць вучняў, спыніць заняткі і ні кроку больш у школу! Інакш, паводле законаў ваеннага часу, яны будуць пакараныя смерцяй. Хацелі забраць з сабой белабілетніка, але змянілі думку — пакінулі. Самазваны дырэктар паплаціўся б галавой, каб засталі. У кожным класе на дошках пакінулі за сабой надпіс: «Смерть фашистам!»

Я адчуваў сябе ніякавата перад маімі настаўнікамі, прасіў іх выбачыць за турботы, і мы разышліся без крыўды адзін на аднаго, па-добраму развіталіся. Гэтак скончылася мая педагагічная дзейнасць.

Сяброў у мяне ніякіх. Вяркееў у партызанах. Вусцін у арміі, Агапка паехала ў Вараноўку — гаворыць, адкрыла там школу. Можа, гэтак, як і я. Хаджу з бацькам на працу — ару, сею, кашу, малачу. Падацца мне некуды. Хацеў бы заглянуць у раён, у Касцюковічы, але ў мяне нікога там няма, дый на дарозе пяраймуць партызаны. Газетаў ніякіх, радыё таксама. Я не ведаю, як ідзе вайна. Гавораць, немцы бяруць ці ўжо забралі Маскву. Чуем, вяртаюцца дахаты былыя салдаты — уцекачы з нямецкага палону. Яны й гавораць, што пад націскам немцаў Чырвоная Армія здае горад за горадам, што нашы здаюцца немцам мільёнамі. Некаторыя вяскоўцы адказваюць на гэта жартам: «Немцы бяруць гарады, а партызаны вёскі». Мая вёска тым часам непартызанская, яна не ведае, як ёй быць, якога боку трымацца. Яна нейтральная вёска. Яна раздвоеная; ёсць у ёй людзі, што на баку партызанаў, маюць з імі тую ці іншую сувязь, хоць і патаемную, прымаюць іх уначы, тыя й гавораць ім, што немцы доўга не ўтрымаюцца, вернуцца нашыя, іншыя ж хочуць, каб нашыя ўжо не вярталіся, і гэтак людзі падзяліліся на два лагеры. Ніводзін з гэтых бакоў не выяўляў сябе адкрыта, хоць кожны добра ведаў настроі іншага. Асабліва асцераліся сувязісты — яны баяліся карнікаў: наскочаць, спаляць за сувязь.

І гэтак я жыву ў нічэйнай, раздвоенай вёсцы. І сам я нічэй. Я і ні туды і ні сюды. Я не ведаю, хто я. Я ніхто. Я не магу стаць на той ці іншы бок. Мяне бакі не цікавяць. Я абпёкся на гэтых баках. Я стаяў ужо на адным баку, і той бок абярнуўся мне бокам. Больш не хачу ніякіх бакоў. Яшчэ на Калыме я даў сабе зарок зрачыся ўсяго, каб нічым не звярачаць на сябе ўвагу, ні ў чым не браць удзелу, жыць для сябе, ціха, непрыкметна, задаволіўшыся, скажам, пасадай нейкага стаража. Каюся, што ўлез быў у дзяльбу зямлі, што аскандаліўся з школай.

У мяне няма ніякага занятку, апрача сельскагаспадарчага. Я ўжо перапісаў з памяці вершы, што складаліся ў выгнанні. За новыя бяруся — не выходзіць. Перачытаў вершы, напісаныя мной да арышту. Цэлы скрутак чакаў мяне ў падстрэшшы — добра захаваліся. Гэтыя вершы здаліся мне цяпер смешнымі, наіўнымі, нясталымі. Але яны, тым не менш, скалынулі маё сэрца, яно азвалася шчымлівым болем, нечым назаўсёды страчаным, чыстым, поўным юнацкага захаплення. Я адчуў, што я цяпер не той, і мне стала шкада сябе, ранейшага. Я хацеў бы

быць тым, ранейшым, вярнуцца назад. Усяго на пяць год! Толькі пяць год аддзяляюць мяне сённяшняга ад мяне ўчарашняга. Тое, учарашняе, здаецца, стаіць за маёю спіною зусім блізка, хоць на самай справе яно нагэтулькі далёкае, быццам прамежак часу паміж учарашнім і сённяшнім запоўнены не пяццю гадамі, а цэлым стагоддзем. Вярнуцца туды, назад, ужо немагчыма. Ад таго апаноўвае сум, усведамленне свае страчанасці. Калі я йшоў з Менску, маім адзіным жаданнем было дайсці, прыйсці ў сваю хату, суцешыць бацькоў, што гэтак адпакутавалі дзеля мяне. І вось гэта ўжо адбылося, я дайшоў. А прадчуванне такое, што яшчэ не ўсё адбылося, што нешта мае наступіць.

Увечары, ідучы з працы, перад тым як пайсці ў хату, я купаюся ў Свінцы, у віры, што недалёка ад нас. Гэтае месца даспадобы мне. Яно ўтульнае. Утульнасць надаюць яму густы абапал вербалоз, высокая, з нейкім гаючым водарам трава, адгароджанасць месца ад навакольнага свету, цішыня, якая пануе тут. Я магу купацца тут голым — ніхто мяне не падгледзіць. Хлапчукі любяць у нас з кустоў падглядаць, асабліва жанчын, калі яны — голыя — купаюцца. Вада, нагрэтая за дзень, яшчэ цёплая і ўвечары, і я, купаючыся, адчуваю вялікую прыемнасць. З гэтага купела я вылажу паздаравеўшы. Стомленасць пакідае мяне, і я іду дахаты, лёгкі і задаволены сабою.

Сёння пасля вячэры выходжу — упершыню — на мост. Чамусьці баюся ступіць на яго, быццам, калі я ступлю,— ён праваліцца. На ім няма ўжо парэнчаў, і адчуванне такое, што ты можаш зваліцца з яго, упасці ў рэчку. Мост увагнуўся, асеў. Раней ён узнімаўся сваім гарбом і па ім, як па якім глобусе, было лёгка ісці. Стаю на ім, але, без парэнчаў, не магу, як калісьці, апёрціся і, апёршыся, глядзець у неба. Гляджу ў ваду — цёмную. Вярба нізка апусціла свае галіны. Я сыходжу з моста — на той бок — чамусьці баючыся застацца на ім. Направа, як і было,— пуня. За пуняй — сельпо, насупраць сельпо — будынак сельсавета. Без аконных рамаў, ён глядзіць цяпер прывідна. Па маю левую руку — Пілілава хата. Без агню ў вокнах. Іду вуліцаю. Нікога не сустракаю. Там-сям у хатах агні, і я бачу — праз вокны — як вячэраюць. Прыйшоў ужо ў канец вёскі, бачу — наўзбоч свеціцца ўсімі вокнамі нейчая хата. Іду на яе. Гэта — пазнаў — хата старшыні сельсавета. З яе гуртам выходзяць жанчыны. Што гэта ў іх? Вяселле? Хрэсьбіны? Памінкі? Не, Спя-

ваюць. Па ўсім відаць — п'яныя. З гурту аддзяляюцца тры жанчыны. Ідуць, абняўшыся, насустрач мне. Я нікуды не збочваю — іду насустрач ім. «Ну во, папаўся хоць адзін мужчынка. Ах, Божа ж мой, адкуль гэта яго чорт прынёс?» Дзве з іх прост валяцца на мяне, абнімаюць, цалуюць, дыхаюць самагонкай. «Трэба ж паглядзець добра, якога мы чорта цалуем». Бяруць мяне — адна з аднаго, іншая з другога боку — пад рукі і павяртаюць тварам да святла. «Дальбог, не можам пазнаць — хто. Быццам нехта знаёмы і як бы незнаёмы. Ды што там — дармовому каню ў зубы не глядзяць. Браточак родненькі, от жа павязло нам — на мужчыну ўзбіліся. Хадзі выпі й ты для смеласці, калі так не можаш». Цягнуць. Я ўпёрся. «Манька, ты не ведаеш, хто гэты рагаты чорт?» — спыталася адна з іх і яшчэ з большай жарсцяй пачала цалаваць мяне ў самыя вусны. Я глянуў на Маньку, і мне стала неяк не па сабе: гэта ж Вусцінава сястра, тая, што хавалася за шырму і казала: «А я чула, пра што вы гаварылі». Манька, відаць, пазнала мяне, не лезла да мяне з сваімі абдымкамі і цалаваннем, як тыя дзве.

Я іду з імі, трыма, назад. Тыя дзве не перастаюць цалаваць мяне, і я ўжо не толькі не даюся ім, а й, не помнячы сябе, сам пачынаю ліпнуць да іх.

Гэтак дайшлі — вуліцаю праз усю вёску — да самай Піліпавай хаты. Не даходзячы да яе, спыніліся. Тыя, дзве, запрашаюць мяне да іх у хату, у тую, што побач Піліпавай хаты. Гэта — як я ведаю — была хата Мельнікавых. Я надта не ўпіраюся — прымаю запрашэнне. Увайшлі ў хату. Яны запалілі лямпу. Упершыню я мог разгледзець іх: Маньку — высокую, кашчавую, грубога складу дзяўчыну з запалымі грудзьмі; абедзвюх бландзінак, як выявілася — салдатак, досыць прывабных і надта грудастых жанчын сярэдняга ўзросту. Забягу наперад. Як я пазней дачуўся — Манька працавала ў Касцюковічах афіцыянткай, ад некага зацяжарала, зрабіла аборт і вярнулася назад у Мокрае.

Кабеткі — тыя, дзве бландзінкі, нізкага росту, кабеткі мястэчковага тыпу — неўзаметку паставілі на стол пляшку самагонкі і паклалі на талерку нейкую закусь. Пачалі частаваць мяне — піць са мною, громка дзынкаючы сваімі шклянкамі аб маю і высока іх узнімаючы. Яны яшчэ больш ап'янелі, у тым ліку і Манька. Ад Манькі яны дазналіся, хто я,— бландзінкам Манька сказала, што я — таварыш ейнага брата Вусціна, што яна вельмі добра помніць мяне.

Не засталося таямніцай і тое, што я толькі што прыйшоў... «Адкуль — з палону?» — паспяшалася запытацца адна з бландзінак. Манька не ведала, як адказаць, і, смеючыся, ляпнула: «З катаргі». «З катаргі? Ах, які ж ты бедненькі, наш катаржнічак!» — мала не спяваючы, залямантавала адна з бландзінак.— Я цябе адхукаю пад пярынаю, калі ты ляжаш са мною, Арынаю. Дам табе... што хочаш. Забудзеш і на сваю катаргу. Праўда, са мной будзе табе яшчэ большая катарга».— «Не дурыся, Арына. Ты ўжо застарая. Мы пакладзем яго сёння з Манькай». Гэта сказала братава Манькі, ейнага старэйшага брата жонка, што прыехала цяпер з Касцюковічаў. Ейны муж — бронь і недзе ладзіць партызанку. Іншая ж бландзінка, Арына,— гэта ейная сяброўка, і я яшчэ не ведаю, хто яна.

Але я не хачу й ведаць. Мне час ісці. Мне час пакінуць іх. Ды ў мяне няма на гэта дастатковай рашучасці: падумаюць — спужаўся. І я не йду. Братавая Манькі, прыкмеціўшы маю нерашучасць, звяртаецца да Арыны:

— Бачыш, ён не ведае, да каго з нас прыстаць. Аддамо яго Маньцы. Мы з табой — бабы, а яна дзеўка. Ёй трэба замуж. Манька! Ідзі ў сваю клець. Душы падушкі. А «катаржніка» мы табе прывядзём. І, на маё здзіўленне, Манька пайшла ў «сваю клець». Ну й добра — я пайду да Манькі. Братава бярэ ліхтарык і вядзе мяне праз сенцы ў клець. Арына, ап'янелая, крычыць мне ўслед:

— Як у цябе там не ўдасца, прыходзь да мяне. У мяне ўдасца.

Мы ўвайшлі ў клець. Манька ўжо ляжала ў пасцелі. Братавая, сказаўшы «добрай ночы», пакінула нас. Я не ведаю, як падысці да Манькі, як распачаць з ёю гаворку. Стаю. У цямноце не бачу яе.

— Дык раскажы, Манька, як ты жывеш,— распачаў я гаворку.— Што новага ў цябе? Ці ёсць што ад Вусціна? Што чуваць наогул? Я ж нічога не ведаю. Раскажы пра ўсё.

І прысеў на ейны ложак.

— Я ведаю, што цябе цікавіць,— азвалася Манька.— Дуся цябе цікавіць, вот што. Яна чакае, чакае цябе, калі ты прыйдзеш да яе ў клець, дармо што да яе ходзяць іншыя.

— А вось я не да Дусі, а да цябе прыйшоў. Намацаў яе руку, трымаю.— Дуся мяне не цікавіць.

— Не веру. У цябе з ёй старая любоў.

— Прайшла, Манька, тая любоў.

Нахіляюся над ёй. Тулюся да яе шчакой. Прыпадаю да

яе грудзей. Змыкаюцца вусны. Адкідаю коўдру — Манька не працівіцца...

Я, доўга не быўшы, пайшоў ад Манькі з страхам, што зачапіў яе. Спяшаюся дахаты, а ў сэрцы балючая стрэмка: «Хто ж ходзіць да Дусі?»

Нядзеля. Нейкае вялікае свята, здаецца — Духаў Дзень, і я мог бы паспаць даўжэй. На працу ж не йсці. Але я не магу болей спаць — лезе ў сэрца Манька, трывожыць маё сумленне. Вырасла на руках маці, без бацькі. Рана пайшла з хаты на свой хлеб. Людзі выкарысталі ейную маладосць і недасведчанасць. Тое зрабіў і я? Хацела яна мяне дзеля свае жарсці, ці тут быў разлік — знайсці сабе жаніха? Але які з мяне жаніх? А потым Маньчыны словы: «Дуся цябе чакае, дармо што да яе ходзяць іншыя». Ці гэта Манька сказала знарок, каб я зрокся Дусі і заставаўся з ёю? Ці гэта на самай справе Дуся такая? Мне надта не залежыць на Дусі, але тое, што сказала пра яе Манька, глыбока кранула мяне. Мне сорамна цяпер за сваю колішнюю рамантычную, па сутнасці, мною выдуманую закаханасць у Дусю. Я знаходзіў у ёй тое, што хацеў знайсці. Яна адпавядала маім пошукам прыгожага, але ці была яна сама ўвасабленнем гэтага прыгожага, я тады не думаў. Я забаўляўся ёю, па-незямному прыгожай, па-нябеснаму чыстай і некранутай. З гэтым вобразам я пайшоў насустрач майму лёсу. Апынуўшыся ўжо на сваёй, наканаванай мне дарозе я надта й не думаў пра яе, ейны вобраз як бы адышоў ад мяне, быў заслонены маім пакутлівым існаваннем. Гэты вобраз для мяне набыў іншае, абстрагаванае значэнне. Каб магчы пераадольваць пакуты, насуперак ім, як выратаванне, паўставаў ужо вобраз зборны, абстрактны, неабавязкова канкрэтны вобраз Дусі:

Як думка аб табе мая мільгне,—
а думаю я пра цябе штодзень,—
ў тваім пакоі на сцяне
становіцца мой чорны цень.

І нерухомы ў постаці сваёй,
нябачанай табой нідзе,
над сумнаю тваёю галавой
ён гутарку з табой вядзе:

— Я не загіну ў небыцці,
мой след не змыць дажджам.

Я за табой прайду ў жыцці,
спакою я табе не дам.

— Мы — кветкі ў полі па вясне
жыцця на вогненным лагу.
Ты жыць не можаш без мяне,
як без цябе я не магу.

Бо ты — багіня на зямлі
і хараство, а ім,
як у палон мяне ўзялі,
павінен я жыццём сваім.

Маліцца хараству — закон,
закон адзіны мой.
Жыццё маё пастаўлена на кон —
і целам і душой я твой.

І думка да цябе мая імкне,
І як адыдзе ў вечнасць светлы дзень,
Становіцца ў пакоі на сцяне,
цябе вітаючы, мой сумны цень.

Створаны мной ідэальны вобраз я надзяляў пакутлівымі рысамі. Вобраз жыў маімі пакутамі. Мне патрэбна была ягоная татальная адданасць, гатовасць ісці за мною, калі трэба — і на смерць. І вось цяпер адданасць майго ідэальнага вобраза стаўляецца пад пытанне: «да яе ходзяць і іншыя». Ува мне ўзнялася цэлая віхура не гэтулькі рэўнасці, колькі шкадаванне сваёй адданасці гэтаму вобразу, што вёў мяне праз усе годы маіх пакутаў.

Вуліца наша ўся ў маладых, уткнутых у зямлю ля кожнай хаты, бярозках — сапраўднае свята. Раніца сонечная. Неба глыбокае. Паветра звонка-празрыстае. Жанчыны без сваіх мужыкоў насеклі сабе бярозак. А можа, не так для сябе, колькі для тых, каго няма. Бярозкі — гэта як бы жывая сувязь з тымі, што не дома. Бярозкі — іхны ціхі шэпат — гэта пасланне ім, размаўленне з імі. У нядзелю людзі чысцейшыя. Лепш убраныя. Больш лагодныя. Сонца ўжо высока, у самым зеніце. Дзень грае сваё, адвечнае. Яму здаецца, няма ніякай справы да людзей — свеціць, бліскотнае, і ўсё.

Гляджу ў вакно, і перада мною як на далоні — праз рэчку — Пиліпава хата. Нехта выходзіць з яе, нясе вялізны — укоптур — кошык. Стаўляе яго на зямлю, пад нацягнутай між двума слупкамі вяроўкай. Нагінаючыся,

бярэ з кошыка паасобныя рэчы і вешае — бялізна. Хто гэта? Не Хіма ж. Дуся? Такая вялікая? Не пазнаю. А мо гэта Эма? Не, гэта не Эма. Гэта ўсё-ткі Дуся. Нагінаецца і вешае. Нагінаецца і вешае. У прамежку спыняецца і пазірае на нашу хату. Я хаваюся за прыталкай. І зноў гляджу. Яна развесіла бялізну і з парожнім кошыкам ідзе назад у хату — я гляджу ёй услед, яна ідзе не азіраючыся, і мне здаецца, што сваёю спіною яна адчувае мой зірк і ні разу не аглянулася толькі таму, каб заінтрыгаваць мяне. Але, адумаўшыся, я палічыў такую сваю здагадку наіўнай, тым не менш у ейнай пастаці, у тым, як яна ішла — быццам выстаўляла сябе напаказ, стройную, танклявую, з прыгожым рухам у таліі,— я не мог не заўважыць ейнага намеру звярнуць на сябе ўвагу. Бо ж я дапушчаў, не — я быў упэўнены, што яна бачыла мяне ў акне і ўсёй сваёй істотай — можа, падсведама — выказвала сваю неабыякавасць да мяне. І я ўжо ўяўляю, як, дачакаўшыся вечара, я пайду да яе ў клець. Манька ж гаварыла, што Дуся спіць у клеці. Пайсці да іх цяпер, удзень, не адважваюся, баюся паказацца ў іх там, на вуліцы, тым больш не гатовы пайсці да іх у хату, як гэта, можа, трэба было б. Бацькі ж яе, канешне, ведаюць, што я прыйшоў, і, можа, чакаюць, калі я зайду да іх. Напэўна, пакрыўджаныя, што не йду.

Мае бацькі, безумоўна, чулі, што ўчора я прыйшоў дахаты позна, і глядзяць сёння на мяне нейкімісь іншымі вачыма. Бачу ў іх першую за гэты час стрыманасць да мяне.

На вуліцы поўна народу — жанчын, дзяцей, сярод іх — трох мужчын — гутараць, размахваюць рукамі, нешта даводзяць адзін аднаму. Не йдуць слухаць Вусатага Якава — што ён там вярзець? Мо прадказвае ўжо канец свету? Гэта бабскае дзела — яны вераць усяму. Ну й разяўляюць раты. (Вусаты Якаў, паставіўшы на сярэдзіне вуліцы свой маленькі столік, чытае бабам Біблію, і іх усё болей і болей падыходзіць да яго.) І калі паглядзець збоку — няма й гора: прыбраныя, заслоненыя бярозкамі хаткі, падмеценая вуліца, жоўты на ёй, пасыпаны на свята, пясочак, гульні маленькіх дзетак, пакора і спіушанасць. Але за ўсім гэтым — затоеная трывога, яна чытаецца ў вачох, страх перад невядомым, боязь, што вось у гэту ці ў наступную часіну нешта станецца. Зблізку, з лесу, даходзяць да слыху стрэлы і глухія выбухі — што б гэта мела азначаць?

Дзеці першыя заўважылі людзей на конях, калі тыя

былі яшчэ наводдалі. Нехта крыкнуў: «Партызаны!», і ў адно вокамгненне вуліца агалілася. Стаяць толькі строем бярозкі ды пакінуты Вусатым Якавым столік. Я зірнуў у вакно — яны! Сястра выпіхвае мяне з хаты на двор, а сама бягом — на вуліцу. Яна бачыць — б'юць, малоцяць прыкладамі вокны ў нашага суседа — паліцая, што служыць у Касцюковічах. Сястра ў страху — будзе тое і нашым вокнам. Ды партызаны, уваліўшыся ў хату паліцая,— громяць усё, што ў ёй ёсць. Не пакінулі нават печы. Селі на коні і зніклі гэтак жа хутка, як і з'явіліся. Нас не зачапілі. «Як гэта зразумець,— шапталіся вяскоўцы,— зямлю дзяліў, школу адкрываў, а не зачапілі. Звязь з імі мае, ці што?»

З двара я падаўся на могільнік, не таму, што баяўся тых партызанаў — хоць у рукі ім не хацеў пападацца,— а проста, каб некуды сысці, пачакаць, пакуль усё ўляжацца. Дый наш могільнік — гэта адно з маіх улюбёных месцаў. Яшчэ ў маленстве я часта хадзіў сюды на святы з маёй маці, часцей з маёй бабкай,— аглядаць нашыя могілкі, папраўляць, калі што было няспраўна. Асабліва я любіў хадзіць на могілкі на Радаўніцу. У гэты дзень могільнік наведвала ўся вёска. Кожная сям'я прыносіла з сабой што-небудзь з ежы, у тым ліку яйкі. Засцілаюць сваю магілку абрусам, стаўляюць на яго ўсё прынесенае і, згадваючы нябожчыка, запрашаюць яго частавацца разам з імі. Добра памятаю, як мы з маці аздаблялі маленькую магілку мае сястрычкі, што памерла, калі ёй не было яшчэ й году, і як маці сцішна расказвала пра яе.

На Радаўніцу на могілках калісьці было поўна моладзі. Моладзь любіла калыхацца тут на арэлях. На нашым могільніку ёсць некалькі магутных, гонкіх сосен, аброслых унізе шурпатай, а ўверсе гладкай карой. Некаторыя з іх, маючы вакол сябе досыць прасторы, працягваюць, як руку, свой даўжэзны і моцны сук.

За такі, на адпаведнай вышыні, сук прывязвалася двума канцамі — з прамежкам паміж імі на якіх паўметра — вяроўка. Унізе яна звісала паўкруглай пятлёй, у якую і садзіліся аматары пагушкацца, папярэдне падклаўшы пад азадак што-небудзь з свае апраткі. Калі вы ўжо селі, вы бярэцеся дзвюма рукамі за вяроўку, якую, узяўшыся за канцы, нацягнутую, трымаюць перад вамі двое хлопцаў. Гэтаю вяроўкай яны раскалыхваюць вас. Калі вы ўжо раскалыханыя, узлятаеце дастаткова высока, вы адпускаеце вяроўку, але хлопцы ўсё роўна не пакідаюць вас падкі-

даць угору, вы дасягаеце ўжо ўзроўню сука, за які ўверсе зачэплена вяроўка, крычэце: досыць! досыць! — тым не менш, асабліва калі гэта дзяўчына, вас шпурляюць яшчэ вышэй. Не ў штоніках, дзяўчына заціскае каленкі, просіць ратунку, ды знізу, пры кожным яе ўзлёце, жартаўнікі, наставіўшы да вачэй казырком руку, падглядаюць, што ў яе там. Мне прыйшло гэта на дум само па сабе, калі я прыглядаюся цяпер да сосен з велічэзнымі сукамі. У згадках пра гэта я самавыключаюся, не ведаю, дзе я. Аж бачу — на бабульчынай магілцы новы крыж. Кажуць, як памерла мая бабка, дзед амаль кожны дзень хадзіў на могільнік плакаць па ёй. Той факт, што дзед узяў цяпер сабе іншую бабку, выклікаў у мяне нейкую непрыязь да яго. Я пакінуў могільнік, пайшоў у кірунку школы. Дайшоўшы да яе, з узгорка, на якім яна стаіць, пабачыў на мосце пярэсты натоўп жанчын. Яны, апусціўшы галовы, глядзяць уніз, у ваду, прыглядаюцца. І хоць яшчэ я не прызвычаіўся быць на людзях, іду на мост. Толькі падышоў — з рэчкі вылазіць незнаёмы мне мужчына з хлопчыкам на руках. З моста кінуліся да яго жанчыны. Хлопчык мёртвы. Утапіўся. Мужчына палажыў яго на траву. Спрабаваў нешта рабіць з ім. Шкляныя вочкі застылі ў сваёй нерухомасці. Доўга не пазнавалі, але нарэшце дазналіся, чый гэта хлопчык. Пабеглі сказаць ягонай маці.

Жанчыны пачалі разыходзіцца. Усе яны з Мокрага Другога — ідуць дахаты. У іхнае Мокрае іду і я. Некаторыя з іх пазнаюць мяне або здагадваюцца, што гэта мушу быць я,— чулі ж, што сын Лявонавіча вярнуўся і ходзіць да Мельнікавай Манькі. Толькі рэдкія з іх прывіталіся са мною, але ніхто з іх не спрабаваў загаварыць са мной. Дзяўчаты шугнулі наперад і гуртом спыніліся на пляцоўцы, што называлася раней «Цэнтрам» — як відаць, нешта задумалі. Я іду таксама на гэтае, быццам лобнае для мяне месца. Іду, уласна, не ведаючы — чаго. Я нясмела, не сваёю паходкай буду праходзіць паўз дзяўчат, буду — невядома чаму — саромецца іх. Калі я міну іх, яны будуць глядзець мне ўслед, і, можа, якая з іх адважыцца выпаліць нешта такое, на што я не знайду адказу. Я хачу прайсціся паўз вокны Піліпавай хаты — можа, мяне заўважыць Дуся, а не — завітаю да іх сам. Старыя, думаю, будуць рады бачыць мяне. У іх вокнах я нікога не ўбачыў і вагаюся — зайсці ці не. Заходжу. Хіма і Піліп расплакаліся, пабачыўшы мяне, зменелага. Просяць праходзіць, не стаяць

у парозе. Хіма замітусілася, змахвае фартухом лаўку — рыхтуе для мяне месца.

— Дуські няма. Збегаю па яе. Сорамна табе, Масеевіч. Колькі часу ў хаце, а да нас і не ўступіў. Дзякуем, што во зайшоў. Пагамані пакуль з маім старым, а я зараз...

Выбегла з хаты.

— Ну куды яе халера пагнала? Дуська вон сама ўжо йдзець,— зірнуўшы ў вакно, нібы сам сабе сказаў Піліп.

Хвалююся — зараз Дуся ступіць на парог. Адчыняюцца дзверы — і першай уваходзіць Хіма, за ёю Дуся. З-за плячэй маці яна паспела ўжо секануць мяне сваім кароткім, ледзь улоўным паглядам: той жа позірк, строга ўзнятыя бровы, гулліва-цёплая ўсмешка. Хіма, увайшоўшы, адступілася набок, як бы даючы дарогу Дусі. Дуся сумелася, не ведала, як ёй быць, але, перамогшы сябе, падышла і падала мне руку. Я не затрымліваў ейнай рукі, і яна адышлася, стала побач маці, быццам чакала ад яе нейкай помачы.

— Але нічога, дзеткі, звыкнецеся,— паспяшалася сказаць Хіма і пачала сваю лёгкую гаворку.— Сядайце во за стол, трэба ж дарагога гасця прывеціць. Ну, а ты, стары, чаго маўчыш, як маўмыра, даставай, што я зберагла — не выпіў жа? А ты, Дуська, займі чалавека. Пакажы Масеевічу Ягоркавы фатаграфіі. Забралі ж і яго на вайну. Можа, ужо, крый Божа, няма і ў жывых.— Хіма выцерла фартухом слёзы.

Дуся дастала альбом і, стоячы, пачала гартаць яго, паказваючы мне здымкі.

— Ну чаго ж вы стаіцё? Сядайце ета за стол. Выгадней будзе,— парадзіла Хіма.

Мы селі за стол побач адно аднаго. Апрача нядаўніх Ягоравых з Эмай здымкаў, у альбоме былі і ранейшыя фатаграфіі, у тым ліку шмат Дусіных. Свае здымкі яна прапушчала хутка, смяялася з іх, саромелася сябе, ранейшай. А мне тыя здымкі падабаліся найбольш, хвалявалі, будзілі мае незваротныя часы. Дуся гартае й гартае. Мы бачым Ягора ў форме сяржанта, Эму — у прыгожай сукенцы, у капелюшы, з узнятым над галавой парасонікам. Бачым здымкі з Ягоравага вяселля. На іх Дуся не затрымліваецца — хутка прагортвае.

— А гэта ты тут! — упершыню загаварыла са мною Дуся. Дасюль яна гартала альбом моўчкі. Ейнае «а гэта ты тут» кранула мяне. Я чую яе вобак сябе і, паддаўшыся

гэтаму пачуццю, амаль не ўспрымаю таго, што яна гаворыць.

На стале ўжо традыцыйны ў вёсцы для госця пачастунак — яечня і паўлітра. Дуся з судніка дастае шклянкі. Калі яна выходзіла па іх з-за стала, я ўгледзеў у ёй усю жаночую прынаднасць. Дуся зноў села вобак мяне. Піліп разліў паўлітра на ўсіх нас чатырох, выдзеліўшы пры гэтым жонцы і дачцэ самую найменшую дозу. Узняўшы шклянкі, Хіма і Піліп прывіталі мяне з прыходам у іхную хату, паспачувалі маёй бядзе, але, сказала Хіма, дзякаваць Богу, што вытрымаў, вярнуўся цэлым і здаровым. «Будзь жа, Масеевіч, не толькі нашым госцем, а й нашым сем'янінам. Будзе з кім і нашай Дусьцы бавіцца. Дачакалася яна цябе, Масеевіч. Помніш, не забыў, як ты быў у нас у гразу і як ад страху Дуся, дзіцянё, ускочыла табе на рукі?»

— Ды пакінь ты, мама,— просіць яе Дуся.

— Ці гэта ты ачмурэла, выпіўшы, ці дурнота табе стукнула ў галаву? — раззлаваўся Піліп.

— Трэба ж нешта гаварыць, а не сядзець надуўшыся,— апраўдвалася Хіма.

— Дык няхай во чалавек ета й гаворыць. У яго ёсць пра што гаварыць,— не ўступаў Піліп.

— А што Масеевічу пра тое гаварыць? Лепш пра тое забыць. Ідзеце, Дуська, пагуляйце святам такім. Глядзіце, як людзі высыпалі на вуліцу. І мы з старым во куды выйдзем.

Дуся прапанавала пайсці ў «Цэнтр», але я не захацеў ісці туды — там, напэўна, будзе Манька. З хаты мы выйшлі на агарод, адтуль спусціліся на рэчку і хутка апынуліся ў зацішку, сярод вербалозу, на міжрэччы, на тым самым астраўку, дзе калісьці я любіў ляжаць у траве, слухаць пчаліны гуд, аддавацца спасціжэнню самога сябе і ўсяго існага навокал. Гэта тое самае месца, дзе мяне падглядала Дуся, падаравала сплецены ёю вяночак і прасіла, калі я не захачу ўзяць яго з сабою, пусціць яго на ваду, паглядзець, дзе ён, ля якога берага прыстане.

Ідзём. Украдкам аглядаем адно аднаго. Дуся ідзе вобак, надта не набліжаючыся да мяне. Ідзём, але няма болей куды ісці, і мы спыняемся. Закутак, ахутаны з усіх бакоў вербалозам, дрэміць у сваёй цішыні, дыша водарам нагрэтых разнаколерных траў, звініць ледзь чутнай музыкай розных казюрак. Сонца свеціць яшчэ на ўсю сваю паабедзенную моц. Напоенае духмянасцяй паветра, мляў-

кае і душнае, родзіць нейкае асаблівае адчуванне паўніны жыцця. Мы селі. Трава вышэй нас. Я рву травінку, па якой паўзе божая кароўка, паказваю яе Дусі. Яна ўсміхаецца, ейная ўсмешка яснее, свеціцца лагодай і любасцяй. Дуся падстаўляе свой пальчык, і божая кароўка перапаўзае з травінкі на ейны пальчык. «Я люблю ейны дотык»,— гаворыць Дуся. Выстаўляе мне кароўку на ейным пальчыку і гаворыць: «Знімі ў мяне яе». Я адказваю: «Ты ж любіш ейны дотык». І, зняўшы з ейнага пальчыка божую кароўку, бяру Дусіну руку. Цалую ў далонь. Ад гэтага майго дотыку вочы ў Дусі імгляцца, закатваюцца ў чуллівасці. Замёршы ў пацалунку, сцішна, нетаропка, яна замыкае мяне ў сваіх абдымках.

Мы доўга ляжым у траве. У нас няма страху, што нехта можа пабачыць нас.

Узняўшыся, Дуся папраўляе сваю святочную сукенку, пытаецца, ці што-небудзь на ёй відаць. І мы пайшлі. Зноў паўз рэчку. Дуся просіць мяне, каб я зайшоў да іх у хату, але я гавару, што мне лепей цяпер пайсці дамоў. Развітваючыся, Дуся доўга не адпушчала мяне. Абняўшы, цалавала і калі адпусціла, у ейных вачох стаялі слёзы, цяжка было зразумець — слёзы радасці ці засмучэння. Адыходзячы, я сказаў Дусі, што прыйду да яе ўвечары.

Калі я вярнуўся дахаты, сястра сказала мне, што, пасля таго як партызаны пакінулі вёску, да нас заходзіў нейкі чалавек, хацеў пагаварыць са мною, пытаўся, дзе я. Сказаў, што зойдзе пазней, увечары, але не сказаў, хто ён і якая ў яго да мяне справа. Сястра думае, што гэта нехта ад партызанаў.

Адведзіны незнаёмага чалавека ўстрывожылі бацькоў. Устрывожыла гэта й мяне, хоць, вярнуўшыся дахаты, з першага дня я зразумеў, што спакойна ў Мокрым я не пражыву. Праіснаваць між немцамі і партызанамі немагчыма. Мая нейтральная пазіцыя можа аказацца самай небяспечнай, але паколькі я заняў яе, я мушу і стаяць на ёй. Я хачу жыць. Я не жыў яшчэ. Я толькі пакутаваў, хоць пакуты — тое ж жыццё, можа, найвышэйшая форма яго праяўлення. Ды я не хачу пакутаваць. Мне дваццаць сем год, а ці жыў я? Не, я толькі рыхтаваўся жыць, жыць для нечага высокага, прыгожага. Дзеля гэтага высокага я бярогся ад спакусы ніжэйшым. Я, напрыклад, не кахаў, як кахалі іншыя. Я кахаў употайку, саромячыся прадмета майго кахання. Мае равеснікі кахалі інакш — яны збіралі ураджай з свайго кахання. Я жыў у мройнасці, яны — у

дзеянні. На подступах да свайго ідэальнага, дзеля якога я ахвяраваў сабой, я зазнаў паражэнне, самае вялікае ў маім жыцці. Я нікога не віню за маё паражэнне. У мяне няма нянавісці — яе пагасілі мае пакуты. Я мусіў бы ненавідзець партызанаў, але я не магу іх ненавідзець — я толькі баюся іх. У мяне ёсць падстава ненавідзець савецкую ўладу, але яна пагасіла ў мяне сілу супраціўлення ёй. Я хачу жыць. Настаў мой час жыць. Я не зважаю на тое, што дзеецца вакол мяне. Дый я не ведаю, што дзеецца. Забралі немцы Маскву ці не — мне ўсё роўна. Я не прагны да навінаў. Я паглынуты адным — сабою. Я нават не ведаю, што робіцца ў мяне пад носам — у Мокрым. Я ахутаны ўласнай глухатою. Адраблю на полі з бацькам дзень, і ўсё. Я не магу дачакацца вечара, калі я магу нырнуць у сцішанасць і патаемнасць начы. Выйду — навокал ні душы, усё ціха, ніхто нідзе не шамніць. Толькі ты сунешся, паглынуты цемрай. Ідзеш — куды хочаш, ніхто табе не перашкодзіць. Ты не думаеш, што нехта, стаіўшыся, можа, сочыць за табою — з вакна, з-за вугла, з-за дрэва. Ты думаеш, што вёска спіць. А яна не спіць. У ёй ідзе начное жыццё. У нейкай хаце вось цяпер, калі ты йдзеш, патаемна шэпчуцца, вядуць нараду, рыхтуюцца да нейкага дзеяння, можа, нат адліваюць на цябе кулю, а ты пра гэта не ведаеш — ідзеш, снуючы ў душы найлепшыя спадзяванні.

Я іду да Дусі. Наўпрасткі. Праз рэчку. Я думаю, што Дуся ўжо ў клеці. Чакае мяне. Уяўляю яе. Уяўляю нават, якая ў яе начная кашуля. Ціхенька стукаю ў дзверы. Яна адчыняе. Абняўшыся, ідзём да ложка.

— Я чакала цябе.

— І я цябе.

Лажымся. І няма грэху ўвайсці ў яе і любіць яе, узяць ад яе і даць ёй, замерці з ёй і зноў нарадзіцца — іншым, чымся ты быў. І ты ляжыш, і ты не хочаш адклейвацца ад яе, як і яна ад цябе. І, прасветленыя, свецімся — два ў плоць адзіну.

Дуся мне прызнаецца, што там, у міжрэччы, на астраўку, яна напачатку не хацела паддавацца мне. Пытаюся — чаму? Адказвае — каб не падумаў пра яе дрэнна. Не чулі — калі заснулі. Прахапіліся, калі праз шчыліны дзвярэй дабіралася ўжо да нас дзённае святло. Дуся, адчыніўшы дзверы, зірнула на бакі — ці няма каго. Я магу выходзіць. Цалуе, і я бягу праз агарод, на рэчку, дахаты. Увечары я буду зноў у Дусі.

Прыйшоўшы ад Дусі, я лёг спаць у сенцах. Прачнуўся позна, калі бацькі былі ўжо пайшоўшы на працу. У хаце заставалася толькі сястра, каб сказаць мне, што незнаёмы чалавек заходзіў да нас яшчэ раз. Я папрасіў сястру перадаць мне як найбольш дакладна ўсё, што гаварыў незнаёмы чалавек — чаго ён хацеў, хто ён, як ён выглядае. Сястра і пачала:

— Мы доўга чакалі цябе, не садзіліся вячэраць, думалі — прыйдзеш. А цябе ўсё не было. Мы й падумалі, што ты не хочаш бачыцца з ім. Не дачакаўшыся цябе, селі вячэраць, а ён — на парог! І адразу: Дзе ты? Бачыць, што цябе няма, пачаў насядаць на нас: вы сказалі яму, што я хачу пабачыцца з ім, што ў мяне ёсць да яго справа? Вы сказалі яму ўсё гэта? Сказалі, што я прыйду ўвечары, во цяпер, значыцца? Бацька спярша не ведаў, што яму адказаць. Сказаць, што мы сказалі гэта — было б нядобра для цябе: выглядала б, што не хочаш з ім бачыцца. Сказаць, што нічога пра гэта мы табе не гаварылі — нам было б нядобра. І бацька, замест каб адказаць яму на ягонае пытанне, узяў дый сам у яго спытаўся: а якая ў вас справа да яго? Незнаёмец раззлаваўся і зноў пачаў пытацца: дзе ты, прасіў нас знайсці цябе, сказаць, каб ты не хаваўся. А бацька на гэта яму — ты не хаваешся, нашто? Сказаў толькі, што ты пайшоў гуляць і недзе забавіўся. Незнаёмец не паверыў бацьку: «Ты мне не хітры,— сказаў. — Бачу цябе наскрозь. А свайму сыну перадай: мы хочам бачыць яго, гаварыць з ім і што для яго няма ніякай апасні. Калі ж ён падвядзе нас і яшчэ раз, пусць на сябе піняець. Буду ў вас зноў заўтра. Увечары». Сказаў і выйшаў, стукнуўшы дзвярыма. Вось, братка ты мой, і чакай вечара. Гэта ж сёння ўжо. І што дзелаць? Бацька не верыць яму, кажа, што яны хочуць згубіць цябе. Як так можа быць, казаў, у турму пасадзілі, а цяпер ты ім спатрэбіўся. Маняць! Я пайду цяпер маці дапамагаць лён палоць, а ты заставайся, братка, у хаце — думай, што рабіць, як з гэтага дзела вычапіцца. Наставіў ты многа людзей проці нас сваёю дзяльбою. Во йдуць палоць лён, а людзі будуць праходзіць міма і скоса глядзець на нас: «Каму як, а сабе выразаў дзе найлепш». Зайздросцяць, што ў нас лён удаўся, зацвіў усіма колерамі на дзялянцы, дзеля якой, ты ведаеш, спор быў — каму яе аддаць? Бацька падбіў цябе, каб гэтая дзялянка нам засталася. І ты так зрабіў. А трэба было аддаць яе каму іншаму. Не было б злабы. Жалаба на цябе пайшла і ў лес — даносяць

і туды. Дык во й прыходзяць цяпер з лесу. Я думаю, што чалавек, што быў у нас і прыйдзе сёння яшчэ — з лесу. Цяпер — ты пытаўся, як ён выглядае. Ды малады яшчэ. Крэпкі. Прысадзісты. У штацкім. Зброі ў яго не прыкмеціла. Ды па ўсім відаць — ваенны. Вось усё, братка, што я магу сказаць пра незнакомца. Думай цяпер сам, што рабіць — ці сядзець табе цяпер у хаце і чакаць незнаёмца, ці не паяўляцца. А калі не паяўляцца, дык дзе дзецца.

Сястра пайшла на працу, і я застаўся ў хаце адзін. Застаўшыся сам-насам, я вярнуўся да сябе самога — хто я? што я? У турме, на этапах, у Сібіры, на Калыме — усюды я быў «я». Я быў свядомым сябе, сваіх пакутаў. Яны ўзвышалі мяне, дадавалі мне моцы пераадольваць гэтыя пакуты. Яны гартавалі мой дух. У душы я нават быў горды за свае пакуты. Я ўсведамляў, адкуль яны былі пасланыя мне. Я ведаў, што пакутую не толькі я, а й цэлыя мільёны. Усведамленне далучанасці да пакутаў іншых дадавала мне мужнасці. Свае пакуты ты не лічыў дарэмнымі, яны будзілі ў табе надзею, што калі-небудзь яны дадуць свой плён. Які — гэта было для мяне туманна, але дзесьці, у падсведамасці, ты цешыў сябе, што й ты належыш да той катэгорыі пакутнікаў, да тых людзей, што нясуць свой крыж, спаўняюць сваю місію, у прыватнасці — песнярскую. Ты рыхтаваў сябе да нейкай будучыні, што — ты моцна верыў — усё ж некалі наступіць. Мільёны такіх, як ты, што ідуць разам з табою пад канвоем, што дзяўбуць, як і ты, скалу, што мёрзнуць і галадаюць, што, сігануўшы ўначы з сваіх верхніх нараў, павісаюць на вяроўчыне, імі самімі звітай,— мільёны такіх людзей, думаў я, не загінуць дарэмна, падрыхтуюць іншае заўтра. У душы тлеў, не сціхаў боль за бацькоў, што пакутуюць не менш, а можа, яшчэ й больш, чымся я. Туга па іх, нейкая віна перад імі, былі другой, асобнай пакутай майго пакутніцтва. Думаў, калі вярнуся,— вярнуся іншым чалавекам, дасведчаным, мудрым, здольным жыць па-новаму. А прыйшоў — дзе дзеўся гэты чалавек? Ён той самы, які й быў,— падуладны свайму хаценню. Застаўшыся ў хаце сам-насам, думаю пра пасланца. Вырашыў не чакаць незнаёмца. Чым бы ён мяне ні заманьваў, як бы ні пагражаў, я не хочу бачыць яго. Не для таго я пакутаваў, каб сустракацца твар у твар з чалавекам, што, можа, дапытваў мяне, гнаў мяне пад канвоем, чыніў мне пакуты. У мяне іншае наўме. Я хачу акунуцца ў маё прыватнае, якога ў мяне не было дасюль. Я чакаю вечара, я чакаю начы, калі ў

ейных лагодных, суцяшальных абдымках я знайду сабе забыццё ад маіх пакутаў.

Бацькі й сястра на абед не прыйдуць. Яны працуюць на самых аддаленых нашых дзялянках, за тры вярсты ад хаты, і каб не біць ног, магчы адпачыць на месцы працы, узялі з сабою полудзень. Мне прыкра, што не пайшоў на працу, сяджу ў хаце, што я ўсё-ткі — угоднік. Прыгадаўся брат, якога, прыйшоўшы дамоў, я не застаў і які невядома дзе цяпер — на вайне? Жыў ці ўжо няма на белым свеце? Бацькі сказалі мне — пакінуў хату, пайшоў і не падаў аб сабе ніякай весткі. Забалела сэрца па ім. Гэты боль хацеў выказаць у вершы, але далей радка «Адзавіся мне, родны мой брат» не пайшло: занадта гэта тэма кваліла мяне, была занадта датклівай, горкай. Колькі я ні хадзіў па хаце, шукаючы патрэбных словаў, не знаходзіў іх і, стомлены гэтымі пошукамі, абяссілены, пакінуў свае патугі. Спрабаваў чытаць, але й на чытанні не мог засяродзіць свае ўвагі — лезла нешта іншае. Сяджу, з хаты нікуды не выходжу, не хачу нікому паказвацца на вочы. Адчуванне такое, быццам я аблажаны ў сваёй роднай хаце. Калі гляджу ў вакно, што на вуліцу, бачу Піліпаву хату, ціхую, як бы стоеную ў сваім нейкім чаканні. У думках, у сваім адчуванні я ўжо там. Ці яна цяпер у хаце? Мусіць, не. Пэўна, цяпер з маці на полі. Чакае яна начы, як і я?

У выгнанні, побач беларускіх, я, бывала, складаў у памяці і вершы па-руску, асабліва калі нехта прасіў мяне аб гэтым. Маўляў, па-беларуску не так зразумела. Бяруся за алавік і схіляюся над паперай. Зрадзіліся хутка і лёгка радкі:

Она мне нравится. Она
неслышно входит в мою душу.
Желаний и огня полна,
Она меня и мучает и сушит.

И жмется сладко в тишине,
как бы боясь попасть другому.
Я рад. Я твой. Иди ко мне —
доступен я всему земному.

Але радкі гэтыя здаліся мне надуманымі, сухімі і штучнымі. Гэта не тое пачуццё, якое ў мяне цяпер. У сваёй уяве бачу Дусю больш спакуслівую, не выдуманую, а рэальную, даступную мне. Гэтая рэальнасць завалодала мной цалкам.

Пастух ужо гоніць з поля кароў, і маці прыйшла з поля першай, загнаць і падаіць карову. Сонца ўжо зайшло, і наступаюць сутункі. Я гавару маці, што мушу ўжо кудынебудзь пайсці — баюся, каб мяне не застаў незнаёмец. Вырашыў, гавару маці, не паказвацца яму. Маці толькі: «Як жа ты пойдзеш не еўшы?» Пра гэта, маці, не турбуйся, гавару. Вось што вам сказаць, як прыйдзе ён? Скажаце яму, што яшчэ не гатовы я да такой сустрэчы. Або, мама, і яшчэ больш ясна — скажэце яму, што я не хочу бачыць яго. Што ж тут хавацца. Я не хачу, каб ён чапляўся да вас. Я хачу ўзяць усё на сябе. Каб вы былі тут ні пры чым.

Выйшаў з хаты, перайшоў вуліцу. Ад вуліцы адразу ж пачынаецца спад на рэчку, і я не йду, а проста качуся ўніз, каб мяне ніхто не прыкмеціў. Я ўжо на рэчцы, сярод утульных хмызнякоў. Чакаю, пакуль пацямнее больш. Дый Дуся, пэўна, яшчэ вячэрае. Не гатова. Але мяне бярэ нясцерп. Пераходжу па кладцы рэчку. Узыходжу на ўзлобак — Дусін агарод. Станаўлюся пад яблыняй, што спусціла свае абцяжаныя галіны амаль да самае зямлі. Адсюль я пабачу, як Дуся будзе выходзіць з хаты ў клець. А калі і не пабачу, дык пачую, як яна стукне дзвярыма, зачыняючы іх за сабою. Я буду ведаць, што яна ў клеці. Ужо як мае быць сцямнела. Ужо час Дусі выходзіць. І вось — у іхнай хаце адчыняюцца дзверы. Дуся? Не. Чую гаворку Хімы: «Запазнілася падаіць цябе, мая ты кароўка. Нацерпілася, бедная». У даёнку цыркнулі першыя струмкі малака. Хіма канчае даіць. Заганяе карову ў хлеў. Гаворыць: «Ну цяпер табе, мая красулька, лягчэй. Ідзі спачываць». Бразнула клямка. Цяпер ужо, напэўна, Дуся. Так і ёсць. Хіма да яе: «Выпіла б кубачак малака нанач?» — «Не хочу, мама»,— гаворыць Дуся, і чую, як яна ўваходзіць у клець. Счакаў якую хвіліну і, упэўніўшыся, што Хімы ўжо няма на двары, з затоеным дыханнем, падыходжу да клеці. Стукаю ціха-ціха. Дуся, не пытаючыся хто, адчыняе мне дзверы, але, на маё здзіўленне, адразу ж адскочыла ад мяне. Пачуў, як яна бухнула ў свой ложак. Падыходжу да ложка ў кутку. Дуся сядзіць, прыціснуўшыся да сцяны. Хачу яе абняць. Прытуліць. Але яна не даецца, размахвае рукамі: «Ідзі да Манькі. У яе падушкі мякчэйшыя». І яшчэ больш ціснецца да сценкі, баронячыся ад мяне. Я ў сполаху. Я не ведаю, што сказаць. Я папаўся. Я мушу ратаваць і сябе, і яе. Кідаюся да яе. З усёй пяшчотай утуляю яе на сваіх грудзёх. Цалую.

Шапчу: «Мне так добра з табой. Я люблю цябе. Я нікуды не хачу ісці ад цябе. Ты навекі мая».

І Дуся мірыцца. Я апыняюся ў ейных руках. Спазнаю дасюль неспазнанае — вялікую пяшчоту, забыццё, слодыч неіснавання. Нам не хапае начы. Калі падкраўся дзень, мы й не прыкмецілі. За намі — спапялёная ноч. Сонечная раніца грае ўсёй сваёй прыгажосцяй. Пасля начы мы — як новыя людзі. Глядзім адно на аднаго. Усміхаемся. Бегчы дахаты мне позна. Дуся просіць пайсці з ёю да яе. І я пагаджаюся. Але баюся пераступіць парог ейнай хаты: як паглядзяць на нас. А Дуся хоць бы што — не саромеецца.

Ейная маці сустракае нас з усёю ветлівасцю і пашанай да мяне. Хімы я ўжо не баюся — не першы ж раз я ў іхнай хаце. Баюся Піліпа. Добра, што яго яшчэ няма цяпер у хаце — пайшоў у поле па каня. Трэба ж брацца за працу. Дуся дае мне вышыты ёю ручнік — умываецца. Ейная маці б'е на патэльню яйкі. Дуся засцілае стол. Яешня гатова. Хлеб і малако на стале. Садзімся снедаць. Толькі пачалі — уваходзіць Піліп. Зірнуў на нас за сталом. Ад сораму лепш бы праваліўся. Ён маўчыць. Пачынае закурваць.

— Ежце ж. Ежце ж, дзеткі,— гаворыць Хіма.— А ты, стары, што хацеў бы? Я табе згатую куляшу.— Смяецца: — Яешня ж толькі зяцям. Прывітаўся б хоць з дзецьмі.

Кулеш на стале. Піліп садзіцца побач мяне. Сіляе лыжкай кулеш. Студзіць. Дуся пытаецца, ці ён пойдзе касіць. Яна б разбівала ўслед за ім пракосы.

— Як «зяць» пойдзе са мною з касой.

Дуся глядзіць на мяне. Смяецца.

— Зяцьку ж нашаму трэба дахаты бегчы. Ён жа яшчэ не зяць.

— Ды я толькі гавару так. Няхай бяжыць. Не прывязваем яго тут.

Зірнуў на мяне, а я і не ўлавіў — як: спагадліва ці з дакорам. Ён жа ведае пра ўсё. І сядзець, не саромеючыся, з ім разам за сталом немагчыма. Піліп прыкмячае маю нязручнасць і загаворвае пра другое:

— Партызаны разгульваюць. Немца не баяцца. Сустрэў во Мельнічыху. Гаворыць — у Паповай Гарэ днямі паліцая з жонкаю расстралялі, а іхнае дзіця, грудное яшчэ, разадралі на дзве палавінкі. Прыбілі гэтыя палавінкі на вуглох яго хаты, каб ета ўсім было відна.

— Ну што ты пужаеш дзяцей. Нашто ета? К чаму? У цябе няма пра што газарыць? Гаворыш абы-што,— прыбіраючы стол, суцяшае нас Хіма.— Ты, Масеевіч, бяжы ўжо. Радзіцелі будуць беспакоіцца. А мы з Дусяй пойдзем сена сушыць, балазе пагода ўдалася.

У сенцах Дуся, абняўшы, гаворыць ціхенька, на самае вуха: «Глядзі ж, увечары не заблудзі мне да Манькі».

У сваёй хаце я ўжо нікога не застаў — ні бацькоў, ні сястры: пайшлі на працу. А я? Што раблю я? Куды йду? Куды прыйду? У хаце ўсё прыбрана, чыста, запалочана ранішнім сонцам, і ад гэтай упарадкаванасці мне яшчэ болей не па сабе, гэта мне як нейкі дакор, напамінак і няўхвала. А пакінутае для мяне на стале снеданне кранула да глыбіні. Гэта маці. Гэта яна. Гэта ейны смутак і клопат па мне. Не магу прыняцца за снеданне, не магу дакрануцца да яго.

Пайду пагляджу на двор, якія прылады яны ўзялі з сабою, куды, на якую працу пайшлі. Грабляў і бацькавай касы няма. Значыцца, пайшлі на сенажаць. Засталася вісець толькі мая каса. Я знімаю яе, бяру брусок, трапышку, іду дапамагаць бацьку касіць. Я ведаю, на якой нашай дзялянцы яны мусяць быць. Дапамагу маці і сястры зграбаць сена, вяршыць копы.

Паабапал дарогі, якой я іду, працуюць на сваіх дзялянках жанчыны з дзецьмі, узнімаюцца, дзівяцца касцу, што йдзе на працу такой позняй парой.

Я падыходжу да сваёй дзялянкі, але не бачу, каб бацька на ёй касіў. Разглядаюся. І бачу — у канцы дзялянкі, пад разложыстым вязам, сядзяць бацькі і сястра — напрацаваліся ўжо і селі адпачыць у халадку. Побач блішчыць на сонцы ўткнутая кассём у зямлю бацькава каса. Наводдалі відняюцца граблі. Пракосы раскінутыя — сушацца. Угледзелі мяне. Ад сораму я невядома дзе дзеўся б. Моўчкі ўтыкаю сваю касу каля бацькавай. Не магу пачаць гаворкі. Муляюся. Адчуваю сябе, як на якім судзе. Бацькі таксама нічога не гавораць. Выручае сястра:

— Не журыся, братуха. Сядай. Ты пайшоў з хаты, і толькі бяды, а якавота нам. Дзела дрэннае. Прычапіліся яны да цябе. Уз'еліся. Учора быў бы ты ў іх руках, каб не забавіўся. У засадцы сядзелі, цябе чакалі. Думалі, прыйдзеш жа. А ты, як знаў, не спяшаўся дамоў.

— Ды ты, калі ўжо ўзялася, раскажы ўсё па парадку,— незадаволеным тонам прамовіў бацька. Хацеў нешта яшчэ сказаць, але ўстрымаўся, дастаў з-за пояса кісет, пачаў

скручваць папяроску. Маці запыталася, ці еў я снеданне.

— Знаеш,— пачала сястра,— было ўжо позна, і мы думалі, што ніхто й не прыйдзе да нас, аж тут не адзін, а трое ўвалілася ў хату. І ты ведаеш, хто з імі быў? Мікола Бугроў. Наш тут павадыр. Зацяты камсамолец. Ён адразу ж: «Міколы няма? Хаваецца? Не хоча нас бачыць? Але не схаваецца. Знойдзем!» Сказаў і замоўк. Тады пачаў той, што ўжо быў у нас: «Сватаць больш не будзем. Сватанне скончылася». І да мяне: «Ану збірайся! Жыва! Паглядзім, наколькі ты дарага свайму брацiку». Штурхае мяне да выхаду. Я ў плач. А тут бацька: «Бярэце мяне! Я гатоў. А дачкі, прашу, не чапайце! Трэба я вам?» Тут уступіўся трэці, што з імі быў. Я так думаю — з тых лейтэнантаў, што былі ў нас на акопах. Відаць, главны ў іх. «Оставь ее!» — сказаў. Пачаў гаварыць да бацькі: «Ни ты, ни твоя дочь нам не нужны. Нам нужен был, повторяю,— был нужен ваш сын. Но, видно, он пошел не туда. Всякий разговор с ним прекращается. Запомните это!» І выйшлі з хаты. Я кінулася была да вакна — куды яны пойдуць, а яны — як расталі ці скрозь зямлю праваліліся. Бацька хацеў выйсці на двор, паглядзець, ці не затаіліся дзе, ды маці не пусціла бацьку. Знаеш, як гэта ўсё ўстрывожыла, напужала нас. Мы ўсю ноч не спалі. На ранку маці выйшла на двор за нейкай патрэбай, а тыя — прост перад ейным носам — як з-пад зямлі паказваюцца. І хоць бы што. Пералезлі праз нашае прасла, нічога не сказаўшы, пайшлі агародамі. Іх было толькі двое. Трэцяга не відаць было. Гэта ж яны хацелі цябе падпільнаваць.

Я маўчу. Слухаю сястру.

— Ну й што цяпер дзелаць? — звяртаецца як бы да мяне бацька. Яны не дадуць жыць. Хоць выбірайся адсюль. Цябе спаймаюць — не пажалеюць. Было ж сказана — не туды пайшоў. А куды ж табе йсці? Да іх? Дык ты ж у іх ужо быў пяць гадоў. Іх заела, што ты пачаў тут проці іх нешта рабіць. З'ехаў бы ты куды, ці што. У раёне знайшоў бы сабе нейкую работу. А нам тут усё роўна. Што яны з нас тут возьмуць? А не — дык і мы б да цябе перабраліся. Згары яно тут усё гэтае нашае хазяйства. Злыдня гэтага, немца, усё роўна прапруць. І будзе ўсё тое самае, што й было. Вырашай, сын.

Маці дастала з торбы полудзень — хлеб, яешню ў маленькім гаршчочку, бутэльку малака. Я сказаў, што я еў, і ўзяў толькі агурок. Бацька прагна запіваў ежу малаком, маці — вадою з біклагі. Мы з бацькам дакасілі наш лапік,

а потым дапамаглі скапніць згрэбенае сена. Вынеслі з топкага месца на ўзгорак скошаную траву на прасушку. Да вечара яшчэ заставалася часу, і мы пайшлі з бацькам у Скарнякоўшчыну нагледзець якую сасну на дошкі, каб потым уначы зрэзаць. Бацька хоча пакласці ў хаце новую падлогу. Дый трэба ж нейкі запас дошак на якую труну — спатрэбяцца. У Мокрым часта паміраюць дзеці і няшчасныя іхныя маці прыходзяць да бацькі з просьбай збіць на скорую руку труну. Бацька ніколі не адмаўляўся — грэх.

Дахаты ішлі моўчкі — ці бацька быў дужа зморany, ці думаў пра нешта сваё, я ж не ведаў, з чаго пачаць гаворку.

Я не магу ўседзець у хаце. Павячэраў — і выходжу. Што ў нас былі «госці», заглушана іншым — маім жаданнем быць у Дусі. І я іду да яе ў клецць. Учора яна мне сказала — на выпадак яна затрымаецца ў хаце, не будзе яшчэ ў клеці, я магу заходзіць туды сам і чакаць яе: дзверы будуць не на замку. Пераходжу па бервяне рэчку. Хоць ужо сцямнела, прабіраюся на Пілiпаў двор крадучыся. Я перад дзвярыма. Гэтыя дзверы для мяне сталіся ўваходам у нейкі патаёмны церам, дзе мяне чакае яшчэ нязведаная дасюль радасць і насалода. Дусі яшчэ няма, і, увайшоўшы, я кладуся на ейны ложак. Чую ейныя крокі. Дуся ўваходзіць. Я гавару, што я тут. Дуся падыходзіць да ложка, і я, не дачакаўшыся, пакуль яна будзе гатова, цягну яе да сябе. Ахвочыя, мы аддаёмся самім сабе. Дуся здзівіла мяне, калі, сцішаная, без ніякага на тое повaду, цалуючы мяне ў вусны, шэптам пытаецца, ці мне добра было ў Манькі. Я ніяк не спадзяваўся ў гэтую хвіліну згадкі пра Маньку. Не мог зразумець, ці Дуся дражніць мяне, ці ў яе нешта наўме. Не паспеў я адказаць ёй, як Дуся загаварыла далей: «Ейная братавая, што цяпер у іх, абзывае цябе самымі апошнімі словамі, вярзець усякую несусвецiцу, гаворыць, што ты сапсаваў Маньку, абяцаў узяць яе, цяпер адкінуўся і што табе гэта так не пройдзе».

Дусі ўся гэтая гісторыя баліць, і мне нялёгка было яе заспакоіць. Я было хацеў запытаць у яе пра яе ўхажораў, але ўстрымаўся, шкадуючы яе, гэткую безабаронную і дарагую мне. Не сказаў я Дусі й таго, што да нас прыходзілі людзі з лесу, дамагаліся сустрэчы са мною. Я адкладаў гэта на пазней. Не хацеў трывожыць яе цяпер, калі мы жывём адно адным, калі кожны дзень для нас наступае

толькі для таго, каб змяніцца на ноч, што зводзіць нас разам.

Ад Дусі я пайшоў дахаты, калі яшчэ добра не развіднелася. Лёг у сенцах і праспаў амаль да паўдня — мяне не будзілі. Усхапіўшыся, спужаўся, што ўжо позна і што не змог пайсці разам з сям'ёю на працу. Снеданне мне пакінулі зноў на стале. Чаму мяне не будзілі? Чулі, што я прыйшоў ужо раніцою, і далі мне паспаць? Ведаюць яны, дзе бываю я? Канечне ж, ведаюць, але ўдаюць, што не ведаюць, і ад таго яшчэ больш сорамна, брыдка і ніякавата. Такое палажэнне нязноснае. Я мушу калі-небудзь запрасіць Дусю да сябе ў хату, найлепей на якое-небудзь свята. Яна была ў нашай хаце малой, з братам і Эмай, а цяпер мне трэба паказаць яе, дарослую. Так будзе прамей. Чаго ж хавацца? Я ведаю, бацькі будуць супраць Дусі. Яна простая, наіўная і нераўня мне, скажуць. А я не думаю, якая яна. У той ейнай прастаце ўсё для мяне, у наіўнасці — уся звабнасць.

Пастух прыгнаў у вёску на час спёкі статак, і маці прыйшла з поля падаіць карову, зрыхтаваць для бацькі і сястры полудзень. Бацька ёй перадаў, каб я схадзіў па каня, запрог яго ў мажару і пазвозіў копы сена ў стадолу — будзе дождж. Я надта быў рады гэтай працы і да вечара звёз амаль усе копы з поля.

Пад час вячэры неспадзявана паказваецца ў дзвярах Агапка. Вітаецца яшчэ з парога: «Добры вечар вам у хату, людзі добрыя. Не перашкоджу вам?» — «Праходзьце. Праходзьце»,— гаворыць бацька. Агапка, ні на кога не глядзячы, толькі ўглядаючыся ў мяне, працягвае руку: «Ну дык прывітаемся, Мікола». Цалуе. У вачох слёзы. «Ты ведаеш, як я рада за цябе». Маці запрашае Агапку за стол, і яна сядае побач мяне. І ўсё глядзіць — то ў вочы, то на мае рукі. Я адчуваю сябе не свабодна, але свайго неспакою не выдаю. Сяджу, уважліва слухаю яе. І думаю — наколькі яна змянілася! Прыстойная і нават прыгожая. «Я сказала вам, Лявонавіч, што Мікола прыйдзе».— «Дзякаваць Богу, Агафія Дзямідаўна»,— адказвае ёй бацька. Я быў здзіўлены, што бацька так велічае яе. «Вось і прыйшоў»,— падагульняе Агапка. Цалуе мяне зноў. «Ну што ж ты маўчыш, Мікола? Нічога не гаворыш. Скажы, як ты тут прышчапіўся пасля Сібіру? У партызаны яшчэ не пайшоў?» Смяецца. А потым сур'ёзна і заклапочана: «Чула, што ты адчыняў тут школку, ды разагналі нашыя таварышы з лесу. А я вось усё вучу дзяцей (ведаеш,

я ж — настаўніца) у Вараноўцы, і мяне не чапаюць. Заглянi калі-небудзь у мой куток. Будзеш вялікім гасцём. А партызанаў не бойся. Зашчышчу». І ўсміхнулася мне, паказаўшы белыя, як часнок, зубы. «Дый мае табе зашчыты не трэба. Партызаны самі цяпер у вялікай бядзе, баяцца. Адшылі адсюль. Зашыліся ў лясох. Чулі ж, можа (Агапка зірнула, на бацьку),— нямецкія карнікі разам з нашымі здраднікамі прачэсваюць Бранскія лясы, ідуць, кажуць, сюды, да нас, знішчаюць усё на сваім шляху, паляць не толькі вёскі, а й людзей — нікому няма пашчады: ні старому, ні малому. Дзяцей кідаюць жыўцом у агонь. У нашым, Касцюковіцкім, раёне спалілі ўжо Дзяражню, Вішанькі, Бароўку, Кляявічы, Калодліва. Гэта ўсё партызанскія вёскі. Партызаны ж паўцякалі. А людзі пагіблі. А ты, брат, сядзіш тут... Ды я гэта так. Рада, бясконца рада, што ты вычапаўся. Я так перажывала за цябе. Насіла табе перадачу ў турму, ды не прынялі. Пісала во Лявонавічу, паведамляла пра няшчасце. Суцяшала. Падавала надзею, што прыйдзеш, не загінеш. І вось ты прыйшоў. Пасля нейкай паўзы: «Я таксама прыйшла. Толькі не падумай — што з турмы. Пад Мінскам настаўнічала і, як пачалася вайна, прытупала да бацькоў, як і ты, у нашае Мокрае. Кінула ўсё там... і — свайго мужа. Узялі ж у армію». Глядзіць на мяне: «Бачыш, я жанатая. Можа, ужо, крый ты Божа, і ўдава. А ты яшчэ не жаніўся?» Жартам адказваю і ёй: «Не знайшоў нявесты». Сястра кінула на мяне насмешлівы пагляд і гэтым выдала мяне.

Бацька вылез з-за стала, пайшоў у сенцы і вярнуўся адтуль з паўлітрам самагонкі. «Гэта, Агафія Дзямідаўна, у вашу чэсць. Хочам вас угасціць за вашую дабрату і прыхільнасць да нас». Разліў паўлітра па ўсіх, пастаўленых стаканах. Адмовілася піць толькі маці, але і яна ў знак пашаны да госці, узняла разам з усімі сваю шклянку. Тост, прызначаны да яе, Агапка адрасавала мне. Падзякавала бацьком за шчыры прыём. Бацька — я дзівіўся, наколькі змяніліся ягоныя дачыненні да Агапкі — абыходзіўся з ёй гэтак, быццам яна была ягонай нявесткай, што прыехала з сынам пасля доўгай адсутнасці. Бацька як бы хацеў мне гэтым сказаць: «Глядзі, во якога чалавека шукай, а не то што...» А я, выпіўшы, пачаў нервавацца, што пазнюся, і хацеў, каб гэта ўсё скончылася як найхутчэй. Баяўся я і таго, што могуць завітаць да нас і іншыя госці. І што тады? А гутаркы не было канца. Агапка была надта ажыўленай, ахвотна гаварыла з бацькам, усё

як бы адкладвала гутарку са мною, асобную гутарку. Нарэшце, бяседзе прыходзіць канец. Агапка, развітваючыся з бацькамі і сястрой, просіць мяне правесці яе. Яна бярэ мяне пад руку, шчыльна тулячыся. Часта спыняецца і на кожным прыпынку цалуе. Даходзім да ейнага двара. Запрашае ў хату, кажа, што бацька, пэўна, спіць. У хату я не йду. Горача тулю яе да сябе, яна — меншая за мяне — уся пада мною — як не апусціцца долу...

Развітваюся з ёй. Думаю — назаўсёды. Бягу наніз. На рэчку. Дуся чакае мяне. Хвалюецца, што пазнюся. Я люблю яе. Люблю ўсю: пругкія, чуллівыя — даткніся толькі — грудзі, гібкую талію, сарамлівую цнатлівасць, анёльскае, лебядзінае абымапне ейных рук, ахвочыя вусны, задуменна-радасны пагляд. Ускіне брывямі — пасланне небу. Усміхнецца — зойдзецца радасцяй сэрца.

Даходжу да Піліпавага агарода, што ўздымаецца над рэчкай невялічкім узлобкам. Бачу — на ім стаіць стажок сена. Учора яго яшчэ не было. У Піліпа няма сенавала, і сваё сена ён трымае ў стагох: у большым — на полі, у меншым — на агародзе, ля хаты. Знізу, ад рэчкі, стажок выдаецца мне стройным і высокім. Месяц — калі гляджу на стажок — цэдзіць над ім сваё святло, на самую макаўку, даймае, быццам падпальвае яе. Я іду на месяц. Бачу пад стогам зваленае сена, побач — парожнюю мажару. Мажара блішчыць і меркне сваімі з'езджанымі да бляску шынамі. Вось я ўжо каля стажка. Гляджу на Піліпава працоўнае месца — на граблі, уткнутыя цаўём у зямлю, на дрыўляныя вілы, якімі ён, мусіць, падаваў сена на стог, а Дуся, стоячы наверсе, падхоплівала яго, укладвала, утаптвала. Хацеў бы я паглядзець на яе, такую працаўніцу! Я ведаю, яна любіць стаяць з граблямі высока на возе ў касынцы, усміхацца. Паглядзець на яе там, на возе,— любата! Спрытная, прыгожая, зайздросная. «Ага, папаўся. Напужала?» Тузае: «Я чакала цябе, схаваўшыся за стогам. Хацела падгледзець, адкуль ты йдзеш». Шаламлівай, Дусі няма спыну: «У клець я цябе не пушчу. Заначуем пад стогам, на сене. Глядзі, як тут прыгожа! Якое духмянае сена! Тут усе краскі, якія толькі ёсць на свеце. Панюхай! Засохлыя, яны пахнуць яшчэ мацней. Слухай, што я табе скажу. Я працавала сёння разам з бацькам і маці цэлы дзень. Зграбала сена. Стаяла на возе. Бацька падаваў на вілах, а я брала ахапкамі, укладвала, утоптвала, каб не звальвалася з воза. Каб ты бачыў, якія прыгожыя, стройныя вазы мы ўмеем з бацькам ладзіць. Не верыш? Смя-

ешся? Мы калі-небудзь з табой паедзем па сена — пакажу!» Узбуджаная, Дуся не сціхае — што з ёй такое, думаю. «Вазілі сюды на агарод. Мяталі стог. Глядзі, які выйшаў! Я доўга цябе тут чакала, а ты ўсё не йшоў. Дзе быў? Я прыкмеціла цябе яшчэ здалёк — ноч сёння такая ясная ад месяца. Думаю — схаваюся. Напужаю цябе. Ці ж ты мог падумаць, што я тут стаю? Або пабачыць на нашым агародзе стог? Усё вырасла раптам — і стог, і я, і ты. Што ты глядзіш? Думаеш, здурнела дзеўка? Няпраўда, заначуем тут? У сене. Гэта ж так цікава і нова. Бачыш, я сёння новая. І ты для мяне новы. Усё нова. Месяц — і той новы. Я прост захмялела ад яго. Галава кружыцца — упаду!

...Мы ў сене. Дуся, як у забыцці, шэпча мне: «Юзік...» Цалуе: «Юзік... табе добра са мною, Юзік? Ляжы. Я цябе не адпушчу, Юзік».

Мы як бы ў глыбокім сне. Але толькі на адзін момант. Зноў абуджаемся. Месяц, падняўшыся вышэй, проста свеціць на нас. Дуся накрывае мне спіну сенам: «Каб нас ніхто не бачыў, Юзік. Толькі месяц. Ён глядзіць, што мы робім. Ты не бачыш яго сваёю спіною. А я бачу ўсё неба. Яно схіляецца над намі. Пасыпае нас зоркамі. А Бог з неба ківае на нас пальцам. Я трошкі баюся, Юзік. Але — не. З табою я нічога не баюся. Юзік».

Дуся сцішылася. Заснула на маёй руцэ. А я не магу заснуць. Ні разу не варухнуўся, каб не пабудзіць яе. Мне прыемна адчуваць яе вобак.

Месяц ужо за стогам. Па другі бок. Збляк. З паўзмроку — бачу — праступае мажара: раніца. Дуся пракідваецца: «А ты спаў, Юзік?» — «Спаў». Цалую яе. Пешчу. А яна: «Ты ўжо будзеш цяпер маім Юзікам... Я перахрысціла цябе на Юзіка».

Мне падабаецца ейнае «Юзік». Гэта яна вымавіла ў забыцці, у стане нейкай асаблівай пяшчоты і любасці. «Юзік» у яе атрымалася як нешта па-дзіцячаму лагоднае і далікатнае. Гэта нагадвала мне Дусю ейных «гусіных» часоў.

Нам час развітацца, пакідаць сваю духмяную пасцель. Гавару Дусі: «Ідзі. Трошкі здрымні ў клеці. Яшчэ рана. А я пабягу дахаты». Дуся й пытаецца: «А дзе цяпер твая хата, Юзік?» Смеючыся, адказваю: «У цябе».

Бягу ўніз праз рэчку дахаты. А ў хаце — засмучэнне. І маці, і бацька, і сястра былі ўжо падняўшыся. Сядзелі. Нічога не рабілі, як бы некага чакалі. Пэўна, майго пры-

ходу. Адразу ж паведамілі мне: «Можа, якую гадзіну назад партызаны павялі з двара нашу жаробку». Маці ў слязах: «Заб'юць на мяса. Не на работу ж. З гаршка карміла. Паіла. Гадавала і выгадавала злыднямь».— «Не чуваць, каб у каго яшчэ бралі што. Толькі ў нас»,— дадае бацька. «За калгас, за зямлю, за турму нам помста. Як бы пайшоў да іх у лес і з імі разам рабаваў — не чапалі б. А як жа табе йсці ў лес? Гэта ж такая абіда, што сцерпець нельга. Пасадзілі. Адпакутваў. Вырātаваўся, а цяпер — давай хадзі! Каб прыдушыць дзе».

Я супакойваю бацькоў як магу. Бацьком шкада жаробкі. Яна была ў нас, як дзіцё. Сядзем, бывала, дзе на полі пад час працы есці — і яна ўжо каля нас. Пакідае маці сваю — кабылу. Просіць есці. Язык так не скажа, як яе вочы. Гнедзенькая. Прыгожанькая. Толькі яшчэ ад матчынай цыцкі. Сысунец яшчэ. Бывала, калі бацька быў на начлезе з коньмі, прыбяжыць да агню. Ляжа спіною да бацькавай спіны. Грэецца, баіцца начы ці з удзячнасці да гаспадара. І вось цяпер няма. Як бы чалавека забралі ад нас. Асабліва заходзіцца маці па ёй. Яна болей за ўсіх хадзіла за ёй, і цяпер яна не магла ўявіць сабе, што яе з'ядуць.

Бацька бачыў у вакно, як партызаны, не заходзячы ў хату, ішлі на двор. «Чаго гэта,— думаў ён.— Што ў мяне на двары? Адна кляча. Дык ім жа яна ні да чога». Не выходзіў з хаты. Чакаў, што будзе далей. Аж бачыць — вядуць жаробку. Бацька з хаты. Просіць пакінуць яму жаробку: «Навошта яна вам такая маладая?» Партызаны — усё невядомыя людзі — і слухаць не хочуць. Вядуць. Бацька ўсё ўпрошвае. А адзін з іх: «Ідзі, стары, спаць, а то й цябе павядзём». Яшчэ й дадаў: «На вяровачцы». «Бачыш, сын,— звярнуўся да мяне бацька,— нам помсцяць. Ты ў турме сядзеў — ужо ты чалавек для іх не свой, а я «зажыўся». Маё дабро коліць ім вочы. А таго не хочуць знаць, што тое маё дабро з мазаля майго, з майго поту, з майго нядосыпу. Дык вось цяпер і йдуць за тым маім дабром. Ета ж, канешне, свае падказалі. Наслалі на нас. Але гора горам. Горам не пракорміпіся. Жывому — жывое. Паедзем у Супырыцу закладваць стог. Пагода будзе харошая. Ідзі запрагай кабылу. Бяры жэрдзь, вілы, граблі, вазавую вяроўку, пілу, тапор. Маці з Дар'яй прыйдуць пазней. А мы тым часам зробім стажарышча».

З працы дахаты прыехалі поцемкамі. Селі за стол, а ў хату — як нейкі прывід — Вяркееў. Прывітаўся і смела

да стала. Згроб мяне ў свае лапы, тармосіць за плечы, глядзіць у вочы: «Пазнаю. Пазнаю. Той самы. Выздаравеў? Ці не? Ну, не злуйся. Вітаю з паваротам. Рады бачыць цябе, Мікола. Рады, што цэл і неўрадзім».

Прывітваецца з бацькам, з маці, з сястрой. «Даўно не бачыліся, Лявонавіч, а? Я ўжо не гавару пра Міколу. З ім гадкоў з пяць. Ці не так? Але паглядзеце, Лявонавіч, ён цяпер рыхтык сібірскі чалавек. Падужэў целам». І да мяне: «Спадзяюся і — духам. Я ў пільнай справе да цябе, Мікола».

Тым часам мы ўсадзілі Вяркеева за стол, і я пабачыў знаёмага мне чалавека — энергічнага ў рухах, жывога, рашучага, можа, трохі пастарэлага і агрубелага абліччам. Не ведаючы яшчэ, як мне паставіцца да яго, стараюся быць стрыманым, але не магу — нешта мяне трывожыць, я рады і не рады яго прыходу, ведаю, што не дзеля нашай нейкай дружбы завітаў ён да нас, да мяне.

— Не шкодзіла б і выпіць за Міколу, ды няма болей капераціву ў Мокрым.

Бацька вылазіць з-за стала. Ідзе ў сенцы. Вяртаецца адтуль з пляшкай гарэлкі.

— Узнаю Лявонавіча! — Вяркееў загарэўся. Пацірае рукі.— Але аднэй гарэлкай, Лявонавіч, Мікола сёння ў мяне не адкупіцца.— І як бы спахваціўшыся:— Няма чым зацемніць вокны. А то яшчэ які паліцай нарвецца. Хоць з Міколам мне не страшна — гэта ж яго цяпер улада,— засмяяўся.

Уквелены, я адказваю яму:

— У мяне не было і няма ніякай улады. Улада твая.

— Ну чаго ты ўспетушыўся,— жартую.

Бацька разліў у шклянкі гарэлку.

— Ну дык за што вып'ем? — узняўшы шклянку, пытаецца Вяркееў.— Я ўсё-ткі за Міколу. За яго пакуты.

— Ды так жа,— адказаў бацька.

Выпілі за «мае пакуты».

Бацька й пытаецца:

— А дзе ж вы січас, Сямёнавіч?

— Я не хаваюся, Лявонавіч,— у лесе, у партызанах, у партызанскім штабе. Напужаў?

— Ды не. Чаго ж? Ета ўсё харашо, а вот адбіраць, Сямёнавіч, у людзей — што б там ні было — не гадзіцца.

— Мы не адбіраем, Лявонавіч. У вас мы ўзялі што-небудзь?

— Узялі. Сёння ж.

— Што ў вас узялі?

— Кабыла нядаўна ажарабілася, дык дзяцёнка ад яе аднялі. На мяса! На што ж болей? Прагаладаліся?

Бацька сказаў гэта з'едліва, і Вяркееў не ўзлюбіў:

— Так, мы церпім і голад, Лявонавіч. Не сакрэт. І калі нам нехта не спагадае, не хоча дапамагчы нам, мы і — адбіраем. Скажу вам больш — і забіваем. Бо забіваюць нас. Пашчады нікому, хто стаў на бок ворага.— Зірнуў на мяне: — Ты не вораг! Да ворага я не прыйшоў бы і не сеў бы за стол. Не прыняў бы пачастунку.

— А вот жа ўпяклі чалавека ў турму. За што? Вораг? І цяпер, калі чалавек прыйшоў, дык зноў пагражаюць. Спакою німа. Чалавек не начуе ўжо ў хаце. Мусіць хавацца.

— Хто пагражае?

— Вашы ж.

Вяркееў перапыніў гаворку з бацькам. Звярнуўся да мяне:

— Бачу, тут нейкае непаразуменне, Мікола. Хачу пагаварыць з табою сам-насам. Лявонавіч, выбачайце. Мы выйдзем з Міколам. Пагаворым. Прагуляемся.

Маці й сястра трывожна пераглянуліся міжсобку, а бацька:

— Ідзеце сабе. Вы свой чалавек і, можа, што парадзіце нам.

Мы выйшлі на двор.

— Ты не бойся мяне. Я цябе не здраджаў. Спадзяюся, і ты не здрадзіш мне. Куды пойдзем? Куды-небудзь набок. Дык хто табе пагражае?

— Прызнацца, дакладна не ведаю хто. Напачатку нехта прыходзіў уначы адзін. Хацеў мяне бачыць, гаварыць са мною. У хаце мяне не было, і я не ведаю, хто гэта быў. Ён гаварыў з бацькамі. Прызначыў мне спатканне на наступную ноч. Прыйшоў зноў. Мяне зноў не было. Я не хацеў яго бачыць. Прызначыў мне і трэцяе — апошняе спатканне. Я не прыйшоў і на гэтае спатканне. Было іх ужо трох, з Міколам Бугровым на чале. Ты ж ведаеш яго. Хацелі замест мяне ўзяць сястру. Перадумалі. Нехта з іх сказаў бацьку, што «отныне всякая связь с ним (гэта значыць са мною) прекращается. Пусть он запомнит это».

— Здорава. Здорава. Хто ж гэта так мог адчыканіць,— нібы здзівіўся Вяркееў.— Дай падумаць. З нашых, мясцовых людзей, так ніхто не скажа. Гэта ўжо нехта з чысцюсенькіх рускіх, з прыезджых. Але пастой! Пастой! Здагад-

ваюся! Гэта ж каломенскі інтэлігенцік! Быў тут у нас такі спец па акопах, прысланы з раёна. Стаяў у Піліпа. Але чаму ён быў з Бугровым? У Бугрова ж, наколькі нам вядома, толькі свае, тутэйшыя людзі. Бугроў, каб ты ведаў, пакінуты тут для мясцовых аперацыяў. І ты, дарэчы, асцерагайся яго, каб цябе ён не падпільнаваў. Ты ж, здаецца,— нам усё вядома — ходзіш да маёй Дуські! Малайцом! Я ўхваляю. Напасціўся ж. Але Бугроў — твой супернік. Уліп у тваю Дуську па самыя вушы. Дамагаўся ўзаімнасці. А тая, знай — адбрыквацца. Хацеў забраць яе ў лес, ды яна — ні ў якую. І гэта заела яго яшчэ больш. Дык глядзі — чалавек ён шалёны. Ёсць пагроза для цябе і з другога боку — з боку каломенскага інтэлігенціка. Ён паляваў за Дуськай. Не ведаю, ці ўпаляваў. Ты пра гэта мусіш ужо сам ведаць. Я перад табой, Мікола, на чыстую — не гневайся! Мы з табой усё-ткі сябры. Не хачу я выклікаць у цябе і рэўнасці. Навошта яна, тая рэўнасць? Дуся — добрая дзеўка, і табе, думаю, яна — якраз. Наслаждайся. Вось я гавару гэта і ў думках разматваю клубок далей. Думаю, і каломенскі інтэлігенцік (выбачай, не сказаў табе — ён сам з Каломны) нездарма тут. Невыпадкова ён быў з Бугровым. Ён заадно з ім. Тут, думаю, справа Дуські. Дык глядзі. Пужаць цябе не хочу. Але беражыся. Па-мойму, найлепшы выхад для цябе — узяць Дусю з сабой і да нас. У штаб. Ты да зарэзу нам патрэбны. Няма каму газету рабіць. Лістоўкі састаўляць. Лістоўка — ты ведаеш — не менш дзейсная, чымся аўтамат. Я разумею цябе — прывязаўся да маладой спадніцы. Але ж трэба нешта рабіць і большае за спадніцу. Што ты тут выседзіш? Нічога. Ды каб жа яшчэ — нічога: таго глядзі, галавой накладзеш. Разумееш, пад маркай партызана ходзяць і банды. Над імі мы кантролю не маем. Удзень такі партызан сядзіць у лесе, а ўначы выходзіць рабаваць, а то й забіваць. У лепшым выпадку спіць у якой-небудзь салдаткі. Бойся, Мікола, такіх «партызанаў». Ты сядзіш тут і, думаю, нічога не бачыш, што дзеецца вакол цябе. Тут можа быць чыста асабістая помста. Я цябе, паўтараю, не пужаю і не агітую. Я толькі раскрываю табе вочы. Ты можаш стацца нявіннай ахвярай. А пойдзеш да нас — зберажэшся. Гарантыі, канешне, няма. Але шансы выжыць у нас у цябе большыя, чымся пад крылом Дусі.

Вяркееў гаворыць і гаворыць, і я не перапыняю яго. Толькі чакаю, калі ён скончыць. Я нават не ўсё ўспрымаю, што ён гаворыць. Я заняты сваім. Не тым, што я

чую. Уявілася, што гэта Вяркееў зноў выпраўляе мяне ў дарогу, як некалі пяць год таму назад, калі мы з ім у сасонніку адзначалі мой ад'езд у Менск і калі дзеля такога важнага моманту ён пёк яешню, узнімаў шклянку і гаварыў: «Праводжу цябе ў дарогу, якой бы яна ні была. Трымайся! Гартуйся ў бядзе! Весяліся ў шчасці! Я табе не вораг». Але цяпер мне не падабаецца, калі ён прыгадвае Дусю, Бугрова, каломенскага інтэлігенціка. Я хачу, каб ён скончыў са мною гэтую гутарку. Не пераконваў мяне. У ягоны штаб я не пайду.

Але Вяркееў не сціхае:

— Што ты сядзеў — гэта ўжо не загана. Гэта ўжо не пляма. Яна змыта тваімі пакутамі. Ты чысты. Ачысціўся. А галоўнае — ты не пайшоў на службу да ворага. Гэта галоўнае цяпер. Гэтым ты забяспечыў сабе права грамадзянінам называцца. І як гэткі, гавару,— ты нам больш чым патрэбны. Скажу табе больш — наш з табою ўпаўнаважаны заклікае цябе. Я, калі хочаш,— ад яго. Дый незалежна ад яго. Я страшэнна хацеў пабачыцца з табою. З бацькам тваім — не менш. Зойдзем да цябе яшчэ ў хату. Узгоднім усё з тваім старым. Ты не канешне мусіш збірацца цяпер, у гэтую хвіліну. Табе трэба як след падрыхтавацца, усё абдумаць і ўдакладніць. Мы забяспечым цябе ўсім. Транспартам таксама. Нашыя сувязныя дапамогуць табе. Прыйдуць у вызначаны табою час і забяруць. Разам з Дусяй. Меры перасцярогі будуць захаваныя. Нас цяпер цісна, але дармо... Пераседзім. Пакуль падкінуць зброю, медыкаменты і іншае забеспячэнне. Збудавалі ўжо і аэрадром. Чакаем першага самалёта адтуль, з Вялікай зямлі.

Падыходзім да нашае хаты. Вяркееў і пытаецца: ну дык і як? Я ж маўчу, і гэта ён успрымае, як адзнаку, што я знаходжуся ў стане вырашэння пастаўленага ім перада мною пытання.

Уваходзім у хату. Бацька яшчэ не лажыўся. Чакаў на нас.

— Ну вось, Лявонавіч, мы й вярнуліся. Я прыйшоў з вамі развітацца. Мне пара назад. Мяне чакаюць і мо турбуюцца, што мяне доўга няма. Мы з Міколам усё абсудзілі і прыйшлі да заключэння, што яму ляпей пайсці да нас. Будзе вам зацішней і яму спакавальней. Думаю, Мікола згодны са мною (Вяркееў зірнуў на мяне). Вы тут мяркуйце, абдумвайце. Гэта ж, канешне, не з бухты-барахты. А мы — калі што — заявімся адразу ж. Была б толькі вашая згода. Мне ж пара. Сігналізуйце.

У поспеху Вяркееў абняў бацьку і ў нейкай нечаканай расчуленасці загаварыў:

— Заставайцеся здаровы. Калі зноў пабачымся — невядома. Усяк можа быць. Ці пабачымся.

Абняў яшчэ раз. Пацалаваў.

— Ну, а ты правядзі мяне з хаты.

Ужо за дзвярыма спытаўся:

— Даеш мне слова? Гавары цяпер! Я мушу вярнуцца з нечым канкрэтным — так ці так.

— Дай падумаць, гавару.

— Значыць, хітрыш? А я думаў, што ты ўзмужаў. Аж бачу — не. Ну, думай. Думай. Але часу ў цябе не шмат.

Моўчкі паціснуў мне руку і матнуўся ў цемру гэтак хутка, што я й не прыкмеціў, у які бок ён шмыгнуў. Думаю, што ён спяшаўся яшчэ зазірнуць да Акуліны.

Дуся мяне чакала доўга. Не спала. Думала, што ўжо не прыйду і непакоілася маёй адсутнасцяй. Яна ўчула мае крокі яшчэ на двары, і не паспеў я падысці да дзвярэй, як яна адчыніла іх, упэўненая, што гэта я. Ужо ідучы да яе, я ўяўляў яе ўва ўсёй ейнай спакуслівасці, і калі яна, зачыніўшы за мною дзверы лягла, утуліўшыся, побач мяне, раскрытая і ахвочая, жарсць і любасць спазнання яе закрэслілі ўсё ў маёй памяці. Шчаслівыя, у забыцці, мы праспалі да самае позняе раніцы.

Выходзім з клеці, а на двары — Дусіна маці. Сыпліць з падолу курам зерне. Глядзіць на нас. Нічога не гаворыць. Дуся падбягае да яе. Абдымае:

— Мамачка. Галубка. Юзік ходзіць да мяне. Не асудзі. Мы спім з ім у клеці.

— Які табе Юзік?

— Гэта я так цяпер Міколу заву.

— Ну дык вядзі свайго Юзіка з клеці ў хату.— І ўжо да мяне: — Ідзі, Масеевіч, паснедаеш у нас.

Засаромлены, іду з Дусяй у хату. Яна мне гаворыць:

— Маці цябе любіць.

Падае мне ручнік, мыла. Просіць умыцца.

Мы за сталом. Хіма пячэ ячныя бліны і кідае іх нам на талеркі. На гарачыя, мы кладзем на іх кавалачкі housepaтопленага з сырам масла. Масла на бліне хутка растае, і мы, каб яно не сцякала, спяшаемся есці, згаладалыя і прагныя да такой смакаты.

Сорам мой праходзіць. Я абвыкся. Хіма, можна сказаць, благаславіла нас. Піліпава хата робіцца маёй хатай.

Паснедалі. Дуся вядзе мяне паказаць за шырмай сваю святліцу. Сапраўды, бачу прыгожа ўбраны куток: ложак, пакрыты прасцірадлам хатняга вырабу, з гарой падушак у галавах, столік, з кветкамі на ім, палічку з кніжкамі, Ягораву з Эмай фатаграфію на сцяне. Дусіна святліца — гэта той самы куток, дзе яна калісьці хавалася ад грому, накрываючыся дзяругай. Вакно, што выходзіць на агарод, надае Дусінай святліцы радасны выгляд, асвятляе яе святлом нейкай асаблівай дзявочай чысціні і дбайнасці. Калі я зірнуў у гэтае вакно — дакорам блiснулі насупраць за рэчкай вокны нашае хаты: «Зрокся ўжо, знайшоў сабе гняздо. Табе даражэй стала чужая хата».

У хату ўваходзіць Піліп. Ён ужо накасіўся і прыйшоў паснедаць, адпачыць. Стомлены, хмуры, ён як бы незадаволены маёй прысутнасцяй. Ды, паснедаўшы, памякчэў, злагаднеў, сам зачапіў мяне:

— Чуў, можа. Немцы спалілі Кавычыцы. Загналі ўсіх — і старых і малых — у каго не было дакументаў, у калгасную абору і падпалілі. Жыўём згарэлі. Нямногія ўцалелі. Немцы б'юць сабе, а партызаны сабе. І як тут быць чалавеку. Адных бойся і другіх бойся. У каго ж у нас тыя дакументы? Ні ў кога няма. А няма — значыць, партызан. Таго глядзі, што й да нас дабяруцца. Праўда, тут арудуюць свае. Немца не баяцца. Дзействуюць адкрыта. Свадзьбы гуляюць. Скот рэжуць. Хлеб па млынох мелюць. Ваююць, называецца. Не шкодзіла б пужнуць і іх. Паймелі ўжо сілу.

— Не кажы, Піліп, дастаецца і ім. Пад Калодлівам вон іх закуталі ў лесе і ўсіх перадушылі. Іх болей гіне, як немцаў. Дык яны й помсцяцца хоць на сваіх. Паліцая якога зловяць — забіваюць. А што той іншы паліцай. Вінтоўку немцы далі, партызаны вокны выбілі — ён і кінуў вінтоўку. Хаваецца дзе па кутках ці ў лес падаўся да партызанаў.

— Што нам тыя партызаны. Трэба сябе глядзець...

У словах Піліпа я адчуў як бы перасцярогу сабе. Заспяшаўся. Пачынаю развітвацца. У маёй паспешлівасці Дуся вычула нешта трывожнае для сябе і праводзіць мяне да самае рэчкі, распытваючы, чаму я так раптам спахмурнеў.

Я думаю, як мне быць. На заклік Вяркеева я не пайду. Прынцыпова. Я не веру ім. Я баюся іх. Я чакаю перамогі над імі. Я хачу, каб лясы былі ачышчаныя ад іх. Я нічым не хачу дапамагаць ім. Я не хачу быць пад іхнай уладай. Я не магу пайсці да іх. Я хаваюся ад іх. Пабачу якога конніка з чырвонай зоркай у шлеме і вінтоўкай за плячыма — мярцвею ад страху. Як я магу аддацца пад уладу гэтай зоркі? Я доўга хадзіў пад ёю, і я баюся яе. Яна трывожыць мой сон. Я хачу, каб яна знікла, не блішчэла. Але яна не-не дый паяўляецца зноў, пужае сваёю чырванню, ад яе вее смерцяй. Я спадзяваўся, што хутка ёй надыдзе канец. Аж не — яна зіхціць. Яна бярэ верх, хоць у гэта я не хачу верыць. Я спадзяюся, што яна згасне. Я жыву спадзяваннямі. Жыву вераю. Я шукаю пацвярджэння сваёй веры. Не хочу прызнаваць усяго таго, што не пацвярджае мае веры. Я не ведаю, што робіцца на франтох. Да мяне не даходзяць ніякія газеты. У мяне няма радыё. Я не веру, што нашы адбілі назад той ці іншы горад. Я прывык, што чырвоная зорка хлусіць. На нашым полі іхны самалёт скінуў цюк лістовак «убей немца!». У гэтых лістоўках доўгі пералік атрыманых над ворагам перамогаў. Я не магу гэтымі перамогамі радавацца. Я не хачу ў гэта верыць. Мяне гэта засмучае. Гэта для мяне пагроза. Я апынуўся ў пастцы. У мяне няма з яе выхаду. Я — нічэй. Я ненавіджу і гэтых. Яны падманілі нас. Мы дарэмна ім паверылі. Ненавідзячы іх, я ўсё яшчэ жадаю ім перамогі. Не ведаю чаму. Яны ж для мяне не абаронцы. Пярэймуць дзе на дарозе — бяспашпартнага, мяне расстраляюць. Я для іх — партызан. У мяне няма выхаду. І я думаю, як мне быць. Якое прыняць рашэнне. Хоць рашэння прыняць я не хачу ніякага. Я ўнікаю гэтага. Адганяю ад сябе нават самую думку пра рашэнне. Прыняць рашэнне — гэта значыць перарваць усё тут. Пакінуць усё тут. Уцячы? Куды? Да каго? Я раскажу Дусі пра маё палажэнне, пра наша з ёю палажэнне. Яна, думаю, не ўсведамляе небяспечнасці майго дый ейнага палажэння. Яна нічога не ведае. Яна ўся ў аддачы, у плыні, што захапіла яе, уся ў здзяйсненні сябе як жанчыны. Я раскажу ёй пра адведзіны мяне, пра ўсё чыста, у тым ліку, канешне, пра Вяркеева. Распытаю пра Бугрова, пра «каломенскага інтэлігенціка».

А калі прыйшоў да яе, чамусьці не мог пра ўсё гэта гаварыць з ёй. Не хацеў яе нічым трывожыць, парушаць зраўнаважанасці яе душы. Я падумаў, што такой гавор-

кай я спужаю яе і азмрочацца нашы дасюль нічым не азмрочаныя дачыненні. Я нічым не хачу парушаць гармоніі, што ўстанавілася паміж намі, у нашым з ёю сужыцці. Тым больш што Дуся надзвычайна чуткая да самага найменшага зруху мае душы, ловіць, пераймае кожны мой уздых. Яна можа, напрыклад, сказаць, што ў мяне сэрца сёння б'ецца не так, як учора. Або што я пацалаваў яе не з такой жарсцяй, з якой, на ейную думку, я мог бы.

Не, я адкладу сваю гутарку з ёй на пазней. Стаіўшыся, ляжу ў яе пад бокам. Яна пытаецца:

— Юзік, ты не спіш? Чаму? Ты думаеш? Я чую — ты думаеш. Ты незадаволены мною? Нешта ў цябе непрыемнае? Па духу тваім чую. Скажы мне, Юзік, што з табой? Не хочаш гаварыць? Я паслухаю тваё сэрца. Можа, яно мне нешта скажа. Не, маўчыць. Б'ецца няроўна. Юзік, ты не любіш мяне? — Абдала духмяным прыбоем сваіх валос. Цалуе.— Юзік...

Я ціха тулю яе. Прыпадаю да яе, сустрэты ейным энергічным захопам мяне.

Дуся ўжо ні пра вошта не пытаецца ў мяне. Сцішна ляжыць, абняўшы мяне за шыю:

— Я сплю, Юзік...

Раніцою мы йдзём да яе ў хату. У хаце стаіць куродым. Хіма нешта пячэ на сняданне. Нас сустракае прыветліва:

— Позна ж вы, дзеткі мае, спіцё. Хоць, праўда, сёння свята. Спас. На работу не пойдзем. Умывайцеся. Нечым пачастую вас.

Дуся, расчэсваючы свае косы, углядаецца ў люстэрка, задаволеная сабою. Я гляджу на яе, зграбную, і мной апаноўвае нейкая асаблівая радасць, гордасць за яе такую.

Піліп прыводзіць з поля каня. «Наеўся. Няхай пастаіць у стайні, а то зловяць партызаны. Завязуць куды сваю якую паклажу і кінуць. Тады шукай!»

За снеданнем Дуся ні каплі не саромеецца маёй прысутнасцяй за сваім сямейным сталом. Уся свеціцца, радасная, упэўненая ў сваёй годнасці.

Па снеданні зайшлі ў ейную святліцу. Я й шапчу ёй на вуха: «Вяду цябе сёння да сябе ў хату. Прадстаўляю бацькам». Дуся спужалася, гаворыць, можа, іншым разам, але ўрэшце пагадзілася. Сказала маці пра маё запрашэнне. Хіма ўсхадзілася прыбіраць Дусю. Я ж сказаў, што Дуся мае яшчэ час. Паспее сабрацца. Прыйду па яе толькі па абедзе.

З гэтага я накіроўваюся дахаты. Нялёгка мне пераступ-

пацьпарог свае хаты, усведамляючы, што ты вінаваты, што твае паводзіны ненармальныя, што ўсё гэта мусіла б быць іначай, не так, як яно ёсць. Адзінае, што нібыта апраўдвала мяне перад бацькамі — гэта маё цяперашняе становішча — становішча, што змушае мяне не начаваць у хаце, хавацца, калі я не хачу папасціся ў рукі людзей з лесу. І з гэтым мае бацькі як бы згодныя, усведамляючы, што іншага выйсця ў мяне няма, што трапіць у рукі партызанаў для мяне небяспечна. Ды ўсё ж для мяне няма большай пакуты, як моўчкі пераступаць раніцою парог, не гаворачы, дзе ты быў, адкуль прыйшоў.

І я адважыўся — сказаў бацькам, што запрасіў Піліпаву дачку сёння дахаты.

— Няхай прыходзіць. Вядзі. Гэта лепш, чым хавацца,— сказаў бацька, не ўзнімаючы на мяне сваіх вачэй.

Маці прамоўчала, а сястра сказала, што гэта трэба было мне даўно зрабіць.

І гэтак я йду па Дусю. Дуся доўга чакала мяне й хвалявалася. Ведала, што йдзе на паказ. Яна была адзета прыгожа і з густам. Хіма выпраўляе нас, як малых дзяцей, настаўляючы і жадаючы нам добрага прыёму.

Выходзім з хаты на вуліцу, а насустрач — Манька з сваёю братавай, бландзінкай, што заводзіла мяне ў клець да свае швагеркі.

Дуся ўся збялела, убачыўшы іх. Не менш быў збянтэжаны і я. Але тыя, на момант спыніўшыся, толькі акінулі нас знішчальным паглядам і пайшлі, некалькі раз азірнуўшыся, быццам пасылаючы нам праклянцце.

— Я баюся іх, Юзік. Яны адпомсцяць табе. Маньчын жа брат у лесе.

Я супакойваю Дусю, а ў самога прайшоў мароз па скуры ад пагляду бландзінкі.

Па дарозе на мост сустракаем убраных па-святочнаму сваіх вяскоўцаў. Яны вітаюцца, усміхаюцца нам, такой, як яны думаюць, прыгожай пары. Пераходзім наш мост. Уваходзім у маё Мокрае. Стрэчныя вітаюцца, глядзяць, дзівяцца — вяду ў сваю хату нявесту.

На парозе нас радасна сустрэла сястра. Прывіталася як належыць, і бацькі, ветліва, хоць і стрымана. Дуся не ведае, як ёй быць,— саромеецца, чырванее, і знайшлася толькі тады, калі маці пачала гаманіць з ёю, унікліва распытваючы ў яе пра самыя розныя рэчы. У Дусі завязалася з маці душэўная гаворка, і я быў рады такому іхнаму збліжэнню. Дуся прыйшла да сябе і сваёй нявымушанасцяй,

з немалой доляй наіўнасці, змагла здабыць павагу да сябе. За пачастункам, які падрыхтавала маці, гаворка пайшла болей свабодна. Асабліва была дружнай з Дусяй сястра. Адзін толькі бацька быў не надта гаваркі. Найболей слухаў. Ужо калі гаворка пачала сыходзіць, калі трэба было ўжо вылазіць з застолля, бацька, як ні ў чым не бывала, звярнуўся да нас:

— Ну дык а як жа вы будзеце жыць? Усё так, хаваючыся? Гэта ж не жарты вам.

Бацькава пытанне, хоць і не такое нечаканае, застала мяне знянацку. Сваёю жыццёвай няўхільнасцяй яно аглушыла мяне. Дуся заклапочана зірнула на мяне, як бы ў чым папаўшыся. Калі мы ўжо вылазілі з-за стала, маці зірнула ў вакно — у коўраты ўязджаюць партызаны. Сястра крыкнула:

— Да нас!

Выходзіць з хаты, уцякаць нам ужо няма як. Мне ўсё роўна. Няхай заходзяць. У змярцвенні прайшла некая часіна. Аж бачым — з гармонікам і бубнам, п'яныя, з песняй партызаны мінаюць нашую хату.

Бацька выйшаў на вуліцу і хутка вярнуўся назад. Гаворыць:

— Спыніліся ў самым канцы вёскі. Кыла Сцепанідзінай хаты. Паедуць далей ці вернуцца назад — нізвесна.

Бацька папярэдзіў нас, і мы з Дусяй, не марудзячы, выходзім з хаты. Хутка перасякаем вуліцу. Спускаемся на рэчку, у хмызнякі. Устрывожаная і напалоханая, Дуся трымае мяне пад руку. Просіць мяне хутчэй да іх у хату. Нам трэба перайсці рэчку. Падыходзім да кладкі-бервяна. Дуся просіць мяне пераходзіць першым. І я ўжо на тым баку. Гляджу, як будзе пераходзіць Дуся. Баюся, каб яна не ўпала ў сваім убранні ў рэчку. Распасцёршы рукі, яна памалу клыпае па бервяне. Дайшоўшы да сярэдзіны, упэўненая, хутка бяжыць напярэймы, прост мне ў рукі.

— Я цяпер, Юзік, не баюся іх. Хадзема хутчэй.

Дусіны бацькі былі ўжо дазнаўшыся, што ў нашай вёсцы партызаны і турбаваліся за нас. З Дусяй я дамовіўся, што нанач я да яе не прыйду. Бацька просіць мяне дапамагчы яму выкапаць на нашым агародзе ямку, абсталяваць яе пад сховішча. Партызны рыхтуюцца да зімы і забіраюць у людзей цёплую вопратку — шубы, паўшубкі, ватнікі, валёнкі, шапкі, рукавіцы і іншыя патрэбныя ім рэчы. Ходзяць па хатах і глядзяць, што можна ў каго ўзяць. Бацька хоча прыхаваць ад іх гэтыя патрэбныя і са-

бе рэчы. Надыдзе зіма, што тады надзенеш, як забяруць. Хоць калі й надзенеш, дык могуць жа й раздзець. Ад іх ратунку няма.

Над схОвішчам мы правазіліся ўсю ноч. Паклалі ў яго ўсё, што магло б кінуцца ў вочы партызану. Маці прынесла некалькі трубак палатна, каб і яго схаваць. Забіраюць жа і палатно. Ім усё трэба. А з чым сам будзеш? Начэй недасыпала ўзімку — прала. Вясной не пакладала рук — ткала, каб было што надзець, прыкрыць сорам.

Справіліся з работай, калі ўжо пачало світаць, калі, нарэшце, супакойна стала ў нашай вёсцы. Дый і ў той, што за рэчкай. Як у нас, так і там людзі не спалі ўсю ноч — разгульвалі партызаны: стралялі, ігралі, спявалі, крычалі, лавілі дзяўчат.

У ранішнім світанку іду з касой на плячах да сваей сястры, што жывець у Красным Вуглу, за якіх два кіламетры ад нас. Мужа ейнага мабілізавалі, і яна засталася адна з трыма малымі дзецьмі. Мы дапамагаем ёй ва ўсім. Я йду да яе на цэлы дзень касіць. Дый не толькі касіць, а й усякую іншую работу спраўляць. Сястра рада, што я ў яе за гаспадара. Я ўжо працую ў яе некалькі дзён узапар. Рана прыходжу да яе і вяртаюся ўвечары. Сястра радзіць, каб не біць надарэмна ногі, начаваць у яе, але як я магу заставацца ў яе, калі мяне чакаюць недзе ў іншым месцы. Пасёлак Красны Вугал — невялічкі, шэсць двароў усяго. Даезду да яго няма ніякага. Чужога чалавека тут не пабачыш. Чужому чалавеку сюды неўзаход. У пасёлку адны бабы, калі не лічыць некалькі старых. Тут ціха і ўтульна. Часамі праляціць нямецкі самалёт — зусім нізка: выразна відны знакі на ім. Жанчыны доўга глядзяць, як ён, павяртаючыся, цяжка раве, пакідаючы стужку дыму. Сестрыны дзеці — мае пляменніцы — учуўшы скогат самалёта, хаваюцца пад стол, накрываючыся дзяругай.

Я працую ў сястры дацямна. Вячэраю і йду, мінаючы сваю хату, да Дусі. Ціхенька стукаю ў дзверы — Дусі штосьці не чуваць. Не падыходзіць да дзвярэй. У клеці яе няма. Яна ў хаце? А мо што здарылася? Стаю, не ведаючы што рабіць. Зайсці ў хату? Раздумваю. Зайду. Толькі наважыўся, а Дуся — з сянец. Яна выглядала мяне ў вакно і, заўважыўшы, выбегла насустрач.

— Юзік, міленькі. Я рада, што прыйшоў.— Цягне мя-

не далей ад хаты: — Тут небяспечна. Пойдзем далей. На рэчку. Там нас ніхто не ўбачыць.

Я ў недаўменні. Ужо калі мы апынуліся ў алешніку, пытаюся:

— Гавары, што з табой, Дуся?

— Каб ты ведаў, Юзік, якога страху я набралася.— Заплакала.— Я хацела табе не гаварыць. Не хацела цябе пужаць. Баялася, што ты тады пойдзеш ад мяне. Але мой тата і мама прасілі мяне сказаць табе. Сказаць, што ў нас былі ноччу партызаны. Ды ета не ўсё. Яны лезлі да мяне ў клець. Я ж ведала, што не прыйдзеш, і заперла дзверы на засоў. Дык яны пачалі дзверы ламаць. Крычаць: «Адчыні. Ты нам не трэба. Нам трэба той, хто ў цябе». Я маўчу. Стаілася. Нічога не гавару. А йны біць у дзверы мацней. Потым сціхлі. І адзін голас пытаецца — я пазнала яго, гэта Мікола Бугроў: «Адчыні. Табе нічога не будзе. Мы знаем, хто ў цябе». Я асмелілася й гавару: «У мяне нікога няма».— «Брэшаш, сука». Налеглі і вывалілі дзверы. Я як непрытомная ўскочыла з ложка. Закрычала немым голасам. Баялася, што яны забяруць мяне з сабой. Запаліўся ліхтарык. Водзяць па кутках святлом. Няма. Я была рванулася з клеці, ды тут жа мяне схапілі дужыя рукі і на ложак. Я — кусацца. Нагамі — біцца. І як ратунак — голас на двары: «Хто тут?» Рукі адпусцілі мяне. Я выбягаю на двор — бацька. У руках у яго сякера. Я ўчапілася за бацьку. Выходзяць і тыя. Бацька пазнаў іх абодвух. І Бугрова, і таго, што жыў у нас. Замахнуўшыся сякерай, бацька крычыць: «Вон з майго двара! — засяку!» І яны пайшлі. Не зачапілі бацькі. У клець я ўжо не вярнулася. Забрала пасцель і — у хату. Мы ўжо не будзем з табою, Юзік, спаць у клеці. Яны хочуць цябе злавіць... Куды мы цяпер пойдзем? Яны будуць сцярэч нашу хату. І тваю.

На рэчцы ўзняўся туман. Зябка. Дуся калоціцца — і ад холаду і ад узрушанасці. Каб не стаяць на месцы, ідзём, абы йсці. Узыходзім на мост. Паднімаемся на другі, вышэйшы, бераг. Кіруемся на школу. Школа з узгорка глядзіць на нас сваімі пустымі без шкла вокнамі злавесна і папераджальна. Але мы йдзём. Быццам хочам знайсці ў ёй прытулак. Абыходзім школу кругом. Усюды дзверы ў ёй адчыненыя. Заходзіць баімося. Дуся тлумачыць мне, дзе і ў якіх класах яна сядзела. Ля якога вакна. Цяпер разбітага. Паказвае мне настаўніцкую, кватэру-пакой, дзе жыў Вяркееў. Дуся забылася, што я ж усё гэта ведаю. «А тут вось я сядзела, калі была ў шостым класе. Глядзе-

ла ў вакно на рэчку, на мост. Бачыла сваю хату».— «Ах, шкада, гавару ёй, што я не сядзеў тады разам з табою».— «Праўда, ты шкадуеш? — пытаецца.— Я шкадую таксама, што цябе не было тады са мною. Я хацела, каб ты быў тады са мною. Але цябе не было. Шкада».

Дуся гаворыць усё гэта і цалуе мяне, і мне прыемная ейная пяшчота, як нейкі гаючы і патрэбны мне лек. Чую краем свае душы, што яна хоча мне сказаць яшчэ нешта, больш важнае за тое, пра што яна гаварыла дасюль.

Мы йдзём назад. На мост. Ноч лагодай абымае нас, і, аддаючыся ёй, мы як бы ажываем, збліжаемся, і без таго блізкія. Нікога нідзе няма. Толькі мы адны. Але мы нідзе не можам прыпыніцца. Набліжаемся да «Цэнтра», направа ад нас — пуня і ў ёй напаўадчыненыя вароты. Мы заглядаем у сярэдзіну. Паапабал — направа і налева — складзенае сена. Пад самы вільчык. Сваёю духмянасцяй яно запрашае нас. І мы лезем наверх. Робім сабе бярлогу. Улазім у яе. Хаценне зраджаецца імгненна, і мы аддаёмся яму. Дуся гаворыць: «Ты сапраўдны Юзік. Я чую цябе ўсяго. Ты ў мяне наскрозь». Ляжыць, узапрэлая. Просіць, каб я сказаў, што мне добра з ёй. І я гавару ёй, што ў мяне слоў не хапае, каб сказаць, як мне добра з ёй, як яна мяне захапляе сваёю пяшчотай, сваёю ўтульнасцяй, усёй сваёю істотай. «Я рада, Юзік. Ляжы. Чуй мяне. Я табе буду шаптаць нешта на вуха. Юзік, я даўно табе гэта хацела сказаць. Ды саромелася. Ды баялася — як ты гэта прымеш. Думала — як скажу, пойдзеш ад мяне. Скажы, Юзік, не кінеш мяне, як скажу? Будзеш так любіць, як во цяпер, у гэтую часінку? Калі ты ўвесь мой і я даастатку твая. Даеш слова мне, што не разлюбіш, як скажу? Даеш? Ну, добра. Веру, Юзік, табе. Ды як мне пачаць? Ты ж здагадаўся, Юзік, што я не цэлая была? Здагадаўся? Ці, можа, не? Здагадаўся! І ты прабачаеш мне? Ты доўга спакушаў мяне, Юзік. Тады яшчэ, калі стаяў на мосце. Калі ляжаў у траве. Калі я падглядала цябе. Я ўжо любіла цябе тады. Я гэта ведаю толькі цяпер. А тады я не ведала. Ды ты мяне не чапаў. Хацеў мяне, ды не чапаў. Шкадаваў мяне? Баяўся? Баяўся, што я — дзіця яшчэ? А я хацела, каб ты зачапіў мяне. Мне было прыемна, калі ты блізка сядзеў каля мяне ў нас за сталом. Калі, схіліўшыся над кніжкай, мы чыталі яе і я дакраналася тваёй шчакі сваім локанам. Калі ты браў мяне на рукі, каб я не баялася грому. Я не так баялася грому, а каб ты ўзяў мяне і ўтуліў. Я была зайздросная, што ты танцаваў у нас

на вяселлі з іншай жанчынай, а не са мной. Я падгледзела, куды ты пайшоў з ёю і што рабіў з ёю. Я хацела быць на месцы той жанчыны. Але ты тады, Юзік, не чапаў мяне. Толькі спакушаў, але не спакусіў. І мяне, Юзік... спакусіў нехта іншы. Даруй, Юзік. Ты не гневаешся? Не?

Праўда? Ты мяне слухаеш? Ты не раўнуеш? Не? Ну й добра. Я сама не ведаю, як гэта сталася. Я адставала па арыфметыцы. І настаўнік хацеў мяне падцягнуць. Займаўся са мною асобна пасля заняткаў. Адну гадзіну. У класе. Тлумачыў. Пасля тлумачэння даваў мне некалькі прыкладаў, каб я іх развязала сама. Прасіў, як спраўлюся, заходзіць да яго ў пакой для праверкі. Садзіў мяне на нізкі тапчан і сам садзіўся побач мяне. Я разгортвала свой сшытак. Паказвала яму свае прыклады. Ён глядзеў у сшытак, нахіляючыся да мяне. І мне было прыемна, што ён так нахіляўся, хоць я й баялася яго як свайго настаўніка. Ад яго йшоў нейкі прывабны пах папіросаў, якія ён курыў. Ён паглядаў на гадзіннік і казаў, што ўжо мне пара ісці дахаты. І я йшла дахаты. Тры разы на тыдзень я мусіла прыходзіць да яго. Ён хваліў мяне і казаў, што я хутка дaганю сваіх аднакласнікаў. Я радавалася. Хадзіла да яго на дадатковую гадзіну. Ён усё так жа, як і кожны раз, садзіўся на тапчан сам і мяне запрашаў. Глядзеў у мой сшытак, ці правільна я зрабіла заданне, якое ён мне даваў. І, правяраючы, нахіляўся да мяне гэтак блізка, што ў мяне кружылася галава і я не ведала, дзе я і што са мною. Аднойчы, седзячы шчыльна каля мяне, ён абняў мяне і перакуліў на тапчан. Палез з рукою пад маю сукенку. Даткнуўся, і я самлела ў нейкай жарсці. Крыкнула. Мне было больна. Ён адпусціў мяне. Я паднялася і ўбачыла на маім споднім кроў. Спужалася. Пабегла дахаты і ў слязах сказала маці, што са мною сталася. Усё чыста сказала. Толькі не сказала хто. Я баялася свайго настаўніка. Як ні дапытвалася маці — хто, я не сказала. Маці мне строга наказала, каб я болей не заставалася ў школе пасля заняткаў. Маці ўсё дазнавалася тайком, хто — і, думаю, дазналася. Але не хацела мяне пазорыць. Маўчала. Не вынасіла гэтага дзела на людзі. Я ж пасля гэтага старалася не пападаць свайму настаўніку на вочы. У класе на яго не глядзела, калі ён прыходзіў да нас на свой урок. Мучылася. Не гневайся на мяне, мой даражэнькі, мілeнькі Юзік. Не крыўдуй на мяне. Ад таго ўсяго й знаку няма. Усё прайшло. Я твая. Юзікава. Ты не разлюбіў мяне, Юзік? Юзік мне даруе, як я Юзіку. Чую — ты ўсё такі ж.

Замёр? Мо не слухаў мяне, што я табе гаварыла? Ну й добра. Не трэба. Ты не чуў, і я табе нічога не гаварыла».

Дуся заснула ў маіх руках. Ды раптам страпянулася:

— Юзік, дзе гэта мы цяпер? У сене? О, як добра ў сене!

Я не магу не думаць пра Дусіну споведзь. Хачу яе забыць і не магу. Дуся нічога не страціла ў маіх вачох. Наадварот, я ацаніў яе яшчэ вышэй. Ейны вобраз застаецца ў мяне такім жа светлым і незаплямленым, якім ён быў для мяне заўсёды. Але тым не менш не думаць пра Дусіну споведзь я не магу. Што — я паранены змяіным джалам рэўнасці? Не. Любоў да Дусі была б тады азмрочанай, і я не змог бы тады яе кахаць. Што ж тады? Думаю — зайздрасць. Зайздрасць да яе, што сваім чарам яна магла зачараваць і некага іншага, не толькі мяне. Гэтая зайздрасць не адштурхнула, а яшчэ больш кінула мяне да яе. Калі яна спавядалася ў пуні, утулены, я слухаў яе, як праз сон, мне было прыемна чуць ейны шэпат, ціхі і ласкавы, здавалася, нібы яна гаворыць мне нейкую казку. Ейная споведзь узвышала яе, ейны грэх акупаўся ў мяне чысцінёю ейнага сэрца. Лежачы з ёй, я не думаў над ейнай споведзяй. А выйшаў з пуні, развітаўся — пачаў думаць. Думку гэтую ганю, заглушаю, а яна ўсё абуджаецца. Нават калі я з Дусяй, у хвіліну, калі мы аддаемся, у часе найбольшай жарсці і забыцця, думка гэта можа ашаламіць мяне.

А то ўзнікне ў мяне спагада, жаль да Дусі, ашуканай. Я ведаю, чалавек падкі на красу, і яна, краса, застаецца безабароннай перад ім. Яе, красу, не берагуць, не абараняюць, а зрываюць, губяць. І зрывае, губіць яе звычайна грубая рука. Я ж красы баюся. Баюся яе зачапіць. Я бярог Дусю, любаваўся ёю, баяўся змяць ейны цвяток, гледзячы, як ён распускаўся. Я не хацеў губіць красы. Бо чым я жыў бы тады?

У Дусі няма віны перада мною. Яна невінаватая, што ўрадзілася прынаднай. Адно толькі мне не па сабе — я ведаю, хто падманіў Дусю. Гэты «хто» ўрываецца ў маю памяць, я чую ягоны голас: «Мая Дуся. Што й ты пасвіш гусі з маёй Дусяй?» Лепш бы Дуся не гаварыла мне пра яго.

# ЧАСТКА ЧАЦВЁРТАЯ

Надышла восень, і партызаны пакінулі нашы лясы. Адышлі пад Унечу. Ім у нас няма чаго рабіць, апрача як здабываць сабе ежу. У нас няма немцаў і ніякіх важных аб'ектаў. Паліцэйскія, бургамайстры, старасты, што былі тут на самым пачатку або паўцякалі, або былі знішчаныя партызанамі. Немцы кантралююць толькі сумежныя з горадам вёскі, ды й то толькі ўдзень. Уначы ў іх гаспадарыць партызаны. Нават і з ліку гэтых вёсак некаторыя былі спаленыя немцамі як партызанскія вёскі. Адышоўшы ад нас, партызаны абралі сабе аб'ектам чыгунку, на перагонах Клімавічы — Камунары — Бялынкавічы — Унеча. Пачалі ўзрываць палатно. Пускаюць пад адкос цягнікі, што вязуць боепрыпасы на падмацаванне нямецкага паўднёва-ўсходняга фронту. У нас засталіся толькі свае, мясцовыя партызаны, малалікія і неарганізаваныя. Яны адарваныя ад асноўных партызанскіх злучэнняў і дзейнічаюць на ўласную руку. Яны ў асноўным сцерагуць прасёлачныя дарогі на Касцюковічы. Перахопліваюць людзей, што йдуць туды. Падазроных страляюць, баючыся, што яны могуць інфармаваць раён, непадазроных — адпускаюць або забіраюць з сабой. Не зважаючы — мужчына гэта ці жанчына. Сярод гэтых мясцовых, дзікіх партызанаў, актыўна заяўляюць пра сябе група Міколы Бугрова і група Іллі Мельнікава. Ілля Мельнікаў — гэта старэйшы брат Вусціна і Манькі, муж бландзінкі, што жыве цяпер у Мокрым. На рахунку гэтых групаў нямала забойстваў. У Мокрае Першае і Другое яны наведваюцца не так ужо й часта. Добра праінфармаваныя, што дзеецца ў нас. Да нас у хату ніхто з іх цяпер не заходзіць. І я не ведаю, як гэта рас-

цэньваць: плюнулі на мяне ці плануюць пусціць мяне ў расход. У кажным разе яны ведаюць, што ў хаце я не начую і ў клець ужо не хаджу.

Дуся спіць цяпер у хаце, у сваёй святліцы. Заставацца ў яе нанач рызыкоўна. Прыходзілі ж па мяне ў клець, могуць прыйсці і ў Піліпаву хату. Калі было яшчэ лета, з надыходам начы мы без цяжкасцяў знаходзілі для сябе месца: у пуні, на рэчцы, на агародах, ля школы, ля ветрака, у сасонніку, на поплаве, нават на могільніку. Патрэба бачыцца штурхала нас на любую крайнасць, абы толькі сысціся разам. Мы звыкліся да таго, што не маглі пражыць і дня адно без аднаго. Намі былі сходжаныя, вытаптаныя бадай усе нашыя ваколіцы. Наставаў вечар, і мы йшлі, куды вяла нас наша хэнць. Мы жылі начой. Аддаваліся начы і сабе. Усё іншае было для нас пабочным і тое, што дзеелася дзесьці па-за намі — страшное і крывавае — толькі яшчэ больш кідала нас у абдымкі, як у бяспамяцтва.

Цяпер жа восень. Холадна. На поплаве шорхне пад нагамі ад марозу трава. Замёрзлі лужыны. Усё скошана. Звезена. Агалелі хмызнякі і чэзнуць над рэчкай. Сялібы і агароды апусцелі. Сады паніклі ў сваёй акалеласці. Ля ветрака, на бую, свішча вецер, што не ўтрымаешся на нагах. Вечары даўгія, і мы не ведаем, як іх праводзіць. Сланяемся ўсюды. Найболей паўз рэчку. Тут ніжэй, зацішней і нікога не стрэнеш. Па адзін і другі бок рэчкі сям-там туляцца лазні, і калі нам захочацца, заходзім у якую-небудзь з іх. Учора мы натрапілі на пратопленую лазню. У ёй нехта мыўся, і яна яшчэ не паспела астыць. Зайшлі. Залезлі на досыць высокі палок, дзе парацца. Побач палка, трохі ніжэй — каменная печка, і ад яе яшчэ йдзе дух. Распасцёрлі на палку пад бок мой армяк. Дусіным манталем накрыліся. Дуся чуе сваімі пяткамі цяпло, што йдзе ад печкі. Вельмі чуллівая, гаворыць, што ёй тут лепей, як дзе. У заходлівасці гаворыць, што сёння ёй ужо так не пройдзе — зачнецца маленькі Юзік.

Мае хатнія звыкліся, што я валачуся. Нічога не гавораць пра гэта. Палявыя работы скончыліся — валачыся! Але я ведаю, што мой спосаб жыцця ім не падабаецца. Тое самае і ў Дусі. У яе не пытаюцца, адкуль яна прыходзіць — ведаюць. Бывае, што днём я заходжу да іх. Прымаюць добра, можна сказаць, як зяця. Хіма частуе мяне і разам Дусю гусінымі скваркамі. Дуся асабліва любіць іх. Аблізваецца: смачныя. Я доўга ў іх не затрымліваюся. Зайду з Дусяй на часінку ў ейную святліцу. Калі мы там

змаўкаем, Хіма, стоеная, прыслухоўваецца, але ў нас ужо няма сораму.

Ды выпаў першы снег. Лягла зіма, і нашае з Дусяй жыццё ўскладнілася. Дуся ўжо на другім месяцы запладнення. Просіць куды-небудзь з ёю перабрацца, знайсці нейкае больш спакойнае месца. Хоць бы ў тыя ж Касцюковічы. Ды й Дусіны бацькі хацелі б, каб мы пачалі жыць нармальна, не хаваючыся, як муж і жонка, ці што. А калі даведаліся, што Дуся і зацяжарала, прапанавалі мне перабрацца да іх, відавочна мяркуючы, што я з якіхсьці прычынаў не магу ці не хачу весці Дусю да сябе ў хату. Яны хіба не ўяўляюць, што ні ў іх, ні ў мяне «нармальна» жыць мы не можам. Дуся гэта добра ведае. «Адведзіны» Бугрова прадэманстравалі гэта. І Дуся выпраўляе мяне ў Касцюковічы шукаць нейкай працы. Але што я магу там знайсці? Ніякай практычнай прафесіі ў мяне няма, галоўнае — няма знаёмых. Што я магу там рабіць? І ўсё-ткі я не магу не паслухаць Дусю: іду ў Касцюковічы. Можа, сапраўды ўдасца перабрацца туды з Дусяй. А з Касцюковічаў, можа, куды і далей. Мо нават у Менск. Але дабрацца да Касцюковічаў не так лёгка. Уцалік зімою не пойдзеш — выб'ешся з сілаў і не дойдзеш. Пойдзеш бітаю дарогай — можаш папасціся партызанам. Зрэшты, прападзі яно пропадам — я не так ужо й баюся тых партызанаў. Без рызыкі — што ты зробіш без рызыкі? Самае горшае — забяруць з сабою. Гэта — калі трапіш у рукі сапраўдным, палітычным партызанам. А калі ў рукі дзікім, сваім, мясцовым? Тады гэта будзе рэванш.

Прашу ў Піліпа каня-гарбунка. Дробненькі, але хуткі, бяглівы канёк. Дасі лейцамі — рванецца, бяжыць, у струнку выцягваецца. Ён мяне й выратуе. Заклаў яму нанач аўса і сена. Ледзь пачало брацца на дзень, пачаў збірацца ў дарогу. Справіў вазок. Палажыў у яго сена. Паставіў у аглоблі гарбунка. Усё гатова. Іду ў хату развітвацца з Дусяй, а яна — і я паеду. Адгаворваю. Слухаць не хоча. Бацькі моляць не ехаць — не дапамагае. Яна на сваім. Надзяе валёнкі, шубу, абвязваецца цёплай хусткай. Садзіцца побач мяне ў вазок. І я бяруся за лейцы. Выязджаем. Мокрае праехалі, калі яшчэ добра не развіднелася. Уз'ехалі на торную дарогу. Па дарозе пападаюцца паадзінокія падводы. Дзе магчыма, мінаем іх. Гурбунок выносіць нас усюды. Уехалі ў лес. Велічны супакой. Па-

абапал гонкія елкі пры кожным, ледзь улоўным, павеве атрахаюць з сваіх галінак сыпкі снег. У Дусі рдзяцца ад марозу шчокі. Кідкі, агністы пагляд вачэй, заінелыя локаны. Сядзіць радасна-ўсмешлівая, слоў няма — харашуня.

Мы ўжо выязджаем з лесу. Паказаліся абгарэлыя каміны, абпаленыя дрэвы, абвуглелыя слупы, разбураныя печы — гэта спаленыя Клеявічы. Гэта партызанская вёска. Жудасна.

Хутка Касцюковічы. Праз якія паўгадзіны будзем там. Затрымаемся ў Дусінай цёткі.

Я не пазнаю Касцюковічаў — іх прадзімае вецер. Калючы, востры. Прадольнаю вуліцаю імчацца не спыняючыся ваенныя грузавікі, часцей — з салдатамі. Рэдка заўважыш прахожага. Уражанне апусцеласці і закінутасці. Мястэчка стулілася, замёрла ў чаканні нечага пагрозлівага. Ды калі спыніцца і ўгледзецца, вычуваеш — існуюць іншыя Касцюковічы, іхны ніжні, падземны, этаж, гатовы вось-вось выбухнуць.

Дуся засталася ў цёткі, а я іду ў «Отдел образования» пры гарадской управе шукаць сабе месца настаўніка ў якой-небудзь тутэйшай, касцюковіцкай школе. Мяне прымае сам загадчык аддзела. Па гаворцы чую — свой чалавек. Мяккі, сімпатычны. Пытаецца, хто я, адкуль, якая ў мяне адукацыя, ці ведаю я нямецкую мову і г. д. Я расказваю, даверыўшыся, яму пра сябе ўсё. Не захаваў, што сядзеў, сказаў нават, што пішу, спадзеючыся, што гэта ўсё можа дапамагчы мне. Узіраючыся ў мяне, загадчык слухае мяне ўважліва,ківае галавою ў знак згоды, што ён разумее мяне і спачувае мне.

— Але я нічым не магу дапамагчы вам,— нарэшце гаворыць ён.— Я сам сяджу тут ні пры чым. У мяне нічога няма. Ніякіх школаў. У саміх Касцюковічах няма. Адкрылі былі дзве пачатковых — разваліліся. А ў вёсках? Вы ж самі, гаворыце, спрабавалі адкрыць школу ў сваёй вёсцы, і што палучылася? Гэтак і ўсюды ў нас. Якія вам тут цяпер школы? Не да школаў. Не бачыце вы, ці што?

Памаўчаўшы трохі, загаварыў зноў:

— Калі хочаце, я пазнаёмлю вас з нашым бургамістрам. Чалавек ён свой. Можа, ён вам чым дапаможа. Але яго цяпер няма. Будзе толькі на наступным тыдні... калі будзе. У групе бургамістраў ён падарожнічаў па Нямеччыне, быў прыняты высокім нямецкім начальствам. Хва-

ліцца гэтым. Шукае чалавека, які б яму апрацаваў для газеты тое, што ён напісаў аб сваім падарожжы. Пісака з яго ніякі. Пакольні вы, кажаце, пішаце, дык мо ён узяў бы вас. А пасля, можа, што і іншае. Але гэта я гавару вам так сабе. Бургамістр той ужо не начуе ў сябе ў хаце — у палявой нямецкай камендатуры хаваецца. Баіцца — выкрадуць. Дабіраюцца і сюды, у нашае тут логава. У вашым Мокрым, бачу, зацішней, чымся ў нас тут. Вялікае начальства паціхеньку змываецца адсюль, а вы прыехалі сюды працы сабе шукаць. Не загнявайцеся, як добраму чалавеку раджу вам — павяртайце аглоблі. Будзьце трохі разумнейшым.

Падкуплёны дабрынёй загадчыка «Отдела образования», сяджу ў нерашучасці, не ведаю, што сказаць яму, а ён:

— Так. Так, браток. Павяртайце аглоблі, гавару вам. Калі вас, там у вашым Мокрым, камарыкі не кусаюць. Кусаюць? Ну тады горай. Тады, як хочаце. Вам я нічым не магу дапамагчы.

Даў мне на развітанне скрутак газет. І я выйшаў з гарадской управы, засмучаны і ўстрывожаны. Паліцэйскія, якія былі абшукалі мяне пры ўваходзе, сустрэлі мяне цяпер недаверлівым паглядам, загадаўшы мне паказаць, што я выношу.

Пераходжу адну, другую вуліцу — усюды дарожныя знакі па-нямецку і па-руску. Ніякай Беларусі тут няма.

Дуся шкадавала, што не пайшла са мною разам — доўга чакала мяне, непакоілася, што мяне, бяспашпартнага, яшчэ могуць затрымаць дзе.

Дусіна цётка згатавала для нас, дарагіх гасцей, смачны абед. Пачаставала гарэлкай уласнага вырабу. У яе гэтае пітво не выводзіцца. Дусі яна прызналася, што да яе ўначы заходзяць. Частуюцца і бяруць з сабою пагрэцца ў лесе, і што, калі б мы захацелі застацца ў яе нанач, нічога нам не пагражала б. А паліцыі яна не баіцца. Яна ўмее ладзіць і з тымі і з тымі.

Раскручваю скрутак газет — ніводнай беларускай, толькі — «Новый путь». Чытаю загалоўкі: «Москва дрожит под градом бомб», «Нам нужен Сталинград, и мы возьмем его», «РОА в действии», «Самопомощь в Минске» і г. д. Гляджу — усё застарэлыя нумары. Свежай зводкі з фронту няма. Але з матэрыялаў, якія праглядваю, здагадваюся, што немцам туга, яны вядуць напружаныя, цяжкія для іх баі і наперад не йдуць.

Я ў нейкай разгубленасці. Не разумею, адкуль яна мной апаноўвае, трывожыць адчуванне незваротнасці, няпэўнасці і страчанасці. Дусі гавару — паедзем дамоў. Не хачу тут заставацца. І Дуся ўскаквае:

— Паедзем, Юзік.

— Трымаць не буду,— гаворыць цётка. Дае Дусі нейкія падарункі. Просіць узяць і «хунцік солі». Паўтарае ўжо сказанае: калі б мы захацелі, яна нас звязала б з ... і мы маглі б жыць спакойна. Благаслаўляе нас. На развітанне гаворыць: — Беражэцеся.

Гарбунок, застаяўшыся на марозе і пасівеўшы, ахвотна нясе нас назад у Мокрае.

Я ўпершыню застаюся начаваць у Піліпавай хаце. Хіма частуе нас настоеным на зёлках гарачым чаем. Сцеліць нам пасцель. Піліп моўчкі лезе спаць на печ. Хіма прыладзілася на прыпеку, недалёка ад нас — мы маглі б даставаць яе нагамі.

Наша паездка ў Касцюковічы не засталася таямніцай для сяльчанаў. Бландзінка пусціла па вёсцы чутку, што я ездзіў да немцаў наймацца. Збіраюся пераязджаць у раён і забіраю з сабою Дусю. Але няхай не думае, што выедзе адсюль чыстым.

Памёр мой дзядзька. Ён доўга хварэў, пакутаваў і хацеў хутчэй памерці. Гэта быў ужо не чалавек, а цень ад яго. Схуднеў. Аслаб. Не мог хадзіць. Яго ўжо як не было. Ён адыходзіў, і ў хаце чакалі толькі, калі ён адыдзе. Ягонае месца гаспадара даўно ўжо заступіла цётка. Ува мне дзядзька знайшоў уважлівага слухача і любіў гутарыць са мною. Пад час гутаркі ён часта правальваўся ў сон ці забыццё, і мая гутарка з ім перарывалася. Адплюшчыўшы вочы, глядзеў, ці я яшчэ з ім. У часе асаблівай знямогі прасіў мяне пахаваць яго, уласнаручна выкапаць для яго магілку, дагледзець яго.

І вось я дзяўбу на нашым могільніку магілку для дзядзькі. Апрача рыдлёўкі, ніякага іншага інструменту ў мяне няма, і пакуль я зняў верхні мёрзлы пласт, нямала намучыўся. Далей пайшло ўжо лягчэй. Я ўжо па пояс у зямлі. Накідаў наверх паабапал сябе жаўцяку столькі, што ўжо не відаць мяне. Але трэба яшчэ капаць, дзядзька прасіў выкапаць магілку глыбокую, каб яму цёпла было, каб узімку мярзлота не даставала яго і каб ён у магільнай цішыні не чуў людской скаргі. Я ўжо ўвесь схаваўся ў ма-

гілцы. Нада мной уверсе жаўцее цэлая гара пяску, гатовая, здаецца, абсунуцца і засыпаць тут мяне самога. Зверху цярусяцца спакойныя сняжынкі, кладуцца мне на шапку, плечы, рукавы. Я, услухоўваючыся ў іхны нейкі шапатлівы дотык, міжволі спыняю працу, аддаюся нейкай бяздумнасці. Мне ўтульна ў гэтай дзядзькавай магілцы, быццам я ў самай цёплай і зацішнай хаце. Нічога не чую, апрача шапатлівага руху сняжынак, нічога не бачу, апрача неба і гонкай нада мною сасны, што, як і я, узіраецца ў неба. Стаю з рыдлёўкай у руках і адчуванне такое, быццам я атрос з сябе ўвесь цяжар свету і, вызвалены, стаю заспакоены, з палёгкай на душы. Стаю, быццам сузіраю нешта, а што — добра не ўцямлю, тое «нешта» бясконца снуецца ў мяне ў душы, праходзіць праз мяне ўсяго, тчэцца нейкай светлай уявай, не перарываецца. Я не чую сябе, што я ёсць. Усё йдзець без мяне, і я ў тым, што йдзець, плыву разам з ім, і няма той плыні канца. Мяне няма, і нікога няма. Ёсць толькі бясконцая плынь, існаванне плыні, а не маё існаванне. І толькі, калі я адчуў у руках рыдлёўку, я ўявіў, што я — гэта на самай справе я, а ніхто іншы і што мне трэба канчаць дзядзькаву магілку і вылазіць з яе. Я ж яе капаю не для сябе, а для дзядзькі.

Прывезлі дзядзьку ў труне на санёх. Труну знялі з саней і ўзялі сабе на плечы два досыць моцныя мужчыны, дзядзькавы нейкія далёкія родзічы, якіх я ніколі не бачыў. Цётка запрасіла іх дапамагчы ў пахаванні. Яны апусцілі на вяроўках дзядзькаву труну ў магілку. Усе, што прыйшлі хаваць, сыпнулі па жмені жвіру на труну, і рыдлёўкі пачалі паспешна засыпаць дзядзьку зямлёй, што я накапаў.

Прайшло сорак ці колькі дзён ад часу пахавання, і цётка зладзіла памінкі па дзядзьку. Нагнала гарэлкі. Нарабіла каўбас. Запрасіла гасцей, у тым ліку, канешне, і мяне. На памінкі прыехалі і тыя два родзічы, што бралі ўдзел у пахаванні. Цётка запрасіла на памінкі і жанчын, што плакалі, калі дзядзька ляжаў на покуці прад абразамі і калі яго апушчалі ў магілку. Седзімо такім парадкам за сталом. П'ём. Закусваем. Успамінаем нябожчыка. Цётка паставіла на часах сваю старэйшую дачку, маю пасёстру, каб яна наглядала за вуліцай і калі, крый Божа, нарвуцца партызаны, мігам папярэдзіць нас. Седзячы за сталом, я даведаўся, што дзядзькавы родзічы, тыя двое, што

апушчалі дзядзьку ў магілку — паліцэйскія. Яны былі толькі запісаўшыся ў паліцэйскія, але службы не няслі — воласць, пры якой яны мусілі служыць, ліквідавалі партызаны ў першым жа тыдні яе існавання, але за імі ўсё роўна замацавалася званне паліцэйскіх. На самым пачатку вайны яны папалі ў палон, але ўцяклі з палону, у партызаны не пайшлі — палезлі ў паліцыю.

Я думаў, што цётка, пасылаючы дачку на вуліцу сцерагчы нас, выставіла варту дзеля мяне і быў надта пранятый ейнай услужлівасцяй.

Добра захмялеўшы, загаманілі на ўсю хату. Пра дзядзьку ўжо й не згадваем, гаворым хто пра што і ўсё болей уцягваемся ў гарэлку. Закусваем смажанінай і кіслай капустай з агуркамі. Жанчыны зацягнулі ўжо й песню, аж тут апромеццю бяжыць у хату наша стража з страшным: «Партызаны!» Мае паліцэйскія выскачылі на панадворак, а я чамусьці — на вуліцу. Зірнуў направа — даўгая вуліца хіснулася сваім канцом у маім п'яным мозгу. Зірнуў налева — на мяне бяжыць з аўтаматам партызан. Я назад на двор. З двара — у поле, у белае чыстае поле. Партызан — за мною. Крычыць: «Стой!» Я бягу. Колькі моцы стае — бягу. Уцякаю. Ён — страляць. А я ўсё — бегчы. Спатыкнуся — ён перастае. Узнімуся — страляе. Ды я бягу. А ён паліць па мне. Я чую, як паўзбоч мяне ціўкаюць кулі і, падаючы ў снег, шыпяць. Прабілі расхлістаную палу ў маім кажушку, бяссільна ўдарыла адна ў гумовы запятак калошы на маім валёнку. Ды я бягу. Уцякаю ад смерці. Упаду. Зірну на яго — ён перастае. Думае — не ўстану. А ўстану — ён ізноў. Калі бягу, баюся — патрапіць у спіну. Падаю. Бягу. А ён усё гоніцца за мной і страляе. На чыстым заснежаным полі толькі я і ён.

А на высокім узгорку над рэчкай ля моста стаіць мая маці з сястрой і ўсё гэта бачыць. Глядзіць і памірае раней, чымся я.

Ён гоніцца ўсё за мною, і мне ўсё роўна — няхай б'ець у спіну. Толькі хутчэй.

Перад вачыма вынырнула вёска Віроўка, і мне як бы адлягло. Я азірнуўся — ён адстаў. Стаіць і не страляе. У яго няма болей патронаў.

Уваходжу ў Віроўку. Звечарэла. У першай жа з краю хаце пачуў — граюць. Я ў хату. Як бы нічога са мною й не было. Тут мяне пазнаюць — уцяклі з палону хлопцы, з якімі я вучыўся ў сямігодцы. Яны даюць мне гарэлкі.

Я адным дыхам асушыў шклянку. Грае музыка. Танцуюць. Як ні ў чым не бывала, пайшоў і я. Яшчэ не скончыў — на парозе сястра і Дуся. Яны йшлі маім следам і знайшлі мяне тут. Я апамятаваўся. Сыпнулі слёзы. Мы пакінулі хату. Сястра і Дуся ўзялі мяне пад рукі. Ідзём назад тым следам, якім яны ішлі. Маім следам. Паказваюць мне — і я бачу сам — гэты мой след, усе ўмятыя мясціны ў снезе, дзе я падаў. Як ішлі яны сюды, яны з боязяй сустракалі кожную з гэтых мясцін — можа, я ляжу — і радаваліся, калі ў іх мяне не было: значыцца, пайшоў, значыцца, жывы, не забіты, не паранены. І гэтак да самай Віроўкі. Сястра і Дуся вялі мяне і плакалі — ад болю, ад гора, ад радасці.

Расцалаваўшы сястру, прашу яе супакоіць маці, а сам іду з Дусяй да яе. Застаюся нанач у яе. Толькі яна можа суцешыць мяне.

Вяскоўцы мне гавораць, што мая смерць расстралялая і мне ўжо няма чаго баяцца. Ды я і не баюся. Партызаны ўціхлі. Іх не чуваць. У Мокрым яны ўжо даўно не паказваліся — з'ехалі, і я начую ў Дусі, мала асцерагаючыся. Але яна ўсё-ткі непакоіцца. Болей, як я. Баіцца, што ад яе могуць забраць мяне людзі з лесу. Калі лажымся, Дуся пытаецца, а што, як прыйдуць? Ды лёгшы пад коўдру, мы ўжо не думаем пра небяспеку: жарсць, што ахоплівае нас, выключае ўсякае меркаванне перасцярогі. Я знарок гавару Дусі: «Ну, дык я пайду, калі ты баішся».— «Не, не, цяпер ужо не пушчу». Абнімае: «Прастудзішся». А то просіць мяне прыкласці да ейнага жывата вуха. Паслухаць, ці там што чуваць.

На печы варочаецца Піліп. І мы не ўпэўненыя, што ён не чуе нас. У прыпеку крэхча Хіма. Яна ляжыць ад нас зусім блізка і, пэўна, чуе, як мы шоргаемся. Яна ўстае рана. Пачынае прасці, і мы чуем у сне ейную самапрадку, але ўставаць не хочам. Спім, пакуль не развіднеецца. Дуся хоча ўжо падняцца, дапамагчы маці, мне ж не хочацца яе адпушчаць — такая яна раніцой нейкая асаблівая і пажаданая. Гляджу на яе, як яна, падняўшыся, адзяецца, скідаючы з сябе начное. Просіць мяне не глядзець — саромеецца. Мы снедаем, і я хацеў бы ўжо пайсці дахаты, але Дуся ўгаворвае мяне заставацца, каб ейныя бацькі не падумалі, што я прыходжу да яе толькі нанач. І я застаюся. Дапамагаю Піліпу рэзаць дровы, ка-

лоць, складваць іх у сціпту. Трэба ж, каб у хаце было цёпла. Дуся памагае маці. І калі мы, пасля працы, садзімося за стол вячэраць, мне прыемна, што й я нечым прыслужыўся ў гэтай хаце. У покуці сядзіць Піліп, побач я з Дусяй. Хіма на другім баку стала. Мы седзімо пад абразамі. Над намі свеціцца лампадка, і ад ейнага святла сыходзіць нейкая асаблівая лагода, мір, суцяшэнне і светлая радасць. І тое, што вобак мяне Дуся, і што з лампадкі сыходзіць святло нейкай таямнічасці, і што Піліп з Хімай у сваёй маўклівай згодзе благаславілі нас, выклікае ў мяне зварушлівы свет нязнанай яшчэ радасці і яснабачання.

Збіраючы з стала посуд, Дуся ўраніла паліваны гаршчэчак прыгожай формы, але ён не разбіўся, а толькі трэснуў. Дуся падняла яго і спалохана глядзіць на мяне, бачачы ў гэтым нейкі нядобры знак. Ледзь не плача. Перадае гаршчочак у мае рукі і просіць як-небудзь наладзіць. Прынамсі, так, каб не было відаць трэшчыны. Мушу ганчаром пабыць, гаворыць яна мне і праз слёзы ўсміхаецца. Мушу сказаць, што гаршчочка я гэтак і не наладзіў, адрабіўся вершам на гэтую тэму.

Пабудзь ганчаром на хвіліну —
не вельмі вялікі тут дар.
Паслухай мяне ты, дзяўчыну,—
нядрэннае слова: ганчар.

Наладзь мне гаршчочак во гэты
(яна яго круціць ў руках).
Усё ўмець павінны паэты —
і ўсмешка мільгнула ў губах.

Не ўмееш? Ну, значыцца смачнай
не будзеш і кашы ты есць.
І мець к табе будзе няўдзячнасць
мой бацька — твой будучы цесць.

Ён скажа: пяро — гэта мала,
трымай лепш тапор ты як след.
А слава была і прапала,
гультай ты, пястун, дармаед.

Пабудзь ганчаром на хвіліну —
не вельмі вялікі тут дар.
Паслухай мяне ты, дзяўчыну,—
нядрэннае слова: ганчар.

Зімовы вечар даўгі, і не сядзець жа нам у хаце. А куды пайсці? Няма куды. І Дуся прапануе пайсці на вячоркі, у хату аднэй vдавы, у якой па суботах збіраюцца дзяў-

чаты «паскаліць зубы». Сядзяць сабе на лаўках паўз сценаў, звесіўшы ногі, лузгаюць канаплі ці семкі і з губы, як набярэцца на ёй досыць шулпаек, выплёўваюць іх на падлогу. Потым падмятаюць яе.

Мы падышлі да ўдовінай хаты. Граюць. Уваходзім. Спраўляюць прыход хлопцаў з палону. Іх пяцёра: трое з Мокрага і два з Краснага Вугла. Яны гэтымі днямі з'явіліся. Кажуць, што ўцяклі з палону. А некаторыя языкі плешчуць, што яны нідзе не былі — ні ў арміі, ні ў палоне. Хаваліся ў лесе, і ўсё. Дэзерціры. Вось і прыйшлі. З палону так лёгка драла не дасі. Сюды на вячоркі яны прыйшлі з гармонікам і гарэлкай. Дзяўчаты прыдбалі нейкую закусь. П'юць. Гуляюць. Танцуюць. Лямпа ґоніць копаць. У хаце паўзмрок. Нас не шмат хто й заўважыў. Дуся ўціснулася між дзяўчатаў на лаўцы. Трымае мяне каля сябе за руку. А недалёка ад нас — можа, якой трэцяй ці чацвёртай — Манька. Дуся, садзячыся, не прыкмеціла яе. Я апешыў — гэта для мяне зашмат. Але Дуся сядзіць. Заўважыўшы маю разгубленасць, распасцірае полы свае шубы і, ашчаперыўшы, захінае мяне. Манька, угледзеўшы нас, скокнула з лаўкі і — да парога. Знікла. Дуся мяне туліць, шэпча на вуха, каб я надта не хваляваўся. І я, сапраўды, супакоіўся ў ейных абдымках. А вячоркі йдуць сваім ходам. Ды хлопцаў няма ўжо ў танцах. Як і я, яны прыліплі да дзяўчатаў на лаўцы, схаваліся ў распасцёртых полах дзявоцкіх манталяў. Гэткім спосабам дзяўчаты засланяюцца ад сваіх суседак побач, і хлопцы, надта не саромячыся, паспяхова карыстаюцца такой утульнасцяй.

Незанятыя дзяўчаты, пабраўшыся з сабой, заўзята, як бы назло хлопцам, віхураць, круцяцца ў танцы. Хлопцаў не хапае, што ты сабе ні рабі.

У хату найшло столькі, што не прайсці. Змрочна. Душна, як у лазні. Манькі не відаць. Пайшла дахаты? Магчыма.

Абняўшы Дусю за талію пад шубай, я стаю спіною на хату. Схіляюся ёй на грудзі, і яна гладзіць мяне на затылку, знывае ад пяшчоты, гледзячы на дзявочы карагод затуманенымі вачыма.

Не відно было, адкуль нахапілася Манька і з нейкай бутэлькі плёснула газай у Дусіны вочы. І ўцякла. Добрая доля газы трапіла мне на спіну, што й выратавала Дусю. Калі мы прыйшлі дахаты, Пі́ліп і Хіма ўжо спалі. Дуся нагрэла вады, нешта ўсыпала ў яе, прамыла вочы.

У пасцелі, тулячыся, Дуся ў слязах пачала наракаць:

— Гэта ты, Юзік, вінаваты. Гэта твая віна, Юзік. Нашто ты чапаў яе, Юзік?

Я, можна сказаць, цалкам занядбаў сваю хату — амаль не жыву ў ёй. Часам па тры дні ўзапар не бываю. А калі й бываю, дык толькі ўдзень, калі бацьку трэба дапамагчы. А так — жыву ў Піліпа. Нідзе не чуваць, каб у нашых ваколіцах заяўлялі пра сябе партызаны, і я карыстаюся гэтым зацішшам — начую й днюю ў Дусі. І самыя нашыя вёскі, засыпаныя снегам, дрэмяць у сваім зімовым сне. Адрэзаным ад свету, ім усё роўна, што дзеецца ў тым свеце. Яны жывуць сваім, замкнутым у сабе, жыццём, і ствараецца ўражанне поўнага міру. Я й карыстаю з гэтага міру, а мір для мяне — гэта Дуся. Пры ёй я не думаю. Пры ёй у мяне няма ні мінулага, ні будучыні, толькі тое, што цяпер, у дадзены момант, і гэта робіць мяне ўпершыню чалавекам, свабодным ад цяжару думаць. У мяне няма іншага жадання, як толькі быць у Дусі. Я не магу перабыць без яе нават аднэй начы. Што б ні рабіў я ўдзень, дзе б я ні быў, ноч вядзе мяне да яе, як у ціхую, мірную прыстань, дзе — я ведаю — знайду сабе заспакаенне, дзе я праяўлюся чалавекам, адкінуўшы ад сябе непатрэбны цяжар роздуму.

Пасля начы мы ўдзень ні за што не бярэмся. Адольвае лянота і дрэмнасць. Хіма не змушае Дусю рабіць што-небудзь. Песціць яе, ашчаджае ейную далікатную натуру. Часам, смеючыся, гаворыць: «Спрацаваную, Масеевіч не будзе цябе любіць». Гэтак мы й не заўважаем у бяздзеллі, як праходзіць кароткі зімовы дзень і наступае вечар. А наступае вечар, мы ажываем, нам хочацца куды-небудзь з хаты. Хоць бы і на тыя вячоркі. А то — для перамены — ідзем да каго-небудзь з ейнай радні, досыць шматлікай у Мокрым. Цяпер мясаед, і нас ахвотна прымаюць, частуюць, пытаюцца, калі ж мы запросім на наша вяселле. Заседзеўшыся, мы часам і начуем у Дусінай радні. Нас не адпушчаюць: позна ўжо і можна напароцца на бяду. Сцеляць нам пасцель, і мы радуемся такому душэўнаму прыйму. Спімо. Яшчэ неяк і лепей у іншай хаце. Мы — неразлучныя, нам здаецца, што ўжо ў нас няма іншага прызначэння, як толькі быць разам. З нас дзівяцца, што мы — як спараныя ці ачмурэлыя. Ліжамся, як кот з кошкай. Ці не на бяду якую, гавораць. Ужо ў абедзвюх Мокрых

ведаюць, што Дуся зацяжарала — жанчыны дазналіся па Дусіным абліччы, гавораць — наелася ўжо.

У Дусі я заўважаю перамену: яна больш вяжацца да мяне, утуляецца ў мяне, як бы баіцца ўпусціць мяне. Гаворыць: «Хутка я не дам табе, і што ты тады будзеш рабіць? Пойдзеш да другой?» Смеючыся, дадае: «Калі ўжо табе так заманецца, я адпушчу цябе да якой-небудзь. Толькі не да Манькі. Але да каго б ты ні пайшоў, ты ўсё роўна прыйдзеш да мяне. Я цябе прываражыла. Прываражыла, Юзік? Ты, ведаю, прыбяжыш да мяне, як цюцька. Як Юзік. Ну, пагладзь у мяне жывот. Я ета люблю. Паглядзі, я ўжо цябе не саромлюся. Праўда, прыгожы ў мяне жывот? Яшчэ й невялікі. Нічога й не відаць».

Горнецца да мяне. Сваёй шчакой трэцца аб маю. А то наваліцца на маю грудзіну — слухае маё сэрца. Усё гэта не можа не падабацца мне, і пад ейным уздзеяннем я станаўлюся непадобным да сябе чалавекам — куды лепшым, чымся я ёсць на самай справе.

Але я пачаў усё болей і болей задумвацца, чым гэта ўсё скончыцца? Надыдзе ж час, калі я буду расплачвацца за ўсё гэта. І той час, відаць, не за гарамі. Я прадчуваю набліжэнне яго. І тым не менш нічога не раблю, нічога не думаю, нічога не плануую. Зрэшты, а калі я што планаваў. Я ніколі не планаваў свайго жыцця. Яно, маё жыццё, планавалася, вызначалася не мною, а нейкай іншай сілай, я ўсё думаю — вышэйшай. У маім жыцці, як я цяпер бачу, было запланавана два вырашальных павароты. Адзін з іх ужо адбыўся. Гэта — арышт. Гэта той паварот, што мусіў адбыцца. Ён быў прадвызначаны, быў нават неабходным. Не было б яго, не было б мяне. Арышт, турма, Калыма былі для мяне выратавальным паваротам. Я выдаў сябе шмат на іх, але яны збудавалі мяне, выратавалі мяне. Лёс паклапаціўся захаваць мяне. Ён не кінуў у раз'юшанае, ненасытнае жэрла вайны. Утрымаў мяне вонках яе, бярог. Было кімсьці разлічана, што з вайны я не выйшаў бы. І мне было наканована: турма, пакуты, праз якія я й выратаваўся. І цяпер, выратаваны, я стаю перад новай пагрозай. Я стаю між кувалдай і молатам. Я зацёрты дзвюма сіламі, і ў мяне засталося мала прасторы для манеўравання паміж імі. Гэтая прастора няспынна звужаецца і звужаецца. Я буду раздаўлены, калі не выйду з гэтага прамежку. Я стаю ўласна перад другім, фінальным паваротам у маім жыцці. Трэцяга ўжо не будзе. Той трэці — гэта ўжо не паварот, а зварот да пачатку.

Дуся не разумее гэтай наканаванасці, яна занадта шчаслівая для гэтага. Яна чакае часу, калі я ўвяду яе ў сваю хату. Яна просіць мяне справіць вяселле. Гэтага хочуць ейныя бацькі. Для яе самой яно няважнае. Ёй усё роўна, дзе жыць, абы са мною. Яна нават саромеецца вяселля як нейкага афіцыйнага акта. Яна кажа, што пасля вяселля яна будзе ўжо сапраўды маёй жонкаю і гэта будзе нецікава. Ёй падабаецца нашае незаконнае жыццё. Але яна хоча задаволіць просьбу бацькоў, якія ёй усё дазвалялі, ніколі не жуцілі за сужыццё са мною. Яна не можа не паслухацца іх. І мы паехалі з ейным бацькам на гарбунку ў Клінцы прыдбаць для Дусі нешта з адзення, патрэбнага ёй на вяселле. У Клінцах, прамысловым горадзе, ёсць тавары, хоць іх можна дастаць толькі за натуру — сала, мяса, хлеб. Падарожжа ў Клінцы было паспяховым. Туды і назад ехалі з начлегам у дарозе. Спалі з Дусяй на падлозе ў хатах, дзе нас пушчалі на ноч. Піліпу, старэйшаму чалавеку, слалі на лаўцы. Для Дусі мы знайшлі ў Клінцах амаль усё патрэбнае ёй. Для мяне мы набылі касцюм. Піліп нічога для сябе не захацеў — зрэшты, не было ўжо за што купляць. Да вяселля было ўжо ўсё гатова, але вяселля ўсё не было. З розных прычынаў: неадпаведны час (я не змагу ўжо, прывёўшы Дусю ў хату, туляцца, як дасюль, мушу быць у хаце), а галоўнае ўсё ж — мае бацькі не хочуць Дусі. «Наўзверх усяго — мо давядзецца выбірацца куды, дык навошта тады важдацца,— тлумачыць мне бацька.— Пачакай трохі»,— радзіць ён мне.

Дуся не магла не ведаць пра ўсе гэтыя абставіны і просіць мяне перабрацца да яе канчальна. «Будзеш у мяне жыць прымаком,— жартуе,— прыму цябе».

І я жыву ў яе на палажэнні прымака. Не зусім, канешне, так. Я бываю і ў сваёй хаце і нават болей, як дасюль, лагоджу бацькоў, не хачу крыўдзіць іх, мне адданых і дзеля мяне гатовых пайсці на ўсё.

Бацька перастаў займацца сваім рамяством — стругаць клёпкі на вёдры, на бочкі, на шайкі, не шукае ў лесе клёну ці бярозы на палазы для саняў, не точыць верацёнаў. Усім гэтым ён займаўся кожную зіму, майстраваў, вазіў свой выраб на кірмаш, прадаваў, каб зарабіць, дадаць нешта да таго, што прыдбаў улетку, каб стаць, як ён казаў, на ногі. Цяпер ён усё гэта занядбаў. Ягоны вярстак, вынесены з хаты ў канцы мінулай зімы, застаецца ляжаць пад павецяй. У хаце ні стружак, ні клёпак, ні палазоў, ні

капылоў, ні абручоў, ні абрэзкаў. Бацька закінуў усё гэта. Ляжыць на печы. Плюе, лежачы, у столь над сабою. Нават пра скаціну не рупіцца. Маці найбольш ходаецца. Па дровы ў лес ні разу за зіму мы з ім не з'ездзілі. Палім печ тымі, што назапасілі восеняй. Ужо неяк пад канец зімы надумаўся схадзіць у поле, паглядзець нашыя азімыя — ці не адмерзла дзе што. Вяртаючыся, прыносіць знойдзены ім у полі вялізны цюк, бацька здагадаўся — скінуты з самалёта. На нашым полі не раз скідвалі лістоўкі і нямецкія і савецкія самалёты — кожны сваё. Развязваем цюк, а ў ім — вялікага памеру лістоўкі на нямецкай мове. Ілюстраваныя: відны згарэлыя танкі, самалёты, бранявікі, гарматы, іншая зброя і даўжэзныя калоны салдатаў пад канвоем. Я хачу зразумець, што пішацца ў лістоўках і не магу — зашмат незразумелых для мяне словаў і граматычных канструкцый, а слоўніка ў мяне няма. Але чытаю і чытаю, па некалькі разоў адно і тое ж — хачу дапяць. Разважаю: чаму для нас лістоўкі па-нямецку? У нас жа немцаў няма. Тады для каго гэтыя лістоўкі? Скідалі лістоўкі і савецкія і нямецкія самалёты, але толькі па-руску. Яны былі прызначаныя для нас. А гэтыя? Хто іх скінуў і для каго? Немцы для немцаў? Але ж у нас няма немцаў. Доўга я прыкідваў і так і гэтак, і ўсё роўна ў мяне, недагадлівага, нічога не выходзіла. Гледзячы на здымкі і расчытваючы тэкст, я не мог уцяміць, хто пераможца і хто пераможаны. Больш таго, напачатку я нават не ведаў, дзе гэта ўсё адбылося, аж пакуль, пры далейшым азнаямленні, не дазнаўся, што гэта ж Сталінград і што гэта савецкія лістоўкі, прызначаныя для нямецкіх салдатаў, што яшчэ не склалі свае зброі, як тыя, пад Сталінградам, якіх цяпер вядуць зось у палон і ззаду якіх курыць на полі бою разгромленая нямецкая машынэрыя. У лістоўцы пададзеныя лічбы: трыста тысячаў узята ў палон, гэтулькі і гэтулькі забіта, паранена, гэтулькі і гэтулькі знішчана танкаў, браневікоў, гарматаў і г. д. Карціна жудасная, якой нельга ўзяць пад сумлеў. Я, нарэшце, зразумеў, што гэта перамога нашай арміі, што немцы пацярпелі катастрофу, што ім ніколі болей не ачухацца. Я расказаў пра ўсё гэта бацьку. Бацька сам пачаў разглядаць лістоўку — здымкі на ёй і, скончыўшы, сказаў, як падагульніў:

— Значыць, немец не ўдзержыцца. Патурацць назад.

«Патурацць назад» бацька вымавіў гэтак, быццам гэта тычыцца і нас, быццам і нашая доля залежыць ад таго, што сталася пад Сталінградам.

Бацька спадзяваўся, што гэтая вайна змяце шолудзь — людзей, што стаяць над табой, піхаюць цябе, варочаюць табой, як быдлам якім, а ты і слова ім не скажы.

У бацькі ўскіпела душа яшчэ і за мяне — ён не мог даравапь гэтай шолудзі, што яна засадзіла мяне, збіла мяне з дарогі, калі я ўзбіраўся на яе і калі ён ужо радаваўся маім узыходжаннем. Ён думаў, што шолудзі прыйшоў канец, а тут, глядзі, яна бярэ верх, зноў усядзецца на цябе.

«Я не прыняў адразу яе, гэтую шолудзь адкінуў яе, паказаў, што пагарджаю ёю, не захаваў свае радасці, што яе пагналі адсюль. Я ўжо не мог цярпець яе. Не мог цярпець яе пад маім вакном, калі яна загадвала мне, куды я мушу пайсці і што я мушу рабіць. Калгас, створаны гэтай шолуддзю, я гатоў быў сам, сваімі рукамі пабіць на палоскі і раздаць яго людзям. Прыйшоў час, і разбіў яго на палоскі ты, мой сын. Над маёй нівай ужо ўзыходзіла сонца, шолудзь была схавалася, а цяпер, глядзі, яна зноў узнімае галаву. Я не хачу бачыць яе, гэтую шолудзь Я лепш сыду, пакіну свае вуглы, пайду ў свет, але не стану зноў пад каманду гэтай шолудзі.

Сын, мы адпакутавалі за цябе. Шолудзь насмяялася над намі. Шолудзь радавалася нашаму няшчасцю.

Сын, адбалела наша душа па табе. Мы свету Божага не бачылі ад слёз па табе. Мы снілі цябе. Не было часіны, каб не думалі пра цябе. Мы пакутавалі тваімі пакутамі.

Сын, узрадавалася сэрца наша, як прыйшоў ты. Засвяціла сонца ў наша вакно, як пабачылі мы цябе, спасёнага.

Сын, шолудзь страляла па табе. Маці твая — ні жывая і ні мёртвая — канчалася, гледзячы, як б'юць па табе.

Сын, мы сваё аджылі тут. У душы сваёй я ўжо развітаўся тут з усім. Развітвайся й ты. Не марудзь. Усё чыста падказвае мне — мы мусім выйсці адсюль. Сны мае звяшчаюць нам берагчыся. Ідуць, кімсьці пасланыя, грознай навалаю, ноч у ноч усё тыя ж сны. Не даюць маёй душы супакоіцца. Паслухай толькі...

Быццам усе нашыя палоскі, што былі заараныя пад калгас, выступілі наўзверх з-пад ворыва, і я, усцешаны такому цуду, бачу іх такімі саменькімі, якія яны былі і пры нас. З радасцяй той крычу вам: «Глядзеце, нашыя палоскі вярнуліся да нас і просяць нас засеяць іх». І вы пабеглі — і ты, і маці, і Дарка — глядзець тыя палоскі. А на іх ужо ўвомірг, на нашых вачох, ураджай закрасаваў: там — жыта, там — пшаніца, а там — ячмень, а там —

грэчка, авёс, бульба і самая найпрыгажэйшая палоска льну — цвіце ўсіма колерамі. Маці радуецца — натчэ палатна, абшые нас усіх. Глядзіць — вачэй не зводзіць. Аж бачым: адкульсьці адтуль, дзе змыкаецца неба з зямлёю, выплываюць да нас хвалі нейкага шырокага сіняга мора. Коцяцца і коцяцца. Усё бліжэй і бліжэй. Займаюць, затапляюць прастору. Шумяць. Іх вал нарастае, узвышаецца. Мы ў страху глядзім, як гэты магутны вадзяны вал мне, вальцуе нашыя палоскі, паглынае ўсё, што на іх, і пагрозліва ўжо падступаецца да нас, гатовы ўцягнуць, усмактаць нас. Мы ў страху — адступаць, а вал — наступаць. Дагнаў нас да самага нашага агарода і — стаў. Зменшыўся. Упаў. Вада пацягнула яго назад, і ён, шыпучы, дробненькімі хвалямі пакаціўся ад нас. І гэтак вада пайшла, але не прайшоў страх. Вада — гэта бяда. З агарода ідзём у сваю хату. Падышлі да ганка. Я хачу ўзяцца за клямку, каб адчыніць дзверы, а дзверы самі адчыняюцца, і на парозе, у праёме дзвярэй, бачым — стаіць белы, як лунь, з лагоднай усмешкай, старэнькі не то чалавек, не то вобраз чалавека і ласкава гаворыць: «Не, дзеці мае, не заходзьце. Ідзеце ў свой пуць. Не марудзьце. На вас ганенне». Сказаў, і яго не стала. Не стала і нашай хаты, як бы яе і не было зусім. І мы пачалі выбірацца. Карова пачула, што мы выбіраемся — зарыкала. Мы ўзялі яе на повад. Дробны скот пакінулі. Маці ўзваліла на сябе трубкі палатна, і мы ўжо ў дарозе. Куды йдзём, не ведаем. Нібы ў Касцюковічы. Ідзём і йдзём. Вядзем на повадзе карову. І гэта ўвесь наш набытак. На дарозе — нікагусенькі. Толькі мы. Хоць дзень і сонечны, але як бы злёгку займглёны, і нам здаецца, што мы глядзім на свет праз светла-жоўтыя акуляры. Ужо мусілі б быць і Касцюковічы, а іх няма. Раптам пялёнку нам зняло з вачэй і перад намі — лес, але які: з роўна зрэзаным, як пад шнур, верхам. Быццам нехта заклаў электрычную пілу і адным цягам адцяў, збрыў макушкі, і ён стаіць цяпер, ківаючы, як куцобкамі, сваімі голымі ствaламі. Мы баяліся йсці праз гэты лес, а іншай дарогі ў нас не было. Лес стаяў перад намі, як здань. Я падумаў, што гэта знёс яму галаву нейкі магутны віхор, што пранёсся над ім. Куды ісці, мы не ведалі, а ноч наступала. Сын, ты ведаеш, куды нам ісці? Ёсць у нас якая-небудзь дарога? Бачыш, што чакае нас? Вада — гэта бяда. Яна затопіць нас, і следу нашага не застанецца. Вымые нас з карэннем. Выкіне з магілаў труны нашыя, і не застанецца тут роду нашага. Прыйдзе шолудзь і ўсё выкараніць,

зрэжа, паадцінае, як злая сіла ў тым лесе макушкі. Я не хачу чакаць іхнага прыходу. Я не хачу болей глядзець ім у вочы. Я лепей сыду з свайго котлішча, а іх бачыць не хочу. Ты гатовы, сын, пайсці? Ты ведаеш, куды нам пайсці? Ты ж быў у свеце. Дык вядзі нас у свет».

Я забягаю да Піліпа кожны вечар, але доўга там не затрымліваюся. Пацалую Дусю, супакою яе і пакідаю хату. Заставацца ў яе нанач я ўжо не адважваюся пасля таго, што яна мне сказала. Мінулай начы ў іх былі партызаны: Мікола Бугроў, Шашок і Ілля Мельнікаў, Маньчын брат. Гэта тыя, што былі ў хаце, а былі ж яшчэ і на двары — Дусін бацька чуў, як яны цёрліся пад сценамі.

— Юзік, яны хацелі цябе злавіць. Думалі, што ты спіш у мяне. Нашыя дзверы былі на круку, дык яны, не дачакаўшыся, пакуль ім адчыніць бацька, рванулі дзверы гэтак, што паляцеў той і крук. Я ўскочыла з пасцелі і да маці ў рукі. А яны святлом — шась! Я калачуся. Думаю — забяруць. Не. Высвечваюць кожны куток. Бацька пытаецца, што ім трэба. Маўчаць. Толькі Шашок сказаў: «Нам ничего не нужно, хозяин. Извини за беспокойство». Маньчын жа брат уталопіўся ў мяне: «Што — не прыйшоў? Шчасце яго». І з насмешкай: «Чаго ж ён так баіцца? Мы пагаманілі б з ім. Спакойненька так. Па душам». Трымае на мне ліхтарык: «Запузаціла? Наелася? Мы ў цябе будзем акушэрамі». Скамандаваў, ён як бы ў іх камандзір: «Пайшлі!» І яны выйшлі з хаты. Ды мне здавалася, што яны ўсё яшчэ на двары. Стаяць, стаіўшыся. Я баялася, што ты можаш прыйсці да мяне ад сястры і пападзешся ім у рукі. А ты як знаў — заначаваў у сястры. Ці, можа, яшчэ дзе, Юзік?

Дуся, кожны раз, як толькі я зайду да іх, ведаючы, што я доўга не магу заставацца з ёй у хаце, хутка апранаецца, і мы выходзім з ёй. Спускаемся на ніз, да рэчкі. Праходзім паўз іхнага стажка на агародзе, цяпер напалавіну скормленага. Унізе, між хмызнякоў, зацішна. Пад месяцам, абмёрзлыя і ў шэрані, яны, здаецца, узніклі з казкі. Ад іх сыходзіць нейкая святочная цішыня і заспакоенасць. Хмызнякі адкідаюць свой цень на снег, чысты, яшчэ бялейшы ўначы. Мы стаімо між хмызнякоў, як у нейкім зачараваным царстве, і Дуся, у нейкім асаблівым настроі, абымае мяне, гаворыць: «Юзік, так прыгожа тут і ўтульна. Магла б — распласталася б на снезе». Але мы йдзём далей.

Снег залубянеў, і мы йдзём па ім не правальваючыся. Неба над намі глыбокае, урачыстае, з бяздоннай блакітнай вышынёю. Зоры высыпалі буйныя, белыя, махнатыя — па шчасце. Мы спыняемся і глядзім у гэтае неба. Нічога не гаворым. Маўчым. Не думаем. Нам добра дваім, з такім небам і зорамі над намі. Нам добра, што мы ёсць, добра, што мы ёсць такія, якія ёсць. У суботу топяць тут лазні,— а сёння якраз субота, — і мы знайшлі яшчэ нявыветраную, з духам. Заходзім. Дуся хоча паляжаць са мною на палку, пацешыць, як яна кажа, мяне, каб не адбіўся. Распасціраем Дусіну шубу. Залазім на палок. Накрываемся маёю. Дуся абшчапляе мяне. Дазваляе цалаваць яе ўсюды, дзе я хачу. Толькі, гаворыць, каб я не чапаў яе. Утуліўшы яе, хоча, каб толькі нешта шаптаў ёй, гаварыў прыгожыя словы, успамінаў прыгожыя часіны з ёю. «Але толькі не распальвайся. Нельга. Калі ўжо такі няўсцерп, дык толькі так... Я люблю цябе так. Без гэтага. Ты вось ляжыш пры мне, і мне нічога больш не трэба. Я хачу, каб ты любіў мяне так. Ты не злуешся, што я табе не дазваляю? Ты не разлюбіў мяне, Юзік? Не адбіўся? Мы ж хутка будзем мець такога Юзіка, як ты. Я ўжо чую яго, як ён штурхае ножкамі. Прытуліся вухам і паслухай. Ой, які ён будзе міленькі, маленькі, цёпленькі. Прытулю яго да грудзей — самлею. А то мы паложым яго між сабой — яму будзе так утульненька паміж намі. Потым я палажу яго ў люльку, і мы ўжо будзем з табою тады адны. Тады ўжо будзе ўсё можна. А цяпер — пацярпі».

Пад вясну начою, недзе вобак нас, я пачуў далёкі, прыглушаны гуд самалёта. Гэты гуд выклікаў у мяне трывогу. Дасюль такога не было. Наша неба было спакойным, і вось цяпер гэты спакой парушаны. Але падумаў: мала чаго — вайна ж. Дзіва што лятуць. Гуд сціх. Сціхла і трывога. Але надыходзіла ноч, і гуд узнаўляўся, далёкі і трывожны. Чые яны, гэтыя самалёты? Адкуль і куды яны лятуць? Кожны раз там, удалечыні, куды яны лятуць, чутны выбухі. Яны скідваюць там бомбы? Што там такое? Фронт? Пэўна, фронт. Набліжаецца да нас? Не. Не веру. Не хачу верыць. Ганю гэтую думку ад сябе. Але самалёты гудуць і, насуперак майму хаценню, узнімаюць у мяне пачуццё няпэўнасці і прадчуванне канца. Якога канца? Майго? Ці чыйго?

Бацька, калі яшчэ не было чутно гуду, прадчуваў

набліжэнне канца. Прадчуваў наканаванасць нашага Зыходу, які, зрэшты, пачаўся даўно, у тую самую хвіліну, калі, выбіраючыся ў Менск, я пераступіў парог нашае хаты. На двары стаяў тады запрэжаны конь, і з моманту, калі я сеў на калёсы, я ўжо быў на дарозе да свае долі. Калёсы скрануліся, і скранулася не толькі мая доля, а й доля ўсёй нашай сям'і. Бацькі й сястра збіралі мяне ў дарогу — клалі ў мой чамадан патрэбныя мне рэчы — і ўжо адначасна, таго не ўсведамляючы, яны рухаліся разам са мною ў прадвызначаную дарогу. І што б яны потым ні рабілі, яно ішло так, як яно не магло ісці іначай. Незвычайная, выключная чуллівасць і засмучанасць, з якой яны мяне выпраўлялі ў дарогу, былі сполахам і крыкам перад сляпымі вачыма лёсу, які ўжо нас засціг. Калёсы мяне павязлі, але яны ўкруцілі ў свае спіцы і ўсю маю сям'ю. Маёй сям'і ўвесь час нагадвалі, куды павезлі мяне тыя калёсы. Як бы на тых калёсах сядзеў вялікі злачынец, за якога мусяць адказваць і тыя, хто нарадзіў яго. Мы ўжо тады былі на ўзбоччы, стаялі на сваёй пуцявіне, адкінутыя. Нас, адрынутых, і падабрала наша доля. Не то што яна нас знайшла — не, мы былі кімсьці аддадзеныя ёй. І трагізм гэтага ў тым, што ты не ведаеш, што ты ўжо ўступіў на прадвызначаную табе дарогу, якая схапіла цябе і імчыць... куды?

Бацька ведаў таксама, што я вярнуся. Але ён не ведаў, што я стануся прычынай фатальнага замыслу сукрытых сілаў. Я быў у руках мае долі сляпым знараддзем, карай для тых, хто мяне найбольш шкадаваў і хто найбольш пакутаваў дзеля мяне. Ці можна было як-небудзь ухіліцца ад прадвызначанага? Не. Ад долі нельга ўхіліцца. У маёй нягеглай асобе доля ўгледзела слабае звяно ў ланцугу, вырвала яго, і ланцуг перарваўся. Але перарваўся не на мне, а на тым, хто мяне нарадзіў. Я мусіў бы быць пакараны скрытымі сіламі па закону найбольшай строгасці. Але доля мая пакінула мяне. Ці мушу я дзякаваць ёй? З пярэрвай ланцугу рассыпаліся ягоныя звенні. Счапіць, сабраць ланцуг нанова было немагчыма — выпала з яго галоўнае звяно-часціна, дзякуючы якой ён трымаўся. Паасобныя звенні-часткі, застаўшыся паасобку, зазналі пякельную муку, і не ўсе яны ўжо існуюць. Яны распаліся ў сваю чаргу і носяцца бязроднымі крупінкамі ў сусвеце. Яны глядзяць стуль сюды і, здаецца, бачаць мяне, але, балесныя і няўцешныя, праносяцца міма, ад іх спадаюць толькі расінкі-слёзы, як пасланне мне.

Асабліва выразна бачу абліччa маці — супакоенае ў сваіх пакутах. Яна ляжыць так, як яна ляжала б у труне. Але труны і яе самой не відаць. Цела яе як бы схаванае ў воблаку, а праступае з яго толькі ейнае, як асветленае зарой, абліччa.

Калі я гляджу на матчына абліччa — а я ў думках заўсёды стаю побач яе — мне здаецца, яна ведае, што я побач і што я гляджу на яе, але яна не хоча выдаць гэтага, ейнае абліччa застаецца ўсё такім жа спакойна-велічным і трошкі як бы строгім у дачыненні да мяне. Я чую сябе вінаватым перад ёю і баюся — баюся не яе — не, а кагосьці іншага.

Калі я гляджу на матчына абліччa, спакойнае, засяроджанае, мне ўяўляецца, што яна і цяпер адчувае свой боль, свае пакуты і толькі, каб магчы сцярпець іх, заснула вечным сном.

Адчуванне Зыходу ўсё ўзмацнялася ў нас. Найперш яго вычуў, распазнаў бацька ў сваіх снох. Сваімі прарочымі вачыма ён бачыў наш Зыход настолькі выразна, што ўжо сузіраў яго ва ўсёй ягонай няўхільнасці. Ён бачыў, як выплывала шырокае, сіняе мора з-пад небасхілу, затапляла нашыя палеткі, вымывала з карэннем пасаджаныя намі дрэвы, выкідвала з зямлі труны нашых продкаў, тое мора стаяла ў ягоных вачох, і ён з страхам глядзеў, як яно набліжалася да яго і, наблізіўшыся аж да самае хаты, не затапляючы яе, літасціва спынілася, каб мы маглі выбрацца з яе. Гэта было папярэджанне, відавочнае, грознае. Папярэдзіў нас, стоячы на парозе нашай хаты, і ссівелы, як лунь, чалавек ці то вобраз яго: «Не, дзеці мае, не заходзьце. Ідзеце ў свой пуць. Не марудзьце. На вас ганенне». І мы пайшлі прэч ад свае хаты. Свет перад намі займгліўся, і мы не бачым, куды мы йдзём. А калі праясніліся нашыя вочы, мы пабачылі лес з зрэзаным верхам. Гэта ўказка нам і прадвесце. У страху зайшліся душы нашыя. А тут падаспела і ноч. Куды ты пойдзеш? У роспачы мы замітусіліся. Бацька пытаецца ў мяне, куды йсці. А я й сам не ведаю, куды йсці. «Ты ж быў у свеце і мусіш ведаць. Вядзі, сын. Не марудзь. Вядзі куды-небудзь». А куды я павяду? Я нікуды не магу ісці, бацька. Я не развітаўся яшчэ з усіма і ўсім, як ты, бацька. Я яшчэ негатовы. Я прыкручаны тут магутнай сілай, прыкаваны ёю і, каб хацеў, не магу пераадолець яе. Яна трымае мяне. Не

пушчае. Я зачараваны ёю. Я ў яе палоне. Я магу пакінуць усё: і нашую родную хату, і нашыя палеткі, і магілкі нашых продкаў, але я не магу пакінуць таго, што вышэй за ўсё гэта, што ўвайшло ў кроў маю, што зраднілася са мною, як я сам з сабою, чаго ніяк не адолець, каб і хацеў адолець. Ты можаш вініць мяне, бацька. І я сапраўды вінаваты. Я ва ўсім вінаваты, і мне горка да болю, што вы мне ўсё даруеце, як бы я заслужыў перад вамі нешта такое, за што вы мусіце цяпер быць мне ўдзячнымі цэлае вашае жыццё. Ты можаш вініць мяне, бацька. Ты можаш праклясці мяне, бацька. Я заслужыў гэта. А ты, мая сястра, гаворыш, што я не вінаваты, што каб я не кваліў сябе, што гэта ўсё напісана на нашым раду.

Сястра мая, даўно цябе не бачыў —
ад самага крывавага жніўя.
Балюча мне за ўсе мае няўдачы,
за ўсе мае грахі, што аплаціў не я.

Калі б не я, усё было б іначай,
я стаўся усяму віной:
жыццё сваё і ваша перайначыў,
і ўсё пайшло не тою стараной.

Яшчэ калі баі ішлі далёка,
а ўжо і перадсмяротны час
страшней вайны аднекуль збоку
наш лёс насоўваўся на нас.

Адно другога ўсё трагічней,
і страшна — гора без турбот
збываў я песняю лірычнай,
замест каб стаць на эшафот.

Вясна ўжо выбухнула зялёнымі выбухамі купчастых дрэў. Мокрае абнавілася, патанула ў гэтых выбухах. Павеяла вясновым ветрам, заблішчэла поле краскамі, узнялося сонца і свеціць па-вясноваму радасна, бліскотна, урачыста. І я зноў на новым пад'ёме. Адчуваю ў сабе прыток новай сілы. Уваскрасаю разам з прыродаю. Шмат пішу. Уклаў зборнік сваіх вершаў. Старанна перапісаў — атрымалася цэлая кніга. Засунуў пад наша застрэшша на двары. Некалі мо вярнуся, дык буду мець, дык, паехаўшы ў Менск, аддам у выдавецтва.

Тое, што недзе ўначы гудуць самалёты, мяне ані не турбуе. Тое, што выбухі з кожным тыднем як бы набліжаюцца, успрымаецца мною як нешта пабочнае. Вёска рыхтуецца да Вялікадня. Беліць у хаце печы, чысціць, прыбірае, пячэ пасхі, фарбуе яйкі. Бацька напачатку не

думаў — як звычайна перад Вялікаднем — бяліць печ, нешта перарабляць, перастаўляць у хаце, прыбіраць на панадворку і вакол хаты, але перадумаў — узяўся. Як жа адступаць ад даўно заведзенага? Не глядзі ні на што. Памірай, а жыта сей. Маці з сястрой льюць на падлогу гарачую з чыгуноў ваду, адскрабаюць нарослы за зіму на цэлы корх бруд. Падлога, як новая, засвяцілася сваімі сасновымі палавіцамі. Каб не наслядзіць, захаваць падлогу чыстай і на свята, бацька заслаў яе саломай, і мы ходзім па ёй дзень, а то й два, пакуль не адкрыем на свята. Хата, пасля чысткі і ўпарадкавання — як не тая: вялікодная, светлая, радасная.

Заўзята рыхтуецца да Вялікадня і Хіма. У яе ўжо ўсё гатова: пасха, кулічы, сыр, шынка. Яна павязе пасху ў Папову Гару свяціць — кажуць, там ёсць поп. Дуся дапамагае маці ва ўсім. Я ж майструю люльку — Дуся будзе хутка раджаць. Яна выглядае цяпер прыгажэй і зайздросней. Жывот толькі трохі выпірае — пад ейнай балахонкай яго амаль не відаць. Яна яшчэ як дзеўка, толькі трошкі як бы папаўнела, акруглілася, паходка сцішаная, ейны стан тоіць у сабе нешта такое, што мне даспадобы, прыгожы, прывабны, на ёй блузка-безрукаўка, грудзі заяўляюць пра сябе болей, як раней, шыя — тонкага крою, вочы — як у іконкі, толькі цяпер больш глыбокія і супакоеныя. Дуся, стоячы над сталом, фарбуе, распісвае яйкі, і ўсмешка ў яе, як у нованароджанай. Зверху, з покуці, на яе глядзіць Божая маці, мне здаецца, што цяпер іх дзве. Прыбраная хата, светлыя вокны, накрыты белым абрусам стол, Дуся каля яго, запаленая лампадка пад абразамі і нават тое, што я майструю люльку, стругаю гэблікам дно пад яе і мне пад ногі спадаюць закручастыя стружкі — усё гэта мае нейкі асаблівы сэнс, ва ўсім гэтым адчуванне нечага, што мае хутка наступіць, адчуванне, што яно ўжо тут, у хаце, варта толькі нейкай нябачнай завесе расхінуцца — і з'явіцца цуда. Толькі трэба ўчуцца і чакаць. Усё ў чаканні — і Дуся, і люлька, і хата, і я.

Я ўсё сваё жыццё чакаў. Думаў, што ўсё маё яшчэ наперадзе. Што прыйдзе тое сапраўднае, маё, чаго я хачу і да чаго імкнуся. Што тое, чым я жыву цяпер,— гэта яшчэ не маё «я», што маё «я» яшчэ будзе, мае наступіць. А што такое маё «я», якое яно, я й сам не ведаў. Ды й не думаў пра гэта ніколі. Але ўсё-ткі недзе, у падсвядомасці, было спадзяванне нечага, хоць і няяснага. Я не ведаў, што яно такое і не меў клопату пазнаць яго. Гэта я ўжо цяпер

«аналізую». Тады ж я нічога не ведаў і ведаць не хацеў. У мяне не было ніякай патрэбы да майго «я». Я быў шчаслівейшым чалавекам без яго. Нашто яно было мне? Мне было добра жыць без яго, без майго «я». Гэта ўжо неяк бацька прабудзіў тое маё «я».

У першую сусветную вайну бацька мой быў салдатам, звычайным салдатам, не ўмеў ні пісаць, ні чытаць. Быў ён на фронце недзе ў Румыніі. Умовы на пазіцыях цяжкія, у тым ліку — санітарныя — завяліся вошы і блохі. Заелі, скусалі салдатаў. Бацькаў камандзір, якога ён паважаў як адукаванага і разумнага чалавека, вазьмі і напішы верш пра вош. Бацька не гаварыў «напісаў верш», а — «складна ўняў пра вош». У тым вершы, звернутым да вошы, камандзір радзіў ёй, вошы, пакінуць грызці беднага салдата ў зямлянцы, худога і знясіленага, а запаўзці пад кашулю афіцэра, ён гладзейшы, у яго больш крыві, чыстая бялізна і наогул куды лепшыя ўмовы, як у таго абяскроўленага салдата. Камандзір прачытаў свой твор салдатам, і тыя, канешне, былі ў захапленні ад яго. Гэтую гісторыю бацька расказаў мне, калі я хадзіў у трэці клас. Закончыў бацька пра свайго камандзіра словамі: «Складна ўмеў пісаць. Вот чалавек быў! Галава!»

Я й захацеў быць той «галавой», захацеў «складна» пісаць. Гэтак пачалося ўсведамленне майго «я». І цяпер я — як бы на самай справе я. Але гэтае маё «я» завяло мяне, відаць, не туды. Я пакутую ад яго. І не толькі я, а й мае бліжнія. Я паддаўся свайму «я». Яно перамагло мяне. Дзе цяпер я? Дзе цяпер яно? Нідзе. Да майго «я» звяртаецца цяпер бацька, просіць, каб маё «я» нешта парадзіла. Што нам рабіць і куды дзецца? Але маё «я» слабое. Яно не здольна на нейкі рашучы крок. Я ў палоне майго «я». Над ім не стаіць розум. Маё «я» не падпарадкоўваецца розуму. Я раблю ўсё насуперак розуму. Мне, напрыклад, трэба было б пайсці ў партызаны. Паслухацца Вяркеева, а яшчэ перад ім — тых, што заходзілі да нас, дамагаліся сустрэчы са мною. Выпускаў бы газету. Складаў бы лістоўкі. Я ж навучыўся ўжо пісаць «складна». Быў бы ў лясным партызанскім штабе. Мог бы ўзяць з сабою і Дусю ці хадзіць да яе з лесу. Каб у мяне быў розум, ён падказаў бы мне толькі такі варыянт. Але маё «я» не захацела. Адкінула такі варыянт. Пайшоўшы ў лес, я мог бы выжыць у лесе: лес усё-ткі — не фронт. А прыйшоў бы той сапраўдны фронт, ён хіба ацаніў бы мае лясныя партызанскія заслугі і ўзяў бы мяне на сваё ўзбраен-

не, як чалавека, што ўмее складна пісаць. І гэтак я перасядзеў бы недзе ўсю вайну, як яе пераседзелі шмат якія майстры складна пісаць. Таго глядзі, я мог бы быць сёння ў маёй шматпакутнай Беларусі народным. Але маё неразумнае «я» не пайшло па гэтай дарозе, засталося сваім «я». Мне не наканавана было быць народным. І гэтак я застаўся з сваім «я». Я не ведаю, ці гэта добра. Цешу сябе толькі тым, што, не зрабіўшыся народным, я меў магчымасць сказаць пра сваё «я». Часамі прыходзіць дума, якую я, канешне, нікому не выказваю, што гэтае маё маленькае «я» некалі перацягне на вазе справядлівасці народнага гладкапісца. Але гэта толькі між іншага.

Ды як бы там ні было, майму «я» прад'яўлены цяпер рахунак. І я плачу па ім. Ужо заплаціў самай дарагой і жудкай цаной. Нарэшце маё «я» прывяло да таго Зыходу, пра які я гаварыў раней.

Застаўшыся з сваім рахункам сам-насам, я сяджу цяпер і думаю. Не, я нават не думаю. Маё «я» не думае. Яно не ўмее думаць. Ці, можа, не хоча. Не хоча азмрочваць свайго існавання, як я.

Пайду да Дусі. Я даўно ўжо не быў у яе. Ад самага Вялікадня. Працаваў у сястры, што ў Красным Вуглу. Ейны муж прыйшоў быў з палону, але не пабыў у хаце і тыдня, як яго сцягнулі з печы партызаны і забралі з сабою. Між іншым, пазней ён загіне ў Берліне, пры ўзяцці рэйхстага. Калі я прыйшоў да Дусі, у яе былі пачаўшыся ўжо схваткі. Цэлую ноч не спала. Прайшлі болі, а цяпер зноў. Маці супакойвае яе, кажа, што гэта яшчэ толькі «звяшчэнне». Пры мне Дуся хоча трымацца бадзёра, але гэта ёй не надта ўдаецца. У слязах гаворыць мне: «Памру, Юзік», просіць быць з ёю. Яна перайшла ў нашу святліцу, за шырму. Лягла на ложак. Я каля яе. Цалую яе. Супакойваю. Хачу адхінуць коўдру, якой яна накрылася, хачу паглядзець, як будзе йсці Юзік, а яна просіць не глядзець на яе, гаворыць, яна цяпер непрыгожая. Сціхла. Мусіць, заснула. Хіма просіць мяне адысціся ад Дусі — няхай паспіць. Я выйшаў з святліцы, узяўшы з Дусінай палічкі ейны сшытак і алавічок. Сеў за стол. Хачу нешта напісаць Юзіку. Даць яму нейкае настаўленне, якім бы ён кіраваўся ў жыцці. Думаю. І ўжо хутчэй мой розум падказаў мне:

Родись и смело в мир иди,
ставь на своем, борись и добивайся,
имей нахальство с вежливостью и
всегда недремлющее око.

Калі Дуся паднялася, я даў ёй прачытаць гэта.

— Юзік, ета мне не наравіцца. Я не хачу, каб наш Юзік меў нахальства. Ён жа будзе ў нас добранькі, міленькі, лагодненькі. І як гэта — каб ён не спаў, ніколі не драмаў, меў заўсёды «нядрэмлюшчае вока»? Юзік, даражэнькі, родненькі, напішы яму што-небудзь другое, нешта такое прыгожае, вясёлае.

Я пачаў суцяшаць Дусю: напішу, напішу, не хвалюйся. Дусі стала дрэнна. У корчах яна пайшла на ложак за шырму.

У Хімы напагатове стаяла на загнеце нагрэтая вада, а на стале ляжаў цэлы ахапак бялізны, у тым ліку прасцірадла, побач стаялі начовачкі з мылам у іх. Хіма выскачыла з хаты і хутка вярнулася з бабкай-павітухай. Хіма мне сказала:

— Ідзі, Масеевіч, куды-небудзь адсюль. Не стой тут. Мужчына не мусіць быць цяпер у хаце.

І я выйшаў на двор. На вуліцы не хацеў заставацца. Іду ў поле. Яно тут жа, побач. Усё навокала — у веснавым цвіценні, пышнае, у мностве колераў, грае, жыве, узнімаецца, расце, як вокам кінуць — шырыня, прастор, захапленне. Іду, і мне здаецца, Вялікадне яшчэ не скончылася. Поле йдзе паўз рэчку. Там узняўся ва ўсім сваім жоўтым царстве вербалоз. Прыгадалася мне, як на Вербніцу секла мяне Хіма галінкамі вярбы з шэра-срэбнымі коцікамі на іх, секла й прыгаворвала:

— Верба ксціць — Бог прасціць. Глядзі, не пакрыўдзі мне Дуську. Верба ксціць — Бог прасціць.

Я пакрыўдзіў Дуську? Як яна цяпер там? Боязна. Радасна. У адчуваннях цэлы нейкі хаос. Усё занялося ў душы, што дасюль драмала. Запякло. Зашчымела. Іду і ўжо нічога не прыкмячаю. Увесь у сабе самім. Дык вось яно нарэшце і прыйшло тое, пра што й не думалася, што атрымалася само па сабе. Няхай і так. Усё яно і было, можа, толькі для гэтага. Цяпер яно набывае іншы сэнс. Сапраўдны. Тое, што было мімалётным, замацуецца цяпер навекі. Ніколі не высахне крыніца радасці. Яна заструменіцца новым ключом, будзе паталяць тваю смагу, і ты будзеш прыпадаць да яе, піць з ейнага самага дна, і будзе яна заўсёды поўнай.

Апамятаўся. Бягу назад. Хіма сустракае мяне на парозе:

— Міколка, (яна ўпершыню пакінула сваё «Масевіч»), Міколка, паздраўляю цябе з хлопчыкам. Такім слаўненькім хлопчыкам.

Крык хлопчыка агаласіў усю хату, а мне ўпаў у самае сэрца. Я ўжо — за шырмай. Дуся трымае яго, як абмазанага нечым, на руках. Вочы ў яе... З чым іх можна параўнаць? Спакутавана радасныя, глядзяць на мяне, блішчаць, паведамляюць, гавораць нешта дасюль няведамае.

— Юзік, ну дык падыдзі ж. Спужаўся, ці што? Вазьмі нашага Юзіка. Патрымай на сваіх руках. Паглядзі на яго — і ён усміхнецца табе.

Я ўзяў, не ведаючы, як яго трымаць, на рукі. Закрычаў.

— Бачыш, і адгукнуўся табе. Давай назад. Ты не ўмееш трымаць. Як мы яго назавём, Юзік? Я ўжо хачу цяпер жа называць яго ягоным імем. Мы не будзем даваць яму імя Юзік. Юзік — толькі ты ў мяне адзін. Ты мне казаў, што, калі будзе хлопчык, дасі яму імя твайго брата Васіля. Так? Згодны? Ну й добра. Васіль, Васілёк, Васілёчак. Глядзі, як ён усміхнуўся, наш Васілёчак. Пачуў, што яго клічуць.

Дуся палажыла Васілька вобак сябе, а мяне прыцягнула:

— Не хочаш мяне пацалаваць, дык я цябе.

Я прыгарнуў Дусю з усёю сваёю жарсцяй да сябе. На ейных вачох заблішчэлі слёзы радасці. Гавару ёй: «Ну вось мы ўжо і ўтрох». Цалую яе. «Я табе буду гушкаць Васілька ў люльцы. Каб ты магла паспаць».— «Дзякую. Я прысплю Васілька і прыйду да цябе. Пачакай яшчэ».

Дусін твар перасмыкнуўся сударгай болю.

— Але я хутка папраўлюся, Юзік. Глядзі, Васілёк цмокае, плямкае губкамі. Хоча есцейкі.

Дуся бярэ Васілька. Прыладжвае да грудзей. Дае яму цыцы.

Прайшоў тыдзень, і з Васільком усё ўнармавалася: вясёленькі і задаволены, цмокча сабе, ухапіўшыся пальчыкамі за матчыну цыцку. Яна дае яму з абедзвюх, і для Васілька хапае болей, чымся даволі. Усяго й не спажывае, і яно, бывае, льецца яшчэ на Дусіны грудзі — уся ейная блузка закапаная. Спіць Васілёк таксама добра — усю ноч не прачынаючыся. Толькі ў Дусі не ўсё яшчэ ў парадку: нешта ў яе там не гоіцца, ці што. І маці парадзі-

ла ёй запрасіць мяне. Дуся баялася, што ёй будзе балець, а калі дайшло да гэтага, яна была ахвочай, не менш чымся звычайна. Хіміна парада апраўдала сябе, і Дуся была цалкам ужо на нагах, заблішчэла новым бляскам маладой жанчыны-маці.

Усё ідзе як мае быць. Толькі не йдзе яно як мае быць са мною. Дусю я не магу ўвесці ў сваю хату, як належалася б. Не магу, бо не сёння, дык заўтра пакінеш яе, сваю хату. Хата ўжо як не свая. Мне ўжо позна шукаць магчымасцяў, якія б дазвалялі мне заставацца тут. Я не магу перайначваць сябе. Я апынуўся зноў на фатальнай дарозе. Быў час, калі мне давалі магчымасць падумаць. Але я не хацеў думаць. Я жыву ў бяздум'і, аддаюся яму. Я спазнаў найвышэйшую асалоду ў бяздум'і і не хачу выходзіць з яго. Я знайшоў яго ў поўнай аддачы сябе некаму другому. Той другі пайшоў насустрач мне, і абодва мы, праглынутыя тым бяздум'ем, праваліліся ў ім. Што — я прыходжу цяпер да розуму? Не, мой позні розум ужо не дапаможа мне. Мяне вядзе маё бяздумнае «я». Мяне ўжо мо й забылі — каму я патрэбны? — але я ўсё хаваюся ад іх. Я баязлівец? Не мужчына? Не салдат? Не патрыёт? Нездарма ж я прызнаваўся сваім сябрам, што я — Мечык з фадзееўскага «Разгрому», які, ухіляючыся ад бою, хаваўся ў кустох, каб не загінуць. Мой следчы дакараў мяне гэтым, разглядаў гэта як здраду Радзіме. І сапраўды, я хаваюся ў кустох. Я не для бою. Я для нечага іншага. Я схаваўся пад крылом жанчыны. Я ў палоне жаночага. У мяне яно было прапушчана, і цяпер я не магу адарвацца ад яго.

Я не начую ў хаце. Лета ўва ўсёй сваёй красе, і я начую ў полі, як некалі, калі я быў малым і вадзіў у начное коней. Надыходзіць вечар, і я, адпаведна апрануўшыся, іду ў ноч. Яна поўны мой уладар і ахоўца. Я спасціг ейную мову цішыні, ейны таемны ход, і я не баюся начы. Я з ёю заадно. Я болей углядаюся ў начное неба, як сплю. Над маёй галавой асыпаецца зорны пыл. Я любуюся і заміраю, гледзячы, як каторая з іх, сарваўшыся, падае ў бездань, пакідаючы за сабой агністы след.

Раніцою я вяртаюся дахаты і калі бачу сястру, выйшаўшую на наш агарод, значыць — усё ў парадку, магу заходзіць у хату. Ніхто мяне не падпільноўвае. Днём я працую ў полі навідавоку — калі б ехалі адкуль парты-

заны, можна схавацца. У полі яны не бяруць людзей. Не тое, што ў хаце, дзе цябе яны могуць заўсёды зашчучыць. Але часцей за ўсё раніцою я чакаю Дусю. Заходжу на іхную сенажаць, што за выганам. Адсюль я бачу нават іхную хату. Сонца, узняўшыся, добра ўжо свеціць, пад ім заблішчэла, замігцела блакітным вогнівам раса. Абрасяненыя, выпаўзаюць на кветкі пчолы. Спакой. Нідзе навокал нікога. Толькі дзесьці ў жыце маніць сваіх дзяцей перапёлка. Узняўшыся, я гляджу на выган, ці не йдзе Дуся. Іхная хата насупраць выгану, і, калі яна ўвойдзе ў гоя, я буду бачыць яе. Вось, бачу,— ідзе: трымае — неяк высока — на руках Васілька, спяшаецца. Махаю ёй рукой, каб бачыла, дзе я. Васілёк ужо вялікі — можа сядзець. Дуся заўсёды прыносіць усё патрэбнае для яго. Васілёк пазнае мяне — усміхаецца, трэпае ручкамі. Мы садзім яго, падклаўшы нешта, на траву, між красак, даём цацку, і ён бразгае ёю, глядзіць, забаўляецца. Дуся ў лёгкай сукенцы, уся правеўная, лёгкая, даступная, садзіцца побач мяне на маё начное ўбранне. Мы хочам адно аднаго і доўга ляжым, забыўшыся на Васілька, нам сцішна і ўтульна, ляжым, аж пакуль закрычыць Васілёк. Узнімаемся. Суцяшаем яго, бавімся самі з ім. Адчуванне, што мы адны, што мы ў полі, сярод такога прыгоства, і што чуем недзе перапёлку з яе перапялятамі, заварожвае нас, і мы аддаёмся гэтаму адчуванню, свабодныя і радыя. І мы не думаем, што ёсць недзе іншае жыццё, суровае і страшнае, якога трэба баяцца, ад якога трэба хавацца, берагчыся. У нас сваё жыццё. Ёсць Васілёк, ёсць мы, а тое, што трэба нам сустракацца ў полі — нас ніколькі не дзівіць. Мы жывём як бы на асобнай, сваёй пляцоўцы жыцця, адгароджанай ад іншых. Дусі падабаецца быць у полі. Яна кажа, што яна як бы вярнулася да сваіх гусіных часоў. З замілаваннем і нейкім шкадаваннем прыгадвае тое месца, дзе мы калісьці сядзелі з ёю ў траве, прыгадвае божую кароўку, што перапаўзала з мае травінкі ёй на палец. Тое адчуванне казытлівасці адзываецца ў яе і цяпер. Не раз мы хадзілі на тое месца. Але цяпер яно выглядае інакш, таго, што было тады, няма.

Дуся прыносіць з сабой і яду, і мы тады застаемся ў полі даўжэй. Да паўдня сходзім яго ўсё. Гэта ж тое самае поле, якім я бег, уцякаючы ад партызана, што страляў па мне. Дуся дакладна вызначае мой след, той след, ідучы якім, яна знайшла мяне з Дар'яй у Віроўцы. Гэтай вясной, калі сагнала снег, яна змагла сабраць усе гільзы ад тых

куль, што былі выпушчаны па мне. Яны клаліся радком, і Дуся лёгка знаходзіла іх. З падваконніка ў нашай хаце, дзе яны цяпер ляжаць, іх ніхто не прымае. Калі сястра, выціраючы пыл, закране іх, яны скрануцца і пакоцяцца, каб потым зноў супакоіцца.

Я люблю глядзець, як Дуся, седзячы ў траве, корміць Васілька. Выніміць, вызваліць свае цыцы і дае яму, ён рупна бярэцца за сваё і, задаволіўшыся, засынае ў яе на руках. Калі яна корміць яго, яна сцішаецца, як бы прыслухоўваецца, замірае, аддаецца яму ўся і чуе, як Васілёк яе цягне. Гэты цяг ёй дужа падабаецца. Гаворыць: «Няхай цягне, набіраецца сілы, дужэе, расце».

Дзень пачаўся незвычайным з'явішчам. Густа ўкрылася самалётамі неба над Мокрым. Нізка лятуць і садзяцца дзесьці недалёка, за лесам. А адтуль, з-за лесу, узнімаюцца іншыя, ідуць насустрач. Размінаюцца. Як адны, гэтак і другія — нямецкія самалёты. Плаўна ідуць над вёскай, пакалыхваюцца пузам, аглушаюць наваколле. На тых, што ўзнімаюцца з-за лесу — чырвоныя крыжы: вязуць параненых. Што йдуць туды — на тых падмацаванне. Усіх іх гэтулькі, што ад іх цёмна ў небе. Цені ад іх пнуцца па зямлі. Праляціць адна хваля, а за ёю — другая. Хоць яны йдуць над Мокрым няхутка — усё роўна як плывуць — але яны лятуць у спешцы, быццам ад таго, як яны справяцца, залежыць быць ім ці не быць. Там, куды яны лятуць, ідзе гарачае жніва — крывавы бой, у разяўленае жэрла якога кідаюцца ўсё новыя і новыя ахвяры, і самалёты з чырвонымі крыжамі, здаецца, не спраўляюцца вывозіць іх адтуль. Тыя, што йдуць туды, зніжаючыся над лесам, здаецца, спаўзаюць па ягоных верхавінах уніз. А адтуль выныраюць іншыя. Узняўшыся настолькі, каб не зачапіцца за дрэвы, яны пралятаюць над хатамі гэтак нізка, што, здаецца, гатовы ўсмактаць іх. Яшчэ людзі не паспелі выгнаць статак на поле, і ён з перапуду шалее ў хлявох. Людзі, што дасюль не бачылі вайны, мірна сядзелі ў сваім забалоцці, напалоханыя гэтым насланнём, не ведаюць цяпер, што дзеецца. Але вось, як па якой камандзе, лёт перапыніўся. Ні туды, ні адтуль — ніводнага самалёта. Людзі высыпалі на вуліцу, здзіўленыя і перапалоханыя. Пытаюцца адзін у аднаго — што гэта будзе? Інвалід першай сусветнай вайны, Вусаты Якаў, акружаны бабамі, тлумачыць: «Нашы здорава дзяруцца, душна

немцу, дык і ратуюцца во. Гэта ясна. Праз дзень-два — пабачыце — нашыя будуць тут. Немец не ўратуецца. Бачыце, як яго калоціць ліхарадка».

Але па абедзе самалёты хлынулі зноў гэтак жа нечакана, як і раніцою. Толькі самалёты ўжо іншыя — чорныя, цяжкія, раўма равуць, рэжуць неба, магутныя. З-за лесу, як бы з-пад зямлі, крута ўзляцела ў неба некалькі малых самалётаў. Яны развярнуліся ў небе, імкліва і рашуча, у адно імгненне, счапіліся ў бітве, і адзін з іх з хвастом дыму і скрогатам упаў на лес. Бітва ішла высока ў небе. Між кім яна йшла — людзі з Мокрага не ведалі. Толькі бачна было, што з малымі самалётамі счапіліся іншыя, такія ж малыя самалёты. І было страшна глядзець, як яны рэзаліся, узляталі, падалі, зноў узляталі. У аднаго з іх адарвалася крыло, і самалёт тарчма ўпаў у Махавое балота. Бой трываў нядоўга, адна з старон — чыя яна? — відаць было, не ўстаяла і змылася з неба гэтак жа хутка, як і наляцела.

Надзвычайнае відовішча, пра якое я толькі што гаварыў, застала мяне з Дусяй і Васільком у полі. Дуся прыйшла рана, калі было яшчэ ўсё спакойна. Я быў здзіўлены, калі заўважыў яе з Васільком яшчэ ў выгане і ў страху падумаў, што нешта здарылася нядобрае. Ужо па тым, як яна ішла, па ейнай паходцы, зразумеў — не з добрымі весцямі. Пабег ёй насустрач, і Дуся ў слязах: «Бугроў!» Бяру ў яе Васілька. Выціраючы слёзы, яна: «...прыставаў, пагражаў. Я карміла якраз Васілька — праснуўся ўначы і не хацеў спаць. Колькі ні люляла, не хацеў ляжаць у люльцы — прасіўся на рукі. Чую — нехта пачаў тармасіць дзверы. Бацька злез з печы — адчыняе: наставіўшы на бацьку ліхтарык, улазіць Бугроў і з ім яшчэ нейкіх двое. Я як трымала на руках Васілька, так і засталася сядзець з ім на ложку. Адразу да мяне — ад яго тхнула гарэлка: «Пазнаеш гэтага рабёнка». Уталопіўся ў Васілька: «Так табе не пройдзе!» І сунецца да мяне. Я ў крык і, прыціскаючы Васілька да грудзей, адсоўваюся задам да сцяны. Бацька, як стаяў сярод хаты, схапіў у парозе таўкач і, замахнуўшыся, гатовы быў выцяць яго ззаду, ды тыя двое, што сталі таксама з ліхтарыкамі, схапілі бацьку і наводмаш кінулі на падлогу. Маці кінулася да мяне. Засланяе мяне. Крычыць на ўвесь голас: «Людзі добрыя, ратуйце! Памажэце, людзі добрыя!» Бугроў аголтаўся. Адступіў. Бацька, устаўшы, падышоў да яго: «Што табе трэба ў нас? Выйдзі, прашу цябе па-добраму!» Калоціцца ўвесь. Не

можа стрымацца. Двое тыя кіўнулі Бугрову галавой — адыходзіць! Ён жа не йдзе. Абазваў мяне абіднымі словамі. І ў парозе ўсё яшчэ крычаў: «Пазнаеш пачым хунт табаку!» Выходзячы, тыя двое паказалі бацьку на таўкач: «Глядзі, каб ён не пахадзіў па тваёй галаве. І выйшлі».

Дуся абдымае мяне і ў плачы просіць: «Юзік, калі ты любіш мяне, калі табе дараг Васілёк, пойдзем адсюль. Пойдзем, куды хочаш, абы не быць тут. Мы не можам заставацца тут. Ён азвярэў, седзячы ў лесе. Ён уходае і мяне, і Васілька, і цябе. Яму трэба людская кроў. Куды нам дзецца, Юзік? Шукай для нас месца. Чаго ж мы тут дачакаемся?»

Плача... З Васільком на руцэ прыціскаю Дусю да сябе. Яна ўхапілася за нас абаіх, а тут — самалёты. Адкуль толькі ўзяліся, наплываюць. Сунуцца. Адзін за адным. Хвалямі. Пакрываюць неба. Гудуць. Нізка. Над самай галавой. Дуся ў бяспамяцтве — што і адкуль? Хапаецца за Васілька. У сполаху глядзіць на мяне. Гавару ёй: «Не бойся. Нас не зачэпяць. Пралятуць».

Толькі калі ачысцілася неба ад самалётаў, сціх іхны гул, мы пакінулі поле. Прыйшлі да Дусі ў хату. Піліп і Хіма былі ў засмучэнні і, відаць, не надта задаволеныя мною. Хіма зноў пачала звяртацца да мяне: «Масеевіч».

— Масеевіч, трэба ж нешта думаць. Не пакідаць жа Дусю з дзіцем на страд.

Яго бачылі, як ён ішоў па вуліцы — адкрыта, не хаваючыся, спаважна. Ён ішоў так, каб яго прыкмецілі, каб яго пазналі, хто ён такі. Ішоў, нічога не баючыся — сярод белага дня. Не аглядаўся па бакох — ішоў проста па вуліцы, акамянелы і суровы. Ішоў, не пазіраючы ў вокны, але з выглядам, што ён усё бачыць, ведае, чым хто дыша, каго хто чакаў, на што спадзяваўся. Апаясаны патранташам і з наганам пры боку, ён дэманстраваў свой паварот, паказваў, што ён не згінуў, прыйшоў во і будзе тут, як і быў. Уся ягоная постаць гаварыла, што скончыўся час у тых, хто яго ўжо не чакаў. Прайшоўшы вуліцу з канца ў канец, ён вярнуўся, каб прайсці яе яшчэ раз. Дайшоў да будынка сельсавета, узышоў на ганак і, як гаспадар, азірнуўся навокал — глядзіце, як стаяў я тут, так і стаю. Сышоўшы з ганка, агледзеў звонку колішнюю сваю рэзідэнцыю — вокны з пустымі праёмамі і ўзломаным франтонам. Глядзеў, упэўнены, што яго бачаць і што ягоная

прысутнасць робіць адпаведнае ўражанне. Пастаяў перад апусцелым і разгромленым сельпо. Пайшоў на мост, каб прайсці і па вуліцы Мокрага Другога. З моста яшчэ зірнуў на школу, што паказалася яму вызваленымі ад бляхі страпіламі. Уступіў у вуліцу. Коўратаў, якімі яна зачынялася, няма. Направа і налева — першыя, знаёмыя яму хаты. Ён неаднойчы быў у іх. Выпіваў. Абмяркоўваў важныя пытанні з людзьмі, блізкімі яму. Наступная хата злева... ён не можа ўстрымацца, каб не кінуць вокам на яе. Кінуў — а там, у вакне, матнулася нейчая постаць. Убачылі яго? Яшчэ пабачаць! Пайшоў далей, у самы канец вуліцы.

Лявонавіч думаў, што ён будзе вяртацца назад — вуліца ж канчаецца абрывам — але, колькі ён ні стаяў перад вакном, таго болей не відно было. Паказаўся і знік. Навёў страху і пайшоў, пакінуўшы загадку пра сябе. Але тут не было ніякай загадкі. Бронь пачала вылазіць з лесу, адкрыта паказвацца на вачох. Чуваць ужо дыханне фронту, пахне крывёю, сасмяглым жалезам і порахам. Глуха ўздыхае зямля. Туды і назад шнуруюць самалёты. У Касцюковічы прыбываюць няспыннай чарадою амбулянсы з параненымі, акрываўленымі немцамі. Партызаны паралізавалі чыгунку. Ім трэба чым-небудзь апраўдаць сваё доўгае сядзенне ў лясох. Прыйдуць свае і ў іх запытаюцца, што яны рабілі, якія іх баявыя дзеянні, змагаліся яны ці хаваліся пад спадніцамі, каго яны болей знішчылі — немцаў ці сваіх. Яны зашавяліліся, рыскаюць па ўсіх дарогах, ловяць, затрымліваюць, дапытваюць. Яны думаюць — пра іх даносяць ворагу. Яны надта пільныя. У тыле ворага яны стварылі спрыяльныя перадумовы для паспяховага наступу Чырвонай Арміі. Ачысцілі тыл ад здрадніцкіх элементаў. Ведаюць усё, дзе якая небяспека і як яе папярэдзіць. Яны падрыхтавалі насельніцтва для сустрэчы пераможнага шэсця Чырвонай Арміі. Яны нездарма пралівалі кроў — сваю і чужую, пакутавалі, мерзлі, гэтымі іхнымі пакутамі забяспечана перамога.

Мокрае Першае і Другое жылі дасюль непрыкметным жыццём. Яно ішло на глыбіні, недаступнай пабочнаму воку, было прыглушаным і ціхім. Вёскі жылі ў няведанні, у чаканні свайго лёсу. І вось яны дачакаліся: спакутаваныя воіны ідуць да іх, нясуць ім вызваленне, хоць іх і няма ад чаго вызваляць. Яны былі тут забытыя, пакінутыя на саміх сябе. Ды радасць, а з ёй разам і трывога разварушылі збалелыя душы: «Нашыя йдуць. Слава Богу, вяртаюцца.

Ідуць да матак сваіх і сясцёр, да жонак і нявестаў сваіх. Ідуць сасмяглыя, знясіленыя, спакутаваныя. Няма слоў радасці і гору нашаму. А ці ж вернецца мой? А ці ж вернуцца мае? А ці ж вернуцца ўсе, што пайшлі адсюль? Ой, не ўсе вернуцца! Ой, не ўсе прыйдуць! Густа ляглі яны. Усю зямлю ўкрылі».

Вайна далёка была — боль тупейшы быў. А наблізілася, кроўю, потам запахла — сэрца разрываецца: ці пабачу свайго? Ці ўгледжу? Я ж сніла яго жывым і цэлым. Бачыла такім, якім ён пайшоў. А мо прыйдзе і пойдзе далей, не пабачыўшыся са мною? Яшчэ далёкая дарога ў яго.

Лявонавіч нікога не чакаў — у яго не было такой радасці. У яго было засмучэнне. Нехта прыйдзе, вернецца сюды, на сваё селішча, а ён мусіць пакідаць сваё. Ён не хоча глядзець у вочы тым, хто прыйдзе. Ён спадзяваўся на іншае, а яно не наступіла. Ён не хоча, каб над ім насміхаліся. Ён лепей пойдзе адсюль у свет, захавае свой боль пры сабе. Няхай ведаюць, што я — нескароны. Мо скажуць — і я быў бы ўсцешаны тым — пакінуў усё сваё, а даказаў. Такі быў ён, гэты пакутлівы і абыдзены шчасцем чалавек. Нат шкада яго.

Балюча зракацца таго, што было сэнсам твайго жыцця, што было набыта, створана табою, а яшчэ перад табою — тваімі бацькам і дзедам, балюча пакідаць свой кут, дзе ты пражыў усё сваё жыццё, дзе нарадзіліся й выраслі твае дзеці, узварушвае да слёз расстанне з усім, табе блізкім і родным, стоптаным і сходжаным табою, зросся, зрадніўся ты з кожнай драбніцай, табе мілай і дарагой, і ўсё-такі з усім гэтым мой бацька вырашыў расквітацца. У хаце засмучанасць, пакора, маўклівасць. Рукі ні за што не бяруцца, не прыстаюць. Трэба тое схаваць, а гэна закапаць — усяго з сабою не возьмеш. Гаршчок, чыгун, міска, лыжка, патэльня просяцца ў рукі, а як гэта ўсё возьмеш? Усё, што нажывалі, цяпер трэба пакідаць. Перажываць гэта — вышэй чалавека. Маці не ведае, за што ўзяцца. Начамі яна насіла дачцэ ў Красны Вугал усё, што яна магла несці. Кошку і тую аднясла, каб не засталася адна ў пустой хаце. Мы пераправілі сястры ў Красны Вугал авечак, парсючка, курэй, крупы, жыта, ячменю. Шмат чаго закапалі на агародзе — будзем прыходзіць з Касцюко-

вічаў і пакрысе забіраць. З сабой мы мала чаго можам узяць — у нас няма каня. Карысталіся ім па радоўцы.

І так я накіроўваюся ў Касцюковічы — шукаць для ўсіх нас нейкага прытулку. Яшчэ добра не сцямнела, пусціўся ў дарогу. Іду на Вараноўку. Трэба завітаць да Агапкі. Гэта мне па дарозе. Чуў — яна ўсё яшчэ там. Жыве ў школьным будынку. Ужо ссутунела, калі я прыйшоў у Вараноўку. Падышоў да школы. У вуглавым пакоі гарыць лямпа. Вакно зацягнутае, і я не магу разгледзець, хто ў хаце. Але заходжу. Усё роўна — адна яна ці з кім. Стукаюся. Адчыняе. Бясконца радая. Знаёміць мяне з прысутнымі — старэйшым чалавекам. Той, аднак, пачаў збірацца выходзіць, і Агапка не затрымлівала яго. Цалуе. Пытаецца, як гэта я надумаўся. Садзіць за стол. Пытаецца, ці хацеў бы я выпіць што напачатку.

— Але — не. Перш раскажы, што ты робіш. Да каго ты там прыклеіўся, што вачэй не паказваеш? Ні слыху, ні дыху ад цябе. Добры з цябе таварыш. Расказвай усё падрабязна. Часу ж у нас хопіць. Заначуеш у мяне. Дарэчы, куды йдзеш? Чаму ты захацеў мяне тут пабачыць? Я табе маю таксама шмат чаго расказаць. Ну дык расказвай, Мікола.

Я сказаў, што йду ў Касцюковічы.

— А чаго проці ночы? — І жартам: — У мяне хацеў перабыць?

— Не. Рад бы. Ды спяшаюся. Справа ёсць.

— Ці не надумаўся ты здуру ўцякаць? Але што мы гаворым так, насуха. Давай чаго глытнем за сустрэчу. Такую дарагую для мяне.

Падышла. Абняла. Потым дастала з шафы пляшку гарэлкі, стаканы. Выпілі.

— Дык, можа б, ты цяпер разгаварыўся? Мяне цікавіць перш бабскае дзела. Я ж баба. Ты мо ажаніўся? Зрэшты, ці гэта мае якое значэнне цяпер? Я жанатая, але што з таго? Пакіньма гэта. Пра гэта потым. Ты ж хіба ведаеш — нашыя не за гарамі. Блізка ўжо. Дык мо сапраўды хочаш драпака даць? Чаго ж у Касцюковічы? Мяне не бойся. Гавары. Я з табою наросхліст.

Падышла і, ужо трохі ап'янелая, абвалілася на мяне.

— Гапа, паслухай мяне. Ты пытаешся — чаго ў Касцюковічы? Хачу пакінуць Мокрае. Назаўсёды. З бацькамі і з...

— Са мною? Дурылка, нікуды не йдзі. Заставайся ў мяне.

— Пачакай, Гапа. Раскажы ты. Як ты жывеш? Што новага ў цябе? Мне цікава.

— Ты нейкім багамольцам стаў.— Села на сваё месца.— Дай я табе яшчэ ладалью. А сама я ўжо ап'янелая. Кажаш, хочаш пакінуць Мокрае? Я таксама хацела б выбрацца адсюль. Збрыдла. Коцік, паедзем з табою ў Мінск? Хацела б туды. Можа б, я пабачыла свайго, калі ён — малюся — жыў. Возьмеш мяне? Куды ж мне адной?

Села мне на калені. Закінула рукі за шыю.

— Нікуды не пушчу. У Мінск... у Мінск.— Цалуе. Прыпала да маіх грудзей.— Я стамілася, Мікола. Я памагала нашым у лесе. Колькі магла. Шкада іх. Але ж і сябе шкада. Ты шкадуеш мяне? — Утуляецца.— Колькі ўсякага ў іх! І ўсё страшное. Не магу прымірыцца. Ты ж мо чуў, што Вяркеева няма ў жывых. Дзесьці іх закуталі. Божачка. Гэта ж і твой таварыш.

Ейнае «гэта ж і твой таварыш» ацвярозіла мяне. Я ўзняўся з крэсла, адвёўшы Гапчыны рукі.

— Хочаш мо чым падсілкавацца?

— Дзякую, Гапа. Я пайду. Мне трэба, Гапа. Дзякую за пачастунак.

Абнімаю яе крэпка-крэпка. Цалую. Гарну да грудзей. Прытуляю ў сцішнасці і жарсці. Яна супакоілася. У супакоенасці самі па сабе пайшлі ў яе слёзы. Яны заблішчэлі на ейных вейках, калі, вызваліўшыся з маіх абдымкаў, яна паглядзела на мяне.

— Міколка, ідзі, куды йдзеш. Трымаць цябе не буду. Мо стрэнемся ў Мінску?

І кінулася яшчэ раз мне на грудзі. Апамятавалася. Падала руку. Я накіраваўся да дзвярэй і, спыніўшыся на момант у ціхім развітальным паклоне, выйшаў.

У Касцюковічах я атрымаў месца бухгалтара на маслазаводзе. З гэтага завода ўцёк бухгалтар, забраўшы з сабою ўсю выручку. Мне далі ягоныя бухгалтарскія кнігі і папрасілі адразу ж распачаць працу. У нейкім напаўразбураным будынку адвялі мне кватэру, вялікі пусты пакой накшталт нейкай залы, без кухні, вады, ложкаў і ўсяго іншага патрэбнага для жыцця. Паставілі толькі стол з канапай побач. На гэтым стале я й пачаў разглядаць бухгалтарскія кнігі. Гартаў іх, углядаўся ў запісы, зробленыя папярэднім бухгалтарам, гартаў і нічога не разумеў — дзе дэбіт, дзе крэдыт. Дырэктар маслазавода — падазроны для мяне чалавек — у першыя дні накоратка заходзіў да мяне паглядзець, што я за бухгалтар. Як ён

паяўляўся ў дзвярох, я пачынаў ляскаць на сваіх лічыльніках косткамі, ганяючы іх направа і налева, каб паказаць, што я нешта раблю, але па тым, як я гэта раблю, дырэктар безумоўна, здагадваўся, што я ніколі не трымаў у сваіх руках гэтай прылады. Запытаецца ў мяне пра што-небудзь, коратка і суха, і пойдзе, а я застаюся сядзець над кнігамі, спрабуючы разабрацца ў іх. Дырэктар папрасіў мяне зрабіць нешта накшталт рэвізіі, праверыць па кнігах, што там і як. Колькі я ні біўся, у мяне нічога не выходзіла. Ніяк не мог праверыць балансу: кожны раз на лічыльніку ў мяне атрымлівалася розная, не тая самая лічба. Падлічваю адзін і той жа слупок па некалькі разоў, а выніковая лічба ўсякі раз не сыходзіцца. Кідаю. Пачынаю зноў. Нарэшце пераконваюся, што гэта праца мне не па плячы. Асабліва занепакоіўся, калі пачуў, што, мой дырэктар маслазавода быў у суполцы з сваім папярэднім — што ўцёк — бухгалтарам і што ён узяў мяне, недасведчанага чалавека, у надзеі, што іхнай аферы я не раскрыю, а яшчэ больш заблытаю і такім парадкам магу яшчэ сам улезці ў гэта нячыстае дзела. Кляну сябе, што прыняў гэтую працу, хоць ніякіх іншых магчымасцяў у мяне і не было. Балазе, што мне паабяцалі кватэру, пільна патрэбную мне. Удзень я б'юся над кнігамі, а ўвечары — хоць задавіся. Сяджу адзін у сваёй кватэры-пустэльні. Не ведаю, дзе дзецца. Баюся тут спаць. А лягу — сплю трывожна, мармычу, крычу, у сне шукаю пры сабе Дусю, грабаю рукамі, а яе няма. Пуста. Яна мусіла б ужо й быць. Але, відаць, нейкая затрымка, ды й не так лёгка выбрацца адтуль. Шкадую, што не прыйшоў сюды разам з ёю. Як яна можа з дзіцем дабрацца сюды? Не дадумаў. Не ўлічыў усіх абставінаў. Сапраўды, пакінуў на «страд». Безадказна. Несур'ёзна. Не па-мужчынску. У часе абеду забягаю на рынак — можа, прыпадкам пабачу каго з Мокрага. Прыходзяць жа сюды, каб здабыць што, з самых далёкіх куткоў, пераважна за соллю. Ды нікога з сваіх на рынку не бачу і, занепакоены, іду назад, у сваю багадзельню. Саджуся за мае кнігі. Гляджу ў іх, а думаю пра іншае, пра тых, каго са мною няма, а мусілі б ужо быць. Прачынаюся рана. Бягу на дарогу, што йдзе з Сцюдзянца, паглядзець — можа, йдуць яны, усе разам з Дусяй. Ні па якой іншай дарозе яны не могуць ісці. Ад Сцюдзянца сюды толькі дзве вярсты, і гэта ўжо самы бяспечны адцінак дарогі. Пабачыў бы іх, каб ішлі, але не йдуць. Няма. Пануры, вяртаюся назад. За сваю бухгалтэрыю не бяруся

ўжо. Знайшоў тры ложкі і матрацы да іх — прыйдуць, будзе на чым легчы. Але не прыходзяць. Настае дзень, бягу зноў на дарогу і зноў — няма. Мокрае патанула ў нейкім мроіве, хачу ўявіць яго, а яно — як па-за светам, як няма яго. А то наадварот — зырка бачу ў сваёй уяве то Дусю, як яна ідзе з дзіцем сюды, то бацькоў і сястру з клумкамі за спіною. Але гэта толькі ўява. Іх няма. А тут, у мястэчку, усё болей і болей нарастае трывога — чуцён фронт. Вязуць параненых, здаецца, толькі што падабраных з поля бітвы. Мой дырэктар маслазавода патайна рыхтуецца да адступу, зафрахтаваў сабе цэлы вагон, каб калі надыдзе той час, пакінуць Касцюковічы з усім сваім скарбам. Ходзяць самыя розныя чуткі: немцы ўжо пакідаюць фельдкамендатуру, раённае начальства гатова змыцца ў кожную хвіліну, паліцыя перабегла да партызанаў, на цягнік бяруць толькі тых, хто гэтага даможацца. А я? Я нікога тут не ведаю, і мяне ніхто. У мяне ніякіх сувязяў. Я чуюся тут чужым, і ўсё тут для мяне чужое.

Не спаў усю ноч. А настала раніца — усхапіўся. Не ўмыўшыся, бягу на сцюдзянецкую дарогу. Яшчэ рана — ніхто не едзе і не йдзе. Толькі я на гэтай дарозе — іду, набліжаюся да Сцюдзянца. З вёскі выходзяць і выязджаюць. І сярод тых, хто выходзіць,— бачу бацьку з каровай на повадзе, а за ім — маці і сястру. Убачыўшы іх, не столькі ад радасці, колькі ад жалю хлынулі слёзы. За іх, пакутных.

Прывёў на сваю «кватэру». На агародзе навязалі карову. Увайшлі. Сястра азірнулася — і не вытрымала. Бацька моўчкі знімае з сваіх плячэй хатулі. Маці, паставіўшы свае клумкі на падлозе, выйшла нарваць на агародзе травы для каровы.

На стол сястра кладзе хлеб, некалькі вараных яек, агурок, памідор. Вярнулася з агарода й маці. Селі за стол. І не можам дакрануцца да яды — рукі не бяруцца за яе: сціснулася, закамянела душа. Пры кожным глытку — глытаюцца і слёзы. Калі аціхлі, сястра першая парушыла маўкліню. Расказвае, як яны йшлі. Гаворыць — пакінулі хату, калі ўжо сцямнела. Ішлі ўсю ноч. Мусілі часта спыняцца, каб даць адпачынак карове. Раніца застала на паўдарозе. З паўдарогі ішлі ўжо пры светлым. Баяліся, што дзе-небудзь нагоняць ці перастрэнуць. Пра Дусю сястра не гаворыць нічога, хоць і бачыць, што я з нецярпеннем жду слова і пра яе. Нарэшце сястра пачала і пра Дусю. Кажа: Дуся да нас не заходзіла, нічога не пыталася, нічога нам

не перадавала. Але пра што я табе зараз скажу, пра гэта мы пачуліся пасля. Дуся, не дачакаўшыся ад цябе ніякай весці, выправілася ў дарогу з дзіцем сама. Днём. Куды ж ёй ноччу? Думала, можа. яе з дзіцем хто падвязе. Ездзяць жа людзі. Не баяцца. Выправілася яна, а за ёю — пагоня. Дуся аж да Дзяражні дабралася. Вот там яе нагналі і павярнулі назад. Ці яна йшла назад на пяхоту, ці яе падкінулі дахаты — пра ета мы не знаем, а толькі пасля етага пайшоў ейны бацька шукаць свайго каня. Партызаны забралі, павезлі на ім нейкую сваю паклажу, і Дусін бацька думаў, што, завёзшы, дзесьці кінуць каня, як гэта яны часта і робяць. Па Мокрым пабегла чутка — Піліпа знайшлі ў лесе нежывым пад хворастам. Шукаючы каня, ён найшоў на партызанскі лагер у лесе, і тыя партызаны, угледзеўшы яго, пабаяліся, што ён можа перадаць каму план месцазнаходжання лагера, узялі і забілі. Днямі й пахавалі яго. Так што ў Дусі — гора, і я не думаю, што яе можна цяпер выручыць. А табе ж туды і патыкацца нельга.

— А я думаю, можна яе яшчэ як выручыць. Трэба ж яшчэ йсці туды, дык можна забраць яе і скрозь ноч прывесці сюды.

— Ды што ты, мама, туды ўжо нельга цяпер хадзіць,— гаворыць сястра.

— Ну дык а як жа — усё там так і пакінуць? Нашто ж мы тады закапвалі? Хоць бы забраць трубкі палатна. Згалеем жа.

Бацька й думаць не хацеў пра хадзьбу туды. Няхай яно там пропадам прападзе. Прапала кароўка, няхай прападзе й вяроўка. Дзе там ужо. Скрануліся, дык няма чаго ўжо поўзаць туды. Што табе так тое палатно? Будзе душа жывая — нажывецца. У сіло кідацца — нашто?

У душы я хачу, каб маці схадзіла ў Мокрае па палатно і заадно прывяла і Дусю. Але пра гэта я маўчу. Грэх пасылаць маці туды. Я гэта ўсведамляю, але і не адгаворваю яе не йсці. Мне хочацца, каб са мною была Дуся. Што ў Дусі няма ўжо бацькі — гэта не даходзіць да мяне. Страшная навіна не выклікала ў мяне ні болю, ні нават спагады. Я — па-за гэтым. Я ўвесь у хаценні — мець Дусю. Я паглынуты адным. Каго я найбольш хачу, каб ён быў тут, таго няма. Мая ўява намалявала Дусю ў часе, калі яна знаходзілася на дарозе да мяне: на руках Васілёк у блакітнай шапачцы, пруткі, як стручок, сама яна жвавая, не сумная — не, засяроджаная, імкне, радая хуткай

сустрэчай са мною. Ад гэтай уявы светла на душы, я нават ганаруся ейнай адвагай, а адначасна боль і роспач, што не дайшла, што схапілі яе, не даюць мне супакою. Магу з некаторай доляй пэўнасці меркаваць, хто яе нагнаў і вярнуў і хто, нарэшце, замардаваў ейнага бацьку — чалавека добрага і ні ў чым не вінаватага.

Дзень прайшоў у клопатах — з дошак і бляхі бацька збіў нешта накшталт стойла для каровы. Ну нашто мы яе прывялі? Чаму не пакінулі сястры ці цётцы? Ну так. Але ж у іх ёсць свае каровы. Маці з сястрой схадзілі на рынак, купілі там солі (калі маці пойдзе, яна занясе соль дачцэ ў Красны Вугал). Я наводзіў спраўкі ў раённай управе, ці будуць браць на цягнік цывільных і ці можна ўмясціць у які́м таварным вагоне карову. Мне адказалі, што ім пра гэта яшчэ нічога не вядома, а што тычыцца каровы, дык не можа быць і гаворкі.

Пахадзіўшы і паглядзеўшы на тутэйшае жыццё, на нервовы тэмп руху на галоўнай вуліцы, маці з сястрой былі рады вярнуцца да нашага супынку. Бацька не выходзіў — замка няма, дык баімся пакідаць клумкі без нагляду.

Увечары селі за стол зmораныя, прыгнечаныя. Елі тое, што прынеслі з хаты. Маці б зварыла што, дык няма дзе і на чым. Бацька спытаўся, што мне сказалі ва ўправе. Яснага нічога не дабіўся, гавару. І наўрад ці можна будзе ўзяць карову. Такая няпэўнасць, бачу, засмуціла бацьку. Ён хацеў бы выбрацца адсюль як найхутчэй. Я сказаў яму: схаджу яшчэ, запытаюся, ці ходзяць цягнікі на Варшу. Маці з сястрой слухалі нашу з бацькам гаворку. Маўчалі. І бацька запытаўся ў іх: «Ну, і што вы думаеце?» Заўважыў бацькаву няўпэўнасць. Ягоная цвёрдая воля як бы пахіснулася. І маці падмеціла гэта. Сказала:

— Што ж думаць? Бачыш, як яно ўсё тут? Думалася адно, а выходзіць другое. Зроду не была тут, а прыйшла — назад хочацца. Ці не паспяшаліся мы, бацька? Разарылі хазяйства, кінулі хату і во прыйшлі. Куды? — Заплакала.— Гэта ж падумаць толькі: кінуць-рынуць і пусціцца ў свет. І во якей ён той свет. Што сам думаеш? Можа, вернемся? Пакуль яшчэ хата цэла.

Азвалася сястра:

— Брат, шкада мне цябе да слёз. Даражэнькі брат, пайду за табой у ваду і ў агонь, не пасылай толькі маці.

Бачу — хочаш, каб яна пайшла. Прывяла табе Дусю. Дарагі брат, хочаш — ідзі сам, а не пасылай маці. Дарагі брат, я не хачу, каб і ты ішоў, галаву сваю падстаўляў. Дусі дарога перарэзана. Яна не можа прыйсці сюды, і ніхто табе яе не даставіць сюды. Дарагі мой брат, мы яшчэ можам вярнуцца, а ты ўжо не можаш. Калі сядзеў у хаце — мог бы яшчэ. Цябе яны тады цярпелі, а цяпер пайшоў — ужо не сцерпяць. Не даруюць. Ты думаеш, хто тут арудуіць? Не хацела табе казаць. Цяпер скажу — Бугроў і Маньчын брат. Яны на цябе цятыя, і перш за ўсё — за Дусю, за Маньку. Мой дарагі брат, кажу табе ў вочы, бо паважаю цябе. Люблю цябе. Прашу цябе апомніцца. Знаю тваю больку. Знаю, па кім твая душа хліпціць. Але што тут можна парадзіць? Глядзі, што разыгралася. Дуся страціла бацьку, а ты можаш, крый ты Божа, страціць матку. Маці пойдзе за цябе, за нас куды хочаш, і на той свет. Такая яна ў нас, нашая маці, што сябе не шануе... Дык брат, мы яе мусім шанаваць. Даруй, я цябе не вучу. Кажу, як ёсць. Ляжа на цябе вялікі грэх, брат, калі пашлеш маці туды.

Маці й бацька маўчаць — відаць — уражаныя дабрынёю дачкі, ейнай такой неспадзяванай сталасцяй і адкрытасцяй. Усё ж маці не ўцерпела. Сказала:

— Ну што ты так ужо яму выгаварваеш, дачка? Трэба ж і яго больку разумець.

Перагаралі ноч. А настаў дзень — бацькі не ведаюць, за што ўзяцца. Гэта ж трэба: было ўсё, а цяпер нічога. Ні кала ні двара. І запякло сэрца па тым двары, што пакінулі. Увайшоў дырэктар маслазавода. Прывітаўся, кідка зірнуўшы на маю сям'ю. Запытаўся ў мяне, ці гатова рэвізія. Адказваю яму, што ў кнігах усё знарок заблытана, перакручана і дзеля гэтага няма ніякай магчымасці зрабіць рэвізію. Аддаю яму кнігі, прашу звольніць мяне ад гэтай працы. Запытаўся, ці можам мы застацца ў гэтым пакоі яшчэ на колькі дзён. Калі дырэктар маслазавода выйшаў, бацька запытаўся:

— Дык у цябе цяпер і службы няма?

**Цывільны цягнік ідзе ў пятніцу, а сёння яшчэ панядзелак, значыць, у нас яшчэ ёсць час. Гэта будзе таварны цягнік, і ён можа змясціць усіх, хто запішацца ва ўправе на выезд. Я і ўсе мае, уключна з Дусяй, у выязным спіску. Цягнік забірае і жыўнасць. Значыцца, можна ўзяць і ка-**

рову. Толькі трэба для яе назапасіць кармоў. Але маці гэта ўжо зрабіла. Для маці карова — як невядома што. Карова з маці як не загаворыць. Зірнець на яе такімі выразнымі вачыма, і маці разумее, што яна хоча. Маці гаворыць з ёю заўсёды: і калі доіць, і калі корміць, калі выганяе з двара пастуху і калі ўвечары заганяе яе ў хлеў. Карова слухаецца маці. Убачыўшы маці, рыкае, расказвае ёй пра сваю нейкую жальбу. Маці не можа пакінуць такую карову. Да таго ж дойную, карову-карміліцу.

Маці ўбачыла сон: яна на сваім дварышчы. Хаты ўжо няма. Стаіць толькі адна печ і яна пры ёй з чапялой у руках. Пячэ бліны. Скідвае іх з патэльні на стол, што стаіць тут жа, пад адкрытым небам. За сталом седзімо мы: бацька, сястра і я. Дусі няма. Маці спяшаецца накарміць нас — у яе засталося мала часу. Полымя шугае ў печы, а з правага боку сонца — таксама шугае полымем, як і тое, што ў печы. Маці пытаецца ў нас, ці мы сыты: яна корміць нас апошні раз і хоча, каб мы задаволіліся. Яна адыходзіць надоўга і не ведае, ці мы стрэнемся калі. Шкадуе, што за сталом не ўсе мы — няма Марфы. Але яна яшчэ забяжыць да яе. Хоць мо ў апошнюю хвіліну. Падумала так, а нехта да яе: «Ты каго корміш?» Вырваўшы, ударыў яе чапялой, якую яна трымала ў сваіх руках. Вядзе, і яна не ведае куды. Закрычала, а століка ўжо не было — знік, і некаму яе ратаваць. У болесці яна просіць адпусціць яе, ды нехта вядзе яе далей і далей, пакуль не прывёў у страшэнна густы лес. Цямнота, хоць вока выкалі. «Ну, гаворыць, ты ўжо дайшла да таго месца, адкуль не пойдзеш. Ёсць у цябе на смерць кашуля?» — «Няма. Яшчэ не пашыла. Прыходзіла во па палатно, каб пашыць. Не паспела». У страху стулілася — што ён будзе рабіць са мною. Аж прад маімі вачыма ўспыхнула святло. Стоўп святла. У гэтым стаўпе я ўзнялася высока-высока і бачу ўсё чысценька на зямлі — і вас усіх. Кажу — не журыцеся. Мне цяпер добра і не страшна. Чакайце, і я прыйду да вас.

Мы стаімо на студзянецкай дарозе і чакаем прыходу маці. Сонца ўжо ўзнялося высока. Мусіла б быць. Ды не відаць. Да самай вёскі не даходзім.Назіраем здалёк. Паводзім сябе так, каб не кідалася ў вочы, што мы некага чакаем, выглядаем. Людзі высыпаюцца з вёскі ў мястэчка

хто за чым. Вёска вялікая і, як пачнецца дзень, валам валяць. Уражанне мірнага часу. Стаяць залатыя, напоеныя ўраджаем, восеньскія дні. Пахне бульбай, укропам, канаплямі. Сярод тых, хто йдзе, прамільгне часамі блузка, такая, як у Дусі. Аж бачу, што гэта падман. Дуся б ішла разам з маці і Васільком на руках. Няма ні маці, ні Дусі. Надзея згасае. Ды, адыходзячы, маці ж гаварыла, што яна можа й прыпазніцца, затрымаецца на які лішні дзень у Марфы. Не, сёння ўжо маці не будзе. Прыйдзе заўтра. І мы пакідаем сцюдзянецкую дарогу. Ідзём у свой бярлог. А трывога ўпаўзла ўжо ў нашы душы. Ды мы крэпімся. Спадзяёмся. Не прызнаёмся, што навісла гора: не прыйшла сёння, дык прыйдзе заўтра. Я цалкам пакладаўся на гэтае заўтра. Прыйдзе маці. Прыйдзе Дуся. Уначы, не сплючы, бачу іх абедзвюх ужо ў хаце. Дуся корміць Васілька, радая, шчаслівая. Маці таксама цешыцца, што прывяла мне Дусю. У сваім жаданні бачыць Дусю я настолькі наблізіў яе да сябе, што яна ўяўлялася мне цалкам рэальнай.

Але настала тое заўтра, і ўсё змеркла, з той уявы нічога не засталося. Бацька і сястра як закамянелі. Маўчым усе паасобку. Жывём паасобку ў агульным прадчуванні нядобрага. Ідзём на сцюдзянецкую дарогу. Сёння ўжо маці будзе. Раніца блішчыць буйнай расою на даляглядзе. Мы добра бачым, як выходзяць і выязджаюць з вёскі. Ужо схлынулі і пешыя і конныя, усе тыя, хто спяшаўся на працу ці яшчэ куды. А маці няма. Пусцее дарога. З вёскі выходзяць толькі рэдкія, адзінокія постаці. Але не выходзіць маці. Меркне сінява на небасхіле. Згасла далячынь. Не зіхціць у бляску расы. Маці няма, але мы не сыходзім з дарогі. Углядаемся. Вось здаецца, ідзе ўжо яна. Не, не яна. Нехта іншы. Аж бачым — на вуліцы нейкая калатнеча. Бяжым. Бачым павозку і некага вярхом на кані. Прыбеглі — ні конніка, ні павозкі. Павыходзілі з двароў жанчыны. Глядзяць, куды тая павозка паехала. Шэпчуцца. А адна, накрыўшы даланямі вочы, не можа ўстрымацца ад нервовага струсу. Сястра пытаецца, што тут сталася, а тая — што плача — ёй у адказ: «Схапілі нейкую жанчыну... Як яна мучылася! Не давалася. Страх глядзець. Вунь засталіся на дарозе ейныя клумкі, разбітыя ўмэтлух. Схапілі на павозку. Вот толькі мінута таму...»

Усё. Усё скончана. Ні жанчын, ні вуліцы. Нікога і нічога. Толькі паплыла пад нагамі некуды зямля. І мы не чуем, ці мы йдзём куды, ці не.

Без маці мы нікуды не паедзем. Маці, можа, яшчэ прыйдзе. Мы будзем хадзіць на сцюдзянецкую дарогу, выглядаць яе. Мы спадзяемся, што калі-небудзь яна з'явіцца на парозе і скажа:

— Ну вось, я й прыйшла...

Глядзіць на нас, спакойная і засмучаная.

***1986—1987***

## ЗМЕСТ

**Барыс Сачанка.** «Хвалююся, сумую і пішу...» . . 3

ВЕРШЫ

«То ўскрэсне, то запаліцца, то згасне...» . . . . 13

НА ДОСВІТКУ

Пастушка . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Сонцу . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Адзінства характва . . . . . . . . . . . 15
Хвала вясне, дажджу і грому . . . . . . . 16
Жаданне . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Вятрак . . . . . . . . . . . . . . . . 17
У дарозе . . . . . . . . . . . . . . . 18
Хутчэй, зара! . . . . . . . . . . . . . 18
Не і так . . . . . . . . . . . . . . . 19
Маё хуліганства . . . . . . . . . . . . 19
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Снегапад . . . . . . . . . . . . . . . 21
Домік у Менску . . . . . . . . . . . . 22
Маленства . . . . . . . . . . . . . . 22
Развітанне з летам . . . . . . . . . . . 23
Прадчуванне . . . . . . . . . . . . . . 24

ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ

Жах . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Уночы . . . . . . . . . . . . . . . . 26
«Жудка. Цемень мне сэрца гняце...» . . . . . 26
«Затуманілася даль...» . . . . . . . . . 27
«З прагавітасцяй звярынай, дзікай...» . . . . 27
«Хадзіў я ў пустыні, і ціхім і сумным...» . . . 28
Зманлівасць . . . . . . . . . . . . . . 28
Жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . 29
«Хацеў бы ўзяць цяпер я посах...» . . . . . . 30
Таварышом . . . . . . . . . . . . . . 30
Крывічом . . . . . . . . . . . . . . . 31
Правадыр на трыбуне . . . . . . . . . . 32
Здрайцам . . . . . . . . . . . . . . . 32
«Мусіць, больш не маючы нічога...» .. . . . . 33
Маім бацьком . . . . . . . . . . . . . 33
Да песняў . . . . . . . . . . . . . . . 34
«Перунамі біце, словы...» . . . . . . . . . 35

НА МАРШРУТАХ

Інвалід . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Верш без назову . . . . . . . . . . . . 36
Усцешаныя геніі . . . . . . . . . . . . 37

З «гістарычных датаў» . . . . . . . . . . . . . 38
Цяжкі адказ . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Страх . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Вайна цішыні . . . . . . . . . . . . . . . 40
На спынку . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Жабраку . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Прага . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Дарожныя ўражанні . . . . . . . . . . . . . 42
«Вёрсты шлях мой далёкі пакрылі...» . . . . . . 43
Снежань . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Майму начному сябру . . . . . . . . . . . . 44
Над морам . . . . . . . . . . . . . . . . 45
З недасланых лістоў .. . . . . . . . . . . . 45
Развітанне . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Дарогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
«Я думаў, што гарэць...» . . . . . . . . . . . 48
Раман . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Кляштар . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Стрыманасць . . . . . . . . . . . . . . . 50
На пляжы . . . . . . . . . . . . . . . . 50
З вячэрніх блуканняў . . . . . . . . . . . . 51
Асепленасць . . . . . . . . . . . . . . . 51
Сум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Сустрэча . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
«Едзеш ты. Ці ж магчыма?..» . . . . . . . . . 53
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Як малітва . . . . . . . . . . . . . . . . 53
«Будзь мне ты ўсім...» . . . . . . . . . . . . 54
Маленькая просьба . . . . . . . . . . . . . 54
Вечар . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
«Даўно агні патухлі ў вокнах...» . . . . . . . . 55
Радасць . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Адзіноцтва . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Разбітае лётнішча . . . . . . . . . . . . . 57
Далёкае . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Відзенне бацькаўшчыны . . . . . . . . . . . 59
«Цяпер я ў неба болей закаханы...» . . . . . . . 59
Боль . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
«Тут жылі мы...» . . . . . . . . . . . . . . 60
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Суцэльнасць . . . . . . . . . . . . . . . 61
Залатое шуганне . . . . . . . . . . . . . . 62
Уначы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Летуценнасць . . . . . . . . . . . . . . . 63
На заходзе сонца . . . . . . . . . . . . . . 64
«Прыглядаюся, каб не разбіцца...» . . . . . . . 65
Смерць малітваў . . . . . . . . . . . . . . 65
Белыя ночы . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Анёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Манах . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Ні канца і ні пачатку . . . . . . . . . . . . 67

## ЯК СПАЖЫТАК ШТОДЗЁННЫ

«Баюся тых дарог...» . . . . . . . . . . . . . 69
Стомленасць . . . . . . . . . . . . . . 70
Вырашэнне мукі . . . . . . . . . . . . . 70
Выгнанец . . . . . . . . . . . . . . 70
Малітва . . . . . . . . . . . . . . 71
«Вось і ноч...» . . . . . . . . . . . . . 71
Акіян . . . . . . . . . . . . . . 72
Небяспека . . . . . . . . . . . . . . 72
Расчараванне . . . . . . . . . . . . . 73
Смутак . . . . . . . . . . . . . . 73
Здрада . . . . . . . . . . . . . . 74
У пушчы . . . . . . . . . . . . . . 75
Вокамгненне . . . . . . . . . . . . . . 75
Кавалкі холаду . . . . . . . . . . . . . 75
Вясна . . . . . . . . . . . . . . 76
На возеры Мічыган . . . . . . . . . . . . 77

## РОЗДУМ

Беларусь . . . . . . . . . . . . . . 78
Зялёная веліч . . . . . . . . . . . . . 78
Ля ціхай брамы . . . . . . . . . . . . 79
Як памяць на вуснах . . . . . . . . . . 80
Майму вершу . . . . . . . . . . . . . 80
«І з словам у душы не ўлезці...» . . . . . . . 81
Гераіня . . . . . . . . . . . . . . 82
Элегійнае . . . . . . . . . . . . . . 82
Простымі словамі . . . . . . . . . . . . 83
Зайздрасць . . . . . . . . . . . . . . 84

## НА СПЫНКУ

Не явай, а вечным сном . . . . . . . . . . 85
Адчуванне начы . . . . . . . . . . . . 86
«Я кажны дзень паміраю...» . . . . . . . . . 86
Адзінота . . . . . . . . . . . . . . 86
З Гейнэ . . . . . . . . . . . . . . 87
З Гейнэ . . . . . . . . . . . . . . 87
Патрыёты . . . . . . . . . . . . . . 87
«Сябром» . . . . . . . . . . . . . . 88
Трыбунам . . . . . . . . . . . . . . 88
«Занадта ўсё да сэрца я прымаў...» . . . . . . 89
Палітычная элегія . . . . . . . . . . . . 89
Непаслухмяныя радкі . . . . . . . . . . . 90
«Я з вамі быў і мог, як вы...» . . . . . . . . 90
Будучыня . . . . . . . . . . . . . . 91
«Адкуль жа будзе брацца і ў мяне?..» . . . . . . 91
Жывы ўспамін . . . . . . . . . . . . . 92
З Новым годам . . . . . . . . . . . . . 93
«Маса» . . . . . . . . . . . . . . 94
Новы год . . . . . . . . . . . . . . 94

## СЛОВА

«Мяне чакае небыццё...» . . . . . . . . . . . . . 95
Нараджэнне песні . . . . . . . . . . . . . . 96
Сінія вочы . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Вёсцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
«Звычайны я...» . . . . . . . . . . . . . . 98
Я не паэт . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Следам за песняй . . . . . . . . . . . . . 99
«Жыжа» . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Сястры . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
«Усё ізноў як і было...» . . . . . . . . . . . 102
Балада пра трох наваградскіх жаўнераў . . . . 103
Галубінае сэрца . . . . . . . . . . . . . . 105

## АЧЫШЧЭННЕ АГНЁМ

Жалейка . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
«Не дасягнуць, не ўзяць...» . . . . . . . . . 109
Надзея . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Лямпадка . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Грэшная душа . . . . . . . . . . . . . . 111
Дзённае . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Сястра . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Акіян і неба . . . . . . . . . . . . . . . 113
Мора ў паходзе . . . . . . . . . . . . . . 114
Таямніца . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Атам . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
70 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Засмучаныя горы . . . . . . . . . . . . . 117
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Агонь . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Жаночая просьба . . . . . . . . . . . . . 121
Патрэба падману . . . . . . . . . . . . . 121
Леда . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Святло і змрок . . . . . . . . . . . . . . 123

## УЯЎЛЕННЕ

Уяўленне . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Венецыя . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
Мая Lorelei . . . . . . . . . . . . . . . 126
«Ты падабаешся ўсё мне...» . . . . . . . . . 127
Ты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Раманс . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
На паляванні . . . . . . . . . . . . . . . 128
Прароцтва Сівілаў . . . . . . . . . . . . . 129
Чужына . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
«Dead end» . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Адказ на запрашэнне . . . . . . . . . . . . 131
Бягун . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Разлучаныя акіянам . . . . . . . . . . . . 133
Кросны . . . . . . . . . . . . . . . . . 133

А ЧАСУ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЕЧНАСЦЬ

Замала часу . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
«З вітком гадоў...» . . . . . . . . . . . . . . 138
Сэрца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
«У адзіноце блукаў я...» . . . . . . . . . . . . 141
«На чужых на загонах...» . . . . . . . . . . . . 141
«Болей пісаць пра мора...» . . . . . . . . . . . 142
Гора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
У парку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Дрэвы ў парку . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Хвалі на моры . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Сізіфава праца . . . . . . . . . . . . . . . 145
Зажурылася восень... . . . . . . . . . . . . . 146
Сустрэча ў парку . . . . . . . . . . . . . . . 146
«З начы у парку яшчэ быў мароз...» . . . . . . . 147
Павуцінкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
«Безліч разоў качка дае нырца...» . . . . . . . . 147
Выслоўі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
«Я цэлае сваё жыццё аддаў слову...» . . . . . . . 148
«Восень — гэта калі рэжуць авечак...» . . . . . . 149
Скарга бяскрылых, ці Як крылатыя дапамаглі бяскрылым . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

**І ТОЙ ДЗЕНЬ НАДЫШОЎ** (Раман) . . . . . . 151

**Сяднёў М.**

С 99 Патушаныя зоры: Вершы. Раман/Прадм. Б. Сачанкі.— Мн.: Маст. літ., 1992.— 375 с., іл.

ISBN 5-340-01100-3.

Седнев М. Погашенные звезды: Стихи. Роман.

Масей Сяднёў — адзін з самых вядомых і папулярных беларускіх пісьменнікаў, якія воляю лёсу апынуліся ў эміграцыі. Гэтаю кнігаю, у якую ўвайшлі лепшыя вершы з яго кніг «Патушаныя зоры», «Ачышчэнне агнём», «А часу больш, чым вечнасць» і яго найбольш дасканалы раман «І той дзень надышоў». Масей Сяднёў адкрываецца перад сучасным айчынным чытачом як таленавіты, арыгінальны паэт і празаік.

С $\frac{4702120202—037}{М 302(03)—92}$ БЗ 91—91 ББК 84Бел7

Литературно-художественное издание

**СЕДНЕВ** Масей Илларионович

**ПОГАШЕННЫЕ ЗВЕЗДЫ**

Стихи. Роман

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**СЯДНЁЎ** Масей Іларыёнавіч

**ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ**

Вершы. Раман

Рэдактар В. М. Хлебавец. Мастак В. А. Губараў. Мастацкі рэдактар В. А. Губараў. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктар К. У. Дзмітрыенка.

ІБ № 3868

Здадзена ў набор 17.01.91. Падп. да друку 09.12.91. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 19,74. Ум. фарб.-адб. 19,95. Ул.-выд. арк. 19,58. Тыраж 3400 экз. Зак. 984. Цана 3 р. 50 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.



3 р. 50 к.

Масей Сяднёў

ПАТУШАНЫЯ ЗОРЫ